ПАМЯЦЬ

ГІСТОРЫКА-
ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ
ХРОНІКІ
ГАРАДОЎ І РАЁНАЎ
БЕЛАРУСІ

ШМАТТОМНАЕ
ВЫДАННЕ
СТВАРАЕЦЦА
ПАВОДЛЕ
РАШЭННЯ
ЎРАДА
РЭСПУБЛІКІ
БЕЛАРУСЬ

ПАМЯЦЬ

КАРМЯНСКІ РАЁН

МІНСК «БЕЛАРУСЬ» 2003

УДК 947.6
ББК 63.3 (4Беи)
П15

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

М.Я.ДЗЯТКОЎ (старшыня райвыканкома), Я.В.МАЛАШЭВІЧ,
В.Я.МАЦВЕЕНКА, І.А.ПРОЦКІН, Б.В.УЛЬЯНКА

РАЁННАЯ КАМІСІЯ
ПА СТВАРЭННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ХРОНІКІ:

В.Я.МАЦВЕЕНКА (старшыня камісіі), М.З.БАШЛАКОЎ,
Р.Ф.ГАНЖУРАЎ, К.Р.МУРАШКОЎ, С.Ф.ЛАПАЦІНА, К.І.ПЯТРОЎ,
К.В.СМІРНОВА, В.К.УШАЎ

АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ ЦЭНТР ПА ВЫДАННІ
ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ ХРОНІК ПАМЯЦІ
МІНІСТЭРСТВА ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ:

Б.В.УЛЬЯНКА (кіраўнік цэнтра), У.І.ЛЕМЯШОНАК (галоўны рэдактар),
М.З.БАШЛАКОЎ (галоўны метадыст), Р.А.ЧАРНАГЛАЗАВА (рэдактар)

Мастак Э.Э.ЖАКЕВІЧ

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі В.А.РАГАЛЕВІЧА

ISBN 985-01-0455-4

© УП “Выдавецтва “Беларусь”, 2003

Помнік воінам-землякам у в. Кароцькі

14—10 тыс. г. да н.э.	Засяленне Пасожжа (стаянкі старажытнага чалавека ва ўрочышчах Бор, Грэнск, Узломы, Узлужжа, Уялец, Пральня)
5—3 тыс. г. да н.э.	Час першага буйнога грамадскага падзелу працы і станаўленне вялікіх племянных аб'яднанняў, шматлікіх пасяленняў на берагах Сажа

Вуліца Кастрычніцкая ў г.п. Карма

X—XII стст.	Першыя гарады. Кармяншчына ў складзе Чарнігаўскага княства
XIV—XV стст.	У складзе Вялікага княства Літоўскага
1569—1772 гг.	Кармяншчына ўвайшла ў склад Рэчы Паспалітай



Помнік адселеным вёскам у г.п. Карма

1691 г.	У пісьмовых крыніцах сустракаюцца звесткі пра м. Карма
1704 г.	Першыя звесткі пра вёскі Бярозаўка, Восаў, Струмень, Ліцвінавічы, Зяцькавічы, Вашчанкі, Кароцькі, Ворнаўка, Сапажкі

На возеры Сырскае

1772 г.	*Кармянскія землі пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай увайшлі ў склад Расійскай імперыі*
1777 г.	Мястэчка Карма ў выніку новага губернскага падзелу на паветы ўвайшло ў склад Рагачоўскага павета

Помнік-танк у г.п. Карма ў гонар воінскіх часцей, якія вызвалялі раён ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у лістападзе 1943 г.

1865 г.	У м. Карма адкрыліся мужчынскае і жаночае народныя вучылішчы
1903 г.	У м. Карма ўзнікла сацыял-дэмакратычная група
1905 г.	1 мая ў зенькавіцкім лесе па ініцыятыве сацыял-дэмакратаў праведзены першы мітынг жыхароў Кармы. Паліцыя арыштавала 14 чалавек. Шасцярых з іх суд прыгаварыў да турэмнага зняволення

Курганны могільнік каля в. Казімірава

1908 г.	У м. Карма пачаў дзейнічаць тэлеграф
1917 г., верасень	У в. Хізаў утвараецца самастойная "рэспубліка", якая не прызнала Часовы ўрад

Помнік Герою Савецкага Саюза М. Г. Калінкіну ў в. Ліцвінавічы

1917 г., лістапад	Улада ў мястэчку і воласці пераходзіць у рукі валаснога Савета
1918 г., восень	У в. Ліцвінавічы прыязджае П. М. Лепяшынскі і стварае там першую школу-камуну

У зоне адсялення пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС

1919 г., 25 лютага	У м. Карма ўспыхнуў контррэвалюцыйны мяцеж, у выніку якога былі па-зверску забіты член рэвалюцыйнага камітэта І. Г. Абатураў, работнікі міліцыі І. А. Ільюшчанка, Ф. М. Давыдзенка
1924 г., 17 ліпеня	Створаны Кармянскі раён

Кармянскі абрус

1929 г.	У раёне пачалася масавая калектывізацыя
1931 г.	У калгасе імя Будзённага з'явіўся першы ў раёне трактар. У Карме пабудаваны завод па апрацоўцы льноволакна
1933 г.	Даў першую прадукцыю Ворнаўскі торфазавод

Кармянскія ўзоры

1941 г., жнівень	Акупацыя Кармянскага раёна нямецка-фашысцкімі захопнікамі
1943 г., 20 лістапада	Тэрыторыя раёна вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў
1944 г., 25 лютага	Раённы сход камуністаў разгледзеў пытанне "Аб аднаўленні калгасаў і выкананні плана лесанарыхтовак"

Народны фальклорны калектыў "Спадчына"

1946—1950 гг.	Адноўлена работа ўсіх прамысловых прадпрыемстваў раёна
1952 г.	Узбуйненне калгасаў. 103 калгасы рэарганізаваны ў 28 буйных гаспадарак
1960-ыя гг.	У раёне створаны 8 саўгасаў
1975 г.	Дала першую прадукцыю птушкафабрыка "Сож"

Рака Сож

1983 г.	Кармянскі раён узнагароджаны Ганаровым дыплома ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКС
1990 г.	Адсяленне вёсак Васільеўка, Гарадок, Жавуніца, Залатаміно, Касцюкоўка, Курганне, Лабыроўка, Лазовіца, Салабута, Струмень, Хляўно, Ясень і інш у выніку забруджання радыенуклідамі пасля авары на Чарнобыльскай АЭС (1986 г.).

Кормянская центральная районная библиотека

Да чытача

Прыгажун Сож з яго маляўнічымі, парослымі лесам і хмызняком берагамі, лагоднай, ласкавай вадой — тая блакітная нітка, што знітавала палатно гісторыі раёна. Менавіта тут, на шматлікіх пагорках Пасожжа, сяліліся нашы старажытныя продкі дзесяткі стагоддзяў таму. Рака карміла і паіла іх, служыла надзейным шляхам зносін з блізкімі і далёкімі суседзямі. Памятае Сож і змрочныя часіны варожых нашэсцяў і войны, віхуры рэвалюцыйных і грамадзянскіх узрушэнняў. Кармяншчыну, хаця і знаходзіцца яна ўбаку ад скрыжаванняў вялікіх дарог, ніколі не абыходзілі больш-менш важныя падзеі, што пакінулі след у гісторыі беларускага народа.

У канцы красавіка 1986 г. значная тэрыторыя раёна, як і амаль усяго гомельскага Пасожжа, у выніку аварыі на Чарнобыльскай атамнай станцыі была забруджана радыенуклідамі, а частка яго жыхароў перaселена ў іншыя рэгіёны рэспублікі. Але, нягледзячы на вялікую бяду, працаўнікі раёна ўносяць свой пачэсны ўклад у станаўленне суверэннай Беларусі, свята захоўваюць лепшыя традыцыі старэйшых пакаленняў. Яскравы доказ таму гэта кніга. Яна аб кармянцах. Аб тых, хто бараніў Айчыну ў суровыя часы ваеннага ліхалецця і не вярнуўся да роднага парога, аддаўшы жыццё за свабоду і незалежнасць краю. Яна аб тых, хто ўзнаўляў народную гаспадарку, выхоўваў новае пакаленне, марыў аб лепшым жыцці. Яна аб чалавеку-змагару, чалавеку-працаўніку, чалавеку-пераможцу.

Кніга пабудавана на канкрэтных дакументах, успамінах непасрэдных удзельнікаў і відавочцаў тых ці іншых падзей, даследаваннях вучоных, краязнаўцаў-гісторыкаў, творах пісьменнікаў, артыкулах і замалёўках. Раённая камісія па падрыхтоўцы кнігі выказвае шчырую падзяку арганізацыям, установам і прыватным асобам, якія аказалі садзейнічанне ў зборы матэрыялу і выданні хронікі “Памяць. Кармянскі раён”.

Думаецца, што агульнымі намаганнямі ўдалося ў немалой ступені ўзнавіць забытыя старонкі гісторыі, устанавіць прозвішчы многіх загінуўшых землякоў, скласці мазаіку мінулага і сучаснага Кармяншчыны.

2. Зак. 522.



Кармянскі раён утвораны ў ліпені 1924 г. Плошча каля 0,9 тыс. кв. м. Населеных пунктаў 74, у тым ліку г. п. Карма, 10 сельскіх Саветаў. На 1.1.1999 г. у раёне пражывала 18,6 тыс. чалавек, у тым ліку ў г. п. Карма 6,3 тыс. чалавек.

Раён размешчаны на паўднёвай ускраіне Аршанска-Магілёўскай раўніны. Рэльеф раўнінна-ўзгоркавы. Хвалістыя раўніны чаргуюцца з хвалістымі ўзвышшамі і слаба ўвагнутымі нізінамі. Узвышшы і пластападобныя раўніны разрэзаны шматлікімі вузкімі і глыбокімі рачнымі далінамі, а месцамі ўскладняюцца ярамі і балкамі. У агульным плане паверхня раёна мае нахіл з поўначы на поўдзень.

Найбольш характэрныя карысныя выкапні: радовішча торфу агульнай плошчай 215 га і з запасамі 3 млн 200 тыс. куб. м торфу-сырцу каля в. Ворнаўка. У 1953 г. на тэрыторыі раёна на правым беразе р. Сож каля в. Студзянец знойдзены буйныя запасы мелу.

Сярэдняя тэмпература студзеня −6 °С, ліпеня 18,5 °С. Ападкаў выпадае прыкладна 550—600 мм у год, глеба прамярзае ў сярэднім на 45—52 см. З поўначы на поўдзень працякае р. Сож (левы прыток Дняпра) з прытокамі Касалянка, Струменка, Кармянка і інш. На ўсім

шляху працякання р. Сож па тэрыторыі раёна распасціраюцца вялікія пойменныя лугі, якія выкарыстоўваюцца пад сенакосы і выпасы. Па берагах ракі цягнецца даліна з надпойменнымі тэрасамі эпохі дняпроўскага абледзянення. У пойме р. Сож шмат невялікіх азёр, дзе водзіцца рыба і вадаплаўная птушка. Сож выкарыстоўваецца для сплаву лесу.

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС плошча сельгасугоддзяў раёна скарацілася з 61,9 тыс. га да 46,7 тыс. га; ліквідаваны 1 калгас і 1 саўгас. З зоны радыеактыўнага забруджання выселена каля 10 тыс. чалавек.

Якасная ацэнка глебаў: ворныя землі — 36 балаў, сельгасугоддзі — 35 балаў. Асноўныя землекарыстальнікі — 7 калгасаў і 7 саўгасаў. Лясны фонд складае 24,8 га.

У раёне налічваецца 6 прамысловых прадпрыемстваў, 14 сярэдніх, 1 базавая школа, 18 дашкольных устаноў, 20 бібліятэк, 23 клубныя ўстановы, дзіцячая музычная школа, філіял абласнога краязнаўчага музея, раённая бальніца, 3 урачэбныя амбулаторыі, 13 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, аптэка, 16 кінаўстановак. Выдаецца раённая газета "Зара над Сожам".

Кормянская центральная районная библиотека

Населеныя пункты Кармянскага раёна

Даныя на 1.1.2002 г.

Акцяброўскі сельскі Савет: вёскі Акцяброва, Косаль.

Барсукоўскі сельскі Савет: вёскі Барсукі, Бялёў, Навасёлкі, Рэвут, Сырская Буда, Тарахаўка.

Валынцаўскі сельскі Савет: вёскі Валынцы, Кляпін, Кляпінская Буда, Корсунь.

Ворнаўскі сельскі Савет: вёскі Ворнаўка, Вострая Карма, Высокае, Добрыч, Енцы, Іванаўка; пасёлкі Каўказ, Рудня.

Каменскі сельскі Савет: вёскі Бярозаўка, Каменка, Кучын, Лебядзёўка, Янаўка; пасёлкі Бор, Пакроўскі.

Кароцькаўскі сельскі Савет: вёскі Багданавічы, Востраў, Вынашаўка, Кароцькі, Куракаўшчына, Новая Зенькавіна, Сапажкі, Старая Зенькавіна, Сырск, Сямёнаўка.

Ліцвінавіцкі сельскі Савет: вёскі Вашчанкі, Дубравіна, Зяцькавічы, Казімірава, Ліцвінавічы, Паштовая Глінка, Рудня, Студзянец; пасёлкі Вазнясенск, Дубролеж, Касаляцкі, Мікольск.

Лужкоўскі сельскі Савет: вёскі Аляксандраўка, Жабін, Лужок, Расохі, Скартынь; пасёлак Чамушаль.

Стараградскі сельскі Савет: вёскі Бераставец, Задуб'е, Лубянка, Пасека-Слабодка, Пятравічы, Стараград, Хізаў.

Струкачоўскі сельскі Савет: вёскі Баравая Буда, Гарадок, Дубавіца, Коласава, Лесавая Буда, Матораўка, Міхалёўка, Норкаўшчына, Праўда, Струкачоў, Шаламеі, Шэрахаўская Буда.

Населеныя пункты Кармянскага раёна, якія не існуюць

Акцяброўскі сельскі Савет: вёскі Косальскі Прудок*, Курганне*; пасёлак Забалоцкае*.

Валынцаўскі сельскі Савет: вёскі Дубраўка, Жавуніца*, Калюды*, Ясень*.

Ворнаўскі сельскі Савет: вёска Халапаўка; пасёлак Ратнік.

Залатамінскі сельскі Савет: вёскі Баравая Глінка*, Воеўка*, Залатаміно*, Касцюкоўка*, Лабыроўка*, Салабута*, Слабада*, Хляўно*; пасёлкі Бакунава*, Ленінскі, Луначарскі*.

Кароцькаўскі сельскі Савет: вёскі Бервяны*, Гарадок*, Добрыч, Новая Халапаўка, Рассвет, Старая Халапаўка; пасёлкі Бурны*, Красны Бор*, Луг*.

Ліцвінавіцкі сельскі Савет: вёска Барысаўка; пасёлак Першая Ступень*.

Лужкоўскі сельскі Савет: пасёлкі Асінаўка, Замошша.

Стараградскі сельскі Савет: пасёлкі Арэшнік, Машанаўка.

Струкачоўскі сельскі Савет: вёска Дубраўка; пасёлкі Жданаў, Круглы, Крывы Рог, Лозкі.

Струменскі сельскі Савет: вёскі Васільеўка*, Восаў*, Данізаўка*, Курганіца*, Лазовіца*, Малашкі*, Малянік*, Мінчукі, Струмень*, Труд*; пасёлак Бель.

---

* Населеныя пункты, адселеныя ў 1990 – 1991 гг. і знятыя з уліку ў сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС.

Кармянская цэнтральная раённая бібліятэка

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

1917

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ

З глыбіні тысячагоддзяў

Паводле археалагічных звестак, тэрыторыя сучаснай Гомельшчыны, у тым ліку і Кармянскага раёна, заселена чалавекам каля 100 тысяч гадоў таму. Гэта былі першабытныя плямёны паляўнічых. Яны ішлі з поўдня і паўднёвага ўсходу і рассяляліся ў асноўным па басейнах рэк.

Каменны век. Кармяншчына здаўна лічыцца багатай на крамянёвую сыравіну. Гэтыя камяні рассыпаны па палях і агаленнях берагоў, сустракаюцца ў мелавых адкладах і выходзяць на паверхню ў выглядзе пластоў. Залягае крамянёвая сыравіна блізка да паверхні, а дзе-нідзе і проста выходзіць на паверхню, асабліва там, дзе ёсць мелавыя адклады. Гэты фактар абумовіў шчыльнае засяленне тэрыторыі раёна ў старажытнасці. Урадлівыя глебы, багатыя на дзічыну лясы, на рыбу вадаёмы таксама спрыялі прытоку насельніцтва ў гэтыя мясціны. Калі ўпершыню чалавек прыйшоў на гэтую зямлю — сказаць цяжка. Вучоныя лічаць, што гэта магло здарыцца ў адзін з міжледавіковых перыядаў. Як вядома, ледавіковых эпох на Беларусі было не менш як пяць, кожны наступны ледавік як нажом здымаў паверхню зямлі і знішчаў усе сляды папярэдняга існавання чалавека.

Калі больш раннія пранікненні чалавека на нашу зямлю можна толькі ўявіць сабе гіпатэтычна, то засяленне ў перыяд апошняга муравінскага міжледавікоўя мае некаторыя доказы. Менавіта тады (110—95 тыс. гадоў таму) першабытныя паляўнічыя дасягнулі 55° паўночнай шыраты. Гэта быў час мусцьерскай культуры, калі неандэртальцы — стваральнікі гэтай культуры — пакінулі на тэрыторыі Заходняй Еўропы звыш 600 стаянак.

Знойдзеныя на тэрыторыі Беларусі скрэблы і паляўнічыя прылады па спосабу апрацоўкі і форме вельмі нагадваюць вырабы неандэртальцаў (Быхаўскі, Чачэрскі і Веткаўскі раёны).

Бясспрэчна, чалавек дасягнуў зямлі Беларусі ў верхнім палеаліце, калі крамаиьёнцы, людзі, якія па сваіх фізічных даных нічым не адрозніваюцца ад нашага сучасніка, дайшлі да берагоў Прыпяці (в. Юравічы ў Калінкавіцкім раёне) і Сажа (в. Падлужжа ў Чачэрскім раёне). Ля Падлужжа, зусім побач з нашым раёнам, археолагі знайшлі Бердыжскую стаянку — паселішча з рэшткамі жытлаў з касцей маманта — і каля тысячы прылад працы і адыходаў крамянёвай вытворчасці. Дзякуючы сучасным метадам удалося высветліць, што ўзрост помніка — 23 тысячы гадоў. Некаторыя вырабы з Бердыжа маюць настолькі прыкметныя своеасаблівасці апрацоўкі, што іх ні з чым не зблытаеш.

Падчас раскопак ля Струменя, ва ўрочышчы Лоша, давялося сустрэць нож, які быў вельмі падобны на бердыжскі. Здаецца верагодным, што менавіта тады, напярэдадні максімальнага наступу апошняга валдайскага абледзянення (18—17 тыс. гадоў таму), чалавек наведаў Кармяншчыну. Не выключана, што археолагам удасца знайсці адрэшткі яго дзейнасці ў тагачасны перыяд на нашай зямлі.

Далей у летапісу засялення Беларусі існуе белая пляма. Ледзяны подых з поўначы (а ледавік дасягнуў мяжы Паазер'я) быў настолькі моцным, што стаянак гэтага часу не знойдзена і на суседніх тэрыторыях.

У пасляледавіковы час на Пасожжы распаўсюдзіліся плямёны, стварыўшыя грэнскую культуру (названа па адпаведнаму помніку ва ўрочышчы Грэнск, што каля в. Ворнаўка Кармянскага раёна).

Упершыню аб гэтым помніку загаварылі яшчэ ў 1930-ыя гг., калі ў 1 км на ўсход ад Ворнаўкі беларускі археолаг К. М. Палікарповіч знайшоў значную колькасць прылад працы з крэменю. Адметнай рысай сабранага з паверхні раздзьмутых пяскоў комплексу была наяўнасць наканечнікаў стрэл з бакавой выняткай. Выявілася таксама вядучая роля адшчэпаў, а не пласцін для выпрацоўкі прылад.

Тут трэба растлумачыць, што азначаюць гэтыя тэрміны. Перш чым зрабіць прыладу, неабходную ў гаспадарцы (наканечнікі стрэл і дзідаў, нажы і скрабкі, скоблы і скрэблы, сякеры і цёслы, долаты і свярдзёлкі, праколкі і разцы і інш.), чалавек шукаў прыдатныя акруглыя ці падоўжаныя крамянёвыя жаўлакі. Моцным ударам ён адсякаў адзін ці некалькі кавалкаў і атрымоўваў так званую ўдарную пляцоўку. Націскаючы на яе краі, ён пачынаў, нібыта аловак, абстругваць камень па перыметры. У выніку атрымліваліся падоўжаныя, правільна агранёныя кавалкі, якія археолагі назвалі пласцінамі, ці няправільнай формы розных памераў абломкі, так званыя адшчэпы. У далейшым з дапамогай другаснай апрацоўкі, рэтушавання, здымаючы маленькія лусачкі з краёў вырабаў, дасягалі патрэбнай і зручнай формы, завастралі ці прытупплялі краі, рабілі, калі патрэбна, чарашок, выняткі і іншае, каб зрабіць рэч дасканалай і зручнай.

Ля вытокаў археалагічных доследаў на тэрыторыі Верхняга Падняпроўя, куды адносіцца і Кармяншчына, у дарэвалюцыйны і даваенны час працавалі Е.Р. Раманаў і Н.Ф. Беляшэўскі, К.М. Палікарповіч, у пасляваенны час — І. І. Арцёменка, І. М. Цюрына, У. Дз. Будзько. У апошнія дзесяцігоддзі раскопкі на Кармяншчыне праводзілі А. Г. Калечыц і В. Ф. Капыцін. Ёсць у раёне і шмат аматараў-краязнаўцаў, якія закаханы ў сваё Пасожжа і аказваюць вялікую дапамогу ў захаванні спадчыны.

Грэнскія плямёны і іх нашчадкі, стварыўшы сожскую культуру, у час фінальнага палеаліту (14—10 тысячагоддзяў таму) і пазней, у мезаліце (сярэдні каменны век, які доўжыўся да 6-га тысячагоддзя), пакінулі на тэрыторыі раёна некалькі помнікаў. Гэта ў першую чаргу наваколле Ворнаўкі (урочышча Бор, Грэнск), Касцюкоўкі (Міхееўкі) (урочышчы Узломы, Узлужжа), Ліцвінавіч (урочышча Цялец), Васільеўкі (урочышча Пральня). З адзначаных мезалітычных помнікаў раскопваўся толькі Грэнск.

Неаліт (новы каменны век). Больш шчыльна была заселена Кармяншчына ў эпоху неаліту (канец 5-га — пачатак 2-га тысячагоддзя да н.э.), калі жыхары Пасожжа навучыліся ляпіць гліняны посуд. Гэтая фармальная знешне адзнака і паслужыла прыкметай для выдзялення прынцыпова новай стадыі ў развіцці першабытнага грамадства. Бо на самай справе гэта быў надзвычай важны момант у гісторыі — час першага буйнога грамадскага падзелу працы і станаўлення вялікіх племянных аб'яднанняў.

Тэрыторыю Кармяншчыны, як і ўсё Пасожжа, у тыя часы насялялі плямёны верхнедняпроўскай культуры. Каранямі яна ўваходзіць у мясцовы мезаліт, а ў плане гістарычных лёсаў — далёка на поўнач, на Валдай. На берагах Сажа і яго прыто-

Кармянская цэнтральная раённая бібліятэка

каў, на тэрасах і пагорках поймы ля старарэччаў і ціхіх заток засталіся шматлікія помнікі той пары. Толькі ў межах раёна яны вядомы ля могілак былой в. Бярвена і ва ўрочышчы Мельнікаў Луг і Пральня ля Васільеўкі, вакол в. Валынцы (урочышчы Леднік, Зарэчча, Лагі, Алес), ля былога хутара Астраўніца, каля Ворнаўкі (урочышча Бор, паўночны бераг ручая Падобчага), ва ўрочышчы Скала і Сярэдняе ля Вынашаўкі; на правым беразе ракі Добрыч ва ўрочышчы Падмаскаўшчына і Вышняя Бабравіна, што ля в. Высокае; паблізу ад в. Данізаўка, ва ўрочышчы Круглая і Белая Грывы і Похалаць; ля в. Жавуніца, каля возера Цішычы (урочышча Макеенкава Грыва) і інш. Неалітычныя паселішчы і рэшткі мезаліту засталіся ля в. Касцюкоўка (Міхееўка) ва ўрочышчы Узломы і Узлужжа. Знойдзены яны і ля былой в. Ланіца, на беразе ракі Дзеражывелі, ва ўрочышчы Узвалле. Рэшткі неаліту ёсць ля Ліцвінавіч (урочышча Цялец); ля былой в. Млынок на заходнім беразе возера Бярозкі; ля вусця ракі Кармянкі, у 1 км на ўсход ад в. Новая Зенькавіна; на паўднёва-ўсходняй ускраіне былога хутара Астраўніца; ва ўрочышчы Барок ля Паштовай Глінкі; у наваколлі в. Прыбар (урочышчы Хвашчы і Цішычы), вакол в. Струмень (урочышчы Біручыха, Жыдоўка, Ліпіца, Лоша, Нараг, Падсёлы, Трыслівец).

Гэта толькі частка з вядомых нам і папярэдне датаваных помнікаў. Ёсць яшчэ шмат знойдзеных, але дакладна не вывучаных паселішчаў, узрост якіх невядомы, бо пры паверхневых зборах не было выразных рэчаў, якія б указвалі на прыналежнасць да каменнага ці бронзавага вякоў. Такія помнікі ёсць ля Вынашаўкі, на паўднёвы ўсход ад вёскі; на поўнач і паўночны ўсход ад в. Высокае; на мысе, які ўтвараецца паміж правым берагам Сажа і ракі Касалянкі, пры іх сутоцы недалёка ад Ліцвінавіч, як і ва ўрочышчах Ступішча, Белая Гара, Бабінец і інш. Магчыма, падчас раскопак і тут будуць знойдзены рэшткі паселішчаў насельніцтва верхнедняпроўскай культуры.

Так здарылася, што з усяго мноства пералічаных помнікаў шырокія раскопкі былі праведзены ў васьмідзесятых гадах толькі ў наваколлі Струменя. Вынікі аказаліся настолькі ўразлівыя, што неабходнасць працягваць вывучэнне гэтага рэгіёна здавалася відавочнай. Але чарнобыльская трагедыя на многа год спыніла працу. Забруджаны самыя каштоўныя ў гістарычным плане мясціны, у тым ліку і наваколле Струменя. Сёння ўвага вучоных павернута менавіта да тых матэрыялаў, якія апынуліся ў распараджэнні археолагаў.

На заходнім беразе возера-старыцы Аўчыннікава Калюга, ва ўрочышчы Біручыха, што знаходзіцца ў 0,2 км на захад ад в. Струмень, яшчэ ў 1927 г. К. М. Палікарповіч знайшоў рэшткі старажытнага паселішча. І. І. Арцёменка, які ў 1962 г. зрабіў спробу маленькіх раскопак, прыйшоў да высновы, што мае справу з неалітам. Далей працягваць раскопкі ён не стаў, таму што даследаваў галоўным чынам помнікі наступнай па часе бронзавай эпохі. Толькі ў 1976 г. даследчыкі зноў вярнуліся ў гэтыя мясціны. У раскопе плошчай 188 $м^2$ знойдзена звыш 1300 вырабаў з крэменю, у тым ліку звыш 200 закончаных прылад і больш за 600 кавалкаў ляпнога посуду, які быў вылеплены ў неаліце і бронзавым веку. Гэта значыць, што ва ўрочышчы Біручыха чалавек сяліўся па меншай меры двойчы. Большасць знаходак была сканцэнтравана ля трох вогнішчаў адкрытага тыпу, не абкладзеных камянямі. Сярод іх — нажы і наканечнікі стрэл, скрабкі і скоблі, сякеры, цёслы, праколкі, свярдзёлкі, разцы і іншыя рэчы, з дапамогай якіх тубыльцы рабілі ўсё неабходнае ў гаспадарцы.

Матэрыялы неаліту адрозніваюць ад іншых у першую чаргу па посуду, яго форме, складу цеста і арнаментацыі. Верхнедняпроўскія плямёны рабілі разнастайны посуд, але, параўноўваючы гаршкі, можна адзначыць, што найбольш



Венцы неалітычных пасудзін;
в. Струмень, урочышча Лоша

характэрнымі на раннім этапе неаліту былі таўстасценныя пасудзіны з прамым ці крыху адагнутым венцам і тоўстым вострым дном. Дыяметр такіх пасудзін у сярэднім складае 30–40 см, вышыня не больш за 40 см. У цеста клалі шмат раслінных дамешак, якія выгаралі і пакідалі адметныя сляды. Першыя гаршкі былі рыхлыя, слабаабпаленыя. Арнаментацыя зводзілася да нанясення неглыбокіх ямак ці наколаў грабёнкай. Звычайна ўпрыгожвалі верхнюю і прыдонную часткі посуду. Выляплялі посуд шляхам кальцавога налёту гліняных стужак шырынёй 6–8 см. На развітым і познім этапах абпал стаў лепшым, пасудзіны больш тонкімі, трывалымі і разнастайнымі. Найбольш пашыранымі сталі шыракагорлыя, прамасценныя, звужаныя да дна або востардонныя, злёгку пакатыя з адагнутым венцам, а таксама акругладонныя, нізкія, з крыху адагнутым венцам пасудзіны.

У якасці арнаментацыі выкарыстоўваліся трубчастыя косткі дробных жывёл і птушак, рэбры, якія пакідалі полыя круглыя ці маладзіковыя адбіткі, ракушкі. Узоры наносілі канцом завостранай галінкі, пяром птушкі, вуглом дошчачкі, канцом размачаленай ці абвітай шнурочкам палачкі. Іншы раз у ход ішлі проста рукі майстра, які пальцамі рабіў зашчыпы ці пазногцямі наносіў наколы. З цягам часу арнаментацыя ўскладнілася. З дапамогай адзначаных прадметаў чалавек наносіў звыш 100 розных элементаў, складаў звыш 130 матываў, якія ўтваралі сістэмы. Узоры былі гарызантальнымі і вертыкальнымі, дыяганальнымі і рамбічнымі, трохкутнымі, лукаткавымі, шахматнымі і інш. Пры ўсёй разнастайнасці спосабаў упрыгожвання адметнай рысай посуду бы-

Фрагменты сценак неалітычных пасудзін;
в. Струмень, урочышча Лоша

Кармянская цэнтральная раённая бібліятэка



Дны неалітычных пасудзін;
в.Струмень, урочышча Лоша

600 м². Удалося знайсці 4 жытлы (1 неалітычнае і 3 ранняга бронзавага веку), 19 гаспадарчых ям, 15 вогнішчаў і 3 грунтовыя пахаванні бронзавага веку. Што тычыцца ям і вогнішчаў, то ўзрост іх часам вызначыць даволі цяжка. У жытлах жа маюцца гаршкі, якія засталіся на падлозе і прастаялі там, куды іх паставіў чалавек, тысячагоддзі. На раскопе паднята каля 10 тыс. вырабаў з крэменю і звыш 7 тыс. фрагментаў посуду.

Яшчэ больш ўразлівыя матэрыялы атрыманы пры вывучэнні бліжэйшай да вёскі часткі ўрочышча. На плошчы 2332 м² знойдзена 37 вогнішчаў, 5 неалітычных жытлаў і 42 гаспадарчыя ямы, звыш 38 тыс. вырабаў з крэменю, а фрагментаў посуду каля 35 тыс. Менавіта тут даследчыкі прыйшлі да высновы, што найбольш устойлівым тыпам неалітычных жытлаў з'яўлялася круглая паўзямлянка з адкрытым во-

Прылады працы з крэменю;
в. Струмень, урочышча Лоша

ло ўжыванне трох галоўных элементаў: грабенчатага штампа, ямкавага рознай формы (іх спалучэнням) і лапчастага (адбіткі шнура ці тканіны).

Адзначаныя прыкметы былі ўласцівыя ўсім неалітычным матэрыялам струменскіх помнікаў. Па іх ўстаноўлены ўзрост знаходак.

Прыкладна ў 0,5 км на поўнач ад Аўчыннікавай Калюгі знаходзіцца пясчанае ўзвышша Лашыная Грыва, ці проста Лоша. Там былі разгорнуты галоўныя работы. Найбольш высокая кропка мае перавышэнне над вадой каля 4 м. Плошча Лашынай Грывы вельмі значная, яна знаходзіцца паміж рэчышчамі рэк Сож і Струменка. У розных канцах узвышша былі праведзены два самастойныя раскопы, якія далі надзвычай цікавы, рознасаставы і разнастайны матэрыял.

На больш аддаленай ад Струменя частцы Грывы, якая да таго ж і больш узвышана, было раскапана больш за



Стрэлы, наканечнікі коп'яў розных форм і памераў, колючыя прыстасаванні, нажы і сякеры. Бронзавы век; в. Струмень, урочышча Лоша

гнішчам унутры. Дыяметр яе вагаўся ад 2,2 да 3,8 м, плошча ад 4 да 12 м^2. У такіх дамах магла існаваць парная сям'я.

Склад прылад амаль не адрозніваўся ад вышэйпералічаных. Пры гэтым былі рэдкімі адзінкавыя знаходкі, як, напрыклад, тыповы толькі для верхнедняпроўскай культуры посуд, арнаментаваны з двух бакоў, які, відавочна, выконваў ролю рытуальнага.

У пачатку 2-га тысячагоддзя да н.э. на ўсім Пасожжы, у тым ліку і на кармянскай зямлі, рассяляліся плямёны так званых "шнуравікоў", са з'яўленнем якіх на велізарных прасторах Еўропы адбыліся значныя перамены. У лік культур са шнуравой керамікай (упрыгожанай адбіткамі шнура) і баявымі сякерамі ўваходзіць і сярэднедняпроўская. Рэшткі дзейнасці менавіта гэтага насельніцтва складалі частку знаходкі ля Струменя.

Носьбіты культур шнуравой керамікі актыўна займаліся земляробствам і жывёлагадоўляй. Узаемаадносіны гэтых прышлых плямёнаў з тубыльцамі, перабудова ў грамадскім жыцці і ідэалогіі этнічна розных груп склалі галоўную сутнасць гістарычнага працэсу ў бронзавым веку. Эканамічныя сувязі паміж прышэльцамі і мясцовым насельніцтвам увесь час узмацняліся і прывялі да істотных змен у бок вытворчай гаспадаркі. Бурнымі тэмпамі працякалі этнічныя працэсы, узніклі новыя этнічныя аб'яднанні. Першабытнаабшчынны лад уступіў у стадыю разлажэння.

На паселішчах Лошы, як і на Біручысе, значная частка матэрыялаў належыць сярэднедняпроўцам. Можна лёгка заўважыць, як удасканальвалася тэхніка апрацоўкі паверхні прылад. З'явіліся новыя тыпы рэтушы, у тым ліку струменістая, калі рэч апрацоўвалася з дапамогай тонкіх доўгіх лусачак. Так ап-



Рэканструкцыя верхніх частак пасудзін. Бронзавы век (сярэдні перыяд); наваколле в. Струмень

Кармянская цэнтральная раённая бібліятэка



Рэканструкцыя пасудзін і іх верхніх частак. Бронзавы век (ранні перыяд); наваколле в. Струмень

рацоўвалі дзіды, наканечнікі стрэл, сярпы, нажы, асабліва рыбныя. А іх з'явілася шмат, таму што, пачынаючы з неаліту, доля рыбалоўства ў гаспадарцы пашыралася.

Бронзавы век. У бронзавым веку чалавек навучыўся апрацоўваць металы і рабіць з іх прылады, асабліва сякеры. Адсутнасць руд каляровых металаў адна з прычын таго, што старажытныя вырабы з іх вельмі рэдка сустракаюцца на помніках Беларусі. На ўсім Пасожжы іх знойдзена не больш за 30. Прылады і ўпрыгожванні, якія знойдзены ў могільніках, на думку вучоных, зроблены з прывазнога металу ці ў гатовым выглядзе прывезены з Каўказа альбо Карпат. Такім чынам, мясцовая бронзаліцейная прамысловасць калі і існавала, дык трымалася на пераапрацоўцы гатовых зліткаў. Падчас раскопак на помніках бронзавага веку Кармяншчыны, на жаль, прылад з металу не знойдзена.

Жытлы нашых продкаў уяўлялі прамавугольныя паўзямлянкі (памеры ў сярэднім 3,5 х 4,5 м) з вогнішчамі, зробленымі ў паглыбленні падлогі. Датуюць жытлы шліфаваныя сякеры, нажы, зробленыя ў манеры сярэднедняпроўцаў, а галоўнае — посуд, які быў знойдзены ва ўсіх трох жытлах. Блізкасць роду заняткаў з'яўлялася прычынай таго, што паселішчы насельніцтва і верхнедняпроўскай, і сярэднедняпроўскай культур вельмі часта супадалі.

Пахавальны абрад у сярэднедняпроўскіх плямён быў надзвычай разнастайным. У пазнейшыя часы невядома спалучэнне такога мноства абрадаў. Хавалі нябожчыкаў пад курганнымі насыпамі і ў грунце, шляхам трупапалажэння і трупаспалення. У грунце па абраду трупаспалення былі пахаваны нябожчыкі на месцы паселішча Лоша-1. Магчыма, два з пахаванняў адначасовыя, бо знаходзіліся амаль побач і былі абсалютна ідэнтычныя, у выглядзе цьмяных плям авальнай формы на глыбіні 0,4 м. Глыбей (0,8—0,9 м ад паверхні) знойдзены круглыя

Археалагічныя раскопкі ва ўрочышчы Лоша; в. Струмень

пласкадонныя гаршкі, кавалачкі абпаленых касцей, трохкутныя наканечнікі стрэл.

Выяўлены яшчэ адзін цудоўны помнік ля Струменя — урочышча Нараг. Яно знаходзіцца ў 0,5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі. Кожны, хто ідзе з парома цераз Сож берагам, абавязкова праходзіць побач. Сотні пакаленняў прайшлі тут за вякі і нават не падазравалі, што пад зямлёй ляжаць скарбы сівой мінуўшчыны. Культурны пласт (слой зямлі, які ўтрымлівае рэшткі жыццядзейнасці чалавека) распаўсюджаны на плошчы амаль 2500 м^2, але перакрыты зверху паўметровай тоўшчай супесі.

Месца для паселішча было абрана вельмі выгаднае — на мысе, які ўтвараюць рэчкі Струменка і Старарэчча.

У раскопе плошчай амаль 500 м^2 знойдзена 7 ям рознай формы і памераў, 2 вогнішчы, звыш 5 тыс. крамянёвых вырабаў і каля 6 тыс. фрагментаў ляпнога посуду. На паўночнай ускраіне ўрочышча знойдзена некалькі цэлых гаршкоў, зробленых сярэднедняпроўскім майстрам, частка іх была пастаўлена ўверх дном. Але магільных плям, кальцыніраваных костак нідзе не знайшлі. Пасудзіны бронзавага веку пласкадонныя высокія і кругладонныя танкасценныя. Упрыгожаны ля краю венца сістэмай звісаючых уніз трохкутнікаў, якія ўтвораны з дапамогай наразных ліній і адбіткаў перавітага шнура.

Менавіта на помніках ля Струменя ўпершыню знойдзены і адноўлены некаторыя канструкцыйныя асаблівасці неалітычных жытлаў, яма-пограб у падлозе, дзе майстры выраблялі прылады працы, спецыялізаваныя цэнтры па апрацоўцы крэменю і вырабу посуду, рабочыя месцы майстра, рытуальны посуд з двухбаковай арнаментацыяй. Размешчаныя ў цэнтры арэала верхнедняпроўскай культуры, гэтыя помнікі даюць уяўленне аб сутнасці і змесце гэтай культуры. Відавочна, што насельніцтва мела кантакты з суседзямі як заходнімі, так і ўсходнімі. У іх запазычаны некаторыя арнаментальныя матывы (наколы канцом адступаючай лапаткі; ромбаямкавы арнамент; круглыя глыбокія ямкі, нанесеныя вертыкальна да паверхні, так што на адваротным баку атрымліваліся пагорачкі — негатывы наколаў).

Яскравымі доказамі наяўнасці ў сярэднедняпроўскіх плямён земляробства і жывёлагадоўлі з'яўляюцца знаходкі на паселішчах і ў могільніках костак буйной і дробнай рагатай жывёлы, коней, свіней, а таксама матык, зерняцёрак, адбіткаў зерня на сценках посуду.

Больш дасканалай стала зброя. Маёмасная няроўнасць парадзіла ўзброеныя сутычкі. Дзеля высвятлення адносін маглі ўжываць і свідраваныя (баявыя) сякеры, альбо, як іх у народзе называлі, "грамавыя стрэлы". Больш "злымі" зрабіліся і наканечнікі стрэл. Трохкутныя з шыпамі сведчаць аб мэце нанесці больш балючую і цяжкую рану.

У сярэдзіне 2-га тысячагоддзя да н.э. Пасожжа засялілі плямёны сосніцкай культуры (сярэдні бронзавы век). Гэтае насельніцтва вырабляла прынцыпова іншы посуд. Пасудзіны мелі галоўным чынам цюльпана- і слоікападобную формы. Яны былі пласкадоннымі з шырокім горлам і тулавам, якое звужалася да дна. Зрэдку арнаментавалася ўся паверхня гаршка, часам толькі верхняя яго частка. Пад венцам зноў з'явіўся ланцужок цыліндрычных наколаў, зусім як у неаліце.

Адным з асноўных элементаў арнаменту былі адбіткі кропачнага і ружанцовага штампа, зрэдку шнура ці буйнога грэбеня. Сярод крамянёвых вырабаў у гэты час найбольш адметнымі сталі сэрцападобныя наканечнікі стрэл з чарашком. Такія вырабы часам сустракаліся і на ўскрытых помніках Пасожжа.

Позні перыяд бронзавага веку не толькі на Кармяншчыне, але і ў Пасожжы ўвогуле вывучаны вельмі слаба, і асвятліць гісторыю насельніцтва той пары пакуль немагчыма.

А. Г. Калечыц

Кормянская центральная районная библиотека

Асноўныя археалагічныя помнікі раёна

ВЁСКА БАГДАНАВІЧЫ,
Кароцькаўскі сельсавет

Курганны могільнік. За 1,5 км на паўднёвы захад ад вёскі 7 курганоў дыяметрам 10—12 м, вышынёй да 1,5 м. Вядомы з 1873 г. У 1976 г. даследаваў В. І. Шадыра. Раскопкі не праводзіліся.

ВЁСКА БЯРОЗАЎКА,
Каменскі сельсавет

Курганны могільнік. За 1,5 км на поўдзень ад вёскі, справа ад дарогі на в. Пакроўск 3 курганы вышынёй 1; 2,7 і 3,5 м, дыяметрам 6,5—10 м. Вядомы з 1873 г., даследаваны ў 1976 г. В. І. Шадырам. Раскопкі не праводзіліся.

ПАСЁЛАК ВАЗНЯСЕНСК,
Ліцвінавіцкі сельсавет

Гарадзішча. Мясцовая назва Гарадок. За 0,3 км на поўдзень ад пасёлка, на правым беразе ракі Вілянка (левы прыток ракі Сож). Вядома з 1873 г. Даследавалі ў 1956 г. В. М. Мельнікоўская, у 1957 г. В. І. Шадыра. Пляцоўка авальная, памерам 60 х 45 м. З паўднёвага захаду і захаду забалочаны поплаў. З поўдня і паўднёвага ўсходу гарадзішча абмежавана глыбокім ярам, з поўначы і паўночнага ўсходу ўмацавана трыма валамі і равамі. Вышыня валоў 1,8—2 м, глыбіня равоў 2 м. Унутраны вал на ўсходняй частцы вышынёй 3 м насыпаны на краі пляцоўкі. Знойдзена кераміка. Адносіцца да мілаградскай культуры ранняга жалезнага веку, датуецца VII ст. да н.э. — III ст. н.э. Матэрыялы даследавання захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

ВЁСКА ВАЛЫНЦЫ,
цэнтр сельсавета

Селішча. За 3,5 км на поўдзень ад вёскі. Займае мыс левага размытага берага ракі Сож. Памеры 125 х 100 м. Вышыня схілаў з усходняга боку 2,5 м, з паўночнага — 2,6 м, з заходняга — 3,8 м. Адкрыў і даследаваў у 1910 г. Е. Р. Раманаў, даследаваў у 1976 г. В. І. Шадыра. Культурны пласт у абрывах 0,25 м. Раскопкі не праводзіліся.

Курганны могільнік. За 3,5 км на поўнач ад вёскі, на высокім левым беразе ракі Сож, за 0,6 км на паўночны ўсход ад прыстані Прыбар, ва ўрочышчы Курганне. 38 насыпаў вышынёй 0,4—2 м, дыяметрам 6—10 м. Адкрыў і даследаваў у пачатку XX ст. Е. Р. Раманаў, даследавалі ў 1928 г. К. М. Палікарповіч, у 1976 г. В. І. Шадыра. Раскопкі не праводзіліся.

ВЁСКА ВАСІЛЬЕЎКА,
Струменскі сельсавет

Паселішча. За 0,5 км на паўночны ўсход ад вёскі, каля старыцы возера Пральня. Займае невысокае (1,5 м над поймай) узвышша, выцягнутае ўздоўж паўночнага берага возера на 80 м. Выявіў у 1927 г. К. М. Палікарповіч, даследавала ў 1975 г. А. Г. Калечыц. Культурны пласт каля 0,1 м. Знойдзены крамянёвыя адшчэпы, пласцінкі, праколкі, скрабкі, скрэблы, сякерападобныя прылады працы. Адносіцца да эпохі мезаліту. Датуецца 8—4-ым тысячагоддзем да н.э. Матэрыялы даследавання захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

ВЁСКА ВОРНАЎКА,
цэнтр сельсавета

Гарадзішча. За 1,5 км на поўдзень ад вёскі, ва ўрочышчы Грэнск, на правым высокім беразе ракі Сож. Пляцоўка авальнай формы, памерам 66 х 73 м. З паўночна-заходняга боку ўмацавана дугападобным валам даўжынёй 85 м, вышынёй 2,5 м. З паўднёвага і паўднёва-заходняга боку прасочаны 2 валы даўжынёй 30—40 м, шырынёй 4—6 м і равы глыбінёй 0,4—0,6 м. Вядомы з канца XIX ст. Даследавалі ў 1936 г. А. М. Ляўданскі і А. Дз. Каваленя, раскапана 220 м^2 плошчы. У культурным пласце 0,5—1 м выяўлены ляпная кераміка, праслiцы, падвеска, касцяная іголка, 2 ліцейныя формы, бронзавыя кольцы, жалезная сякера-

кельт. Прасочаны 2 каменныя агнішчы, а таксама месцы плаўкі жалеза. Даследавалі ў 1957 г. В. М. Мельнікоўская, у 1969 г. У. Дз. Будзько і Е. А. Шмідт, у 1975 г. В. І. Шадыра. Адносіцца да мілаградскай і зарубінецкай культур ранняга жалезнага веку, датуецца VII–VI стст. да н.э. – II ст. н.э. Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

ВЁСКА ДУБАВІЦА,
Струкачоўскі сельсавет

Гарадзішча. За 1 км на паўночны ўсход ад вёскі, за 0,1 км справа ад дарогі на в. Расохі, на мысе правага берага ракі Горна. Пляцоўка авальная, памерам 33 х 30 м, вышыня над поймай ракі 12 м. З паўночнага, усходняга і паўднёвага бакоў прасочаны вал вышынёй 2 м і роў глыбінёй 2,5 м. З паўночнага боку знаходзіцца ўезд на пляцоўку ў выглядзе перамычкі рова шырынёй 2,5 м. З поўдня і паўднёвага ўсходу каля асновы вала праходзіць траншэя часоў Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг. Гарадзішча вядома з 1873 г. Даследаваў у 1976 г. В. І. Шадыра. Культурны пласт 0,4 м. Раскопкі не праводзіліся.

ВЁСКА ЗАЛАТАМІНО,
цэнтр сельсавета

Гарадзішча. За 0,5 км на паўночны захад ад вёскі, на правым беразе безыменнага ручая, прытока ракі Сож. Займае высокі ўчастак берагавой тэрасы (вышыня над поймай 6–7 м). Помнік добра захаваўся. Пляцоўка круглая, дыяметрам 25 м, умацавана 2 падкавападобнымі валамі і равамі. Вышыня ўнутранага вала 2,5–3 м, вонкавага 1–1,5 м. Глыбіня равоў 5 і 1 м. З паўднёвага боку пляцоўка прымыкае да абрыву тэрасы. Даследаваў у 1981 г. С. Я. Расадзін. У 2 шурфах памерам 1 х 1 м выяўлены культурны пласт 0,3 м, у якім знойдзены фрагменты ляпной керамікі. Матэрыялы даследавання захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

ВЁСКА ЗЯЦЬКАВІЧЫ,
Ліцвінавіцкі сельсавет

Гарадзішча. За 1,5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, на правым беразе ракі Мужанка, ва ўрочышчы Гарадок. Пляцоўка круглая, дыяметрам 55 м. З заходняга боку ўмацавана 2 дугападобнымі валамі даўжынёй 120 і 130 м, шырынёй 3–5 м, вышынёй каля 2 м, а таксама равамі глыбінёй 0,6–0,8 м. Даследавалі ў 1936 г. А. М. Ляўданскі і А. Дз. Каваленя, у 1976 г. В. І. Шадыра. У культурным пласце 0,3–0,6 м знойдзены косці жывёл, камяні, абломкі глінянага посуду. Адносіцца да мілаградскай культуры, датуецца VII ст. да н.э. – II ст. н.э. Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

Курганны могільнік. За 0,6 км на паўднёвы захад ад вёскі 3 курганы вышынёй 1,3; 1,7 і 1,8 м, дыяметрам 6,7 і 15 м. Вядомы з 1873 г. Даследавалі ў 1956 г. В. М. Мельнікоўская, у 1976 г. В. І. Шадыра. Раскопкі не праводзіліся.

ВЁСКА КАЗІМІРАВА,
Залатамінскі сельсавет

Курганны могільнік. За 1 км на поўнач ад вёскі, абапал дарогі на в. Глінка Паштовая, на правым беразе ракі Сож 46 курганоў вышынёй ад 0,6 да 2,85 м, дыяметрам ад 5 да 12 м. З паўночнага боку могільніка знаходзіцца глыбокі і шырокі роў. Вядомы з 1873 г. Даследавалі ў 1893 г. Е. Р. Раманаў, у 1976 г. В. І. Шадыра. Раскопкі не праводзіліся.

Паселішча. За 0,7 км на ўсход ад вёскі, на невысокім (3 м над наваколлем) узвышшы. Выявіў у 1927 г. К. М. Палікарповіч, даследавала ў 1975 г. А. Г. Калечыц. У культурным пласце 0,3 м знойдзены крамянёвыя вырабы і рэшткі ляпной керамікі. Адносіцца да эпохі неаліту і бронзавага веку. Матэрыялы даследавання захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

ВЁСКА КАСЦЮКОЎКА,
Залатамінскі сельсавет

Паселішча. За 0,8 км на поўдзень ад вёскі, ва ўрочышчы Узлужжа. Выявіў у

1924 г. К. М. Палікарповіч, даследавала ў 1975 г. А. Г. Калечыц. У культурным пласце 0,15 м знойдзены крамянёвыя вырабы і рэшткі ляпной керамікі. Паселішча адносіцца да каменнага і бронзавага вякоў. Частка пласцiністых наканечнікаў стрэл, магчыма, эпохі мезаліту. Матэрыялы даследавання захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

ВЁСКА КЛЯПІН, Валынцаўскі сельсавет

Курганны могільнік. За 3 км на поўнач ад вёскі, за 0,7 км ад моста цераз раку Кляпінка, абапал дарогі на Валынцы 4 насыпы: 3 справа ад дарогі і 1 злева, вышынёй 1,3—1,6 м, дыяметрам 6,5—8,5 м. Курганы зараслі лесам і здзірванелі. Адкрыў і даследаваў у 1976 г. В. І. Шадыра. Раскопкі не праводзіліся.

ВЁСКА КУРГАННЕ, Акцяброўскі сельсавет

Курганныя могільнікі.

Могільнік-1. За 0,4 км на поўдзень ад вёскі 15 курганоў вышынёй 1—2,3 м, дыяметрам 3—10 м. Выявіў і даследаваў у 1976 г. В. І. Шадыра. Раскопкі не праводзіліся.

Могільнік-2. За 0,5 км на паўднёвы захад ад вёскі 20 курганоў вышынёй 1—3 м, дыяметрам 5—10 м. Выявіў і даследаваў у 1976 г. В. І. Шадыра. Раскопкі не праводзіліся.

ВЁСКА ЛЕБЯДЗЁЎКА, Каменскі сельсавет

Курганны могільнік. За 0,25 км на паўднёвы ўсход ад вёскі 7 курганоў вышынёй 1,4—2 м, дыяметрам 6,5—10 м. Вядомы з 1873 г. Даследаваў у 1975 г. В. І. Шадыра. Раскопкі не праводзіліся.

ВЁСКА ЛІЦВІНАВІЧЫ, цэнтр сельсавета

Курганны могільнік. За 0,3 км на захад ад вёскі. Захаваліся 3 насыпы вышынёй 1,2; 2 і 2,2 м. Вядомы з 1873 г. Даследаваў у 1976 г. В. І. Шадыра. Раскопкі не праводзіліся.

Паселішча. За 2 км на ўсход ад вёскі, на правым беразе ракі Сож, ва ўрочышчы Цялец. Выявіў у 1924 г. К. М. Палікарповіч, даследавала ў 1976 г. А. Г. Калечыц. Пляцоўка зарасла лесам. Культурны пласт 0,1 м прасочваецца толькі ў размывах. Найбольш выразны на ўчастку 300 x 50 м, які прымыкае да вусця ракі Перагонка. Тут знойдзены крамянёвыя пласціны, адшчэпы, скрабкі, наканечнікі стрэл. Адносіцца да эпохі неаліту і бронзавага веку. Матэрыялы даследавання захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

ПАСЁЛАК ЛУНАЧАРСКІ, Залатамінскі сельсавет

Гарадзішча. За 0,8 км на ўсход ад пасёлка, ва ўрочышчы Гарадок, на правым беразе ракі Сож. Памеры 66 x 57,5 м. Вышыня гарадзішча над поймай ракі 16 м. З боку поля пляцоўку абмяжоўваюць вал вышынёй 1,2 м, шырынёй 0,4—0,6 м і роў глыбінёй 1,8 м. Яшчэ адзін дугападобны вал даўжынёй 20 м і шырынёй 4 м прасочаны ў паўночна-ўсходняй частцы пляцоўкі. Вядома з 1873 г. У 1936 г. А. М. Ляўданскі і А. Дз. Каваленя заклалі пры даследаванні гарадзішча 2 шурфы. Культурны пласт 0,9—1 м. У ім знойдзены абпаленыя камяні, косці жывёл, абломкі ляпнога, часткова штрыхаванага посуду. У 1976 г. гарадзішча даследаваў В. І. Шадыра. Адносіцца да мілаградскай і ранняга этапу зарубінецкай культур, датуецца VI ст. да н.э. — III ст. н. э. Матэрыялы даследавання захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

ВЁСКА НОВЫ МЛЫН, Ворнаўскі сельсавет

Гарадзішча. За 1,5 км на ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Гарадок, на пагорку вышынёй 5 м. Пляцоўка выцягнута з захаду на ўсход, памерам 60 x 35 м. На паўночнай і паўночна-ўсходняй ускраінах гарадзішча прасочаны вал вышынёй 2,2 м, даўжынёй 40 м і роў глыбінёй 0,3 м. Паўночны і ўсходні схілы больш стромкія і на 2 м вышэй за іншыя. Адкрыла і дас-

Кармянская цэнтральная раённая бібліятэка

ледавала ў 1956 г. В. М. Мельнікоўская, даследаваў у 1976 г. В. І. Шадыра. У культурным пласце выяўлены крамянёвыя прылады працы і фрагменты ляпной керамікі. Адносіцца да мілаградскай культуры, датуецца VI ст. да н.э. — II ст. н.э. Раней тут існавала паселішча каменнага веку. Матэрыялы даследавання захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

ПАСЁЛАК ПАКРОЎСКІ,
Каменскі сельсавет

Курганны могільнік. На паўночнай ускраіне вёскі 7 насыпаў вышынёй ад 1 да 5 м, дыяметрам 6—14 м. Адкрыў і даследаваў у 1976 г. В. І. Шадыра. Раскопкі не праводзіліся.

ВЁСКА РУДНЯ,
Ліцвінавіцкі сельсавет

Гарадзішча. За 1,5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, на правым беразе ракі Касалянка (на вышыні 6—7 м над поймай ракі). Пляцоўка чатырохвугольная ў плане, выцягнута з поўначы на поўдзень, памерам 110 х 30 м. З паўночнага, заходняга і паўднёвага бакоў пляцоўкі праходзіць траншэя шырынёй 1,5—2 м, глыбінёй да 0,4 м. Адкрыў і даследаваў у 1976 г. В. І. Шадыра. Культурны пласт 0,8 м. Раскопкі не праводзіліся.

ВЁСКА СТАРАГРАД,
цэнтр сельсавета

Курганны могільнік. За 0,2 км на поўнач ад гаспадарчага двара саўгаса "Стараградскі", злева ад шашы Доўск—Карма, на полі 40 курганоў вышынёй 1—3 м, дыяметрам 4—12 м. Вядомы з 1873 г., даследаваў у 1978 г. В. І. Шадыра. На асобных насыпах у верхняй частцы выяўлены ямы, зробленыя скарбашукальнікамі. Раскопкі не праводзіліся.

ВЁСКА СТРУМЕНЬ,
цэнтр сельсавета

Паселішча. За 0,5 км на паўднёвы захад ад вёскі, па тэрасе левага берага ракі Струменка, ва ўрочышчы Нараг. Плошча 2500 м^2. Выявіў у 1927 г. К. М. Палікарповіч, даследавала ў 1976 г. А. Г. Калечыц. У раскопе плошчай 464 м^2 выяўлены культурны пласт каля 0,6 м. У ім прасочаны 7 гаспадарчых ям і 2 агнішчы. Знойдзена ляпная кераміка, у тым ліку пасудзіны бронзавага веку, крамянёвыя прылады працы і зброя: скрабкі, скоблі, скрэблы, разцы, наканечнікі стрэл і дроцікаў і інш. Адносіцца да эпохі неаліту і бронзавага веку. Матэрыялы даследавання захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

Паселішча-1. За 1,5 км на захад ад вёскі, у міжрэччы рэк Струменка і Сож. Плошча 6000 м^2. Адкрыў у 1926 г. К. М. Палікарповіч, даследавала ў 1976 г. А. Г. Калечыц. У культурным пласце 0,4 м знойдзены неалітычная кераміка з ямачна-грабеньчатым арнаментам, крамянёвыя прылады працы: разцы, скрабкі, цёслы, праколкі, нуклеусы і інш. Адносіцца да верхнедняпроўскай культуры, датуецца 3-ім тысячагоддзем да н.э.

Паселішча-2. За 0,5 км на паўночны захад ад вёскі, ва ўрочышчы Біручыха, на пясчанай выдме. Даўжыня з паўднёвага ўсходу на паўночны захад 300 м, шырыня 10—20 м. Выявіў у 1926 г. К. М. Палікарповіч, даследавала ў 1976 г. (200 м^2) А. Г. Калечыц. Культурны пласт 0,4 м. У ім знойдзены неалітычная кераміка, фрагменты посуду бронзавага веку. Прасочана некалькі попельных плям. Крамянёвы інвентар характэрны для неалітычных стаянак Пасожжа: скрабкі, разцы, праколкі, нуклеусы. Адносіцца да верхнедняпроўскай культуры, датуецца 3-ім тысячагоддзем да н.э.

Паселішча-2 і могільнік. Знаходзяцца на паселішчы-1, вышэй неалітычнага культурнага пласта. Адкрыў у 1926 г. К. М. Палікарповіч, даследавала ў 1976 г. А. Г. Калечыц. У культурным пласце 0,4—0,6 м прасочаны гаспадарчыя ямы, агнішчы, 4 паўзямлянкавыя жытлы, 3 пахаванні па абраду трупаспалення, кераміка сярэднедняпроўскай і сосніцкай культур. Адносіцца да сярэднедняпроўскай культуры, датуецца 2-ім тысячагоддзем да н.э. Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

Кормянская центральная районная библиотека

ВЁСКА ХІЗАЎ,
Старагградскі сельсавет

Курганны могільнік. За 2 км на ўсход ад вёскі, за 1 км на захад ад вёскі Тараxаўка 18 насыпаў вышынёй 1,5 – 2 м, дыяметрам 10 – 15 м. Адкрыў і даследаваў у 1890 г. В. К. Чарапанаў, які раскапаў і курган. Пахавальны абрад — трупапалажэнне ў яме, галавой на ўсход. Знойдзены шкляныя пазалочаныя пацеркі, біэліпсападобныя і гронкападобныя падвескі, прасліцы. Помнік даследавалі ў 1961 г. В. У. Сядоў, у 1976 г. В. І. Шадыра. Датуецца II ст., належаў радзімічам.

ВЁСКА ХЛЯЎНО,
Залатамінскі сельсавет

Курганны могільнік. За 0,3 км на ўсход ад вёскі, на ўсходняй ускраіне могілак, з правага боку ад дарогі на в. Міхееўка 4 насыпы вышынёй 1,2 – 1,7 м, дыяметрам 7 – 10 м. Даследавалі ў 1956 г. В. М. Мельнікоўская, у 1976 г. В. І. Шадыра. Раскопкі не праводзіліся.

На зямлі радзімічаў

Радзімічы — усходнеславянская этнічная супольнасць. Жылі ў міжрэччы Дняпра і Дзясны па цячэнні Сажа і яго прытокаў. Паводле “Аповесці мінулых гадоў”, назва этнічнай супольнасці паходзіць ад імя Радзім, на чале з якім радзімічы прыйшлі з прапольскіх (ляшскіх) зямель. “Для вучоных-гісторыкаў гэта меркаванне летапісца ўяўляла сабой здагадку,— адзначаў М. В. Доўнар-Запольскі,— таму што здавалася вельмі дзіўным з'яўленне польскага племені, адарванага так далёка на ўсходзе. Аднак, дзякуючы новым даследаванням у галіне філалогіі і славянскіх перамяшчэнняў, ужо не існуе сумнення ў тым, што паведамленне пачатковага летапісца адпавядае сапраўднасці: племя радзімічаў з'яўляецца часткай ляшскага племені. Тыя самыя звесткі філалогіі даюць падставу наогул гаварыць аб тым, што паўночнае Прыдняпроўе было занята часткай ляшскага племені. Філолагі з вялікай верагоднасцю прызнаюць і дрыгавічоў па моўных асаблівасцях галін ляшскага племені (акадэмік Шахматаў). У радзімічаў і дрыгавічоў была адна мова — продак беларускай мовы”. (Доўнар-Запольскі М. В. Гісторыя Беларусі. Мн., 1994. С. 25 – 26). Пра жыццё нашых прашчураў у “Аповесці мінулых гадоў” можна знайсці наступныя звесткі: “Радимичи и Вятичи, и Север один обычай имеяху: живяху в лесе, якоже всякий зверь, ядуще все нечистое, и срамословие в них пред отцы и пред снохами, и браци не бываху в них, но игрища межю селы, схожахуся на игрища, на плясания и на вся бесовская песни, и ту умыкаху жены собе, с нею же кто свещашеся; имяху же и по две и по три жены. И аще кто умряше, творяху трызу над ними, и по сем творяху кладу велику, и возложать на кладу мертвеца, и сожигаху, и по сем собравше кости, вложаху в сосуд мал, и поставляху на столпе на путех, еже творять Вятичи и ныне. Си же творяху обычаи и Кривичи и прочии погании, не ведуще закона божия, творяще сами собе закон”.

“Судзячы па гэтай летапіснай ведамасьці, выходзіць, што нашыя продкі былі зусім у превястковым стане, ня мелі ніякай культуры і жылі сярод лясоў, як нейкае быдла. Ня так абстаіць справа, калі мы запытаемся ў чужаземных сьведкаў. Усе яны ў адзін голас кажуць аб тым, што ўсходнія славяне ўжо і ў часы сівой старасьветчыны мелі нейкую культуру, і нават немалую. Так, напрыклад, гавораць бізантыцкія аўтары — Пракопі, Маўрыкі, Канстанты Чырвонародны і арабскі аўтар Масудзі... Аб гэтым жа, хоць маўчком, але гавораць тыя магільнікі-курганы, каторыя засталіся на тэрыторыі Беларусі аж да нашых часоў. Раскопкі гэтых магільнікаў-курганоў, якія робяцца вучонымі, даюць шмат матэрыя-

лаў, каб намаляваць стан культуры як матэрыяльнай, так і духоўнай у крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў.

Па тых рэчах, што знаходзяцца ў курганох, ясна, што дзяды нашыя ня скапны былі да вайны, ім больш падабалася мірная праца: земляробства, зьвералоўства і гандаль. Яны ўмелі ўжо ткаць на кроснах, ведалі бандарную і ганчарную справу. Былі сярод іх людзі заможныя, каторыя любілі хараша прыбрацца. На шыі яны насілі маністы з шкляных пацерак; часам бронзавых і срэбных, з разнаітымі падвескамі, добра апрацаванымі. Відаць, што пацеркі, вельмі штучна зробленыя, дзесь купляліся. Беларус нашага часу ня можа прыбрацца так багата і цікава, як маглі прыбрацца яго продкі, каторыя, па летапісу, "жывяху в лесе, яко-же всякій зверь" (Ігнатоўскі У. М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мн., 1992. С. 32–33).

Амаль да канца X ст. радзімічы жылі самастойна і выплачвалі даніну спачатку хазарам, а потым Кіеву.

Як сведчыць "Аповесць мінулых гадоў", у IX–XIII стст. кармянскія землі, на якіх жылі радзімічы, уваходзілі ў склад Кіеўскай Русі, а больш канкрэтна — у Чарнігаўскае княства. Упершыню ў Старажытным зборы Чарнігаў упамінаецца толькі ў 1024 г., аднак тая абставіна, што ён стаіць адразу пасля Кіева ў Дагаворы Русі з грэкамі, уключаным у летапіс 907 і 945 гг. сведчыць аб вялікай палітычнай і эканамічнай ролі, якую адыгрывалі горад і княства ў старажытнарускай дзяржаве. Да XI ст., згодна з дакументамі, Чарнігаўская зямля мела рад вялікіх гарадоў са шматлікім насельніцтвам, а яе купцы праз Кіеў гандлявалі з Візантыяй, па Данцу і Дону зносіліся з Каўказам.

Чарнігаўская дружына, куды ўваходзілі і радзімічы, была адной з самых вялікіх у складзе аб'яднаных сіл краіны, якія на чале з Алегам зрабілі неўзабаве ваенны паход на Царград.

У той жа час і землі саміх радзімічаў, з'яўляючыся паўночна-заходняй мяжой Чарнігаўскага княства, нярэдка падвяргаліся спусташальным набегам з боку суседзяў. Асабліва вялікія няшчасці прынесла дзесяцігадовая барацьба, пачатая ў 970 г. паміж наўгародскім князем Уладзімірам і полацкімі князямі. У 984 г. кіеўскі ваявода Воўчы Хвост жорстка падавіў паўстаўшых радзімічаў, разбіўшы іх на рацэ Пясчань каля Прапойска (Слаўгарад).

З "Повести временных лет": "В лето 6492 (984): Иде Володимер на Радимичи. Бе у него воевода Волчий Хвост. И посла Володимер перед собою Волчья Хвоста. И срете и на реце Пищане, и победи Радимиче Волчий Хвост. Темь и Русь корятся Радимичем глаголюше: "Пишаньци волчыя хвоста бегають".

Тым не менш барацьба радзімічаў за незалежнасць працягвалася яшчэ амаль трыццаць гадоў, аж да 1015 г. Трэба думаць, і на тэрыторыі сучаснай Кармяншчыны ў той далёкі час было вельмі неспакойна.

У складзе Чарнігаўскага княства

Рост вытворчых сіл і палітычнае ўмацаванне мясцовага феадальнага магнацтва садзейнічалі абасабленню Чарнігаўскага княства. Залежнасць ад Кіева ў пачатку XI ст. ужо становіцца яму ў цяжар. Гэта, зрэшты, датычыць і іншых княстваў, што ўваходзілі ў склад старажытнарускай дзяржавы. Яраславу Мудраму, праўда, удалося вярнуць пад сваю ўладу «ўцекачоў», аднак ненадоўга. Ужо адразу пасля яго смерці Чарнігаў дастаецца яго сыну Святаславу, якога многія гісторыкі лічаць роданачальнікам чарнігаўскіх князёў.

Святаслаў княжыў у Чарнігаве амаль дваццаць гадоў — з 1054 па 1073 г. Затым, змовіўшыся з братам Усеваладам, яны вясной 1073 г. выганяюць з Кіева

Кармянская цэнтральная раённая бібліятэка

трэцяга брата — Ізяслава, і Святаслаў 22 сакавіка займае яго трон. У 1076 г. ён памірае, і ў Кіеве ўкняжваецца Усевалад. Але на вельмі нязначны час. Ужо 15 ліпеня таго ж года ён, памірыўшыся з выгнаным некалі Ізяславам, аддае яму Кіеў, а сам вяртаецца ў Чарнігаў.

Тым часам на чарнігаўскі трон прэтэндуюць і сыны памерлага Святаслава — Барыс і Алег. І зноў землі княства на два гады становяцца арэнай міжусобных спрэчак, часта ваенных, высвятленне адносін заканчваецца тым, што 3 кастрычніка 1078 г. Усевалад разбівае войска сыноў Святаслава, якія з дапамогай полаўцаў і смаленскіх князёў спрабавалі ўтрымаць захоплены Чарнігаў, і садзіць там свайго сына Уладзіміра Манамаха.

У 1094 г. з-за Чарнігава зноў успыхвае вайна, якая не абышла бокам і тэрыторыю сучаснай Кармяншчыны. Алег, які яшчэ ў 1083 г. вярнуўся са ссылкі, сумесна з полаўцамі ўчыняе паход на Чарнігаў, і Манамах, не падтрыманы гараджанамі, вымушаны пакінуць горад і ўступіць княжанне дваюраднаму брату.

Гэтым Алег не задаволіўся. Пры падтрымцы чарнігава-северскіх гарадоў і полаўцаў ён пачынае рашучую барацьбу супраць кіеўскіх князёў. Такім чынам, як лічаць многія даследчыкі, іменна з Чарнігаўскай зямлі пайшло полымя адной з самых першых буйных феадальных войнаў у старажытнай дзяржаве.

У 1096 г. Уладзіміру Манамаху, аб'яднаўшыся з кіеўскім князем Святаславам Ізяслававічам, удалося прагнаць Алега з Чарнігава. Той знаходзіць прытулак у Старадубе. Горад быў узяты толькі пасля працяглай асады, але і пасля гэтага Алег не спыніў вайны. Усяго праз некалькі месяцаў ён урываецца ў "Отчину" і распраўляецца са сваімі ворагамі.

Ваенныя поспехі Алега вельмі занепакоілі кіеўскіх князёў. Яго войска было разбіта, а сам ён быў вымушаны згадзіцца склікаць у 1097 г. у Любечы з'езд князёў для вырашэння палітычных пытанняў.

Адным з рашэнняў з'езда з'явілася прынцце «прынцыпу дынастычнага раздзелу Рускай зямлі паміж рознымі княжаскімі родамі пры захаванні яе цэласнасці перад пагрозай знешняй небяспекі». Згодна з гэтай дамоўленасцю, Чарнігаўскае княства дасталося сынам Святаслава Яраслававіча — Давыду і Алегу.

З пачатку XIII ст. Чарнігаўскае княства раздрабілася на некалькі ўдзельных княстваў. Гэта суправаджалася барацьбой за ўладу паміж князямі. Гэтую барацьбу перарвала мангола-татарскае нашэсце, якое прынесла Чарнігаўскай зямлі велізарныя разбурэнні, і да сярэдзіны XIII ст. яна як адносна цэласная і акрэсленая дзяржаўная адзінка перастала існаваць.

У СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА І РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

Станаўленне дзяржавы

XIII стагоддзе — адзін з самых змрочных перыядаў у гісторыі нашых продкаў. Землі, дзе яны жылі, аслабленыя палітычна, раздробленыя на мноства ўдзелаў, паступова прыходзілі ў заняпад і станавіліся лёгкім аб'ектам для нашэсцяў як з усходу, так і з захаду, з боку нямецкага ордэна крыжакоў, які з'явіўся ў пачатку XIII ст. у вусці Заходняй Дзвіны.

Да таго ж і паміж самімі князямі ўспыхвалі феадальныя міжусобіцы і войны. Знешняй агрэсіі і ўнутраным разладам магла супрацьстаяць толькі моцная цэнтралізаваная дзяржава. Таму на абшарах

Беларусі пачаўся працэс аб'яднання асобных княстваў. Цэнтрам кансалідацыі стала летапісная Літва, якая размяшчалася паміж асноўнымі этнічна беларускімі землямі — Полацкай, Турава-Пінскай і Наваградскай. Галоўнай дзеючай асобай на пачатку стварэння адзінай дзяржавы стаў князь Міндоўг. Сталася так, што ў 1240-ых гг. ён змушаны быў, ратуючыся ад унутраных разладаў на радзіме, перабегчы ў Наваградак (цяпер Навагрудак): прыняў там хрысціянства. Першым этапам стварэння новай дзяржавы — Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ) стаў перанос яго сталіцы ў Наваградак і падпарадкаванне яму Полацка і Мінска.

Справу, пачатую Міндоўгам (ён быў забіты разам з двума сваімі сынамі ў 1263 г.), завяршылі Гедымін (памёр у 1341 г.) і Альгерд (памёр у 1377 г.). Далучэнне беларускіх зямель ішло са згоды мясцовага насельніцтва, якое бачыла відавочную палітычную выгаду такога саюзу — абарона ад знешніх ворагаў, спыненне міжусобнай барацьбы. Стварэнне адзінай дзяржавы ўносіла больш трывалы парадак у народнае жыццё, станавілася надзейным заслонам на шляху мангола-татараў, якія дагэтуль неаднойчы рабілі спусташальныя набегі на ўсходне-славянскія землі.

Толькі з 1275 па 1338 г. шэсць разоў былі вымушаны нашы продкі са зброяй у руках бараніць сваю зямлю ад ардынцаў. Адна з апошніх бітваў войска Вялікага княства Літоўскага пад камандаваннем князя Альгерда адбылася на левым прытоку Паўднёвага Буга, рэчцы з прыгожай назвай Сінія Воды, у 1362 г. Аб'яднаныя венныя сілы маладой дзяржавы разбілі татарскіх князёў Кутлубуга і Хачэбея і вымусілі іх пакінуць паўднёва-ўсходнія беларускія землі. Вельмі верагодна, што ўдзел у гэтай бітве прымалі ратнікі Карманшчыны, якая к гэтаму часу ўжо ўваходзіла ў склад Вялікага княства Літоўскага.

У 1386 г. велікакняжацкі прастол заняў сын Альгерда і Цвярской князёўны Ульяны Ягайла. Часткова з палітычных меркаванняў, а яшчэ больш, на думку некаторых даследчыкаў, з-за празмернага самалюбства ён у хуткім часе прыняў прапанову польскіх паноў ажаніцца на каралеве Ядвізе і ўскласці на сябе польскую карону. Узамен палякі патрабавалі, каб Ягайла прыняў каталіцтва і хрышчэнне паводле каталіцкага абраду. За рэлігійным пытаннем само па сабе ўзнікла пытанне аб прывілеях для асоб польскай нацыянальнасці, якое паставіла пад пагрозу само існаванне Літоўска-Рускай дзяржавы.

Палітыка Ягайлы прывяла не толькі да пагаршэння становішча простага насельніцтва дзяржавы праваслаўнага веравызнання. З пранікненнем каталіцызму ўзнікла сур'ёзная небяспека для праваслаўнай царквы. А самае галоўнае — феадалы паўднёва-ўсходняй часткі Беларусі, у тым ліку і кармянскія, пачалі губляць ранейшую незалежнасць і манапольнае становішча. Іх уплыў на палітычнае жыццё прыкметна знізіўся.

Супраць Ягайлы рашуча выступіў яго дваюрадны брат Вітаўт. Барацьба Вітаўта з Ягайлам закончылася Востраўскім пагадненнем, заключаным у 1392 г., паводле якога Вітаўт фактычна прызнаваўся Вялікім князем літоўскім.

Трэба сказаць, што велікакняжанне Вітаўта мела надзвычай важнае значэнне ў станаўленні Вялікага княства Літоўскага. Па сведчаннях яго сучаснікаў, ён вызначаўся вялікім дзяржаўным розумам, незвычайнай энергіяй і змог паставіць сваю палітыку ў адносінах да абласцей так, што выклікаў шырокую папулярнасць сярод насельніцтва. Асноўнай мэтай яго палітыкі было стварэнне самастойнай дзяржавы і прымірэнне дзвюх пануючых у ёй нацыянальнасцей.

Вітаўт канчаткова вызваліў літоўскія і беларускія землі ад знешніх ворагаў. Злучыўшыся з Ягайлам, ён разбівае ў час Грунвальдскай бітвы ў 1410 г. прускі ордэн. Паражэнне апошняга было настолькі моцным, што ордэн неўзабаве распаўся. Фактычна спыніліся пры Вітаўце і мангола-татарскія набегі на паўднёва-ўсходнія землі Вялікага княства. Значна пра-

Кормянская центральная районная библиотека

сунуліся межы краіны і на ўсходзе. Некаторы час Вітаўт прымаў у сферы свайго ўплыву нават Вялікі Ноўгарад.

Адсутнасць знешніх ворагаў у гэты час садзейнічала развіццю эканамічных адносін унутры дзяржавы, асноўную частку насельніцтва якой складала цяглае сялянства.

З другой палавіны XV ст. у ВКЛ пачаўся ўціск праваслаўя, што выклікала нацыянальна-рэлігійную варожасць у яго нетрах. Кароль Казімір, бачачы сепаратызм, які зыходзіў галоўным чынам з беларускіх зямель, стаў прыгнятаць тых князёў, хто прытрымліваўся праваслаўя, забараняў будаваць праваслаўныя храмы. Усё гэта прывяло да таго, што ўсходняя частка зямель княства аж па Беразіну, у тым ліку і Кармяншчына, магла адысці да Масквы. Але змова была раскрыта, і Міхал Алелькавіч Слуцкі, арганізатар змовы супраць Казіміра, у 1481 г. быў пакараны смерцю. Тым не менш усяго за пяць наступных гадоў да Расіі адышла даволі значная тэрыторыя.

Але на гэтым беды не канчаліся. Адразу пасля смерці Казіміра ўспыхнула вайна з Масквой. Яна была кароткай, але абышлася ВКЛ вельмі дорага. Згодна з дагаворам 1494 г. да Расіі адыходзілі многія ўсходнія землі княства. Яшчэ больш несуцяшальнымі былі для ВКЛ вынікі трохгадовай вайны з Маскоўскай дзяржавай, якая пачалася ў 1500 г. Паводле перамір'я, заключанага ў сакавіку 1503 г., яно страціла 19 гарадоў і 70 валасцей.

Цяжкасці на ўсходзе супалі з небяспекай на поўдні, якую прадстаўляла Крымскае ханства, што ўтварылася пасля распаду Залатой Арды.

Ваенныя канфлікты паміж Вялікім княствам і Масквой узнікалі ў наступныя гады яшчэ не раз. Сіл, каб змагацца з маскоўскім царом, не хапала. Ад яго спусташэнняў асабліва цярпелі ўсходнія раёны краіны, у тым ліку тэрыторыя сучаснай Кармяншчыны, якая, паводле адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы 1565 г., увайшла ў склад Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства.

Вайна з Маскоўскай дзяржавай паскорыла заключэнне ў 1569 г. паміж ВКЛ і Польшчай у Люблінe уніі, згодна з якой адбылося аб'яднанне ў адну федэратыўную дзяржаву — Рэч Паспалітую. Заключаючы яе, кожны бок праследаваў свае мэты: Вялікае княства меркавала знайсці саюзніка ў барацьбе з Масковіяй, палякі — прасунуць каталіцызм на ўсходне-славянскія землі. Стваральнікі уніі перш за ўсё думалі пра выгаду для сябе — і, можа, таму стварэнне агульнай дзяржавы не толькі не ўмацавала яе, а наадварот — аслабіла.

Асабліва гэта тычылася Вялікага княства Літоўскага, якое ў наступным, як частка аб'яднанай дзяржавы, павінна было адстойваць чужыя яму інтарэсы і цярпець ад нападаў маскавіцян, якія ўрываліся ў суседнія беларускія вобласці. Да ўсяго трэба дадаць голад, які амаль штогод даводзілася цярпець простаму люду, у тым ліку і жыхарам Кармяншчыны.

Узмацненне прыгнёту, выкліканага прыняццем “Уставы на валокі”, уціск праваслаўя прывялі да абвастрэння класавай барацьбы. У кастрычніку — снежні 1595 г. на поўдні і ўсходзе Беларусі ўспыхнуў антыфеадальны бунт пад кіраўніцтвам украінскага казака Севярына Налівайкі. Супраць бунтароў было выстаўлена 18-тысячнае войска, і на Буйніцкім полі пад Магілёвам адбылася жорсткая сеча. Сілы аказаліся няроўныя, і Налівайка адступіў на поўдзень у напрамку Быхаў — Рагачоў — Рэчыца. Зусім верагодна, што ягоныя атрады праходзілі і па Кармяншчыне, вынішчаючы на сваім шляху маёнткі мясцовых землеўладальнікаў.

Праз пяцьдзесят гадоў на Кармяншчыне з'явіліся тайныя пасланцы Багдана Хмяльніцкага, якія заклікалі простых людзей да паўстання, а ўжо ў верасні 1648 г. каля Рагачова адбыліся баявыя дзеянні. Шэсць наступных гадоў Кармяншчына, якая знаходзілася на ўсходняй мяжы Рэчы Паспалітай, зноў была ахоплена полымем руска-польскай вайны.

Войны, палітычныя інтрыгі і барацьба паміж магнатамі за ўладу прывялі Рэч Паспалітую пад канец XVIII ст. да эка-

намічнага і палітычнага крызісу. Гэтыя цяжкасці дзяржавы выкарысталі Расія, Прусія і Аўстрыя, падзяліўшы паміж сабою тэрыторыю Рэчы Паспалітай.

Дакументы сведчаць

З рускіх летапісаў

В лето 6823 (1315). Нача княжити Кгедимин Витунович в Литве, в Новогородку и Кернове, и воева на Русь крепко. Сих времен прежде, Премышлява, короля Польского, убили сами Ляхы, пьяного, в месте Рогозном, а забили бояре Лядскии Налец и Заремба: бог сотворил отмщение ему, понеже он преже жену свою, именем Лукерию, удави ради другое, которая просися у него, да в единой ризце пустит ю в дом: она бо бе рода князей Сербских, с Кашуб, от помория Варязкого, от Стараго града за Кгданском. По нем Ляхи избрали Вацлава Ческаго на королевство свое, понеже Премышляв не име сына. Владислава Локетка не восхотели взяти; сей Локетко много им зла в земли творил, изгоняли его из земли. Ходил до Риму, жалуяся папе на Ляхов, — он их прокля. По смерти Вацлавовой избрали его собе паном. Име у себе сына Казимера, за него же взят в жену дщерь Кгедимина князя Литовского, поганку, и перекрести ю; и много Ляхов полоненых Литва вместо дара брачного пусти, много бо зла Ляхом Литва, Жмойть прежде сотвори, Ляхов и Мазуров полками в полон бра, сице Лях един по гривне, се есть по десети грошей Литовских, в Литве и в Руси Белой продаван был, и на лошата и волы Литва межи собою их замениваху; а на крещении Кгедиминовне имя дано Анна...

Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Мн., 1936. Т. 1.

З рускіх летапісаў

В лето 6895 (1387). Ягелло, ставши королем Полским, пойде паки в Литву, во отчество свое, в Вилню, и тамо всю Литву и Жмудь на веру христианскую приведе, и да охотнейших их ко крещению сотворит, коемуждо крещенному белую одежду даяше; сего ради мнози ко крещению бежаху. В то ж время вся боги Литовския погуби и искорени, тогда же и первого бискупа Андрея в Вилне постави; было в той час много що чолнейших князей и панов в Литве, и все братия Ягеллова, и самая матка его веры православной Греческой, которые собе тогда варовали, абы им никто насилия в вере не чинил.

Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Мн., 1936. Т. 1.

З хронікі Яна Длугаша

[1387 г.]. Владыслаў, кароль польскі, абавязаўшыся, умовай з палякамі і каралевай Ядвігай, вывесці Літоўскі народ з язычаства і яго цемнаты і абараціць у хрысціянскую веру, і імкнучыся да пашырэння гэтай веры, накіраваўся ў Літву разам з Бадзантаю, архіепіскапам Гнезненскім і вялікай колькасцю іншых духоўных каралеўства Польскага, з дапамогаю якіх спадзяваўся, што можна будзе ў язычніцкім народзе прышчапіць і пашырыць семя хрысціянскай веры, бо да гэтага часу ў Літве Хрыстос быў нязнаны і невядомы. Апрача гэтых духоўных ён узяў з сабой каралеву Ядвігу, каб яна азнаёмілася з новаю сваёю бацькаўшчынаю, з новым краем і народам свайго мужа, затым Земовіта і Яна, князёў мазавецкіх, Конрада князя Алесніцкага, Бартоша з Вісенбурга, ваяводу пазнанскага, Хрысціна з Козеглоў, Сандэцкага Нікалая з Асаліна, каштэляна Вісліцкага, канцлера Закліку з Межгор'я, падканцлера каралеўства Польскага Нікалая з Маскажова, чашніка Валодка з Харбіновіч, падкаморага Спытка з Тарнова, Томка падчашага кракаўскага і многіх іншых паноў і шляхты польскай.

Прыбыўшы ў Літву ў першы дзень вялікага посту*, сабраў вялікі з'езд у Вільні.

---

* 5 сакавіка 1386 г.

Кормянская центральная районная библиотека

На гэты з'езд, па загаду караля, сабраліся каралеўскія браты — Скіргайла Трокскі, Вітаўт Горадзенскі, Владзімір Кіеўскі, Карыбут Новаградскі, князі і значная колькасць шляхты і народу. Владыслаў, кароль польскі, з дапамогаю хрысціянскіх князёў, якія разам з ім прыбылі, дамагаўся ад шляхты і народу, каб яны пакінулі сваіх багоў, якім пакланяліся да гэтых часоў у язычніцкай слепаце, і схіліліся да прызнання адзінага праўдзівага бога і прыняцця яго праўдзівай хрысціянскай рэлігіі. А калі гэтаму праціваліся варвары літоўцы, якія даводзілі, што было-б бязбожным і супроць звычаяў і веры продкаў адкідаць уласных багоў (былі ў іх выдатнейшымі: агонь, які яны лічылі вечным і які сцераглі жрацы дзень і ноч, падкладаючы дровы ў касцёр; гаі, якія лічыліся свяшчэннымі, там-жа вужакі і змеі, у якіх, паводле іх думкі, жылі богі), кароль Владыслаў загадаў гэты агонь (які яны лічылі вечным, і які падтрымліваўся ў Вільне ў галоўным месцы — сталіцы Літвы і які вартаваў жрэц), на іх мове вядомы пад назваю зніч, у прысутнасці язычнікаў загасіць і разбурыць святыню і алтар, на якім прыносілі яму афяры. Гаі і гароды, якія лічыліся святымі, загадаў павырубіць, вужак і змей, якіх нават у дамах кармілі і лічылі хатнімі божствамі, загадаў пазабіваць. Пры гэтым варвары горка плакалі і скардзіліся на знішчэнне і знявагу гэтых фальшывых багоў, аднак не асмельваючыся супраціўляцца загадам караля.

Пасля знішчэння язычніцкіх багоў, літоўцы, наглядна пераканаўшыся ў іх фальшывасці, нарэшце, схіліліся да прыняцця хрысціянскай веры, адракаючыся ад ранейшых заблуджэнняў. Абучаныя на працягу некалькіх дзён духавенствам, а яшчэ больш каралём Владыславам, які ведаў іх мову і якога больш ахотна слухалі, — галоўным асновам рэлігіі, або правілам веры, і некаторым малітвам — прыступілі да святога абліваня.

Владыслаў раздаваў простаму народу адзежу, кашулі і новыя вопраткі з сукна, прывезенага для гэтага з Польшчы. Гэта шчодрасць караля прывяла да таго, што калі аб гэтым разнесліся чуткі, то цёмны люд, пры гэтым бедны, для таго, каб дастаць вопратку з шэрсці, з усіх бакоў збягаўся для прыняцця хрышчэнння.

А паколькі было-б вялікім цяжарам кожнага асобна ахрысціць, то сабраўшы вялікую колькасць абодвух полаў літоўцаў, па загаду караля дзялілі на валасці і грамады, і кожнай грамадзе і ў паасобку, хто належаў да гэтай грамады, надавалася адно з імён, ужываемых хрысціянамі, замест ранейшых язычніцкіх. Такім чынам, першай грамадзе дано імя Пятра, другой Паўла, трэцяй Яна, чацвертай Якуба, пятай Станіслава і г.д. Жанчынам-жа, якія стваралі асобныя грамады, адпаведна надаваліся імёны: Кацярыны, Малгарэты, Дароты і г.д. колькі было нанава ахрышчоных грамад.

Шляхта і старшыя ў народзе хрысціліся асобна: яны з'яжджаліся для гэтага ў Вільню з жонкамі, дзецьмі і сваімі родзічамі, імкнучыся да прыняцця хрышчэння і пазнання асноў хрысціянскай веры.

Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Мн., 1936. Т. 1.

Аб ваенных паходах князя Вітаўта на рускія землі

[1395 г.]. Вялікі Літоўскі князь Александр-Вітаўт, сабраўшы войска з палякаў, літоўцаў і рускіх, накіраваўся на заваяванне Смаленскай зямлі, вельмі багатай краіны, заселенай рускімі. На працягу 10 год ён разараў яе беспярапыннымі бойкамі, а Владыслаў, кароль польскі, штогодна прысылаў яму дапамогу. Без гэтай дапамогі Вітаўт не адважыўся б пайсці ў паход супраць смалян.

Пасля таго, як усю Смаленскую ваколіцу спустошыў грабяжом і пажарамі, нарэшце, аблажыў смаленскі замак, галоўную сталіцу краіны, куды смальняне скрывалі сваіх жонак, дзяцей, маёмасць і ўсё тое, што лічылі самым дарагім. Пачаўшы здабываць замак, спачатку разбіваў і развальваў сцены, метаючы ў іх бомбы з пушак, а затым загадаў падступіць усяму войску, у той час, як асаджаныя смальняне недастаткова мужна і горача адбівалі напады.

Пасля таго, як сцены былі разбураны, замак быў здабыты сілаю. Ва ўсямім выпадку заваяванне Смаленска каштавала літоўцам не малых страт і крыві. Многа іх лягло мёртвымі, а яшчэ больш было паранена. З палякаў загінулі: выдатны рыцар Ян, каштэлян калішскі, Вержбента Кемпінскі, харужы Велюнскі, ранены цяжка ў твар.

Князь смаленскі Васіль, пачуўшы аб тым, што галоўны яго замак захоплены, уцёк з зямлі Смаленскай у Венгрыю, дзе пражываў на працягу многіх гадоў пры двары караля венгерскага Жыгімонта, а потым быў забіты пры асадзе аднаго замка.

Смаленскія мяшчане, не адважваючыся далей супраціўляцца князю Александру, з рэшткай сваіх умацаванняў аддаліся пераможцы. Ад гэтага часу княства Смаленскае было далучана да княства Літоўскага і стала літоўскай правінцыяй.

З захопленых скарбаў, нязмерных багацсяў, каштоўных каменняў і залатых і сярэбраных рэчаў, якія асталіся пасля пераходу замка ў рукі вялікага князя літоўскага Александра, значную частку іх Александр пераслаў Владыславу, каралю польскаму, а частку падзяліў паміж больш заслужанымі рыцарамі, якія адзначаліся сваёй мужнасцю.

Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Мн., 1936. Т. 1.

Рускія летапісы аб барацьбе князя Вітаўта з мангола-татарскімі заваёўнікамі

В лето 6905 (1397). Витовт, князь Литовский, пойде на Татаров и порази их; пригна одну орду до Литвы, с жонами и с детми, и посади их около Вилня, идеже и доныне свою веру махометову держат.

В лето 6907 (1399). Тамерлан, цар Татарской, пойде на Рускую землю, изыйде же противу ему Витовт со всею силою своею и со всеми Литовскими князи, и снийдеся с Тамерланом на реце Воркслe, но побежден бысть зле; идеже убиен бысть князь Андрей Олгердович Полоцкий, и его брат Димитрий Брянский, Михаило Евнутичи, Иван Димитриевич Киндир, Андрей внук Димитриев, Иван Борисович Киевский, и прочих много князей и бояр. А Татаре, победивши христиан, пойдоша в Рускую землю, пленяюще огнем и мечем Волынь и Литву, а Киев окупися тысячею червоных, а Печерски монастыр тридесятию червоных; сей окуп бысть августа 12.

Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Мн., 1936. Т. 1.

З рускіх летапісаў

В лето 7013 (1505). Посла Миндикирей, хан Перекопский, сынов своих трех со великим множеством на Литву, идеже старейший сын Махметкерей пойде и положися кошем под Менском, и взят его и всю страну попленив, поведе в плен самых людей кроме товара около ста тысячей, и инаго бесчисленного добра во свою землю повезе; а брат его Битикерей иде под Слуцк, на самое Успение, идеже запреся княгиня Симеонова Анастасия, вдова, со младым сыном своим Юрием, и хотяху Татаре взяти Слуцк, и не могоша биша бо их из града крепко, и оттуду шедше поплениша аже за Новгородом, яко и под Вилню загоном забегати, возвратишася со великою користию и пленом великим. Вилняне же, престрашены от Татар, оттоле обмуроваша Вилно муром.

В лето 7018 (1510). Не здержа миру з королем Миндикерей, якоже обещася, но прийде в Литву со великою силою, аже ку Вилню, и много зла сотвори и добытия взя, и християн в плен поведе.

Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Мн., 1936. Т. 1.

З шасцігадовага замірэння паміж Вялікім княствам Літоўскім і Масквой у 1556 г.

А мне великому государю Ивану, божиею милостию царю и великому князю всея Руси, твоих великого государя Жигимонта Августа, короля Польского и великого князя Литовского и Русского, земель не воевати, не зацепляти ничем в те перемирные лета, в шесть лет: города Киева с волостми, города Канева с волостми, города Черкас с волостми, города Житомира с волостми, города Вручья с волостми, города Любеча с волостми, города Гомья с волостми, и сел: Уварович, Телешевич, Теренич, Кошелева Лесу, Морозович, Липинич, Полешан, города Турова с волостми, города Мозыря с волостми, да волостей: Бчича, Брагина, Речицы, Горволя, Стрешина, Чичерска, Пропойска, Могилева, города Мстиславля с волостми и волости Хотславич; города Кричева с волостми, города Дубровны с волостми и волостей: Гор и Романова, и города Орши с волостми, и волостей: Любавичь и Микулина; города Витебска и волостей: Бруса, Дречих-Лук, Усвята, Озерищ; города Полотцка и волостей: Мошников, Дрисы, Освия, Нещерды, Непоротович, Вербиловы слободы, Кубка, Вязма, Клина, Ситнян, Лисны, Замошья, Истца, Неведрея, ни воевати, ни зацепляти ничем в те перемирные лета. А кого ты, брат наш, великий государь Жигимонт Август, божьею ми-

Кармянская центральная районная библиотека

лостью король и великий князь, пошлешь к нам своих послов, и тем твоим послом приехати к нам и от'ехати добровольно, безо всякие зацепки; также кого мы пошлем к тебе своих послов, и нашим послом по вашим землям к вам добровольно приехати и от'ехати, безо всяких зацепок.

А вашим купцом изо всех ваших земель во все наши земли приехати со всяким товаром и торговати на всякой товар, а приехати им и от'ехати добровольно, безо всяких зацепок; а нашим купцом изо всех наших земель во все ваши земли приехати со всяким товаром и торговати на всякий товар, а приехати им и от'ехати добровольно, безо всяких зацепок.

Также которые твои послы пойдут к тебе через наши земли, и гости с ними, или опричь послов гости пойдут к тебе, через наши земли с таким товаром ни буди: и нам у тех послов и гостей товару не отнимати, а пропущати нам к тебе послов и гостей со всяким товаром через свои земли безо всякие зацепки; также наши послы и гости куды ни пойдут, от нас или к нам, через твои земли с каким товаром ни буди: и тебе у тех наших послов и гостей товару не отнимати, а пропущати тебе к нам наших послов и гостей с всяким товаром через свои земли безо всяких зацепок.

Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Мн., 1936. Т. 1.

З Баркулабаўскага летапісу*

Лета 1595, месеца ноября 30 дня, в понеделок, за тыдень перед святым Николою, — Севериян Наливайко, при нем было казаков 2000, дел 14, место славное Могилев, место побожное, домы, крамы, острог выжгли, домов всех яко 500, а крамов з великими скарбами 400. Мещан, бояр, людей учтивых так мужей, яко и жен, детей малых побили, порубили, попоганили, скарбов теж незличоных побрали с крамов и с домов. Тут же войско литовское пана Радзивила троцкого, гетмана литовского, до Могилева у погоню за козаками притегнули люду рыцерского конного збройного, Татар 4000, Литвы 14000. Над тым людом был гетманом на имя Миколай Буйвид. В той час Наливайко лежал у Могилеве две недели. Услышал о том Наливайко, иж гетман з великим людом и з делами до Могилева тягнет, тогда Наливайко з Могилевского замку на гору Илинскую, где тепер церков святого Георгия стоит, бо на тот час не было, выехал. А так войско литовское на поли Буйницком, именю велможного его мл. князя Богдана Соломерецкого, старосты кричевского и олучицкого, на войско Наливайково вдарили и кругом оступили. Там же зранку аж до вечера, яко вже к вечерни звонити час, межи собою битву мели, якож Литва з войском великим натискали на войско Наливайкино. Предсе один другому войску мало шкоды учинили, бо великую армату, так дел и гаковниц, пулгаков вельми при себе множство мел, так же люд свой отаборив конями, возами, людом, шол моцно. Якож з дела с табору Наливайкины козаки пана зацного пана Григория Анюховского забили; первей коня под ним застрелили, а потом выпадши с табору казаки его самого розсекли. Тепер же Литва от козаков отступивши, до Могилева на больший луп поехали, а козаки всю ноч ехали до Быхова аж на низ. Литва за козаками гналася аж до Рогачева, да ничого згола не вчинили козакам; а Литва и Татары рушилися до Менска, до Новгорода и до Вильни, набравшися тутешнего краю лупу.

Документы и материалы по истории Белоруссии. Мн., 1953. Т. 1.

Сацыяльна-эканамічнае становішча сялянства ў XIV—XVI стагоддзях

У XIV—XVI стст. пераважным тыпам паселішчаў на тэрыторыі сучаснай Кармяншчыны былі невялікія вёскі і хутары. Іх насельніцтва несла павіннасці ў выглядзе паншчыны — працы на карысць князя. З паншчынай перамяжоўваўся аброк, які плацілі натурай — збожжам, мясам, мёдам. Часам натуральны аброк пераводзілі на грошы. Трэба зазначыць, што галоўную ролю ў той час адыгрывала ўсё ж не земляробства, а промыслы — бортніцтва, здабыча пушніны і інш.

Сітуацыя пачынае мяняцца з сярэдзіны XV ст. Ужо ў пачатку XVI ст.

* Помнік беларускай пісьменнасці XVI—XVII стст.

займацца гаспадаркай стала вельмі выгаднай справай. Мяса, збожжа, лес знаходзілі выдатны збыт на захадзе, і цэны на іх сталі хутка расці. Зямля набыла сілу велізарнай каштоўнасці. Але для таго, каб апрацоўваць яе і атрымоўваць прыбытак, патрабаваліся рабочыя рукі. Неабходна было, перш за ўсё, замацаваць селяніна за зямлёй, павялічыць павіннасці, паступова пераводзячы яго з аброку на паншчыну.

У 1557 г. урад праводзіць шырокую рэформу сялянскай гаспадаркі ў маёнтках, прыняўшы Устаў на падаткі. Прынцце гэтага дакумента мела дваякую мэту — узняць дабрабыт сялян і паставіць іх у становішча, пры якім бы яны маглі даваць больш плацяжоў і адбываць вялікія павіннасці на карысць казны. На справе ж ён садзейнічаў толькі яшчэ большаму запрыгоньванню селяніна. У эканамічных адносінах сялянства гібела. У прававых — не магло нідзе знайсці абароны ці аказаць актыўнага супраціўлення. Выхад у яго быў адзін — уцёкі. Менавіта так і дзейнічалі масы беларускага сялянства, уцякаючы на Украіну і папаўняючы там рады казацтва.

Дакументы сведчаць

Устаўная грамата караля намеснікам і іншым управіцелям каралеўскіх валоданняў аб відах і памерах пабораў, якія належала браць у падняпроўскіх паветах

Чэрвень 1500 г.

Намесником нашим и старцом и всим мужом Поднепрским и волостем нашим Свислоцким, Любошанским, Бобруйским обема половицам — Виленское половицы и Троцкое, — Кричевским, Пропойским, Чечерским, Горвольским, Речицким, Брагинским, Мозырским, Бчицким.

Штоестеданинашое грошовое, бобров и куниц не отнесли до скарбу нашого и меду пресного не отвезли до ключов наших до Вилни, до Троков, а которые з вас хотя будуць и дань нашу до скарбу нашого грошовую и бобры и куницы отнесли и мед пресный до ключов наших привезли не сполна, где ся што будет у волостех наших остало и мы для всих тых дел послали там до вас, на волости нашы, писара нашого, наместника Перелайского, Богуша Боговитиновича, и казали есмо ему тую дань нашу на вас сполна справити грошовую и бобры, и куницы, и мед пресный, подлуг давного обычая: за рубль грошей по две копе грошей, а за бобра чорного по копе грошей, а за карого бобра по сороку грошей, а за куницу по шести грошей, — где не будеть шерстью; а за встав меду пресного по чотыри рубли грошей, а за колоду по две копе грошей. И вы бы все сполна и з его доходом выдали конечно, по тому как перед тым бывало. А которые у вас будуть земли пустовские або люди голтяйные, абы по себе роскинули, на болшого большей, а на меньшого меньшей, как здавна бывало, абы ни один грош дани нашое у вас не остал. Також, которые промеж вас дела обидные будут кому о чем… мы казали емуж о том промежы вас досмотрети и справедливость тому вчинити.

Писан в Менску июнь… день, индикт 3.

М. К. Любавский. Областное деление и местное самоуправление Литовско-Русского государства. М., 1892. Прил. XII – XIII.

Кормянская центральная районная библиотека

Са скаргі мяшчан і сялян Чачэрскай воласці каралю Жыгімонту II Аўгусту на павелічэнне пабораў чачэрскім управіцелем

1554 г

Ознаймуем тым листом нашим, што перво сего и тых часов прыходили до нас мещане и вси люди наши волости Чечерское, жалуючы и велико собе отежаючы о том, што дей державцы тамошние первшие и теперешний державца Чечерский и Пропойский пан Юрий Миколаевич Зеновьевича крывды и тяжкости им великие делаеть, новины уводить и пожитки неслушные и вины непомерные на них собе береть, чого перед тым не бывало, для чогож дей многие люди с тое волости нашое проч ся розошли и даней и платов нашых не мало знищало. А он дей тых новин и крывд чинити перестати и ни в чом им фолькговати не хочет, о чом же их тыми часы воевода Виленский маршалок земский канцлер Великого Князства Литовского, староста Берестейский, державца Борысовский и Шовленский пан Миколай Радивил з роскázанья нашого смотрел. Очевисте они о том з ним мовили и тые кривды и тяжкости свои, на реистр списавшы, покладали, б'ючы чолом, обыхмо им уставу нашу дали, якобы ся мели наперед державцы нашы с ними справовати и которые доходы вроком на них брати.

Документы и материалы по истории Белоруссии. Мн., 1953. Т. 1.

Устаўная грамата караля Жыгімонта II Аўгуста на скаргу чачэрскіх мяшчан і сялян аб павелічэнні пабораў чачэрскім управіцелем

21 жніўня 1554 г.

Ознаймуем тым листом нашым. Што перво сего и тых часов приходили до нас мещане и вси люди нашы вол. Чычерское, жалуючы и велико собе отежаючи о том, штож дей державцы тамошние першие и теперешний державца чечерский и пропойский пан Юри Миколаевич Зеновевича крывды и тяжкости им великие делати, новины уводить и пожытки неслушные и вины непомерные на них собе береть, чого перед тым не бывало, для чого ж дей многие люди с тое волости нашое прочь ся розошли и данье и платов нашых не мало знищало. А он дей тых новин и крывд чынити перестати и ни в чом им фолькговати не хочет, о чом же их тыми часы воевода виленский, маршалок замский, канцлер Вел. кн. Лит., староста берестейский, державца борысовский и шовленский пан Миколай Радивил з роскázанья нашого смотрел. Очевисте они о том з ним мовили и тые крывды и тяжкости свои, на реистр списавшы, покладали, бъючы чолом, абыхмо им уставу нашу дали, якобы ся мели наперед державцы нашы с ними справовати и которые доходы вроком на них брати. А так мы бачачы, их што по тые часы он брал на них, то все чынил за листы нашыми и, тые вси жалобы их на сторону отложывшы, а не хотячы далей того такового обътяженья и знищенья им, подданым нашым, чынити допустити, вчинили есмо таковое постановенье:

Напервей што ся дотычеть стацыи и живности на державцу с тое волости нашое, мають они, подданые нашы, тые, которые особливые земли свои мають и особливыми сохами своими пашуть, давати ему на кождый год су хлеба, по солянце жита а по солянце овса, меречы ущорк солянкою тою, которую есмо здеся у Вильни заковавши им дати казали. А тое жыто и овес сами они до замку отвозити и отдавати мають, почоньшы от запуст Филипповых аж до ст. Николы Зимнего. А за кождою солянкою жыта мають давати городничому державцы тамошнего пищого по пенезю, а за овсом по пенезю ж водле давное повинности своее. Сена теж на кождую зиму су хлеба по возу доброму, як кляча повести можеть, мають давати. А естли бы з села до замку трудно было одною клячою тот воз вести, тогда 2 возки малых сена за один воз давати мають. Которые люди и не за рекою жывуть, тые на день св. Николы, а которые за рекою живуть, тые на боже нароженье сено отдати мають. А за тым сеном водле звыклое повинности своее будуть повинни дати по 12 пенезей а закосного копу гр. А кгды потреба вкажеть в замку што поправити або знову будовати, ино по весне 2 недели, а у восень, як обробяться, 3 недели робити и поправовати мають, што потреба вкажеть; нижли естли бы пришла робота замку знову або иная якая кгвалтовная потреба, тогды мають робити до того часу, поки заробять. А кгды они на тую роботу прыйдуть або, заробившы, до домов своих пойти усхочуть, от того ничого в них брано быти не маеть. Кади теж, што они на замок на каждый год давати повинни, тые кади потребу замковую, яко бы было без обътяжливости их, водле реестров, которые посланцы нашы, будучы там, з роскázанья нашого списа-

ли и до скарбу нашого дали, завжды на семую суботу отдавати мають, ничым того року не омешкиваючы. А за кождою кадю городничому державцы тамошнего маюць давати поставного полгроша.

А што ся дотычеть бранья вин, ино головная и злодейская вина маеть быти барна до скарба нашого по первому. А кгды хто с ним межы собою побъется не до крови, от того державца маеть брати на них вины от рубля до 10 гр., а от полтины по 5 гр. подле листа отца нашого, который они оказывали. А куниц, лисиц, бобров и кождого зверу косматого и меду пресного не мають они потаемне по домом продавати, жебы ся злодейство не множыло. А иж бы торгом нашым запоможенье деялося, для того куницы, лисицы, бобры и всякий зверь косматый и мед пресный, так теж вшелякую жывность мають они на торгу тамошнем продавати для запоможенья места тамошнего. А то все в них ценою маеть куплено быти. А пак ли бы хто з них куницы, лисицы, бобры або который иншый зверь косматый и теж мед пресный потаемне продавал, а то бы было переведено, таковый вины маеть заплатити 2 руб. гр. до скарбу нашого. А полюдья мають они давати по грошу водле давного обычая. Которые люди в месте живуть, а земли пашни свои по селам мають, таковые полюдье будуть повини давати и платити по тому, як подданые нашы волостные полюдье дають и сполняють. А строжов по 6 до замку на кождый год мають они давати. А што ся дотычеть даванью дров, ино хто воз сена дасть, тот воз дров один, як кляча повести можеть, маеть дати. А люди боярскых, которые без листов нашых земли и люди там держать, и теж мещане тамошние и бобровники тяглые и подданые нашы тые, которые, земли тяглые под собою држачы, их вжывають, мають им в метех и в роботе замковой и во всем помогати и всякие повинности весполок с ними сполняти водле давного обычая. Теж кгды озера стануть, тогда на кождую зиму кождое озеро только раз державца на себе зволотыти и рыбу брати маеть, а потом подданым нашым тамошним рыбу в тых озерах ловити вольно будеть по тому, як и перед тым бывало, нижли у езы их и в закопы никоторого уступу мети и бобров гонити и перказы никоторое в бобровых гонех державца чынити не маеть. А метов никоторых не мають они без ведомости державцы тамошнего метати и разрубливати, але кгды потреба вкажеть для платов наших господарских або для якое слушное потребы волостное розруб чынити и меты метати, тогды они з ведомостю державцы тамошнего и за вижом его, а без бытности державцы ино за ведомостью и видом наменсика его, розрубы чынити и меты метати мають. Што теж они били нам чолом, абыхмо уставу нашу им дати казали, по чому бы быдло державца в них куповати мел, того ся нам учыџнити и уставы на быдло давати им не видело, але мають ся они в том заховати водле давнего обычаю. А которую сторожу повинни они от татар в Гоми держати, ино иж кождому оборона и осторожность есть потребна, для того на туую сторожу яко подданые нашы волостные, так теж попы тамошние и теж люди боярские мають на кождый год с хлеба по 2 гр. давати. А державца, вземшы в них тые пенези, маеть за то аж до году сторожу в Гоми мети. А што они за данью 7 коп гр. и по 4 гр. пишчого давати не хотели и с того ся выламывали, поведаючи, иж того давати неповинни, ино державца слался на бояр тамошних, поведаючы, иж они здавна то даивали; але иж они на тот довод слати ся не хотели, для того и теперь туую 7 коп гр. за данью и по 4 гр. пишчого державцы давати будуть повинни. А естли бы они на тые роки вышейписаные жыта, овса, сена и кадей не отдали и в недбалость то собе покладаючы, тых роков омешкали, а децкий для того до них поедеть, тому децкому помильное платити они будуть повинни на кождую милю по грошу.

А так вжо от того часу державца чычерский и пропойский пан Юри Миколаевич Зеновъевича и по нем будучые даржавцы нашы мають подле тое уставы нашое с поддаными нашыми чечерскими без жадное обтежливости их справоватися и в тых во всих речах их заховати, ничого не отменяючы, ани прибавляючы и ничым с того не выступаючы, яко вышей в сем листе нашом установном стоить описано, под ласкою нашою господарскою. А подданые теж нашы чечерские туую уставу нашы такеж во всем полнити мають, ничым с нее не выступаючы, под виною нашою. Которая ж устава им подданым нашым вол. Чечерское маеть быти до воли и ласки нашое господарское, якже на твердость того и печать нашу казали есмо приложыти к тому листу нашому. Писан у Вильни лет[а] бож[ьего] народж[енья] 1554 месяца августа 21 дня.

М. В. Довнар-Запольский. Очерки по организации западнорусского крестьянства в XVI в. Киев, 1905. С. 61–65.

З Баркулабаўскага летапісу

1. — 1582 року многае множества страшных и великих чудес господь бог оказати рачил: перуны и грады великие, сухость, морозы амаль не через все лето были у Литве. От велико-

Карм'янская цэнтральная раённая бібліятэка

го морозу на поли у колосьи жито посхло, многия домы панов зацных от перунов великих погорели, зиме, з морозов и метелицы, по дорогам многое множество людей убогих, также и купецких померло. А лете великий жар был: жыто, яри, трава, также ярины огородные все погорело у Литве, а звлаща около Менска, около Вильни. Люди убогия з хлеба на Русь давалися — молодцы, жонки, девки, много на Русь и на Украину понаходило.

4. — Року 1592, июня по старому 11 дня в неделю. Была брань великая, вельми страшная: почавшы от западных краев замков украинских — Чернигов, Гомель, Любеч, Белая Церков, Переяславль, Стрешин, Речица, Рогачев, Крычев и иных многих мест и замков: в тых всих по селах и местах и местечках немало збожа попсовала град и бура великая, а на бору и на лесе и по лугом со пчолами дерева бортное на воде угнала згола, штось трохо зостала, — буря великая поломала; на тот час давали справу и жалосно поведели, иж дей у в одного мужа Северского бортного дерева сто поломило, у другого двест у третего триста, иж страшно о том слышати было; дороги кажды от села до села волостью прочищали, навет и тепер на лесех, на бор и по болотах, поломатые видети много.

Могилевская старина. Вып. 1. Могилев, 1901.

Аб вёсках Кармяншчыны XVII—XVIII стагоддзяў

Бярозаўка, Восаў, Струмень, Ліцвінавічы, Зяцькавічы, Вашчанкі, Кароцькі, Ворнаўка, Сапажкі — вось далёка не поўны пералік вёсак Кармянскага раёна, аб якіх пішуць дакументы — "Інвентары Чачэрскага староства" 1704 і 1726 гг., даючы тым самым падставу лічыць, што гэтым населеным пунктам ужо некалькі стагоддзяў існавання. Інвентары даюць шырокі эканамічны аналіз тагачаснага жыцця беларускіх сялян.

Так, указваецца, колькі ў той ці іншай вёсцы дымоў (за адзін дым лічыліся кожны двор, манастыр, шляхецкі дом, а таксама кожная сялянская хата, гаспадар якой апрацоўваў зямлю. З дыма збіралі падатак, які называлі падымным). Згодна з інвентаром 1704 г., самымі буйнымі пасяленнямі былі Ліцвінавічы і Струмень, дзе налічваліся па 9 дымоў. Яны ж, бачна, былі і самымі старымі пасяленнямі з усіх іншых. Колькасць дымоў у астатніх была наступнай: Калюды — 7, Вашчанкі — 3, Зяцькавічы — 2, Бярозаўка — 1.

Цікава прасачыць і паходжанне назваў вёсак. Несумненна самым маладым населеным пунктам пачатку XVIII ст. была Бярозаўка — 1 дым. Яе назва ўказвае на ўзнікненне пасялення ў бярозавым гаі, дзе гаспадар і зрубіў сваю хату і гаспадарчыя прыбудовы. Цікава, што, па дакументу, бярозаўскі гаспадар валодаў 22—24 валокамі зямлі (валока — гэта галоўная пазямельная мера ў Вялікім княстве Літоўскім і Рэчы Паспалітай; напрыклад, літоўская валока раўнялася 19,5 рускай дзесяціны, а старая і новая польскія валокі — адпаведна 16 і 15 рускім дзесяцінам). Гэтыя валокі гаспадар адваяваў у лесу, расчысціў плошчу ад бярозавых парасткаў.

Вёска Зяцькавічы, мяркуецца, узнікла дзесьці ў другой палове XVII ст. як магчымы выселак з суседніх Ліцвінавіч. Назва яе ўтварылася ад абагульненай (калектыўнай) мянушкі Зяцькавічы, якая адносілася да першых пасяленцаў вёскі. Гэта калектыўнае абазначэнне ў сваю чаргу ўтварылася ад слова "зяць", "зяцёк". Напэўна, зяць нейкага гаспадара з Ліцвінавіч вырашыў заснаваць асобную гаспадарку, каб быць цалкам незалежным, выселіўся з сям'ёй на пустэльныя землі, дзе і атабарыўся. Усе дзеці і ўнукі гэтага чалавека лічыліся зяцькавічамі, гэта значыць патомкамі зяця. Тады, хутчэй за ўсё, і замацавалася за вёскай яе цяперашняя назва.

Прыкладна так атрымалася і з Ліцвінавічамі. У вёсцы, як мяркуецца, жылі патомкі ці падуладныя Ліцвіна. У сваю чаргу, такое прозвішча ці мянушка ўзніклі на аснове этнічнага наймення ліцвіна, як увогуле жыхара Вялікага княства Літоўскага.

У інвентары 1726 г. ёсць раздзел пра насельніцтва. Так, мяшчане ўяўлялі сабой уласна гарадскіх жыхароў. А вось баяры, продкі больш позняй шляхты XIX ст., сяліліся асобнымі пасёлкамі і мелі ў сваім карыстанні ўчасткі зямлі, за што плацілі падатак, які называўся гіберна. У 1726 г. у Багданавічах было 5 баярскіх дымоў, якія плацілі 100 злотых гіберны; у Жабіне — 10 баярскіх дымоў (280 злотых у якасці падатку); у Кароцьках — 10 дымоў і 110 злотых; у Енцах — 9 дымоў і 200 злотых; у Ворнаўцы — 9 дымоў і 200 злотых. Акрамя таго, 7 баярскіх дымоў існавала ў ваколіцах в. Струмень, гаспадары якіх плацілі 120 злотых гіберны.

Інвентары 1704 і 1726 гг. паказваюць, што з ростам колькасці насельніцтва павялічвалася і колькасць двароў. У Бярозаўцы стала ўжо 3 дымы, Калюдах — 9, Ліцвінавічах — 16.

Дарэчы, баяры, як асобнае саслоўе, неслі асаблівыя, толькі ім прысвоеныя абавязкі. Так, яны павінны былі будаваць і безадкладна рамантаваць будынкі замка, байніцы, брамы, манастыры; у час кірмашоў ад баяр патрабавалася пасылаць у Чачэрск на варту па чалавеку ад ваколіцы, а пры неабходнасці абароны замка і граніц баярам увогуле неабходна было ўсім станавіцца пешымі і коннымі атрадамі з баявой зброяй.

А. Рогалеў

Кляпін

Вёска Кляпін была заснавана ажно ў 1667 г. На картах XVIII і пачатку XIX ст. яна абазначана як Клятвін — па назве рэчкі Клятвінкі. І толькі ў сярэдзіне XIX ст. назвы вёскі і рэчкі змяніліся на Кляпін і Кляпінку. У чым загадка?

Існуе паданне, што ў адзін з майскіх вечароў пан Васілеўскі згвалціў вясковую дзяўчыну Марысю, каханую юнака Ігната. Дзяўчына, супраціўляючыся, пакусала ганебніка, за што атрымала трыццаць бізуноў. Зняслаўленая, абражаная, яна ледзь не рассталася з жыццём.

Ігнат з братамі Пятром і Піліпам ноччу вывезлі ў лес свае сем'і і Марысю з няхітрымі пажыткамі, а самі вярнуліся ў вёску. І хутка жанчыны ўбачылі, як запалала чырвоным агнём ускраіна неба над вёскай. Вярнуліся на панскіх конях браты. Лес добра схаваў уцекачоў. У рэшце рэшт спыніліся ля струменчатай рачулкі і рашылі, што лепшага месца і шукаць не варта. І зноў прагучала клятва: панам тут не панаваць. Рачулку назвалі Клятвінкай, а новае паселішча Клятвінам. Сюды паціху пацягнуліся многія з тых, каго ўлада прrandaвала...

У зборніку "Магілёўшчына", які выдадзены ў 1922 г., у раздзеле "Сялянскія бунты на Магілёўшчыне" ёсць такія радкі: "У маі 1667 г. тры браты зарэзалі пана Васілеўскага, што маёнтак меў на Чэрыкаўшчыне, спалілі падвор'е і ўцяклі з сем'ямі ў лясы". Ёсць, значыць, выснова ў падання. А зменена ранейшая назва хутчэй за ўсё па палітычных матывах: не хацелася ўладам, каб людзі ведалі пра згвалтаванне і бунт братоў, вось і перайменавалі Клятвін у Кляпін. Самі кляпінцы па сённяшні дзень у гэтым да канца ўпэўнены. І, бачна, небеспадстаўна.

Карма

Упершыню Карма ўпамінаецца ў "Параўнальных сведках аб колькасці жыхароў у маёнтках Міхаіла Фёдара Яльца ў 1691 г. перад пачаткам казацкіх войнаў". Дакумент гэты напісаны на польскай мове і надрукаваны ў выданні "Архіў Паўднёва-Заходняй Расіі" (Кіеў, 1876. Т. II, VI. С. 207).

Населены пункт Карма таксама абазначаны на "Геаграфічнай карце Магілёўскай губерні, на чатыры правінцыі раздзеленай", якую склаў у 1776 г. Я. Шмідт, а таксама на карце Магілёўскай губерні на польскай мове без даты.

Кармянская центральная районная библиотека

Мястэчка Карма адзначана ў "Эканамічных заўвагах да планаў Генеральнага межавання Рагачоўскага павета", складзеных у канцы XVIII ст. Там, у прыватнасці, гаворыцца: "Мястэчка Карма агульнага валодання былой польскай гвардыі харунжага і былога рагачоўскага прадвадзіцеля Філіцыяна Аляксандрава, былых войскаў польскіх генерал-ад'ютанта Герарда Сцяпанава; дзяцей Быкоўскіх, выдзеленай царкоўнаю зямлёю. Колькасць двароў — 24, па пятай рэвізіі душ мужскіх — 61, жаночых — 70. Ляжыць на беразе ракі Кармянкі. У гэтым мястэчку царква уніяцкая драўляная аб адным прыдзеле і двух алтарах у Імя Міколы Цудатворца. Яўрэйскіх двароў драўляных — 54, яўрэйская школа і гасціны дом, у ім лавак 22 драўляныя, у якіх яўрэі гандлююць рознымі таварамі, харчовымі і іншымі вясковымі прыпасамі, гандаль праходзіць кожную нядзелю. На яго наязджаюць сяляне з бліжэйляжачых вёсак. Кірмашоў у год бывае чатыры, на іх з'язджаюцца з навакольных мястэчкаў купцы з рознымі краснымі і рэдкімі таварамі, а з маларасійскіх слабод з соллю, мылам, рыбай, жалезам і другімі вясковымі прадуктамі... Кірмашы працягваюцца не больш трох дзён. На рацэ Кармянцы мукамольны млын аб дзвюх паставах, дзейнічае ў вясеннія дні... Сяляне апрацоўваюць землі памешчыкаў, на якіх пашуць пяцьсот шэсцьдзесят дзесяцін, а аброкам абкладзены з чвэрці зямлі па тры рублі, а астатнюю ўсю зямлю на сабе апрацоўваюць, прамышляюць хлебаробствам, да якога яны вельмі здольныя. Жанчыны, акрамя палявых работ, займаюцца рукадзеллем, прадуць лён, шэрсць і паскон, ткуць халсты і сукны для свайго спажывання і на продаж. Па зажытках сваіх адносяцца да больш-менш забяспечаных" (Ф. 1355. Зап. 1, № 727. Л. 110—114).

У "Геаграфічным слоўніку Расійскай Імперыі" П. П. Сямёнава запісана: "Карма, мястэчка Магілёўскай губерні, Рагачоўскага павета, у 60 вёрстах на ўсход ад павятовага горада пры рэчцы Парычаўцы, ля правага берага ракі Сож, на якой маецца прыстань. У XVII стагоддзі ўваходзіла ў колькасць пасяленняў Гомельскага староства і значылася мястэчкам у 1784 г. Колькасць людзей — 1497 абодвух полаў (1268 яўрэяў, 121 двор, праваслаўная царква, сінагога, два яўрэйскія малітоўныя дамы)" (СПб., 1865. Т.ІІ. С. 725).

С. Р. Доўгава, О. Г. Санін

Колькі гадоў Карме?

Да нядаўняга часу меркавалася, што Карме тры стагоддзі. І вось новае пасведчанне. Яго даслаў супрацоўнік Публічнай бібліятэкі імя М. Я. Салтыкова-Шчадрына з горада на Няве Мікалай Мікалаеў, дарэчы, па паходжанні беларус.

У юрыдычным акце, а дакладней, контркамесейным квіце, выпісаным з каптуравай кнігі Рэчыцкага павета, значыцца, што генерал Рэчыцкага павета ў прысутнасці шляхціцаў Яна і Міхаіла Закрэўскіх і пана Самуэля Хведаровіча перадае рэчыцкаму гарадскому пісару Паўлу Квялчэўскаму на вечнае карыстанне "двор у Карме". Двор называўся Куракаўшчынай (вёска з гэтай назвай і зараз прылягае да Кармы). Названаму вышэй пісару перадаваліся таксама паласа бору з борным дрэвам, што пачынаўся адразу ж непадалёку ад Куракаўшчыны, а яшчэ паласа бору каля рэчкі Добрыца, сенажаці ля Сажа ва ўрочышчах Уладычная, Ланіца і Пральня (дарэчы, сярэдняя з назваў захавалася і да нашага часу).

Гэты дакумент датаваны 1696 г. (што некалькі пазней дакумента "пана" Міхаіла Яльца, названага першым). Калі ў 1696 г. "двор у Карме" з прылягаючымі да яго ўгоддзямі ўжо перадавалі ў валоданне, значыць, было што перадаваць, было чым валодаць. І збіраецца такое, як вядома, не год-два, а дзесяцігоддзі. Таму версія заснавання Кармы ў 1696 г. застаецца толькі версіяй.

Дасланы Мікалаем Мікалаевым дакумент напісаны на беларускай мове. І гэта ў той ужо час, калі пастановай усеагульнай канферэнцыі саслоўяў у Вялікім княстве Літоўскім было забаронена пісаць на беларускай мове дзяржаўныя дакументы. Пасля шырокага ўжытку беларускую мову пачалі паслядоўна выцясняць з абароту. Ёсць думка, што ў даным выпадку зварот да беларускай мовы зрабіў падстараста Рэчыцы Стэфан Антоній Скарына — нашчадак славутага першадрукара і асветніка.

Ліст з Санкт-Пецярбурга прыадкрывае больш сівую гісторыю Кармы.

К. В. Смірнова

Адкуль пайшло імя тваё, бацькаўшчына?

У Гомельскай вобласці назва "Карма" вельмі распаўсюджана. Так, Карма ёсць у суседнім Буда-Кашалёўскім раёне, Добрушская Карма. Такую ж назву носіць і наш раённы цэнтр, вакол якога прыгожыя мясціны, багатыя нетры, многа працавітых, таленавітых людзей.

Аб паходжанні назвы ходзяць самыя розныя легенды. Адно з паданняў сцвярджае, што ў далёкія часіны спыняўся ў тутэйшых насельнікаў на начлег славуты падарожнік Афанасій Нікіцін, які зрабіў сваё "Хаджэнне за тры моры" (1463–1467).

У другім гаворыцца, што раней гэтыя мясціны былі мнагаводнымі, і людзі займаліся караблебудаваннем. Легенду пацвярджае такі факт: ля вёскі Струмень, што на рубяжы з Краснапольскім раёнам, ёсць балота пад назвай Карабельнае. У ім некалі і сапраўды знайшлі рэшткі старажытнага карабля...

Але найбольш верагодна, што назва "Карма" пайшла з таго часу, калі на поўдзень праз гэтыя землі быў пракладзены шлях, які месцамі захаваўся і да нашых дзён. У час падарожжа царыца Кацярына II спынялася тут "на кармленне", а потым ехала далей на Чачэрск. Праезджыя тады і сапраўды карміліся там, дзе было што паесці ці купіць...

Мясцовыя ж старажылы і гісторыкі прытрымліваюцца іншай версіі. У XIV–XVI стст. княжацкія слугі і багатыя баяры набылі права атрымліваць кармленне (магчыма, "кармы") з тых мясцін, што замацоўваліся за імі за пэўныя заслугі. Права на кармленне выяўлялася не толькі ў зборы "кармоў" натурай і грашыма, але і ў кіраванні гэтай тэрыторыяй, яе насельнікамі. Так званае кармленне адмяніў Іван Грозны земскай рэформай у 1555 г. А вось назвы засталіся на стагоддзі.

К. В. Смірнова

У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

Шляхам двух стагоддзяў

У выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) тэрыторыя сучаснай Кармяншчыны ўвайшла ў склад Расійскай імперыі. Землі і вёскі, якія раней належалі польскай Кароне, пераходзілі пад Расійскую юрысдыкцыю, а спадчынныя пакідаліся іх законным уладальнікам. У канцы таго ж года жыхары Кармяншчыны далі прысягу на вернасць Кацярыне II. На новых землях была створана Магілёўская губерня на чале з губернатарам генералам Кахоўскім. Арганізацыяй яе вельмі цікавілася і сама імператрыца. Ад імя Кацярыны губернатар склаў адозву да насельніцтва, у якой абяцаліся свабода веравызнанняў, сцвярджэнне праву законных маёмасцей, права і вольнасці расійскіх падданых.

У 1777 г. на Беларусі адбыўся новы губернскі падзел на паветы і было ўведзена

Кармянская центральная районная библиотека

агульнае кіраванне. Згодна з ім мястэчка Карма, таксама як і Чачэрск, Шарсцін, прыпісвалася да Рагачоўскага павета. Даўжыня граніц новай адміністрацыйнай адзінкі складала 707 вёрст, колькасць насельніцтва — 26 323 жыхары. Дарэчы, у хуткім часе Карму нават наведала сама імператрыца.

Далучэнне поўдня Беларусі да Расійскай імперыі дало магчымасць да ўключэння і Магілёўскай губерні ў агульнарасійскую гаспадарчую сістэму, стварыла перадумовы для больш хуткага развіцця эканомікі.

У далучаных абласцях палітыка царскага ўрада зводзілася ў першую чаргу да таго, каб захаваць "цішыню і спакой". На беларускія гарады, якія мелі магдэбургскае права, а таксама на цэнтры паветаў пашыраліся льготы, якія былі вызначаны ў 1785 г. Дароўнай граматай. Усё насельніцтва, незалежна ад звання і чыну, павінна было ў месячны тэрмін прысягнуць на вернасць царскай уладзе. Памешчыкам, якія давалі такую прысягу, пакідаліся маёнткі і прыгонныя. Яны мелі тыя ж самыя правы, што і рускія дваране. Тыя ж, каторыя прысягаць не жадалі, абавязаны былі выехаць за межы рускай дзяржавы. На працягу трох месяцаў ім дазвалялася прадаваць маёмасць. Калі ж тэрмін, адведзены на гэта, заканчваўся, а памешчык маёнтак не прадаў, то маёнтак гэты падлягаў канфіскацыі і аддаваўся ў казну.

У пачатку XIX ст. Карма, як і раней, заставалася невялікім мястэчкам, дзе жылі пераважна рамеснікі і гандляры. Суровым выпрабаваннем для жыхароў павета стала Айчынная вайна 1812 г. На яго тэрыторыі дыслацыраваліся перадавыя злучэнні другога рэзервовага корпуса генерала Ф. Ф. Эртэля, якія прыкрывалі ад пранікнення напалеонаўскіх войск краіну. Больш чым два месяцы воіны 3-га Бугскага палка пад камандаваннем палкоўніка Кляноўскага не толькі трымалі абарону, але і вялі актыўныя атакуючыя дзеянні супраць французаў, знішчалі нязваных гасцей. Адзін з такіх баёў адбыўся, як сведчаць дакументы, і ў мястэчку Карма. Руска-французская вайна, а затым некалькі амаль падрад неўраджайных гадоў прывялі ў заняпад гаспадарку краю, насельніцтва яго рэзка скарацілася.

Увогуле аграрная палітыка царызму на далучаных тэрыторыях была накіравана на пашырэнне землеўладання дваранства і ўмацаванне памешчыцкага землеўладання наогул.

Большасць насельніцтва з'яўляліся прыгоннымі сялянамі. Іхнія павіннасці былі ў асноўным такімі: тры дні на тыдзень паншчыны для мужчын (з канём) і тры — паншчыны для жанчын (пешай); гвалты(талокі) — згон сялян у час уборкі сена, збожжавых і інш.; шарваркі — будаўнічыя работы ў маёнтку памешчыка (будаўніцтва дарог, мастоў, жывёлагадоўчых памяшканняў і інш.); павіннасць дарожная — перавозка прадуктаў памешчыцкай гаспадаркі да месца продажу; даніна — збор грыбоў і ягад для памешчыка, здача яму прызначанай колькасці курэй, яек, дроў і інш.; пража для памешчыка пэўнай колькасці палатна.

Існавалі і дзяржаўныя падаткі, якія аплачваліся грашыма.

Прыгонныя сяляне знаходзіліся ў поўнай залежнасці ад сваіх памешчыкаў. Але, бадай, яшчэ больш цяжкім было становішча для іх у маёнтках дзяржаўных. Арандатары (часовыя ўладальнікі) стараліся выціснуць з сялян як мага больш.

Далейшы ўціск прыводзіў да новых сялянскіх хваляванняў.

Рэвалюцыйная сітуацыя канца 1850 — пачатку 1860-ых гг., абумоўленая крызісам феадальна-прыгонніцкай сістэмы і зараджэннем капіталістычных адносін, стала галоўнай прычынай, якая прымусіла царызм у 1861 г. пайсці на адмену прыгоннага права. Сяляне Кармяншчыны, як і па ўсёй Расійскай імперыі, атрымалі асабістую волю і магчымасць распараджацца сваёй маёмасцю. Але адмена прыгоннага права не ліквідавала прыгонніцкія перажыткі. Большая частка зямлі засталася за памеш-

чыкамі. Пры раздзеле землеўладальнікі пакінулі за сабой і лепшыя ўчасткі. Сяляне засталіся ў асноўным малазямельнымі. Павінны былі заплаціць памешчыку і за волю, і за зямлю. Выкуп асабістай волі быў замаскіраваны ў завышэнні цаны за зямлю. Вядома, сяляне не мелі грошай, неабходных для выкупу. 80 працэнтаў неабходнай сумы давала дзяржава. Сяляне ж рабіліся даўжнікамі на 49 гадоў. Выплачвалі не толькі суму доўгу, а і працэнты за пазыку. Былі вымушаны браць у памешчыкаў надзелы, апрацоўваць іх сваім інвентаром і засяваць уласным насеннем. А калі прыходзіў час уборкі ўраджаю, то палову ад намалочанага трэба было аддаць памешчыку.

"Палажэнні 19 лютага" прадугледжвалі новы парадак кіравання сялянамі. Ён быў заснаваны на выбарнасці ніжэйшых службовых асоб. Жыхары сельскай грамады выбіралі старасту. На валасных сходах сельскія старасты і ўпаўнаважаныя ад кожных 10 двароў выбіралі валаснoе праўленне, валаснога старшыню і суддзю. Функцыі новых органаў сялянскага самакіравання былі надзвычай абмежаваныя. Галоўнымі абавязкамі сельскіх улад былі: раскладка і збор падаткаў, кантроль за выкананнем сялянамі іхніх павіннасцей, рэгуляванне пазямельных узаемаадносін паміж сялянамі, арганізацыя ў вёсках паліцэйскай службы (соцкія, дзесяцкія).

Па "Палажэнні", кожны мужчына павінен быў адпрацаваць на пана 40 дзён у год, прычым прыходзіць трэба было са сваім канём. Для жанчыны паншчына складала 30 дзён.

У дачыненні да сялянства дзейнічаў закон кругавой парукі, што з'яўлялася перажыткам сярэднявечча. Сярод іх распаўсюджваліся чуткі аб падмене памешчыкамі царскага маніфеста, скажэнні ягонага зместу. Гэта прыводзіла да хваляванняў.

Самымі багатымі памешчыкамі на Кармяншчыне былі палякі Дзерналовічы і Быкоўскія. Яны валодалі зямлёй, што прылягала да Кармы. У вёсках Навасёлкі, Бялёў панаваў Случаноўскі, у Хізаве — Жмыхоўскі, у Пятравічах — Чарапанаў. Графу Чарнышову належалі ўсе землі на правым беразе Сажа, в. Ліцвінавічы, ды яшчэ і суседняя Чачэршчына. Засажэўем і в. Кляпін валодаў пан Стош.

З сельскагаспадарчых культур на Кармяншчыне ў асноўным сеялі жыта, грэчку і яравую пшаніцу, высокія ўраджаі давалі лён і каноплі, таму, напэўна, тут былі самыя вялікія плантацыі гэтых культур па Магілёўскай губерні.

Пастувова развівалася і жывёлагадоўля, вырошчваліся авечкі, свінні. Значна пашырыліся плошчы пад садамі, больш стала пасек. Садавіна і мёд ішлі на продаж у вялікія гарады — Маскву, Пецярбург, Рыгу, Кіеў, Магілёў.

Вельмі шмат праблем прынесла мясцоваму насельніцтву, у тым ліку і кармянцам, будаўніцтва шашэйных шляхоў з Масквы ў Варшаву і з Пецярбурга ў Кіеў, якія праходзілі па тэрыторыі павета. У той жа час будаўніцтва спрыяла развіццю інфраструктуры гаспадаркі не толькі адміністрацыйнага цэнтра павета, але і мястэчак, прыпісаных да яго. У 1879 г. у павеце ўжо налічвалася 79 вінакурных заводаў, некалькі буйных мануфактур. Але найбольш значнае развіццё атрымаў гандаль, якому садзейнічалі вялікія рэкі Днепр, Сож, Друць. Галоўнымі прадметамі гандлю былі лес, смала, гарэлка, пянька, коні.

Па афіцыйных даных Цэнтральнага статыстычнага камітэта за 1886 г., у Кармянскай воласці Рагачоўскага павета было: 14 сельскіх грамадстваў, 22 абшчыны, 26 пасяленняў, 913 двароў, 1985 душ насельніцтва (па рэвізіі), 2605 — па сялянскіх спісах.

У сельскіх грамадствах налічвалася 10 517 дзесяцін зямлі, з іх пашы — 6070. У мясцовых памешчыкаў і дробных уласнікаў было 2065 дзесяцін, а пашы — 4832. У сапраўднасці 80 працэнтаў усіх зямель належала 13 мясцовым памешчыкам.

Кармянская центральная районная библиотека

Дакументы сведчаць

Наказ Кацярыны II аб арганізацыі ўпраўлення беларускімі абласцямі і кіруючыя дырэктывы губернатарам

Генерал-майорам Каховскому и Кречетникову, с приложением наказа — по коему они должны поступать при исправлении должностей губернаторов в присоединенных от Польши губерниях.

Из следующего при сем, за подписанием нашим, наказа, усмотрите вы, что решились мы ныне на присоединение к империи нашей некоторых Польских земель, и что мы поручаем вам одну из новоучреждаемых губерний. Сие сообщаем вам теперь для единственного вашего известия и содержания в секрете, пока зачатое нами о том дело не доведено будет до совершенного окончания, и пока не получите вы о том от нас уведомления. Между тем же повелеваем вам принять команду над находящимися в составляющих будущую губернию вашу землях войсками, и стараться собирать там все предписуемые вам наказом нашим и до будущего управления тех земель потребные сведения, под предлогом распоряжения справедливой и соразмерной репортиции в поставке провианта и фуража, будто б для отвращения через то как всяких от небольших деташаментов, случающихся иногда продерзностей и наглостей, так и неравных от земских коммисаров сборов, отягощающих и оскорбляющих мелкое дворянство, и чтоб тем самым доставлять по обывательским жалобам справедливое правосудие. Вы имеете также исполнять и во всем прочем по содержанию наказа, поелику то с вышеписанным предлогом согласоваться будет, и не может открыть рановременно прямых наших намерений.

НАКАЗ

по которому на первый случай поступать господам генералам майорам Каховскому и Кречетникову в отправлении должности губернатора в губернии Псковской и Могилевской.

Причины, кои нас принудили присоединить некоторые провинции Польской республики к империи нашей, вы усмотрите из печатного о том манифеста, и для того за излишнее почитаем здесь о том упомянуть. Мы единственно только через сие заблагорассудили предписать правила управления сих провинций и приобретений.

1. Порядок во всем есть душа правления: того для, дабы способнее руководствовать сими новыми приобретениями, за благо признали мы разделить сии земли на две губернии, а именно:

2. Под именем Псковской губернии включить часть наших провинций, приписав из новых те уезды, поветы, или иного названия земли, кои по близости удобнее.

3. Вторая Могилевская губерния называться будет.

4. Псковская губерния будет состоять из провинций: 1. Псковской, 2. Великолуцкой, 3. Двинской, в которую переименовать польскую Лифляндию, 4. Полоцкой, состоящей из той части Полоцкого воеводства, которая в наши границы входит, и из Витебского по правую сторону реки Двины. Губернским городом назначается Опочка, который для того и устроить нужно.

5. Могилевская губерния составится из провинций: 1. Могилевской, 2. Оршанской, 3. Рогачевской, 4. Витебской. Сия составится из лежащих мест между реками Двиною и Днепром, входящими в наши границы, губернским городом быть имеет Могилев.

6. Мы вверяем вам г. генерал-майору отправление должности губернатора на первый случай.

В губернии Псковской и Могилевской.

7. Состоять вам по сей должности под ведением генерала-губернатора графа Захара Чернышева, которому на два года повелели мы отправлять генерал-губернаторскую должность обеих сих губерний.

Указ Кацярыны II Сенату

Збор пагалоўных падаткаў з насельніцтва беларускіх губерняў

Всемилостивейши повелеваем, с начала будущего 1780 г. впредь до указа нашего собирать подати в Белорусских наместничествах Могилевском и Полоцком в год поголовные с крестьян по 35 копеек в том числе по получетверику муки, да за винную продажу по 20 коп.

с головы; с городов поголовные с мещан по 60 коп. за винную продажу по рублю с головы; с местечек за винную продажу по 50 коп. с головы; арендные по 50 коп., да поголовные с жидов по 50 коп. с каждой.

Полный хронол. сбор законов и полож., касающ. евреев. Сост. Леванда. СПб., 1874. С. 27.

Са справаздачы магілёўскага губернатара за 1847 г. аб стане сельскай гаспадаркі губерні

23 марта 1848 г.

Сельское хозяйство

Положение крестьян Могилевской губ. относительно сельского их хозяйства находится в том же жалком состоянии, в коем я имел счастие представлять в. и. в. во всеподданейшем отчете за 1846 г. Быт их не может быть улучшен, доколе не будет обращено постоянное попечение об исправлении их нравственности искоренением излишнего употребления вина, которое при недостатке жизненных потребностей, происшедшее от частых неурожаев и упадка торговли, лишает их последней возможности и к благоустройству своего состояния.

Картофель в губернии разводится в значительном количестве, который в неурожайные годы служит пособием крестьянину к прокормлению своего семейства, а владельцу во время урожаев — к возделыванию из оного вина, но в прошлом 1847 г. при самом добывании из земли он большею частию подвергся гниению...

Са справаздачы магілёўскага губернатара за 1859 г.

Становішча прыгоннікаў і прыгоннага сялянства Магілёўскай губерні ў канцы 50-ых гг.

...Направляя деятельность дворян на занятие наименее для них выгодное — земледелие, крепостное право с другой стороны препятствовало и его возможному, по крайней мере, развитию: крестьяне, не имея никаких прав собственности на обрабатываемую землю, не имея возможности располагать своею работою, зная, с другой стороны, что помещик во всяком случае должен кормить их, не заботились ни об улучшении своего хозяйства, ни о снискании себе средств существования, барщинная работа отбывалась небрежно с слабосильными лошадьми или волами мелкой породы; крестьяне приходили в крайнюю бедность, а помещики, вынужденые снабжать их на свой счет рабочим скотом, часто кормить их в продолжении, по крайней мере, 6 месяцев в году и платить за них казенные подати, должны были довольствоваться плохою обработкою полей, производительность которых с каждым годом уменьшается, и Могилевская губерния приобрела репутацию бесплодной, хотя уезды Гомельский, Рогачевский, отчасти Быховский и Мстиславский могут по качеству почвы считаться даже плодородными.

Готовящееся по воле в. и. в. преобразование быта помещичьих крестьян должно иметь самые благоприятные последствия для Могилевской губернии, где крепостное право более чем в великороссийских губерниях имело характер личного рабства...

...Но для того, чтобы освобождение класса земледельцев совершилось мирно без всяких потрясений, без нарушения чьих либо прав и чтобы дворянство сохранило сословное свое значение, необходимо, кажется, с одной стороны, чтобы преобразование это не повлекло за собою разорения помещиков, а с другой стороны, чтобы оно по возможности осуществило возбужденные между крестьянами ожидания; местные же обстоятельства края таковы, что цель эта может быть достигнута только при возможно радикальном и быстром изменении существующего порядка, при совершенной отмене обязательных отношений между помещиками и крестьянами, породивших взаимную неприязнь, и при полном вознаграждении помещиков за отходящую от них землю. Таким образом, в Могилевской губернии выкуп крестьянами как усадьб, так и полевых угодий представляет лучший исход этого дела; оставление же крестьян барщинниками или оброчниками помещиков будет иметь, вместо благотворного, гибельное влияние на благосостояние дворян, в особенности менее значительных, которых в Могилевской губернии весьма много. Они разорятся окончательно, потому что, будучи обре-

Кормянская центральная районная библиотека

менены долгами как казенными, так и частными, не имеют достаточно капиталов на издержки для введения новой системы хозяйства, необходимой при предстоящей перемене, и притом, будут лишены возможности исправно уплачивать долги, вследствие уменьшения доходов, которое при сохранении обязательного труда или оброка совершенно неизбежно, так как крестьяне не понимают свободы, при которой они были бы обязаны отбывать какие-либо повинности помещику.

При таких обстоятельствах освобождение крестьян без обращения в собственность их за определенное вознаграждение полевых угодий может быть выгодно только для богатых владельцев, которых здесь весьма мало. Сознание необходимости выкупа кроме усадьб и полевых угодий вполне выразилось в постановлении Могилевского крестьянского комитета, который значительным большинством числа 2/3 голосов признал необходимость оного.

...Промышленность Могилевской губернии не заслуживает особенного внимания, в особенности между крепостным классом она стоит на весьма низкой степени, хотя нельзя не заметить, что Могилевская губерния по богатству находящихся в ней лесов, по соседству с южными губерниями, хорошим путям сообщения и судоходным рекам заключает в себе залоги развития промышленной деятельности. Низкое состояние ремесел нельзя между прочим не приписать тому, что в Могилевской губернии крепостным классом барщина отбывается с рабочих душ, а не с тягол, как это существует в великороссийских губерниях, через это все лица крепостного звания, будучи обязаны барщиною, лишены возможности отлучаться в другие губернии или вообще с места постоянного жительства, а следовательно и заниматься с выгодою промыслами.

ЛОЦИА. Архив МВД. 1860. № 21.

Са справаздачы генерал-губернатара аб становішчы з асноўнай цяглавай сілай у вёсках Рагачоўскага павета ў 70-ых гг. XIX ст.

Рогачевский уезд. Основным занятием в крестьянском хозяйстве является хлебопашество; лошади употребляются для всех полевых работ. В зимнее время в немногих местностях занимаются вывозкою леса, по найму лесопромышленников, преимущественно к пристаням рек. Напр., этим промыслом занимается небольшая часть крестьян из селений.

Распространение в крестьянских хозяйствах травосеяния могло бы, по мнению некоторых лиц, производивших перепись, способствовать развитию коневодства. Замечено, что более рослые лошади обыкновенно находятся в худшем теле, потому что, требуя большего количества корма, редко могут довольствоваться скудной порциею, обыкновенно даваемою местным крестьянским лошадям. Лучший вид лошадей соответствует времени пользования подножным кормом и осени, когда в корме является избыток. В худшем виде лошади бывают весною, по недостатку корма. В 1-м стане сравнительно с другими менее распространены пороки, и лошади относительно лучше сбережены. В 4-м стане почва земли легко поддается обработке, почему лошади и не изнуряются работою. Из пороков и болезней замечены: слепота, запал, надорванность, колер; все четыре порока развиты преимущественно у лошадей, работавших в лесу. Чемерь, чельчак (тельчак), порица (норица), чесотка, сап и сибирская язва являются случайными болезнями у здешних лошадей. Вследствие различных пороков, болезней и старости в 3-м стане считаются негодными для военных целей около 75% всех рабочих лошадей, имеющих рост более 1 арш. 14 вершков. Сила крестьянских лошадей определяется (в 3-м стане) ходом 25—30 верст по хорошей летней или санной дороге с 20—25 пуд. груза, при скорости от 6 до 8 верст в час. Лучшие помещичьи лошади могут провезти, при тех же условиях, груз в 30—35 пудов на 30—40 верст, но по непривычке к постоянному труду, лошади землевладельцев мало способны к извозу. В 1-м стане указано, что в силе лошадей встречается большое разнообразие, что объясняется значительным количеством приводных лошадей в этой местности...

Конская перепись в Европейской России. Могилевская губерния по сведениям 1875 г. Изд. Ц. С. К. 1876. С. 77—89.

Запіс аб Кармянскай воласці ў кнізе "Волости и важнейшие селения Европейской России"

Корма — местечко белорусских владений при речке Кормянке, дворов 23, жителей 109. Волостное управление, церковь православная и 3 еврейских молитвенных дома. Школа, 30 лавок, ярмарки бывают 9 мая, 15 августа и 1 октября, в 8 верстах около д. Струмень церковь и православное кладбище.

Литвиновичи, село белорусских владений при р. Мужине, дворов 93, жителей 462. Церковь православная, водяная мельница.

Корма входила в третий стан Рогачевского уезда, объединявшего Дудичскую, Кормянскую, Меркуловичскую, Рассохскую, Чечерскую волости. В Кормянской волости имеется сельских обществ 14, общин 22, селений 26, дворов 913. Мужского населения 1985 (по ревизии, а по семейным спискам 2605). Количество земли у общества 10 517 дес., а пахотной — 4832 дес. Остальной земли 145 дес., а пахотной — 96 дес.

Изд. Центрального статистического комитета. СПб., 1886. Вып. 5.

З успамінаў М. М. Макаранкі, жыхара м. Карма

Карма да рэвалюцыі была невялікім мястэчкам. Яе пяць вуліц называліся Першая і Другая Сялянскія, дзве Казіных і Прапойская (на былым тракце Чачэрск—Прапойск, цяпер Слаўгарад). Яўрэйскія могілкі знаходзіліся там, дзе цяпер стадыён. На месцы гарадскога сквера размяшчаліся некалькі дзесяткаў лавачак.

Землі вакол вёскі Сырск, спіртзавода, а таксама некаторыя кармянскія і вынашаскія ўчасткі належалі памешчыку Дзерналовічу. Яго фальварак знаходзіўся ў Гарадку. На поўдні былой Кармы, уключаючы Куракаўшчыну і Старую Зенькавіну, землямі валодала памешчыца Быкоўская. У 1908—1910 гг. яна прадала іх пляменніку А. А. Бачкову. Той, у сваю чаргу, толькі за лес за Сажом выручыў 330 тыс. рублёў замест 20 тыс., выплачаных цётцы за пакупку. Акрамя таго, Бачкоў заклаў землі ў банк і прапанаваў вяскоўцам выкупіць іх, на чым таксама нажыўся. У Хатоўні новы гаспадар пабудаваў хлявы і задакументаваў іх у ашчадкасе як склады, а потым, калі пабудовы згарэлі, Бачкоў атрымаў яшчэ 20 тыс.

Землямі ад цяперашняй Школьнай вуліцы на поўдзень да рэчкі Кармянкі, а таксама за цагельным заводам да вёскі Сямёнаўка валодаў пан Юдзеніч.

У 1904 г. у Карме адкрылася аддзяленне паштовай сувязі.

У 1908 г. у пасёлку стаў дзейнічаць тэлеграф, які ўзначаліў М. В. Драбышэўскі.

Школа размяшчалася ў доме пракуратуры па цяперашняй вуліцы імя Ільюшчанкі. Вучыліся ў ёй дзеці папа, урадніка, пісара, купцоў.

Асабліва цяжка было з медыцынскім абслугоўваннем. Вельмі часта ўспыхвалі эпідэміі: з прычыны не толькі адсутнасці медыкаў, але і наяўнасці мноства лясоў і балот, што акружалі Карму. Тады без паперкі ад памешчыка ў лес хадзіць было нельга.

Першы фельчар, адзін на Кармянскую і Доўскую воласці, пачаў працаваць у 1905 г. Жыў ён у Доўску. Яшчэ адзін урач, які абслугоўваў людзей абодвух паветаў, жыў у Рагачове, і, каб трапіць да яго, трэба было ехаць за паўсотню кіламетраў.

Напярэдадні першай сусветнай вайны на тэрыторыі Кармяншчыны дзейнічала 28 школ граматы (Барсукоўская, Бярозаўская, Багданавіцкая, Баравабудская, Будасырская, Бычанская, Валынцаўская, Ворнаўская, Вашчанская, Вынашаўская, Задубская, Зяцькаўская, Каменская, Кармянская, Кароцькаўская, Лебядзёўская, Ліцвінавіцкая, Навасёлкаўская, Расохская, Руднянская, Стрyкачоўская, Струменская, Сырская, Тарахаўская, Хізаўская, Хляўнянская і Шаламееўская. Рыкаўская двухкласная школа рыхтавала

Кармянская центральная районная библиотека

настаўнікаў для іншых школ), царкоўнапрыходскія школы і народныя вучылішчы.

У школе звычайна працаваў адзін і толькі ў рэдкім выпадку два настаўнікі. У Шаламееўскай школе дзяцей вучыў Сцяпан Бахматаў, які сам толькі закончыў Кармянскае народнае вучылішча. Навасёлкаўская школа тулілася ў старым каравульным памяшканні прыходскай царквы. Разразная азбука, па якой вучні авалодвалі граматай, была напісана на столі. Вось і прыходзілася дзецям увесь час задзіраць галовы. Затым доўгі час школа "вандравала" па хатах, навучанне ішло то на папоўскім падвор'і, то ў хаце дзячка, то ў сялян. Толькі ў 1912 г. школа атрымала ўласнае памяшканне, хаця ўжо з 1900 г. лічылася народным вучылішчам. Выкладчыцай у ёй працавала выпускніца Магілёўскага жаночага вучылішча. Яна добра спявала, таму больш часу аддавала правядзенню вечароў, а не выкладанню прадметаў.

Прыкладна аналагічнае становішча было і ў іншых школах Кармяншчыны. У 1916 г. вучні, каб здаць экзамены за народнае вучылішча, адпраўляліся ў Новую Ельню. А там галоўнае слова належала папам Нова-Ельнінскай, Кляпінскай і Папараткаўскай цэркваў.

У Карме знаходзілася валасная ўправа, ураднік і 6 стражнікаў. Мястэчка ўваходзіла ў трэці стан, а станавы прыстаў жыў у Чачэрску. Ва ўпраўленні воласці быў старшына, пісар і два яго памочнікі. Уладу прадстаўлялі таксама ўраднік і поп.

Вуліцы вясной і восенню заносіла брудам. Хаты з саламянымі стрэхамі паўрасталі вокнамі ў зямлю. А на водшыбе ў зеляніне стаяў фальварак пана Дзерналовіча. Двухпавярховы будынак адбудаваў купец Крок. Каменнай была і царква.

Прамысловасць прадстаўлялі крухмальны завод Дзерналовіча, пабудаваны ў 1905 г., які ў 1912—1913 гг. пераабсталявалі ў спіртзавод, на ім працавалі не больш за 30 чалавек. У вёсках Хізаў і Ліцвінавічы ў 1913 г. пачалі дзейнічаць вінакурныя заводзікі. Яшчэ на тэрыторыі воласці працаваў цагельны завод, а пры ім — ганчарны цэх.

З гісторыі народнай адукацыі ў XIX стагоддзі

Па даных Віленскай вучэбнай акругі, у Расохах у 1863 г. адкрылі народнае вучылішча. Але ж тады Расохі не ўваходзілі ў Кармянскую воласць.

У 1865 г. адкрываецца мужчынскае народнае вучылішча, якое размяшчалася ў грамадскім памяшканні. Пры вучылішчы праіснавала адзін год жаночае аддзяленне. Грошы на яго дзяржава не выдаткоўвала, сродкі — да 60 руб. — сабрала на яго патрэбы насельніцтва.

Зацвярджэнне "Правілаў аб царкоўнапрыходскіх школах" у 1884 г. дало магчымасць расшырыць сетку школ у воласці.

У 1888/89 навучальным годзе ў Кармянскай воласці налічвалася 14 школ, чатыры з іх — царкоўнапрыходскія. У іх навучалася ўсяго 300 чалавек. І гэта ў той час, калі большасць насельніцтва не мела адукацыі!

Заняткі пачыналіся 1 кастрычніка, пасля заканчэння палявых работ. Выкладанне вялося выключна на беларускай мове. Над работай школы быў пастаянны нагляд царквы і паліцыі. Шмат вучэбнага часу аддавалася закону Божаму. Бібліятэк не было. На тэрыторыі воласці ў гэты ж тэрмін дзейнічалі 9 цэркваў і тры сінагогі.

Кармянскае мужчынскае народнае вучылішча. Адкрыта ў 1865 г. Знаходзілася ў грамадскім доме. На ўтрыманне вучылішча штогод адпускалася 175 руб. з дзяржаўнага казначэйства. Настаўнік вучылішча з 1 верасня 1865 г. — Л. Р. Глыбоўскі, які закончыў Магілёўскую ду-

хоўную семінарыю. Утрыманне: 150 руб. у год і кватэра.

Законанастаўнік з 1 лістапада 1872 г. святар Даніла Іванавіч Шышковіч, які закончыў Магілёўскую семінарыю. Жалаванне — 25 руб. у год.

Кармянскае жаночае народнае вучылішча. Адкрыта ў 1865 г. Знаходзілася ў тым жа доме, што і мужчынскае вучылішча. На ўтрыманне яго штогод адпускала 60 руб. мясцовае сялянскае таварыства. Настаўнічала ў ім С. Р. Глыбоўская. Яна закончыла Буйніцкае вучылішча для дзяўчат духоўнага звання. На пасадзе — з 1 кастрычніка 1865 г. Утрыманне: 60 руб. у год і кватэра.

Рэкта-Бычанскае народнае вучылішча Рэкцянскай воласці, сяло Быч (цяпер Акцяброва). Адкрыта ў 1851 г. Знаходзілася ў грамадскім доме. На ўтрыманне вучылішча штогод адпускалася 251 руб., сабраныя з былых дзяржаўных сялян.

Настаўнік вучылішча з 1 кастрычніка 1873 г. — Міхаіл Аўксентавіч Яндоўскі. Ён закончыў Магілёўскую семінарыю. Утрыманне: 150 руб. у год і кватэра.

Законанастаўнік — святар Іерафей Іванавіч Саульскі. Закончыў Магілёўскую семінарыю. Жалаванне — 25 руб. у год.

У апошняй чвэрці XIX ст. былі адкрыты царкоўнапрыходскія школы і школы пісьменнасці, аб чым сведчыць справаздача за 1888/89 навучальны год.

Царкоўнапрыходская школа ў ваколіцы Кароцькі. Знаходзілася ў сялянскім доме бясплатна. Настаўнікам і законанастаўнікам быў дыякан Яўграф Раманоўскі. Атрымліваў 40 руб. за вучэбны перыяд. Вучылася 27 хлопчыкаў. Дзяўчынкі не вучыліся.

Школа пісьменнасці ў ваколіцы Кароцькі. Знаходзілася яна таксама ў сялянскай хаце бясплатна. Настаўнічаў селянін Апанас Караткевіч, які атрымліваў ад бацькоў вучняў 25 руб. за вучэбны перыяд. Вучылася толькі 12 хлопчыкаў.

Царкоўнапрыходская школа ў вёсцы Сырская Буда. Размяшчалася ў наёмным доме. Настаўнічаў былы унтэр-афіцэр Павел Зайцаў, які атрымліваў за гэта ад таварыства 25 руб. Займалася 16 хлопчыкаў.

Школа пісьменнасці ў ваколіцы Сапажкі. Знаходзілася яна ў сялянскім доме бясплатна, настаўнічаў былы унтэр-афіцэр Сямён Емяльянаў. Бацькі вучняў плацілі яму па 50 кап. Вучыліся 15 хлопчыкаў і 1 дзяўчынка.

Школа пісьменнасці ў вёсцы Сырск. Размяшчалася яна ў наёмным доме. Настаўнічаў селянін Канстанцін Фёдараў. Атрымліваў ён 15 руб. за навучанне 21 хлопчыка.

Пераўтвораная *царкоўнапрыходская школа ў вёсцы Ліцвінавічы* знаходзілася ў пабудаваным для яе доме. Настаўнічала Валянціна Лепяшынская, якая заканчвала Магілёўскае жаночае духоўнае ведамства вучылішча і за работу атрымлівала ў год 100 руб. ад таварыства. Выкладаў закон Божы святар Мікалай Лепяшынскі. Вучыліся 21 хлопчык і 1 дзяўчынка.

Аналагічныя школы былі і ў іншых валасцях, у паселішчах цяперашніх Каменскага, Стараградскага, Лужкоўскага, Струкачоўскага, Барсукоўскага сельскіх Саветаў.

В. Філіянаў

З успамінаў А. А. Яўнайса, былога настаўніка Кармянскай сярэдняй школы

17 год прапрацаваў я настаўнікам да Кастрычніцкай рэвалюцыі, у тым ліку 9 год — у пачатковай школе. Першай школай, куды я быў прызначаны пасля сканчэння Полацкай настаўніцкай семінарыі, была Дабейская пачатковая народная школа Полацкага павета. У гэтай школе налічвалася 115 вучняў, 4 аддзяленні і 1 настаўнік. Зарплата настаўніку была прызначана 12 руб. дзяржаўных і 8 руб. ад "мірскага збору" ў месяц, якія выдавалі валасны старшыня і валасны пісар. Курс навучання ў школе — трохгадовы. За тры зімы — ад 16 кастрычніка да 16—20 красавіка — трэба было навучыць вучня чытаць па-руску, пісаць пад дыктоўку, рабіць пераказ, вызначаць, дзе пішацца "ять", а

Кармянская центральная районная библиотека

дзе "е", чытаць па-царкоўнаславянску Псалтыр і Евангелле і перакладаць на рускую мову. На ўроках гісторыі трэба было ўсяляць вучням веру ў тое, што кожны з дома Раманавых — уключна да Мікалая II крывавага — "клапоціцца" аб сялянах і г.д.

Кожны дзень было 5 урокаў па 55 мінут і 1 урок па закону Божаму, які выкладаў поп. А поп, як правіла, зрэдку з'яўляўся ў школу, і таму гэты час настаўнік займаў сваім прадметам або зусім адпускаў дзяцей са школы.

У сярэдзіне красавіка кожнага года прызначаліся экзамены, на якія прыязджаў з горада экзаменатар, а з сяла — поп. Гэтыя экзамены з'яўляліся нейкім страшыдлам для вучняў, не менш баяўся іх і настаўнік: ад іх выніку залежала, дзе будзе працаваць настаўнік у наступным годзе. Цяжэй за ўсё даваліся вучням царкоўнаславянскі язык і літара "ять". Гэта для вучняў мучэнне, для настаўніка. А колькі марнавалася на гэта сіл — падумаць жах!

Поп, выкладаючы закон Божы, шпіёніў за кожным крокам настаўніка. Аднойчы з'явіўся ў маю школу поп у час вялікага посту, зайшоў у мой пакой, пацягнуў носам і адразу закрычаў: "Учитель, что это у вас скоромным пахнет?" — "Это вам показалось", — адказваю я.

Пасля гэтай гутаркі поп адчыніў дзверцы печкі і паказаў мне пальцам: "А это что? Так, так!" Там сапраўды смажыўся на абед кавалачак мяса з бульбай. Праз 10 дзён я ехаў ужо ў г. Віцебск да дырэктара народных вучылішч даваць тлумачэнні па даносу папа.

У 1901 г. я набыў у Полацку "Волшебный фонарь". Праз гэты фанар я паказаў дзецям і дарослым малюнкі перапрацаванай казкі Пушкіна пра папа і пра яго батрака Балду (пра купца і яго батрака). Вучні, як і дарослыя, надта цікавіліся. Але хутка атрымаў загад ад інспектара народных вучылішч, што такія чыткі і паказ малюнкаў рабіць толькі ў прысутнасці папа або ўрадніка. Праз кароткі час фанарык разбілі. Малюнкі ж да казкі Пушкіна я доўга вазіў з сабой як памяць. У першыя гады пасля рэвалюцыі паказваў іх вучням Кармянскай школы, пакуль не парваліся, а тэкст поўнасцю чытаў па Пушкіну.

Кармянскія вёскі ў канцы XIX стагоддзя

Большасць паселішчаў цяперашняй тэрыторыі Кармяншчыны ўваходзіла ў склад Доўскай, Кармянскай, Палескай, Расохскай і Новабычанскай валасцей Рагачоўскага павета. У спіс важнейшых паселішчаў былі ўключаны 12 вёсак, якія існуюць і сёння. Гэта Задуб'е, Калюды, Карма, Ліцвінавічы, Навасёлкі, Хляўно, Хізаў, Расохі, Струкачоў, Быч. У сярэдзіне 80-ых гг. XIX ст. самай вялікай вёскай былі Калюды, у якіх налічвалася 157 двароў і пражывала 928 жыхароў. Яшчэ вёска была вядома тым, што тут меліся ажно тры ветраныя млыны. Для параўнання, у самой Карме тады пражывала ў 23 дварах 109 жыхароў. Тым не менш у мястэчку размяшчалася валасная царква. Быў моцна развіты гандаль: дзейнічала 30 лавак, штогод па традыцыі праводзіліся буйныя кірмашы.

У вёсцы Хляўно, якая тады адносілася да Новабычанскай воласці, было 87 двароў і 641 жыхар, праваслаўная царква, таржок і пастаялы двор. У Задуб'і Доўскай воласці — 77 двароў і 551 жыхар, дзейнічаў ветраны млын. У Струкачове Расохскай воласці — 95 двароў, 541 жыхар, два ветраныя млыны. А ў Расохах — цэнтры воласці — пражывала 379 жыхароў, былі школа, царква, два млыны. У Хізаве Доўскай воласці — 65 двароў, 507 жыхароў, праваслаўная царква, вадзяны млын, які прыводзіўся ў рух вадой ракі Добрыч. 840 жыхароў было ў Навасёлках, 462 у 93 дварах — у Ліцвінавічах. Гэтыя населеныя пункты ўваходзілі ў склад Кармянскай воласці, у

іх дзейнічалі праваслаўныя цэрквы і вадзяныя млыны.

Дарэчы, далейшы лёс Навасёлак і Ліцвінавіч далёка не аднолькавы. У Навасёлках у свой час штогод праводзіўся на дзень Святой Тройцы вялікі кірмаш, збіралася нямала гандлёвага люду. Але затым у сілу розных прычын вёска перайшла ў лік другарадных. Ліцвінавічы ж, наадварот, паспяхова развіваліся, раслі і сталі самай вялікай вёскай на Кармяншчыне.

Два населеныя пункты маюць адну назву — Быч. Адзін з іх, у якім было 89 двароў і 664 жыхары, з'яўляўся адміністрацыйным цэнтрам Новабычанскай воласці. Тут дзейнічала царкоўнапрыходская школа, недалёка — у Свянскопалі (Свенску) — знаходзілася паштовая станцыя; у другім пражывала 495 жыхароў, дзейнічалі праваслаўная царква, ветраны млын.

Р. Ганжураў

Напярэдадні рэвалюцыі 1905 года

Спачатку да Кармы далятали толькі водгаласы нарастаючай у краіне рэвалюцыйнай хвалі. Такія весткі звычайна прывозілі ўчарашнія кармянцы, якія ў пошуках лепшай долі падаліся ў вялікія гарады. Менавіта яны, прыязджаючы дадому, і расказвалі землякам пра падзеі ў дзяржаве.

Варта было рабочаму або шахцёру вярнуцца на радзіму, і яго хата тут жа напаўнялася людзьмі. Кожнаму хацелася даведацца, што новага ў свеце, як жывецца ў іншых мясцінах. Большасць прыезджых гаварылі землякам пра саюзы рабочых, пра тое, як яны дабіваюцца сваіх правоў. А яшчэ — заклікалі сялян забіраць у паноў зямлю, таму што належыць яна ўсім. Безумоўна, гэтыя словы кранали сэрцы простых людзей.

А неўзабаве ў воласці з'явіліся і першыя сацыял-дэмакраты. Іх дзейнасць была цесна звязана з дзейнасцю Гомельскай сацыял-дэмакратычнай групы РСДРП. У самой Карме сацыял-дэмакратычная група ўзнікла ў другой палове 1903 г. Старажылы Кармы Р. Ю. Зелічонак, С. А. Касянкоў, К. М. Антоненка, А. В. Агееў і іншыя пацвярджаюць, што ў Карме сапраўды існавала падпольная сацыял-дэмакратычная група, і яна была даволі шматлікай. У групу ўваходзілі розныя па сваіх палітычных поглядах людзі. Сярод іх былі іскраўцы, бундаўцы, эсэры і нават сіяністы (члены яўрэйскай буржуазна-нацыяналістычнай арганізацыі "Паолей-Сіон"). У гэтай групе як у кроплі вады адлюстроўваліся ўсе складанасці дзейнасці бальшавіцкай партыі наогул і гомельскай групы ў прыватнасці. У студзені 1904 г. ЦК РСДРП стварыў у Беларусі Палескі камітэт РСДРП, які ў далейшым каардынаваў і накіроўваў дзейнасць мясцовых партыйных арганізацый.

З Гомеля ў Карму прывозілі лістоўкі, адозвы Палескага камітэта. Праз сувязных іх распаўсюджвалі па вёсках. Члены групы часта збіраліся для чыткі палітычных кніг і брашур, ладзілі дыскусіі па розных палітычных пытаннях, вялі агітацыю сярод жыхароў мястэчка і воласці.

Па ініцыятыве кармянскіх сацыял-дэмакратаў 1 мая 1905 г. у зенькавіцкім лесе быў праведзены мітынг жыхароў Кармы, на які прыйшлі каля двухсот чалавек. Былі тут і прадстаўнікі гомельскіх і чачэрскіх сацыял-дэмакратаў.

Пасля заканчэння мітынгу яго ўдзельнікі разышліся, члены сацыял-дэмакратычнай групы засталіся абмяркоўваць свае партыйныя справы. За гэтым заняткам іх і заўважыў палявы вартаўнік. Пасля яго паведамлення заможныя сяляне вёскі Зенькавіна кінуліся лавіць "бунтаўшчыкоў". Большасці сацыял-дэмакратаў удалося ўцячы, але чатырнаццаць з іх усё ж было схоплена. Падаспеўшыя на

дапамогу ўраднік і два стражнікі знайшлі пад мостам цераз дарогу чырвоны сцяг. Небарак павялі ў мястэчка, па дарозе іх моцна білі.

У Карме іх пасадзілі ў камеру для зняволеных, а раніцай пад узмоцненым канвоем этапіравалі ў Чачэрск. Прыкладна праз месяц адбыўся суд, які прыгаварыў шасцярых арганізатараў мітынгу да розных тэрмінаў зняволення.

Але, нягледзячы на жорсткую расправу ўлад над удзельнікамі маёўкі, у воласці было неспакойна. Ужо ў канцы лета таго ж года ў адну з начэй адначасова запалалі чатыры панскія гумны: два — у пані Быкоўскай і два — у Дзерналовіча. Сяляне пачалі захопліваць "адрэзкі". Памешчыкі былі так напужаны, што нават з'ехалі са сваіх маёнткаў, кінуўшы іх на ўпраўляючых.

Праз некаторы час Дзерналовіч з'явіўся з атрадам чаркесаў. Сялянам загадалі вярнуць усю маёмасць, што яны ўзялі з панскага двара. А ноччу ў мястэчку і вёсках пачаліся арышты. Пяць актыўных бунтаўшчыкоў былі высланы ў Сібір, а астатнія падвергліся цялеснаму пакаранню.

У гэты ж час адбыліся выступленні сялян у Кароцьках, Навасёлках, Каменцы. Аднак усе яны былі жорстка падаўлены. Рэвалюцыйны рух на Кармяншчыне заціх, сацыял-дэмакратычная група распалася. Самае ж цікавае тут, аднак, тое, што яшчэ за дзесяць гадоў да Кастрычніцкай рэвалюцыі многія кармянскія землеўладальнікі і фабрыканты пачалі спешна распрадаваць альбо здаваць у арэнду зямлю і прадпрыемствы і назаўсёды пакідаць Кармяншчыну.

К. В. Смірнова

Дакументы сведчаць

Аграрныя выступленні сялян і забастоўкі батракоў у Чэрыкаўскім, Рагачоўскім, Клімавіцкім і Аршанскім паветах Магілёўскай губерні

З данясення магілёўскага губернатара міністру ўнутраных спраў

1905 г. июня 16

...О новых, полученных мною, сообщениях о самоуправных действиях крестьян докладываю следующее:

1. По донесению исправника Рогачевского у., крестьяне дер. Михалевки явились 9 июня с кольями в им. Гуту Селивестровой и заставили рабочих прекратить работу, пригрозив, в случае неисполнения требований, перебить рабочих; последние прекратили работу. Затем толпа направилась к помещичьему дому и предъявила владелице следующие условия: а) плату в день: мужчине 60 коп., женщине 40 коп.; б) начало работ — 6 час. утра, конец — 6 час. вечера; в) во время жатвы и покоса цену увеличить: мужчине от 75 коп. до 1 руб., женщине до 60 коп. Цен этих никогда не существовало.

11 июня те же крестьяне, прогнав рабочих с фольв. Колотин, опять явились в им. Гуту, но, встретив полицию, повернули обратно по засеянным лугам помещицы, заявляя, что, если их будут преследовать, они сумеют защищаться, и показали ножи, кистени и пр.

При увещании крестьян земским начальником и исправником они держали себя крайне дерзко и вызывающе.

Документы и материалы по истории Белоруссии. Мн., 1953. Т. 1. С. 504.

Аб гэтым не забыць

З успамінаў Рыгора Юдавіча Зелічонка, жыхара м. Карма

Група сацыял-дэмакратаў існавала ў Карме да 1905 г. З гарадоў да нас прыязджалі рабочыя, нашы землякі, якім дзеля заробку даводзілася кідаць родныя мясціны, сем'і, бацькоў. Яны шмат расказвалі аб росце рэвалюцыйнага руху, вучылі, што трэба скінуць цара і багацеяў, зрабіць лепшай долю простых людзей. Паступова рэвалюцыйная свядомасць абудзілася ў мяне і многіх іншых. Арганізацыя ячэйкі, зборы і спрэчкі на партыйныя тэмы далі магчымасць шмат чаго зразумець і навучыцца ацэньваць розныя плыні, бо ў групе былі не толькі іскраўцы, але і бундаўцы, эсэры і інш. Мы, сацыялісты, чыталі Пляханава.

Не абыходзілася і без канкрэтных заданняў. Асабіста я павінен быў распаўсюджваць пракламацыі ў вёсцы Навасёлкі, перадаваць нашы ідэі іншым, агітаваць за звяржэнне царызму. Даводзілася ездзіць у Гомель за лістоўкамі або перавозіць іх з Прыстані ў Карму. Рабілі гэта з вялікімі перасцярогамі, рознымі спосабамі. Усе пракламацыі і лістоўкі заканчваліся заўсёды заклікам "Далоў цара і памешчыкаў!". У час правядзення мітынгу 1 мая 1905 г. мы пераканаліся, што барацьба будзе складанай і крывапралітнай. Калі людзі пасля гарачых прамоў пачалі разыходзіцца і засталіся толькі самыя актыўныя, у асноўным члены групы сацыял-дэмакратаў, якія працягвалі сходку, кулакі з Новай Зенькавіны акружылі астравок, каб арыштаваць мітынгуючых. Напачатку мне пашчасціла: я збег і быў ужо ля Сажа, гатовы пераправіцца на другі бераг, ды тут мяне схапілі Кандрат і Мацвей Падзерневы. Сілай даставілі ў Карму. У камеры нас было 14 чалавек. Сярод арыштаваных знаходзіўся беглы салдат Веля Шпіцар, якому пагражала цяжкае пакаранне. Праз саламяную страху туалета мы дапамаглі яму ўцячы, але начальнік Стральцоў папярэдзіў, што за ўцекача ў першую чаргу прыйдзецца адказваць мясцоваму насельніцтву, да якога будуць прыняты карныя меры. Тады гаспадар хлява, дзе хаваўся салдат, параіўшыся з яўрэйскім старастам Гозам, выдаў В. Шпіцара ўладам.

Нас білі жорстка. У камеры і па дарозе ў Чачэрск. Там нас пратрымалі амаль тры дні, а потым адправілі на допыты і суд у Карму. Шэсць чалавек былі пасля суда пасаджаны, а васьмі, у тым ліку і мне, прадбачыліся гады жыцця пад паліцэйскім наглядам.

З 1908 да 1911 г. я служыў у царскай арміі. Калі вярнуўся, Карму не пазнаў, таму што большая частка мястэчка згарэла пры пажары 1910 г.

Вось што прадстаўляў наш раённы цэнтр на пачатку дваццатага стагоддзя. На галоўнай плошчы было заўжды брудна. Даводзілася хадзіць па насцілу, па абодва бакі якога стаялі лаўкі купцоў, памешчыкаў.

У мястэчку налічвалася недзе 150 падвор'яў, дзе ў асноўным жылі сем'і збяднелых яўрэяў. Больш за 40 кустароў-адзіночак шылі адзенне, абутак, выраблялі футра. Памятаю шапачніка Гільку Шурына, са скурай працаваў Лейба Белкін, які меў да 10 рабочых і нават браў за капейкі вучнямі дзяцей, купляў сыравіну ў насельніцтва Янкелю Мерману. Найбольш багатымі домаўладальнікамі былі гандляр Лейба Самсонавіч, а таксама арандатары крухмальнага завода памешчыка Дзерналовіча браты Самуіл і Гаршаль Крокавы. Першы жыў у цагляным доме з падвалам, а ў братоў быў адзіны ў мястэчку двухпавярховы дом. Не горш жылі партны Фейшн, якога празвалі Ёсель-куртачка, скупшчык сыравіны Юда Элькін.

Валасная ўправа знаходзілася ў хаце, якая раней стаяла побач з поштай. Гэта было жудаснае месца. Пры ўправе затрыманых змяшчалі ў дзве камеры. А вось каралі розгамі ў двары, адкуль часта чуліся крыкі і стогны. У той час суд вяршыў Цыбікаў, справаводам працаваў Ас-

малоўскі, а прыводзіў прыгавор у выкананне жыхар Новай Зенькавіны Піліп Касьянік. Калі ведаў, што прыгавораны паднясе потым гарэлкі, — біў для адводу вачэй, калі ж не — да крыві.

Гарэлі маёнткі

Недарод 1904 г. яшчэ больш знізіў жыццёвы ўзровень селяніна. Але царскія чыноўнікі патрабавалі падаткі, паны накладвалі больш высокія штрафы, а царква выціскала гарцавы збор і плацяжы за іншыя паслугі. Старажылы ўспаміналі характэрны выпадак. Ідучы ад манапалькі, поп Саракалет сустрэўся з селянінам Іванам Цітавічам Паліцыным. Перш чым павітацца, поп гняўліва запытаўся, чаму той не плаціць гарцавы збор на харамы. Паліцын пачухаў патыліцу і хітравата запытаўся: навошта, маўляў, святому храму збожжа, хіба што свіней на папоўскім падвор'і карміць? І тут жа сам сабе адказаў: у бацюшкі ў свірне і так збожжа зашмат, дык, маўляў, навошта ж яшчэ?

Назаўтра староста Фядос Сляпцоў з запіскай папа ў руцэ вёў Івана ў валасць. Пачытаўшы скаргу папа, валасны старшыня загадаў стражніку даць Паліцыну 25 удараў нагайкай.

Дадому Іван і Фядос вярнуліся моўчкі. У Паліцына нылі раны, не па сабе было і старасце. На сярэдзіне шляху селі, каб падсілкавацца. І тут падыходзіць да іх спадарожнік. Павітаўшыся, распытаў, адкуль і куды ідуць, аб жыцці вясковым пацікавіўся. А на развітанне даў нейкі пакет і параіў пачытаць разам з сялянамі адозвы.

У той вечар доўга свяціліся вокны кляпінскіх хат: пад трэск смаловых карчоў амаль у кожнай з іх вясковыя грамацеі чыталі адозвы. Размова ў іх ішла аб прыбліжэнні рэвалюцыйных падзей.

Забурліў і Кляпін

Узброеныя віламі, сякерамі, а той-сёй і дубальтоўкамі, вяскоўцы грамілі маёнткі паноў Стоша, Маліноўскага, Дзерналовіча. Зарыва асвятляла неба некалькі начэй запар. Раздзеленае насенне дало магчымасць кожнаму гаспадару засеяць поле. Лета выдалася вольнае ад прыгнёту, добрае на ўраджай. Але разам з восеньскімі хмарамі прыйшла да кляпінцаў бяда. Драгуны шыбельніка Мураўёва акружылі вёску. Добра, што яшчэ здалёк убачылі калону коннікаў і паспелі папярэдзіць зачыншчыкаў вясенняга бунту, каб тыя ўцяклі.

Ля папоўскага дома спынілася тройка. Поп Саракалет вітаў прыехаўшых на ёй прыстава і ротмістра драгунскага эскадрона, адразу ж перадаў нейкія паперы. Пасярод вуліцы паставілі стол, за які села начальства. Насупраць на лаўцы ўжо ляжалі агаленыя бярозавыя дубцы. Драгуны сагналі сюды ўсіх вяскоўцаў. Прыстаў выцягнуў адну з папоўскіх папер і пачаў называць прозвішчы. Першымі значыліся шахцёры, потым найбольш актыўныя з сялян. Але рады вяскоўцаў нават не зварухнуліся. Тады наперад выйшаў староста і залямантаваў:

—Паночкі, ды тых, каго вы выклікалі, даўно ў вёсцы няма, з'ехалі...

Але прыстаў працягваў чытаць спіс. Выйшла больш за дваццаць сялян. Па загаду ротмістра трое драгунаў выцягнулі з гэтага натоўпу Марціна Пракапенку і 25 разоў перацягнулі яго дубцамі. Дасталося і астатнім.

Староста-бунтаўшчык

Аляксей Несцераў, якога хізаўцы абралі кіраваць вёскай, быў чалавекам рухавым. То з'едзе некуды ў горад, то з мужыкамі на прызбе аб нечым спрачаецца. Яно зразумела: Аляксей — чалавек адукаваны, а простаму мужыку ля такога толькі розуму і набрацца.

Летам 1905 г. пабываў Несцераў і ў полі, наведаўся ў млын, на цагельны завод, сукнавалку. І ўсюды адкрыта гаварыў: "Кідайце працу. Будзе забастоўка".

На ўзгорку ля возера сабраліся амаль усе хізаўцы, нават пан са служкамі прыкаціў.

Стараста проста і дасціпна расказваў, што па ўсёй краіне рабочыя і сяляне паўставалі супраць дэспатызму, патрабуюць эканамічных і палітычных свабод. Час, маўляў, і нам за розум брацца. Колькі на пана дарэмна працаваць!

Праз тры дні стражнікі забралі старасту, а тых, хто падтрымліваў Несцерава, нагайкамі адпаласавалі і зноў на мануфактуры панскія ды поле выгналі.

Хутка хізаўцы даведаліся, што Аляксея Несцерава на катаргу саслалі, некуды аж пад Архангельск. Ну, думалі, прапаў чалавек. Але гады праз тры вярнуўся наш стараста-бунтаўшчык. І зноў пайшлі сходкі па вечарах, дзе і Несцерава слухалі, і газеты чыталі, і аб сваім жыццібыцці разважалі.

В. Гроднікаў

Кормянская центральная районная библиотека

1917
1941

НА КРУТЫМ ПАВАРОЦЕ ГІСТОРЫІ

За ўладу Саветаў

Першая сусветная вайна прынесла вялікія бедствы працоўным і к восені 1917 г. прывяла Расію на грань эканамічнай катастрофы. Найбольш разладжанай аказалася гаспадарка прыфрантавой паласы Беларусі і яе ўсходніх раёнаў, дзе асела шмат бежанцаў, даведзеных да галечы бясконцымі мабілізацыямі дзеяздольных сялян. Расла дарагавізна і спекуляцыя. Мясцовыя ўлады злоўжывалі сваім службовым становішчам і рабілі ўсё магчымае, каб умацаваць уладу багацеяў. У такой абстаноўцы расла рэвалюцыйнасць працоўных мас вельмі хутка, і Беларусь ператварылася ў найважнейшы ўчастак барацьбы за перамогу рэвалюцыі ў Расіі. Пад уплывам дзейнасці бальшавікоў пачалі хутка аднаўляцца мясцовыя бальшавіцкія арганізацыі Беларусі (у тым ліку ў Гомелі). Яны не толькі аднаўлялі і ўмацоўвалі сувязі з рэвалюцыйнымі цэнтрамі, але і актывізавалі сваю дзейнасць сярод насельніцтва. Асабліва паспяхова вялася работа беларускімі бальшавікамі сярод салдат франтавой і прыфрантавой паласы. Салдаты на самай справе праходзілі школу рэвалюцыйнага выхавання, і напрыканцы 1916 г. назіралася разлажэнне арміі: масавае дэзерцірства, уцёкі з пазіцый цэлых палкоў, адмовы выканання загадаў ваеннага начальства, братанне з нямецкімі салдатамі. Вяртаючыся ў вёску разам з рабочымі горада, такія салдаты рабіліся кіруючай сілай рэвалюцыйнага руху ў вёсцы.

Пасля звяржэння царызму падчас лютаўскай рэвалюцыі па ўсёй краіне пачаўся перыяд рэвалюцыйнага руху, у якім прымае ўдзел вялікая колькасць народа. Красамоўным пацвярджэннем гэтага з'яўляюцца падзеі 1917 г. у Карме і ў Кармянскай воласці. Саветы ў Карме арганізаваны ў сакавіку—красавіку 1917 г. адначасова з утварэннем іх у іншых месцах Гомельшчыны, а 11 (24) красавіка сяляне і салдаты мястэчка, па паведамленні газеты "Речь" ад 24 красавіка 1917 г., учынілі самасуд над мясцовымі ўладамі — начальнікам паштовага аддзялення (Салаўянчыкам), валасным старшынёй, пісарам (Асмалоўскім) і былым урэднікам (Стральцовым). Гэта быў своеасаблівы адказ на дарагавізну, спекуляцыю і злоўжыванне ведамасных асоб. Завагаліся стогадовыя ўстоі і ўяўленні воласці. Пачаліся частыя змены ведамасных асоб. Так, толькі ў 1917 г. начальнікамі валаснай управы ў Карме былі: арандатар маёнтка Сырск Якубскі, настаўнік Кузняцоў і былы пісар управы Шпакаў.

У канцы чэрвеня 1917 г. у Гомелі па ініцыятыве Палескага камітэта РСДРП(б)

праведзена нарада прадстаўнікоў з Кармы. У ноч з 26 на 27 жніўня (8—9 верасня) 1917 г. пачаўся карнілаўскі мяцеж. Часовы ўрад усё больш губляў свой аўтарытэт. Нават у такім глухім кутку, як Кармяншчына, ужо адкрыта выяўляецца недавер Часоваму ўраду. 26 жніўня і 3 верасня праходзіць VI з'езд партыі, і бальшавікі бяруць кірунак на ўзброенае паўстанне і бальшавізацыю Саветаў. 31 жніўня ў Петраградзе, 5 верасня ў Маскве, а затым у асноўных прамысловых гарадах кіраўніцтва пераходзіць у рукі бальшавікоў. 14 верасня 1917 г. з Рагачова ў Стаўку Вярхоўнага Галоўнакамандуючага паступае тэлеграма аб тым, што ў сялібе Хізаў (Хізаў цяпер уваходзіць у Кармянскі раён) утварылася самастойная рэспубліка, якая не прызнавала Часовы ўрад.

На Кармяншчыну вяртаюцца з фронту рэвалюцыйна настроеныя салдаты. У канцы верасня група такіх салдат-франтавікоў таямніча збіраецца ў лесе непадалёк ад в. Зяцькавічы і прымае рашэнне ўтварыць атрад Чырвонай гвардыі. Жадаючых уступіць у яго спачатку было 16 чалавек, але не хапала зброі. Па ўспамінах былога камандзіра гэтага атрада Івана Міхайлавіча Антоненкі, атрад меў 5 вінтовак, 3 наганы, некалькі драбавікоў і шаблі. Але гэта не палохала. Члены атрада ведалі, што атрад будзе расці і зброя таксама будзе. Выбралі камандзіраў, адказных асоб, разбілі атрад на аддзяленні. Камандзірам атрада прызначылі І. М. Антоненку, камісарам — яго брата Кузьму Міхайлавіча, камендантам атрада — Ануфрыя Антоненку (жыхар в. Куракаўшчына, загінуў у 1941 г.), а справаводам — Міхаіла Андрэевіча Ільюшчанку, былога матроса (жыхар в. Куракаўшчына).

Баявое хрышчэнне прыйшло нечакана. Яшчэ не паспелі звыкнуцца са звесткай аб тым, што адбылася Кастрычніцкая рэвалюцыя, як ноччу 22—23 лістапада ў атрад прыйшла вестка аб тым, што праз Карму прайшоў вялікі ваенны атрад і спыніўся на начлег у в. Новая Зенькавіна. Калі атрад прыбыў да ракі Сож, частка атрада з Карнілавым, збегшым з Быхава з палком тэкінцаў, ужо паспела пераправіцца і скрыцца ў лесе. І. М. Антоненка паведаміў аб гэтым у Гомель, што дапамагло даць бой карнілаўцам пад Унечай. Але не прайшлі і суткі, як у Карме з'явіўся яшчэ адзін атрад тэкінцаў. Ужо па дарозе ў Карму яны рабавалі жыхароў і ўчынялі насілле. Сабраўшы жыхароў в. Хізаў да будынка валаснай управы, яны расстралялі ў іх на вачах бацьку і сына Шаўчэнкаў толькі за тое, што тыя аказалі супраціўленне. Атрад чырвонагвардзейцаў арганізаваў засаду па шляху тэкінцаў, даў бой і адбіў абоз: 40 пудоў рысавай крупы, 30 пудоў сметанковага масла, 4 паходныя кухні, 17 коней. Акрамя таго, было абяззброена 35 тэкінцаў. Астатніх, паспеўшых знікнуць, разбілі ў в. Манкевічы. Ужо к гэтаму часу ў Кармянскім атрадзе чырвонагвардзейцаў налічвалася 50 байцоў. За каштоўную інфармацыю аб карнілаўцах і актыўную барацьбу з імі Гомельскі рэвалюцыйны атрад прыслаў Кармянскаму чырвонагвардзейскаму атраду для падмацавання зброю: 2 станковыя кулямёты, 200 вінтовак і 100 000 патронаў. Гэта дапамагло атраду значна ўмацаваць свае сілы. У сакавіку 1918 г. у атрадзе было 70 чалавек. У далейшым Кармянскі атрад чырвонагвардзейцаў дзейнічаў у Кармянскай, Бычанскай, Расохскай і іншых валасцях.

У канцы лістапада 1917 г. па ўсёй Беларусі, у тым ліку і ў Карме, устанаўліваецца савецкая ўлада. На агульным сходзе прадстаўнікоў воласці выбіраецца Кармянскі валасны Савет мясцовага выканкома. У гэты выканком увайшлі І. П. Караткевіч (старшыня), Андросенка (жыхар Кармы), Мятнікаў (жыхар в. Н. Зенькавіна), А. Кадуцкі (жыхар в. Бярозаўка), Г. Фрадкін (жыхар Кармы). Пачалося фарміраванне іншых органаў улады, была ўтворана валасная міліцыя з 5 чалавек — старшага міліцыянера І. А. Ільюшчанкі (в. Куракаўшчына), міліцыянераў Ф. М. Давыдзенкі, Н. І. Гайкова, А. Караткевіча, А. Ан-

тоненкі. Пачалі ўтварацца сельскія камітэты беднаты, выганяцца больш ненавісныя службы багацеяў. Але гэта былі яшчэ нясмелыя крокі, і часта жыхары не ведалі, як правільна рашыць пытанне, і ішлі за дапамогай у валасную ўправу, якая яшчэ дзейнічала.

У студзені 1918 г. у вельмі трывожнай абстаноўцы група рэвалюцыянераў — салдат і мясцовых жыхароў вырашыла стварыць у Карме ячэйку бальшавікоў (па сцвярджэнні К. М. Антоненкі — арганізатара ячэйкі, яе тады называлі фракцыяй). Старшынёй абралі Кузьму Міхайлавіча Антоненку, сакратаром — Шнеера Фрадкіна, а тэхнічным сакратаром — І. Н. Ганчарова. У складзе яе было спачатку 18 чалавек, а потым 27. Вось імёны некаторых з іх: К. М. Антоненка, І. М. Антоненка, І. Г. Абатураў (загінуў у мяцяжы 1919 г.), А. У. Агееў, І. Н. Ганчароў, А. Л. Гарэлік, М. А. Ільюшчанка, І. А. Ільюшчанка (загінуў у мяцяжы), С. Л. Леўшуноў, Я. М. Лейзяронак, П. М. Мельнікаў, Ш. Фрадкін, Л. Фрадкін (памёр у 1919 г.).

Аднак барацьба за савецкую ўладу яшчэ далёка не была скончана. На дапамогу рускай буржуазіі прыйшлі замежныя інтэрвенты. Першымі з іх на тэрыторыі Беларусі аказаліся карпусы палякаў Даўбор-Мусніцкага і немецкія, якія акупіравалі 23 і 35 паветаў адпаведна. Сярод неакупіраваных былі часткова Магілёўскі і Рагачоўскі паветы. Аднак палякі, якія занялі 13 студзеня 1918 г. Рагачоў, рабілі ўсё, каб дапамагчы памешчыкам і арандатарам вярнуцца ў маёнткі. Так было і ў Карме. Легіянеры Даўбор-Мусніцкага рабілі на Карму неаднаразовыя набегі. У лютым 1918 г. былы арандатар маёнтка Дзерналовіча Якубскі, які ўцёк у 1917 г., з'явіўся з палком палякаў, каб вярнуць свой маёнтак. Але праз два дні ён вымушаны быў пакінуць Карму. У сакавіку было яшчэ тры спробы захапіць Карму. Першы раз Кармянскі чырвонагвардзейскі атрад, які налічваў ужо 70 чалавек і ўзброены вінтоўкамі і кулямётамі, нечакана напаў на легіянераў, разбіў атрад карнікаў і адбіў у іх маёмасць, нарабаваную ў жыхароў. Легіянеры зрабілі спробу сваімі сіламі вярнуць страчаную маёмасць, але ў іх нічога не атрымалася. Тады яны звярнуліся за дапамогаю да германскіх войск і накіравалі супраць чырвонагвардзейцаў 80 германскіх і белапольскіх салдат. Яны дайшлі да в. Масцеравая Слабодка і ўчынілі расправу над яе жыхарамі. Кармянскі атрад звярнуўся за дапамогай да чачэрскіх чырвонагвардзейцаў, і сумеснымі намаганнямі яны разбілі атрад карнікаў, забіўшы больш за 30 салдат. Болей карнікі ў Карму не з'яўляліся.

Карма ўвайшла ў зону нямецкай акупацыі па Брэсцкаму міру, але дэмаркацыйная лінія праходзіла ад яе даволі блізка — па рацэ Чачэры. Цяжка было ў такіх умовах змагацца за ўмацаванне савецкай улады. Але паступова, крок за крокам будавалася новае жыццё. 13 чэрвеня 1918 г. валвыканкам ззывае агульны сход грамадзян Кармянскай воласці ад Савецкай Расіі і рыхтуецца да яе абароны. "Пакуль на Украіне моцна ўстановіцца дэмакратычны вобраз праўлення, — гаворыцца ў пастанове, — пакуль Украіна не стане дзяржавай цалкам незалежнай і свабоднай ад ціску замежных сіл (у цяперашні час нямецкіх), да тых пор не можам мець ніякага жадання далучыцца да яе і не вагаючыся застаёмся пад уладай Расійскай Федэратыўнай Рэспублікі, якая здабыта крывёй і потам нашых братоў і бацькоў і якую мы гатовыя абараняць да апошняга чалавека". Саветы яшчэ з'яўляліся слабым органам, іх склад часта мяняўся. Нягледзячы на трывожныя абставіны, у воласці ўтвараюцца валком беднаты (старшыня А. В. Агееў), сельскія камітэты беднаты, якія рашаюць на месцах пытанне аб размеркаванні зямлі, і інш. Усё больш увагі надаецца арганізацыі жыцця працоўных. Адначасова кармянцы ўважліва сочаць за падзеямі ў краіне. 24 жніўня (6 верасня) агульны сход Кармянскага валаснога Савета прымае спецыяльнае рашэнне аб падтрымцы працоўных Петраграда і Ма-

сквы ў дні леваэсэраўскага мяцяжу і паўстання чэхаславацкага корпуса. Яно заклікае насельніцтва воласці да паўсюднай арганізацыі ў баявыя атрады Чырвонай Арміі для барацьбы з інтэрвенцыяй, белагвардзейцамі і аказання дапамогі хлебам галадаючым пралетарскім цэнтрам. Не менш цікавай з'яўляецца і пастанова гэтага ж сходу па пытанні "Аб мерах па распаўсюджванню адукацыі сярод працоўных", дзе ўказваецца, што, "жадаючы як мага шырэй ажыццявіць дэкрэт рабоча-сялянскага ўрада аб бясплатным абучэнні і распаўсюджванні адукацыі сярод шырокіх мас працоўнага народа", Савет прапаноўвае шэраг мер па аказанні дапамогі вучылішчам. Напрыклад, унесці на школьную справу 44 000 руб., паставіць пэўную колькасць дошак, партаў і іншае абсталяванне, а таксама выдзеліць сродкі на набыццё вучэбных і пісьмовых прылад.

У хаце, канфіскаванай у лесапрамыслоўца Гелера, партячэйкай была створана вялікая бібліятэка. К. М. Антоненку спецыяльна камандзіравалі за кнігамі ў Смаленск. Але гэтая бібліятэка была знішчана мяцежнікамі ў лютым 1919 г.

Восенню 1918 г. у в. Ліцвінавічы прыехаў П. М. Лепяшынскі для арганізацыі працоўнай школы-камуны. Але ён займаўся не толькі гэтымі пытаннямі. Лепяшынскі вельмі хутка ўстанавіў сувязь з кармянскімі бальшавікамі, ператварыў Кармянскую ячэйку ў валасную партарганізацыю, дзе з'яўляўся яе сакратаром (старшынёй) да самага ад'езду з Ліцвінавіч летам 1919 г.

У студзені—лютым 1919 г. па даручэнні партарганізацыі Т. Пухальскім і членамі рэўкома К. М. Антоненкам, Я. М. Лейзяронкам, М. А. Ільюшчанкам быў праведзены сход моладзі, на якім было пастаўлена пытанне аб арганізацыі ў Кармянскай воласці Камуністычнага Саюза Моладзі. На гэтым сходзе ў камсамол былі прынятыя: Ф. Александровіч, П. Ц. Бандарэнка (стаў пасля адміралам), Ільюшчанка, І. Драздоў, А. Маскалёў, І. Усевіч і інш. Першым сакратаром валкома быў абраны С. Л. Леўшуноў, а пасля яго І. В. Усевіч. Сваю дзейнасць камсамольскі камітэт пачаў з канфіскацыі дома гандляра Цэйтліна. Гэты дом стаў штабам камсамола. Працавала камсамольская арганізацыя пад кіраўніцтвам партыйнай.

Восенню 1918 г. па прапанове П. М. Лепяшынскага ў Гарадку на добраахвотных пачатках была створана сельскагаспадарчая арцель "Гарадок". У яе ўвайшло некалькі бяднейшых сем'яў сялян, якія сумесна апрацоўвалі зямлю. Такую ж камуну разлічваў Панцеляймон Мікалаевіч сумесна з М. І. Кернажыцкім стварыць на базе фальварка і цагельнага завода недалёка ад в. Ліцвінавічы. Кулакам гэта вельмі не падабалася. Аднойчы да яго з'явіліся два кулакі і заявілі: "Вось што, Панцюха, быў бы ты папом, рукі б табе цалавалі, маліліся б на цябе, а будзеш камуну ўводзіць, усё роўна заб'ём". І гэта была не простая пагроза. Яны на самай справе рыхтавалі разгром школы-камуны і захоп улады ў свае рукі.

Восенню 1918 г. пры чарговых выбарах у Саветы трапілі эсэры Навуменка (в. Зяцькавічы), А. Кадуцкі (в. Бярозаўка), С. Пехцераў (былы касір валуправы), Кручкоў, Ф. П. Караткевіч (в. Востраў). Такое становішча назіралася не толькі ў Карме. Грамадзянская вайна прымала ўсё большыя памеры. Абставіны склаліся напружаныя. Трэба было прымаць тэрміновыя меры да ўмацавання савецкай улады на месцах. Павятком даслаў на месцы распараджэнні аб тым, каб часова ўсю паўнату ўлады перадаць рэўкомам і з іх дапамогай вырваць уладу з рук эсэраў і іншых апартуністаў.

У канцы лютага ў Гомелі пачаўся стракапытаўскі мяцеж. Расправа мяцежнікаў над камуністамі Гомеля натхніла эсэраў і кулакоў Кармяншчыны. Карыстаючыся сваім становішчам, Навуменка (старшыня валвыканкома), Караткевіч, Кадуцкі развярнулі самую актыўную дзейнасць супраць камуністаў. Яны ве-

далі, што рэўком 25 лютага (10 сакавіка) пазбаўляе іх паўнамоцтваў, і не гублялі дарма час. Мала таго, што заклікалі сваіх аднадумцаў да "саветаў без камуністаў", яны разаслалі па вёсках загад з'явіцца да будынка валсавета з узброенымі атрадамі. На жаль, ні рэўком, ні міліцыя, ні валком не надалі гэтай пагрозе ўвагі. Раніцай 25 лютага рэўком і міліцыя сабраліся, каб абмеркаваць у дэталях, як выканаць указанні павяткома. У гэты час да будынка валуправы, дзе размяшчаўся выканком Савета, пачалі сцякацца групы ўзброеных людзей з блізляжачых вёсак: Навасёлак, Бярозаўкі, Ліцвінавіч, Маляніка і інш. Даведаўшыся аб гэтым, члены рэўкома паспяшылі да валвыканкома. Члены валвыканкома былі ў поўным складзе, але Навуменка адмовіўся растлумачыць членам рэўкома, для чаго сабрана столькі народу са зброяй. У гэты час на вуліцы пачуліся стрэлы. Члены рэўкома выскачылі на вуліцу, і тады зразумелі, у чым справа. Гэта міліцыя ўступіла ў бой з мяцежнікамі. Забіты на месцы былі міліцыянеры Ільюшчанка і Давыдзенка. Мяцежнікі накіраваліся да хаты валкома і міліцыі, разбурылі яе, знішчылі з такой цяжкасцю сабраную бібліятэку. К вечару К. М. Антоненка дабраўся да Доўска і паведаміў у Рагачоў аб тым, што здарылася. Раніцай 26 лютага з Рагачова прыбыў атрад ЧК пад камандаваннем Норкіна і прыступіў да падаўлення мяцяжу. Некалькі пазней па просьбе П. М. Лепяшынскага з Рагачова прыбыў яшчэ адзін атрад на чале з Адольфам Цымерманам.

Аб'яднанымі сіламі гэтых атрадаў у Карме быў праведзены мітынг, на якім Цымерман заклікаў насельніцтва да парадку. Ахвяры мяцяжу былі пахаваныя, а памяць аб іх увекавечана ў назвах вуліц. Галоўныя зачыншчыкі і актыўныя ўдзельнікі мяцяжу былі арыштаваны. Кадуцкі і Караткевіч пазбеглі суда і пакарання, таму што ім удалося ўцячы. Расследаванне па справе аб мяцяжы вялося павятовай Надзвычайнай камісіяй г. Магілёва, а суд і прывядзенне ў выкананне прысуду праводзіліся ў Карме.

Пасля падаўлення мяцяжу ўлада часова была перададзена ў рукі рэўкома, а з другой паловы 1919 г. — зноў Савету. Старшынёй новага складу выканкома Савета стаў былы матрос Палякоў (в. Бярозаўка). У 1920 г. пасля перавыбараў — М. П. Караедаў (в. Ліцвінавічы).

Жыццё паступова прыходзіла ў норму. На тэрыторыі воласці працягваў дзейнічаць атрад чырвонагвардзейцаў Кармы, так як прыходзілася абараняць насельніцтва ад наскокаў банд "зялёных", "Марусі" і інш. 30 снежня 1918 г. па рашэнні I з'езда Камуністычнай партыі Беларусі аб межах Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Рагачоўскі падраён выйшаў са складу Магілёўскай губерні і ўвайшоў у склад Гомельскага раёна. К сярэдзіне мая 1919 г. Кармянская партарганізацыя была адной з найбольш буйных у Рагачоўскім павеце. Магілёўскі губком нават хацеў перакінуць у Магілёў 25 партыйных работнікаў з Кармянскай воласці, але іх удалося адстаяць Лепяшынскаму.

У 1919 г. у Карме на базе сырскага маёнтка была арганізавана першая паказальная камуна. У яе склад увайшло ўсяго 8 – 12 чалавек. Старшынёй яе выбралі матроса з Навасёлак Івана Шведава, камуна мела назву "Палярная зорка". Арганізаваць работу члены камуны так і не змаглі, у хуткім часе яна распалася. Але арцель "Гарадок" не толькі выжыла, але і вырасла ў добрую гаспадарку. На тэрыторыі Кармы ўтварылася ў той час яшчэ адна сельскагаспадарчая арцель — "Свабода" (старшыня Каплан, потым Ф. Кажамякін). Землі яе размяшчаліся ад цагельнага завода да Сырска (аэрадром).

Да канца інтэрвенцыі і грамадзянскай вайны на тэрыторыі воласці дзейнічалі камбеды, харчкомы і іншыя органы, якія дапамагалі забяспечыць перамогу над ворагам, і савецкая ўлада перамагла.

Дакументы сведчаць

Аб ўтварэнні “Хізаўскай рэспублікі”

В тех деревнях Гомельщины, где крестьянские комитеты состояли из бедноты и батрачества, они полностью брали власть в свои руки. Так было в селе Хизов Рогачевского уезда. Крестьяне этого села еще в сентябре 1917 г. под руководством своего комитета, председателем которого был крестьянин-отходник, большевик Т. Г. Ковалев, конфисковали землю и все имущество имения Черепановых и распределили между собой. Эсеровская газета “Труд и воля” 14 сентября 1917 г. жаловалась, что “в селе Хизов образовалась самостоятельная республика, совершенно не признающая Временного правительства. В новоявленной республике возникли крупные аграрные беспорядки. Местные власти бессильны противодействовать развивающейся анархии”. “Хизовская республика” существовала вплоть до Октябрьской революции.

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 406. Воп. 6. Спр. 119. Л. 52, 56, 112.

Загад Кармянскага валрэўкома Гомельскага павета аб мерапрыемствах па ліквідацыі непісьменнасці

12 чэрвеня 1920 г.

На основании декрета Совнаркома от 26 декабря 1919 г. о ликвидации безграмотности среди населения РСФСР и § 4 плана ведения кампании по ликвидации безграмотности в Гомельской губ. в порядке мобилизации призывается к обязательному обучению все неграмотное население волости в возрасте от 14 до 17 лет включительно. Все неграмотные граждане указанного возраста должны явиться в помещение местных школ 20 июня с.г. Занятия с неграмотными будут производиться по воскресным, праздничным и ненастным дням в течение 4 месяцев, в каковые дни все призванные неграмотные обязательно должны посещать занятия. К непосещающим занятия будут применяться репрессивные меры. По истечении 4-месячного срока на территории Гомельской губ., согласно § 111 того же плана, безграмотность до 18-летнего возраста будет караться по всем строгостям революционных законов.

Предволревкома
Секретарь

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 1619. Воп. 1. Спр. 2. Л. 10.

Загад Кармянскага валрэўкома Гомельскага павета аб яго арганізацыі і задачах сельсаветаў воласці

16 лістапада 1920 г.

На основании приказа Гомельского угорревкома от 3 ноября с.г. за № 3 на заседании волисполкома 11 ноября с.г. организован Кормянский волостной революционный комитет, являющийся высшим органом власти в районе волости.

Предсельсоветам приказывается в самый кратчайший срок, но не позже указанного в приказах времени, точно исполнять все приказы и распоряжения Ревкома.

Во исполнение приказа Гомельского угорвоенревкома за № 3 приказывается:

1) В 3-дневный срок доставить списки дезертиров фронта и уклонившихся от явки по призыву на военную службу.

2) В районе своего селения следить за бандитизмом и о всех случаях бандитизма с нарочным доносить волревкому.

3) Установить строгий контроль за предметами, вывозимыми крестьянами в город для продажи, согласно приказу № 75; не разрешенные к продаже предметы задерживать и направлять в волревком.

4) Немедленно озаботиться заготовкой и доставкой топлива для нуждающихся в рабочей силе семейств красноармейцев.

5) К 22 ноября с.г. выполнить наряды продовольственной разверстки.

6) Еженедельно доставлять сводку...

Неисполнение приказов и распоряжений волревкома будет караться по всем строгостям законов военно-революционного времени.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 1619. Воп. 1. Спр. 2. Л. 59.

Рэвалюцыянер і педагог

Панцеляймон Мікалаевіч Лепяшынскі нарадзіўся 29 лютага 1868 г. у сям'і вясковага папа ў в. Студзянец Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні. Бацька яго, Мікалай Пятровіч, быў адукаваным для свайго часу чалавекам. Ён шмат чытаў, любіў прыроду, пакутаваў за сялян і імкнуўся па магчымасці ім дапамагаць. Маці — Клаўдзія Нічыпараўна Лепяшынская-Зубкоўская таксама была адукаваным чалавекам. Яна закончыла гімназію, шмат чытала, цікавілася палітыкай. У сям'і Лепяшынскіх нарадзілася 18 дзяцей, 11 з якіх выжыла. Панцеляймон быў старэйшым.

Бюст П. М. Лепяшынскага ў в. Ліцвінавічы

У 1874 г. сям'я Лепяшынскіх пераязджае ў в. Ліцвінавічы Рагачоўскага павета. У 1877 – 1888 гг. Панцеляймон — навучэнец Магілёўскай мужчынскай гімназіі. Пасля экзаменаў на атэстат сталасці ён летам адпачываў у Ліцвінавічах, а восенню стаў студэнтам фізіка-матэматычнага факультэта Пецярбургскага універсітэта.

З 1889 да 19 красавіка 1890 г. за Лепяшынскім устанавілі паліцэйскі нагляд, а 19 красавіка 1890 г. ён быў арыштаваны разам з братам Мікалаем, пазбаўлены магчымасці займацца ва універсітэце і высланы з Пецярбурга. Паліцэйскі нагляд устанаўліваецца за ўсёй сям'ёй Лепяшынскіх.

Вясной 1891 г. Панцеляймон Мікалаевіч паспяхова здае экзамены ў Кіеўскім універсітэце і атрымлівае дыплом настаўніка. Ён пачынае працаваць у Севастопалі, але, трапіўшы ў "чорныя спісы" за арганізацыю забастоўкі канторскіх служачых, вымушаны выехаць з горада.

З восені 1894 г. працуе ў Пецярбургу ў Дзяржаўнай камісіі пагашэння даўгоў. У ноч з 8 на 9 снежня 1895 г. Лепяшынскага арыштоўваюць. Тады ж арыштоўваецца вялікая колькасць членаў пецярбургскага "Саюза барацьбы за вызваленне рабочага класа". Чатырнаццаць месяцаў знаходзіўся ён у папярэднім заключэнні, а 29 студзеня 1897 г. яго высылаюць пад нагляд паліцыі ва Усходнюю Сібір на тры гады, напачатку ў в. Казачынскае, а затым у Ермакоўскае, якое было за 40 кіламетраў ад Шушанскага.

Пасля заканчэння тэрміну высылкі П. М. Лепяшынскі актыўна займаецца рэвалюцыйнай дзейнасцю. Ён — агент

У музеі П. М. Лепяшынскага ў в. Ліцвінавічы

газеты РСДРП "Іскра", член арганізацыйнага камітэта па скліканні II з'езда РСДРП і падрыхтоўцы III з'езда партыі бальшавікоў, надзейны падпольшчык і канспіратар. Выконвае заданні партыі ў Пскове, Пецярбургу, Екацярынаслаўлі. У 1907 – 1910 гг. працуе настаўнікам у рамесным вучылішчы ў г. Орша і кіруе падпольнай групай бальшавікоў.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі восенню 1918 г. П. М. Лепяшынскі разам з сям'ёй прыязджае ў стаўшыя яму роднымі Ліцвінавічы.

У краіне ішла жорсткая барацьба са шматлікімі ворагамі маладой улады, панавалі голад і разруха, а Лепяшынскі з паплечнікам па заданні партыі прыехалі ствараць працоўную сельскагаспадарчую школу-камуну, вучыць маладое пакаленне жыць і працаваць па-новаму.

У Кармянскім валасным выканкоме Панцеляймон Мікалаевіч расказаў аб заданні, аб тым, якой павінна быць гэта школа. Як успамінае І. М. Антоненка, пасля паведамлення Лепяшынскага ўсе сядзелі моўчкі: неверагодным здаваліся яго мары і спадзяванні на светлае будучае народа.

— Цяжкую справу вы ўзялі на сябе, — зазначыў старшыня выканкома. — Становішча ў нас — быццам на фронце. Але чым зможам — дапаможам.

Пад школу быў вызвалены папоўскі дом. У садзе пачалі ўзводзіць іншыя прыбудовы. Па ўсіх вёсках пакацілася чутка аб тым, што ў Ліцвінавічах бальшавік Лепяшынскі адкрывае новую школу-камуну.

У школе дзеці не толькі вучыліся. Яны поўнасцю сябе абслугоўвалі. Кожны павінен быў пашыць сабе берэт, сарочку, штаны, а дзяўчаты — сукенкі. Спалі юныя камунары на ложках, зробленых іх рукамі ў сталярнай майстэрні, якая дзейнічала пры школе.

Лепяшынскі шмат часу аддаваў актывізацыі дзейнасці Кармянскай партыйнай арганізацыі. Ён і яго таварышы, вясковыя актывісты вялі растлумачальную работу ў масах. Даведаўшыся аб разгроме Кармянскага валаснога рэўкома, Лепяшынскі разам з ліцвінавіцкімі актывістамі прымае ўдзел у падаўленні кулацка-эсэраўскага мяцяжу.

Асабліва трывожна ўспрынялі камунары вестку аб тым, што цераз Сож пераправілася белагвардзейская банда на чале з мацёрым злачынцам Галакам, члены якой помсцілі актывістам новай улады, а яшчэ мелі намер знішчыць новую школу. Панцеляймон Мікалаевіч паведамляе пра банду ў Надзвычайную камісію г. Рагачова. Адтуль на веласіпедах праз Карму ў Ліцвінавічы выязджаюць чэкісты: старшы следчы Іван Бардухай, камісары

Данііл Гашко, Павел Сокалаў і Іван Антоненка. Каб не даць магчымасці бандытам выйсці на Ліцвінавічы, яны, ацаніўшы абстаноўку, выйшлі наперад бандзе. Але ў Вашчанках нечакана сустрэліся з Галакам і яго спадручнікамі. Быў цяжкі бой. Чэкісты занялі абарону ў вясковай хаце. Першымі ад куль бандытаў загінулі Данііл Гашко і Павел Сокалаў. Потым замоўк карабін Івана Бардухая. Але да школы бандыты не дайшлі — падаспелі чырвонаармейцы.

Банда Галака была разбіта. Але абстаноўка на Кармяншчыне заставалася складанай. А тут яшчэ наступ белагвардзейцаў. Восенню 1919 г. Панцеляймон Мікалаевіч перавозіць школу-камуну ў Маскву, арганізоўвае там вопытна-паказальную школу-камуну.

У чэрвені 1918 г. у Маскве адбыўся першы з'езд настаўнікаў-інтэрнацыяналістаў. На ім з дакладам аб рэформе школы выступіў Панцеляймон Мікалаевіч Лепяшынскі. Багаты жыццёвы, партыйны і педагагічны вопыт яго стаў прадумовай стварэння плана будучай адзінай савецкай працоўнай школы. Аб гэтым і гаварыў ён у сваім дакладзе. У другім дакладзе П. М. Лепяшынскі спыніў увагу прысутных на тэме школы і жыцця.

У 1920 г. у часопісе "Народная асвета" (№ 16—17) была надрукавана адна з грунтоўных распрацовак Лепяшынскага "Школьнае пытанне ў абставінах сацыялістычнай рэвалюцыі". Ён выказвае свой пункт гледжання на школьную гаспадарку як на гаспадарку калектыўную, якая вядзецца на аснове даных навукі і перадавога вопыту.

У канцы 1919 г., калі паўстала пытанне, каго накіраваць з камісіяй ВЦВК у Туркестан у якасці арганізатара народнай асветы, У. І. Ленін рэкамендаваў П. М. Лепяшынскага. Шмат сіл і энергіі аддаў Панцеляймон Мікалаевіч арганізацыі школ, дзіцячых садкоў, змешанага навучання дзяцей розных нацыянальнасцей, пабудовы падмурка вышэйшай адукацыі. Ён стаў ініцыятарам склікання першага ў Туркестане з'езда адказных работнікаў народнай асветы. Навуковы аддзел Наркамасветы Туркестана пад кіраўніцтвам Лепяшынскага падрыхтаваў адкрыццё дзяржаўнага універсітэта ў Ташкенце.

У канцы 1920 г. П. М. Лепяшынскага адклікаюць у Маскву на працу ў Гістпарт — спецыяльную камісію па гісторыі партыі бальшавікоў і Кастрычніцкай рэвалюцыі пры ЦК РКП(б). Лепяшынскі — намеснік старшыні камісіі. Ён арганізаваў збор дакументаў па гісторыі партыі і рэвалюцыі ў рэспубліках, краях, абласцях. Збіраліся ўспаміны старых рэвалюцыянераў, вялося выданне кніг пралетарскіх пісьменнікаў. Так, у пачатку 1923 г. выйшла першае выданне кнігі "Чапаеў", у верхняй частцы тытульнага ліста якой надрукавана: "Цэнтральны камітэт РК КП(б). Камісія па гісторыі Кастрычніцкай рэвалюцыі і РКП бальшавікоў".

У архіве прыёмнай дачкі Лепяшынскага — Бібісары Лепяшынскай захоўваецца экземпляр гэтай кнігі з надпісам: "Глыбокапаважанаму Панцеляймону Мікалаевічу Лепяшынскаму, чыя рука па-сяброўску, беражліва і любоўна прайшлася па "Чапаеву" і выправіла добрую палову яго недахопаў. Вашай дапамогі не забуду ніколі. Дзм. Фурманаў. 16 сакавіка 1923 г.".

П. М. Лепяшынскі рэцэнзаваў артыкулы члена апарату Альмінскага, падрыхтаваў да друку з вялікай уступнай прадмовай і заключным артыкулам "Пратаколы другога з'езда РСДРП". Як літаратуразнаўца быў аўтарам шэрага артыкулаў аб Салтыкове-Шчадрыне, Грыбаедаве, Някрасаве і іншых рускіх пісьменніках.

У Музеі Рэвалюцыі ў Маскве захоўваецца цікавы дакумент. Ён сведчыць, што ў першыя гады савецкай улады Лепяшынскі настойліва прапаноўваў Дзяржвыдавецтву выдаць поўны збор публіцыстычных твораў ігнараванага ў той час выдатнага рэвалюцыйнага дэмакрата Д. Пісарава. І дамогся свайго — выданне прыйшло да чытача.

П. М. Лепяшынскі шмат зрабіў па арганізацыі стварэння часопіса “Маладая гвардыя”. Сам увайшоў у склад рэдакцыйнай калегіі. Падрыхтаваў да выдання шэраг артыкулаў пад агульнай назвай “У свабодна-дыскусійным клубе”.

З 1927 да 1930 г. П. М. Лепяшынскі вядзе вялікую навуковую работу як кіраўнік Дзяржаўнага гістарычнага музея. Затым ён загадчык навукова-даследчага аддзела інстытута Наркамата знешняга гандлю. У 1935–1937 гг. Лепяшынскі – дырэктар Музея Рэвалюцыі СССР.

Шмат гадоў аддаў П. М. Лепяшынскі рабоце над раманам “Барацьба і творчасць”, які закончыў напярэдадні смерці.

Землякі ганарацца сваім сынам, рэвалюцыянерам, выдатным педагогам, вучоным, актыўным дзеячам і творцам Панцеляймонам Мікалаевічам Лепяшынскім. Яго імя носяць калгас і школа ў Ліцвінавічах на Кармяншчыне. Яго імем названы вуліцы ў Оршы, Гомелі, школы ў Маскве і Мінску. Устаноўлена прэмія за лепшую кнігу для журналістаў-пісьменнікаў рэспублікі. Яе ўдастоены ў свой час былі Генадзь Будай, Вера Палтаран, Анатоль Вярцінскі і іншыя публіцысты. На студыі “Беларусьфільм” створаны стужкі аб дзейнасці П. М. Лепяшынскага: “Старонкі вялікага жыцця”, “Барацьба і творчасць”, “Нецярпенне душы”.

П. М. Лепяшынскаму прысвечана кніга Р. Булацкага “Ленінскай гвардыі салдат”, нарысы “У школе імя Лепяшынскага” І. Якуша, “Закон прыцягнення” Я. Радкевіча, “Агент “Искры” І. Ідэльсона.

Ён з’яўляецца ганаровым старшынёй Аршанскага райвыканкома, ганаровым камсамольцам Беларусі. За заслугі перад Радзімай Панцеляймон Мікалаевіч узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памёр П. М. Лепяшынскі 30 верасня 1944 г.

Барацьбіты за савецкую ўладу з в. Кляпін

У 1909 г. генерал-губернатар Сярэдняй Азіі і Туркестана Бараноўскі арганізаваў у сваім маёнтку двухкласную школу, якая павінна была рыхтаваць служак рэлігійнага культу і настаўнікаў царкоўнапрыходскіх школ. Сюды выпадкова трапілі і шэсць падлеткаў з Кляпіна. Пасля заканчэння школы Мікалай Шчэрбітаў і Дзмітрый Паліцын паехалі ў Кіеў, дзе здалі экзамены на званне народнага настаўніка. Але, вярнуўшыся ў вёску, працаваць у школу сябры не пайшлі і хутка паехалі з Кляпіна.

Вярнуліся яны толькі ў маі 1917 г. Мікалай Шчэрбітаў у вёсцы прабыў нядоўга: бальшавіка накіравалі ўзначальваць Чэрыкаўскі УКОМ. Затым было больш адказнае заданне ў Рэчыцы: праца ў Палескім камітэце РСДРП. У 1918 г. Мікалай Шчэрбітаў добраахвотна ідзе на фронт і ўзначальвае палiткiраўніцтва 20-ай Перакопскай дывізіі. Калі Крым быў ачышчаны ад белагвардзейцаў, Мікалай Дарафеевіч накіроўваецца ў Сімферопаль у якасці арганізатара і кіраўніка партыйнай школы. У 1922 г. сыпны тыф абарваў жыццё маладога камуніста. Яго імя насіла Сімферопальская партыйная школа. Абеліск у гонар бальшавіка з далёкай беларускай в. Кляпін стаяў перад уваходам у гэту ўстанову.

У 1917 г. у канцы чэрвеня ў в. Кляпін ствараецца партыйная ячэйка з ліку былых шахцёраў і бяднейшага сялянства ў складзе 32 чалавек. Сакратаром абралі Дзмітрыя Арсенцьевіча Паліцына.

У ліпені па ініцыятыве ячэйкі на тэрыторыі сучаснага Валынцаўскага сельскага Савета былі створаны Саветы, дэпутатамі якіх абіраліся бедныя сяляне. Кляпінскі Савет узначаліў былы шахцёр Нічыпар Іванавіч Паліцын, Валынцаўскі – Аляксей Мікітавіч Сапега, Буда-Кляпінскі – Іван Багданавіч Каваль.

Партыйная ячэйка сумесна з Саветам стварыла камісію па нацыяналізацыі маёнтка пані фон Мект. Старшынёй камісіі

абралі Івана Іванавіча Паліцына, а сакратаром — Фаму Захаравіча Суворава. Жывёлу, палі і сенажаці раздзялілі паміж сялянамі.

Партыйная арганізацыя вяла значную работу па выхаванні народа. Жонка сакратара партыйнай ячэйкі настаўніца Аляксандра Парфенаўна Герчыкава арганізавала ў вёсцы хор, драматычны гурток. Тут наладжваліся чытанні палітычнай і мастацкай літаратуры, праводзілася работа па ліквідацыі непісьменнасці. Маёнтак пані фон Мект быў перададзены школе.

Пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі партыйная арганізацыя накіроўвае сваю дзейнасць на аднаўленне народнай гаспадаркі. Двойчы ў Кляпіне пабываў стары бальшавік П. М. Лепяшынскі. Ён выступаў на партыйных сходах, даваў практычныя ўказанні, наведаў мясцовую школу.

У 1918 г. на тэрыторыі Наваельненскай воласці аб'явіліся два афіцэры, сябры па кадэцкаму корпусу Лебедзеў і Герчыкаў. Яны ездзілі па хутарах, падбухторваючы людзей на контррэвалюцыйны мяцеж.

У адну з начэй да сакратара партыйнай ячэйкі Дзмітрыя Паліцына прыйшлі дзяжурны і незнаёмец. Апошні перадаў запіску, у якой гаварылася аб падрыхтоўцы да мяцяжу. Паліцын сабраў камуністаў, паставіў перад імі задачу: захапіць зачыншчыкаў. Атрад пад камандаваннем камандзіра баявой дружыны Івана Мікітавіча Філоненкі рушыў да Наваельні.

На трэція суткі атрад выявіў мяцежнікаў на Мядзведаўскіх хутарах. Захопленыя знянацку, яны здаліся без бою. Абяззброеныя зачыншчыкі былі дастаўлены ў воласць. Афіцэраў Герчыкава і Лебедзева пасля суда расстралялі.

Калі над маладой Савецкай рэспублікай навісла замежная інтэрвенцыя, закружылася чорным воранам белагвардзейшчына, многія з кляпінскіх партыйцаў добраахвотна пайшлі на фронт. На Украіне ў час грыгор'еўскага мяцяжу геройскі загінуў сакратар партыйнай ячэйкі Дзмітрый Арсенцьевіч Паліцын. Вось што напісаў яго маці былы работнік Екацярынаслаўскай ваеннай акругі Мікалай Іванавіч Казлоўскі: "Мяцежнікі рваліся да штаба, які размяшчаўся ў Кацярынінскім палацы. Мы абараняліся. І раптам замоўк кулямёт. Паліцын падбег да яго, адцягнуў параненага кулямётчыка і стаў паліваць ворага градам куль. Але раптам па кулямёту ўдарыла гармата. Варожы снарад абарваў жыццё мужнага камуніста".

Не вярнуліся дамоў Якаў Нічыпаравіч Паліцын, Прохар Іванавіч Сувораў, Васіль Гаўрылавіч Лажэвіч і Фрол Лосеў.

* * *

У Кляпіне ў гэты час таксама было неспакойна. Не давалі жыць розныя недабітыя банды, што хаваліся ў векавых лясах. Восеньскай ноччу 1920 г. бандыты разграбілі Кляпінскае лясніцтва, мясцовую кантору сувязі, абрабавалі бацькоў сакратароў партячэйкі Паліцына і валаснога землеаддзела Канавалава.

Чэкісты, якія прыехалі ў Кляпін на наступны дзень, сакрэтна размясціліся на падвор'ях актывістаў. Хутка высвеілі, што ў наваколлі арудуюць банды Савіцкага, Белахвостава і Саламонава. Устанавілі і месцы, дзе яны збіраюцца, — у вёсках Валынцы і Дубраўка. Першы ўдар быў нанесены бандзе Саламонава ў Валынцах, другі — у Дубраўцы і апошні — каля Мядзведаўскіх хутароў. Банду разграмілі, хаця пры гэтым быў паранены начальнік ВЧК Вяртліб, які камандаваў аперацыяй.

Вучняў Палескай школы папрасілі высветліць прозвішчы бандытаў з дзвюх другіх банд. Гэтым займаліся М. Н. Лісоўская, Н. А. Паліцына, П. Ф. Чабаткова, В. І. Чураўцова і іншыя. Яны паведамілі даныя Лявону Яфімавічу Філоненку, а той у сваю чаргу перадаў іх працаўнікам камісіі Аляксеенку, Сіняўскаму і Пракопенку, якія былі пакінуты для сувязі. Да пачатку лістапада, калі спісы былі складзены, з Гомеля і Рагачова прыбылі два чырвонагвардзейскія ат-

рады. У Кляпіне размясціўся атрад Магідзіна, а ў Беразяках — Ізвекава.

Напярэдадні гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі вучні з Палескай школы даведаліся, што бандыты плануюць на гэта свята сабрацца ў Лецяхах і зрабіць налёт на Папову Гару.

Тады камсамолкам Паліцынай і Чураўцовай было даручана схадзіць у Кляпін, каб перадаць гэтую навіну. Па дарозе дзяўчат сустрэлі два незнаёмцы, але, высветліўшы, што дзяўчаты ідуць да сваякоў, адпусцілі. Потым стала вядома, адным з незнаёмцаў быў бандыт Кабякоў, другім — у форме унтэр-афіцэра — Лакаў.

У Кляпіне дзяўчаты адразу ж пайшлі да Івана Пракопенкі і расказалі аб плануемай вылазцы бандытаў.

6 лістапада 1922 г. каля Бесядзі банды былі акружаны чырвонагвардзейскімі атрадамі. Завязаўся бой, у выніку якога многія бандыты загінулі, а тых, што ўратаваліся, потым вылавілі па складзеных спісах. Савіцкі быў арыштаваны на станцыі Клінцы і пакараны смерцю. Белахвоставу ўдалося ўцячы. І толькі ў 1928 г. ён быў арыштаваны і прыгавораны да расстрэлу.

У Кляпін і навакольныя вёскі прыйшло мірнае жыццё.

Час выбраў нас
(успаміны ўдзельнікаў і сведак падзей 1917—1920 гг.)

“Хізаўская рэспубліка”

З успамінаў В. Ушава-Ландыша, жыхара в. Хізаў

Пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. у Хізаў прыехаў з Петраграда рабочы Абухаўскага завода Цімох Рыгоравіч Кавалёў. Расказваў землякам пра рэвалюцыйныя падзеі ў Піцеры, аб тым, хто ўвайшоў у Часовы ўрад, падрабязна спыніўся на праграме бальшавікоў, якія заклікалі аддаць заводы і фабрыкі рабочым, зямлю — сялянам. А хто з вяскоўцаў не марыў аб зямлі?

Ідэя стварэння ў Хізаве рэвалюцыйнага сялянскага камітэта, які б накіроўваў усю барацьбу, прыйшлася вяскоўцам па душы. У склад яго абралі Цімоха Рыгоравіча Кавалёва, сына беззямельнага селяніна Ціта Іванавіча Голубава, былога салдата Максіма Пятровіча Шаўчэнку, Астапа Сямёнавіча Хрыпунова. Яны пазнаёміліся з праграмай бальшавікоў, данеслі яе асноўныя палажэнні вяскоўцам. Галоўнае, вучылі яны, раздзяліць зямлю папраўдзе, не выконваць загады Часовага ўрада.

Над хатай Кавалёвых, дзе размясціўся новы орган улады, залунаў чырвоны сцяг. Было аб’яўлена аб стварэнні “Хізаўскай рэспублікі”. Яе члены адмовіліся здаць хлеб і жывёлу для арміі, стварылі камісію па раздзелу памешчыцкай зямлі. У верасні 1917 г. у Магілёў з павятовага горада Рагачова паляцела дэпеша: “У вёсцы Хізаў утварылася самастойная рэспубліка, якая не прызнае Часовы ўрад, не выконвае яго распараджэнні...”. Ды толькі галоўным уладам у той напружаны час не было справы да хізаўчан.

Праіснавала “Хізаўская рэспубліка” да рэвалюцыі. Карнікі “дзікай дывізіі” знялі сцяг з хаты Кавалёвых і расстралялі трапіўшага ім у рукі рэўкомаўца Максіма Шаўчэнку і яго старога бацьку.

Без памылак не абыходзілася

З успамінаў І. П. Караткевіча, жыхара м. Карма

Дэзерціры з франтоў, якія вельмі часта з’яўляліся ў Карме ў 1917 г., былі той рухаючай сілай, што дапамагала хутка зразумець новыя ідэі. Напрыклад, неабходнасць выбраць савецкую ўладу. На

мітынгах, якія ў той час праходзілі часта, прапаноўваецца абраць у Савет І. П. Караткевіча, І. Мятнікава, Андросенку, Кадуцкага, ад яўрэйскага насельніцтва — Фрадкіна. Большасцю галасоў гэтыя кандыдатуры праходзяць.

Прыход легіянераў, як памятаю, зноў нарадзіў у Карме двоеўладдзе. Пасля таго як палякі пакінулі Кармяншчыну, выканком Савета ліквідуе ўправу і забірае ўладу ў свае рукі. Але воласць кішыць бандытамі, якія, называючы сябе партызанскімі атрадамі, грабяць насельніцтва, марадзёрствуюць. Быў такі "партызанскі атрад" пад камандаваннем Бабікава. Грабілі, палілі, здзекаваліся. Калі ж каго з гэтых "партызан" лавілі на месцы злачынства, сам Бабікаў з'яўляўся ў Савет і абараняў сваіх ваяк. Дайшло да таго, што гэты атрад намерваўся захапіць Карму. Толькі летам 1918 г. бабікаўцаў удалося абяззброіць і распусціць.

Нейкі час мне давялося ўзначальваць арганізаваны ў Доўску павятовы выканком, які прадстаўляў уладу ў незанятых акупантамі валасцях Рагачоўскага павета. Памятаю: у Карме тады было надзвычай шмат шараханняў. Амаль штомесяц перавыбіралі выканком, туды часта праходзілі класавыя ворагі. Толькі пасля таго, як членамі выканкома сталі бальшавікі Фрадкін, браты Лейзяронкі, Фількельштэйн і іншыя, справы пачалі наладжвацца.

Дубы-волаты

З успамінаў В. Гроднікава, жыхара в. Хізаў

Раз'юшанымі драпежнікамі ўварваліся ў Хізаў у той чорны дзень легіянеры паляка Даўбор-Мусніцкага. Засвісталі бізуны над членамі створанай у вёсцы "Хізаўскай рэспублікі". Сялянам было загадана вярнуць дабро пані Чарапанавай. У рукі легіянераў трапіў член рэўкома Максім Шаўчэнка. Чарапанава ўказала на яго як на завадатара і папрасіла, каб бунтаўшчыка забралі ў Карму. Разам з сынам забралі і бацьку Максіма — Пятра Шаўчэнку. Усхваляваныя гэтай навіной хізаўцы рушылі грамадой да памешчыцы з патрабаваннем адпусціць бацьку і сына. Але тая гняўліва адсылала ўсіх прэч. Тады з натоўпу выйшаў Лукаш Жукоўскі і прыгразіў Чарапанавай, калі тая не напіша зараз адпаведную паперу, пусціць на вецер усё яе дабро. І на яе вачах падпаліў пук саломы, што трымаў у руках. Перапалоханая Чарапанава напісала запіску. Але было позна...

Расказвалі, што першым расстралялі Максіма, а бацьку прапанавалі ісці дамоў. Але стары плюнуў у вочы афіцэру і крыкнуў:

— Я таксама з ім быў за новую ўладу!

Шаўчэнкаў — бацьку і сына — хізаўцы паклалі ў адну труну, у іх гонар пасадзілі два маладзенькія дубкі. І даглядалі дрэўцы ўсёй вёскай, перадаючы маладым легенду пра бацьку і сына.

Як мы змагаліся...

З успамінаў арганізатара партызанскага руху на Беларусі ў грамадзянскую вайну І. М. Антоненкі, жыхара м. Карма

Другі год ішла першая сусветная вайна. Мяне аб'явілі рэкрутам, і апошні месяц з гармонікам у руках хадзіў я з вясковай моладдзю, граў прыпеўкі, а потым забароненыя песні. Менавіта за іх і атрымаў добрую порцыю паліцэйскіх бізуноў. Давялося пасядзець за кратамі, але выратавала рэкруцтва: арміі патрэбна было "гарматнае" мяса.

На фронце нас, незадаволеных вайной салдат, і сустрэла вестка аб лютаўскай рэвалюцыі. Мы спадзяваліся, што цяпер вайна закончыцца. Перамога да канца, аб'яўленая Часовым урадам, для нас азначала новыя смерці, новыя ахвяры. Я, як і многія мае таварышы, дэзерціраваў. Апошняй кропкай у маім рашэнні стаў цікавы выпадак. Неяк да мяне ў акоп прыйшоў узводны Манжуга, былы ярас-

лаўскі рабочы. Сказаў, што прыглядаецца да маіх дзеянняў і размоў і поўнасцю мне давярае. А вечарам ён і салдат-бальшавік Васіль Веташкін прапанавалі прачытаць салдатам газету "Акопная праўда".

Потым часцяком даводзілася ўціхую сядлаць каня і мчацца на станцыю Маневічы, што пад Ковелем. Менавіта тут з праходзячага цягніка сувязныя перадавалі пракламацыі, лістоўкі, газеты. Там і я атрымліваў "Акопную праўду", якую потым салдаты зачытвалі да дзірак. Гэта бальшавіцкае выданне заклікала салдат да братання, патрабавала пакончыць з вайной.

І аднойчы на пастраенні камандзір нашага дывізіёна заявіў, што на агнявой пазіцыі знойдзена падпольная газета. Той, хто прапагандуе, абвінавачваецца ў здрадніцтве. А шпіёнам тады было адно пакаранне — смерць. Мяне быццам токам працяло! Праўда, далей гэтых пагроз афіцэр не пайшоў. Але, сабраўшыся вечарам, бальшавікі дывізіёна (нас было чацвёра) вырашылі, што далей заставацца ў часці нельга. А ў верасні 1917 г., праз тры месяцы пасля вышэй апісаных падзей, я быў ужо на бацькаўшчыне — у мястэчку Карма Магілёўскай губерні.

Родныя сустрэлі мяне з радасцю і адчаем: агенты Часовага ўрада лавілі ўсіх, хто самавольна пакінуў фронт, арыштоўвалі і тэрмінова накіроўвалі маршавымі ротамі на самыя небяспечныя ўчасткі фронту. Бацька параіў на досвітку ісці ў лес.

Доўга давялося блукаць па мясцінах, дзе хлапцом збіраў грыбы, ягады, ірваў арэхі. Нарэшце на адной з палянак убачыў вогнішча і людзей. Падышоў ціха, ніхто нават не спыніў. Прыгледзеўся: усе хлопцы з навакольных вёсак. Такія ж былыя салдаты, як я. Браты Газбенкі — Панкрат і Фёдар, Іван з в. Вашчанкі, Кузьма Купцоў з Буды, Мікалай Ланюгоў з Сырска, Якаў Лейзяронак з Кармы. Апранутыя хто як. Урэшце мяне заўважылі.

— Нашага палку прыбыло, — выгукнуў Кузьма Купцоў. — Просім да агню і будана.

— Агню рады, сустрэчы таксама, а вось будана не бачу, — у тон яму адказаў я. — І ахову ставіць усё ж трэба...

Пасядзелі, у размовах успомнілі і блуканне з гармонікам, і агітацыйныя прыпеўкі, і дубцы, што пагулялі па маёй спіне.

— Будзем, хлопцы, пераходзіць да сур'ёзнай размовы, — заўважаю ўрэшце я. — Па норах нас як пацукоў пералавяць. Раз з царскай арміяй не па дарозе, створым свой, чырвоны атрад. Будзем ваяваць за інтарэсы народа. Такія атрады ўжо шмат дзе дзейнічаюць.

Маю прапанову поўнасцю падтрымалі і тут жа абралі мяне камандзірам чырвонагвардзейскага атрада Кармяншчыны. Справа ў тым, што я быў найбольш адукаваны на той час, да таго ж закончыў артылерыйскія курсы, з'яўляўся камандзірам агнявога ўзвода. У першым спісе атрада нас налічвалася толькі 16 чалавек. Яшчэ горш было са зброяй. Яе з арміі прынёс не кожны. Напачатку мы мелі пяць ружжаў, тры наганы, некалькі драбавікоў і шабляў. Месцам збору атрада вызначылі Ліцвінавіцкую лясную дачу, недалёка ад в. Зяцькавічы. Абсталявалі жыллё, арганізавалі ахову. Па чарзе хадзілі ў вёску да родных, запасаліся харчаваннем, прыносілі навіны.

Хутка ў атрадзе з'явіліся новыя людзі: бядняк Андрэй Агееў з Кармы, былы матрос Міхаіл Ільюшчанка з в. Куракаўшчына, мой старэйшы брат Кузьма, які толькі што прытупаў з арміі, і іншыя.

Вестка аб Кастрычніцкай рэвалюцыі паставіла перад атрадам новыя задачы, у тым ліку патрэбнасць устанавіць парадак у воласці, сачыць, каб не было марадзёрства і грабяжоў. Новая ўлада аб'явіла аб перадачы зямлі сялянам, што асабліва ўскалыхнула вяскоўцаў. Нават кулакі напачатку выступілі за раздзел зямлі і ўласнасці, разбіралі жывёлу, перавозілі пабудовы. Асабліва шмат у той час секлі лес: колькі хацелі і дзе хацелі.

Кармянскі чырвонагвардзейскі атрад сумесна з валасным камітэтам беднаты, які ўзначаліў наш таварыш па атраду Андрэй Уладзіміравіч Агееў, павялі рашучую барацьбу з самавольствам. Мы не далі разграміць маёнткі ў Сырску, Навасёлках, Янаўцы, строга сачылі за тым, каб лес, сельскагаспадарчы інвентар, жывёлу перш за ўсё атрымлівалі беднякі-сяляне.

У лістападзе 1917 г. чырвонагвардзейскі атрад правёў першую баявую аперацыю супраць ворагаў новай улады.

19 лістапада з Быхаўскай турмы збег генерал Карнілаў. Пад аховай тэкінцаў "дзікай" дывізіі ён спыніўся на адпачынак у Карме. Напачатку мы не маглі зразумець, што гэта за ваякі. Форма незнаёмая: доўгія чаркескі, шаблі крывыя, на пытанні салдаты не адказваюць, размаўляюць не па-нашаму.

Нязваныя госці групамі разышліся па падвор'ях. Некалькі чалавек зайшлі ў хату чырвонагвардзейца Кірылы Падзернева. Мы з Іванам Мятнікавым таксама туды, быццам выпадкова, заглянулі. Тыя якраз збіраліся вячэраць. Ціха параіў гаспадару паставіць на стол самагон, мауляў, хутчэй языкі развяжуць. Пасля першых бутэлек першаку госці павесялелі, сталі ўсміхацца. Урэшце адзін з іх падняўся, і на грудзях — чатыры крыжы, як памятаю, два залатыя і два сярэбраныя. Бачна, што старэйшы ў іх. Ён папярэдзіў, каб мы па п'янцы не зайшлі ў хату з белым сцягам.

— Там — сам генерал Карнілаў, — сказаў ён.

У мяне з галавы хмель адразу выйшаў. Я ведаў, што Карнілава збіраюцца судзіць. Значыць, збег генерал? Вось бы захапіць! Але дзе там: тэкінцаў было пад чатыры сотні, куды нашай жменьцы чырвонагвардзейцаў з імі цягацца сілай.

Пасядзеў яшчэ крыху з гасцямі — і хуценька да старэйшага брата Кузьмы, які з'яўляўся камісарам валаснога рэвалюцыйнага камітэта. Ноччу мы перадалі па тэлеграфу ў Гомельскі рэвалюцыйны полк кірунак следавання генерала Карнілава.

На досвітку тэкінцы пераправіліся праз Сож. Гомельскі рэвалюцыйны полк сустрэў іх пад станцыяй Унеча. Завязаўся бой. Тэкінцы былі разбіты, многія здаліся ў палон. Захапілі нашы 300 коней, шмат зброі. Але генералу Карнілаву з невялікім атрадам удалося адбіцца.

Менш чым праз суткі на вуліцах Кармы зноў з'явіўся атрад яшчэ адных узброеных "гасцей". Аказалася, што гэта гаспадарчая частка Карнілава. Абоз вельмі расцягнуўся. Тэкінцы цікавіліся ў сустрэчных, куды пайшоў галаўны атрад.

Мы хуценька сталі збіраць сваіх. Прыйшлі Андрэй Агееў, Іван Ганчароў, Якаў Лейзяронак і іншыя. Усяго чалавек пятнаццаць. Вырашылі захапіць абоз. Да Кармы на гэты час падышлі чатыры кухні з прадуктамі. Мы атакавалі іх. Каля трыццаці салдат здаліся ў палон. Двое на конях кінуліся наўцёкі. Я, Іван Ганчароў і сын вартаўніка ўправы за імі. Таварышы мае пакрыху адставалі, бо не звыкліся з такім алюрам, а мяне армія ўсяму навучыла. Бачу, тэкінцы да лесу мецяць. Выхапіў рэвальвер — няма патронаў. "Уцякуць гады!" Склаў далоні лодачкай і моцна хлопнуў. Эха разнесла па лагчыне мае "выстралы". Тэкінцы спыніліся: махаю ім рукой, маўляў, давайце назад. Паслухаліся, едуць. Разумею, што голымі рукамі дваіх не возьмеш. Паварочваю каня і еду спераду. Тут паказаліся мае адстаўшыя таварышы. На душы павесялела...

З Краснаполля мы атрымалі новую вестку: да Кармы рухаюцца польскія легіянеры. Параіўшыся, вырашылі падрыхтаваць засаду ва ўрочышчы Градкі, кіламетрах у трох ад мястэчка. Кузьма Антоненка вызваўся пайсці ў разведку.

Чакаем. Вось ўжо апоўдні, а разведчыка ўсё няма. Тут у двор убягае чарада хлапчукоў з крыкам: з горкі і сапраўды накіроўваюцца верхавыя да 150 чалавек. Я ж адзін. А тут яшчэ скрыні са зброяй. Давай іх дровамі закідваць. Ледзь паспеў. Раптам чую:

— Цо пане бальшавіку робіць?

Аглядваюся. У двары чатыры верхавыя.

— А вось дровы складваю, вартаўнік я тут...

Паверылі, паехалі.

Выскачыў на вуліцу, а міма ў санках вязуць нашага разведчыка. Накіроўваюцца роўна да пошты, дзе начальнікам першы вораг Кузьмы эсэр Іван Салаўянчыкаў. Усё, думаю, выдасць брата. І зноў я на хітрасць пайшоў. Бягом да старшыні земскай управы Шпакава. Адукаваны быў чалавек, спачуваў бальшавікам.

— Рыгор Іванавіч, выручай брата...

Ва ўпраўленні хуценька аддрукавалі пасведчанне, што Кузьма з'яўляецца лясным аб'ездчыкам. З гэтым дакументам я бягом да Салаўянчыкава, кажу яму: "Перадай брату дакумент, інакш і табе не жыць". Спалохаўся эсэр, паслухаў. Так і выратаваўся Кузьма.

Пры адыходзе з Кармы легіянеры пакінулі ў двары валаснай управы шмат нарабаванага і загадалі начальніку міліцыі Ткачэнку перавезці маёмасць у Рагачоў. Чаго там толькі не было: запасныя часткі да кулямётаў, сёдлы, швейныя і пішучыя машынкі, кухонныя наборы...

— Не дадзім, — сказаў я Ткачэнку.

Той і сам быў не супраць, але як гэта зрабіць? Дамовіліся, што начальнік міліцыі з'ездзіць у Рагачоў і высветліць абстаноўку. Ён паехаў і не вярнуўся.

Замест Ткачэнкі ў канцы лютага 1918 г. у Карму накіроўваецца карная экспедыцыя, каб забраць нарабаванае. У якасці кантрыбуцыі легіянеры запатрабавалі яшчэ сто вазоў фуражу і прадуктаў. Насельніцтва выканала ўсе патрабаванні карнікаў, а чырвонагвардзейцы вырашылі ўсё ж сустрэць абоз па дарозе, у тым жа ўрочышчы Градкі. Месца для засады было добрым: ельнік, густы хмызняк.

Добра было бачна, як рухаецца калона. Мой стрэл у першага верхавога быў камандай да пачатку бою. Тут жа разанула доўгая чарга кулямёта, за якім ляжаў Венянкоў. Некалькі верхавых адразу ўпалі на зямлю. А з тылу распачалі стральбу байцы другога ўзвода. Легіянеры паспрабавалі ўцячы ў бок в. Барсукі. Мы іх не затрымлівалі: абоз цэлы, людзі нашы цэлыя, што яшчэ трэба? А падводчыкам загадалі вяртацца назад.

Дні праз чатыры ў Карму ідзе новы карны атрад на чале з харунжым Якубскім, былым арандатарам, а затым гаспадаром вялікага маёнтка ў Сырску. Пачаліся здзекі над сялянамі. Якубскі патрабаваў вярнуць канфіскаваныя хлеб, жывёлу, маёмасць. Пасля нядаўняй сутычкі з палякамі мы бачылі, што ім не вельмі хочацца паміраць за чужое дабро. Зноў мы арганізавалі засаду. Пасля першых кулямётных чэргаў карнікі пабеглі ад абозу.

Пераканаўшыся, што іх карныя экспедыцыі поспеху не даюць, камандаванне легіянераў звярнулася за дапамогай да немцаў. Тыя ў сакавіку 1918 г. накіроўваюць у мястэчка атрад, які ўзначаліў капітан Берк. Карнікі па-зверску расправіліся з насельніцтвам. Яны акружылі і падпалілі в. Масцеравая Слабодка, многія жыхары якой былі членамі нашага атрада, разграбілі магазін у Карме, забілі нашых таварышаў.

Пасля трох дзён грабяжу і здзекаў карнікі накіраваліся ў Чачэрск. Мы дамовіліся, што тутэйшыя чырвонагвардзейцы дапамогуць. Атрад у іх быў хоць і не вялікі — усяго чалавек за 20, але меў некалькі кулямётаў.

Засаду зрабілі ва ўрочышчы Пола, кіламетраў за дванаццаць ад мястэчка па дарозе на Чачэрск. Немцы рухаліся на конях, былі п'яныя, гучна спявалі. Мы падпусцілі іх блізка. Знянацку распачаты бой прынёс нам перамогу: каля 30 карнікаў былі забіты, астатнія разбегліся. Гэта — апошняя карная экспедыцыя на Кармяншчыну. Неўзабаве быў заключаны Брэсцкі мірны дагавор.

У лютым 1919 г. наш атрад прымаў удзел у падаўленні кулацка-эсэраўскага мяцяжу ў Кармянскай воласці. Члены валаснога выканкома эсэры Абрам Кадуцкі, Фрол Караткевіч і здрадзіўшы

бальшавікам старшыня выканкома Навуменка разаслалі па Саветах загады з патрабаваннем даслаць у Карму узброеныя атрады. Ім падпарадкаваліся не толькі эсэры і кулакі, якія прабраліся да ўлады, а нават і некаторыя работнікі Саветаў.

Да дванаццаці гадзін у Карме сабралася некалькі тысяч узброеных сялян, хаця многія з іх добра не ўсведамлялі, для чаго іх тут трымаюць. Арганізатары мяцяжу заклікалі звергнуць савецкую ўладу, абяцалі падтрымку воінскіх падраздзяленняў з фронту. Некаторыя з сялян пастараліся пацiху пакінуць мітынг, але тыя, каму новая ўлада прыйшлася не па нутры, пачалі граміць установы. У будынку партячэйкі яны сарвалі партрэты кіраўнікоў рэвалюцыі, разбілі мэблю. Былі па-зверску забіты член выканкома Абатураў, начальнік міліцыі Ільюшчанка, міліцыянер Давыдзенка, збіты міліцыянер Караткевіч і Гайкоў.

Пазбавіцца расправы ўдалося немногім актывістам. Так, Кузьма Антоненка паспеў на кані, адстрэльваючыся, вырвацца з мястэчка і паведаміць аб мяцяжы ў Рагачоў.

Неяк мы атрымалі дэпешу, што на Карму ідзе банда "Марусі". Гэта была шайка адпетых галаварэзаў, дзе налічвалася да двухсот чалавек. Камісар Кузьма Антоненка мабілізаваў на абарону ўсё дарослае насельніцтва мястэчка. Убачыўшы столькі абаронцаў, атрад "Марусі" павярнуў убок Бычы, а затым наогул падаўся ў Польшчу.

Нямала трывог у навакольных вёсках выклікалі і мясцовыя бандыты. Асабліва пакутавала насельніцтва ад шайкі Андрэя Акінчыца. Гэты трыццацідвухгадовы вярзіла трымаў у страху ўсю акругу. Дапамагалі яму тры браты і некалькі сяброў. Бандыты да таго абнаглелі, што грабілі магазіны сярод белага дня, пагражалі людзям зброяй, забіралі ўсё, што трапляла пад руку, і знікалі без усялякіх слядоў. Шайка ўмела маскіравалася. Шматлікія вобыскі, якія праводзіліся чырвонагвардзейцамі і міліцыяй у хлявах, на падвор'ях, нічога не давалі.

Аднойчы ўдалося даведацца, што Акінчыц паехаў на прыстань да Сажа. Парашылі, што ноччу ён будзе дома, і напярэдадні схаваліся ў хаце. Гадзіны ў тры ночы заскрыпелі санкі, а затым у дзверы ўваліўся і сам бандыт. Тут жа накідваю яму на шыю вяроўку, астатнія чырвонагвардзейцы дапамагаюць скруціць Акінчыца. Праз некалькі дзён былі арыштаваны ўсе 13 членаў гэтай банды.

Кармянскі чырвонагвардзейскі атрад правёў каля дзесяці баявых аперацый. Праіснаваў ён да 15 мая 1919 г. А потым па закліку партыі большасць членаў атрада пайшла на франты грамадзянскай вайны, каб біць ворагаў савецкай улады. Мне ж прапанавалі працаваць у Надзвычайнай камісіі.

Пашчасціла абараняць школу Панцеляймона Мікалаевіча Лепяшынскага ў Ліцвінавічах. Аб яе дзейнасці ведалі многія. Я не раз сустракаўся з самім педагогам. Ворагам не падабалася, што рос аўтарытэт Лепяшынскага ў мясцовага насельніцтва. Сяляне вучыліся новаму жыццю, бачылі, што іх дзецям педагогі аддаюць шмат часу і ўвагі.

У маі 1919 г. на павятовай партыйнай канферэнцыі, якая праходзіла пад кіраўніцтвам Лепяшынскага, мяне абралі намеснікам старшыні павятовай Надзвычайнай камісіі. А праз месяц Панцеляймон Мікалаевіч патэлефанаваў у Рагачоў і паведаміў мне трывожную навіну: белагвардзейская банда мацёрага Галака пераправілася праз Сож з намерам знішчыць школу.

Старшы следчы Іван Бардухай, камісары Данііл Гашко, Павел Сокалаў і я на веласіпедах выехалі ў мястэчка. Раніцай мы былі ўжо ў Карме, а недзе апоўдні — у Ліцвінавічах. Нас сустрэў Лепяшынскі. Ён паведаміў апошнія навіны, і мы вырашылі правесці разведку з тым, каб сустрэць бандытаў загадзя.

Вечарэла. Навокал панавала цішыня, было цёмна. Добра, што ішлі па мясцінах, знаёмых мне з дзяцінства.

Мінулі Зяцькавічы, направіліся да Вашчанак. Раптам вецер данёс нейкі

шум. Мы прыпыніліся, услухваючыся і ўглядаючыся ў наваколле. Недалёка ад нас праскакаў коннік, недзе загаўкалі сабакі, паказаліся першыя хаты вёскі. Зноў цішыня. Але раптам нас асляпіў яркі сполах ракеты. Зусім побач загўчала лаянка, пачуліся крыкі.

— Што, папаліся? Здавайцеся!

Мы пачалі адстрэльвацца, імкнучыся схавацца ў крайняй хаце. Трэба пратрымацца хаця б з гадзіну, бо вось-вось павінна была прыйсці дапамога. Але хата аказалася на замку. Тады мы разбілі шкло, ускочылі ўнутр і сталі так, каб было бачна падступаючых бандытаў з усіх бакоў.

Па вокнах ударылі з кулямёта. І зноў крык:

— Здавайся, камісар, а то падпалім.

Сілы аказаліся няроўнымі. Загінулі Гашко і Сокалаў. Праз нейкі час упаў Бардухай. Адчуваю, што таксама паранены. Але працягваю адстрэльвацца. Бандыты ўрываюцца ў хату, я атрымліваю яшчэ некалькі куль, але сам паспяваю выпусціць кулю ў аднаго з бандытаў. У самы апошні момант мне здаецца, што гучыць “ура!” чырвонаармейцаў...

Мяне палічылі забітым. Маці паведамілі, каб рыхтавалася да пахавання. Але ў школе, куды нас чатырох прывезлі, жонка Лепяшынскага, Вольга Барысаўна, урач па прафесіі, заўважыла ў мяне прыкметы жыцця. Мяне хутка прааперыравалі, перавязалі раны. Апрытомнеў я на чацвёртыя суткі ў Гомельскай бальніцы. Толькі там даведаўся, што банда Галака разбіта чырвонаармейцамі, а школа-камуна, за якую аддалі жыццё мае таварышы-чэкісты, працуе.

Праз некалькі месяцаў пасля ранення я прыйшоў у Надзвычайную камісію г. Рагачова. Абапіраючыся на мыліцы, далажыў, што гатовы да выканання абавязкаў па абароне савецкай улады.

Актыўныя ўдзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны

АКІНЧЫЦ Кузьма Восіпавіч, н. у 1895 у в. Багданавічы.

АНІШЧАНКА Апанас Ерафеевіч, н. у 1894 у в. Барсукі.

АНТОНЕНКА Кузьма Міхайлавіч, н. у 1892 у г.п. Карма.

БЕРДНІКАЎ Восіп Захаравіч, н. у 1899 у в. Прудок.

ВАСІЛЬЕЎ Мацвей Рыгоравіч, н. у 1896 у в. Зяцькавічы.

ГАЙКОЎ Навум Іванавіч, н. у в. Зяцькавічы.

ГАЎРЫЛЕНКА Мікалай Васілевіч, н. у 1900 у в. Тарахаўка.

ЕЎДАКІМАЎ Пётр Мітрафанавіч, н. у 1893 у в. Высокае.

ЖЛОБА Антон Ільіч, н. у 1892 у в. Высокае.

ЗДАРАВЕНКА Іван Васілевіч, н. у 1896 у в. Кучын.

ІГНАЦЕНКА Дзмітрый Іванавіч, н. у 1894 у в. Лужок.

ІГНАЦЕНКА Фрол Гур'евіч, н. у 1894 у в. Ліцвінавічы.

КАВАЛЁЎ Пётр Міхайлавіч, н. у 1899 у в. Каменка.

КАЛІНОЎСКІ Васіль Фаміч, н. у 1894 у в. Кучын.

КАЛІНОЎСКІ Яфім Фаміч, н. у 1896 у в. Кучын.

КАРАТКЕВІЧ Мадэст Іванавіч, н. у 1899 у г.п. Карма.

КАСЯНКОЎ Сцяпан Аўрамавіч, н. у 1893 у в. Новая Зенькавіна.

КЛІМАЎ Ціхан Рыгоравіч, н. у 1884 у в. Акцяброва.

КОРНЕЎ Уладзімір Ануфрыевіч, н. у 1890 у в. Прудок.

КРАЎЦОЎ Фёдар Ціханавіч, н. у 1896 у в. Аляксандраўка.

КУЗЬМІЦКІ Фёдар Цярэнцьевіч, н. у 1897 у в. Сырская Буда.

КУЛАЖАНКА Андрэй Рыгоравіч, н. у 18(?) у в. Косаль.

КУРБАЦКІ Пракоп Міхайлавіч, н. у 1896 у в. Жабін.

ЛАШКЕВІЧ Міхаіл Андрэевіч, н. у г.п. Карма.

ПАПКОЎ Цімафей Пятровіч, н. у в. Салабута.

ПРАКОПЕНКА Іван Іванавіч, н. у 1898 у г.п. Карма.

РАМАНАЎ Харытон Апанасавіч, н. у 1890 у в. Сырская Буда.

САСНОЎСКІ Іван Сцяпанавіч, н. у 1897 у в. Халапаўка.
СЯРГЕЕНКА Мікіта Пятровіч, н. у 1887 у в. Акцяброва.
ХАРЫТОНЕНКА Давід Ісакавіч, н. у 1887 у в. Лабыроўка.
ХАРЫТОНЕНКА Міхаіл Васілевіч, н. у в. Лабыроўка.
ЦЫКУНЕНКА Павел Марцінавіч, н. у 1892 у в. Прудок.
ШАНЬКОЎ Ігнат Кузьміч, н. у 1895 у в. Каменка.
ШАРШНЁЎ Пётр Паўлавіч, н. у 1891 у в. Каменка.
ШКЛЯРАЎ Карп Захаравіч, н. у 1900 у в. Сырская Буда.
ШМЫГАЛЁЎ Васіль Данілавіч, н. у 1898 у пас. Пакроўскі.

Да новага жыцця

Гаспадарчае будаўніцтва

Адгрымела грамадзянская вайна. Стала наладжвацца мірнае жыццё ў Карме, на тэрыторыі раёна. 17 ліпеня 1924 г. воласць была пераўтворана ў Кармянскі раён. Па даных падатковага папярэдняга спісу (1923), тут налічвалася 28 356 дзесяцін зямлі, 7156 гаспадарак, 40 107 едакоў.

У раёне існавала 16 сельскіх Саветаў і 159 населеных пунктаў. Расла колькасць насельніцтва: у 1926 г. на тэрыторыі раёна ўжо пражывала 68,3 тыс. жыхароў.

У сваёй аснове насельніцтва Кармяншчыны займалася земляробствам. Перадача сялянам памешчыцкай зямлі не дала вялікіх змен у атрыманні хлеба, бульбы, прадуктаў жывёлагадоўлі. Па ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур раён займаў амаль апошняе месца на Гомельшчыне. Вузкапалосіца і цераспалосіца не дазвалялі павышаць аддачу зямлі. Працягвалася далейшае драбленне сялянскіх гаспадарак. Да 1927 г. за кошт абрэзкі заможных гаспадарак, а таксама выкарыстання дзяржаўнай зямлі дадаткова да папярэдніх надзелаў атрымалі зямлю звыш 3000 сялянскіх двароў.

Пленум ЦК КП(б) Беларусі, які прайшоў у лістападзе 1928 г., паставіў задачу сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

Прыйшла калектывізацыя і ў вёскі Кармяншчыны. Было ўсё: і перагібы, і штурмаўшчына. Напрыклад, пры стварэнні калгасаў імя Якаўлева ў в. Новая Зенькавіна і імя Будзённага ў в. Сырск туды ўступілі амаль усе вяскоўцы, але потым разабралі назад сваю маёмасць і разышліся. Засталося толькі па 15—20 сем'яў.

Больш стабільна дзейнічала ўзбуйненая арцель "Гарадок", створаная яшчэ ў 1919 г. па ініцыятыве П. М. Лепяшынскага. Напачатку ў яе ўваходзілі дзве сям'і Блусянковых, па дзве сям'і Газбенка і Шпакавых, а таксама сем'і Піжова, Лавянецкага, Семілетава, М. М. Макаранкі і Н. Жукава. Першым старшынёй арцелі быў М. М. Макаранка, потым — Г. І. Шпакаў. Арганізацыйна арцель ўзмацняецца ўжо да 1922 г.: здае дзяржаве хлеб, прадукты жывёлагадоўлі, атрымліваючы ўзамен сельскагаспадарчую тэхніку, прылады працы. Так, парк машын папоўнілі сеялка і жняярка. Потым з'явіліся дадатковыя сродкі, і ў арцелі пабудавалі паравы млын. У 1922 г. узбуйненая арцель "Гарадок" пераўтворана ў калгас з аднайменнай назвай.

Яшчэ 19 беднякоў в. Новая Зенькавіна арганізавалі арцель "Новае жыццё", дзе наладзілі выпуск цэглы для патрэб сялян. У 1929 г. пачалося масавае ўступленне сялян у калгасы. Да 1933 г. у раёне было створана звыш 100 калгасаў, аб'яднаўшых 75 працэнтаў усіх гаспадарак Кармяншчыны.

У 1929—1930 гг. у Карме ствараецца машынна-трактарная станцыя. Да 1941 г. у раёне з'явіліся Руднянская і Багданавіцкая МТС.

У 1931 г. у калгасе імя Будзённага, ды і ва ўсіх кармянцаў, было сапраўднае свята. Дырэктар Кармянскай МТС Белавусаў ва ўрачыстай абстаноўцы перадаў старшыні калгаса К. М. Антоненку акт на вечнае карыстанне зямлёй і першы трактар "Фардзон" узору 1909 г. Павёў машыну па полі першы трактарыст, жыхар в. Пятравічы Піліп Печкуроў.

Да 1932 г. пасяўная плошча раёна значна павялічылася, прычым большая палова пасяўных плошчаў належала калектыўным гаспадаркам. З іх паступала дзяржаве да 70 працэнтаў таварнага хлеба раёна.

Перабудова і тэхнічнае пераўзбраенне сельскай гаспадаркі зрабілі пераварот у грамадскім жыцці вёскі, стварылі ўмовы для развіцця новай культуры. На Кармяншчыне з'явілася значная праслойка рабочых, занятых на машынна-трактарных станцыях, прадпрыемствах мясцовай прамысловасці, вясковая інтэлігенцыя, занятая ў школах, галіне аховы здароўя, калгасах і саўгасах. З'явіліся літаральна новыя для вёскі спецыялісты: трактарысты, камбайнёры, шафёры, аграномы, заатэхнікі, урачы і многія інш.

У той жа час у выніку індустрыялізацыі адбываецца вялікі адток жыхароў з вёсак у гарады. У выніку насельніцтва Кармянскага раёна зменшылася з 68,3 тыс. чалавек у 1926 г. да 47 486 тыс. у 1939 г. Колькасць працуючых у розных галінах народнай гаспадаркі на 1 кастрычніка 1939 г. складала 1850 чалавек.

У 1931 г. у мястэчку Магілёўскім ільнотрэстам Міністэрства лёгкай прамысловасці быў пабудаваны завод па апрацоўцы льновалакна. Магутнасць прадпрыемства была невялікая — каля трох тыс. тон валакна ў год. Для выпрацоўкі доўгага валакна ўстанаўліваецца агрэгат ЛТ-2. Сыравінай для яго служыла траста мясцовых калектыўных гаспадарак. З пачатку заснавання завода на ім доўгі час працавалі майстры сваёй справы А. С. Суворава, А. М. Бандарэнка.

У 1933 г. быў арганізаваны Кармянскі прамысловы камбінат, куды ўвайшлі электрастанцыя, раённы млын, сталярная майстэрня, піларама, станкі па вырабе драўлянага матэрыялу для пакрыцця дахаў.

Буйным прадпрыемствам становіцца Кармянскі спіртзавод. За суткі ён выпускаў 120 дэкалітраў спірту-сырцу. Акрамя спіртавога цэха тут дзейнічалі млын і крупарушка. Сыравінай служылі ў асноўным бульба, зерне, цукровыя буракі. У якасці паліва выкарыстоўваліся торф і драўніна.

У 1933 г. даў першую прадукцыю Ворнаўскі торфазавод. У 1938 г. у Карме пачынае працаваць швейны калектыў "Вышывальная арцель" (у будучым — фабрыка імя Клары Цэткін). Асноўным відам вырабаў былі карункі, якімі здаўна славіліся майстрыцы Кармяншчыны, а таксама вышывальныя купоны. Да вайны пачалі асвойваць выраб абрусаў, на якія быў значны попыт.

Прамысловасць будаўнічых матэрыялаў прадстаўлялася крэйдавым заводам у в. Студзянец, цагельнымі — у Матораўцы, Новай Зенькавіне. У Карме дзейнічаў цагельны завод, сыравінай якому служыла цэгла са знакамітага ліцвінавіцкага месцанараджэння.

На 1 красавіка 1940 г. у раёне дзейнічалі 5 цагельных прадпрыемстваў, 11 — дрэваапрацоўчых, 2 прадпрыемствы швейнай прамысловасці, 2 — абутковай, мукамольныя прадпрыемствы абслугоўвалі 151, дробныя кавальні — 121 чалавек. У сельскай гаспадарцы на гэты час 106 калгасаў аб'ядноўвалі 91 працэнт усіх вясковых падвор'яў і 98,6 працэнта пасяўных плошчаў. Машынна-трактарныя станцыі абслугоўвалі 272 работнікі. Рос і матэрыяльны дабрабыт калгаснікаў, рабочых саўгасаў. У 1940 г. калгаснікі ў сярэднім атрымалі на працадзень зерневых 1,5—2 кілаграмы, бульбы — 8—10 кілаграмаў, грошай — 2—3 рублі.

У 1939—1940 гг. у раёне меліся 2 бальніцы на 88 ложкаў, 2 раддамы, 5 амбулаторый, акушэрскі і 7 фельчарскіх пунктаў. Гэтыя ўстановы абслугоўвалі 6 урачоў, 3 зубныя ўрачы, 15 фельчараў, 14

Кармянская центральная районная библиотека

акушэрак, 15 медсясцёр. У Карме быў створаны радыёвузел, які абслугоўваў 286 радыёкропак у пасёлку і 145 — на сяле.

Народная асвета

Адразу пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на Кармяншчыне пачалася рэарганізацыя школьнай сеткі. Першай у Беларусі ў 1918 г. была створана школа-камуна, арганізатарам якой быў П. М. Лепяшынскі. У ёй навучалася 40 дзяцей з Ліцвінавіч і навакольных вёсак.

Крыху пазней, у пачатку 1920-ых гг., такая школа адкрылася на левым беразе Сажа ў былым маёнтку князя Васілеўскага непадалёк ад Чэрыкаўскага павета. Кіраваў калектывам Мадэст Мікалаевіч Лепяшынскі, відны дзеяч народнай асветы ў першыя гады савецкай улады. Пасля яго трагічнай смерці педкалектыў узначаліў брат Пётр Мікалаевіч Лепяшынскі. Потым ён доўгі час працаваў дырэктарам Ліцвінавіцкай сярэдняй школы.

Пры партыйнай арганізацыі Кармяншчыны, у якую ўваходзілі Кармянская, Бычанская і Расохская валасці, была створана спецыяльная камісія па ліквідацыі непісьменнасці.

У 1920 г. аддзел народнай асветы на Кармяншчыне ўзначальваў Фядот Мікалаевіч Казакоў, які потым працаваў дырэктарам Магілёўскага педагагічнага інстытута, з'яўляўся сакратаром Гомельскага абласнога камітэта КПБ, затым намеснікам міністра асветы Беларускай ССР.

Сярод тых, хто нёс веды ў масы ў той час, вызначаліся педагогі А. А. Усава, А. А. Яўнайс, М. Г. Думс-Савініч, П. А. Паліцын, П. П. Караткевіч, В. І. Цыбікаў і іншыя. Вядома, многія настаўнікі мелі двухгадовыя ці аднагадовыя курсы, а некаторыя скончылі толькі трохмесячныя ў Карме. У гэтай справе галоўным быў энтузіязм людзей, іх прага ведаў да новага.

У 1920-ых гг. на Кармяншчыне былі пабудаваны школьныя памяшканні ў вёсках Вашчанкі, Вынашаўка, Лазовіца, Багданавічы, Дубавіца. Яны былі тыпавыя трох- і чатырохкамплектныя для пачатковых школ. Замест існаваўшых раней царкоўнапрыходскіх, земскіх, народных, школ граматы стваралася адзіная працоўная школа першай і другой ступеняў. На тэрыторыі Кармяншчыны было толькі дзве школы другой ступені — у Карме і в. Быч. У асноўным сетка вясковых школ была першай ступені. Слабай з'яўлялася і матэрыяльная база.

У адпаведнасці з пастановай ЦК і Савета Народных Камісараў БССР ад 7 красавіка 1926 г. уводзіцца абавязковае навучанне дзяцей ва ўзросце ад 8 да 11 гадоў. Кіраваў у гэты час аддзелам народнай асветы ў раёне Ф. М. Казакоў, пасля яго — Н. К. Любецкі. Абодва яны карысталіся вялікім аўтарытэтам сярод настаўнікаў, шмат увагі ўдзялялі ліквідацыі неадукаванасці і непісьменнасці.

На тэрыторыі раёна дзейнічалі чатыры сямігадовыя школы: Кармянская — загадчык Н. К. Любецкі, Бычанская — загадчык К. Т. Пісарэнка, Навасёлкаўская — загадчык Варабей, Журавіцкая (у той час гэты населены пункт падпарадкоўваўся Карме) — загадчык Т. Б. Здановіч. Узорнымі лічыліся Кармянская і Журавіцкая школы.

У пачатку 1931/32 навучальнага года былі адкрыты пятыя класы яшчэ ў чатырох школах раёна: Кароцькаўскай — загадчык П. П. Караткевіч, Струменскай — загадчык Здор і іншых. У 5—7-ых класах гэтых школ навучалася каля 500 вучняў. Настаўнікаў з вышэйшай адукацыяй было



Р. В. Цыкуненка

толькі двое — выкладчык біялогіі Кармянскай школы Іван Міхайлавіч Таропчанка і загадчык Навасёлкаўскай школы Варабей.

У асноўным дзяцей навучалі маладыя выпускнікі розных педагагічных курсаў — Т. В. Конанаў, І. А. Міхаленка, Ф. І. Швідэнкоў, С. А. Паплаўскі, Е. В. Паліцына і іншыя.

Сярод настаўнікаў раёна заслужанай павагай і аўтарытэтам карыстаўся выкладчык матэматыкі Кармянскай школы Аляксандр Андрэевіч Яўнайс, які меў вялікі педагагічны вопыт.

Першая сярэдняя школа ў раёне была адкрыта 1 верасня 1935 г. Цікава, што выпускнікоў сямігодак, жадаючых працягваць вучобу далей, у восьмым класе было звыш 200 чалавек на 35 месц новай дзесяцігодкі. Але з-за сціплай матэрыяльнай базы (не было інвентару, адпаведнага памяшкання) усіх задаволіць не было магчымасці.

Добрым стымулам у справе павышэння педагагічнай адукацыі паслужыла пастанова ўрада краіны ад 10 красавіка 1936 г. “Аб персанальных званнях для настаўнікаў пачатковых і сярэдніх школ”.

У Кармянскім раёне па прадстаўленні аддзела народнай асветы, якім загадваў у той час Арон Львовіч Кагановіч, была зацверджана камісія па атэстацыі настаўнікаў. У яе склад увайшлі дырэктар Кармянскай сярэдняй школы М. Якушэнка, дырэктар Хляўнянскай сямігадовай школы В. В. Шкарубскі, загадчык Маленікаўскай пачатковай школы Сергеенка. На працягу 1936/37 навучальнага года былі атэставаны пасля праверкі ўрокаў, арганізатарскай і выхаваўчай работы ўсе педагогі раёна. Персанальнае званне на выкладанне ад першага да дзесятага класа атрымалі нямногія: сказвалася адсутнасць педагагічнай адукацыі, невялікі асабісты вопыт. Некалькі больш аказалася атэставаных на выкладанне ў 5—7-ых класах. Асноўная частка настаўнікаў мела права на выкладанне ў пачатковай школе. Большасць, вядома, атрымала прадпісанне абавязковага навучання па завочнай сістэме, інакш яны маглі пазбавіцца права наогул выкладаць у школе.

Настаўніку Косальскай пачатковай школы Рыгору Васілевічу Цыкуненку было прысвоена званне “Заслужаны настаўнік БССР”.

Другая сярэдняя школа ў Карме была адкрыта ў 1938 г. у выніку рэарганізацыі яўрэйскай сямігадовай школы, аддзеленай у свой час ад сярэдняй школы № 1.

На 1 кастрычніка 1939 г. у Кармянскім раёне меліся 46 пачатковых школ (111 настаўнікаў), 18 НСШ (158 настаўнікаў) і 5 сярэдніх школ (78 настаўнікаў). У іх навучаліся 10 240 дзяцей. Функцыяніравалі 3 дзіцячыя садкі, 20 клубаў, 16 хат-чытальняў, 2 калгасныя клубы і 1 прафсаюзны, 18 бібліятэк, кніжны фонд якіх складаў 9119 экземпляраў. Кармяншчына ўжо не была глухім кутком, жыла паўнацэнным жыццём і ішла ў нагу са ўсёй краінай.

М. Якушэнка,
М. І. Шчарбачэня

Мара аб зямлі

З успамінаў Ф. С. Хрыпунова, былога старшыні Хізаўскага сельскага Савета

Памятаю, як чакалі мы новага жыцця, звязанага з прыходам савецкай улады. У папоўскім доме стаў працаваць Хізаўскі Савет, затым сямігадовая школа, а Савет перавялі ў хату раскулачанага Сямёна Андрэйчыкава. На тэрыторыі Савета былі тры вёскі — Хізаў, Бераставец, Тарахаўка. У гады калектывізацыі ў іх былі арганізаваны калгасы “Новы свет”, “Зара Беларусі”, “Камінтэрн”. На хутарах паміж Хізавам і Берастаўцом арганізавалі калгас “Чырвоны хлебароб”, а ў 1939—1940 гг. пры ліквідацыі хутароў гэтая гаспадарка ўлілася ў вышэйназваныя калгасы.

У 1931 г. у Багданавічах арганізоўваецца машынна-трактарная станцыя для аказання дапамогі калгасам у апрацоўцы зямлі. Гэта вельмі узрадавала сялян: мара аб трактарах,

жнярках, сеялках была, бадай, самай запаветнай пасля мары аб уласнай зямлі.

У 1930 г. у Хізаве пражывала амаль 140 сем'яў. Актыўна выступалі за развіццё новых гаспадарак брыгадзіры калгаса "Новы свет" Віктар Васільевіч Велікоўскі, Ягор Цімафеевіч Мацвейчыкаў, дырэктар МТС Кавалёў, парторг Палякшанаў, брыгадзір трактарнай брыгады МТС Сямён Маеўскі.

За новае жыццё

З успамінаў С. А. Касянкова, жыхара в. Новая Зенькавіна

У 1922 г. у Новай Зенькавіне была арганізавана арцель па выпуску цэглы. Дзейнічала чатыры печы па абпальванні цэглы, горн. Мелі мы таксама два кані і дзве каляскі. Гаспадарам участкаў, дзе бралі гліну, плацілі натурай па 100 цаглін за сезон. Усяго ж за гэты час для патрэб мясцовых жыхароў вырабілі да 70 тыс. штук цаглін. Працавала арцель да 1929 г., даючы тым самым магчымасць адным прыработку, другім — будаўнічы матэрыял.

У арцелі працавалі Данііл Аўрамавіч Касянкоў, яшчэ тры браты Касянковы — Уладзімір, Данііл і Віктар, Раман Ягоравіч Прытычанка і яго брат Павел, Андрэй Раманавіч Прытычанка, браты Аляксандр і Фёдар Самастроенкі, я і іншыя вяскоўцы.

У кастрычніку 1929 г. на агульным сходзе жыхароў вёскі (у ім прыняў удзел прадстаўнік раёна) вырашылі арганізаваць сельскагаспадарчую арцель і назваць яе ў гонар тагачаснага міністра Якаўлева. Напачатку ў калектыве налічвалася 24 гаспадаркі, але ўжо вясной наступнага года ён вырас яшчэ на 70 падвор'яў. Мяне абралі першым старшынёй арцелі.

У 1931 г. у вёсцы не было ніводнага аднаасобніка. Старшынёй новага калгаса стаў Пётр Мацвеевіч Прытычанка. Я ж зноў узначаліў Нова-Зенькаўскі Савет. Затым даводзілася працаваць старшынёй Струменскага, Кароцькаўскага, Куракаўскага Саветаў, дырэктарам па нарыхтоўцы Кармянскага спажыўтаварыства.

Вучыліся і вучылі

З успамінаў былога дырэктара Кармянскай сярэдняй школы М. Якушэнкі

У красавіку 1932 г. у ліку іншых студэнтаў я быў датэрмінова выпушчаны з Магілёўскага педагагічнага інстытута і накіраваны ў Кармянскі раён. Менавіта нам выпала задача ажыццяўляць пераход да абавязковага сямігадовага навучання.

Мяне прызначылі загадчыкам аддзела народнай асветы. Трэба было зрабіць многае, каб нашы школы набылі той воблік, які прапаноўваўся ўладай, жыццём. Намячалася ў 1932/33 навучальным годзе адкрыць 11 сямігадовых школ. Слабая матэрыяльная база, адсутнасць кадраў, а яшчэ і невялікая ўвага да праблем школы з боку кіраўніцтва раёна, якое лічыла асвету і культуру ў гады калектывізацыі і індустрыялізацыі другапланавай задачай, — усё гэта ўскладняла нашы праблемы.

Перш за ўсё мы накіравалі 30 настаўнікаў на трохмесячныя педагагічныя курсы. Пры аддзеле народнай асветы на месцы адкрылі шасцімесячныя курсы, якімі загадваў настаўнік геаграфіі Кармянскай узорнай школы Ф. А. Кажамякін. Выкладанне вялі студэнты Віцебскага педагагічнага інстытута муж і жонка Холад. Гэта дало магчымасць папоўніць кваліфікаванымі кадрамі 5—7-ыя класы школ.

Пры першай сярэдняй школе, адкрытай у мястэчку ў 1935 г., была арганізавана школа для дарослых (зараз школа рабочай моладзі). Доўгі час мне давялося кіраваць гэтай установай па сумяшчальніцтве з дырэктарствам у сярэдняй школе. У далейшым педагагічны калектыў тут узначальвалі С. А. Таксман, А. М. Сазаноўская. У пасляваенны час

ёю доўга кіраваў Р. І. Сянько, вопытны выкладчык і выхавацель. Да вайны сярэдняя школа № 1 зрабіла чатыры выпускі, дала краіне ў далейшым не толькі выдатных спецыялістаў, але і яе мужных абаронцаў, герояў Вялікай Айчыннай вайны.

1938 г. стаў для першай сярэдняй школы асабліва памятным: мы атрымалі новае тыпавое памяшканне.

Дырэктарам першай школы мне пашчасціла працаваць з 1935 да 1955 г., затым загадваў навучальнай часткай, выкладаў да 1963 г.

За газетным радком…

Па матэрыялах газеты “Чырвоная змена”, якая праводзіла агляд працы Задубскай камсамольскай ячэйкі*

1926 г.

Дзед Задуб’я не пазнаў бы

Бюро прапанавала ўсім камсамольцам прачытаць, хто колькі зможа, навейшую літаратуру па сельскай гаспадарцы, што “заваляласяˮ ў камсамольска-сельсавецкай бібліятэчцы. А праз тыдзень, вясной 1925 г. на агульным сходзе Кузьма Купрэеў, вопытнік пасёлка Ільіч, “аграном-самародак”, як завуць яго сяляне, робіць даклад на тэму “Тое, што павінен зрабіць кожны камсамолец у сваёй гаспадарцы”.

Нягледзячы на іранічныя супярэчнасці часткі старэйшых камсамольцаў, ячэйка прыняла пастанову, якая зрабіла цэлую рэвалюцыю ў жыцці задубцаў. Змест яе кароткі:

“Камсамольцы ў абавязковым парадку павінны сеяць насеннем, ачышчаным на сартыровачнай машыне або на добрай варсе. Прапануецца сваё дрэннае насенне абмяняць у саўгасе на гатунковае, аб чым бюро дагаворыцца з загадчыкам саўгаса. Караняплоды, канюшына, лён — расліны, якіх у нашай вёсцы няма. Давайце заводзіць іх у сваіх гаспадарках”.

Прыйшла восень — праверка выканання, падвядзенне вынікаў. Купрэеў Міхаль, бацька сакратара ячэйкі, ніколі не сеяў канюшыны. Ён і яшчэ 7 гаспадароў купілі ў Карме па тры фунты канюшыны, прачыталі там, як і дзе яе лепш сеяць. У адзін ціхі дзень мужчыны хадзілі па пасеве ячменю, бралі з кацялкоў у тры пальцы зярняткі-макавінкі і няўпэўнена кідалі іх у раллю. Налета Міхаль накасіў 100 пудоў канюшыны, а з маленькага кавалачка, пакінутага на насенне, намалаціў тры пуды яго, якое, пакінуўшы сабе патрэбную вагу пасеву, прадаў і атрымаў 42 рублі.

Гэтак жа зрабілі ў Задубскім сельсавеце 8 “акамсамоленых” гаспадарак: дзве Купрэевых, Кільчэўскія, Міхальковы і іншыя. Першы блін не выйшаў комам.

Ячэйка стала практыкаваць пастаноўку дакладаў аб паляпшэнні камсамольцамі гаспадарак перад кожным сезонам… У выніку — землеўпарадкаванне ў дзвюх вёсках, пераход на шматполле ў пасёлках, у 10 гаспадарках — вырошчванне канюшыны і караняплодаў, 12 гаспадарак уцяплілі хлявы, зрабілі дацкія кармушкі.

---

* У конкурсе сярод вясковых ячэек задубскія камсамольцы атрымалі першую прэмію. Камсамольская ячэйка была арганізавана летам 1923 г. Першымі камсамольцамі сталі Нічыпар Купрэеў, Кузьма Філіпенка, Леанід Грэчкаедаў. Сваім сакратаром маладыя абралі Піліпа Штапенку, тэхнічным сакратаром — Цімафея Кільчэўскага. У склад ячэйкі ўваходзіла найбольш актыўная моладзь вёсак Пятравічы, Задуб’е, Лубянка, у тым ліку — Кузьма Купрэеў, Марфа Купрэева, Фрося Баброва, Пелагея Купрэева і іншыя.

Кормянская центральная районная библиотека

Атака сялян на ячэйку

Сем камсамольскіх гаспадарак пасеялі кармавыя буракі. З маленькіх кавалачкаў накапалі пудоў па 60. Прыйшла вясна. Скупа стала на харч. Камсамольцы-"караняплодзіны" дасталі з капцоў буракі, іх каровы, кормячыся караняплодамі, пачалі прыбаўляць малако. Тут задубцы сабраліся ў ячэйку, склалі спіс на патрэбу ў насенні і паслалі двух камсамольцаў у Магілёў за пакупкамі. Прывезенае насенне падзялілі ў той жа дзень. Прачулі суседзі і цэлымі дзесяткамі прыходзілі ў ячэйку. Але задаволіць жаданні сялян не ўдалося: у Карме караняплодаў не было, а пасляць спецыяльна чалавека ў Магілёў не выпала.

Свой кааператыў

У вясну 1926 г. па ініцыятыве райкома партыі ячэйка правяла двухтыднёвік кааперацыі. Праводзіліся сходы сялян, растлумачваючы карысць, якую дае ўзмацненне кааперацыі. Сяляне больш ахвотна ўступалі ў пайшчыкі спажывецкага таварыства. Усяго ў двухтыднёвік завербавалі 58 пайшчыкаў, ды ранейшых было 100. Пакуль яшчэ да стварэння свайго Задубскага спажывецкага таварыства не хапае 30 пайшчыкаў. Іх ячэйка думае навербаваць восенню, пасля зняцця ўраджаю, таксама шляхам правядзення двухтыднёвіка.

Непасрэдна пайшчыкаў-камсамольцаў 11 чалавек. Амаль усе камсамольцы ўцягнулі ў кааперацыю сваіх бацькоў.

Камсамолкі — найлепшыя работніцы

Першыя гады свайго існавання ячэйка складалася толькі з адных хлапцоў. У пачатку 1925 г. пад уплывам братоў-камсамольцаў у ячэйку ўступілі тры дзяўчыны. Напачатку яны саромеліся, бо старыя бабы пальцамі тыкалі:

— Камсамольцы ткаць і шыць не навучаць!

Дзяўчаты заняты працаю і ўлетку і зімою. Вольнага часу, каб праводзіць з імі чыткі ці заняткі, амаль зусім няма. Парашылі вячоркі, часы, калі дзяўчаты збіраюцца ў адну хату прасці кудзелю, скарыстаць для росту ячэйкі за лік маладых сялянак. Даручылі гэту справу сакратару ячэйкі Нічыпару Купрэеву.

І амаль кожны вечар, калі камсамолкі, а разам з імі і беспартыйныя дзяўчаткі збяруцца з кастрыцай кудзелі выкручваць роўненькую пражу, Нічыпар, узброены кніжкамі, газетамі і часопісамі, прыходзіць да іх. Спачатку па Яраслаўскаму пазаймаюцца, а потым давай чытаць гумарыстычныя апавяданні і фельетоны з "Чырвонай змены" або "Комсомольской правды". І такія чыткі асабліва ажыўлялі вячоркі і зацікаўлівалі дзяўчат, калі матэрыял браўся бытавога характару: адносіны хлапца да дзяўчыны, аліменты і інш.

Пасля гэтага дзяўчаты пачалі актыўна працаваць у драматычным гуртку, а ячэйка пачала склікаць сходы жанчын і дзяўчат.

Зараз у ячэйцы 7 дзяўчын. У гэтым годзе яны старанна прайшлі вячэрнюю школу.

Баявая задача ячэйкі — арганізаваць гурток кройкі і шыцця.

Будзем гатовы абараняць краіну

На парадку дня пытанне аб узмацненні абароны пралетарскай рэспублікі. Пачалі ваенізацыю ячэйкі і насельніцтва Задубскага сельсавета з узмацненнем падпіскі на газету "Чырвонаармейская праўда ў вёсцы". Была сабрана падпіска на 38 экземляраў. Наладзілі вечар провадаў у Чырвоную Армію хлапцоў нараджэння 1904 года. Камсамольцы-чырвонаармейцы Кузьма Філіпенка і Павел Садоўнікаў трымаюць з ячэйкай самую цесную сувязь.

На падшэфны лінкор "Парыжская камуна" выслалі падарункі і папку з матэрыялам аб магілёўскім конкурсе на лепшую вясковую ячэйку.

Зараз праводзім тыдзень абароны. Арганізавалі ячэйку Асаавіяхіма, у якую ўжо ўступіла 14 камсамольцаў.

Намецілі 17 ліпеня правесці конкурсную стральбу шрацінкамі.

Зм. Паваротны,
Ніч. Купрэеў

Выхаванне камсамольцаў і беспартыйнай моладзі

У 1926 г. у ячэйцы існаваў гурток палітадукацыі. Кіраваў заняткамі камсамолец-добраволец Чырвонай Арміі Яўхім Купрэеў. Ён цікавіцца пытаннямі бягучай палітыкі, шмат чытае. Ідзе, напрыклад, пытанне аб тым, якое мае права селянін у нашым краі на зямлю, якую нясе ён за яе адказнасць, — Купрэеў Яўхім падмацоўвае гэта становішча мясцовымі фактамі.

На ўсіх занятках гуртка вельмі шмат прысутнічала беспартыйнай моладзі. А к вясне выявілася патрэба ў арганізацыі з ёю асобных заняткаў. Ячэйка гэта зрабіла: праводзіла з імі чыткі журналаў, газет, гутаркі. Тэмы гутарак: як падняць сваю гаспадарку, аб кааперацыі, аб рэвалюцыі 1905 г., аб быце. А пасля заняткаў з'явіцца балалайка са скрыпкай, і моладзь пачынае весяліцца.

У Задуб'і пачала працаваць школа малапісьменных. Вечарамі займаліся ў школе камсамольцы, беспартыйная моладзь, пажылыя малапісьменныя сяляне. Пасля зачынення школы бюро ячэйкі абгаварыла пытанне далейшага працягу палітычнага выхавання моладзі ў летні час і парашыла ўтварыць гурток бягучай палітыкі. Стараемся выбіраць такія дні, калі камсамольцы вольныя ад працы.

Зм. Паваротны

Без газет працаваць нельга!

Ячэйка пераканалася, што без газет "Чырвоная змена", "Комсомольская правда" нельга паставіць работу на належную вышыню. Ячэйка без газеты — ўсё роўна як майстра без рук.

На ліпень месяц выпісалі 1 экземпляр "Комсомольской правды", 3 экземпляры "Чырвонай змены", 2 экземпляры "ЖКМ", часопісы "Плуг", "Сам сабе аграном", 3 экземпляры "Магілёўскага селяніна", "На стражы" і часопіс "Маладняк".

Цяпер праводзім пяцітыднёвік "Чырвонай змены". Зрабілі даклад на агульным сходзе ячэйкі, выбралі спецыяльнага ўпаўнаважанага па распаўсюджванні "Чырвонай змены".

Камсамольцы ходзяць па хатах, тлумачаць сялянам, якая для іх газета больш цікавая, і тут жа прымаюць падпіску.

Ніч. Купрэеў

Вечарынкі, гульбішчы

Вярсты за дзве ад Задуб'я ёсць надзвычай прыгожае месца — Стараград. Прыходзяць сюды і камсамольцы каратаць вольныя хвіліны. Недахопам ячэйкі з'яўляецца тое, што яна не пастаралася выкарыстаць Стараграддзе для культурна-масавай работы, не наладзіла тут ні масавых гульняў, не правяла для сялянскай моладзі выступленняў.

У сябе ў Задуб'і камсамольцы арганізавалі паказ на невялічкай сцэне, устаўленай жывымі галіцамі, герояў з п'есы М. Чарота "Сон на балоце". Дрэнна было толькі тое, што не ўсе добра ведалі словы, і п'еса ішла слаба. Разабралі няўдачы культурна-масавай работы на бюро ячэйкі.

Па старонках раённай газеты "Калгаснік Кармяншчыны"

1936 г.

Выканалі план лесанарыхтовак

Разгортваючы стаханаўскія метады работы на лесанарыхтоўках і лесавывазцы, калгас імя Куйбышава Хляўнянскага сельсавета 21 лютага выканаў свой план па лесавывазцы на 102,5%. Вывезена 1220 м^2 лесу замест планавых 1190 м^2. Працягваем нарыхтоўку і вывазку лесаматэрыялаў звыш плана.

Кормянская центральная районная библиотека

Старшыня Савета *Ігнаценка*; старшыня калгаса *Паплаўскі*, начальнік лесаўчастка Кандыдатаў.

Стаханаўская пяцідзёнка

З 11 па 16 лютага ў калгасе імя Якаўлева Куракаўскага сельсавета была арганізавана стаханаўская пяцідзёнка. Сярод калгаснікаў і паміж брыгадамі было разгорнута сацспаборніцтва за колькаснае і якаснае выкананне сваіх заданняў. Самастроенка Захар выклікаў на спаборніцтва Самастроенку Фёдара па вывазцы гною не менш як на 150% сваёй нормы. Мятлікаў Янка ўзяў на сябе абавязацельства выканаць норму на 200%. Калгасніцы Бабкова Вася і Талкачова Мар'я падрадзіліся перавыканаць нормы на 150% і г.д.

Як вынік, у ходзе пяцідзёнкі спаборнічаючыя паміж сабой калгаснікі перавыканалі нормы. Па ўсім калгасе: вывазка гною — 113%, утрамбоўка — 231, возка дроў — 200, возка сена — 200, збор попелу — 231, ачыстка насення — 180%.

Асабліва многа ў правядзенні стаханаўскай пяцідзёнкі дапамагла калгасная насценгазета, у якой штодзённа паказваліся лепшыя і адстаючыя. Кожны калгаснік праз газету ведаў, колькі ён выпрацаваў працадзён, на колькі выканаў норму.

Паміж брыгадзірамі Д. Касянковым, А. Самастроенкам і П. Талкачовым заключаны сацдагавор на найлепшую падрыхтоўку да веснавых работ з такім разлікам, каб даць з ураджаю 1936 года 250 ц бульбы, 14 — пшаніцы, 15 — ячменю, 17 — аўса, 15 ц ільнасемя.

Старшыня ў хвасце

Вылучаная брыгада на лесавывазках у калгасе "Чырвоны куршан" Руднянскага сельсавета ў стаханаўскую пяцідзёнку працавала зусім дрэнна. А тлумачыцца гэта вось чым.

Старшыня калгаса Максім Міроненка не ўзначаліў стаханаўскі рух. Калі яго запытаць, на колькі працэнтаў калгасам выкананы нормы, хто ездзіў у лес, колькі яны зрабілі, ён вам не адкажа, бо не ведае. Ён вельмі мала турбуецца пра своечасовае выкананне плана лесавывазак.

Парушаюць сталінскі статут

Выкананне сталінскага статута калгаснага жыцця з'яўляецца свяшчэнным абавязкам для кіраўніцтва калгаса і кожнага калгасніка.

Аднак кіраўнікі калгаса імя Калініна Барсукоўскага сельсавета яўна парушаюць сталінскі статут сельгасарцелі. У гэтым калгасе яшчэ і зараз ёсць асобныя калгаснікі, якія маюць звыш устаноўленай колькасці прысядзібныя ўчасткі. Вось калгаснікі Сафон Кеўлеў, Іван Цераха́ў, Даніла Сомаў і іншыя прысядзібныя ўчасткі маюць у 56—57 сотак, у той час калі калгаснікі Кузьма Афанасенка, Ягор Аўласенка і іншыя не маюць і 25 сотак прысядзібнага ўчастка. Так што ў гэтай частцы яўна парушаны статут сельгасарцелі.

1937 г.
27 кастрычніка

На раённым злёце стаханаўцаў

Днямі адбыўся злёт стаханаўцаў прадпрыемстваў і калгасаў раёна. На злёце прысутнічала звыш трохсот чалавек.

Стаханавец — трактарыст трактарнай брыгады № 7 Лазарэнка ў сваім выступленні адзначыў, што трактарысты гэтай брыгады з радасцю і вялікім творчым уздымам адгукнуліся на заклік ініцыятараў стаханаўскага руху ў Беларусі. Паміж трактарыстамі шырока разгарнулася прадкастрычніцкае спаборніцтва. Яны ўсе гараць адзіным жаданнем — сустрэць 20-ую гадавіну Вялікага Кастрычніка з бліскучымі паказчыкамі работы.

«На аснове сацыялістычнага спаборніцтва я са сваёй напарніцай Пашай Балахонавай, — гаворыць т. Лазарэнка, — выпрацаваў на трактары "ХТЗ" 1015 гектараў... Мы змаглі б выпрацаваць да гэтага часу значна больш, але ж у нас у рабоце з-за адсутнасці гаручага былі час-

тыя перабоі. Сваё абавязацельства выпрацаваць на кожны трактар брыгады 1300 га да 20-ай гадавіны Кастрычніка мы выканаем», — заявіў у заключэнне т. Лазарэнка.

«Работаючы на палявых работах, — гаворыць стаханавец калгаса "Свабода" Уласаў Пётр, — я дабіўся даволі добрых узораў у рабоце. Па распашцы бульбы я замест нормы 1 га распахваў за дзень 2 га, на ворыве пад зяб я замест нормы 0,50 га выпрацоўваў 0,75 га. Коні, на якіх я працую, знаходзяцца ў добрым становішчы». Затым т. Уласаў гаворыць аб шчаслівым і заможным калгасным жыцці. Багаты працадзень калгаснікаў у гэтым годзе. Калгаснікі атрымалі ўжо па 12 кг бульбы на працадзень і больш за 1 кг збожжа. Але гэта яшчэ не ўсё.

Машыніст-стаханавец МТС Рыжанкоў расказвае аб сваіх вытворчых поспехах. Рыжанкоў, уключыўшыся ў прадкастрычніцкае спаборніцтва, узяў на сябе абавязацельства да 20-ай гадавіны Кастрычніка вымалаціць на сваёй складанай малатарні 900 тон збожжа. Зараз ён вымалаціў ужо 700 тон пры норме 400 тон. Гэтых поспехаў Рыжанкоў дабіўся дзякуючы правільнаму ўходу за сваёй машынай. За два сезоны работы ў яго не было ніводнага выпадку аварый.

На злёце многа гаварылася аб тым, што паасобныя кіраўнікі калгасаў, сельсаветаў і райза яшчэ не ўзначалілі працоўны энтузіязм калгаснікаў, не змагаюцца за далейшае развіццё стаханаўскага руху. Марудна ліквідуюць вынікі шкодніцтва ў сельскай гаспадарцы. У некаторых калгасах яшчэ не ліквідавана абязлічка і не ўведзена індывідуальная здзельшчына.

Злёт стаханаўцаў звярнуўся з пісьмом да ўсіх працоўных раёна, у якім заклікае іх рыхтаваць дастойную сустрэчу 20-ай гадавіне Кастрычніка і рыхтавацца да выбараў у Вярхоўны Савет СССР.

І. Г. Каў

Па старонках раённай газеты "Авангард"

1937 г.
14 студзеня

Нам. старшыні СНК наведаў Карму

11 студзеня к поўдню ў Карму прыехаў намеснік старшыні СНК БССР т. Любовіч. Перад тым як у 5 гадзін вечара выступіць на сходзе раённага актыву перад усімі членамі і кандыдатамі ВКП(б), ён наведаў новапабудаваны універмаг.

І вось сход. Як толькі ў прэзідыуме яго з'явіўся т. Любовіч, у зале раздаліся бурныя, доўга не змаўкаючыя апладысменты. Т. Любовіч у дакладзе падрабязна расказаў аб тых падзеях, якія адбываюцца зараз у Іспаніі і Кітаі, аб подлых фашысцкіх піратах, якія сваімі правакацыямі ўскладняюць міжнароднае становішча. Потым каля трох гадзін высокі госць гутарыў з прысутнымі, якія расказалі яму аб поспехах і недахопах.

Пасля прыёму т. Любовіч наведаў ільнозавод і іншыя прадпрыемствы Кармяншчыны.

27 лютага

Раскрадальнікі калгаснага дабра пакараны

Аднаасобнік Піліп Якутовіч і палявы вартаўнік калгаса імя Дзімітрава Ворнаўскага сельсавета Антон Караткевіч па змове паміж сабою ўкралі ва ўрочышчы "Лаўск" 440 снапоў калгаснага жыта, але былі выкрыты. Нядаўна адбыўся суд. Ён прыгаварыў Якутовіча і Караткевіча да пазбаўлення волі ў папраўча-працоўных лагерах у аддаленых вёсках СССР тэрмінам на 5 гадоў без права аднаўлення ў правах.

1939 г.
18 лістапада

Вялікі сын народа

Члены сельгасарцелі "Новы мір" Руднянскага сельсавета і калектыў настаўнікаў кандыдатам у дэпутаты раённага Савета вылучылі Рыгора Васільевіча Цыкуненку.

Хто не ведае ў раёне Рыгора Васільевіча, хто з працоўных раёна некалькі разоў з павагай не паўтараў яго імя?

Кормянская центральная районная библиотека

Сёння спаўняецца 30 год з таго дня, як Рыгор Васільевіч прысвяціў сябе справе вялікага народа. За гэтыя гады ім выхавана сотні людзей Кармянскага раёна, якія зараз сталі інжынерамі, урачамі, аграномамі, настаўнікамі і слаўнымі камандзірамі доблеснай Чырвонай Арміі. Гэтыя выхаванцы зараз дастойны вялікага гонару. Яны працуюць ва ўсіх кутках нашага неабсяжнага Саюза.

Каму гэтыя людзі больш за ўсё ў сваім жыцці ўдзячны?

Безумоўна, Рыгору Васільевічу. Ён ім, вясковым хлапчукам і дзяўчатам, першы адкрыў вочы на жыццё. Першы сказаў, што такое жыццё і як трэба за яго змагацца.

Партыя і ўрад работу Рыгора Васільевіча Цыкуненкі дастойна ацанілі. Рыгору Васільевічу прысвоена званне народнага настаўніка, і ўзнагародзілі яго вышэйшай узнагародай — ордэнам Леніна.

Можна спадзявацца, што Рыгор Васільевіч Цыкуненка вялікі давер, які ўскладваюць на яго выбаршчыкі Лабыроўскай выбарчай акругі, з гонарам апраўдае.

1941 г.
1 мая

Поспехі ў народнай асвеце

Дзякуючы клопатам партыі і ўрада культурная рэвалюцыя непазнавальна змяніла аблічча раёна. Калі ў 1926 г. было ўсяго толькі 12 пачатковых і 1 няпоўная сярэдняя школы, то ў 1941 г. маем 47 пачатковых, 16 няпоўных сярэдніх і 7 сярэдніх школ. У гэтых школах навучаецца 10 тысяч чалавек.

Партыя і ўрад штогод асігнуюць вялікія сумы на народную асвету.

Выраслі і новыя выдатныя кадры педагогаў. Настаўніцкі калектыў раёна ганарыцца такімі вопытнымі і знакамітымі педагогамі, як ардэнаносцы Цыкуненка і Дзмітрыеў, настаўнікі Кажамякін, Яўнайс, Тужыкаў, Агееў і шэраг іншых.

Гэтыя настаўнікі за час сваёй работы выхавалі сотні юнакоў і дзяўчат. Толькі адна Кармянская беларуская сярэдняя школа выпусціла 550 чалавек, даўшы ім сярэднюю і няпоўную сярэднюю адукацыю. Многія з іх ужо цяпер займаюць пасады ў кіруючым апараце краіны.

Клопаты аб здароўі працоўных

У нашым раёне за тры апошнія гады значна павялічылася колькасць медустаноў. Мы маем 2 добра абсталяваныя бальніцы, 4 урачэбныя участкі, 7 ФАПаў, дзіцячую кансультацыю, дзесяткі дзіцячых пляцовак і ясляў.

Дзякуючы шырокай сетцы медработнікаў у раёне энергічна праводзяцца прафілактычныя мерапрыемствы, прышчэпкі супраць воспы, адру, брушнога тыфу і інш.

Сярод калектыву медработнікаў выхавана многа выдатных спецыялістаў. Вось лепшыя з іх: Камоцкі, Мядзведзеў, Бабарыкіна, Барко, Нікіфарава, Кудзельскі і шмат іншых.

Вынікі “суцэльнай калектывізацыі”

Аналізуючы 1930-ыя гг. і дамагаючыся гістарычнай праўдзівасці, нельга падыходзіць да гэтага перыяду, і найперш да калектывізацыі, аднабакова. Калектывізацыя мела шмат адмоўнага і трагічнага. З аднаго боку, станаўленне калгаснага ладу прывяло да ўздыму вёскі. Але прага як мага хутчэй дасягнуць высокіх тэмпаў калектывізацыі прыводзіла да грубага ўціску тых, хто меркаваў быць аднаасобнікам. На іх у першую чаргу накладваліся праз сельсаветы дадатковыя падаткі, нярэдка непасільныя для чалавека і ягонай сям’і.

На высяленні ў Сібір і Казахстан выправіліся першыя раскулачаныя. З сем’ямі. З сабой дазвалялася браць толькі тое, што можна было несці ў руках.

Карныя органы ўжо мелі на руках тлумачэнні асобай часткі Крымінальнага кодэкса, і ў прыватнасці сумна славутага артыкула 58. Былі там і такія радкі: “С конца 1929 г. в районах сплошной коллективизации стала на практике осуществляться директива Партии и Правитель-

ства о ликвидации кулачества как класса. В процессе этой ликвидации имеют место попытки кулацко-зажиточной части крестьянства разными приемами и способами подорвать экономическую мощь организуемых колхозов. Попытки эти могут заключаться как в умышленном уничтожении имущества колхозов, так и в разложении колхозов изнутри со стороны попавших туда кулаков и подкулачников. Во всех этих случаях, когда будет установлено, что действия этих лиц преследовали цель ослабления экономической мощи колхоза с целью подрыва колхозного строительства, действия эти должны рассматриваться как экономическая контрреволюция и квалифицироваться по ст. 58^7 УК".

Звычайна ідэалагічнай выдумкай было тое, што кулацка-заможная частка сялянства рознымі прыёмамі і спосабамі хацела падарваць эканамічную магутнасць калгасаў. Затое мела месца іншае: эканамічна першыя калгасы былі надзвычай слабымі, і каб неяк выправіць становішча, маёмасць забіралася ў больш заможных, якія мелі тую ж малацілку, маслабойку, млын-вятрак і г.д.

Рэпрэсіі напаткалі не толькі вяскоўцаў, якія не жадалі ўступаць у калгасы, але і многіх з тых, каторыя ўжо з'яўляліся членамі сельгасарцелей.

Дакументы сведчаць

З інструкцыі па чыстцы калгасаў. 1930 г.

Чыстка калгасаў мае мэтай вызваленне калгасаў ад кулацкіх і антысавецкіх элементаў як класавых ворагаў калгаснага будаўніцтва.

Выключэнню з калгасаў падлягаюць:

1) кулакі і нэпманы; 2) асобы, пазбаўленыя выбарчых правоў; 3) асобы, сістэматычна вядучыя работу па падрыву калгасаў; 4) асобы, якія сістэматычна скарыстоўвалі да ўступлення ў калгас наёмную сілу альбо займаліся іншай эксплёататарскай дзейнасцю.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 138. Воп. 1. Спр. 95. Л. 6.

Аб тым, што памятаецца
(паводле твораў Васіля Маеўскага)

Нядобрыя дзядзькі

...Памятаю, аднойчы на досвітку прыйшлі да нас у хату два чужыя, незнаёмыя мне дзядзькі. Адзін, куртаты і кручканосы, у скураной пакамечанай тужурцы, вельмі нагадваў задзірыстага Канушыхіна пеўня, які выклеваў вока нашаму сабаку Жуку. Прысеўшы на ўслончыку, ён пры цьмяным святле "вочка" (так мы называлі газнічку) пільна ўглядаўся ў нейкія паперы. Другі, вышэзны, падобны на бадлівага суседавага бугая, апрануты ў шырокі шэры лапсардак, спыніўся ў парозе. Пазіраючы на абразы, што займалі ўвесь кут над сталом, ён незадаволена і смешна шморгнуў носам, акурат так, як наш Жук, калі я іншы раз падносіў яму нюхнуць шкіпідару, якім маці звычайна націрала ад прастуды маю стогадовую прабабку Ганну.

"І чаго яны прыйшлі так рана?" — думаў я на ложку і, з галавою ўкрыўшыся коўдрай, цікаваў праз невялічкую адтуліну, прыслухоўваючыся да размовы. І надта шкадаваў, што не ўсе словы разумеў — асабліва такія: "калгас", "абагульванне", "ферма", "сабатаж" і "сабатажнік"... Але па тым, як стаў перад сталом засмучаны бацька і як кончыкам хусцінкі выцірала слёзы маці, адчуваў: штосьці нядобрае задумалі гэтыя незнаёмыя людзі, і не памыліўся...

Раптам кручканосы падняўся з услончыка і пачаў ушчуваць майго бацьку:

—Дарэмна супраціўляешся, Хама Паўлавіч, рабоча-сялянскай уладзе...

Што ж, не хочаш па-добраму — сілком забяром карову ды і самога ў сабатажнікі запішам. Не паглядзім, што ў грамадзянскую вайну чырвоным коннікам быў, у корпусе Гая служыў…

І як ні стараўся бацька давесці, што без каровы ў вёсцы пражыць цяжка, як ні даказваў сваю адданасць савецкай уладзе (і каня, і калёсы, і ўвесь інвентар абагуліў у калгас), тыя нават і вухам не вялі. Не звярталі яны ніякай увагі і на матчыны слёзы-просьбы, каб хоць на якога паўгодзіка пакінулі Кветку ў хляве.

—Абагульванне — не наша выдумка, а каманда адтуль, — кручканосы пальцам паказаў угору. (Не ведаю, як бацька, а я разумеў, што каманда тая ад Бога, пра якога мне часта апавядала прабабка Ганна.) І тут жа скамандаваў бугаепадобнаму:

—Бяры вяроўку і чапляй за рогі кароўку!..

Бацька моўчкі стаяў ля стала. А маці залямантавала на чым свет, бегаючы па хаце; потым узяла з лавы даёнку і борздзенька памкнулася да выхаду. Але дарогу ёй перагарадзіў дзядзька ў шырокім лапсардаку, а кручканосы тым часам прарэзліва пракудахтаў:

—Ку-у-ды?! Там, на ферме, без вас і падояць, і пакормяць…

—А як жа нам бы-ы-ць?! — не супакойвалася маці. — А што ж нам рабіць?!

Тут кручканосы нібыта зміласцівіўся і пачаў тлумачыць, што кожны дзень хто-небудзь з нашых будзе прыходзіць на ферму і пад распіску атрымліваць малако — па аднаму карцу на члена сям’і.

—І нашаму коціку таксама карэц? — радасна пацікавіўся я з-пад коўдры.

—Коціку — не паложана, — астудзіў маю радасць кручканосы і дадаў: — І бабулі Ганне — не паложана: па шнуравой кнізе яна не лічыцца членам вашай сям’і. Яна проста ваша радня…

—Госпадзі Ісусе, што ж гэта дзеецца? — запрычытала на печы прабабка. — Такога на маім вяку яшчэ ніколі не было… Нават і пры прыгонным праве…

Нядобрыя, няўмольныя дзядзькі — адзін з паперамі ў руках, другі з вяроўкай — падаліся на двор. Маці яшчэ мацней загаласіла. Бацька ў роспачы стаяў пасярэдзіне хаты і, — я гэта добра пачуў! — вылаяўшыся, пытаўся сам у сябе: “Ці ведае пра ўсё гэта Сталін?” А я, вынырнуўшы з-пад коўдры, скокнуў з ложка на падлогу і без штаноў, у сподняй кашулі шмыгнуў за дзверы. І ўбачыў такое, чаго ніколі не забыць. Бугаепадобны, накінуўшы на рогі Кветцы вяровачную пятлю, колькі было моцы цягнуў яе з двара, а кручканосы, сцёбаючы карову дубцом, дапамагаў сябру.

—А куды ж вы яе павялі?! — абліваючыся горкімі слязьмі, тупаў я на прыцярушаным снегам ганку босымі нагамі. — А хто ж цяпер нам малачко даваць будзе?

—Не плач, сынок, — супакойвала мяне заплаканая маці і, махаючы кулаком у бок тых нядобрых дзядзькаў, прымаўляла: — Хай яны там самі засіляцца і задушацца!..

Безгалоўе

—Уставай, сынок, — яшчэ да золку ўзбудзіла мяне маці. — Пойдзем на хверму, па малачко…

Я хуценька апрануўся. І мы, не паснедаўшы, выйшлі ў канец вёскі. Трымаючыся за матчын хвартух, я з горда ўзнятай галавой — як-ніяк пры справе! — крочыў на тую хверму, якая мясцілася ў двары Ямінскага Сяргея. Што яна сабою ўяўляла, я ўжо ведаў. Якраз на другі дзень пасля таго, як забралі нашу Кветку, мы прыйшлі сюды з бацькам і ўбачылі такое… Пад павеццю, наскрозь прадзімаемай ветрам, тоўпіліся, бы непрыкаяныя, каровы, равучы на розныя галасы.

—Якое бязладдзе! Якое безгалоўе! — гледзячы на гэты кароўскі гармідар, разпораз кідаў бацька. — І трэба ж звесці скаціну амаль з усяго нашага Хізава ў адну кучу!..

“І дзе ўбачыў бацька тое безгалоўе? — думаў я тады, уважліва прыглядваючыся да пярэстых і чарнабурых, рагатых і лабатых насельнікаў фермы. — Ёсць дзве бясхвостыя, а вось безгаловай не заўважыў аніводнай!..”

Гэткі ж кароўскі гармідар прадстаў перада мною і цяпер, калі прыйшлі мы сюды з матуляй. І я пацікавіўся ў яе:

— Чаму гэта ўвесь час каровы, нібы згаварыўшыся, рыкаюць?

— То ж яны, бедненькія, так просяць сваіх былых гаспадароў, каб вызвалілі іх з гэтай бяды-няволі і забралі дамоў, — тлумачыла маці як магла.

— І наша Кветка таксама просіць?

— І наша, сынок. Бо хто ж яе тут дагледзіць, як мы дома даглядалі, кармілі і паілі...

— А вунь тыя дзядзькі і цёткі, што ходзяць ля іх? Хіба яны не ўмеюць карміць і паіць?..

— Адны не ўмеюць, бо ніколі сваёй худобіны не мелі. Абібокі, можна сказаць. Другія — можа, і ўмеюць, ды, гледзячы на абібокаў, таксама не жадаюць працаваць як след, шукаюць лёгкага хлеба.

Вядома, не ўсё, што гаварыла маці, даходзіла да майго дзіцячага розуму. Аднак галоўнае я зразумеў па-свойму. Што абібок — гэта той, хто б’е катоў па баках, і яго я чамусьці атаясамліваў з загадчыкам фермы. А ўлікоўца — з чалавекам, які шукае лёгкага хлеба, — такога, які прывозіла мне на гасцінец цётка Полька з Ленінграда мінулым летам. “Вось бы цяпер такога пульхнага і смачнага пірага ды з цёплым сырадоем”, — думаў я.

Глытаючы сліну, следам за маці наблізіўся я да ўлікоўца, які звычайна выпісваў малако. Але — што гэта? Шукальнік лёгкага хлеба на хвілінку адарваў свой позірк ад папераў і, зласнавата зыркнуўшы на новы гарлачык, што маці нядаўна купіла ў заезджага гаршэчніка, адрэзаў:

— Сёння, Пёкла, табе малака не будзе!

— Як гэта – не будзе? — абурылася маці. — А чым мне карміць вось яго? — паказала на мяне. — Ды і меншае дзіцянё малака просіць.

— Нічога не хачу знаць! — стаяў на сваім уліковец. — У вашай каровы малако перагарэла. Не доіцца!..

— Дык пры чым тут мы?! — даказвала яму маці. — Самі забралі карову, самі сапсавалі худобіну, а зараз вінаватых шукаеце.

— Нічым дапамагчы не магу, — паўтарыў уліковец. — Дазволіць загадчык фермы — выпішам...

Мы — да таго загадчыка. І ён тое ж плешча. Але, нарэшце, раіць звярнуцца з пісьмовай просьбай да старшыні калгаса, калі той вернецца з нейкіх курсаў.

— Безгалоўе — і толькі, — пачуў я ад маці тыя ж словы, што калісьці вымавіў бацька. І мы ні з чым пайшлі дахаты. І зноў усю дарогу думаў і не мог дапяць, дзе маці ўбачыла тых безгаловых. “І ў загадчыка, і ва ўлікоўца, здаецца, галовы на плячах, — разважаў я. — Пры чым жа тут безгалоўе?”

Амаль цэлы месяц чакалі мы вяртання старшыні з тых курсаў. І ўвесь гэты час выручала нас суседка Канушыха: яна кожную раніцу прыносіла малако ад сваёй каровы, і не толькі малако. Аднойчы прынесла мне засмажанага пеўня, які выклюнуў вока нашаму Жуку і на якога быў вельмі падобны той кручканосы дзядзька, які забраў нашу Кветку, і кажа:

— Не-е-е! Мяне і на вяроўцы не зацягнуць у той калгас...

І пасля гэтага мне не раз снілася, як тыя два нядобрыя дзядзькі — кручканосы і бугаепадобны — цягнуць на вяроўцы аднаасобніцу — Канушыху з яе хаты, а яна вырываецца ад іх і крычыць:

— Людзі добрыя, ратуйце! Не дайце ім і мяне зацягнуць у тое безгалоўе і бязладдзе!..

Галавакружэнне

Ужо дакладна не памятаю: была нядзеля ці якое іншае свята. Але што дзень пачынаўся небудзённа, урачыста, відаць было па ўсім. Бацька, як звычайна ў

Кормянская центральная районная библиотека

такія дні, дастаў з прыскрынка брытвенныя прычындалы і, падышоўшы да невялікага круглага люстэрка, што вісела на цвічку каля акна, старанна намыльваў памазком шчаку. Маці падпаліла ў печы і, паставіўшы на ўслончык, паблізу загнета, дзежку з цестам, сальным помазам націрала дно патэльні — каб не падгаралі бліны. Я карміў коціка малаком, якое ўранні, калі яшчэ спаў, маці прынесла з фермы. Меншая сястрычка спала ў люльцы, падвешанай да бэлькі. Як кажуць, кожны быў заняты сваёю справаю. І гэтую ціхамірную сямейную ідылію раптам парушыў прарэзлівы жаночы голас з вуліцы:

— Хо-о-мка! Пё-ё-кла! Што вы там забарыліся?! Людзі пазабіралі сваіх кароў з хвермы! А вы?!

І праз якую хвіліну ўвайшла бабка Задубка (яе так звалі таму, што родам яна з суседняй вёскі Задуб'е) — жонка старэйшага бацькавага дзядзькі Максіма — і з парога радасна абвясціла:

— Прынесла вам добрую навіну: кажуць, Сталін здурнеў! Слава Богу, ужо і наш калгас разбягаецца...

— Што ты чаўпеш, цётка! — паўшэптам перасцярог яе бацька, на хвілінку адвярнуўшыся ад люстэрка: — За такія словы мігам у каталажку запруць. Як таго Ваську Гародніка з Бераставуца. Праспяваў: "Гоп, гоп, грачанікі, а ўсе жыды — начальнікі!" — і загрымеў на Салаўкі.

Тым часам прыйшлі родзічы, суседзі. Усе ўзрушана радасныя! Гараська Паплаўскі не толькі пацвердзіў Задубчыну вестку, але і ўдакладніў...

— Не захварэў Сталін, — умяшаўся ў размову дзядзька Марцін, старэйшы матчын брат. — Відаць, апамятаўся, што натварыў немаведама чаго...

Не ведаю: верыў ці не бацька ўсім гэтым словам. Аднак не спяшаўся. Ён хадзіў па хаце ўзад-уперад, і мне было смешна, што адна шчака ў яго паголеная, а другая — толькі намыленая. Але я і шкадаваў, што маці дапякала яму за нерашучасць, гаварыла, што ён баязлівец.

— Не сакачы ты, — раз-пораз перапыняў ён яе. — Ведаеш: высунуўся я наперад, а мяне — хоп у нерат. І так вунь новае наша начальства вочы коле: маўляў, Хомка — сын лішэнца, цвёрдазаданніка. Што бацька — хутаранін, з сынамі ўцёк ад раскулачвання ў Сібір. Такое прыпішуць! Забярэш карову — і не паспееш аглянуцца, як загоняць туды, дзе Макар цялят не пасвіў...

— Ён праўду кажа, — падтрымаў бацьку дзядзька Марцін. — Табе самой, сястра, зручней Кветку забіраць.

Радасная маці накінула на галаву святочную гарусавую хустку, падперазала новы, з вышытымі пеўнікамі фартух і выбегла з хаты. Я подбегам пашыбаваў за ёю. Прыйшлі на двор Сяргея Ямінскага. Поўны разгром. Пад паветкаю бадзялася мо з дзесяць кароў. Глянулі мы на Кветку — вачам не паверылі. Худая, мурзатая, нейкая ўскалахмачаная. Да таго ж якаясь карова прапарола ёй бок. А галоўнае, наша Кветка, павярнуўшы галаву назад, як ачмурэлая, круцілася на адным месцы, нібыта ганяючыся за сваім хвастом.

— Зусім знявечылі худобіну! — Маці ў роспачы пляснула рукамі. — Каб ім самім пакруціла так галовы, хто прыдумаў гэтае абагульванне. Хай яго ніколі не пакідае то галавакружэнне.

Скалечаную Кветку мы ледзь-ледзь прывялі на свой двор. Глянуў бацька на каровіны пакуты і, схамянуўшыся, кажа:

— Хадзем, сынок, на канюшню, а то і варанога нашага даканаюць...

У той дзень мы зрабілі тое ж, што і нашы суседзі. Бацька запрог свайго каня ў свае калёсы, пагрузіў на воз свой інвентар і, уручыўшы мне лейцы і пугу, блаславіў:

— Паганяй!..

Але паганяць варанога не спатрэбілася: адчуўшы волю, ён трушком вёз нас па вуліцы ў напрамку свайго незабытага двара. І, памятаю, потым цэлы вечар бацька тлумачыў маці, што Сталін не здурнеў і не захварэў, а проста зразумеў нейкія свае перагібы і напісаў у газеце

пра нейкае “Галавакружэнне ад поспехаў”.

А праз колькі часу мы павялі хворую Кветку ў Карму і прадалі яе сталовай на мяса, а за тыя грошы ў Пятравічах купілі Лыску. І пасля ўсіх гэтых падзей яшчэ чатыры гады пражылі аднаасобна. Але, як казаў пасля бацька, гэта было ўжо не жыццё, а адны пакуты. Бо сталінскае “галавакружэнне ад поспехаў” служыла той шырмай, якой высокапастаўленыя калектывізатары прыкрывалі свае злачынствы.

З успамінаў А. І. Акінчыца, жыхара г. п. Карма

Наша семья была зажиточной: два дома, ветряная мельница, надел земли, различный скот. Отец, когда в 1930 г. началась коллективизация, отказался идти в колхоз. За это его раскулачили и осудили на 6 лет. Дома забрали и перевезли в г.п. Корма, где долгое время размещались районный народный суд и прокуратура. Забрали у нас также весь имеющийся скот. Мать с нами ютилась по соседям. Перед началом Великой Отечественной войны отец возвратился домой, построил себе небольшой дом, а во время оккупации района восстановил ветряную мельницу, на которой продолжал размалывать зерновые культуры себе и другим людям. Однажды зимой 1942/43 г. к нему обратился командир партизанского отряда им. Ворошилова Аверьян Ушев с просьбой размолоть зерно, которое они отбили у немцев. Отец только начал размол, как нагрянули немцы и полицейские из кормянского гарнизона. Отца забрали, некоторое время держали его под стражей в д. Лазовица в доме, пытали, а затем, ничего не добившись, повесили в деревне Выдранка Краснопольского района.

З успамінаў М. С. Супічэнка, жыхаркі в. Лужок

Мой отец Степан Фомич Супиченко жил в д. Лужок. Имел землю, коня, корову и другой мелкий скот и птицу, а также два дома. В колхоз вступать отказался. Судили его в 1933 г. и сослали на строительство какого-то канала, а через 15 лет он вернулся домой без руки и доживал в своей деревне. Работал сторожем в колхозе.

З успамінаў П. А. Жлоба, жыхаркі в. Багданавічы

За 1930—1937 гг. в нашей деревне необоснованно репрессировано 18 граждан. В основном это были такие же люди, как и все сельчане, трудяги, с утра до ночи работавшие на земле. У них были хорошие жилые дома и надворные постройки. Каждый держал по одной лошади и одной корове, мелкий скот. Когда началась коллективизация, то они отказались вступать в колхоз. За это их раскулачили и сослали: одних на Урал, других в Сибирь. Никто из них в деревню больше не вернулся. Выслали и Зборомирского Ефима Ивановича, который, наверное, согрешил тем, что очень верил в Бога и также не хотел работать в колхозе, и Зборомирского Григория Ивановича, некоторое время работавшего в г.п. Чечерск милиционером, а потом заведующим Богдановичской начальной школой.

Вернутыя імёны

Складаным жыццём жыло савецкае грамадства, у тым ліку і на Беларусі, у 30-ыя гг. З аднаго боку — упартая, самаадданая праца па наладжванні новага жыцця, сацыялістычнага пераўтварэння краіны, з другога — трагічныя лёсы несправядліва абвінавачаных людзей. Вядомы тэзіс Сталіна пра абвастрэнне класавай барацьбы па меры руху да сацыялізму ствараў атмасферу падазронасці,

Кормянская центральная районная библиотека

неабгрунтаваных рэпрэсій. 1937 год увайшоў у нашу гісторыю як год "вялікага тэрору".

Масавыя рэпрэсіі 30-ых гг., стварэнне жорсткай сістэмы ГУЛАГу мелі вельмі цяжкія вынікі, значная маса дзеяздольнага насельніцтва была ў прамым сэнсе фізічна знішчана. Дакладную лічбу расстраляных, загінуўшых ад холаду, недаядання, хвароб у канцэнтрацыйных лагерах і ў ходзе дэпартацый да гэтай пары нельга прызнаць канчатковай. Вядома толькі, што гаворка можа ісці аб мільёнах бязвінных ахвяр.

У Кармянскім раёне, па няпоўных звестках, было рэпрэсіравана больш за 330 чалавек.

Большасць ахвяр палітычных рэпрэсій былі пакараны паводле рашэнняў пазасудовых органаў ("двоек", "троек", асобых нарад калегій АДПУ, НКУС, МУС і інш.). Тысячы сялян раёна былі ў адміністрацыйным парадку раскулачаны і высланы на Поўнач, Урал, у Сібір.

Палітычныя рэпрэсіі, якія пракаціліся па Беларусі ў 1930–1950 гг., на доўгія гады ўсялілі ў свядомасць жыхароў страх, падазронасць. Людзі вырошчвалі хлеб, працавалі на фабрыках і заводах, ва ўстановах, гадавалі дзяцей, займаліся мірнай стваральнай працай і раптам станавіліся "ворагамі народа", страчвалі свабоду, часта і жыццё. Якія толькі абвінавачванні не прыпісваліся ім: і ўдзельнікі "антысавецкіх дыверсійна-тэрарыстычных, контррэвалюцыйных арганізацый" і "агенты замежных разведак". Людзі прыцягваліся да адказнасці за "антысавецкую прапаганду", "распаўсюджванне контррэвалюцыйных чутак", "агітацыю супраць калгасаў", "шкодніцтва", як члены сям'і "ворага народа" і інш.

Народ жыў у трагічна супярэчлівых абставінах. У народнай свядомасці перапляталіся непрыязь да існуючага рэжыму з ілюзорнай ідэяй аб вымушанасці рэпрэсій для ўмацавання дзяржавы.

Не проста было тады разабрацца ў тым, што адбывалася. Многія верылі, што быццам сярод іх жывуць сапраўдныя ворагі народа, і падтрымлівалі органы НКУС, якія вялі "непрымірымую" барацьбу з імі. І толькі праз гады даведаліся людзі праўду аб тых, хто без усякай віны загінуў у засценках НКУС, у турмах і лагерах.

Рэпрэсіі, тысячы вязняў — жахлівая, страшная рэчаінасць нашай гісторыі, народжаная аб'ектыўнымі і суб'ектыўнымі абставінамі. Гэтую старонку гісторыі дзяржавы і народа замаўчаць альбо забыць нельга.

Многія з рэпрэсіраваных былі рэабілітаваны яшчэ ў 1950–1960 гг., іншыя пазней. Людзям вяртаюцца іх чэсныя імёны. У працэсе работы над кнігай "Памяць" сталі вядомы прозвішчы рэабілітаваных, якія прыводзяцца ніжэй.

У. І. Лемяшонак

Ахвяры палітычных рэпрэсій

АКІНЧЫЦ Іван Сцяпанавіч, н. у 1894 у в. Малашкі. Арыштаваны 21.10.1932. Рэабілітаваны 31.10.1989.

АКІНЧЫЦ Фама Якаўлевіч, н. у 1906 у в. Сапажкі. Арыштаваны 13.3.1936. Рэабілітаваны 26.6.1990.

АНДРОСЕНКА Іван Міхайлавіч, н. у 1882 у в. Навасёлкі. Арыштаваны 25.2.1934. Рэабілітаваны 22.3.1989.

АНІКЕЕНКА Іларыён Іванавіч, н. у 1871 у в. Бераставец. Арыштаваны 6.3.1930. Рэабілітаваны 27.11.1989.

АНІКЕЕНКА Пракоп Іларыёнавіч, н. у 1902 у в. Бераставец. Арыштаваны 6.3.1930. Рэабілітаваны 27.11.1989.

АРХІПЕНКА Ягор Сцяпанавіч, н. у 1895 у в. Касцюкоўка. Арыштаваны 30.11.1937. Рэабілітаваны 10.10.1966.

АРЦЕМ'ЕЎ Васіль Платонавіч, н. у 1876 у в. Студзянец. Арыштаваны 20.1.1945. Рэабілітаваны 29.12.1961.

АСІПКІН Даніла Мікітавіч, н. у 1882 у в. Скартынь. Арыштаваны 18.5.1931. Рэабілітаваны 15.9.1991.

АСТРОЎСКІ Шая Мордухавіч, н. у 1895 у в. Расохі. Арыштаваны 25.8.1951. Рэабілітаваны 22.12.1969.

БАГДАНОВІЧ Авакум Данілавіч, н. у 1890 у в. Дубавіца. Арыштаваны 30.7.1932 і 1.9.1937. Рэабілітаваны 8.4.1988.

БАГДАНОВІЧ Еўдакія Іванаўна, н. у 1900 у в. Багданавічы. Арыштавана 24.6.1944. Рэабілітавана 19.4.1971.

БАГДАНОВІЧ Іван Сцяпанавіч, н. у 1865 у в. Багданавічы. Арыштаваны 1.9.1937. Рэабілітаваны 19.5.1989.

БАГДАНОВІЧ Іван Якаўлевіч, н. у 1873 у в. Багданавічы. Арыштаваны 7.2.1933. Рэабілітаваны 25.8.1989.

БАГДАНОВІЧ Іван Якаўлевіч, н. у 1896 у в. Багданавічы. Арыштаваны 31.5.1942. Рэабілітаваны 19.4.1971.

БАГДАНОВІЧ Нікандр Нічыпаравіч, н. у 1889 у в. Кляпінская Буда. Арыштаваны 8.2.1933. Рэабілітаваны 19.7.1989.

БАГДАНОВІЧ Павел Пятровіч, н. у 1879 у в. Багданавічы. Арыштаваны 4.11.1938. Рэабілітаваны 18.5.1990.

БАГДАНОВІЧ Сцяпан Аўрамавіч, н. у 1870 у в. Багданавічы. Арыштаваны 7.2.1933. Рэабілітаваны 25.8.1989.

БАГДАНОВІЧ Сямён Данілавіч, н. у 1903 у в. Дубавіца. Арыштаваны 22.2.1933 і 1.9.1937. Рэабілітаваны 8.4.1988.

БАГДАНОВІЧ Цімафей Якаўлевіч, н. у 1877 у в. Багданавічы. Арыштаваны 27.9.1938. Рэабілітаваны 18.10.1989.

БАЛАБАЙКА Сямён Сцяпанавіч, н. у 1916 у в. Гарадок. Арыштаваны 28.3.1939. Рэабілітаваны 29.6.1990.

БАЛОТКІН Фама Якімавіч, н. у 1892 у в. Ліцвінавічы. Арыштаваны 23.10.1937. Рэабілітаваны 30.7.1980.

БАНДАРЭНКА Пётр Мацвеевіч, н. у 1872 у в. Сапажкі. Арыштаваны 2.6.1933. Рэабілітаваны 23.3.1989.

БАРЫСЕНКА Аляксандр Навумавіч, н. у 1893 у в. Хізаў. Арыштаваны 6.3.1930. Рэабілітаваны 27.2.1989.

БАРЫСЕНКА Харлампій Данілавіч, н. у 1868 у в. Хізаў. Арыштаваны 6.3.1930. Рэабілітаваны 27.2.1989.

БЕКАРЭВІЧ Аляксандр Пятровіч, н. у 1908 у в. Навасёлкі. Арыштаваны 26.10.1937. Рэабілітаваны 21.4.1960.

ВАЙЦЯНКОЎ Фама Піліпавіч, н. у 1880 у в. Лужок. Арыштаваны 17.3.1933. Рэабілітаваны 25.10.1965.

ВАРАБ'ЁЎ Адам Іванавіч, н. у 1875 у в. Баравая Буда. Арыштаваны 9.3.1930. Рэабілітаваны 1.12.1989.

ВАРАБ'ЁЎ Аляксандр Кузьміч, н. у 1890 у в. Навасёлкі. Арыштаваны 25.2.1934. Рэабілітаваны 22.3.1989.

ВАСІЛЕНКА Сямён Пракопавіч, н. у 1906 у в. Зяцькавічы. Арыштаваны 23.12.1937. Рэабілітаваны 12.3.1990.

ВАСІЛЬКОЎ Андрэй Давыдавіч, н. у 1878 у в. Бярозаўка. Арыштаваны 28.1.1933 і 1.9.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ВІЛЬЧЫПОЛЬСКІ Міхаіл Іосіфавіч, н. у 1886 у в. Багданавічы. Арыштаваны 26.7.1930. Рэабілітаваны 10.11.1989.

ВІНАГРАДАЎ Дзмітрый Сяргеевіч, н. у 1902 у в. Вынашаўка. Арыштаваны 13.12.1945. Рэабілітаваны 1.8.1962.

ГАЛАДУШКА Міхаіл Тарасавіч, н. у 1873 у в. Гарадок. Арыштаваны 9.3.1930. Рэабілітаваны 1.12.1989.

ГАНЧАРОЎ Захар Ермалаевіч, н. у 1877 у в. Ст. Алешня. Арыштаваны 12.8.1937. Рэабілітаваны 12.6.1989.

ГАРБУЗОЎ Фядосій Сафронавіч, н. у 1892 у в. Косаль. Арыштаваны 22.5.1936. Рэабілітаваны 16.10.1989.

ГАРЭЛІК Павел Нахімавіч, н. у 1886 у г.п. Карма. Арыштаваны 23.3.1933. Рэабілітаваны 5.10.1956.

ГАРЭЛІКАЎ Іван Фядосавіч, н. у 1834 у в. Навасёлкі. Арыштаваны 9.3.1930. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ГАЎРЫЛЕНКА Андрэй Міхайлавіч, н. у 1885 у в. Зарэчча. Арыштаваны 13.12.1938. Рэабілітаваны 26.6.1991.

ГАЎРЫЛЕНКА Павел Кандратавіч, н. у 1880 у в. Расохі. Арыштаваны 3.12.1935. Рэабілітаваны 18.5.1990.

ГРЫБАЎ Мікалай Фёдаравіч, н. у 1894 у в. Ворнаўка. Арыштаваны 16.2.1933. Рэабілітаваны 23.1.1989.

ГРЫБОЎСКІ Аляксандр Якаўлевіч, н. у 1893 у в. Жабін. Арыштаваны 22.2.1933. Рэабілітаваны 4.2.1963.

ГРЫБОЎСКІ Міхаіл Антонавіч, н. у в. Новая Зенькавіна.

ГРЫБОЎСКІ Павел Міхайлавіч, н. у 1909 у в. Жабін. Арыштаваны 23.10.1937. Рэабілітаваны 30.7.1989.

ГРЫБОЎСКІ Ягор Фёдаравіч, н. у 1907 у в. Жабін. Арыштаваны 30.5.1945. Рэабілітаваны 2.9.1968.

ГРЫНКЕВІЧ Сцяпан Пятровіч, н. у 1898 у в. Сапажкі. Арыштаваны 2.6.1933. Рэабілітаваны 23.3.1989.

ГУБЕРНЫ Ісак Фёдаравіч, н. у 1873 у в. Лубянка. Арыштаваны 29.9.1938. Рэабілітаваны 14.1.1958.

ГУДЗЯНКОЎ Васіль Міронавіч, н. у 1867 у в. Лубянка. Арыштаваны 29.9.1938. Рэабілітаваны 14.1.1958.

ГУПАЎ Васіль Навумавіч, н. у 1910 у в. Лебядзёўка. Арыштаваны 15.6.1942. Рэабілітаваны 22.5.1955.

ГУРЭВІЧ Ісак Банцыанавіч, н. у 1877 у г.п. Карма. Арыштаваны 25.10.1937. Рэабілітаваны 22.7.1989.

ДАЛДОНАЎ Васіль Фёдаравіч, н. у 1888 у в. Кляпінская Буда. Арыштаваны 8.2.1933. Рэабілітаваны 19.8.1989.

Кармянская центральная районная библиотека

ДАЛДОНАЎ Мацвей Іванавіч, н. у 1894 у в. Кляпінская Буда. Арыштаваны 21.3.1930. Рэабілітаваны 31.7.1989.

ДАНІЛЕНКА Іван Аўрамавіч, н. у в. Струкачоў. Арыштаваны 16.2.1930. Рэабілітаваны 23.12.1991.

ДАРАШЭНКА Аксён Лаўрэнцьевіч, н. у 1885 у в. Струмень. Арыштаваны 3.3.1933. Рэабілітаваны 17.10.1989.

ДЗЕМІДОВІЧ Іван Іванавіч, н. у 1872 у в. Багданавічы. Арыштаваны 7.2.1933. Рэабілітаваны 25.8.1989.

ДЗЕРУЖЫНСКІ Сяргей Яфімавіч, н. у 1889 у в. Паштовая Глінка. Арыштаваны 16.7.1945. Рэабілітаваны 11.7.1966.

ЕЛЕНСОН Гірша Борухавіч, н. у 1888 у в. Расаўка. Арыштаваны 30.10.1937. Рэабілітаваны 11.2.1960.

ЕЛІСЕЕЎ Антон Дзянісавіч, н. у 1863 у в. Бераставец. Арыштаваны 14.3.1938. Рэабілітаваны 19.10.1989.

ЕЛІСЕЕЎ Кузьма Антонавіч, н. у 1904 у в. Бераставец. Арыштаваны 25.5.1939. Рэабілітаваны 13.7.1960.

ЕРМАЛАЕЎ Кірыл Васілевіч, н. у 1894 у в. Рэвут. Арыштаваны 17.9.1937. Рэабілітаваны 7.10.1957.

ЕРМАЛАЕЎ Савасцей Васілевіч, н. у 1887 у в. Рэвут. Арыштаваны 9.3.1930. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ЕЎДАКІМАЎ Іван Мітрафанавіч, н. у 1897 у в. Ворнаўка. Арыштаваны 17.12.1937. Рэабілітаваны 10.12.1957.

ЖЛОБА Андрэй Пятровіч, н. у 1873 у в. Жабін. Арыштаваны 22.2.1933. Рэабілітаваны 4.2.1963.

ЖЛОБА Васіль Сямёнавіч, н. у 1878 у в. Ворнаўка. Арыштаваны 16.2.1933. Рэабілітаваны 23.1.1989.

ЖЛОБА Іван Андрэевіч, н. у 1907 у в. Жабін. Арыштаваны 22.2.1933. Рэабілітаваны 4.2.1963.

ЖЛОБА Іван Пятровіч, н. у 1924 у в. Ворнаўка. Арыштаваны 19.8.1944. Рэабілітаваны 25.12.1970.

ЖЛОБА Міхаіл Барысавіч, н. у 1884 у в. Лядцы. Арыштаваны 16.2.1933. Рэабілітаваны 23.1.1989.

ЖЛОБА Рыгор Андрэевіч, н. у 1886 у в. Старыя Лядцы. Арыштаваны 16.2.1933. Рэабілітаваны 23.1.1989.

ЖУРАЎЛЁЎ Аляксей Прохаравіч, н. у 1912 у в. Міхалёўка. Арыштаваны 22.12.1931. Рэабілітаваны 21.5.1992.

ЖУРАЎЛЁЎ Васіль Яфімавіч, н. у 1895 у в. Паштовая Глінка. Арыштаваны 8.2.1933. Рэабілітаваны 27.7.1989.

ЖУРАЎЛЁЎ Навум Андрэевіч, н. у 1890 у в. Міхалёўка. Арыштаваны 1.9.1937. Рэабілітаваны 19.5.1989.

ЖУРАЎСКІ Пётр Геарвізіевіч, н. у 1894 у в. Глазкі. Арыштаваны 28.4.1933. Рэабілітаваны 30.9.1989.

ЗАЙЦОЎ Цярэнцій Лукіч, н. у 1891 у в. Косаль. Арыштаваны 1.9.1937. Рэабілітаваны 4.2.1963.

ЗБАРАМІРСКІ Рыгор Іванавіч, н. у 1902 у в. Багданавічы. Арыштаваны 30.10.1937. Рэабілітаваны 14.3.1960.

ЗБАРАМІРСКІ Яфім Іванавіч, н. у 1882 у в. Багданавічы. Арыштаваны 1.9.1937. Рэабілітаваны 12.6.1989.

ЗВЯРКОЎ Рыгор Яфімавіч, н. у 1898 у в. Расохі. Арыштаваны 22.2.1933. Рэабілітаваны 8.4.1988.

ІВАРОЎСКІ Аляксей Раманавіч, н. у 1869 у в. Жавуніца. Арыштаваны 8.2.1933. Рэабілітаваны 12.4.1990.

ІГНАЦЕНКА Емяльян Кандратавіч, н. у 1904 у в. Ліцвінавічы. Арыштаваны 30.9.1938. Рэабілітаваны 29.4.1958.

КАВАЛЁЎ Архіп Іванавіч, н. у 1902 у в. Навасёлкі. Арыштаваны 25.2.1934. Рэабілітаваны 22.3.1989.

КАВАЛЁЎ Пётр Антонавіч, н. у 1889 у в. Гарадок. Арыштаваны 9.3.1930. Рэабілітаваны 1.12.1989.

КАВАЛЁЎ Фёдар Сіланцьевіч, н. у 1904 у в. Расохі. Арыштаваны 16.2.1933. Рэабілітаваны 23.1.1989.

КАВАЛЁЎ Ягор Антонавіч, н. у 1896 у в. Навасёлкі. Арыштаваны 25.2.1934. Рэабілітаваны 22.3.1989.

КАДЗІНОЎСКІ Яфім Фаміч, н. у 1898 у в. Кучын. Арыштаваны 16.2.1931. Рэабілітаваны 22.6.1990.

КАЗАКОЎ Іван Пракопавіч, н. у 1903 у в. Вынашаўка. Арыштаваны 3.11.1937. Рэабілітаваны 11.3.1963.

КАЗНАЧЭЕЎ Іван Іванавіч, н. у 1899 у в. Пятравічы. Арыштаваны 2.12.1939. Рэабілітаваны 4.4.1990.

КАЛІНОЎСКІ Рыгор Сцяпанавіч, н. у 1908 у в. Кучын. Арыштаваны 25.2.1934. Рэабілітаваны 23.9.1960.

КАЛІНОЎСКІ Сцяпан Іванавіч, н. у 1864 у в. Кучын. Арыштаваны 14.2.1931. Рэабілітаваны 26.6.1990.

КАНДРАШОЎ Максім Глебавіч, н. у 1913 у в. Акцяброва. Арыштаваны 14.11.1937. Рэабілітаваны 23.2.1993.

КАНОПЛІЧ Анісім Сцяпанавіч, н. у 1870 у в. Махнавічы (Ліцвінавічы). Арыштаваны 28.2.1930. Рэабілітаваны 16.1.1989.

КАРАТКЕВІЧ Адам Антонавіч, н. у 1888 у в. Сапажкі. Арыштаваны 18.10.1937. Рэабілітаваны 2.6.1958.

КАРАТКЕВІЧ Адам Іпалітавіч, н. у 1887 у в. Кароцькі. Арыштаваны 16.2.1938. Рэабілітаваны 24.10.1989.

КАРАТКЕВІЧ Акуліна Аляксандраўна, н. у 1874 у в. Востраў. Арыштавана 9.2.1930. Рэабілітавана 17.10.1991.

КАРАТКЕВІЧ Аляксандр Андрэевіч, н. у 1865 у в. Кароцькі. Арыштаваны 2.6.1933. Рэабілітаваны 23.3.1989.

КАРАТКЕВІЧ Аляксандр Антонавіч, н. у 1886 у в. Сапажкі. Арыштаваны 2.6.1933. Рэабілітаваны 23.3.1989.

КАРАТКЕВІЧ Васіль Прохаравіч, н. у 1912 у в. Кароцькі. Арыштаваны 24.3.1933. Рэабілітаваны 17.4.1961.

КАРАТКЕВІЧ Ганна Пятроўна, н. у 1908 у в. Струмень. Арыштавана 10.2.1945. Рэабілітавана 27.1.1993.

КАРАТКЕВІЧ Дамініка Сямёнаўна, н. у 1871 у в. Струкачоў. Арыштавана 9.2.1930. Рэабілітавана 17.10.1991.

КАРАТКЕВІЧ Іван Максімавіч, н. у 1908 у в. Малашкі. Арыштаваны 16.11.1937. Рэабілітаваны 30.9.1960.

КАРАТКЕВІЧ Іван Фёдаравіч, н. у 1881 у в. Кароцькі. Арыштаваны 2.6.1933. Рэабілітаваны 23.3.1989.

КАРАТКЕВІЧ Кузьма Афанасьевіч, н. у 1884 у в. Кароцькі. Арыштаваны 30.6.1937. Рэабілітаваны 12.6.1989.

КАРАТКЕВІЧ Кузьма Кузьміч, н. у 1899 у в. Багданавічы. Арыштаваны 30.10.1937. Рэабілітаваны 6.6.1989.

КАРАТКЕВІЧ Лявон Адамавіч, н. у 1920 у в. Кароцькі. Арыштаваны 23.6.1941. Рэабілітаваны 11.6.1973.

КАРАТКЕВІЧ Лявон Сямёнавіч, н. у 1872 у в. Кароцькі. Арыштаваны 9.2.1930. Рэабілітаваны 17.10.1991.

КАРАТКЕВІЧ Майсей Данілавіч, н. у 1866 у в. Малашкі. Арыштаваны 21.10.1932. Рэабілітаваны 31.10.1989.

КАРАТКЕВІЧ Максім Пятровіч, н. у 1873 у в. Кароцькі. Арыштаваны 30.4.1933. Рэабілітаваны 31.10.1989.

КАРАТКЕВІЧ Мацвей Іосіфавіч, н. у 1872 у в. Енцы. Арыштаваны 13.12.1938. Рэабілітаваны 21.2.1990.

КАРАТКЕВІЧ Мікалай Антонавіч, н. у 1881 у в. Сапажкі. Арыштаваны 29.11.1936. Рэабілітаваны 30.8.1991.

КАРАТКЕВІЧ Міхаіл Аляксандравіч, н. у 1887 у в. Кароцькі. Арыштаваны 13.3.1936. Рэабілітаваны 26.6.1990.

КАРАТКЕВІЧ Міхаіл Антонавіч, н. у 1906 у в. Кароцькі. Арыштаваны 9.6.1945. Рэабілітаваны 12.8.1991.

КАРАТКЕВІЧ Міхаіл Арцёмавіч, н. у 1892 у в. Кароцькі. Арыштаваны 16.2.1938. Рэабілітаваны 24.10.1989.

КАРАТКЕВІЧ Міхаіл Іванавіч, н. у 1867 у в. Востраў. Арыштаваны 9.2.1930. Рэабілітаваны 17.10.1991.

КАРАТКЕВІЧ Міхаіл Міхайлавіч, н. у 1909 у в. Востраў. Арыштаваны 9.2.1930. Рэабілітаваны 17.10.1991.

КАРАТКЕВІЧ Палікарп Антонавіч, н. у 1898 у в. Кароцькі. Арыштаваны 19.10.1937. Рэабілітаваны 13.4.1967.

КАРАТКЕВІЧ Пётр Дзям'янавіч, н. у 1886 у в. Кароцькі. Арыштаваны 23.10.1937. Рэабілітаваны 18.12.1989.

КАРАТКЕВІЧ Сцяпан Ігнатавіч, н. у 1895 у в. Кароцькі. Арыштаваны 21.7.1945. Рэабілітаваны 20.7.1962.

КАРАТКЕВІЧ Фрол Паўлавіч, н. у 1885 у в. Востраў. Арыштаваны 25.2.1934. Рэабілітаваны 23.9.1960.

КАРАТКЕВІЧ Якаў Ігнацьевіч, н. у 1894 у в. Васільеўка. Арыштаваны 30.4.1933. Рэабілітаваны 31.10.1989.

КАРАТКЕВІЧ Яўмен Астапавіч, н. у 1900 у в. Ліцвінавічы. Арыштаваны 27.9.1938. Рэабілітаваны 16.4.1963.

КАРНЕЙЧЫК Міхаіл Кірылавіч, н. у 1886 у в. Баравая Глінка. Арыштаваны 28.5.1938. Рэабілітаваны 21.6.1989.

КАРЧЭЎСКАЯ Юлія Іосіфаўна, н. у 1899 у в. Востраў. Арыштавана 23.10.1937. Рэабілітавана 5.11.1967.

КАСЦЮЧЭНКА Іван Авяр'янавіч, н. у 1879 у в. Касцюкоўка. Арыштаваны 30.11.1937. Рэабілітаваны 10.10.1966.

КАСЦЮЧЭНКА Мікалай Савельевіч, н. у 1892 у в. Касцюкоўка. Арыштаваны 1.9.1937. Рэабілітаваны 12.2.1962.

КАСЦЮЧЭНКА Павел Сямёнавіч, н. у 1878 у в. Касцюкоўка. Арыштаваны 30.11.1937. Рэабілітаваны 10.10.1966.

КІРЭЕНКА Барыс Давыдавіч, н. у 1908 у в. Норкаўшчына. Арыштаваны 22.2.1933. Рэабілітаваны 9.4.1988.

КІРЭЕНКА Гаўрыіл Васілевіч, н. у 1878 у в. Норкаўшчына. Арыштаваны 22.2.1933. Рэабілітаваны 8.4.1988.

КІР'ЯНАЎ Пётр Іванавіч, н. у 1884 у в. Баравая Буда. Арыштаваны 25.2.1933. Рэабілітаваны 30.9.1989.

КЛІМАЎ Пётр Іванавіч, н. у 1878 у в. Мікалаеўка. Арыштаваны 21.3.1930. Рэабілітаваны 31.7.1989.

КЛІМАЎ Фёдар Рыгоравіч, н. у 1881 у в. Акцяброва. Арыштаваны 4.12.1937. Рэабілітаваны 10.12.1959.

КОЛЬЧАЎ Ігнат Аляксеевіч, н. у 1878 у в. Салабута. Арыштаваны 16.8.1938. Рэабілітаваны 6.2.1961.

КРАСАКОЎ Іван Іванавіч, н. у 1911 у в. Струкачоў. Арыштаваны 19.5.1948. Рэабілітаваны 23.6.1955.

КРАСАКОЎ Фёдар Іванавіч, н. у 1919 у в. Струмень. Арыштаваны 19.5.1948. Рэабілітаваны 2.9.1953.

КУДРАЧОЎ Церах Якімавіч, н. у 1904 у в. Расохі. Арыштаваны 1.9.1937. Рэабілітаваны 5.5.1989.

КУПРЭЕЎ Васіль Піліпавіч, н. у 1898 у в. Задуб'е. Арыштаваны 10.10.1938. Рэабілітаваны 11.12.1961.

Кармянская цэнтральная раённая бібліятэка

ЛАВЯНЕЦКІ Аляксей Ульянавіч, н. у 1868 у в. Восаў. Арыштаваны 21.3.1930. Рэабілітаваны 1.7.1962.

ЛАВЯНЕЦКІ Афанасій Іванавіч, н. у 1888 у в. Лазовіца. Арыштаваны 21.3.1930. Рэабілітаваны 17.7.1962.

ЛАВЯНЕЦКІ Васіль Талімавіч, н. у в. Шэрахаўская Буда. Арыштаваны 25.2.1933. Рэабілітаваны 30.9.1989.

ЛАВЯНЕЦКІ Кандрат Ульянавіч, н. у 1868 у в. Лазовіца. Арыштаваны 21.3.1930. Рэабілітаваны 18.7.1962.

ЛАДЗІСАЎ Дзям'ян Міхайлавіч, н. у 1876 у в. Салабута. Арыштаваны 7.2.1933. Рэабілітаваны 19.12.1989.

ЛАДЗІСАЎ Парфірый Міхайлавіч, н. у 1903 у в. Салабута. Арыштаваны 7.2.1933. Рэабілітаваны 19.7.1989.

ЛАРЧАНКА Іларыён Марцінавіч, н. у 1904 у в. Вашчанкі. Арыштаваны 23.10.1937. Рэабілітаваны 19.1.1989.

ЛАЦЯНКОЎ Васіль Яфімавіч, н. у 1878. Арыштаваны 21.3.1930. Рэабілітаваны 12.9.1989.

ЛАЦЯНКОЎ Церах Васілевіч, н. у 1907. Арыштаваны 21.3.1930. Рэабілітаваны 12.9.1989.

ЛАЦЯНКОЎ Ціхан Васілевіч, н. у 1900. Арыштаваны 21.3.1930. Рэабілітаваны 12.9.1989.

ЛАШКЕВІЧ Аляксандр Іванавіч, н. у 1879 у в. Жабін. Арыштаваны 22.2.1933. Рэабілітаваны 4.2.1963.

ЛАШКЕВІЧ Антон Аляксандравіч, н. у 1876 у в. Востраў. Арыштаваны 2.3.1933. Рэабілітаваны 23.3.1989.

ЛАШКЕВІЧ Антон Аляксандравіч, н. у 1880 у в. Востраў. Арыштаваны 23.10.1937. Рэабілітаваны 18.12.1989.

ЛАШКЕВІЧ Аўгусцін Антонавіч, н. у 1873 у в. Востраў. Арыштаваны 29.9.1938. Рэабілітаваны 14.1.1958.

ЛАШКЕВІЧ Вікторыя Ігнацьеўна, н. у 1888 у в. Тарахаўка. Арыштавана 9.2.1930. Рэабілітавана 17.10.1991.

ЛАШКЕВІЧ Казімір Францавіч, н. у 1887 у в. Тарахаўка. Арыштаваны 9.2.1930. Рэабілітаваны 17.10.1991.

ЛАШКЕВІЧ Канстанцін Вітольдавіч, н. у 1884 у в. Востраў. Арыштаваны 29.9.1938. Рэабілітаваны 14.1.1958.

ЛАШКЕВІЧ Маргарыта Адамаўна, н. у 1879 у в. Сапажкі. Арыштавана 9.2.1930. Рэабілітавана 17.10.1991.

ЛАШКЕВІЧ Уладзімір Мацвеевіч, н. у 1890 у в. Кароцькі. Арыштаваны 1.9.1937. Рэабілітаваны 5.5.1989.

ЛАШКЕВІЧ Яфім Канстанцінавіч, н. у 1882 у в. Жабін. Арыштаваны 3.11.1937. Рэабілітаваны 16.7.1963.

ЛЕЎЧАНКА Сяргей Пятровіч, н. у 1909 у в. Міхалёўка. Арыштаваны 28.3.1931. Рэабілітаваны 24.10.1989.

ЛІБЕРМАН Гірша Хаймавіч, н. у 1876 у г.п. Карма. Арыштаваны 9.1.1938. Рэабілітаваны 5.9.1956.

ЛІПЯНКОВА Васіліса Паўлаўна, н. у 1892 у в. Акцяброва. Арыштавана 1.1.1946. Рэабілітавана 3.2.1993.

ЛОБАЎ Уладзімір Ермалаевіч, н. у 1888 у в. Навасёлкі. Арыштаваны 24.1.1942. Рэабілітаваны 11.12.1989.

ЛОСЕЎ Сямён Герасімавіч, н. у 1880 у в. Сырская Буда. Арыштаваны 23.10.1937. Рэабілітаваны 25.5.1959.

ЛУГОЎСКІ Мікалай Сямёнавіч, н. у 1874 у в. Рэвут. Арыштаваны 1.2.1935. Рэабілітаваны 20.2.1990.

ЛУКАШЭНКА Адам Усцінавіч, н. у 1907 у в. Бярозаўка. Арыштаваны 28.1.1933. Рэабілітаваны 14.8.1989.

ЛЫСЯНКОЎ Канстанцін Піліпавіч, н. у 1881 у в. Дубраўка. Арыштаваны 21.3.1930. Рэабілітаваны 31.7.1989.

ЛЮБУЦІН Іосіф Данілавіч, н. у 1914 у в. Аляксандраўка. Арыштаваны 14.11.1937. Рэабілітаваны 23.2.1993.

ЛЮБУЦІН Цімафей Макаравіч, н. у 1898 у в. Аляксандраўка. Арыштаваны 17.3.1933. Рэабілітаваны 25.10.1965.

ЛЯВОНЕНКА Павел Восіпавіч, н. у 1892 у в. Лужок. Арыштаваны 17.3.1933. Рэабілітаваны 25.10.1965.

ЛЯШНЕЎСКІ Ігнацій Трафімавіч, н. у 1892 у в. Васільеўка. Арыштаваны 21.10.1932. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ЛЯШЧЫНСКІ Віктар Мацвеевіч, н. у 1901 у в. Багданавічы. Арыштаваны 16.11.1937. Рэабілітаваны 19.7.1989.

ЛЯШЧЫНСКІ Фрол Лукашавіч, н. у 1880 у в. Багданавічы. Арыштаваны 29.2.1938. Рэабілітаваны 14.1.1958.

МАЕЎСКІ Іван Пятровіч, н. у 1926 у в. Высокае. Арыштаваны 8.6.1950. Рэабілітаваны 4.6.1955.

МАКАРАЎ Кузьма Гаўрылавіч, н. у 1890 у в. Хізаў. Арыштаваны 7.10.1944. Рэабілітаваны 26.12.1960.

МАЛЧАНАЎ Андрэй Герасімавіч, н. у 1886 у в. Струмень. Арыштаваны 30.11.1937. Рэабілітаваны 28.6.1989.

МАЛЧАНАЎ Тарас Герасімавіч, н. у 1891 у в. Струмень. Арыштаваны 9.1.1938. Рэабілітаваны 26.6.1989.

МАЛЮЧЭНКА Васіль Мікалаевіч, н. у 1912 у в. Акцяброва. Арыштаваны 2.6.1933. Рэабілітаваны 23.3.1989.

МАЛЮЧЭНКА Мікалай Мікітавіч, н. у 1887 у в. Быч. Арыштаваны 2.6.1933. Рэабілітаваны 23.3.1989.

МАРЧАНКА Мікалай Яфімавіч, н. у 1900 у в. Востраў. Арыштаваны 2.6.1933. Рэабілітаваны 23.3.1989.

МАРЧАНКА Сцяпан Яфімавіч, н. у 1901 у в. Востраў. Арыштаваны 28.2.1937. Рэабілітаваны 9.11.1964.

МАСКАЛЕНКА Навум Мікалаевіч, н. у 1903 у в. Багданавічы. Арыштаваны 3.11.1937 і 31.8.1949. Рэабілітаваны 16.7.1963.

МЕДЗВЯДЗЁЎ Іван Мініч, н. у 1887 у в. Пятравічы. Арыштаваны 21.2.1930. Рэабілітаваны 7.9.1989.

МЕДЗВЯДЗЁЎ Лявон Антонавіч, н. у 1900 у в. Пятравічы. Арыштаваны 11.1.1933. Рэабілітаваны 31.11.1989.

МЕДЗВЯДЗЁЎ Піліп Рыгоравіч, н. у 1882 у в. Пятравічы. Арыштаваны 23.7.1932. Рэабілітаваны 9.10.1989.

МІРОНЕНКА Аляксандр Іванавіч, н. у 1884 у в. Мікалаеўка. Арыштаваны 8.2.1933. Рэабілітаваны 31.7.1989.

МІРОНЕНКА Аляксей Рыгоравіч, н. у 1884 у в. Акцяброва. Арыштаваны 22.10.1937. Рэабілітаваны 22.3.1989.

МІРОНЕНКА Аляксей Рыгоравіч, н. у 1884 у в. Быч. Арыштаваны 2.6.1933. Рэабілітаваны 23.3.1989.

МІРОНЕНКА Елісей Сцяпанавіч, н. у 1885 у в. Курганне. Арыштаваны 25.8.1945. Рэабілітаваны 23.12.1960.

МІРОНЕНКА Іван Міронавіч, н. у 1910 у в. Быч. Арыштаваны 2.6.1933. Рэабілітаваны 23.3.1989.

МІРОНЕНКА Мікалай Андрэевіч, н. у 1904 у в. Мікалаеўка. Арыштаваны 7.7.1938. Рэабілітаваны 7.1.1965.

МІРОШКІН Іосіф Сцяпанавіч, н. у 1901 у в. Быч. Арыштаваны 2.6.1933. Рэабілітаваны 23.3.1989.

МІТКЕВІЧ Гаўрыіл Леанардавіч, н. у 1873 у в. Багданавічы. Арыштаваны 9.2.1930. Рэабілітаваны 17.10.1991.

МІТКЕВІЧ Станіслаў Гаўрылавіч, н. у 1907 у в. Багданавічы. Арыштаваны 9.2.1930. Рэабілітаваны 17.10.1991.

МІХАЙЛАЎ Міхаіл Емяльянавіч, н. у 1889 у в. Кучын. Арыштаваны 16.2.1931. Рэабілітаваны 26.6.1990.

МІХАЙЛОЎСКІ Аляксандр Міхайлавіч, н. у 1896 у в. Лужок. Арыштаваны 17.3.1933. Рэабілітаваны 25.10.1965.

МІШАКОЎ Пётр Ільіч, н. у 1894 у в. Пасека-Слабодка. Арыштаваны 3.11.1937. Рэабілітаваны 16.7.1963.

МЯЖЭННЫ Рыгор Кузьміч, н. у 1889 у в. Кучын. Арыштаваны 16.2.1931. Рэабілітаваны 26.6.1990.

МЯЖЭННЫ Рыгор Кузьміч, н. у 1890 у в. Салабута. Арыштаваны 16.2.1938. Рэабілітаваны 6.2.1961.

НАВОЕНКА Іван Захаравіч, н. у 1909 у в. Норкаўшчына. Арыштаваны 22.2.1933. Рэабілітаваны 8.4.1938.

НАВУМЕНКА Раман Якаўлевіч, н. у 1872 у в. Хізаў. Арыштаваны 9.1.1938. Рэабілітаваны 24.10.1989.

НАВУМЕНКА Савелій Раманавіч, н. у 1923 у в. Хізаў. Арыштаваны 25.2.1934. Рэабілітаваны 23.9.1960.

НЕСЦЯРОВІЧ Васіль Андрэевіч, н. у 1923 у в. Енцы. Арыштаваны 8.6.1949. Рэабілітаваны 10.12.1957.

НЕСЦЯРОВІЧ Усцін Фёдаравіч, н. у 1879 у в. Ворнаўка. Арыштаваны 3.11.1938. Рэабілітаваны 15.5.1990.

НЕСЦЯРЭНКА Сілівей Мацвеевіч, н. у 1900 у в. Быч. Арыштаваны 16.2.1938. Рэабілітаваны 29.4.1969.

НЕЎМЯРЖЫЦКІ Аляксандр Андрэевіч, н. у 1907 у в. Стараград. Арыштаваны 11.1.1931. Рэабілітаваны 31.1.1962.

НЕЎМЯРЖЫЦКІ Ілья Аляксандравіч, н. у 1872 у в. Стараград (х. Шэя). Арыштаваны 26.4.1930. Рэабілітаваны 20.9.1989.

НЕЎМЯРЖЫЦКІ Рыгор Рыгоравіч, н. у 1892 у в. Стараград (х. Шэя). Арыштаваны 19.12.1933. і 10.13.1949. Рэабілітаваны 27.11.1956.

НОВІКАЎ Леанід Паўлавіч, н. у 1926 у в. Праўда. Арыштаваны 7.1.1950. Рэабілітаваны 7.10.1955.

НОВІКАЎ Павел Сысоевіч, н. у 1886 у в. Навасёлкі. Арыштаваны 29.9.1938. Рэабілітаваны 14.1.1958.

ПАГРАБЕНКА Андрэй Сяргеевіч, н. у 1904 у в. Каменка. Арыштаваны 29.9.1937. Рэабілітаваны 30.10.1991.

ПАДЗЯРОЎ Павел Кандратавіч, н. у 1916 у в. Новая Зенькавіна. Арыштаваны 28.7.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ПАДЗЯРЭНКА Захар Макаравіч, н. у 1887 у в. Шаламеі. Арыштаваны 7.7.1938. Рэабілітаваны 21.1.1991.

ПАЛАВІНКІН Антон Дзмітрыевіч. Арыштаваны 9.1.1938. Рэабілітаваны 7.8.1959.

ПАЛАЎКОЎ Ульян Іларыёнавіч, н. у 1878 у в. Ліцвінавічы. Арыштаваны 16.2.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ПАЛІЦЫН Мікалай Нічыпаравіч, н. у 1900 у в. Кляпін. Арыштаваны 9.3.1930 і 10.9.1938. Рэабілітаваны 19.7.1989.

ПАЛЯКОЎ Малах Іванавіч, н. у 1877 у в. Бярозаўка. Арыштаваны 21.3.1930. Рэабілітаваны 27.9.1989.

ПАНЮШЭНКА Антон Раманавіч, н. у 1884 у в. Задуб'е. Арыштаваны 29.9.1938. Рэабілітаваны 14.1.1958.

ПАНЮШЭНКА Іван Трафімавіч, н. у 1885 у в. Задуб'е. Арыштаваны 23.7.1932. Рэабілітаваны 9.10.1989.

ПАПЛАЎСКІ Пётр Сцяпанавіч, н. у 1904 у в. Ворнаўка. Арыштаваны 5.10.1937. Рэабілітаваны 7.6.1971.

ПАРХОМЕНКА Міхаіл Сцяпанавіч, н. у 1902 у в. Гарадок. Арыштаваны 16.4.1931. Рэабілітаваны 28.12.1989.

ПАРЫНАВА-ВІТАЛЬЕВА Анастасія Цярэнцьеўна, н. у 1918 у в. Барсукі. Арыштавана 12.4.1947. Рэабілітавана 2.2.1993.

ПАЦЁМКІН Васіль Сямёнавіч, н. у 1888 у в. Рэвут. Арыштаваны 30.10.1930. Рэабілітаваны 30.5.1960.

Кармянская цэнтральная раённая бібліятэка

ПЕТРАЧЭНКА Гаўрыіл Пятровіч, н. у 1884 у в. Бярозаўка. Арыштаваны 28.1.1933. Рэабілітаваны 14.8.1989.

ПЕТРАЧЭНКА Іван Пятровіч, н. у 1877 у в. Бярозаўка. Арыштаваны 28.8.1938. Рэабілітаваны 13.12.1989.

ПЕТРАЧЭНКА Патап Аляксеевіч, н. у 1880 у в. Бярозаўка. Арыштаваны 28.1.1933. Рэабілітаваны 14.8.1989.

ПЕТРАЧЭНКА Піліп Аксёнавіч, н. у 1880 у в. Кабылічы. Арыштаваны 29.9.1938. Рэабілітаваны 14.1.1958.

ПІНЦЭВІЧ Пётр Міхайлавіч, н. у 1905 у в. Лядцы. Арыштаваны 27.12.1938. Рэабілітаваны 8.9.1989.

ПРАКАПЕНКА Іван Васілевіч, н. у 1898 у в. Кляпін. Арыштаваны 25.1.1933. Рэабілітаваны 27.7.1989.

ПРАКАПЕНКА Марцін Іванавіч, н. у 1872 у в. Кляпін. Арыштаваны 21.3.1930 і 17.9.1937. Рэабілітаваны 11.5.1989.

ПРЫВАЛАЎ Іосіф Фёдаравіч, н. у 1890 у в. Салабута. Арыштаваны 16.2.1938. Рэабілітаваны 6.2.1961.

ПРЫВАЛАЎ Міхаіл Фядосавіч, н. у 1888 у в. Салабута. Арыштаваны 16.2.1938. Рэабілітаваны 6.2.1961.

ПРЫТЫЧАНКА Сямён Фёдаравіч, н. у 1874 у в. Ст. Зенькавіна. Арыштаваны 28.3.1939. Рэабілітаваны 19.11.1991.

ПТАШКІН Емяльян Кандратавіч, н. у 1902 у в. Навасёлкі. Арыштаваны 25.2.1934. Рэабілітаваны 23.9.1960.

ПЯТРОЎ Гаўрыіл Якаўлевіч, н. у 1920 у в. Бель. Арыштаваны 7.8.1944. Рэабілітаваны 14.5.1974.

РУСЕЦКІ Іван Сцяпанавіч, н. у 1872 у в. Багданавічы. Арыштаваны 30.10.1937. Рэабілітаваны 6.6.1989.

РЫЖАНКОЎ Іван Іванавіч, н. у 1893 у в. Бярозаўка. Арыштаваны 25.2.1934. Рэабілітаваны 23.9.1960.

РЫЖАНКОЎ Міхей Піліпавіч, н. у 1892 у в. Лужок. Арыштаваны 17.3.1933. Рэабілітаваны 25.10.1965.

РЫЖАНКОЎ Сямён Усцінавіч, н. у 1902 у в. Бярозаўка. Арыштаваны 23.10.1937 і 15.8.1949. Рэабілітаваны 17.4.1959.

РЫЖАНКОЎ Якаў Усцінавіч, н. у 1910 у в. Бярозаўка. Арыштаваны 23.10.1937 і 7.9.1949. Рэабілітаваны 17.9.1949.

САЗОНАЎ Іван Сільвестравіч, н. у 1869 у в. Бераставец. Арыштаваны 3.3.1930. Рэабілітаваны 27.11.1989.

САПЕГА Максім Аляксеевіч, н. у 1917 у в. Валынцы. Арыштаваны 21.7.1942. Рэабілітаваны 24.4.1969.

САСНОЎСКІ Аляксей Сямёнавіч, н. у 1903 у в. Кароцькі. Арыштаваны 5.10.1937. Рэабілітаваны 19.10.1989.

САСНОЎСКІ Захар Васілевіч, н. у 1894 у в. Кароцькі. Арыштаваны 2.6.1933. Рэабілітаваны 23.3.1989.

САСНОЎСКІ Міхаіл Сямёнавіч, н. у 1898 у в. Кароцькі. Арыштаваны 2.7.1933. Рэабілітаваны 23.3.1989.

САЎЧАНКА Павел Сафонавіч, н. у 1895 у в. Дубраўка. Арыштаваны 9.3.1938. Рэабілітаваны 7.9.1989.

СЕЛЯЗНЁЎ Іван Лукіч, н. у 1891 у в. Гарадок. Арыштаваны 26.7.1931. Рэабілітаваны 16.1.1989.

СЕЛЯЗНЁЎ Карп Сямёнавіч, н. у 1890 у в. Аляксандраўка Струменскага с/с. Арыштаваны 21.10.1932. Рэабілітаваны 16.1.1989.

СЕЛЯЗНЁЎ Лука Пятровіч, н. у 1866 у в. Гарадок. Арыштаваны 19.4.1931. Рэабілітаваны 11.11.1989.

СЕЛЯЗНЁЎ Сазон Ігнатавіч, н. у 1862 у в. Аляксандраўка Струменскага с/с. Арыштаваны 22.11.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

СЕЛЯЗНЁЎ Сазон Ігнатавіч, н. у 1862 у в. Сырск.

СЕМІЛЕТАЎ Мікалай Фаміч, н. у 1899 у в. Вынашаўка. Арыштаваны 14.11.1938. Рэабілітаваны 28.6.1958.

СІМАНЕНКА Фёдар Лаўрэнцьевіч, н. у 1910 у в. Рэвут. Арыштаваны 25.7.1935. Рэабілітаваны 8.8.1990.

СІМКІН Максім Рыгоравіч, н. у 1902 у г.п. Карма. Арыштаваны 27.6.1942. Рэабілітаваны 26.3.1943.

СІНІГАЕЎ Аляксей Уладзіміравіч, н. у 1922 у в. Ворнаўка. Арыштаваны 6.9.1949. Рэабілітаваны 26.6.1990.

СІНІЧЭНКА Пётр Рыгоравіч, н. у 1888 у в. Алешня (Кучын). Арыштаваны 25.2.1934. Рэабілітаваны 22.3.1989.

СІНЮТ Іван Еўдакімавіч, н. у 1894 у в. Рэвут. Арыштаваны 15.6.1938. Рэабілітаваны 24.11.1955.

СМАРЧАНКА Рыгор Архіпавіч, н. у 1899 у в. Бярозаўка. Арыштаваны 1.9.1937. Рэабілітаваны 5.5.1989.

СМАРЧАНКА Рыгор Архіпавіч, н. у 1899 у в. Бярозаўка. Арыштаваны 23.10.1937. Рэабілітаваны 7.9.1949.

СОКАЛАЎ Васіль Ігнатавіч, н. у 1903 у в. Кучын. Арыштаваны 14.2.1931. Рэабілітаваны 26.6.1990.

СТАЛБОЎ Якаў Пятровіч, н. у 1899 у в. Ліцвінавічы. Арыштаваны 18.10.1937. Рэабілітаваны 14.3.1960.

СТАРАВОЙТАЎ Павел Канстанцінавіч, н. у 1886 у в. Паштовая Глінка. Арыштаваны 16.7.1945. Рэабілітаваны 22.6.1966.

СТАСЯНКОЎ Васіль Георгіевіч, н. у 1922 у в. Лебядзёўка. Арыштаваны 6.1.1946. Рэабілітаваны 15.5.1956.

СТРУКАВА Мар'яна Іванаўна, н. у 1890 у в. Гарадок. Арыштавана 9.3.1930. Рэабілітавана 11.12.1992.

СТРУКАЎ Мікіта Савельевіч, н. у 1863 у в. Гарадок. Арыштаваны 9.3.1930. Рэабілітаваны 1.12.1989.

СТУКАЧ Іван Якаўлевіч, н. у 1908 у в. Аляксандраўка. Арыштаваны 17.4.1933. Рэабілітаваны 15.7.1957.

СТУКАЧ Павел Якаўлевіч, н. у 1905 у в. Аляксандраўка. Арыштаваны 17.4.1933. Рэабілітаваны 16.7.1957.

СУПІЧЭНКА Андрэй Ягоравіч, н. у 1900 у в. Лужок. Арыштаваны 17.3.1933. Рэабілітаваны 25.10.1965.

СУПІЧЭНКА Афанасій Сцяпанавіч, н. у 1891 у в. Лужок. Арыштаваны 9.3.1930. Рэабілітаваны 13.10.1989.

СУПІЧЭНКА Сцяпан Фаміч, н. у 1900 у в. Лужок. Арыштаваны 17.3.1933. Рэабілітаваны 25.10.1965.

СУПІЧЭНКА Сямён Сяргеевіч, н. у 1907 у в. Лужок. Арыштаваны 3.11.1937. Рэабілітаваны 12.7.1989.

СУПІЧЭНКА Сяргей Нічыпаравіч, н. у 1875 у в. Лужок. Арыштаваны 9.3.1930. Рэабілітаваны 13.10.1989.

СУСАЎ Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1872 у в. Сырск. Арыштаваны 30.12.1937. Рэабілітаваны 12.6.1989.

СЦЕПАНЕНКА Максім Кірылавіч, н. у 1884 у в. Кабылічы. Арыштаваны 4.11.1938. Рэабілітаваны 14.5.1990.

СЦЕПАНЕНКА Савелій Кірылавіч, н. у 1877 у в. Кабылічы. Арыштаваны 14.4.1939. Рэабілітаваны 20.11.1989.

СЦЯПАНАЎ Аўрам Нічыпаравіч, н. у 1882 у в. Кучын. Арыштаваны 16.2.1931. Рэабілітаваны 26.6.1990.

СЯЛІЦКІ Арцём Самуілавіч, н. у 1888 у в. Струмень. Арыштаваны 21.3.1930. Рэабілітаваны 17.7.1962.

СЯЛІЦКІ Рыгор Сямёнавіч, н. у 1898 у в. Дубраўка. Арыштаваны 30.11.1937. Рэабілітаваны 30.3.1960.

СЯЛІЦКІ Сямён Іванавіч, н. у 1865 у в. Струмень. Арыштаваны 23.10.1937. Рэабілітаваны 9.6.1989.

СЯЛОВІЧ Фёдар Самсонавіч, н. у 1881 у в. Махнавічы (Ліцвінавічы). Арыштаваны 28.2.1930. Рэабілітаваны 16.1.1989.

СЯРГЕЕНКА Восіп Дзмітрыевіч, н. у 1892 у в. Пасека-Слабодка. Арыштаваны 3.11.1937 і 31.8.1949. Рэабілітаваны 16.7.1963.

СЯРГЕЕНКА Фёдар Макаравіч, н. у 1882 у в. Ст. Зенькавіна. Арыштаваны 31.5.1939. Рэабілітаваны 29.6.1990.

ТАМАШКОЎ Кузьма Ігнатавіч, н. у 1887 у в. Быч. Арыштаваны 2.7.1933. Рэабілітаваны 23.3.1989.

ТАХАЛЕНКА Усцін Лукіч, н. у 1884 у в. Быч. Арыштаваны 29.3.1938. Рэабілітаваны 19.9.1991.

УСЦІНОВІЧ Васіль Майсеевіч, н. у 1882 у в. Енцы. Арыштаваны 3.6.1944. Рэабілітаваны 24.12.1965.

УСЦІНОВІЧ Віктар Паўлавіч, н. у 1911 у в. Бялёў. Арыштаваны 9.2.1930. Рэабілітаваны 17.10.1991.

УСЦІНОВІЧ Леанід Паўлавіч, н. у 1913 у в. Бялёў. Арыштаваны 9.2.1930. Рэабілітаваны 17.10.1991.

УСЦІНОВІЧ Марыя Ігнатаўна, н. у 1884 у в. Востраў. Арыштавана 9.2.1930. Рэабілітавана 17.10.1991.

УСЦІНОВІЧ Напалеон Аляксандравіч, н. у 1908 у в. Бялёў. Арыштаваны 9.2.1930. Рэабілітаваны 17.10.1991.

ФІЛІПЧАНКА Фадзей Ульянавіч, н. у 1905 у в. Норкаўшчына. Арыштаваны 22.2.1933. Рэабілітаваны 8.4.1988.

ХАДАНОВІЧ Аляксандр Уладзіміравіч, н. у 1898 у в. Струмень. Арыштаваны 12.2.1933. Рэабілітаваны 27.9.1989.

ХАДАНОВІЧ Дзмітрый Якаўлевіч, н. у 1889 у в. Курганіца. Арыштаваны 12.2.1933. Рэабілітаваны 14.9.1989.

ХАДАНОВІЧ Дзямід Мікалаевіч, н. у 1894 у в. Струмень. Арыштаваны 12.2.1933. Рэабілітаваны 11.10.1989.

ХАДАНОВІЧ Дзяніс Андрэевіч, н. у 1877 у в. Струмень. Арыштаваны 21.10.1932. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ХАДАНОВІЧ Захар Уладзіміравіч, н. у 1896 у в. Курганіца. Арыштаваны 12.2.1933. Рэабілітаваны 14.9.1989.

ХАДАНОВІЧ Іван Захаравіч, н. у 1905 у в. Лазовіца. Арыштаваны 30.11.1937. Рэабілітаваны 30.9.1960.

ХАДАНОВІЧ Ісак Пятровіч, н. у 1887 у в. Восаў. Арыштаваны 21.10.1933. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ХАДАНОВІЧ Мікалай Герасімавіч, н. у 1926 у в. Восаў. Арыштаваны 8.1.1949. Рэабілітаваны 31.3.1955.

ХАДАНОВІЧ Мікалай Рыгоравіч, н. у 1891 у в. Струмень. Арыштаваны 12.2.1933. Рэабілітаваны 14.9.1989.

ХАДАНОВІЧ Міхаіл Венядзіктавіч, н. у 1873 у в. Багданавічы. Арыштаваны 7.2.1933. Рэабілітаваны 25.8.1989.

ХАДАНОВІЧ Павел Антонавіч, н. у 1887 у в. Струмень. Арыштаваны 11.5.1932. Рэабілітаваны 11.9.1989.

ХАДАНОВІЧ Пётр Фёдаравіч, н. у 1918 у в. Струмень. Арыштаваны 21.4.1945. Рэабілітаваны 12.7.1990.

ХАДАНОВІЧ Рыгор Фёдаравіч, н. у 1898 у в. Кароцькі. Арыштаваны 13.3.1936. Рэабілітаваны 26.6.1990.

ХАМУТОЎСКІ Сцяпан Майсеевіч, н. у 1901 у г.п. Карма. Арыштаваны 25.12.1931. Рэабілітаваны 11.10.1989.

Кормянская центральная районная библиотека

ХАРЫТОНЕНКА Ягор Васілевіч, н. у 1892 у в. Лабыроўка. Арыштаваны 20.1.1945. Рэабілітаваны 9.8.1961.

ХОЛАПАЎ Фядос Сафронавіч, н. у 1899 у в. Жавуніца. Арыштаваны 8.2.1933. Рэабілітаваны 12.11.1990.

ХРАМЯНКОЎ Карп Раманавіч, н. у 1899 у в. Лебядзёўка. Арыштаваны 28.1.1933. Рэабілітаваны 14.8.1989.

ЦАДАЎ Якаў Фёдаравіч, н. у 1878 у в. Бераставец. Арыштаваны 14.2.1938. Рэабілітаваны 30.7.1990.

ЧАБАТКОЎ Даніла Трафімавіч, н. у 1904 у в. Кляпінская Буда. Арыштаваны 3.6.1949. Рэабілітаваны 16.6.1966.

ЧАБАТКОЎ Лукаш Рыгоравіч, н. у 1880 у в. Кляпінская Буда. Арыштаваны 8.2.1933. Рэабілітаваны 19.7.1989.

ЧУГУТАВА Хрысціна Ягораўна, н. у 1918 у в. Вашчанкі. Арыштавана 4.7.1945. Рэабілітавана 3.12.1992.

ЧУМАКОЎ Іван Мікалаевіч, н. у 1865 у в. Куракаўшчына. Арыштаваны 9.3.1930. Рэабілітаваны 10.11.1989.

ЧУМАКОЎ Міхаіл Іванавіч, н. у 1886 у в. Куракаўшчына. Арыштаваны 9.3.1930. Рэабілітаваны 10.11.1989.

ЧУМАКОЎ Фёдар Мікалаевіч, н. у 1875 у в. Куракаўшчына. Арыштаваны 9.3.1930. Рэабілітаваны 10.11.1989.

ШАПАВАЛАЎ Іван Елісеевіч, н. у 1887 у в. Навасёлкі. Арыштаваны 10.4.1930. Рэабілітаваны 24.10.1989.

ШАТЛІКАЎ Васіль Ісакавіч, н. у 1899 у в. Ліцвінавічы. Арыштаваны 30.10.1937. Рэабілітаваны 15.9.1947.

ШАЎЧЭНКА Кірыл Пятровіч, н. у 1868 у в. Хізаў. Арыштаваны 6.3.1930. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ШВЕДАЎ Каліна Нічыпаравіч, н. у 1889 у в. Лебядзёўка. Арыштаваны 28.1.1933. Рэабілітаваны 14.8.1989.

ШКЛЯР Мікалай Трафімавіч, н. у 1925 у в. Тарахаўка. Арыштаваны 3.1.1946. Рэабілітаваны 27.4.1955.

ШПАКАЎ Рыгор Іванавіч, н. у 1888 у в. Кучын. Арыштаваны 2.6.1933. Рэабілітаваны 23.3.1989.

ШПАЛЯНКОЎ Кузьма Сямёнавіч, н. у 1879 у в. Струмень. Арыштаваны 18.10.1937. Рэабілітаваны 30.7.1989.

ШУТАЎ Яўсей Самуілавіч, н. у 1902 у в. Быч. Арыштаваны 3.1.1946 і 27.4.1955. Рэабілітаваны 21.7.1976.

ШЫНКЕВІЧ Адам Рыгоравіч, н. у 1888 у в. Багданавічы. Арыштаваны 7.2.1933. Рэабілітаваны 25.8.1989.

ШЫПІНСКІ Андрэй Лявонавіч, н. у 1882 у в. Лазовіца. Арыштаваны 30.11.1937. Рэабілітаваны 30.9.1960.

ШЫПІНСКІ Апанас Уладзіміравіч, н. у 1910 у в. Лазовіца. Арыштаваны 23.10.1937. Рэабілітаваны 22.6.1980.

ШЫПІНСКІ Васіль Уладзіміравіч, н. у 1906 у в. Лазовіца. Арыштаваны 12.8.1930. Рэабілітаваны 9.12.1989.

ШЫПІНСКІ Іван Андрэевіч, н. у 1911 у в. Лазовіца. Арыштаваны 30.11.1937. Рэабілітаваны 30.9.1960.

ШЫПІНСКІ Іван Іванавіч, н. у 1877 у в. Струмень. Арыштаваны 21.10.1932. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ШЫПІНСКІ Іван Уладзіміравіч, н. у 1903 у в. Лазовіца. Арыштаваны 21.3.1930. Рэабілітаваны 17.7.1962.

ШЫПІНСКІ Пётр Іванавіч, н. у 1902 у в. Восаў. Арыштаваны 21.10.1932. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ШЫПІНСКІ Піліп Уладзіміравіч, н. у 1896 у в. Восаў. Арыштаваны 21.3.1930. Рэабілітаваны 17.7.1962.

ШЫПІНСКІ Томаш Нікадзімавіч, н. у 1888 у в. Лазовіца. Арыштаваны 21.3.1930. Рэабілітаваны 17.7.1962.

ШЫПІНСКІ Уладзімір Лявонавіч, н. у 1874 у в. Лазовіца. Арыштаваны 21.3.1930. Рэабілітаваны 17.7.1962.

ШЫПІНСКІ Фёдар Уладзіміравіч, н. у 1908 у в. Лазовіца. Арыштаваны 12.8.1930. Рэабілітаваны 9.12.1992.

ШЫПІНСКІ Ягор Канстанцінавіч, н. у 1907 у в. Лазовіца. Арыштаваны 30.11.1937. Рэабілітаваны 30.9.1960.

ЯКАВЕНКА Рыгор Яўграфавіч, н. у 1898 у в. Быч. Арыштаваны 2.6.1933. Рэабілітаваны 23.3.1989.

ЯКУТОВІЧ Васіль Ульянавіч, н. у 1891 у в. Ворнаўка. Арыштаваны 16.2.1933. Рэабілітаваны 23.1.1989.

ЯКУТОВІЧ Кузьма Рыгоравіч, н. у 1906 у в. Калюды. Арыштаваны 21.3.1930. Рэабілітаваны 31.7.1989.

ЯКУТОВІЧ Лука Рыгоравіч, н. у 1906 у в. Калюды. Арыштаваны 23.3.1930. Рэабілітаваны 31.7.1989.

ЯКУТОВІЧ Лявон Дзямідавіч, н. у 1887 у в. Лядцы. Арыштаваны 16.2.1933. Рэабілітаваны 23.1.1989.

ЯКУТОВІЧ Рыгор Захаравіч, н. у 1860 у в. Калюды. Арыштаваны 23.3.1930. Рэабілітаваны 31.12.1989.

ЯКУТОВІЧ Сцяпан Якаўлевіч, н. у 1883 у в. Ворнаўка. Арыштаваны 16.2.1933. Рэабілітаваны 23.1.1989.

ЯКУТОВІЧ Сямён Рыгоравіч, н. у 1902 у в. Калюды. Арыштаваны 21.3.1930. Рэабілітаваны 31.7.1989.

ЯКУШЭЎСКІ Іван Іванавіч, н. у 1891 у в. Сырская Буда. Арыштаваны 1.9.1937. Рэабілітаваны 4.2.1963.

Кармянская цэнтральная раённая бібліятэка

1941

1945

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

На рубяжы жыцця і смерці

На досвітку ў трывожны дзень 22 чэрвеня 1941 г. фашысцкая Германія, вераломна парушыўшы дагавор аб ненападзе, пачала вайну супраць СССР.

Непасрэдна на Беларусь наступалі войскі групы армій "Цэнтр". У яе склад уваходзілі дзве арміі (4-ая і 9-ая) і дзве танкавыя групы (2-ая і 3-яя) — усяго 50 поўна ўкамплектаваных дывізій (у тым ліку 9 танкавых, 6 матарызаваных і 1 кавалерыйская) і дзве брыгады. Групу армій падтрымліваў 2-гі паветраны флот — самы моцны ў нацысцкай арміі (1670 баявых самалётаў). Акрамя таго, ёй было перададзена больш за трэць усіх інжынерных і дарожна-будаўнічых войск і каля палавіны асобных артылерыйскіх, зенітных і супрацьтанкавых дывізіёнаў і батарэй рэзерву сухапутных сіл Германіі. Уся гэтая армада навалілася на пагранічныя атрады, 3-юю, 10-ую і 4-ую савецкія арміі, што знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі, нанесла ім цяжкія страты.

Жыхары раёна мужна сустрэлі цяжкую вестку аб пачатку вайны. Адразу ж быў скліканы раённы актыў, на якім абмеркавалі неадкладныя меры па пераводзе мірнага жыцця на ваенны лад. Патрэбна было правесці мабілізацыю мужчын прызыўнога ўзросту, вывесці калгасную жывёлу, тэхніку на ўсход, эвакуіраваць архівы. Жыхарам выдавалася ў краме ўсё, што там было, каб не засталося гітлераўцам. Прадумваліся спісы тых, хто павінен быў застацца на акупіраванай тэрыторыі для арганізацыі падпольнай і партызанскай барацьбы. У калгасах і буйных населеных пунктах праходзілі мітынгі і сходы, на якіх жыхары раёна з гневам і абурэннем успрынялі вестку аб вераломным нападзе гітлераўскай Германіі, заяўлялі аб сваёй рашучасці са зброяй у руках абараняць Радзіму.

Выконваючы дырэктывы ЦК КП(б) партыйным органам аб падрыхтоўцы да пераходу на падпольную работу партарганізацый раёнаў, што знаходзіліся пад пагрозай фашысцкай акупацыі, ад 30 чэрвеня 1941 г. і дырэктывы ЦК КП(б)Б партыйным, савецкім і камсамольскім арганізацыям аб разгортванні партызанскай вайны ў тыле ворага ад 1 ліпеня 1941 г., у калгасах і саўгасах, на прадпрыемствах, у шматлікіх арганізацыях ствараліся атрады народнага апалчэння, знішчальныя батальёны, групы самаабароны.

У другой палове ліпеня 1941 г. у Карму прыязджаў сакратар абласнога камітэта партыі І. П. Кожар. Ён унёс змяненні ў план арганізацыйна-палітычных мерапрыемстваў, пракантраляваў ход фарміраван-

ня камуністычнага падполля, падбор людзей у партызанскія атрады.

У раёне з добраахвотнікаў стварылі знішчальны батальён, у які ўвайшло 193 чалавекі. Камандаваў атрадам рэдактар раённай газеты Мікалай Казіміравіч Ждановіч, начальнікам штаба быў абраны былы супрацоўнік аддзела па нарыхтоўцы зерня Сяргей Сямёнавіч Дудалеў.

Для ўзбраення байцоў батальёна было выдзелена 120 вінтовак, 1 ручны кулямёт, 50 гранат, 5000 патронаў (НАРБ. Ф. 4. Воп. 29. Спр. 3. Л. 27а).

Вялася ў раёне работа па эвакуацыі на ўсход дзяржаўнай маёмасці. Да 21 ліпеня 1941 г. на ўсход было накіравана 4500 галоў буйной рагатай жывёлы, 1500 свіней, 3500 авечак, з Кармянскай МТС — 12 трактароў і 2 камбайны.

Па калгасах і саўгасах ішла ўборка ўраджаю. Каб не трапіла збожжа новага ўраджаю ворагу, Гомельскі абком партыі абавязаў партыйныя і гаспадарчыя органы раёнаў вобласці знішчыць яго ці падзяліць паміж калгаснікамі. Па Кармянскаму раёну знішчэнню падлягала зерне з 10 475 га, бульбы — з 3872 га, тэхнічных культур — з 2382 га. Паміж калгаснікамі планавалася падзяліць зерне з 1243 га, бульбы — з 1658 га (НАРБ. Ф. 4. Воп. 29. Спр. 3. Л. 195).

Для работы ў тыле ворага пакідалася частка партыйнай арганізацыі. З 30 камуністаў была сфарміравана група падпольнага райкома партыі. У яе ўвайшлі М. С. Бруёк, І. А. Асташонак — сакратары райкома, А. В. Кузьмянкоў — сакратар райвыканкома, Н. С. Гаварушкін — дырэктар Кармянскай МТС, А. Д. Вярэніч — старшыня райспажыўтаварыства, М. К. Ждановіч — рэдактар раённай газеты, К. М. Драздоў — загадчык ваеннага аддзела райкома, А. І. Ушаў — дырэктар ільнозавода, Ф. С. Сяліцкі — загадчык ашчадкасы, Р. Ф. Коршыкаў — старшыня Задубскага сельскага Савета, С. В. Лявоненка — да вайны працаваў у Заходняй Беларусі, З. Р. Шпіцар — дырэктар прамарцелі, П. А. Паліцын — дырэктар кляпінскага млына, Е. В. Паліцына — настаўніца, Е. Г. Астапенка — дырэктар спіртзавода, М. Ц. Рыцікаў — сакратар РК ЛКСМБ, С. С. Дудалеў — супрацоўнік канторы па нарыхтоўцы зерня, І. П. Калякін — супрацоўнік НКУС, І. П. Караткевіч — упаўнаважаны па нарыхтоўках, К. П. Маўчанаў — старшыня Струменскага сельсавета, М. Ф. Марозаў — старшыня Хляўнянскага сельскага Савета, І. П. Давыдкоў — старшыня Ліцвінавіцкага сельскага Савета, Лагераў — намеснік старшыні Буда-Кашалёўскага райвыканкома, А. Ф. Шапшын — дырэктар Багданавіцкай МТС, І. І. Пракапенка — інструктар РК КПБ, А. В. Агееў — дырэктар Кляпінскага лесазавода, А. Ф. Кажамякін — настаўнік, І. Е. Хадановіч — супрацоўнік райваенкамата, І. Я. Балоткін — жыхар вёскі Ліцвінавічы.

Для вядзення падпольнай работы і ўкаранення ў нямецкія акупацыйныя органы былі прызначаны А. І. Сцяпура, М. А. Лешчанка, Н. А. Сычкоў, С. М. Хадановіч, С. Д. Лавянецкі, К. М. Антоненка, П. А. Паліцын, А. С. Сапега, А. К. Антоненка, Д. С. Мікалаеў, Ф. Д. Цярэшчанка, К. Ф. Еўдакіменка, І. Я. Балоткін і іншыя.

Райком партыі падабраў сувязнымі Ганну Мікалаеўну Абатураву і Таццяну Іванаўну Абатураву (абедзве з вёскі Бель), Лідзію Аляксандраўну Арцем'еву і Валянціну Аркадзьеўну Арцем'еву з Кармы, Наталлю Сцяпанаўну Ушаву і Івана Сцяпанавіча Мажэйку з вёскі Дуброўка, Ксенію Якаўлеўну Хадановіч з вёскі Струмень, Юлію Васілеўну Пятрову з вёскі Новая Зенькавіна, Настассю Сямёнаўну Караткевіч і Марыю Сцяпанаўну Караткевіч з вёскі Кароцькі, Еўдакію Фёдараўну Самастроенка з пасёлка Бурны, Кузьму Фёдаравіча Еўдакіменку з вёскі Валынцы, Марка Арцёмавіча Лешчанку, Пятра Рыгоравіча Ганжурава і Наталлю Ісакаўну Цярэшчанка з вёскі Вынашаўка, Васіля Лявонавіча Агеенку, Панцеляймона Якаўлевіча Ціцянкова з вёскі Малянік, Марыю Васілеўну Караткевіч з вёскі Востраў, Іларыёна Міхайлавіча Хадановіча з вёскі Гарадок,

Еўдакію Мацвееўну Паліцыну з вёскі Кляпін.

Першымі явачнымі кватэрамі былі прызначаны хаты А. М. Абатуравай, Е. С. Мажэйка, К. Я. Хадановіч, М. Е. Савасцеевай.

Абласны камітэт зацвердзіў Карманскі падпольны райком партыі ў складзе: І. А. Асташонак, М. С. Бруёк, С. Р. Еўдачкоў.

А вораг тым часам рваўся на Гомель. Кравапралітныя абарончыя баі на заходнім напрамку ад Кармы не спыняліся ўсю сярэдзіну ліпеня і першую палову жніўня. Байцы і камандзіры Чырвонай Арміі змагаліся стойка і мужна, параненыя, як маглі, дапамагалі сваім таварышам, а мясцовае насельніцтва — салдатам. На перадавую прывозілі хлеб, малако, ваду, выводзілі з акружэння асобных салдат і цэлыя падраздзяленні. Нямецка-фашысцкія войскі, маючы істотную перавагу ў жывой сіле і тэхніцы, 12 жніўня 1941 г. прарвалі фронт абароны 13-ай арміі на р. Сож.

13 жніўня 1941 г. нямецка-фашысцкія войскі захапілі Бычанскі і Каменскі сельскія Саветы. У гэты ж дзень нямецкія самалёты бамбілі Карму. Райком і райвыканкам пакінулі райцэнтр, а 15 жніўня фашысты акупіравалі ўсю тэрыторыю раёна.

Па ўказанні райкома партыі ў вёску Труд Струменскага сельскага Савета 13 жніўня быў выведзены знішчальны батальён. Сюды ж прыбылі сакратары райкома М. С. Бруёк, І. А. Асташонак, іншыя кіраўнікі будучага падполля.

Напярэдадні акупацыі за Сажом былі створаны два склады з боепрыпасамі, медыкаментамі, прадуктамі харчавання. Кіравалі гэтай работай С. С. Дудалеў і К. М. Асташонак.

Дакументы сведчаць

З прамовы на радыё Старшыні Савета Народных Камісараў СССР В. М. Молатава аб нападзе гітлераўскай Германіі на Савецкі Саюз

22 чэрвеня 1941 г.

Граждане и гражданки Советского Союза!

Советское правительство и его глава тов. Сталин поручили мне сделать следующее заявление:

Сегодня в 4 часа утра, без предъявления каких-либо претензий к Советскому Союзу, без объявления войны, германские войска напали на наша страну, атаковали наши границы во многих местах и подвергли бомбежке со своих самолетов наши города — Житомир, Киев, Севастополь, Каунас и некоторые другие, причем убито и ранено более 200 человек. Налеты вражеских самолетов и артиллерийский обстрел были совершены также с румынской и финляндской территории.

Это неслыханное нападение на нашу страну является беспримерным в истории цивилизованных народов вероломством. Нападение на нашу страну произведено, несмотря на то что между СССР и Германией заключен договор о ненападении и советское правительство со всей добросовестностью выполняло все условия этого договора. Нападение на нашу страну совершено, несмотря на то что за все время действия этого договора германское правительство ни разу не могло предъявить ни одной претензии к СССР по выполнению договора. Вся ответственность за это разбойничье нападение на Советский Союз целиком и полностью падает на германских фашистских правителей.

Уже после совершившегося нападения германский посол в Москве Шуленбург в 5 часов 30 минут утра сделал мне, как Народному Комиссару Иностранных Дел, заявление от имени своего правительства о том, что германское правительство решило выступить с войной против СССР в связи с сосредоточением частей Красной Армии у восточной германской границы.

В ответ на это мною от имени советского правительства было заявлено, что до последней минуты германское правительство не предъявляло никаких претензий к советскому правительству, что Германия совершила нападение на СССР, несмотря на миролюбивую позицию Советского Союза, и что тем самым фашистская Германия является нападающей стороной.

По поручению правительства Советского Союза я должен также заявить, что ни в одном пункте наши войска и наша авиация не допустили нарушения границы, и потому сделанное сегодня утром заявление румынского радио, что якобы советская авиация обстреляла румынские аэродромы, является сплошной ложью и провокацией. Такой же ложью и провокацией является вся сегодняшняя декларация Гитлера, пытающегося задним числом состряпать обвинительный материал насчет несоблюдения Советским Союзом советско-германского пакта.

Теперь, когда нападение на Советский Союз уже совершилось, советским правительством дан нашим войскам приказ — отбить разбойничье нападение и изгнать германские войска с территории нашей Родины.

Эта война навязана нам не германским народом, не германскими рабочими, крестьянами и интеллигенцией, страдания которых мы хорошо понимаем, а кликой кровожадных фашистских правителей Германии, поработивших французов, чехов, поляков, сербов, Норвегию, Бельгию, Данию, Голландию, Грецию и другие народы...

Правительство призывает вас, граждане и гражданки Советского Союза, еще теснее сплотить свои ряды вокруг нашей славной большевистской партии, вокруг нашего великого вождя тов. Сталина.

Наше дело правое. Враг будет разбит. Победа будет за нами.

Друкуецца паводле кн.: Германія — СССР. Вільнюс, 1989. С. 24—25.

З пратакола № 69 пасяджэння бюро ЦК КП(б)Б ад 22 чэрвеня 1941 г.

Присутствовали: члены бюро ЦК КП(б)Б тт. Пономаренко, Калинин, Былинский, Ванеев, Цанава, Матвеев, Наталевич, Эйдинов, Крупеня.

Кандидат в члены бюро ЦК КП(б)Б т. Бударин.

Секретари ЦК КП(б)Б тт. Авхимович, Прохоров, Ганенко, Тур.

Уполномоченный КПК т. Захаров.

Вопросы, рассмотренные 22 июня 1941 г.

1. Слушали о нападении Германии на СССР.

Постановили: 1. Поручить членам бюро и секретарям ЦК КП(б)Б немедленно связаться и поддерживать беспрерывную связь с областями и районами, в первую очередь областями и районами полосы начавшихся военных действий.

Передать указания ЦК КП(б)Б:

а) о немедленной перестройке работы парторганизаций на военные рельсы;

б) установление связи с воинскими частями;

в) введение угрожаемого положения в городах и районах Белоруссии, организации боевой службы ПВО;

г) об усилении охраны промышленных предприятий, узлов, транспорта, складов, средств связи, постов силами групп по борьбе с авиадесантами, вооруженными коммунистами, рабочими и колхозниками;

д) о помощи военкоматам в проведении всей работы...

2. Слушали: О задачах и мероприятиях в связи с выступлением по радио заместителя председателя СНК СССР т. Молотова В. М.

Постановили: Обязать все партийные, советские, профсоюзные и комсомольские организации широко популяризовать речь т. Молотова в народе, мобилизуя весь белорусский народ на борьбу и разгром немецкого фашизма.

Созвать в Минске и других областных городах партийные активы для мобилизации партийных организаций на разрешение задач, вытекающих из военной обстановки. На Минском партийном акте (созвать на 3 часа дня) выступление поручить тов. Пономаренко.

На всех предприятиях, в колхозах, совхозах, учреждениях провести митинги.

Обязать все обкомы, горкомы и райкомы, советские, комсомольские и профсоюзные организации принять меры к организованному переводу работы промышленности и транспорта на нужды Красной Армии.

Поручить редакциям газет "Советская Белоруссия" и "Звязда" опубликовать речь товарища Молотова, передовую и другие материалы по указанию отдела пропаганды ЦК КП(б)Б с призывом к Отечественной войне против немецких фашистов.

5. Слушали: О мерах в связи с введением в Белорусской ССР военного положения.

Постановили:

а) предложить всем партийным, профсоюзным и комсомольским организациям, директорам заводов, руководителям учреждений — немедленно перевести работу учреждений и предприятий на условия военного времени, в связи с введением военного положения;

б) в целях организованного проведения мобилизации и обеспечения бесперебойной работы всех партийных и советских органов в связи с военной обстановкой поручить тов. Прохорову согласовать с Военным советом оставление на посту первых и вторых секретарей обкомов, горкомов и райкомов КП(б)Б, председателей облисполкомов, гор. и райисполкомов.

6. Слушали: О работе железнодорожного транспорта.

Постановили: Обязать секретаря ЦК КП(б)Б т. Тур вместе с работниками его отдела установить контроль за немедленным переводом работы всех железных дорог на военные условия...

7. Слушали: Об эвакуации детей из городов, подвергающихся бомбардировке противником в полосе военных действий и г. Минска.

Постановили: Обязать СНК БССР (т. Былинского), Наркомпрос (т. Уралову), ЦК ЛКСМБ (т. Зимянина) и председателя Минского горисполкома (т. Бударина) в двухдневный срок вывезти детей из детских домов, садов, лагерей, из городов, подвергающихся бомбардировке в полосе военных действий и г. Минска.

8. Слушали: Об эвакуации ценностей и денежных знаков из государственного банка БССР.

Постановили: 1. Обязать зам. Управляющего Госбанка БССР т. Кузнецова в суточный срок эвакуировать в Москву ценности, денежные знаки и архив банка.

2. Обязать тт. Миронова и Карасева немедленно обеспечить эвакуацию банка вагонами.

9. Слушали: Об организации вооруженных рабочих отрядов для усиления охраны предприятий и порядка в городе.

Постановили: 1. В целях усиления охраны предприятий и порядка в городе обязать Минский обком и горком КП(б)Б создать по районам отряды вооруженных рабочих и трудящихся.

2. Просить Военный совет Западного фронта выделить для этой цели 5000 винтовок и соответственное количество патронов...

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 3. Спр. 1214. Л. 2—5.

Падрыхтаваў У. І. Лемяшонак

Паведамленні Кармянскага РК КП(б)Б у ЦК КП(б)Б аб становішчы ў раёне

27 июля 1941 г. (7 ч. 20 м.). В районе спокойно. РК КП(б)Б имеет связь с Журавичским, Светиловичским, Краснопольским и Чечерским районами. Проводится в жизнь решение Комитета Обороны в отношении уборки урожая.

4 августа (7 ч.). По сообщению секретаря райкома партии в направлении Журавич идет артиллерийская перестрелка.

Сбор средств в фонд обороны страны не проводится. Республиканские газеты доставляются в район с большим опозданием.

6 августа (17 ч. 40 м.). Колхозы района заканчивают уборку озимых культур. Приступили к обмолоту убранного хлеба.

В дер. Гайшин Пропойского района скопилось много скота по дорогам, брошенного гонщиками при эвакуации его из колхозов.

7 августа (7 ч. 15 м.). В соседнем Журавичском районе изменений в расположении сил противника не произошло.

8 августа (7 ч. 30 м.). По сообщению секретаря райкома в расположении противника в Журавичском районе изменений нет. Дер. Гайшин и Тереховка Пропойского района в наших руках.

Кампания по сбору средств в фонд обороны страны развернута недостаточно, собрано наличными 3000 руб. Среди колхозников сбор средств по существу не начался. Только вчера по этому вопросу проведено совещание председателей с/с. Уборка озимых согласно директиве Комитета Обороны проходит слабо, убрано всего около 50%. Технические культуры уничтожены полностью.

10 августа (7 ч. 30 м.). Уборка урожая озимых культур в колхозах района проходит медленно. Убрано всего лишь 3 тыс. га.

В фонд обороны страны собрано 5 тыс. рублей.

9/VIII с.г. РК КП(б)Б было проведено совещание учителей, председателей с/Советов и колхозов по вопросам уборки и уничтожения посевов, сбора средств в фонд обороны страны и проведения партийно-массовой работы среди населения.

Оставшиеся реэвакуированными спирт и ячмень спиртзавода сегодня погружаются на баржу.

12 августа (9 ч. 25 м.). Секретарь райкома партии тов. Бруек сообщил, что в Журавичском районе идут упорные бои. В 4 часа утра фашисты с самолета разбросали большое количество листовок. Листовки в основном собраны и уничтожены. В соответствии с директивой уничтожено технических культур 2078 га из 2400 га посева. В фонд обороны страны собрано 5 тыс. рублей и 1500 рублей облигациями.

13 августа (10 ч.). Тов. Аксельрод — деж. НКВД.

Противник предпринял наступление, занял дер. Новый Бич. С Журавичами связи нет. Кормянский райком КП(б)Б и райисполком выехали в неизвестном направлении. Вчера вражеские самолеты бомбили Корму, в результате один человек убит и несколько ранены.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь.
Ф. 4. Воп. 29. Спр. 3. Л. 360, 374–375, 378, 388–389, 392, 396.

Дакладная запіска ў ЦК КП(б)Б аб эвакуацыі дзяржаўнай маёмасці па Кармянскаму і Журавіцкаму раёнах

3 жніўня 1941 г.

В Кормянском и Журавичском районах проведены следующие мероприятия: в районных центрах проведены совещания районных активов по вопросу эвакуации ценностей и уничтожения урожая. Районный актив был послан в с/с для проведения совещаний с председателями колхозов по выполнению задания ЦК Совнаркома.

В колхозах указанных районов к уборке урожая приступили согласно указаниям ЦК, остальные зерновые и технические культуры: конопля, лён и т.д. уничтожаются.

Колхозное поголовье из районов эвакуировано, но имело место, что отдельные колхозы Журавичского р-на свой скот переправили на другой берег реки Сож Кормянского р-на, но не в пункт эвакуации, для чего приняты меры по отправке этого скота в тыловые районы и часть скота сдана в части Красной Армии. Также приняты меры по эвакуации мелкого скота в отдельных колхозах (овцы, свиньи).

В Кормянской МТС осталось не вывезено на 2/VIII 8 тракторов; в Богдановской МТС 7 тракторов, каковые должны быть вывезены не позднее 3–4/VIII, и часть комбайнов, молотилок и большое количество сеялок, жнеек и плугов. Приняты меры к их эвакуации. По эвакуации промышленных предприятий в районах установлено:

а) на 26/VII на кормянском спиртзаводе было вывезено основное оборудование из цветных металлов и больше никакой работы не проводилось;

б) на кормянской электростанции и льнозаводе к эвакуации на 26/VII не приступали, для чего по согласованию с районным руководством были приняты меры по вывозке оборудования. В результате основное оборудование было вывезено. Идет подготовка к вывозу остального оборудования материалов, которого и имеется большое количество.

Для вывозки остальной части оборудования, металлолома и других материалов, спирта 25 тонн, листового и полосового железа и т.д. в Корму необходимо выслать 10–12 барж.

В ходе проведения данной работы настроение среди колхозников и рабочих в основном хорошее.

Пулькин. Смирнов. Бондаренко.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 29. Спр. 3. Л. 304 і адв.

Падрыхтавала Р. А. Чарнаглазава

Той гарачы ліпень

З успамінаў К. Мурашкова, былога жыхара в. Сырск

Ліпеньскай цёплай раніцай увайшла вайна ў нашу вёску Сырск. Засланяючы промні сонейка, на небе з ледзянячым сэрца гулам з'явіліся бамбардзіроўшчыкі з крыжамі ў суправаджэнні знішчальнікаў: напэўна, ляцелі бамбіць Гомель. Але раптам самалёты, раздзяліўшыся на тройкі, павіслі на імгненне над вёскай.

Пікіруючы з падвываннем, яны пачалі скідваць фугасныя і запальныя бомбы на невялічкі безабаронны населены пункт. Застагнала зямля, паглынаючы крыкі вяскоўцаў. Запалалі падвор'і на ўсходняй ваколіцы. Сэрцы камянелі ад жаху і роспачы. Па-варварску адбамбіўшыся, самалёты паляцелі далей, несучы свой смертаносны груз. А ў вёсцы засталіся параненыя, восем сем'яў скрозь слёзы аглядвалі дагарэлыя пабудовы.

Гэтая бамбардзіроўка і сёння ў маёй памяці.

...Колькі гадоў прайшло з тых дзён, але і зараз ўспамінаецца і ўражвае тая аднадушнасць, з якой людзі ішлі ў ваенкаматы, на прызыўныя пункты: ворага трэба было сустракаць са зброяй у руках. Толькі за адзін дзень у раён паступіла больш як 400 заяў ад юнакоў, сталых людзей, дзяўчат і нават тых, хто меў броню. Добраахвотнікі сталі салдатамі знішчальнага батальёна. Сотні жанчын, старых, падлеткаў выйшла на ўзвядзенне абарончых рубяжоў: за некалькі дзён было вырыта больш як 6 кіламетраў супрацьтанкавых равоў, некалькі кіламетраў траншэй.

Акупацыйны рэжым

Акупацыйны рэжым, што быў устаноўлены гітлераўцамі на часова захопленай тэрыторыі нашай Радзімы, распрацоўваўся загадзя, яшчэ да нападу на Савецкі Саюз. Галоўныя яго кірункі былі выкладзены Гітлерам у сакрэтным мемарандуме “Некаторыя думкі пра абыходжанне з насельніцтвам на Усходзе” ад 25 мая 1940 г. У ім указвалася, што захопленыя ўсходнія тэрыторыі належыць разглядаць як аб'ект каланізацыі і германізацыі. Акупацыйная палітыка, гаварылася ў гэтым мемарандуме, павінна быць накіравана на тое, кабператварыць актыўную масу “іншароднага насельніцтва” ў напаўпісьменных рабоў.

Асноўныя палажэнні акупацыйнага рэжыму былі даволі падрабязна выкладзены і ў шэрагу іншых дакументаў, у тым ліку ў плане “Барбароса” (канчатковы варыянт змяшчаўся ў дырэктыве № 21 вярхоўнага галоўнакамандавання ўзброенымі сіламі ад 18.12.1940 г.), дырэктыве па кіраўніцтву эканомікай у акупіраваных усходніх абласцях і інш. Гэтыя дакументы намецілі практычныя мерапрыемствы па ўстанаўленні акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі, якая падлягала захопу. У далейшым яна дапаўнялася загадамі, інструкцыямі галоўнакамандавання ўзброеных сіл і іншых ведамстваў гітлераўскай Германіі, у якіх масавы тэрор, рабаванне, гвалтаванне і забойствы ўзводзіліся ў ранг дзяржаўнай палітыкі.

Асноўны сэнс гэтых жорсткіх, нечалавечых загадаў і інструкцый зводзіўся да таго, каб самымі бязлітаснымі сродкамі і мерамі не дапусціць супраціўлення нашага народа, фізічна знішчыць значную частку насельніцтва краіны. Гэтыя і іншыя дакументы поўнасцю развязалі рукі гітлераўскім катам і забойцам, вызваляючы іх ад усялякай адказнасці за здзейсненыя злачынствы.

Уся тэрыторыя рэспублікі была літаральна разарвана на часткі без уліку гістарычных, нацыянальных, культурных асаблівасцей. Цэнтральная частка рэспублікі, якая складала толькі трэцюю яе частку з насельніцтвам 3 138 256 чалавек (па стану на 4.12.1941 г.), была вылучана ў генеральную акругу, якая атрымала назву “Беларутэнія”. Паўднёвыя раёны Гомельскай і Брэсцкай абласцей, былая Пінская, Палеская вобласці былі ўключаны ў рэйхскамісарыят “Украіна”. Да акругі “Беласток”, які далучаўся да Усходняй Прусіі, адышлі паўночныя раёны Брэсцкай і частка былой Баранавіцкай абласцей. Частка паўночных раёнаў былой Вілейскай вобласці ўвайшла ў склад генеральнай акругі “Літва”.

Усходняя частка Беларусі адыходзіла да тылавога раёна групы армій “Цэнтр”. Яе

межы на захадзе ўмоўна праходзілі па лініі Асвея – Полацк – Лепель – Барысаў – Старыя Дарогі – возера Чырвонае. Кармянскі раён цалкам уваходзіў у вобласць армейскага тылу групы армій "Цэнтр". Уся ўлада на гэтай тэрыторыі знаходзілася ў руках ваенных і паліцэйскіх органаў. Вышэйшым органам быў штаб групы армій "Цэнтр". Ваенна-адміністрацыйныя функцыі выконвалі створаныя вермахтам палявыя і мясцовыя камендатуры, якія былі надзелены ўсёй паўнатой улады ў зоне сваёй дзейнасці. У армейскім тыле ўлада належала камандаванню армейскіх часцей, ваенна-палявым і мясцовым камендатурам (фельд- і ортскамендатурам). Яны стваралі мясцовыя дапаможныя ўстановы: раённыя, валасныя ўправы на чале з бургамістрамі, у вёсках – са старастамі. На тэрыторыі Кармянскага раёна было 15 валасцей, якія ў асноўным адпавядалі даваенным сельскім Саветам. У 13 населеных пунктах стаялі моцныя гарнізоны. Пры валасных управах дзейнічалі паліцэйскія ўчасткі. Буйны гарнізон, больш за 200 чалавек, размясціўся ў раённым цэнтры.

Па ўсяму раёну вёўся ўлік насельніцтва з данымі аб узросце, нацыянальнасці, месцы пражывання. Строгаму ўліку падлягалі прыбываўшыя ў раён на месца жыхарства. Абмяжоўваўся час знаходжання на вуліцах з 21.00 да 5.00. Згодна з распараджэннем акупацыйных улад ад 14 верасня 1941 г. усё насельніцтва ва ўзросце ад 16 гадоў павінна было мець пасведчанне асобы ўстаноўленага ўзору. Без такога пасведчання ўсе затрыманыя на дарозе, у лесе, у полі лічыліся партызанамі і расстрэльваліся на месцы.

Кармянскі раён, як і ўвесь тылавы раён, на працягу акупацыі падлягаў забеспячэнню групы армій "Цэнтр" усім неабходным: прадуктамі харчавання, фуражом, цяглавай сілай. Для зручнасці забеспячэння нямецкіх армій акупанты захавалі калгасныя і саўгасныя гаспадаркі.

Гітлераўскія акупанты прынеслі жыхарам раёна, як і ўсяму беларускаму народу, вялікія страты і няшчасці. За першыя тры месяцы свайго панавання яны знішчылі больш за тысячу чалавек.

З першых дзён акупацыі тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і Кармянскага раёна, учыняліся крывавыя акцыі па масаваму забойству насельніцтва. Гэта рабілі аператыўныя групы рэйхсфюрэра СС Гімлера, якія рухаліся за перадавымі часцямі вермахта. Толькі за кастрычнік 1941 г. у Беларусі яны знішчылі 37 180 чалавек. Знішчалі камуністаў, савецкіх актывістаў, асабліва яўрэяў. Ідэалагічнай асновай забойства насельніцтва акупіраваных савецкіх тэрыторый з'яўлялася нацысцкая тэорыя аб "расавай перавазе" нямецкай нацыі над іншымі народамі, неабходнасці пашырэння "жыццёвай прасторы" для немцаў, "права на сусветнае панаванне". Знішчэнню падлягалі 30 млн. славян – рускіх, беларусаў, украінцаў... Знікнуць з твару зямлі павінны былі ўсе яўрэі.

У г. п. Карма па вуліцах Абатурава і Школьнай былі створаны 2 лагеры, у якіх утрымлівалася 700 яўрэяў. У лістападзе 1941 г. усе яны былі знішчаны.

Ахвярамі нямецкіх акупантаў сталі 71 жыхар Струкачоўскага, 32 – Ворнаўскага, 11 – Барсукоўскага сельскіх Саветаў. 271 чалавек загінуў на тэрыторыі Кармянскага гарпасялковага Савета. У Карме гітлераўцы забілі 252 жыхары. Усяго па Кармянскаму раёну было знішчана 1357 чалавек. Адправілі на прымусовыя работы ў Германію 211 чалавек.

Значныя страты нанеслі акупанты прамысловасці раёна. Толькі ў Кармянскай цагельнай арцелі "Аднаўленне" былі знішчаны машыннае аддзяленне, сушыльныя навесы, абсталяванне, пабудовы на агульную суму 227 597 рублёў у даваенных цэнах.

Былі разграблены амаль усе калгасныя гаспадаркі раёна, знішчаны будынкі, сельскагаспадарчы інвентар, насенныя фонды, лесаабарончыя пасадкі. Агульныя страты па калгасах раёна склалі 364 984 856 рублёў у даваенных цэнах.

Са 102 вёсак раёна гітлераўцы часткова спалілі 42. Вёску Кляпін яны палілі тры разы, Валынцы – двойчы. Гарэлі

5. Зак. 522.

вёскі Сырская Буда, Пятравічы, Баравая Буда, Норкаўшчына, Ворнаўка і іншыя. Пры адступленні пад націскам савецкіх войск гітлераўцы закідвалі гранатамі хаты вяскоўцаў. У лістападзе 1943 г. на тэрыторыі Курганскага сельсавета такім чынам спалілі 100 хат.

Пад выглядам барацьбы з партызанамі акупанты праводзілі карныя аперацыі супраць цывільнага насельніцтва і масава знішчалі яго. У ліпені 1942 г. яны правялі аперацыі № 2 і № 3 у Свяцілавіцкім, Чачэрскім, Кармянскім, Прапойскім раёнах. 140 такіх аперацый на ліку нямецка-фашысцкіх захопнікаў за гады акупацыі Беларусі. Яны расстрэльвалі, рабавалі, знішчалі маёмасць, жывёлу, населеныя пункты спальвалі, ператвараючы многія з іх у "зоны пустыні".

Была ўведзена абавязковая працоўная павіннасць для мужчын і жанчын ва ўзросце ад 14 да 65 гадоў. Акупанты прымушалі насельніцтва выконваць розныя работы для сваёй арміі. Асабліва жорстка эксплуатавалі людзей у восень 1943 г. Пад прымусам яны з ранку да ночы будавалі абарончыя рубяжы на р. Сож. Жыхары раёна ўсялякімі спробамі ўхіляліся ад гэтых работ. Фашысты выяўлялі такіх людзей і расстрэльвалі. Але, нягледзячы на ўсе выпрабаванні, жыхары раёна не скарыліся ворагу.

Р. А. Чарнаглазава

Дакументы сведчаць

З адміністрацыйнага распараджэння № 1 камандуючага тылам групы армій "Цэнтр" генерала пяхоты фон Шэнкендорфа

7 ліпеня 1941 г.

О назначении бургомистров в волостях

1. На должность бургомистров в первую очередь должны быть назначены политически надёжные и квалифицированные люди, по возможности — из числа белорусов.
2. Бургомистр является представителем волости.
3. Он является служебным начальником над всеми лицами, работающими в волости. Он принимает их и увольняет с работы.
4. Бургомистр несёт ответственность за финансовые дела волости.
5. Все жители, проживающие в волости по состоянию на 21.06.1941 г., должны быть заново учтены и переписаны бургомистром.
6. Бургомистры немедленно должны позаботиться о том, чтобы все жители были обеспечены соответствующими документами, удостоверяющими их личность: фамилия и имя, время и место рождения, местожительство, состав семьи, профессия, пребывание и род занятий, социальное происхождение, вероисповедание, национальность, подданство.
7. Бургомистры привлекаются к ответственности за совершенные акты саботажа в вверенной им волости. Они должны всеми средствами предотвращать акты саботажа. В их обязанность входит охрана предприятий, расположенных на территории волости, особенно жизненно важных.
8. Бургомистров и их заместителей в населенных пунктах, насчитывающих до 20 000 жителей, назначает местный комендант, а в населенных пунктах свыше 20 000 жителей назначает комендант полевой комендатуры.

О запрещении оставления квартир в ночное время

1. В период с 21.00 до 5.00 утра населению запрещается покидать квартиры.
2. Исключения допускаются по письменному разрешению местного коменданта для лиц, работающих в ночное время на жизненно важных предприятиях врачами, акушерами, на машинах скорой помощи.

3. Нарушители будут строжайшим образом наказываться местными комендантами. Как вспомогательными мерами наказания могут быть временный арест с ограниченным питанием, насильственное задержание и привлечение к работам.

Создание вспомогательной полиции

1. Для проведения полицейских мер безопасности бургомистрам поручается привлечь в вспомогательную полицию надежных "фольксдойче", белорусов и, если таковых не имеется, то поляков, и использовать эту полицию по согласованию с начальниками команд полиции безопасности.

2. Служащие вспомогательной полиции, которые работают в тесном контакте с местными айнзатцкомандами полиции безопасности и СД, могут поддерживать связь только с местными начальниками полиции безопасности и СД или назначенными ими органами.

3. Служащие вспомогательной полиции носят белую нарукавную повязку с надписью "Вспомогательная полиция".

4. Местные комендатуры до 20-го числа каждого месяца, а в первые и 20.07.1941 года сообщают о численности и вооружении вспомогательной полиции.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 952. Л. 1–5.

НЕМЦА ЗАБІ, ЗАКАЛІ, ЦІ ЗАРЭЖ, ЗНІШЧЫ ЯГО – ЖЫЦЦЁ ЗБЕРАЖЭШ!

Моладзь мая, аднагодкі мае,
Хіба ў нас сілы ў грудзях не стае?
Ўспомні, удумайся, родны мой брат.
Чым табе грозіць раз'юшаны кат!
Вызваліць хоча цябе ён на век
З гордага звания твайго – чалавек.
Хоча цябе ён пазбавіць жыцця,
Брата, сястру дарагую забіць,
Каб на крыві чалавечай, касцях
Стада шчанятаў сваіх узрасціць.
Хоча цябе ён зрабіць дзікаром,
Парабкам вечным, слугою сваім.
Ці можаш аддаць ты нямецкім звярам
Тое, што вечна завеш дарагім?
Хто-ж сваю волю святую і шчасце
Дасць разарваць гэтым злыдням на часці?
Выпрастай плечы і зброю вазьмі,
Шчасце сваё ты адстайвай грудзьмі.
Сцісні, таварыш, вінтоўку рукой,
Выйдзі на жорсткі, на праведны бой.
Хочаш быць вольным, шчаслівым, жывым, –
Куляй, гранатай, штыком баявым
Немца забі, закалі, ці зарэж,
Знішчыш яго – жыццё зберажэш!

Анатоль Астрэйка

Лістоўка ЦК ЛКСМБ у гады вайны *(З асабістага архіва Дз. М. Марчанкі)*

Акт аб стратах, нанесеных нямецка-фашысцкімі захопнікамі гаспадарцы г.п. Карма Кармянскага раёна

24 лютага 1944 г.

Мы нижеподписавшиеся, председатель кормянской кирпичной артели "Возрождение" т. Виленков Яков Федорович, заведующий артелью Ланюгов Николай Иванович, заведующий Кормянским райкоммунхозом т. Антоненко Кузьма Михайлович, счетовод Шлеменкова Екатерина Алексеевна, составили настоящий акт об ущербе и убытках, причиненных немецко-фашистскими захватчиками и их сообщниками зданиям и другим объектам, принадлежащим кормянской кирпичной артели "Возрождение", находящимся в гор. пос. Корма Кормянского района Гомельской области БССР.

Ущерб и убытки, причиненные фашистскими захватчиками

№ п/п	Виды уничтоженного, разгромленного, разграбленного имущества	Единица измерения	Количество	Процент (%)	Восстановительная стоимость уничтоженного имущества (в руб.)	Восстановительная стоимость частично разрушенного (в руб.)	Общая сумма уничтоженного имущества (в руб.)
1.	Кирпичный завод	объект	1	50	—	26 776	26 776
2.	Сушильные навесы	куб. м	4320	100	82 871	—	82 871
3.	Машинное отдел.	—	90	«	7226	—	7226
4.	Нефтедвиг. 18 сил	шт.	1	«	8000	—	8000
5.	Напольн. печь	шт.	1	«	3000	—	3000
6.	Гончарное здание	куб. м	189	30	—	3575	3575
7.	Гончарное здание	«	90	20	—	1429	1429
8.	Жилые дома	«	216	40	—	6860	6860
9.	Канцелярия	«	162	50	—	6441	6441
10.	Конюшня	«	168	20	—	1467	1467
11.	Гончарный горн	шт.	1	50	—	1000	1000
12.	Телеги	шт.	10	100	5000	—	5000
13.	Мерин	гол.	10	100	46 500	—	46 500
14.	Кобыл	гол.	2	100	9300	—	9300
15.	Тачек	шт.	15	100	750	—	750
16.	Лопат	шт.	15	«	1200	—	1200
17.	Столов	«	3	«	2400	—	2400
18.	Стульев	«	6	«	600	—	600

Працяг табліцы

19.	Саней	«	8	«	1200	—	1200
20.	Упряжь	компл.	12	«	1200	—	12 000
Итого					18 0047	4755	227 597

Подпись лиц, составивших акт
Виленков
Ланюгов
Антоненко
Шлеменкова

Исполнительный комитет Кормянского Совета депутатов трудящихся акт заверяет
Председатель исполкома (*Евдочков*)
Секретарь исполкома (*Короткевич*)
Зарегистрирован в книге актов по учету ущерба за № 129 от 24 февраля 1944 г.
Секретарь исполкома (*Короткевич*)

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 861. Воп. 1. Спр. 6. Л. 246 і адв.

Акт аб злачынствах нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Кароцькаўскага сельсавета Кармянскага раёна

19 лістапада 1944 г.

Мы, нижеподписавшиеся: председатель Коротьковского сельского Совета Акинчиц Леонид Алексеевич, председатель колхоза "Парижская коммуна" Короткевич Михаил Семенович, директор Коротьковской неполной средней школы Сосновский Адам Иванович, колхозник колхоза имени Парижской Коммуны Короткевич Михаил Александрович, фельдшер Коротьковского медицинского пункта Куприенко Мария Ивановна, составили настоящий акт на все злодеяния, произведенные немецко-фашистскими властями за период оккупации территории Коротьковского с/Совета с 14 августа 1941 г. до ноября 1943 г. Нами на основании заявлений и свидетельских показаний установлено, что в ноябре 1942 г. группа немецких солдат во главе с фельдфебелем кормянской жандармерии угнали в немецкое рабство 6 граждан нашего сельского Совета. При угоне в рабство многие подвергались телесному наказанию резиновыми плетями.

В начале октября 1943 г. при обороне реки Сож немецкими войсками группа немецких солдат во главе с полевым комендантом забрали не успевшую скрыться часть населения от немецких захватчиков и угнали в рабство. При угоне в рабство 2-е были избиты и расстреляны, из них Жлобо Семен Иванович и Богданович Виктор Борисович. Похороны последних запрещались до дня изгнания немецких захватчиков с территории сельского Совета, и трупы последних лежали до 26 ноября в соломе амбара. Всего немецкими властями за период оккупации Коротьковского с/Совета расстреляно 2 человека и угнано в фашистское рабство 28 человек, из дер. Сапожки — 14 человек, что своими подписями и подтверждаем.

Подписи:
Акинчиц
Короткевич
Сосновский
Короткевич
Куприенко

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 861. Воп. 1. Спр. 6. Л. 259.



ANORDNUNG
über Sperrstunden

Mit Zustimmung des Reichskommissars für das Ostland setze ich die Sperrzeit im Generalbezirk Weissruthenien in den Städten auf die Zeit vom Dunkelwerden bis zum Hellwerden fest.

Zivilpersonen, die während der Sperrzeit ohne zwingende Gründe auf der Straße betroffen werden, werden sofort standgerichtlich erschossen.

Für die Besucher von Theatern und sonstigen kulturellen Veranstaltungen ergeht eine Sonderregelung.

Diese Anordnung tritt am 1. November 1941 in Kraft.

Minsk, den [illegible] Oktober 1941

Der Generalkommissar für Weissruthenien
WILHELM KUBE

РАСПАРАДЖЭНЬНЕ
аб абмежаваньні хаджэньня вячэрняю парою

Са згодай Дзяржаўнага Камісара Ўсходняга Абшару пастанаўляю абмежаваць час хаджэньня ў гарадах Генэральнай Акругі Беларусі ад зьмярканьня да развідненьня.

Асобы цывільныя, якія ў абмежаваным часе без уважлівай прычыны будуць спатканыя на вуліцы, будуць зараз-жа на месцы расстраляны.

Для адведваючых тэатр і іншыя культурныя ўстановы выйдзе асобнае распараджэньне.

Гэта распараджэньне ўваходзіць у сілу ад 1 лістапада 1941 г.

Мінск, [illegible] 1941 г.

Генэральны Камісар Беларусі
ВІЛЬГЕЛЬМ КУБЭ

ROZPORZĄDZENIE
o ograniczeniu ruchu cywilnego w czasie od początku zmierzchu do świtania

Za zgodą Komisarza Rzeszy Ostlandu zarządzam ograniczenie czasu chodzenia po miastach Generalnego Okręgu Białorusi od zmierzchu do świtania.

Osoby cywilne, które w zabronionym czasie spotka się chodzące bez powodu na ulicy, będą natychmiast doraźnym sądem rozstrzelane.

Dla odwiedzających teatr i inne kulturalne imprezy wydane zostanie odrębne uregulowanie.

Rozporządzenie wchodzi w życie z dniem 1 listopada 1941 r.

Mińsk, [illegible] października 1941 r.

Generalny Komisarz Białorusi
WILHELM KUBE

РАСПОРЯЖЕНИЕ
об ограниченном хождении вечерней порой

С согласия Государственного Комиссара Восточной Территории постановляю:

Ограничить время хождения в городах Генерального Округа Белоруссии от вечерних сумерек до рассвета.

Лица гражданские, которые в ограниченное время без уважительной причины будут встречены на улице, будут сейчас же Военным Судом расстреляны.

Для посещающих театр и другие культурные учреждения выйдет особый приказ.

Это распоряжение входит в силу с 1-го ноября 1941 г.

Минск, [illegible] 1941 г.

Генеральный Комиссар Белоруссии
ВИЛЬГЕЛЬМ КУБЕ

Адно з распараджэнняў акупацыйных улад аб абмежаванні знаходжання на вуліцах у гарадах вечарам і ноччу.

Акт аб злачынствах нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Куракаўскага сельсавета Кармянскага раёна

21 лістапада 1944 г.

Я, уполномоченный Государственной Чрезвычайной Комиссией по злодеянию немцев в Кураковском с/Совете Буткин Алексей Петрович в присутствии председателя Кураковского с/Совета депутатов трудящихся Драчева Александра Ивановича, секретаря Кураковского с/Совета депутатов трудящихся Сомовой Евгении Васильевны и учительницы Кураковского с/Совета Кураковской сельской школы Чумаковой Евы Ивановны и председателя колхоза "Октябрь" Андрейченко Николая Лазаревича, составили настоящий акт в нижеследующем:

За время оккупации немецкими властями Кураковского с/Совета Кормянского р-на Гомельской области с 12 августа 1941 г. по 25 ноября 1943 г. немецкие военные власти на территории Кураковского с/Совета совершили множество зверских злодеяний над невинными советскими гражданами, временно оказавшимися на оккупированной территории немцами. Так, примерно перед Рождеством 1943 г. в дер. Сырск приехал комендант Райзмазель в возрасте 50 лет, потребовал привести к нему (якобы на помилование) граждан дер. Сырск:

1. Шевцева Василия Афанасьевича
2. Шевцева Григория Афанасьевича
3. Голишманова.

Райзмазель приказал снять с них головные уборы и поставить на колени, после чего приказал повесить. Немецкие солдаты схватили их и повесили на заранее подготовленное виселище. В начале ноября 1943 г. были расстреляны немцами 4 старика за то, что они были больными и не могли идти к немцам.

При отступлении немцев из дер. Сырск немецкие солдаты под командованием фельдфебеля Отто (имя не установлено) и еще с одним офицером в чине лейтенанта (фамилия и имя тоже не установлены) с гранатами в руках врывались в дома к тем гражданам, которые не выходили на улицу, и взрывали дома. Гражданам вышеуказанной деревни Рижанковой Вере, проживающей с тремя детьми и престарелой матерью, бросили в дом 3 гранаты, после чего вышеуказанную семью убило гранатами. Под руководством военного коменданта м. Корма майора Райзмазеля Макса были расстреляны и повешены ни в чем не повинные следующие советские граждане: дер. Кураковщина – 7 человек, дер. Мастеровская Слободка — 2 чел., дер. Старая Зеньковина — 6 чел., дер. Городок — 3 чел., дер. Новая Зеньковина — 1 чел., дер. Семеновка — 1 чел., м. Корма — 1 чел. и один военнопленный из Саратовской области. Угнано в немецкое рабство 211 чел. Все вышеизложенные факты подтверждаются прилагаемыми протоколами опроса и заявлениями граждан, на что и составлен настоящий акт.

Уполномоченный Государственной Чрезвычайной Комиссией Кураковского с/с *Буткин*
Председатель Кураковского с/с *Драчев*
Учительница Кураковской школы *Чумакова*
Председатель колхоза *Андрейченко*

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 861. Воп. 1. Спр. 6. Л. 245.

Апытанне жыхароў вёскі Задуб'е Кармянскага раёна аб злачынствах нямецка-фашысцкіх захопнікаў

18 красавіка 1945 г.

Я, гражданин городского поселка Корма Кормянского района Левшунов Сафрон Леонтьевич, опросил граждан деревни Задубье Кильчевского Конона Семеновича, Купреева Сергея Васильевича, Юрченко Захара Моисеевича, Савицкого Дмитрия Федоровича о немецко-фашистской проводимой политике по истреблению граждан нашей деревни.

Мы, граждане, в период немецкой оккупации нашей деревни проживали в своей деревне и даем свидетельские показания о тех зверствах, которые проводили немецкие захватчики совместно с полицией над нашими гражданами. Немецко-фашистский карательный отряд, так называемый истребительный, прибыл в нашу деревню 26 ноября 1943 г., окружили деревню и начали проводить массовые обыски по домам и сараям. В это время большинство граждан нашей деревни убежали, кто в лес, а кто в соседние деревни, и хоронились от немцев, а кто остался в деревне, всех сослали в конец деревни и приняли зверский характер к нашему гражданину Игнатенко Федору Прокофьевичу, 1906 года рождения. 26 ноября 1943 г. зверски расстреляли Анищенко Леонида Даниловича, 1928 года рождения, обнаружили в поселке Карчевана. 25 ноября 1943 г. зверски расстреляна Наройкина Зинаида Иосифовна, 1931 года рождения, зверски расстреляли Евтухова Степана Емельяновича, 1867 года рождения, зверски расстреляли, обвиняя граждан, что они имеют связь с партизанами. В это время немецкие каратели согнали с других деревень в нашу деревню большое количество населения и приступили в первую очередь к избиению и пыткам и массовым расстрелам. В результате зверства немецких захватчиков было ими расстреляно 41 (сорок один) человек невинных граждан Советского Союза, после чего оставшихся еще не расстрелянных граждан заставили копать ямы, стягивать трупы расстрелянных и закапывать. После чего оставшихся граждан загнали в один двор и около 50 с лишним человек угнали в немецкое рабство, запретили совершенно давать питание гражданам, а кто подносил из родственников, стариков, старух и детей, немцы отбирали у них и угоняли вместе в немецкое рабство.

Еще даем свидетельские показания в том, что гражданин деревни Задубье Панюшенко Платон Романович, 1901 года рождения, житель нашей деревни, в 1941 г. был мобилизован в ряды РККА и попал в плен к немецким извергам, находился в Бобруйском лагере советских военнопленных, где избивался немцами до полусмерти. Узнавши об этом, его сын Панюшенко Владимир отправился в лагерь, чтобы освободить отца, но поскольку Панюшенко Платон был полуживой, его отпустили из лагеря, на дороге Панюшенко умер.

Похоронен на кладбище в деревне Задубье.

Мы, граждане в своих свидетельских показаниях о тех зверствах и угрозах, которые проводили немцы, не в состоянии даже всего передать, так они многочисленны. Свидетельские показания нам прочитаны дословно, в чем и расписываемся.

Подписи

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 7021. С. 315.

Акт аб злачынствах нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Ліцвінаўскага сельсавета Кармянскага раёна

21 лістапада 1944 г.

Мы, нижеподписавшиеся, комиссия в составе Уполномоченной Чрезвычайной Комиссии по расследованию злодеяний, нанесенных немецко-фашистскими захватчиками тов. Агеенко Ксеньи Астаповны, председатель Литвиновского с/Совета тов. Полевиков Сергей Акимович, председатель колхоза им. Лепешинского тов. Короедов Леон Петрович, учительница Пратасенко Матрена Аврамовна, колхозница Булатчикова Ольга Матвеевна, составили настоящий акт в том, что на территории Литвиновского с/Совета при немецкой оккупации было совершено злодеяние немецко-фашистскими захватчиками как при наступлении, а также и при отступлении немецких войск, было расстреляно с дер. Литвиновичи 12 человек, в лесу пойманы немцами во время блокировки и посчитали их как партизан. В дер. Зятьковичи были расстреляны 10 человек ввиду того, что подано заявление немецким властям, что они имели связь с партизанами. В дер. Вощанки — 12 человек, военнопленным живым выкалывали глаза и у опушки леса их расстреляли, также были расстреляны мирные жители этой деревни за скрытие военнопленных в количестве 9 человек, сожгли живьем 70-летнюю старуху в бане за то, что она шла скрываться в лес. В пос. Вознесенск расстреляли двух человек, пойманных в лесу, и посчитали их как за партизан. Семью Короедова Никиты Петровича в составе 4 человек, его жену и двух дочерей, в том числе и самого Короедова — расстреляли в дер. Фощное, Красногорского с/Совета, за эвакуацию. Также расстрелян немецко-фашистскими захватчиками и военнопленный Подзолкин Василь Степанович в м. Корма, за неподчинение немецким властям. С дер. Дубролеж расстрелян Агеенко Федор Данилович и его дочь Елена Федоровна за то, что они скрылись в лесу. И так по Литвиновскому с/Совету были расстреляны и сожжены и угнаны в немецкое рабство:

1. В дер. Литвиновичи расстреляно 13 ч., угнано в рабство 17				
2. В дер. Зятьковичи	—	10 ч.	—	41
3. В дер. Вощанки	—	21 ч.	—	4
4. В дер. Дубролеж	—	2 ч.	—	6
5. Пос. Вознесенск	—	7 ч.	—	4

Всего по Литвиновскому с/Совету расстреляно и сожжено 54 человека, угнано в немецкое рабство 72 чел.

Итого по всему Литвиновскому с/Совету расстреляно, угнано в немецкое рабство и сожжено 126 человек (сто двадцать шесть человек), на что и составлен настоящий.

Комиссия (подписи)

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 7021. Л. 316.

Даведка аб злачынствах нямецка-фашысцкіх захопнікаў у вёсцы Хізаў Кармянскага раёна

25 лістапада 1945 г.

Справка

Выдана настоящая Хизовским сельсоветом Кормянского района Гомельской области БССР.

В том, что территория Хизовского сельсовета, в том числе и деревня Хизов, была оккупирована немцами, и в 1943 г. в сентябре месяце вооруженные войска немецкой армии под командованием офицера приехали в деревню Хизов и начали искать граждан, связанных с партизанами, но таковых найти не удалось.

После чего в деревне Хизов расстреляли первых попавших 10 человек ни в чем не повинных граждан:

1. Выдренков Никифор Афанасьевич — 1884 г.р.
2. Авласенко Архип Данилович — 1887 г.р.
3. Маевский Степан Павлович — 1900 г.р.
4. Матвейчиков Никита Романович — 1890 г.р.
5. Власов Михаил Семенович — 1900 г.р.
6. Алексеенко Лукьян Дмитриевич — 1883 г.р.
7. Сергеенко Константин Романович — 1889 г.р.
8. Савельев Дмитрий Лукич — 1888 г.р.
9. Куцанова Пелагея Титовна — 1919 г.р.
10. Голубов Григорий Ефимович, инвалид — 1908 г.р.
11. Чистяков Сергей Семенович — 1879 г.р.
12. Елисеев Семен Кузьмич — 1891 г.р.
13. Власов Василий Яковлевич — 1878 г.р.
14. Сергеенко Павел Петрович — 1876 г.р.
15. Алексеенко Иван Семенович — 1878 г.р.
16. Лопатенко Герасим Игнатьевич — 1875 г.р.
17. Михальченко Яков Васильевич — 1892 г.р.
18. Елисеева Прасковья Андреевна — 1890 г.р.

Что и удостоверяется Хизовским сельсоветом.

Председатель сельсовета *Авласенко*
Секретарь *Шкляров*

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 861. Воп. 1. Спр. 6. Л. 247.

Звесткі аб стратах, якія ўчынілі нямецка-фашысцкія захопнікі калгасам Кармянскага раёна Гомельскай вобласці

Лістапад 1944 г.

Наименование	Общий размер ущерба (в тыс. руб.)
1. Разрушено и повреждено построек, сооружений на сумму	51 239 651
2. Разграблено и уничтожено с/хоз. инвентаря	3 813 298
3. Разграблено, уничтожено и погибло от войны посевов и урожая	66 082 805
4. Уничтожены сады, леса и лесозащитные посадки	6 628 095
5. Разграблено, уничтожено и погибло скота и птицы на сумму	4 119 260
6. Разграблено и уничтожено запаса семян, кормов, продуктов и материалов	2 187 476
7. Расходы по эвакуации и возвращению на старое место	62 900
8. Недополучено доходов из-за прекращения или сокращения деятельности колхозов	200 351 391
На сумму	364 984 856 руб.

Комиссия по ущербу

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 861. Воп. 1. Спр. 6. Л. 244а.

Даведка аб стратах, якія ўчынілі нямецка-фашысцкія захопнікі на тэрыторыі Курганскага сельсавета Кармянскага раёна

Лістапад 1944 г.

Выдана настоящая Курганским сельсоветом Кормянского района в том, что по опросу граждан при отступлении немцев по данному сельсовету немцами было изъято следующее количество скота:

крупного рогатого скота — 500 голов,
лошадей — 250 голов,
свиней — 1500 голов
и вся домашняя птица.

В пос. Покровск в ноябре месяце 1943 г. во время эвакуации населения было изъято немцами 10 коров и 12 лошадей, разграблено все имущество и сожжено 4 дома. Всего по Курганскому сельсовету при отступлении в ноябре месяце 1943 г. немцы сожгли 100 домов.

Председатель Курганского сельсовета *Астапенко*
Секретарь *Анушкина*

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 861. Воп. 1. Спр. 6. Л. 258.

Рашэнне № 171 выканкома Кармянскага райсавета дэпутатаў працоўных ад 3 чэрвеня 1969 г.

Об уничтожении сведений о населенных пунктах и населении Кормянского района, уничтоженных немецко-фашистскими захватчиками в годы Великой Отечественной войны

Рассмотрев материалы Чрезвычайной комиссии, а также проведя работу по уничтожению сведений о преступлениях немецко-фашистских оккупантов на территории Кормянского района Гомельской области, Исполком районного Совета депутатов трудящихся констатирует, что на территории Кормянского района имелось 102 деревни, из них частично сожжено 42. В настоящее время восстановлены на прежнем месте 42. В этих деревнях уничтожено 88 человек, погибло на фронтах Великой Отечественной войны 1801 человек, в партизанских отрядах и в подполье 153 человека.

Кроме того, установлено, что в деревнях, не подвергшихся разрушению, уничтожено 100 человек, угнан в фашистское рабство 71 человек, погибло на фронтах Великой Отечественной войны 1495 человек, погиб в партизанских отрядах и в подполье 191 человек.

Исполком Кормянского Совета депутатов трудящихся решил:

утвердить рассмотренные материалы, поступившие от комиссий по сельским Советам о населенных пунктах и населения Кормянского района, уничтоженных немецко-фашистскими захватчиками в годы Великой Отечественной войны.

Зам. председателя исполкома Кормянского районного
Совета депутатов трудящихся *К. Мурашков*
И.о. секретаря райисполкома *Н. Короткевич*

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 755. Л. 157.

Жыццё пад акупацыяй

З успамінаў К. Мурашкова, былога партызана

Захапіўшы Кармяншчыну, гітлераўцы сталі наводзіць "новы парадак". Уладу ажыццяўлялі гестапа, камендант, бургамістр. Замест сельскіх Саветаў былі сфарміраваны валасныя ўправы, прызначаны старасты. Не заўсёды гэта былі здраднікі ці былыя раскулачаныя. Староста вёскі Масцеравая Слабодка Шугаёў неаднаразова зрываў адпраўку рабочай сілы ў Германію. Староста вёскі Новы Млын наладзіў сувязь з партызанамі, перадаваў важныя навіны.

Па даручэнні падпольнага райкома партыі ў акупацыйныя ўстановы пайшлі працаваць А. Кузьмянкоў, К. Еўдакіменка, А. Сцяпура, Е. Сычкоў і іншыя падпольшчыкі. Яны здабывалі каштоўныя звесткі, садзейнічалі зрыву праводзімых акупантамі мерапрыемстваў, забяспечвалі патрэбнымі дакументамі.

У раёне функцыяніравалі ортскамендатура і фельдкамендатура. У Карме стварылі гета, куды сагналі больш як 700 яўрэяў. За два дні — 25 кастрычніка і 9 лістапада 1941 г. — яны былі расстраляны ў рове на ўсходняй частцы мястэчка.

Праходзілі масавыя арышты і пакаранні. Дапамагалі новым гаспадарам прыстаў паліцыі Макаранка, начальнік спецатрада па барацьбе з партызанамі Сметаў, палачы Малючэнка, Маслакоў.

Быў уведзены каменданцкі час. А пасля з'яўлення першых лістовак, з якіх насельніцтва даведалася аб становішчы на франтах, баях, якія вяла з гітлераўцамі Чырвоная Армія, фашысты яшчэ больш азвярэлі. Яны схапілі і пасля цяжкіх катаванняў павесілі старшыню калгаса "Праца" Васіля Фёдаравіча Караткевіча і яго жонку Ганну Дзянісаўну, супрацоўніка канторы сувязі Івана Калякіна.

На пасяджэнні райкома партыі пасля абмеркавання вырашылі падаслаць у раённую ўправу Аляксандра Іосіфавіча Сцяпуру — латыша па нацыянальнасці, інтэрнацыяналіста па духу. Яго ведалі як актыўнага ўдзельніка грамадзянскай вайны, стойкага і вытрыманага таварыша, адданага Радзіме патрыёта. На Кармяншчыне Сцяпура працаваў з 20-ых гадоў. Беспартыйны. Добра ведаў раён і людзей. Да таго ж валодаў нямецкай мовай. Не звязаны з сям'ёй. Працаваў намеснікам старшыні райвыканкома, але напярэдадні вайны як урача па спецыяльнасці Сцяпуру перавялі на пасаду загадчыка аддзела аховы здароўя. Вось гэта паніжэнне па службе саветамі і стала шырмай для паступлення "пакрыўджанага" іншародца на службу да акупантаў.

...Асабістую справу Аляксандра Сцяпуры ў гестапа вывучалі не адзін дзень. Тым не менш з 22 кастрычніка 1941 г. яму даверылі кіраўніцтва фінансавай, а затым і сакрэтнымі часткамі раённай управы.

Лепшага падпольшчыка і не трэба было. Моцнае самавалоданне дапамагала Аляксандру Іосіфавічу ўвайсці ў рытм рызыкоўнай работы. Асабліва цяжка было пераносіць халодныя, поўныя нянавісці позіркі савецкіх людзей. Нават сябры адвярнуліся. Часам хацелася кінуць усё, вярнуцца ў лес і змагацца з

М. А. Хілінскі

фашыстамі ў адкрытым баі. Але Сцяпура пераадольваў слабасць, браў сябе ў рукі і працягваў спакойна выконваць абавязкі. Яму нельга было памыляцца.

Хутка Аляксандр Іосіфавіч стаў забяспечваць партызан і падпольшчыкаў неабходнымі дакументамі для пражывання і руху па акупіраванай тэрыторыі. Дзякуючы Сцяпуру загад каменданта аб правядзенні карнай аперацыі супраць кармянскіх партызан праз сувязных Юлію Кузьмянкову і Марыю Сцяпанаўну Караткевіч адразу стаў вядомы ў штабе атрада імя Варашылава. Затым ён выведаў прозвішча здрадніка, якому фашысты даручылі як сувязному падпольнага абкома партыі склікаць у пасёлак Бурны членаў падпольнага райкома партыі.

Акупанты шалелі. Яны па-зверску забілі многіх сувязных, членаў партыйных груп, савецкіх актывістаў. Ахвярамі сталі Кузьма Еўдакіменка, Панцеляймон Ціцянкоў, Наталля Ушава, Іван Мажэйка. Нечуваныя здзекі вынеслі перад пакараннем падпольшчыкі Іван Калякін, Васіль і Ганна Караткевічы, Уладзімір Масейкаў і многія іншыя таварышы па барацьбе з фашызмам. Іх гібель выводзіла Аляксандра Іосіфавіча з раўнавагі. Так, пасля расстрэлу маці і дачкі Абатуравых ён амаль тыдзень не мог выйсці на працу. Душэўнае аблягчэнне ў якойсьці меры наступіла тады, калі Сцяпура дапамог падпольшчыкам з вёскі Расохі Ігару і Галіне Гісчыкавым, Зоі Талкачовай. Потым папярэдзіў разгром падпольных груп у Вынашаўцы, Зенькавіне, Куракаўшчыне і Сырску.

Да лета 1943 г. знаходзіўся Аляксандр Іосіфавіч у варожым логаве. І толькі пагроза выкрыцця прымусіла яго вярнуцца ў партызанскі атрад, дзе ўдзельнічаў у аперацыях па ўзрыву электрастанцыі, разгроме складоў з фуражом, соллю, пшаніцай. У ліпені 1943 г. камуністы атрада імя Варашылава прынялі падпольшчыка ў рады камуністычнай партыі.

Слова клікала ў бой

Ён нарадзіўся ў вёсцы Хізаў у самы разгар будаўніцтва новага сацыялістычнага грамадства. Рос, выхоўваўся і сталеў пад уплывам новых ідэй, новага светапогляду. Подзвігі Сяргея Лазо, Паўкі Карчагіна і Мікалая Шчорса былі для будучага паэта Мікалая Хілінскага нязгаснымі маякамі. У Хізаўскай школе ён быў не па гадах сталым: маці памерла рана, хлапчука выхоўвала старая бабуля. З маленства юнак адчуваў прагнасць да літаратуры, рана пачаў пісаць вершы.

У жніўні 1941 г. вёску захапілі ворагі. Бадай, упершыню пазнаў агіду і нянавісць Мікола Хілінскі, калі ўбачыў, як юліць і труслівa дапамагае новым "гаспадарам" недабіты махновец Андрэйчыкаў. Слова пачынаючага паэта набывае палымянасць. Ён піша верш "Нависла туча над деревней", у аснове якога жыццё роднай вёскі ў гады акупацыі.

…Мы с вами все отлично знаем,
Что саранче тут не бывать.
Я всех вас, братья, призываю:
Пойдем с фашизмом воевать!

Мацнеюць крылы ў палёце, больш цвёрдай робіцца рука паэта, мужнасць і бясконцую адданасць Радзіме, свайму народу апявае Мікола Хілінскі. У вершаванай лістоўцы ён расказвае землякам аб паражэнні фашыстаў пад Масквой:

…Не верьте, люди, супостатам,
Что Волга и Москва заняты.
Москва — гранитная скала,
И Волге течь, как и текла:
Там чумной рати не бывать,
Наш долг врагов уничтожать!

Восенню 1942 г. М. Хілінскі ўступае ў партызанскі атрад. Ён помсціць фашыстам за зямлю-карміцельку, за роднага бацьку, расстралянага фашыстамі ў першыя дні акупацыі Кармяншчыны. Клятвай бацьку гучаць радкі яго верша:

...За счастье и волю народа
Иду я с врагом воевать.
За Родину, Правду, Свободу,
Как ты, буду грудью стоять!

Мікола ўдзельнічаў у партызанскім судзе надураднікам і паліцэйскімі ў родным Хізаве. Ён — актыўны ўдзельнік большасці вылазак партызан на паліцэйскія гарнізоны. Поплеч з вінтоўкай крочыў яго паэтычны радок. Мацнеў голас паэта, крышталізавалася літаратурнае майстэрства. Своеасаблівым гімнам атрада 10-ай Журавіцкай брыгады стаў верш песняра "В тылу врага". Простыя і суровыя паэтычныя радкі з аптымізмам гаварылі аб перамозе, аб сіле народа, клікалі да бітвы, вучылі змагацца і жыць:

...Не поставит нас враг на колени,
Нашей воли ему не сломать.
Били, бьём, будем бить, как умеем,
Чумовую фашистскую рать!

Пасля бою ля вёскі Белае Балота партызанскі паэт піша верш-водгук на падзеі, у якіх прымаў самы непасрэдны ўдзел:

...Белое Болото кровью всё полито,
И крестов понурых выстроился ряд,
Много Гансов, Фрицев, Вилли перебито —
Все они бесславно падалью лежат.
Вот им и землица, вот и рай небесный —
Всё, чего хотели, получили тут,
Вот для них именье — гроб в могиле тесной,
Больше не горланят, что Москве — капут!

У верасні 1943 г. у незабыўныя гадзіны сустрэчы партызан з часцямі Савецкай Арміі М. Хілінскі прысвячае новы верш камандзіру атрада імя 25-годдзя Ленінскага Камсамола Чарненку:

...Ты отважный боец, командир боевой,
Нас сдружили походы, дороги!
Много раз на врага ты нас вёл за собой —
Сам в бою был отважным и строгим.
Летом жарким, и в слякоть, и лютой зимой
Мы в фашистском тылу не дремали!
От Друти и до Сожа ходили с тобой,
Дерзновенно с врагом воевали...

У характарыстыцы, выдадзенай Журавіцкім падпольным райкомам партыі партызану М. Хілінскаму, гаворыцца: "...Сярод байцоў і камандзіраў таварыш Хілінскі карыстаўся даверам і аўтарытэтам. Акрамя баявых дзеянняў праводзіў у вёсках агітацыйна-масавую работу. Пісаў вершы і лістоўкі, у якіх заклікаў народ на адкрытую барацьбу з нямецкімі акупантамі. Як прыкладны баец-агітатар Хілінскі выбіраецца членам бюро камсамольскай арганізацыі 256-га партызанскага атрада, сакратаром ротнай камасамольскай арганізацыі 256-га партызанскага атрада, сакратаром ротнай камсамольскай арганізацыі, а затым сакратаром Журавіцкага райкома камсамола".

Н. Хацяшоў

На Кармянскай прыстані

На Кармянскай прыстані акупанты рыхтавалі да навігацыі газаход (від парахода), каб вывезці нарабаванае. Група партызан пад камандаваннем Сямёна Хадановіча пасля перастрэлкі з аховай узарвала яго.

На прыстань прыгналі яшчэ адзін газаход з трыма баржамі. Транспарт загрузілі бульбай, зернем, мясам для адпраўкі ў Гомель. Аб гэтым паведамілі партызанам былыя паліцаі Пікін і Казакоў, перайшоўшыя да мсціўцаў з ручным кулямётам і ружжом. Непадалёк ад вёскі Васільеўка рота Шумскага напала на газаход. Ахова была перабіта, газаход патоплены, а баржы панесла цячэннем.

У маі на прыстань для адпраўкі награбленай маёмасці фашысты прыгналі новы газаход і тры баржы. Ва ўрочышчы Пясочнае група партызан пад камандаваннем камандзіра атрада імя Варашылава А. І. Ушава напала на транспарт. Баржы былі патоплены, але камандзе газахода ўдалося збегчы ў Гомель.

...У маі 1943 г. пасля цяжкіх баёў у лозаўскім лесе Буда-Кашалёўскага раёна, дзе быў разгромлены рэгулярны нямецкі полк, а таксама гарнізоны ў Баб-

руйску, Гомелі, Чачэрску, Рагачове, Доўску, у Кармянскае засожжа перадыслацыравалася 10-ая Журавіцкая брыгада генерал-маёра І. М. Дзікана.

Партызаны атрада імя Варашылава выбралі месца пераправы брыгады ў раёне Прыбара Валынцаўскага сельскага Савета. Забяспечылі яе лодкамі, плытамі. Каб фашысты знянацку не парушылі планаў, былі выстаўлены заслоны, засады і занята кругавая абарона вакол пераправы. Пераправа працягвалася ўсяго чатыры гадзіны.

А. Ушаў

Партызан Іван Юрчанка

У снежні 1942 г. Кармянская падпольная група накіроўвае сувязнога Івана Юрчанку ў 260-ы партызанскі атрад 10-ай Журавіцкай брыгады. Юнака прызначаюць камандзірам аддзялення і рэкамендуюць шукаць зброю, падбіраць надзейных людзей. Вялікую дапамогу маладому камандзіру аказаў жыхар вёскі Пятравічы Мацвей Арцёменка.

Першая баявая аперацыя — разгром паліцэйскага гарнізона ў вёсцы Задуб'е — была праведзена з партызанскай кемлівасцю і воінскай арганізаванасцю. У ноч з 10 на 11 снежня гарнізон акружылі. Юрчанка, апрануты ў форму гітлераўскага афіцэра, з ад'ютантам накіраваліся да камендатуры. Там было спакойна: адны пілі самагон, другія спалі.

— Ні з месца! Здаць зброю! — скамандаваў "нямецкі" афіцэр.

Супраціўлення ніхто не аказаў, а на допыце партызаны даведаліся, што літаральна за гадзіну назад з гарнізона ў Пятравічы ад'ехаў начальнік кармянскай паліцыі Доўгань. Іван Юрчанка і Васіль Дзякаў вырашылі захапіць здрадніка. У Пятравічах Доўганя знайшлі хутка, але той адстрэльваўся, пакуль не насцігла трапная партызанская куля.

З вёскі вярталіся напрасткі, праз поле, каб хутчэй трапіць у атрад. Злосны сіверка прадуваў нават ватнік. Ішлі моўчкі, трывожна ўглядваючыся ў цемру. Раптам наперадзе выраслі чатыры незнаёмыя постаці. Заляскалі затворы ружжаў. "Ворагі!" — партызаны кінуліся ў розныя бакі. Юрчанка бег да стомы, пакуль не пакінулі астатнія сілы. Выпушчана апошняя куля, зроблены апошні крок — юнака акружылі, павалілі, пачалі біць прыкладамі.

— Дзе партызаны? Хто паслаў забіць Доўганя? Хто кіруе падпольшчыкамі? — Юрчанка не паспяваў адысці ад допыту, як пачынаўся чарговы.

Праз колькі дзён яго, акрываўленага, прывезлі да рова, што выкапалі кармянцы яшчэ летам 41-га, і загадалі:

— Капай!

Іван зразумеў, што яма будзе прызначана яму. Мёрзлая зямля ледзь паддавалася аслабленаму юнаку. Калі ён выкапаў магілу, партызана паставілі на край, канвой ўзняў аўтаматы:

— Ты ест партызан? — замест каманды спытаў нямецкі афіцэр, — дзе твой атрад?

Юнак маўчаў. Гітлеравец узмахнуў рукой — раздаўся стрэл. Міма.

— Лічу да трох, гавары...

І другі стрэл, трэці. Маўчанне вывела фашысцкага афіцэра, і ён накінуўся на Юрчанку. Біў, пакуль юнак не зваліўся на халодны жвір толькі што выкапанай магілы.

Юрчанку зноў павезлі ў камендатуру. Новыя допыты. Але ўскрыццё трупа Доўганя паказала, што той хутчэй за ўсё перабраў гарэлкі. І стала гэта вядома тады, калі абавязкі дзяжурнага выконваў другі афіцэр. Не ведаючы спаўна абставін справы, ён загадаў вызваліць Юрчанку. Так, цудам, Іван зноў апынуўся на волі. Праз якую гадзіну яго ўжо шукалі па ўсёй Карме, але дарэмна.

...Гарачымі былі партызанскія будні. Грамілі ворага ў Каменцы, Ходасавічах, Янаўцы, Лозаве, Гарадку, Серабранцы, Доўску. У сакавіку 1943 года ствараецца падрыўная група, узначаліць якую даручылі Івану Юрчанку. Падрыўнікамі сталі Уладзімір Рабчанка, Фёдар Нікіцін,

Аляксей Талкачоў, Мікалай Карпенка, Антон Мацюшэнка, Іван Савіцкі, іншыя партызаны.

...Першае адказнае даручэнне падрыўнікі выканалі ў час лозаўскага бою. Яны замініравалі шлях ля ўрочышча Царкоўнае, што не дало магчымасці карнікам прыцягнуць да бою танкі і самаходкі. Мініраванне правеў Уладзімір Рабчанка з двума партызанамі.

З прыходам вясны колькасць дыверсійных аперацый значна ўзрасла. Асабліва важнымі былі выхады на чыгунку. Атрымаўшы заданне ўзарваць цягнік паміж Рудняй і Салтанаўкай, падрыўнікі Юрчанкі выйшлі з базы апоўначы...

Недзе далёка за лесам чуецца шум паравоза. Эшалон набліжаўся павольна, быццам адчуваючы небяспеку. На нейкі момант цемру асвяціла запалка, зашыпеў, запырскаў маленькімі іскаркамі канец шнура. Прыгнуўшыся, падрыўнікі бягуць у бок кустоў да выратавальнага лесу. У гэты момант за спінамі паветра скаланае магутны выбух. У водбліску зарыва ўздыбіўся паравоз, застыў на нейкія секунды і павольна лёг на бок. Адзін на адзін папаўзлі вагоны, пачалі рвацца снарады...

12 мая на перагоне Рудня – Буда-Кашалёўская пушчаны пад адхон яшчэ адзін эшалон. На гэты раз немцы не далічыліся танкаў, гармат, боепрыпасаў.

...А праз тры дні на шашэйцы паміж Новымі Журавічамі і Доўскам узляцеў у паветра мост, былі зрэзаны тэлеграфныя слупы на ўчастку ў 9 кіламетраў ад Лясной Пошты да Зялёнай Паляны. Непадалёк падарваліся на партызанскіх мінах дзве аўтамашыны з гітлераўцамі.

19 мая 1943 г. другі раз на перагоне Рудня – Салтанаўка падрыўнікамі групы Івана Юрчанкі пушчаны пад адхон нямецкі эшалон з жывой сілай, тэхнікай і боепрыпасамі.

Чэрвень 1943 г. Вораг збірае ўсе сілы, каб папоўніць парадзелыя рады сваіх вояк перад Курскай бітвай. Чыгунка пад пільнай аховай: цягнікі ідуць адзін за адным. Некалькі дзён і начэй спрабавалі падрыўнікі Юрчанкі падысці да палатна, але ўсё было дарэмна. Час вяртацца ў атрад. Узарваўшы на маскоўскай шашы мост, спаліўшы матавоз ля в. Гуцішча, знішчыўшы на 9 кіламетраў сувязі на шашы Гомель – Доўск, Задзідаўка – Новыя Журавічы, група вяртаецца назад. Кароткі адпачынак — і новы рэйд да чыгункі. На гэты раз у раён станцыі Шабыраўка, што непадалёк ад Буда-Кашалёва.

5 кастрычніка 1943 г. група падрыўнікоў Івана Юрчанкі разам з партызанамі 10-ай Журавіцкай брыгады ўлілася ў рады Чырвонай Арміі. Для самога камандзіра баявыя дарогі закончыліся на Паўднёвым Сахаліне, у Маока і Тайхары.

Радзіма высока ацаніла баявыя заслугі партызана і салдата. Два ордэны Баявой Чырвонай Зоркі, медалі "За адвагу", "Партызану Вялікай Айчыннай вайны" II ступені, "За перамогу над фашысцкай Германіяй", "За перамогу над Японіяй" і іншыя ўпрыгожваюць грудзі Івана Захаравіча.

У імя свабоды

Васіль марыў стаць аграномам, а давялося быць партызанам-падпольшчыкам. З першага дня фашысцкай акупацыі 14 – 16-гадовыя хлопцы згуртаваліся, каб не даваць ворагу хадзіць спакойна па беларускай зямлі. Васіль Касцючэнка, Аркадзь і Аляксандр Ушавы, Мікалай Архіпенка, Леанід Пімашэнка, Мікалай Пімашэнка вырашылі дзейнічаць.

Пасля контрнаступлення савецкіх войск пад Масквой юныя падпольшчыкі атрымалі даўно чаканыя лістоўкі — невялікія аркушы з чырвонай палоскай і подпісам: "Прачытай і перадай таварышу". ...Лістоўкі вырашылі расклеіць у Карме. На заданне пайшлі стрыечныя браты Аркадзь і Аляксандр Ушавы.

З даведкай ад старасты браты павезлі мяшок зерня для здачы на нарыхтоўчы пункт. Карма здавалася пустэльнай: вокны дамоў зіялі праваламі, прахожыя на

вуліцах трапляліся зрэдку. Першую лістоўку Ушавы прыклеілі на базары, дзе той-сёй з вяскоўцаў спрабавалі прадаць сена, бульбу, цыбулю. Другая з'явілася на дзвярах крамы. Яшчэ адна — на агароджы каля памяшкання паліцыі, побач з загадамі каменданта маёра Нахтыгаля.

Вясной 1942 г. юныя патрыёты вывелі са строю артылерыйскі цягач. Пасля таго адспецыялісты тыдзень корпаліся ў машыне, каб адрамантаваць яе.

Акупанты не паспявалі адпраўляць у Германію нарабаванае. На складах захоўваліся бульба, зерне, адзенне. У марозную зімнюю ноч юныя патрыёты наведалі адно з такіх сховішчаў, адчынілі насцеж усе дзверы, спілавалі вентыляцыйныя трубы над буртамі, знялі ўцяпляльную пракладку. Удзел у аперацыі прынялі Васіль і браты Ушавы, Лёня Пімашэнка і Коля Архіпенка.

Вясной 1943 г. Васіль Касцючэнка, Аркадзь і Аляксандр Ушавы, Мікалай Пімашэнка сталі байцамі партызанскага атрада імя Варашылава. Сядзелі ў засадах, хадзілі ў разведку. На пачатку восені ў няроўным баі з фашыстамі загінуў Аркадзь Ушаў.

...Ноччу з 1 на 2 кастрычніка партызанскі атрад імя Варашылава падышоў да дарогі Валынцы—Струмень, па якой каціліся адступаючыя фашысты: пяхота, грузавікі, абозы. Хуценька ўстанавілі кулямёты. Васіль Касцючэнка, Аркадзь Даўгушаў, Мікалай Пімашэнка, Адам Семяненка, Валодзя Свірыдзенка ледзь дачакаліся каманды адкрыць агонь. На струменскай дарозе ў тую ноч знайшлі сваю смерць многія гітлераўскія салдаты і афіцэры. Смела змагаўся ўзвод Мікалая Сычкова. Хлопцы падбілі 2 бронетранспарцёры, знішчылі 12 грузавікоў, дзесяткі падвод амуніцыі.

А днём партызаны сустрэліся з разведчыкамі 3-яй арміі, пад націскам якой армада гітлераўцаў адступала за раку Сож...

У родным калгасе "Чырвоны партызан" Васіль Касцючэнка працаваў рахункаводам. А перад правядзеннем аперацыі "Баграціён" пайшоў на фронт. Дамоў, на жаль, вярнуўся параненым, хварэў. Жыццё былога падпольшчыка было кароткім, але яркім...

Камсамольцы-партызаны Васіль Касцючэнка і Аркадзь Ушаў пахаваны на ўскраіне вёскі. Ім не было і васемнаццаці, калі са зброяй у руках сталі змагацца з ворагам. Дзеля свабоды яны заўчасна аддалі свае жыцці.

В. Ушаў-Ландыш

Апаленае вайной юнацтва

У Мінск Марыя Суворава паехала літаральна напярэдадні Вялікай Айчыннай. Напачатку была вучаніцай на радыётэхнічным заводзе, а потым стала працаваць самастойна.

У першыя ваенныя дні Марыя, як і многія яе равеснікі, спрабавала вярнуцца на Кармяншчыну, у родны Кляпін. І ёй гэта ўдалося. У Кляпіне дзяўчына яшчэ нават застала савецкіх воінаў, якія трымалі абарону на Сажы, дапамагала ім, з аднавяскоўцамі хадзілі капаць акопы. Але хутка і ў вёску прыйшлі акупанты. Марыя становіцца народным мсціўцам.

У пачатку 1942 г. на Кармяншчыне пачынае дзейнічаць партызанскі атрад. У ліку першых залічылі ў атрад Марыю. Прыйшла з гарачай упэўненасцю — помсціць ненавіснаму ворагу. За кароткі час дасканала вывучыла зброю, стала лепшым стралком роты, якой камандаваў Пётр Шумскі. Хадзіла на баявыя заданні. Не раз даводзілася глядзець смерці ў вочы.

Небяспечнай была аперацыя ў в. Лепяхі на Арлоўшчыне. Партызаны сумесна з суседнімі атрадамі вялі баі супраць фашыстаў. У той дзень яны разграмілі паліцэйскі гарнізон, у якім налічвалася да 60 фрыцаў і паліцаяў. Вяртаючыся з задання, сустрэліся з паліцаямі краснагорскага гарнізона Бранскай вобласці. І зноў бой! Сярод трафеяў аказаліся ручныя кулямёты, патроны, прадукты харчавання, медыкаменты.

Раптоўнасць і манеўранасць, хуткасць дзеянняў прыносілі партызанам поспех у баявых аперацыях супраць намнога большых сіл праціўніка.

Юныя мсціўцы

...У вёсцы Навасёлкі амаль з самага пачатку акупацыі дзейнічала патрыятычная група сямікласнікаў на чале з Яўгенам Новікавым. Хлопцы сабралі вялікую колькасць зброі, боепрыпасаў, некалькі скрынь толу. Без асаблівай асцярожнасці, часта адкрыта выказвалі яны сваю нянавісць да акупантаў, вялі агітацыю сярод насельніцтва. Жэня Новікаў і Ваня Кандрацьеў на дарозе Навасёлкі—Востраў устанавілі міну, на якой падарваўся нямецкі матацыкліст. Патрыёты марылі аб стварэнні партызанскага атрада, але хлапчукоў выдаў здраднік. Жэню і Ваню арыштавалі паліцаі. Пры вобыску на гарышчы ў Новікавых быў выяўлены сапраўдны склад зброі.

Юных мсціўцаў падвергглі катаванням. Ішлі дні, тыдні, але хлапчукі не здаваліся, мужна пераносілі здзекі. Следчы вырашыў уздзейнічаць на іх пры дапамозе маці Жэні. Убачыўшы жудасны выгляд дзяцей, крывавыя раны і струпы на целе, маці страціла прытомнасць.

— Не хвалюйся, мама, — ледзь трымаючыся ад слабасці, супакоіў яе Жэня. — Мы нікога не выдалі, а нам горш ужо не будзе. Ідзі дадому, не трэба паказваць катам сваю слабасць...

Хлапчукі былі закатаваны да смерці. У загадзе каменданта, які быў вывешаны на ўсіх вуліцах Кармы, адзначалася, што так будзе з усімі, хто пакваліцца на жыццё салдат фюрэра.

...Пасля акупацыі раёна ў вёсцы Гарадок пачала дзейнічаць падпольная камсамольская група. У яе ўваходзілі Уладзімір Масейкаў, Аляксандр Вішнеўскі, Іван Хадановіч, Міхаіл Малаткоў і Люба Вішнеўская. Яны збіралі зброю, вялі разведку ў гарнізонах, збіралі весткі аб планах карнікаў, распаўсюджвалі лістоўкі. Гібель Масейкава паставіла пад пагрозу ўсю групу. З дапамогай камуніста Іларыёна Хадановіча юныя падпольшчыкі ўстанавілі сувязь з райкомам партыі і ў кастрычніку 1942 г. уступілі ў атрад імя Варашылава.

А. А. Ушаў

Вёз хлапчук малако...

...Міша паправіў шапку, выйшаў за брамку і рашуча накіраваўся ў бок Доўска. Дарога знаёмая да кожнага ўзгорачка, кожнага павароту. Яшчэ б! Колькі разоў мераў хлапчук за апошні час гэтыя 18 кіламетраў ад роднай Каменкі да мястэчка. Шлях заканчваўся ў хаце цёткі Агаф'і Талкачовай. Ёй і нёс чарговы раз Міша партызанскія лістоўкі.

А пачалося ўсё так. Хата Марчанкаў у Каменцы Рыскоўскай стаяла на водшыбе, у самым пачатку вёскі. І званы ці нязваны госць часцей за ўсё заходзіў напачатку да іх: вады напіцца, аб вясковых навінах паразмаўляць. Неяк ноччу завіталі да Марчанкаў партызаны. Потым яны сталі, бадай, самымі частымі гасцямі. Аднойчы да Мішы звярнуўся высокі шыракаплечы юнак:

— Назіраю за табой, Міхаіл, чалавек ты сур'ёзны. Зброю вунь нам збіраеш, навіны аб фашыстах расказваеш. Хачу табе адну справу даручыць. Трэба ў Доўск надзейнаму чалавеку лістоўкі занесці.

Сэрца ў хлапчука забілася гарачэй, хутчэй: ён так хацеў быць патрэбным гэтым мужным людзям, якія білі акупантаў. Потым Міша даведаўся, што размаўляў з Уладзімірам Палякшанавым, сакратаром касамольскай арганізацыі 256-га партызанскага атрада 10-ай Журавіцкай брыгады.

...Вось усе 18 кіламетраў засталіся за спінай. Міша ўжо бачыў знаёмую хату Талкачовых, як раптам пачулася: "Здароў, сябра!" Перад хлапчуком стаяў Мікола Кірпаносаў, былы ваеннапалонны, які асеў у Каменцы.

—Куды шлях трымаеш? — запытаўся Кірпаносаў.

— Маці за соллю паслала.

— За соллю, дык за соллю, — Мікола ўсміхнуўся, а потым, хутка азірнуўшыся, прыглушана прашаптаў:

— Заўтра з Доўска немцы на Каменку збіраюцца. Сам чуў, калі афіцэр боты чысціў. Трэба перадаць партызанам, папярэдзіць.

— Не ведаю я ніякіх партызанаў, — пачаў было Міша, але Кірпаносаў яго перарваў:

— Мая справа сказаць, а твая — папярэдзіць. Бывай, знаёмец...

Назад Міша і не заўважыў, як праляцелі тыя доўгія кіламетры, як дабраўся ў Рыскоў, у штаб партызанскай брыгады. Слова ў слова перадаў размову з Кірпаносавым. "Вось што — ты тут паснедай, а мы абмяркуем усё, падумаем", — адказаў Піліп Карпавіч, начальнік штаба.

Праз паўгадзіны хлапчука выклікалі ў штаб.

— Такая справа, брат, — пачаў начальнік штаба. — Навіна, вядома, цікавая. Але як запэўніцца, што гэта не падман? Давай зробім так. Заўтра з флягай малака паедзеш у Доўск. Не спяшайся, убачыш немцаў, прапускай. На развілцы ля Доўска цябе сустрэнуць, перадасі запіску і гані назад да нас. Зразумеў? Удачы табе!

У Доўск Міша выехаў у прыцемках. Вось і Курганне, затым — Крыўск. Нікога. Няўжо Кірпаносаў падмануў? І тут з-за павароту пачулася ржанне коней. Выехала павозка, затым яшчэ адна. "Хальт!" — да хлопца падбег паліцай.

— Куды і чаго ў такую рань?

— Стараста загадаў адвесці ў Доўск малако.

— Малако, — паліцай заглянуў у флягу і крыкнуў немцам: — Млеко, зольдат...

— О, гут-гут... карашо млеко!

Шлях да Доўска быў свабодным. А хутка і развілка. Зноў назад. Партызаны сустрэлі карнікаў агнём. Ніхто з фашыстаў і іх памагатых не вярнуўся ў гарнізон, а вечарам перад строем камандзір 256-га атрада аб'явіў піянеру Мішу Марчанку падзяку.

Ішла вясна 1943 г. Наперадзе ў юнака, сувязнога 10-ай Журавіцкай брыгады, былі яшчэ баі, разведка, уцёкі са спаленай карнікамі роднай Каменкі, раненне. Было яшчэ доўгае жыццё, жыццё, у якім Міхаіл Марчанка сустрэў і права на подзвіг, і права на шчасце.

М. Гелер

Газета "Зорька". 10 сакавіка 1989 г.

Юныя патрыёты

...У вёсцы Каменка 15-гадовы Ілья Дзенісенка з аднагодкамі збіраў зброю і перадаваў яе партызанам. Ён з выключнай адвагай і рашучасцю выконваў абавязкі сувязнога, а затым стаў слаўным разведчыкам 10-ай Журавіцкай брыгады. Пры выкананні адказнага задання камандавання ў складзе разведгрупы 362-ой стралковай дывізіі Ілья Дзенісенка загінуў. Юнак пахаваны ў брацкай магіле ў вёсцы Беразякі разам з байцамі і афіцэрамі Чырвонай Арміі, якія прынеслі вызваленне.

Таня Маскалёва пражывала ў пасёлку Бурны. Яе мужнасць выклікала павагу нават у дарослых сувязных і разведчыкаў. Неяк камандаванню Кармянскага атрада імя Варашылава трэба было перадаць пісьмо начальніку турмы. Быў намер схіліць яго да супрацоўніцтва з тым, каб аблегчыць становішча зняволеных. Размова ішла ў прысутнасці Тані, якая толькі што прынесла чарговае данясенне. Дарослыя з увагай аднесліся да прапановы Тані ўручыць пісьмо з яе дапамогаю.

— Ты, Таня, павінна ведаць, што цяжка давядзецца не толькі перадаць пісьмо, але і выбрацца ў выпадку небяспекі, — папярэдзілі дзяўчыну камандзіры.

— Пастараюся не трапіць ім у рукі, — сур'ёзна адказала Таня.

І дзяўчына выканала заданне. Высачыўшы нямецкага прыслужніка, Таня пе-

радала яму пасланне партызан. І пакуль той адкрываў канверт, знікла ў завулку.

К. Мурашкоў

З успамінаў Аляксандра Ігнатавіча Міхаленкі, былога вязня канцлагера

В нашей семье было четверо детей. Я – самый младший. Зимой 1942/43 г. вместе с такими же, как и я, был угнан в Германию. Сначала нас привезли в деревню Красный Берег Жлобинского района. Там погрузили в товарные вагоны и повезли. Так мы, около четырехсот подростков, оказались на западе Германии, в местечке Альтизель. Содержали нас в бараках, окруженных колючей проволокой. Спать доводилось на 3-ярусных нарах. Кормили очень плохо, многие умирали от голода и болезней. Мы восстанавливали железные дороги, копали траншеи и окопы для немецкой обороны.

В начале февраля 1945 г. лагерь освободили американцы, но по-прежнему мы продолжали там жить. Правда, еда стала намного лучше.

Сразу после Победы нас передали советским войскам. И к середине мая 1945 г. я прибыл домой в д. Лабыревка, которая была сожжена немцами при отступлении.

Вызваленне

Камандуючы фронтам генерал арміі К. К. Ракасоўскі загадаў 3-яй арміі актывізаваць дзеянні, каб не дапусціць умацавання групоўкі праціўніка ў раёне Гомеля за кошт перакідкі сіл, якія абараняліся на ўчастку Прапойск – Багданавічы.

Камандаванне арміі для вырашэння пастаўленай задачы выбрала найбольш радыкальны, на яго думку, спосаб – перайсці ў наступленне сіламі трох дывізій з мэтай пашырэння плацдармаў на рацэ Сож ля Касцюкоўкі.

Наступленне пачалося 12 кастрычніка сіламі 120-ай гвардзейскай, 269-ай і 121-ай гвардзейскай стралковых дывізій. За тры гадзіны бою нашы войскі захапілі на заходнім беразе Сажа населеныя пункты Касцюкоўка, Салабута і Студзянец, а ў наступныя дзве гадзіны прайшлі ўперад яшчэ на 1,5–5 кіламетраў. Хутка праціўнік падцягнуў рэзервы і зрабіў рад контратак, падтрыманых моцным артылерыйскім агнём... Нам стала ясна, што пашырэнне плацдарма было памылковым. Тады камандуючы арміяй выказаў камандуючаму фронтам свае меркаванні: калі пашырыць паласу 3-яй арміі за кошт правага суседа на 15 кіламетраў, нашы актыўныя дзеянні на гэтым участку будуць больш паспяховымі і прывядуць да захопу буйнога плацдарма.

...Фарсіраванне пачалося на досвітку 25 кастрычніка пасля 10-мінутнага агнявога налёту. У гэты дзень некалькім злучэнням удалося захапіць плацдарм памерам па фронту на 6 кіламетраў і ў глыбіню на 3 кіламетры, адбіўшы дзве буйныя контратакі пяхоты і танкаў. Але да вечара выявілася, што ў арміі засталося каля 0,3 боекамплекта. Усё гэта прывяло да таго, што наступленне войск арміі к канцу другога дня было спынена. Варта прызнацца, што горкі ўрок няўдалага наступлення ля Касцюкоўкі не пайшоў нам на карысць.

...Неўзабаве ў штаб арміі паступіла інфармацыя са штаба фронту аб тым, што ля Рэчыцы захоплены палонныя з пяхотнай дывізіі, якая раней дзейнічала супраць 3-яй арміі. Камандуючы фронтам загадаў нам зноў зрабіць сур'ёзную спробу пашырыць адзін з плацдармаў, каб не дапусціць далейшай перакідкі войск праціўніка да Рэчыцы.

Да гэтага часу становішча ў паласе дзеянняў 3-яй арміі змянілася. Групоўка праціўніка ля Касцюкоўкі і на поўнач ад яе зменшылася з-за перакідкі часцей у раён

Помнік на месцы фарсіравання р. Сож 22 лістапада 1943 г. каля в. Касцюкоўка (в. Міхееўка)

Гомеля і Рэчыцы. Да сярэдзіны лістапада мы змаглі назапасіць боепрыпасаў, часткова папоўніць асабовы састаў у дывізіях. Усё гэта дазволіла дабіцца перавагі над ворагам на выбраным для ўдару ўчастку, разлічваць на поспех наступлення.

Прарыў абароны праціўніка вырашана было здзейсніць сіламі чатырох стралковых дывізій. Дзве з іх наносілі франтальны ўдар у напрамку Хляўно — Рэкта — Журавічы, а дзве іншыя прызначаліся для дзеяння на флангах: адна ў напрамку Прапойска, а другая — Кармы з задачай скараціць абарону ворага да поўначы і поўдня ад участка прарыву заходняга берага Сажа.

Найбольш напружанымі былі дзве ночы перад наступленнем. Трэба было непрыкметна для праціўніка на невялічкім плацдарме сканцэнтраваць па аднаму стралковаму палку з дывізіёна артылерыі ад 362-ой, 283-яй, 17-ай і 121-ай гвардзейскіх стралковых дывізій.

Наступленне пачалося 22 лістапада 1943 г. у 9 гадзін раніцы. Пасля 10-мінутнага агнявога налёту пяхота батальёнаў першага эшалона імкліва ўварвалася ў першую траншэю праціўніка. Да 11 гадзін часці авалодалі Касцюкоўкай, Салабутай і Студзянцом, а да зыходу дня, нягледзячы на моцнае супраціўленне ворага і яго контратакі, злучэнні арміі выйшлі: 362-ая стралковая дывізія да Гайшына; 283-яя перарэзала шашу на поўнач ад Слаўні; 17-ая стралковая дывізія падышла да Слаўні і авалодала шашой; 121-ая гвардзейская стралковая дывізія заняла Рудню і Касаляцкі. Другі эшалон арміі — 41-ы стралковы корпус — да 20 гадзін сканцэнтраваўся ў раёне Лабыроўкі і лесу на захад ад яе, ачысціўшы яго ад дробных груп ворага; 269-ая дывізія, якая знаходзілася ў рэзерве, да зыходу дня выйшла ў раён Хляўно.

Такім чынам, аперацыя пачалася паспяхова. За першы дзень наступлення плацдарм быў пашыраны да 20 кіламетраў у шырыню і да 8—10 у глыбіню. Войскі арміі захапілі каля 200 палонных, 41 гармату, 50 мінамётаў і шмат рознай маёмасці і рыштунку. Каб не даць ворагу перадышкі, наступленне не спынялася і ўначы. 23 лістапада ў мэтах нарошчвання ўдару ў бой быў уведзены 41-ы стралковы корпус, а 24 лістапада — 269-ая стралковая дывізія...

Імклівае наступленне 283-яй стралковай дывізіі з'явілася вынікам умелага кіраўніцтва яе камандзіра палкоўніка В. А. Канавалава. 269-ая стралковая дывізія пад камандаваннем ініцыятыўнага, бясстрашнага камандзіра палкоўніка А. Ф. Кубасава, якая захапіла ў начным баі мястэчка Журавічы, таксама вызначылася ў гэтых баях.



Карта-схема прарыву варожай абароны і вызвалення Кармянскага р-на

За тры дні наступлення прарыў быў пашыраны па фронту ўжо да 40 кіламетраў, а глыбіня прасоўвання войск дасягала 50 кіламетраў. У выніку выхаду часткі арміі да Дняпра варожая групоўка, што абаранялася ў міжрэччы Сож – Днепр, была раздвоена. Цяпер удар нашых войск накіраваўся на вузел шашэйных дарог Доўск, у тыл гомельскай групоўкі праціўніка.

Друкуецца ў перакладзе на беларускую мову паводле артыкула генерала арміі А. Гарбатава і генерал-лейтэнанта М. Івашачкіна "Наступленне 3-яй арміі на поўнач ад Гомеля". З часопіса "Военно-исторический журнал". 1962. № 8.

Падрыхтаваў Р. Залесны

Дакументы сведчаць

Даведка начальніка штаба 17-ай стралковай дывізіі аб папаўненні яе асабістага складу і матэрыяльнай часткі за кошт 10-ай Журавіцкай партызанскай брыгады

5 кастрычніка 1943 г.

Выдана 10-й Журавичской партизанской бригаде штабом 17-й стрелковой дивизии 5.10.1943 года, принято личного состава и материальной части:

Партизанский отряд № 261 — 110 чел., 1 станковый пулемет, 3 50 мм миномета, 110 винтовок, 1 повозка, 1 конь.

Партизанский отряд № 264 — 125 чел., РПД — 7, ППШ — 4, винтовок — 125.

Партизанский отряд № 265 — 110 чел., ручных пулеметов — 6, автоматов — 4, ПТР — 1, винтовок — 96.

Партизанский отряд № 266 — 52 чел., ППШ — 5, РПД — 3, ручных пулеметов — 3, станковых пулеметов — 3, винтовок — 40, минометов 82 мм — 1, повозок — 1, лошадей — 2.

Партизанский отряд № 267 — 32 чел., станковых пулеметов — 1, винтовок — 23, повозок — 2, лошадей — 2.

Партизанский отряд № 268 — 25 чел., ручных пулеметов — 3, ручных немецких — 2, ППШ — 1, минометов 50 мм — 1 с 46 минами, винтовок — 18, повозок — 1, лошадей — 2.

Начальник штаба 17-й сд майор *Эпштейн*

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3946. Воп. 1. Спр. 1. Л. 338.

Распіска аб перадачы 261-ым партызанскім атрадам маёмасці 1312-му стралковаму палку

7 кастрычніка 1943 г.

Выдана мною, старшиной комендантского взвода, 1312 сп, Исаченко Евдокимом Денисовичем командиру 261-го п/о в том, что я взял для 1312-го сп одну повозку, двух лошадей, сапожный инструмент, 1 швейную машину.

В чем и расписываюсь.

Подпись

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3946. Воп. 1. Спр. 1. Л. 337.

Гомельска-Рэчыцкая аперацыя

З успамінаў Логвіна Данілавіча Чэрвонія, былога камандзіра 121-ай гвардзейскай стралковай дывізіі

Пасля паспяховага завяршэння контрнаступлення пад Курскам савецкія войскі ў верасні 1943 г. працягвалі баі на бранскім, чарнігаўскім і кіеўскім накірунках. Пасля разгрому нямецкай групоўкі пад Бранскам войскі аднайменнага фронту ў пачатку кастрычніка выйшлі на Сож на поўнач ад Гомеля і захапілі некалькі плацдармаў на заходнім беразе ракі.

Л. Д. Чэрвоній

Тут немцы загадзя падрыхтавалі рубеж абароны з добра развітой сеткай траншэй, хадамі сувязі, дзотамі, перад лініяй абароны цягнуліся мінныя палі і дротавыя загарадкі.

Войскі 3-яй арміі генерала А. В. Гарбатава Бранскага (з 20 кастрычніка — Беларускага) фронту атрымалі задачу актыўнымі дзеяннямі не дапускаць узмацнення групоўкі нямецкіх войск у раёне г. Гомеля за кошт зняцця часткі сіл, якія абараняліся перад яе фронтам.

Камандаванне арміі рабіла неаднаразовыя наступы ў розных напрамках, але поспеху яны не прынеслі. У лістападзе 1943 г. прымаецца рашэнне правесці наступленне з маленькага плацдарма ля вёскі Касцюкоўка (Міхееўка, пазней на картах — Хляўно) з задачай выйсці да ракі Днепр, захапіць перакрыжаванне шасейкі ля Доўска і закрыць шляхі адыходу гомельскай групоўцы на захад.

Прарыў нямецкай абароны вырашана было ажыццявіць сіламі чатырох дывізій. Дзве з іх — 362-ая і 178-ая стралковыя — наносілі франтальны ўдар на Хляўно, Рэкту, Журавічы. Адна дывізія, дзейнічаючы ў флангу, павінна была павярнуць баявыя нямецкія пазіцыі на поўнач у бок г. Прапойска. 121-ай гвардзейскай стралковай дывізіі, якая займала абарону на ўсходнім беразе ракі Сож на фронце Студзянец—Загор'е, было загадана скаваць нямецкую абарону невялікімі сіламі на фронце Студзянец—Загор'е, наносячы ўдары на Рудню—Зяцькавічы, зламаць баявыя парадкі 110-ай нямецкай пяхотнай дывізіі на поўдні, паслядоўна ўводзячы ў бой свежыя сілы, вызваліць Карму. У далейшым наступаць на Сырск, Багданавічы, Хізаў.

Войскі ўводзіліся на плацдарм ноччу, каб раніцай салдаты былі ўжо добра замаскіраваны. Надвор'е было непрыглядным: церушыў дождж са снегам, дзьмуў пранізлівы вецер. Зімовага абмундзіравання яшчэ не атрымалі, у сырых акопах было холадна.

22 лістапада 1943 г. у 9.00 раніцы правялі дзесяцімінутны артналёт па агнявых кропках ворага. Распачаў атаку 342-і гвардзейскі стралковы полк падпалкоўніка Ф. І. Ячменева. Авалодаўшы першымі дзвюма траншэямі ворага, другі батальён капітана А. М. Мешчаракова ўварваўся на паўночную ваколіцу вёскі Студзянец. Але з-за развалін пабудоў варожы дзот адкрыў агонь у фланг батальёна. Байцы заляглі. Камандзір вылучыў ударную штурмавую групу пад камандаваннем старшага сяржанта М. М. Шыкіна. Дзот быў блакіраваны і падарваны. Трэці батальён капітана В. П. Масквіціна, які наступаў злева, зламаўшы супраціўленне фашыстаў, уварваўся ў Студзянец з поўдня.

Імклівасць атакі 342-га палка была для ворага настолькі нечаканай, што фашысты, кідаючы забітых, раненых, тэхніку, сталі адыходзіць да пасёлкаў Рагозны і Касаляцкі. Паказваючы ўзоры мужнасці, рота, якой камандаваў капітан М. Г. Калінкін, пачала праследаванне. Вырваўшыся з невялікай групай наперад і блакіруючы чарговы дзот ворага, камандзір загінуў. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Калінкіну Міхаілу Герасімавічу пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Рота, імкнучыся адпомсціць фашыстам за смерць любімага камандзіра, уварвалася ў пасёлак Касаляцкі.

337-ы гвардзейскі полк падпалкоўніка В. А. Бережнога, які знаходзіўся ў другім эшалоне, фарсіраваў раку Сож і, разгортваючыся з-за правага фланга 342-га палка, павёў наступленне на Рудню. Адбіваючы шматлікія контратакі, полк захапіў вёску Рудня. У баях за Рудню вызначыўся трэці батальён капітана Е. І. Бузыкіна. Сам камандзір у час бою быў паранены, але застаўся ў страі да поўнай перамогі. Е. І. Бузыкін узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені.

Захапіўшы вёскі Студзянец, Рудня, пасёлкі Рагозны, Касаляцкі, 337-ы і 342-і палкі да зыходу дня 22 лістапада выйшлі да ракі Касалянка.

На другі дзень наступлення палкі дывізіі пачалі адчуваць востры недахоп

боепрыпасаў і прадуктаў харчавання. Непагадзь, бездараж не давалі магчымасці дастаўляць іх у неабходнай колькасці. Даводзілася нават выкарыстоўваць для гэтых мэт разам з іншымі відамі транспарту і самалёты У-2.

На досвітку 23 лістапада вораг прадпрыняў моцныя контратакі каля вёсак Зяцькавічы, Вазнясенск, Ліцвінавічы. Пяхоту гітлераўцаў падтрымлівалі танкі. Адбіўшы гэтыя контратакі, 337-ы полк уварваўся ў Кабылічы і Зяцькавічы, працягваючы адцясняць немцаў. 342-і полк увёў у бой першы батальён і захапіў Прасвет, Васкрасенск, Калініна, Ліцвінавічы. Такім чынам, дывізія за два дні баёў выйшла на рубяжы: Зяцькавічы, Вазнясенск, Калініна, прайшоўшы ўперад на 12—15 кіламетраў.

Вечарам 23 лістапада 340-ы гвардзейскі полк падпалкоўніка Ф. З. Слюсарэнкі, які трымаў абарону па ўсходняму берагу ракі Сож, фарсіраваў яе сіламі першага батальёна М. С. Цыбульскага ў раёне вёскі Новы Луч і другім батальёнам Н. Т. Бубнова ў раёне вёскі Рассвет. Пачалося наступленне на пасёлак Карму. Захапіўшы вёскі Новы Луч, Чырвоны Бор, Ветку, батальён Цыбульскага выйшаў на ўсходнюю ваколіцу Кармы. Батальён маёра Бубнова заняў вёскі Рассвет, Казакі, вышыню 155,2, вёску Сапажкі, пасёлак Бурны і ўвязаўся ў бой за пасёлак Шырокі.

У гэты час 337-ы полк, адбіўшы дзве контратакі ворага з боку Янаўкі і Лебядзёўкі, выйшаў на рубеж Лебядзёўка.

342-і полк, адбіўшы контратаку немцаў з боку Масцеравой Слабады, авалодаў Вынашаўкай і вышынёй 155,2, выйшаўшы так на паўночна-заходнюю ваколіцу Кармы. Да зыходу дня 24 лістапада Карму нашы войскі абышлі з трох бакоў.

...Мястэчка Карма размешчана каля вузла шасейных дарог, якія звязваюць Прапойск, Гомель, Магілёў, Журавічы. Нямецкае камандаванне надавала абароне Кармы вялікае значэнне, стварыўшы тут магутны абарончы вал на паўночных подступах да Гомеля. Акрамя 252-га пяхотнага палка 110-ай палявой дывізіі сюды быў уведзены 123-і запасны батальён. Абарону Кармы вёў гарнізон, узмоцнены вялікай колькасцю артылерыі, танкаў і САУ. Гітлераўцы разумелі, што страта мястэчка пазбавіць іх магчымасці манеўраваць сваімі рэзервамі і закрые шляхі адыходу гомельскай групоўцы на захад, за Днепр. Усё гэта абумовіла жорсткі характар яе абароны.

На працягу 24 лістапада наша дывізія была папоўнена боепрыпасамі, палепшылася справа з забеспячэннем часцей ежай. І нягледзячы на тое што салдаты вельмі стаміліся, камандаванне прымае рашэнне пачаць штурм Кармы 24 лістапада ў 21.00. Магутны артылерыйска-мінамётны агонь па важнейшых вузлах нямецкай абароны і агнявых кропках паведаміў аб пачатку штурму.

Немцы супраціўляліся з усіх сіл. Ішла барацьба за кожную вуліцу, кожны квартал, дом. Практыка ўзяцця населеных пунктаў ноччу якраз тут вельмі спатрэбілася нашым воінам. Створаныя ў батальёнах штурмавыя групы адыгралі выключна важную ролю ў блакіраванні, падрыве агнявых збудаванняў ворага і ачыстцы будынкаў ад засеўшых там немцаў.

Шостую гадзіну ідзе жорсткі бой. 342-і гвардзейскі полк ужо ачысціў ад гітлераўцаў паўночную і паўночна-заходнюю часткі Кармы. Асобныя групы і падраздзяленні вядуць баі ў цэнтры мястэчка. 340-ы гвардзейскі полк захапіў усходнюю і паўднёва-ўсходнюю часткі мястэчка, а таксама перакрыжаванне галоўных шасейных дарог. Супраціўленне ворага паступова заціхае. Нарэшце — пералом, і немцы пачынаюць адступаць, мініруючы на сваім шляху падыходы да дамоў, перакрыжаванні вуліц, дарог. Робяць усё, каб затрымаць наша наступленне.

Імклівасць і начны націск гвардзейцаў даюць канчатковую перавагу над фашыстамі. Раніца 23 лістапада прынесла насельніцтву Кармы перамогу. Разгарнуўшы фронт у заходнім накірунку, дывізія на-

ступае на ворага, адразаючы яму шляхі адыходу за Днепр, і да ночы выходзіць на рубеж Барсукі — Навасёлкі — вышыня 168,5 — Добрыч.

У вызваленні мястэчка Карма асабліва вызначылася аддзяленне сапёраў 340-га гвардзейскага палка сяржанта Пескарова, якія абясшкодзілі 87 пяхотных і супрацьтанкавых мін і іншых "сюрпрызаў", пакінутых гітлераўцамі пры адступленні. У складзе штурмавых груп аддзяленне падарвала тры дзоты. Усе шасцёра сапёраў былі ўзнагароджаны ордэнам Славы III ступені.

На досвітку 26 лістапада воіны працягвалі наступленне. 337-ы полк — у накірунку Залужжа — Стары Крыўск, а 340-ы полк — Навасёлкі — Рэвут — Тарахаўка. У ноч на 26 лістапада немцы падцягнулі буйныя рэзервы і з раніцы рабілі контратакі на Навасёлкі і Рэвут. Адбіўшы іх, воіны 340-га гвардзейскага палка літаральна на плячах адыходзячага ворага ўварваліся ў Рэвут і ў жорсткім баі авалодалі вёскай.

27 лістапада ў баі на подступах да Тарахаўкі немцы пры падтрымцы цяжкіх танкаў "тыгр" і самаходна-артылерыйскіх установак тыпу "фердынанд" 9 разоў хадзілі ў контратаку на першы і другі батальёны маёраў Цыбульскага і Бубнова. Але гвардзейцы стаялі насмерць. Вораг не прайшоў. У час адной з нямецкіх контратак, кіруючы боем свайго батальёна, паказваючы прыклады мужнасці і вытрымкі, смерцю героя загінуў камандзір першага батальёна 340-га гвардзейскага палка маёр М. С. Цыбульскі. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 15 студзеня 1944 г. Мікалаю Сцяпанавічу Цыбульскаму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Гэтым жа ўказам за подзвігі, здзейсненыя ў баях на Кармяншчыне, званне Героя Савецкага Саюза прысвоена Мікалаю Міхайлавічу Шыкіну.

На рубяжы Стары Бялёў — Новае Жыццё — Берастьавец — Хізаў — Рэвут — Тарахаўка з 27 па 30 лістапада ішлі цяжкія баі. Знішчаючы жывую сілу і тэхніку ворага, 337-ы і 340-ы гвардзейскія палкі нанеслі яму цяжкія страты і прымусілі адыходзіць. 1 снежня 1943 г. воіны выйшлі да ўсходняга берага ракі Днепр на фронце Гадзілавічы — Рагачоў, 342-і гвардзейскі полк знаходзіўся ў другім эшалоне ў раёне Серабранкі.

...У выніку дзесяцідзённых баёў, якія распачаліся 22 лістапада, 121-ая гвардзейская стралковая дывізія фарсіравала раку Сож і прарвала моцна падрыхтаваную паласу абароны 110-ай нямецкай пяхотнай дывізіі, у жорсткіх баях выматала яе баявыя парадкі, не дала магчымасці фашыстам аднавіць абарону на поўдні Беларусі на фронце 25—27 кіламетраў.

Дывізія, прымяняючы абходны манеўр, вяла наступленне на поўдзень уздоўж галоўнай паласы абароны ворага. У далейшым поспех дывізіі і хуткі рух наперад усёй групоўкі арміі да Дняпра паставілі абарону ворага пад Гомелем у цяжкае становішча, прымусіўшы яго зняць адтуль частку сваіх сіл і перакінуць у раён Доўска.

Вечарам 26 лістапада 1943 г. савецкае Інфармбюро передало загад Вярхоўнага камандуючага І. В. Сталіна аб вызваленні горада Гомеля. Сярод часцей і злучэнняў, якія вызначыліся, першай была названа наша 121-ая гвардзейская дывізія. Яе ўдзел у вызваленні Гомеля быў высока ацэнены. Дывізіі прысвоілі найменне "Гомельская".

Пасля заканчэння Гомельска-Рэчыцкай аперацыі 121-ая гвардзейская Гомельская дывізія выводзіцца ў рэзерв Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання і, прайшоўшы больш як 400 кіламетраў у раён г. Карасцень, уліваецца ў склад 13-ай арміі 1-га Украінскага фронту.

У баях на Кармяншчыне дывізія вызваліла 110 населеных пунктаў. Яна нанесла ворагу значныя страты ў жывой сіле і тэхніцы. За мужнасць і гераізм было ўзнагароджана 1500 чалавек: салдат, сяржантаў, афіцэраў дывізіі.

Батальён ішоў у атаку


В. С. Круглікаў

Каторы ўжо раз з трапяткім хваляваннем бяру ў рукі пухнатую папку з маляўніча афармленым надпісам: "Яны вызвалялі Кармяншчыну". Тут змешчаны ўспаміны-памяць, успаміны-боль, фотаздымкі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, якія ў суровыя дні восені 1943-га, не шкадуючы жыцця, ішлі ў бой, каб вызваліць шматпакутную зямлю Кармяншчыны ад ненавіснага ворага. З аднаго фота глядзіць на мяне строгім позіркам ветэран 283-яй стралковай Чырванасцяжнай ордэна Суворава дывізіі былы палітработнік, маёр у адстаўцы В. С. Круглікаў, на грудзях якога ззяюць звыш дваццаці ўзнагарод за ратныя подзвігі ў Сталінградскай і Курскай бітвах, у баях за вызваленне Беларусі і Польшчы, за штурм Берліна.

...Халодная лістападаўская ноч 1943 г. Першы батальён 856-га палка 283-яй дывізіі на плацдарме ля вёскі Міхееўка заняў зыходны рубеж перад наступленнем. Камандзір палка падпалкоўнік Якунін паставіў задачу: выбіць ворага з паўднёвай часткі в. Міхееўка і развіваць наступленне на в. Хляўно, вызваліць яе ад ворага. Камсорг батальёна лейтэнант Круглікаў пабываў у ротах і ўзводах батальёна, гутарыў з байцамі.

— Вось мы і ступілі на зямлю нашай любіміцы Аннушкі Акінчыц, якая, паміраючы на руках байцоў, густа акрапіўшы сваёй гарачай крывёю зямлю расійскую, ціха шаптала: "Ідзіце дружней на ворага, там, наперадзе, Беларусь, мая Кармяншчына..."

Амаль кожны баец дывізіі ведаў і з гонарам узгадваў імя слаўнай патрыёткі. Пазней былы начальнік палітаддзела гэтай дывізіі Ц. А. Каваленка ў кнізе "Гомельская стралковая" напіша: "Прыгадваю сакратара 858-га стралковага палка старшага лейтэнанта Ганну Адамаўну Акінчыц, ураджэнку в. Сапажкі Кармянскага раёна Гомельскай вобласці. Яна вяла вялікую работу сярод моладзі, заўсёды знаходзілася на перадавой з аўтаматам у руках і санітарнай сумкай праз плячо — трапна страляла, выносіла раненых. За смеласць і мужнасць яе ўзнагародзілі ордэнам Айчыннай вайны і медалём "За адвагу". 8 сакавіка 1943 г. у баі ля вёскі Краснае на рацэ Неруч, імкнучыся дапамагчы параненаму камандзіру батальёна С. В. Кавалёву, Ганна Акінчыц прабіралася пад моцным агнём праціўніка на назіральны пункт. Варожая куля скасіла адважную дзяўчыну. Тады на магіле патрыёткі воіны пакляліся адпомсціць ворагу за смерць Ані і хутчэй вызваліць ад чужынцаў Кармяншчыну".

Раніцай цішыню абарваў грукат нашай артылерыі. На варожых пазіцыях паміж вёскамі Студзянец і Міхееўка ўздымалася зямля, вухкалі міны, рваліся снарады. Пад прыкрыццём артылерыйскага агню батальёны першага эшалона імкліва рынуліся на ворага. Шматгалосае "ўра!" пранеслася па ланцугу наступаючых байцоў.

— У атаку! — прагучаў над Сажом голас камандзіра 1-га батальёна 856-га палка А. В. Касенкі. Пад прыкрыццём туману байцы яго батальёна імгненна пераадолелі драцяную мінную загароду, уварваліся ў першую варожую траншэю. Завязаўся рукапашны бой. Лейтэнант Круглікаў з групай воінаў батальёна непрыкметна прабраліся да нямецкай батарэі, якая вяла агонь па наступаючых, падавілі гэтую агнявую кропку. 8 фашысцкіх ваяк засталіся вечна ляжаць каля разбітых гармат, астатнія, не вытрымаўшы націску смельчакоў, далі драпака ў бок Хляўна.

Камандаванне і афіцэры штаба 283-яй стралковай дывізіі 15 кастрычніка 1943 г.; р. Сож, в. Благадаць. Злева направа (сядзяць): камандзір артылерыйскай дывізіі маёр Смірноў, нам. камандзіра дывізіі палк. І. В. Груздоў, камандзір дывізіі В. А. Канавалаў, нач. штаба В. Куўшыннікаў, нач. палітаддзела Ц. А. Каваленка

Вёска Хляўно аказалася моцным арэшкам і з ходу яе ўзяць не давялося, бо фашысты на атакуючых байцоў першай роты батальёна абрушылі моцны кулямётны і аўтаматны агонь. Апрача гэтага, іхнія "фердынанды" вялі беглы агонь асколачнымі снарадамі па байцах роты. У ланцугу наступаючых атрымалася замешка. Салдаты заляглі, прыціснутыя моцным свінцовым дажджом. Атака захлынулася. Вораг пачаў контратакаваць роту. У гэты крытычны момант камбат капітан А. В. Касенка перадаваў Круглікаву:

— Вася, імчы ў роту і рабі ўсё магчымае, каб загад быў выкананы.

Пад Хляўном мясцовасць была роўнай і луг без кустоўя, бы той бубен, навылет прастрэльваўся ворагам. Камсорг усё ж дабраўся да ланцуга роты і, узняўшыся ва ўвесь рост, ускрыкнуў: "За мной! За Радзіму! За Аню! Наперад!" Байцы роты ўзняліся і кінуліся ў атаку на ворага. Фашысты не вытрымалі і пачалі адступаць, пакінуўшы на полі бою сваю гармату з боепрыпасамі. Байцы-смельчакі хуценька павярнулі варожую пушку, і хтосьці з іх кінуў жарт, гледзячы на камсамольца Парамонава:

— Ну што ж, Саша, дадзім салют у гонар твайго 18-годдзя, — і пачаў смаліць па чужынцах, якія, яшчэ шалёна агрызаючыся, адкочваліся ад вёскі Церахоўка.

На падыходзе да вёскі вельмі спатрэбілася тэлефонная лінія. Выканаць гэтую задачу было загадана камсамольцу А. А. Парамонаву. Ён па-пластунску папоўз з катушкай кабелю, але раптам быў цяжка паранены. Пераадольваючы боль, сцякаючы крывёю, Парамонаў цягнуў лінію,

П. В. Мажэйка

пакуль не страціў прытомнасць. На вялікі жаль, рана аказалася смяротнай, і ён назаўсёды знайшоў сабе спачын на зямлі суседняй з Хляўном Церахоўкі. У дзень ягоных імянін не тосты застольныя гучалі, а развітальны салют над магілаю-пагорачкам воіна-героя. Не чуў радавы Парамонаў, як салдаты ягонага батальёна вялі бой за вёску, а потым раптоўным ударам сумесна з часцямі дывізіі палкоўніка Канавалава авалодалі ёю і суседняй Чарнякоўкай і надвячоркам перарэзалі шашу Прапойск (зараз Слаўгарад) — Доўск у раёне в. Свенск, паспяхова выканаўшы гэтым самым задачу першага дня наступлення. Воіны дваццаці нацыянальнасцей удзельнічалі ў прарыве вельмі ўмацаванай абароны праціўніка ў раёне в. Міхееўка, а потым у кравапралітных баях вызвалялі ад чужынцаў тутэйшыя мясціны.

Былы начальнік палітаддзела 283-яй дывізіі Ц. А. Каваленка ў сваім успаміне расказвае:

"...У першых баях на зямлі Беларускай вызначыліся рускія... камбат і маёр С. В. Кавалёў (той самы камбат, імкнучыся якому аказаць дапамогу загінула Ганна Акінчыц. — *А. К.*), капітаны А. В. Касенка, Н. П. Лістуноў, украінцы начальнік штаба батальёна І. А. Беразняк, разведчыкі Н. А. Гнатчанка, П. С. Ганчарэнка, грузіны старшы лейтэнант Ш. А. Гогіхашвілі, камандзір стралковай роты О. М. Імедадзэ, азербайджанец камсорг 9-га гвардзейскага артпалка старшы лейтэнант С. Г. Азізаў, яўрэі камандзіры батарэі Н. Ш. Гімельштэйн і Д. Г. Гольберг, армянін камандзір роты А. Г. Авецісян, казах радавы К. Касенаў. Храбра змагаліся за вызваленне роднай зямлі воіны-беларусы начальнік штаба 856-га стралковага палка маёр Ф. І. Давыдзенка, камсорг 1-га стралковага батальёна гэтага ж палка лейтэнант В. С. Круглікаў... Воін-смяльчак прайшоў вогненнымі вёрстамі вайны праз усе нягоды выпрабаванняў, і сярод роспісаў на рэйхстагу ёсць і яго, хлебароба з вёскі Вепрын, што на Магілёўшчыне, Круглікава Васіля Савельевіча".

А. Кольчаў

Героі Савецкага Саюза — ураджэнцы Кармяншчыны

МАЖЭЙКА Павел Віктаравіч, нарадзіўся 28.12.1911 г. у в. Сапажкі. Скончыў Ленінградскую ваенна-тэарэтычную школу лётчыкаў (1933), Арэнбургскую школу лётчыкаў і лётчыкаў-назіральнікаў (1935). З чэрвеня 1941 г. на Паўднёва-Заходнім, Варонежскім, 1-ым і 4-ым Украінскім франтах ваенком авіяэскадрыллі, палка, нам. нач. палітаддзела дывізіі, нам. камандзіра асобнага палка па палітчастцы, камандзір авіяэскадрыллі, нам. камандзіра палка па лётнай падрыхтоўцы. Маёр Мажэйка вызначыўся ў баях за Карпаты ў жніўні 1944 — лютым 1945 г., на тэрыторыі Венгрыі і Чэхаславакіі. Зрабіў 112 вылетаў.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена ў 1945 г.

Да 1950 г. у Савецкай Арміі, падпалкоўнік.

Памёр 19.1.1987 г.

НЕСЦЯРОВІЧ Павел Уладзіміравіч, нарадзіўся 8.7.1913 г. у в. Енцы. На фронце з 1943 г. Удзельнік Курскай бітвы, вызвалення Рэчыцы, Бабруйска, Асіповіч, Баранавіч,

Польшчы, баёў ва Усходняй Прусіі. Сапёр сяржант Несцяровіч вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра каля Лоева.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена ў 1943 г.

Пасля вайны ў органах МУС БССР. Памёр 7.9.1974 г. Імем П. У. Несцяровіча названа вуліца ў в. Енцы.

Подзвіг на Дняпры

П. У. Несцяровіч

Павел Уладзіміравіч Несцяровіч у 1930-ыя гг. па камсамольскай пуцёўцы паехаў у Зейскі раён Амурскай вобласці, працаваў горным рабочым у капальні "Кастрычніцкая". Працаваў выдатна, быў ударнікам, карыстаўся аўтарытэтам сярод сваіх таварышаў па працы.

На шосты дзень вайны з нямецка-фашысцкімі захопнікамі Павел Несцяровіч быў прызваны ў армію і стаў салдатам-сапёрам. Мужна змагаўся ён з ворагам на Курскай дузе, пад Сеўскам і Ноўгарадам-Северскім, на Дзясне і Сажы.

...Гэта было ў кастрычніку 1943 года. Вайсковае падраздзяленне, у якім быў Павел Несцяровіч, выйшла да Дняпра ў раёне г.п. Лоева. У ноч з 14 на 15 кастрычніка аддзяленню сапёраў была пастаўлена задача: у 2—3 кіламетрах на поўдзень ад Лоева замераць шырыню Дняпра, устанавіць профіль дна, праверыць, ці ёсць на заходнім беразе міны.

Толькі лодка са смельчакамі дайшла да сярэдзіны ракі, як у неба ўзляцелі варожыя ракеты і засвісталі кулі. Але яны не спынілі сапёраў.

Раніцай 15 кастрычніка 1943 г. прыфрантавую цішыню ўскалыхнуў гул гармат і рэактыўных мінамётаў. Пачатак артылерыйскай падрыхтоўкі быў і сігналам для фарсіравання Дняпра. Лодка з разлікам, дзе быў старшым Павел Несцяровіч, адна з першых адышла з усходняга берага на заходні. Фашысты заўважылі байцоў, адкрылі моцны агонь. Вада кіпела ад разрываў і куль, прабіла лодку. Сярод дэсантнікаў з'явіліся параненыя. Але лодка, якой кіраваў Несцяровіч, ішла наперад. Калі да берага засталіся лічаныя метры, Павел Несцяровіч загадаў адкрыць агонь па фашыстах. Дэсантнікі выскачылі з лодкі і, страляючы на хаду з аўтаматаў і кулямётаў, кінуліся ў атаку. Ім на дапамогу спяшаліся ўжо воіны іншых падраздзяленняў. Вось і першыя траншэі ворага. Калі фашыстаў выбілі з іх, сапёр Несцяровіч з таварышамі забраў у лодку параненых дэсантнікаў і зноў перасёк Днепр. Камандзір роты т. Шавела ўключыў яго ў групу, якая павінна была перацягнуць цераз раку паромны трос і наладзіць пераправу артылерыі.

Зноў пад моцным агнём ворага сапёры пераправіліся на заходні бераг, замацавалі трос. Калі вярталіся назад, убачылі, што асколкам снарада перабіты трос. Павел Несцяровіч кінуўся ў ваду, за ім байцы Сласцін і Чакіраў. Адшукаўшы канцы троса, сапёры злучылі іх. Заданне было выканана.

30 кастрычніка 1943 г. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР радавому Несцяровічу Паўлу Уладзіміравічу і яго баявым сябрам-аднапалчанам сяржанту Ільгачову Івану Васільевічу, радавым Сласціну Васілію Мікалаевічу і Чакіраву Кузьме Емяльянавічу было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Пасля Дняпра Павел Уладзіміравіч удзельнічаў у баях за Вышамір, Ровенскую Слабодку, Каравацічы, Васілевічы, Дземяхі. Многа вогненных вёрст прайшоў воін-сапёр. У Польшчы, на Нараўскім плацдарме, Павел Уладзіміравіч быў цяжка паранены. Пасля шпіталя —

А. А. Філімонаў

курсы, а потым больш чвэрці стагоддзя служба ў органах міліцыі. Да баявых узнагарод ветэрана далучыліся новыя, пасляваенныя. Прозвішча Героя Савецкага Саюза выдатніка міліцыі Паўла Уладзіміравіча Несцяровіча было занесена ў Ганаровую кнігу Міністэрства ўнутраных спраў СССР.

Ф. Стэльмашок

ФІЛІМОНАЎ Аляксандр Андрэевіч, нарадзіўся 9.5.1918 г. у в. Кучын. Герой Савецкага Саюза (1945). З 1943 г. на Сцяпным, 1-ым і 2-ім Украінскіх франтах, камандзір танкавага ўзвода, роты. Вызначыўся ў баях на тэрыторыі Германіі. З 16.4. 1945 г. да 11.5.1945 г. рота на чале з Філімонавым фарсіравала р. Нэйсе і Шпрэе, знішчыла ачагі супраціўлення гітлераўцаў у адным з прыгарадаў Берліна. У баях з праціўнікам рота адбіла 10 контратак, знішчыла 12 танкаў і самаходных гармат, 11 палявых гармат, 35 кулямётных кропак, 20 грузавых аўтамашын і каля 500 гітлераўцаў. Прымаў удзел у вызваленні Прагі.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена ў 1945 г.

Скончыў БДУ (1949). Доктар гістарычных навук (1969), прафесар (1970).

З 1952 г. на выкладчыцкай, з 1969 г. на навуковай рабоце. Распрацоўвае праблемы гісторыі БССР перыяду сацыялістычнага будаўніцтва, Вялікай Айчыннай вайны. Адзін з аўтараў і член рэдкалегіі 3-томнай кнігі "Усенародная барацьба на Беларусі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны" (кн. 1–3, 1983–1985), адзін з аўтараў 5-га тома і член галоўнай рэдкалегіі 5-томнай "Гісторыі Беларускай ССР" (1972–1975).

Поўны кавалер ордэна Славы

ХАДАНОВІЧ Леў Сяргеевіч, нарадзіўся 15.11.1923 г. у в. Струмень. Поўны кавалер ордэна Славы. У Вялікую Айчынную вайну (з 1942 г.) падрыўнік 1-ай Гомельскай партызанскай брыгады, з 1943 г. на фронце. Памочнік камандзіра ўзвода разведкі ст. сяржант Хадановіч вызначыўся ў баях за вызваленне Беларусі і Польшчы. Ноччу на 22.7.1944 г. у тыле праціўніка знішчыў 2 варожых карэкціроўшчыкаў, разведаў агнявыя сродкі ворага; ноччу на 1.12.1944 г. у тыле ворага з узводам разведчыкаў пранік у размяшчэнне абароны праціўніка, закідаў гранатамі бліндаж, знішчыў кулямёт, узяў у палон 2 гітлераўцаў; 13.2.1945 г. у раёне Гдыні з групай разведчыкаў захапіў "языка" і каштоўныя звесткі пра абарону ворага.

Пасля дэмабілізацыі скончыў Гомельскі рачны тэхнікум (1947). Працаваў старшым дыспетчарам Днепра-Бугскага тэхнічнага ўчастка рачнога шляху. Адзначаны Граматай Вярхоўнага Савета БССР, двума знакамі "Выдатнік сацыялістычнага спаборніцтва" Галоўрачфлоту рэспублікі, ганаровымі граматамі.

З узнагародных лістоў на Льва Хадановіча

"...Ноччу з 22 на 23 ліпеня 1944 г. Хадановіч, выконваючы спецыяльнае задан-



Л. С. Хадановіч

не камандавання, прабраўся на вышыню, дзе заселі фашысцкія карэкціроўшчыкі, і аўтаматным агнём знішчыў іх. Ён даставіў у наша размяшчэнне каштоўныя звесткі аб агнявых сродках ворага. Таварыш Хадановіч заслугоўвае ўрадавай узнагароды — ордэна Славы III ступені. Камандзір палка палкоўнік Семянчук".

1-ая рэзалюцыя: таварыш Хадановіч узнагароджаны ордэнам Славы III ступені. Подпіс: камандзір 139-ай стралковай дывізіі генерал-маёр Кірылаў.

"Са сваім узводам Хадановіч ноччу на 1 снежня 1944 г., пераадолеўшы раку Нараў, пранік у размяшчэнне ворага, закідаў гранатамі бліндаж, знішчыў станковы кулямёт і захапіў двух палонных. Нягледзячы на моцны агонь фашыстаў, Хадановіч вёў свой узвод у пошуку спакойна, умела. Манеўраваў сіламі ўзвода ў час захопу "языка".

Сваімі дзеяннямі Хадановіч заслугоўвае узнагароды — ордэна Чырвонага Сцяга...

Загадам па 49-ай арміі ад 23 снежня 1944 г. Хадановіч узнагароджаны ордэнам Славы II ступені. Камандуючы войскамі 49-ай арміі генерал-палкоўнік Грышын".

У трэцім узнагародным лісце, падпісаным камандуючым 2-ім Беларускім фронтам маршалам Савецкага Саюза К. К. Ракасоўскім, гаворыцца, што 13 лютага 1945 г. Хадановіч у якасці старшага групы разведчыкаў пранік у размяшчэнне нямецкай абароны, захапіў "языка" і сабраў неабходныя звесткі аб пярэднім краі абароны фашыстаў, за што ўзнагароджваецца ордэнам Славы I ступені.

Адзнака маршала

...Ішлі цяжкія баі за горад Данцыг. Палонны гітлеравец расказаў, што ў катакомбах хаваюцца пярэваратні-вервольфаўцы. Камандзір палка Семянчук і начальнік штаба Сямашка паставілі перад разведчыкамі задачу: даведацца, дзе і колькі пярэваратняў знаходзіцца ў катакомбах, і па магчымасці даставіць "языка" ў штаб палка.

Старшыня Хадановіч падабраў групу байцоў, якія пайшлі разам з ім. Першага часавога знялі бясшумна. Група ціхенька прабіралася па цемры катакомбаў. І зноў удача — пасля трохдзённага бою фашысты спалі непрабудным сном, спадзеючыся на вартавых. Разведчыкі бясшумна сабралі зброю, Хадановіч выстраліў. Ашалелым вервольфаўцам заставалася толькі лыпаць на савецкіх салдат. Гэта вылазка дала магчымасць разведчыкам без бою прывесці ў штаб 82 салдат і 2 гітлераўскіх афіцэраў.

Ордэн Баявога Чырвонага Сцяга на гімнасцёрку Льва Хадановіча прымацаваў сам маршал К. К. Ракасоўскі.

На развітанне Канстанцін Канстанцінавіч выказаў спадзёўку, што ім яшчэ давядзецца сустрэцца. І сапраўды было яшчэ дзве сустрэчы з камандуючым. Адна — на Эльбе, калі маршал павіншаваў старшыню з перамаганосным завяршэннем вайны з фашыстамі. А другая — 24 чэрвеня 1945 г. у Маскве, калі К. К. Ракасоўскі, С. М. Будзённы, К. Я. Варашылаў наведалі казармы, дзе размясціліся ўдзельнікі святочнага парада Перамогі.

Кавалер ордэна Аляксандра Неўскага

Ураджэнец в. Каменка 23-гадовы лейтэнант Мікалай Давыдзенка сустрэў ранак 22 чэрвеня 1941 г. на заходніх рубяжах Краіны Саветаў, а дакладней — на Паўночна-Заходнім фронце, дзе служыў у складзе 415-га стралковага палка першай стралковай дывізіі. Яго злучэнне пагеройску супраціўлялася пераўзыходзячым у колькасці і па ўзбраенні фашысцкім армадам. Але сілы былі няроўныя, і адступаць з цяжкімі баямі давялося да самай Масквы.

Менавіта з-пад Масквы зімой 1941-га і пачаўся доўгі пераможны шлях маладога афіцэра да фашысцкага логава. Асабліва вызначыўся стралковы батальён, якім камандаваў М.А.Давыдзенка, у ба-

7. Зак. 522.

ях за вызваленне Польшчы і ва Усходняй Прусіі ў 1944—1945 гг. Менавіта ў 1944 г. за ўдалыя аперацыі па фарсіраванні рэк і ўзяцці гарадоў, праведзеныя яго часцю ў складзе дывізіі, высокае камандзірскае майстэрства і асабістую мужнасць Мікалай Акулавіч быў узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонага Сцяга. Але самы памятны бой быў наперадзе.

...Ішоў апошні год вайны. Стралковы батальён маёра Давыдзенкі вёў упартыя баі ў Польшчы. У адзін з дзён перад ім была пастаўлена задача: абысці з тылу і заняць вельмі ўмацаваны пункт праціўніка — польскі гарадок Торнуў.

Наступаючы, падраздзяленне на працягу некалькіх гадзін авалодала першай і другой лініямі абароны фашыстаў. У выніку чыгуначная ветка, па якой праціўнік падкідваў на падмацаванне жывую сілу і тэхніку, была перарэзана, а гітлераўцы абяскроўлены.

У гэтай аперацыі нямала страт панёс і батальён Давыдзенкі, а сам камбат, які заўжды быў у першых радах байцоў і асабістым прыкладам натхняў іх у атакі, быў цяжка паранены, апынуўся ў шпіталі. А таму не мог ведаць, што за тую аперацыю вышэйшае камандаванне прадставіла яго да баявой узнагароды.

Але Радзіма не забыла героя. Праз 17 год, у 1962 г., старшыню тадышняга Курганіцкага сельсавета нечакана патурбавалі званком з ваенкамата. Маўляў, так і так, у архіве Міністэрства абароны СССР знайшлі ўзнагародны ліст, у якім гаворыцца, што за высокае ваеннае майстэрства маёр Давыдзенка ўзнагароджаны палкаводчым ордэнам Аляксандра Неўскага і яму належыць з'явіцца для атрымання ўзнагароды.

На жаль, цяжкія раненні далі аб сабе ведаць: Мікалай Акулавіч Давыдзенка рана пайшоў з жыцця.

Р.Залесны

Героямі сталі на Кармяншчыне

КАЛІНКІН Міхаіл Герасімавіч, нарадзіўся 16.4.1916 г. у Петраградзе. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з 1941 г. Камандзір асобнай стралковай роты капітан Калінкін вызначыўся пры вызваленні Кармянскага раёна. 22.11.1943 г. каля в. Студзянец рота на чале з Калінкіным уварвалася ў траншэі і выбіла з іх праціўніка, аўтаматным агнём і гранатамі ён знішчыў 12 гітлераўцаў. Каб спыніць кулямётны агонь варожага дзота, паранены М. Г. Калінкін закрыў амбразуру сваім целам. Загінуў 22.11.1943 г. Натхнёныя яго подзвігам, байцы захапілі важны плацдарм.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена ў 1944 г.

Пахаваны ў в. Касцюкоўка. Яго імем названы вуліцы ў г.п. Карма і в. Ліцвінавічы. На месцы бою каля в. Касцюкоўка, на беразе р. Сож, насыпаны курган Славы, каля падножжа якога мемарыяльная пліта з апісаннем подзвігу Героя.

Паўтарыў подзвіг Матросава

Трэцяя армія генерала Гарбатава рыхтавала наступленне. Пачалося вызваленне Беларусі. У роту капітана Калінкіна наведаўся паштальён. Атрымаў ліст з роднай Вярэйшчыны і камандзір. Горка было чытаць радкі, дзе родныя пісалі пра пахавальныя, што прыходзяць у іх Падольнае. Сяброў юнацтва заставалася ўсё менш. Які лёс наканаваны яму, Калінкіну?

М. Г. Калінкін

На здымку, што ўклаў у паштоўку, капітан напісаў: "На памяць аб Вялікай Айчыннай вайне. Няхай помніць маю жалезную руку той, хто яе пацiскаў. І вы памятайце, родныя, і ты, жонка Галіна, успамінай баявога сябра, смелага і слаўнага, які змагаецца супраць фашыстаў. За Радзіму-маці, за сяброў і за цябе... Ваш Міхаіл. Лістапад 1943 года. Беларусь". Гэта было яго апошняе пісьмо, дасланае на бацькаўшчыну перад подзвігам.

...Нарадзіўся Міхаіл Калінкін у невялічкай вёсачцы Падольнае на беразе Рудзі. Рачулка працякае каля самага падвор'я Калінкіных. Яна заўсёды прыцягвала братоў-блізнят Мішу і Алёшу. Аднойчы яны паспрачаліся, даказваючы адзін аднаму, што ў Рудзі няма канца, ды і пайшлі, назіраючы за плынню вады. Аж да вусця датупалі, датуль, дзе Рудзь уліваецца ў Протву.

Благавешчанскую пачатковую школу браты Калінкіны скончылі на “выдатна”. Цяпер іх чакала Вышагародская сярэдняя школа.

—У школе я тады выкладаў гісторыю,— расказвае дырэктар Вышагародскай школы Мікалай Фёдаравіч Кісялёў.— Мішу Калінкіна памятаю па яго захапленні Спартаком, Паўкам Карчагіным, рэвалюцыянерамі, героямі грамадзянскай вайны. Памятаю такі выпадак. Ад Падольнага да Вышагорада было каля 6 кіламетраў. Цяжкавата даводзілася падлеткам у непагадзь. Дык вось аднойчы, у самы разліў, Міша ўсіх малых вяскоўцаў перанёс цераз брод, каб яны сухімі засталіся, а на самім, як кажуць, сухой ніткі не засталося. Хто, скажыце, мог бы здзейсніць такі ўчынак?

—Асабіста мне падабалася прагнасць Мішы Калінкіна да ведаў, — прыпамінае настаўніца біялогіі Ганна Віктараўна Кісялёва. — На ўсю вёску пяцікласнікі мелі толькі адзін падручнік па біялогіі. Але яны ніколі не атрымлівалі двоек. Мішы падабалася даследніцкая работа. Памятаю, як ганарыліся дзеці, калі падзякаваў ім старшыня мясцовага калгаса за вырашчанае і перададзенае гаспадарцы насенне канюшыны, аб якой на вёсцы тады амаль не ведалі. Магчыма, менавіта праца на доследным участку ў школе і прывяла Мішу за руль трактара.

Дырэктар школы М. Ф. Кісялёў дапамог юнаку ўладкавацца на курсы трактарыстаў, якія адкрыліся пры Вярэйскай машынна-трактарнай станцыі. Прайшлі месяцы вучобы — і вось на палетках роднага калгаса "Першае Мая" вядзе свой трактар малады трактарыст Калінкін. А памочнікам у яго, вядома ж, брат Алёша. Прымаючы работу ад братоў, брыгадзір трактарнай брыгады Мацвей Уладзіміравіч Чысцякоў заўсёды адзначаў: ёсць дзве нормы!

Не толькі да працы быў здатны Міхаіл. Без яго не абыходзілася ніводная вясковая вечарынка, ніводнае вяселле. Цікавы субяседнік, добры гарманіст, аматар прыпевак.

Восенню 1936 г. Мішу Калінкіна праводзілі на службу ў Чырвоную Армію. Праводзілі з наказам не падвесці род Калінкіных, служыць не горш, як працаваў у калгасе. Ад калгаса юнаку ўручылі прэмію, а дырэктар Вярэйскай машынна-трактарнай станцыі Гаўрыла Пятровіч Бажамолаў падараваў на развітанне ад калектыву імянны гадзіннік. Праводзілі ў армію Мішу родныя. За сталом побач сядзела шчаслівая ад павагі да каханага жонка Галіна.

Праз тры гады вярнуўся Міхаіл Калінкін на бацькаўшчыну ў званні лейтэнанта, камуністам. Першая парада, з якой сустрэлі маладога афіцэра ў Вярэі, была адназначнай — трэба вучыць моладзь ваеннай справе. Хмары згушчаліся на небасхіле, Радзіме патрэбны былі добра падрыхтаваныя абаронцы. Міхаіл стаў інструктарам райкома камсамола.

А потым — вайна, развітанне з роднымі, Галінай, якая рыхтавалася стаць маці яго першынца. І вось аўтамабіль з мабілізаванымі крануўся з месца, пакаціў па пыльнай вясковай вуліцы і схаваўся за ваколіцай.

...Раніца 22 лістапада 1943 г. Па лугавінах уздоўж Сажа — свае і чужыя. Вось-вось аб'яваць атаку. Некалькі мінут агнявога артылерыйскага шквалу. Выбухі бачны ў глыбіні варожай абароны. Наступае час пехацінцаў. Крыху прыгнуўшыся, салдаты кінуліся ў першую траншэю. Твар у твар, вочы ў вочы — усё вырашаюць мужнасць, раптоўнасць, уменне валодаць зброяй. Калінкін побач са сваімі салдатамі. Стральба ідзе ва ўпор. На першай лініі абароны фашысты агрызаліся да апошняга патрона. Побач з Калінкіным радавы Анатоль Латачкін, які толькі што першым уварваўся ў фашысцкі дзот. Крыху далей схапіўся з гітлераўцамі радавы Павел Васільеў.

Пасля першага ранення Міхаіл Калінкін не пакінуў поле бою. У гэты час з флангаў загаварылі фашысцкія кулямёты. Салдаты як падкошаныя падалі на зямлю. "Трэба знішчыць дзот", — маланкай бліснула ў галаве капітана. І вось ужо дзве гранаты ляцяць у адкрытую амбразуру. Але аднекуль збоку раздаюцца новыя чэргі. Міхаіл адчуў, як кулі зноў упіліся ў яго цела. Побач падаюць салдаты. Сабраўшы астатнія сілы, камандзір паўзе да дзота. Кінута апошняя граната, але і пасля выбуху дзот працягвае агрызацца. Свінцовыя чэргі спыняюць наступаючых. Міхаіл падцягвае анямелае цела, яшчэ рывок — кулямёт ворага захлынуўся, працінаючы чэргамі адважнага воіна. Нашы падраздзяленні з крыкам "ура" пайшлі ў атаку.

...На руках неслі байцы любімага камандзіра. Неслі, не хаваючы слёз. Міхаіл Герасімавіч Калінкін паўтарыў подзвіг легендарнага Аляксандра Матросава.

На полі, па-над блакітным Сожам узвышаецца помнік герою, на ім золатам зззяюць словы: "Герой Савецкага Саюза капітан Калінкін Міхаіл Герасімавіч, 1916—1943". Ля помніка часта можна ўбачыць людзей. Ветэраны, былыя аднапалчане героя, а часцей маладыя наведваюць месца подзвігу, ускладваюць кветкі — даніну павагі і памяці аб тых, хто аддаў жыццё ў барацьбе з фашызмам.

М. Кольчаў

УШАКОЎ Сцяпан Лаўрэнцьевіч, нарадзіўся 7.12.1909 г. у в. Задушнае Навасільскага р-на Арлоўскай вобл. У Чырвонай Арміі ў 1930—1933 гг. З ліпеня 1941 г. на Калінінскім, Бранскім, 2-ім Беларускім франтах.

Камандзір узвода разведкі старшы сяржант С. Л. Ушакоў вызначыўся ў баях за вызваленне Кармянскага раёна.

8.11.1943 г. каля в. Салабута ўварваўся ў варожы дзот і знішчыў кулямётны разлік, чым забяспечыў захоп узводам траншэі ворага. 14.11.1943 г. таксама ўварваўся ў дзот ворага і знішчыў яго. У час прарыву варожай абароны каля вёсак Казімірава, Паштовая, Глінка знішчыў 13 гітлераўцаў, пяцярых захапіў у палон. У баях з 29 лістапада да 9 снежня 1943 г. узвод адбіў некалькі контратак ворага, знішчыў больш як 60 гітлераўцаў.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена ў 1944 г.

Памёр 28.10.1965 г.

"Ганаруся, што ёсць такія смельчакі"

Камандуючаму 3-яй арміяй генералу А. В. Гарбатаву перад пачаткам наступлення патрэбны былі свежыя звесткі аб сілах гітлераўцаў у раёне вёсак Міхееўка, Студзянец, Салабуда, што на Кармяншчыне. Разведку вырашылі даручыць узводу старшага сяржанта Ушакова з 362-ой Чырванасцяжнай стралковай дывізіі. Начальнік разведкі дывізіі маёр Шапавалаў выклікаў да сябе камандзіра ўзвода і растлумачыў задачу: прабрацца ў размяшчэнне ворага, засекчы агнявыя кропкі на пярэднім краі, знайсці слабае звяно ў абароне фашыстаў, а яшчэ — захапіць "языка".

Узвод разведчыкаў з 1210-га стралковага палка ў лістападаўскія дні 1943 г. знаходзіўся на славутым плацдарме-пятачку на правабярэжжы Сажа ў той час, калі асноўныя сілы арміі трымалі абаро-

ну на левым, славіўся ў дывізіі рызыкоўнасцю, ініцыятыўнасцю, абавязковасцю ў выкананні любога задання. Перад выхадам старшы сяржант Ушакоў, камандзір узвода, уважліва азнаёміў падначаленых з задачай кожнага, падкрэсліў, што ад гэтай разведкі ў многім залежыць поспех аперацыі. Асаблівую надзею Ушакоў ускладваў на разведчыка Зуева з Тульшчыны. Магчыма, таму, што той, як і ён сам, у мірным жыцці працаваў на зямлі, быў аграномам, вырошчваў хлеб.

...Дзе паўзком, дзе пад прыкрыццем лагчынкі ці хмызняку разведчыкі непрыкметна адолелі "нейтралку", дротавае нагрмаджэнне, падкраліся да першай варожай траншэі. Ушакоў вучыў хлопцаў заўсёды дзейнічаць па-суворАўску: нечакана для ворага, хутка і з націскам. Рыўком кінуліся ў траншэю да варожага дзота, агонь якога прыкмеціў Сцяпан ужо некалькі гадзін таму назад. Кароткая чарга — і кулямётны разлік быў знішчаны.

Ля вёскі заціхлі. Трэба было засекчы агнявыя кропкі. І зноў удача — выявілі, што ля Салабуты вораг замаскіраваў больш за дзесятак дзотаў і бліндажоў. Цяпер на чарзе разведка варожай абароны ў Студзянцы і Міхееўцы. Выяўлены асноўныя агнявыя кропкі. Але галоўнае — здабыць "языка". Выбралі адзін з бліндажоў, што ўзвялі фашысты воддаль ад галоўных камунікацый. Зняты вартавы. Зуеў і Шышкін юркнулі ў бліндаж і хутка вывелі адтуль да смерці перапалоханага обер-яфрэйтара. Цяпер разведчыкаў чакаў не менш цяжкі зваротны шлях. Урэшце фашысты выявілі іх і адкрылі агонь, які не даваў узняць галавы. А тут яшчэ "язык" пачаў супраціўляцца. Давялося звязаць фрыца і цягнуць на сабе. На кожным кроку нашых байцоў чакала лавіна свінцу.

Ушакоў аддае загад прабірацца ўперад з "языком", а сам з групай прыкрыцця застаецца, каб адбіцца.

Немца пацягнуў Зуеў, але хутка варожая куля дагнала яго. Так і застаўся ляжаць былы аграном на зялёнай руні азіміны, паліваючы яе гарачай крывёй. Потым смерць напаткала яфрэйтара Шышкіна, але ўсё ж група дацягнула "языка" да сваіх.

...Паказанні обер-яфрэйтара, даныя разведчыкаў дапамаглі ў наступленні. Артылерысты прыцэльна накрылі бліндажы і траншэі ворага.

Уручаючы старшаму сяржанту С. Л. Ушакову ордэн Славы III ступені, камандзір 362-ой стралковай дывізіі сказаў:

— Ганаруся, што ў нашай дывізіі ёсць такія смельчакі.

Гэта толькі адзін эпізод з баявога жыцця Сцяпана Лаўрэнцьевіча Ушакова.

М. Кольчаў, В. Ушаў-Ландыш

ЦЫБУЛЬСКІ Мікалай Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1920 г. у в. Тоўмач Шпалянскага р-на Чэркаскай вобл. У Чырвонай Арміі з 1940 г. У 1941 г. скончыў Кіеўскае ваенна-пяхотнае вучылішча. На фронце ў Вялікую Айчынную вайну (са снежня 1941 г.) камандзір батальёна 340-га гвардзейскага стралковага палка (121-ая гвардзейская стралковая дывізія, 3-яя армія, Беларускі фронт) гвардыі маёр вызначыўся пры прарыве абароны праціўніка на р. Сож 22.11.1943 г. Пасля фарсіравання ракі батальён авалодаў апорнымі пунктамі каля вёсак Чырвоны Бор і Чырвоная Ветка і гэтым самым забяспечыў разгортванне і ўступленне ў бой галоўных сіл палка. 30.11.1943 г. пры адбіцці варожай контратакі каля в. Тарахаўка М. С. Цыбульскі загінуў. Званне Героя Савецкага Саюза пасмяротна прысвоена 3.6.1944 г. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Аляксандра Неўскага.

М. С. Цыбульскі

М. М. Шыкін

ШЫКІН Мікалай Міхайлавіч, нарадзіўся 7.10.1913 г. у в. Мар'еўка Гарадзішчанскага павета Пензенскай губ., удзельнік баёў у Беларусі ў час Вялікай Айчыннай вайны. На фронце з 1941 г., старшы сяржант, камандзір сапёрнага ўзвода. Вызначыўся пры вызваленні Кармянскага раёна. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена ў 1944 г.

Памёр у 1967 г.

Сяржант з Пензеншчыны

У лістападзе 1943 г. стралковая дывізія, якой камандаваў генерал Логвін Данілавіч Чэрвоній, стаяла ў абароне на ўсходнім беразе Сажа на фронце Касцюкоўка (пазней, па картах, — Хляўно) — Загор'е, маючы перад сабою вайсковыя часці 110-ай нямецкай пяхотнай дывізіі. Камандуючы 3-яй арміяй А. В. Гарбатаў паставіў перад дывізіяй Чэрвонія задачу прарваць абарону ворага ў раёне вёскі Студзянец і, наносячы галоўны ўдар у накірунку Рудні і Зяцькавіч, вызваліць Карму і ў далейшым наступаць на Хізаў, Багданавічы.

Ноччу войскі выйшлі на выгіб Сажа, які дугой выступаў паміж Міхееўкай і Студзянцом.

Цяжкая задача выпала сапёрам. Ноччу на 22 лістапада трэба было зрабіць праходы на мінных палях і ў дротавых загародках. На ўчастку другога батальёна 342-га палка капітана А. І. Мешчаракова дзейнічала група дывізіённых сапёраў гвардыі старшага сяржанта Мікалая Міхайлавіча Шыкіна, у склад якой уваходзілі М. А. Кузняцоў, А. П. Чарной, І. М. Ягораў, С. Р. Білый.

Возера Крынічнае, адкуль пачынаўся шлях сапёраў, было ахутана шчыльнай коўдрай восеньскай цемрадзі. Церушыў дробны дождж, пераходзячы падчас у снег. Але калі заняліся справай, адышлі некуды холад, цемра, патаемны страх. Сапёр у жыцці, як вядома, памыляецца толькі аднойчы...

Пасля першага праходу немцы пачулі сапёраў і адкрылі прыцэльны агонь. Адляжаўшыся, нашы байцы зноў прыступілі да размініравання. Рызыкуючы жыццём, праклалі яшчэ два праходы, залажылі чатыры фугасы, злучыўшы правады з падрыўной машынкай. Святлела марудна.

Раніцай 22 лістапада ў неба ўзвілася чырвоная ракета — сігнал аб пачатку атакі. Сяржант Шыкін павярнуў рукаятку падрыўной машынкі. Чатыры магутныя выбухі скаланулі паветра. Кароткі артналёт — і воіны 342-га палка, якім камандаваў падпалкоўнік Ф. А. Ячменеў, з магутным "ура!" пайшлі на ворага.

Наперадзе байцоў беглі сапёры, праводзячы атакуючых па створаных праходах. Сяржант Шыкін адным з першых уварваўся ў траншэю і ўступіў у рукапашную. Пасля яго ўдараў чатыры фашысцкія ваякі не падняліся з зямлі.

У гэтым жа баі гвардыі старшы сяржант Шыкін вывеў са строю дзве агнявыя кропкі ворага. Потым захапіў фашысцкі кулямёт і доўгімі чэргамі стаў касіць адступаючых гітлераўцаў. Убачыўшы, што адна з фашысцкіх гармат усё яшчэ вядзе агонь па нашых баявых парадках, Шыкін з П. М. Ваўліным і Е. Р. Васаевым паўзком прабраліся да яе і знішчылі разлік.

Да зыходу першага дня наступлення дывізіі авалодалі вёскамі Студзянец, Рудня, пасёлкамі Рагозны, Касаляцкі...

Памяць аб ураджэнцу Пензеншчыны, які праявіў мужнасць у баях з фашыстамі

пры вызваленні Кармяншчыны, жыве ў сэрцах ўдзячных беларусаў.

М. Кольчаў, В. Ушаў-Ландыш

Знакамітыя землякі

Лёс адмірала П. Ц. Бандарэнкі

Не так даўно мне давялося пабываць у Цэнтральным ваенна-марскім музеі ў Ленінградзе. У адной з залаў экскурсавод паказаў фатаграфію контр-адмірала П. Бандарэнкі. У гады Вялікай Айчыннай вайны ён быў начальнікам палітаддзела Волжскай ваеннай флатыліі. Здымак зроблены ў адзін з дзён Сталінградскай бітвы летам 1942 г. На маё пытанне пра далейшы лёс воіна старшы навуковы супрацоўнік гісторыка-архіўнага аддзела музея Л. Філіпава адказала, што ён рэпрэсіраваны ў 1950 г.

Фатаграфію П. Ц. Бандарэнкі мне даслаў настаўнік сярэдняй школы № 2 г.п. Карма А. Спадабаеў. У школьным музеі захоўваюцца некаторыя асабістыя рэчы адмірала. Навучэнцы вядуць перапіску з дачкой Пятра Ціханавіча — Святланай, якая жыве ў Ленінградзе. Жыхары вёскі Старая Зенькавіна, дзе нарадзіўся П. Бандарэнка, шануюць памяць свайго легендарнага земляка.

У жніўні 1949 г. контр-адмірал П. Ц. Бандарэнка наведаў родную вёску. Выступіў на сходзе партыйнага актыву раёна. Гэта была апошняя сустрэча з землякамі. Адмірал успомніў у дэталях сваё дзяцінства і юнацтва. Яго бацька, Ціхан Якімавіч, таксама доўга служыў на флоце. Удзельнічаў у руска-японскай вайне 1904–1905 гг. на крэйсеры "Варяг". Раненні падарвалі здароўе. У маці, Марыі Анісімаўны, засталося пяцёра дзяцей — два сыны і тры дачкі. Старэйшым быў Пётр.

"Эх, дай Бог веку Ціхану, ганарыўся б сваім сынам. Сапраўдны гаспадар", — гаварылі пра Пятра яго суседзі. А ён на ўсё жыццё запомніў словы бацькі: "Вучыся, сынок, лягчэй будзе жыць на свеце". Нават калі батрачыў да рэвалюцыі, з кнігай ніколі не развітваўся.

Пасля рэвалюцыі, летам 1918 г., у сямі кіламетрах ад роднага сяла — у Ліцвінавічах саратнік У. І. Леніна П. М. Лепяшынскі арганізаваў першую на Беларусі школу-камуну. Пётр не раз бегаў з сябрамі паглядзець, як жывуць там. Разам са стрыечным братам І. А. Ільюшчанкам стварыў у роднай вёсцы атрад чонаўцаў. Ён жа быў і адным з першых камсамольцаў у Карме. Калі ў 1918 г. эсэры паднялі тут мяцеж, Пётр прыняў удзел у яго падаўленні. Не абышлося і без страт — загінуў у час бою Іван Ільюшчанка, які працаваў старшым міліцыянерам.

Вясной 1919 г. Пётр з сябрам Апанасам Маскалёвым сталі маракамі-добраахвотнікамі ў Дняпроўскай флатыліі. У гэты ж час Пятра прымаюць у камуністычную партыю. Васемнаццацігадовы юнак удзельнічае ў баях на Дняпры, Доне, Днястры, змагаецца супраць белапалякаў, Махно, Урангеля, прымае ўдзел у падаўленні Кранштацкага мяцяжу. У 1922 г., закончыўшы курсы старшых рулявых, Пётр знаходзіцца на караблях Балтыйскага флоту.

Арганізатарскі талент камісара Чарнаморскага флоту праявіўся ў перыяд абароны Адэсы і Севастопаля. Вось што піша пра П. Ц. Бандарэнку ў сваёй кнізе "Асаджаная Адэса" віцэ-адмірал І. І. Азараў: "Самы сумленны, адкрытай душы камуніст, ураўнаважаны і бясхітрасны. Да яго кожны мог трапіць на прыём у любы час. Ён умеў выслухаць, даць разумную параду.

П. Ц. Бандарэнка

На флоце яго любілі і паважалі". Аптыміст па натуры, Пётр Ціханавіч ніколі не губляўся нават у самай складанай франтавой абстаноўцы.

У баях пад Сталінградам камандуючы Волжскай ваеннай флатыліяй адмірал Д. Рогаў так ацаніў камісара флатыліі контр-адмірала П. Ц. Бандарэнку: "Стойкі салдат. Умелы арганізатар, выдатны военачальнік і палітработнік".

Так, Пятру Ціханавічу нярэдка даводзілася знаходзіцца па пояс у вадзе, пад градам куль і асколкаў побач з матросамі. Там, на берагах Волгі, ён атрымаў цяжкае раненне.

Да апошняга часу мы мала што ведалі пра героя. Цяпер людзі шануюць яго памяць у Ленінградзе, Адэсе і Севастопалі. На радзіме, у Карме, у яго гонар названа адна з вуліц райцэнтра. У музеі сярэдняй школы № 2 герою прысвечана экспазіцыя. У школе, дзе яшчэ да рэвалюцыі вучыўся Пётр Ціханавіч, праводзіцца вялікая ваенна-патрыятычная работа. Аб яе выніковасці гавораць такія факты: за апошнія 15 гадоў з выпускнікоў школы каля 100 чалавек выбралі нялёгкую ваенную прафесію.

Б. Дз. Даўгатовіч

Дакументы сведчаць

Выпіска з асабістай справы

Бандарэнка Пётр Ціханавіч нарадзіўся 3 верасня 1901 г. у вёсцы Старая Зенькавіна Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Беларус, селянін-бядняк. У 1919 г. Кармянскі валасны камітэт РКСМ прымае яго ў камсамол. Кастрычнік 1919 — жнівень 1920 г. — адказны праваднік Дняпроўскай ваеннай флатыліі. Удзельнічаў у баях на польскім фронце пад Кіевам, Ржышчавам і Чарнобылем у складзе Дняпроўскай флатыліі.

Удзельнічаў у баях супраць Урангеля пад Марыупалем, Бярдзянскам у складзе экспедыцыйнай марской дывізіі — жнівень—кастрычнік 1920 г. Да 1922 г. упаўнаважаны кантралёр, кантралёр асобнага марскога пагранічнага аддзялення пры Асобным аддзеле Чорнага і Азоўскага мораў (г. Ейск, Анапа).

Люты—май 1922 г. — чырванафлоцец другога балтыйскага флоцкага экіпажа, г. Ленінград. Затым да мая 1923 г. — курсант школы рулявых і сігнальшчыкаў, а да лістапада — старшынярулявы пасыльнага судна "Азімут", Балтыйскі флот.

Лістапад 1923 — лістапад 1926 г. — слухач ваенна-марскога вучылішча імя Рошаля, г. Ленінград. Затым — да студзеня 1929 г. — палітрук крэйсера "Камінтэрн" Чарнаморскага флоту. На крэйсеры быў у загранічным плаванні ў Турцыі ў 1928 г.

1929 г. — ваенком тральшчыка "Даратэя" (дывізіён тральшчыкаў Чарнаморскага флоту). Да студзеня 1930 г. — ваенком падлодкі "Палітрук" Чарнаморскага флоту. Да мая 1934 г. — слухач ваенна-палітычнай акадэміі імя Талмачова, г. Ленінград. Да верасня 1937 г. — ваенком, да лютага 1939 г. — ваенком лінкора "Парыжская Камуна". Затым да чэрвеня 1942 г. — начальнік Палітупраўлення Чарнаморскага флоту, а са жніўня да кастрычніка 1942 г. — ваенком Волжскай ваеннай флатыліі.

Кастрычнік 1942 — ліпень 1943 г. — намеснік камандуючага па палітчастцы Волжскай ваеннай флатыліі. Да 19 ліпеня 1944 г. — начальнік палітычнага аддзела Ваенна-марскіх устаноў СССР.

19 ліпеня 1944 — 31 мая 1947 гг. — начальнік палітаддзела Каспійскай флатыліі. Да лістапада 1949 г. — намеснік па палітчастцы камандуючага Чарнаморскім флотам.

21 лістапада 1949 г. звальняецца з кадраў Узброеных Сіл па артыкулу 44 пункт "В".

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, медалямі "20 год РККА", "За абарону Сталінграда", "За абарону Адэсы", "За абарону Севастопаля".

Адказ з ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР

7 снежня 1988 г.

Бандарэнка Пётр Ціханавіч асуджаны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 28 кастрычніка 1950 г. да расстрэлу з канфіскацыяй маёмасці па абвінавачванні ва ўдзеле ў шкодніцка-падрыўной рабоце ў партыі і дзяржаўным апараце. Праведзенай у 1954 г. дадатковай праверкай было ўстаноўлена, што данае абвінавачванне з'яўляецца неабгрунтаваным, і вызначэннем ваеннай калегіі ад 26 мая 1954 г. даны прыгавор адменены і справа ў адносінах Бандарэнкі П. Ц. спынена з-за адсутнасці саставу злачынства. Бандарэнка поўнасцю рэабілітаваны пасмяротна.

Падрыхтаваў Б. Дз. Даўгатовіч

Камандзір дывізіі

Адным з першых злучэнняў войск, якія прынялі на сябе ў чэрвені 1941 г. магутны ўдар механізаваных і танкавых часцей германскага вермахта, была 17-ая Горкаўская Чырванасцяжная стралковая дывізія імя Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. Менавіта тут, на лясістых прасторах шматпакутнай Беларусі, пралёг накірунак галоўнага ўдару нямецка-фашысцкай арміі па плану "Барбароса".

17-ай стралковай дывізіяй к таму часу ўжо тры гады камандаваў генерал-маёр Цярэнцій Кірылавіч Бацанаў. Сялянскі сын з в. Вашчанкі прайшоў суровую працоўную і вайсковую школу.

У маі 1940 г. Ц.К.Бацанаву Пастановай Савета Народных Камісараў СССР было прысвоена званне генерал-маёра. Дарэчы, гэта была першая пастанова ўрада аб прысваенні ўведзеных у РСЧА генеральскіх званняў. Такім чынам, Бацанаў стаў першым з ураджэнцаў Кармяншчыны генералам.

У канцы лета 1940 г. 17-ая сд была перадыслацыравана ў Беларусь у г. Полацк. А вясной грознага 1941-га Ц.К.Бацанаву прапанавалі паехаць у Маскву на вучобу ў Акадэмію Генеральнага штаба. Але ён папрасіў пакінуць яго ў дывізіі.

У сярэдзіне чэрвеня дывізія была вылучана да заходняй мяжы для аператыўнага сканцэнтравання ў раёне г. Ліда. Тут 22 чэрвеня ў раёне Воранава—Ліда яна ўступіла ў бой з мотапяхотай і танкамі 12-ай танкавай і 18-ай матарызаванай дывізій германскага вермахта. У гэтых баях у першыя дні вайны часцямі дывізіі пад камандаваннем вопытнага генерала Бацанава (за яго плячыма ўжо была фінская кампанія) было разгромлена да двух палкоў мотапяхоты праціўніка, падбіта і знішчана шмат танкаў, аўтамашын і іншай тэхнікі.

Але фашысты яўна пераўзыходзілі ў жывой сіле і тэхніцы, асабліва танкамі і авіяцыяй. І генерал Бацанаў у тых складаных умовах прымае рашэнне вечарам 24 ліпеня рухацца ў бок г. Стоўбцы. На чале першага ланцуга ішоў генерал Бацанаў, афіцэры штаба дывізіі. І ўсё ж у 90 км на паўднёвы захад ад Мінска дывізія трапіла ў акружэнне.

Ц.К.Бацанаў аддаў загад палкам прарывацца ў напрамку Слуцк—Калінкавічы, малымі групамі выходзіць з акружэння і весці нападзенні на малыя групы праціўніка, праходзячы на поўдзень па рацэ Прыпяць.

Сам Бацанаў выйшаў з акружэння 16 ліпеня з батальёнам сувязі ў раёне Азарыч, у 60 км ад Мазыра, прайшоўшы з баямі па лясах і балотах Беларусі, ад Нёмана да Прыпяці, каля 400 км. Але Бабруйск быў заняты немцамі, таму накіраваліся на Гомель.

Тут Бацанаў камандаваў спачатку зводным атрадам, а ў канцы ліпеня 1941 г. быў прызначаны камандзірам 24-й сд, сфарміраванай ім з рэшткаў 17-ай сд. На працягу жніўня і першай паловы верасня яна вяла цяжкія абарончыя баі ў Мазырскім умацаваным раёне, з баямі адыходзіла праз Лоеў, Чарнігаў, Пры-

Т. Л. Уласаў

лукі на Палтаўшчыну. У той час як лінія фронту адкатвалася ўсё далей на ўсход, войскі 21-ай арміі, у т.л. і 24-ая сд, змагаліся ў выключна складаных умовах акружэння ў раёне гарадоў Прылукі і Піраціп. Тут дывізія была часткова разбіта, частка трапіла ў палон. Быў убіты і камандзір дывізіі генерал Бацанаў.

Вось вытрымка з рапарта начальніка штаба дывізіі маёра Р.Р.Скрыпкі, якому ўдалося выйсці з акружэння: "У цяжкай абстаноўцы абарончых баёў генерал-маёр Бацанаў заўсёды быў на самых небяспечных участках і асабіста кіраваў боем. Ён быў для нас узорам мудрасці і храбрасці".

За баявыя адзнакі ў баях з фашыстамі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны Ц.К.Бацанаў быў узнагароджаны пасмяротна ў маі 1965 г. ордэнам Ачыннай вайны I ступені, а таксама медалём "За абарону Кіева". А яшчэ да вайны ўдастоіўся ордэна Чырвонай Зоркі. Беларускі селянін па паходжанні, рабочы па сацыяльным становішчы і ваенны па прафесіі, ён быў чалавекам доўгу, патрыётам і інтэрнацыяналістам у самым поўным сэнсе гэтых слоў.

Рыгор Ганжураў

Генерал з Хізава

Трафім Лявонавіч Уласаў нарадзіўся ў 1900 г. у в. Хізаў. Атрымаўшы пачатковую адукацыю, не захацеў заставацца ў вёсцы сярод збяднелых і паўгалодных сялян, а пайшоў добраахвотнікам у рады Чырвонай Арміі. Ваяваў на франтах грамадзянскай вайны. Прайшоў шлях ад чырвонаармейца да начальніка артылерыі арміі. У 1940 г. пастановай Савета Народных Камісараў СССР Т. Л. Уласаву прысвоена воінскае званне генерал-маёра. У якасці камандзіра аднаго з вайсковых злучэнняў ён прымаў актыўны ўдзел у савецка-фінляндскай вайне і быў узнагароджаны ордэнам Леніна.

...У пачатку Вялікай Айчыннай вайны, калі вораг імкліва рухаўся ў напрамку Масквы, у ваколіцах Смаленска разгарнуліся жорсткія абарончыя баі. 41-гадовы генерал знаходзіўся на пярэднім краі абаронцаў старажытнага горада, умела кіруючы абаронай і ўласным прыкладам узнімаючы дух байцоў. 14 ліпеня 1941 г. у час чарговага націску праўзыходзячых сіл праціўніка адважны камандзір быў цяжка паранены асколкам варожага снарада. Яго накіравалі ў бліжэйшы шпіталь, але выратаваць жыццё, на жаль, не змаглі. Т. Л. Уласаў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені.

Пахаваны ў г. Смаленск на Пакроўскіх воінскіх могілках.

Б. Пладуноў

Баявымі шляхамі

Прыйшоў той дзень

Верасень 1943-га. Фашысты адступаюць, але яшчэ спадзяюцца, што ім дапамогуць утрымацца збудаванні і ўмацаванні, узведзеныя над кручамі Сажа.

Камандаванне Чырвонай Арміі ставіць перад народнымі мсціўцамі 14-ай Цёмналесенскай Чырванасцяжнай партызанскай брыгады, якая дзейнічала на Магілёўшчыне, заданне: у раёне вёскі Студзянец фарсіраваць раку Сож і выйсці на злучэнне з наступаючымі часцямі, ударыўшы па ворагу з тылу.

Асноўны ўдар было намечана нанесці з лесу, што ля вёсак Студзянец, Рудня, Ліцвінавічы. Чырвоная ракета падала сігнал аб пачатку аперацыі. У Студзянцы фашысты ад нечаканасці выскоквалі з хат літаральна ў адной бялізне. Апамятаўшыся, пачалі падпальваць пабудовы, каб неяк разабрацца ў начной цемры. Зарава асвяціла і вёску Салабута. Тут група партызан вяла знішчальны агонь па невялікай фашысцкай групоўцы.

Бой за Студзянец быў больш цяжкім. Каля штаба гітлераўцаў, што размясціўся ў хаце Панаса Арцем'ева, былі сканцэнтраваны агнявыя кропкі ворага. Немцы ўдарылі па наступаючых партызанах. Узвод Дзмітрыя Цюлева першым закідаў гранатамі кулямётнае гняздо, але з другой амбразуры ўдарыў кулямёт, і Цюлеў быў цяжка паранены. Ён яшчэ знайшоў у сабе сілы падняць узвод у атаку. "За Радзіму, наперад!" — гэта былі апошнія словы партызанскага камандзіра, скошанага фашысцкай куляй. Завязаўся рукапашны бой. Пад націскам партызан гітлераўцы адступілі, пакінуўшы на полі бою 156 трупаў, 2 спаленыя аўтамашыны, дзесяткі ручных і станковых кулямётаў, сотні аўтаматаў, ружжаў.

Салабуту зноў азарыла вогнішча. За вёскай гарэла гумно. Адтуль чуліся крыкі, і партызаны кінуліся ратаваць людзей. У полымі аказаліся італьянцы, выступіўшыя супраць вайны і Гітлера. Фашысты вырашылі спаліць іх у гумне. Большасць былых ваяк загінула жудаснай смерцю. Выратаваць ўдалося толькі каля сотні.

Пераправіўшыся цераз Сож у раёне вёскі Прыбар, партызаны адкрылі свабодны праход для часцей Чырвонай Арміі.

Але хутка немцы зноў сканцэнтравалі каля вёсак Студзянец і Салабута свае групоўкі. Цяжка давялося жыхарам, што не асмеліліся пакінуць родныя мясціны. Карнікі хапалі любога. У Студзянцы былі расстраляны дзед Мітрафан Ларчанка, Пётр Ларчанка, Марцін Сінігаеў. Жанчын і дзяцей фашысты загналі ў лагер. Большасць з іх ужо ніколі не вярнуліся дамоў. Жыхар вёскі Салабута Цімафей Пятровіч Папкоў з жонкай Дар'яй Пятроўнай толькі праз 23 гады адшукалі свайго сына, якога пяцігадовым хлапчуком схапілі карнікі.

...Вяртаючыся з Чырвонай Арміяй на месцы нядаўніх баёў, партызаны 14-ай Цёмналесенскай брыгады зноў прынялі ўдзел у фарсіраванні Сажа. На гэты раз у раёне вёскі Хляўно. 22 лістапада над кручамі ракі загаварылі гарматы нашай артылерыі. У Студзянец першымі ўварваліся байцы роты капітана Калінкіна, якія паўтарыў подзвіг Аляксандра Матросава. У баі за Хляўно смерцю герояў загінуў начальнік штаба аднаго з атрадаў 14-ай Цёмналесенскай брыгады Рыжанкоў з вёскі Прудок. Да канца выканалі свой абавязак партызаны Пётр Лёгкі, Павел Перасаў, Іван і Мікіта Кольчавы з Салабуты.

М. Кольчаў

Ваяваў на Украіне

У кастрычніку 1939 г. Пятра Трафімавіча Асюлева прызываюць у рады Чырвонай Арміі і накіроўваюць у Гомельскае кулямётнае вучылішча. Але не давялося юнаку прайсці тут поўны курс абучэння. У званні лейтэнанта Пётр Трафімавіч быў накіраваны на фронт. Яго прызначылі камандзірам кулямётнай роты. З пачатку жніўня 1941 г. і да кастрычніка рота стаяла ў абароне на ўсходнім беразе ракі Волхаў. У лістападзе гэтага ж года Асюлева прызначылі камандзірам стралковага батальёна, прысвоілі званне старшага лейтэнанта.

Ішлі кровапралітныя баі за кожную пядзю зямлі. Горад Малая Вішара двойчы пераходзіў з рук у рукі. У час наступлення пад Масквой, якое пачалося 6 снежня 1941 г., Волхаўскі фронт сваімі баявымі дзеяннямі дапамагаў Заходняму, Калінінскаму і Паўднёва-Заходняму франтам у правядзенні наступальных баявых аперацый. 14 снежня 1941 г. пас-

ля ўзяцця горада Малая Вішара батальён, якім камандаваў Асюлеў, атрымаў задачу выбіць ворага з вёскі Някрасава.

У лютым 1942 г. П. Т. Асюлеў на Паўночна-Заходнім фронце ў раёне Старой Русы. Тут прайшоў курсы ўдасканальвання каманднага саставу. Пасля заканчэння іх яму прысвоілі званне капітана, прызначылі памочнікам начальніка аператыўнага аддзела штаба дывізіі. У яго функцыі ўваходзіла прымаць удзел у распрацоўцы наступальных аперацый часцей, якія ўваходзілі ў склад дывізіі, кантраляваць ад імя штаба выкананне баявых задач падраздзяленнямі. За непасрэдны ўдзел у баявых аперацыях Пётр Трафімавіч быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. У лістападзе 1942 г. яму прысвоена воінскае званне маёр. Асюлеў назначаецца начальнікам аператыўнага аддзела штаба дывізіі. Удзельнічае ў ліквідацыі Дзям'янскага плацдарма. Потым дывізія ўваходзіла ў склад Стэпавага фронту. У жніўні 1943 г. дывізія, у якой служыў П. Т. Асюлеў, разам з танкавымі падраздзяленнямі вызваліла горад Гадзяч. Пасля ўзяцця боем гэтага горада неабходна было заняць горад Вялікая Пісараўка. Паступілі даныя, што там немцаў няма. Для высвятлення становішча ў Вялікую Пісараўку камандуючы арміяй генерал-лейтэнант Трафіменка пасылае Асюлева з групай аўтаматчыкаў і радыёстанцыяй.

—Калі мы прыбылі ў Вялікую Пісараўку, — успамінаў Пётр Трафімавіч, — у горадзе ніякіх вайсковых падраздзяленняў не было. Аб гэтым я паведаміў камандзіру дывізіі. Аднак праз некаторы час мы даведаліся, што да горада набліжаецца вялікая калона нямецкіх войск. Аддаю загад заняць абарону ў самым высокім будынку горада — школе і паведамляю аб гэтым камандзіру дывізіі. Завязаўся цяжкі бой. Сярод нашай групы з'явіліся забітыя і раненыя. З нецярпеннем чакаем падмацавання. Праз некаторы час у горад увайшлі нашы часці. За выкананне баявога задання я быў узнагароджаны ордэнам Вялікай Айчыннай вайны II ступені.

П. Т. Асюлеў прымаў удзел у вызваленні гарадоў Ахтырка, Пераяслаў-Хмяльніцкі. У 1943 г. (жнівень) дывізія выйшла да Дняпра. Фарсіравала яго ў раёне вёскі Букрын. Гэта быў невялічкі плацдарм на заходнім беразе. Ён адыграў важную ролю ў развіцці далейшага наступлення. Дывізія ўдзельнічала ў вызваленні Левабярэжнай Украіны, гарадоў Васількова, Фастава, Казаціна, Вінніцы, Жмерынкі, Камянец-Падольска.

У баях за Вінніцу ў лютым 1944 г. Пётр Трафімавіч удзельнічаў ужо як начальнік штаба стралковага палка. За праяўленую храбрасць у бітве за гэты горад ён ўзнагароджаны ордэнам Баявога Чырвонага Сцяга. У бітве за горад Цярнопаль 16 ліпеня 1944 г. Асюлеў быў цяжка паранены. Пасля шпіталя ён зноў начальнік штаба свайго палка. 3 мая 1945 г. Асюлеву прысвоена воінскае званне падпалкоўнік. Да ўзнагарод далучылася яшчэ адна, як сведчанне яго баявых заслуг, — ордэн Вялікай Айчыннай вайны I ступені. Свой баявы шлях П. Т. Асюлеў закончыў пад Прагай.

Пасля вайны Пётр Трафімавіч працаваў спачатку настаўнікам гісторыі, а затым ваенруком у СШ № 2 г.п. Карма.

В. Смірноў

Гронкі каліны

...22 лістапада 1943 г. Макрэдзь, перадсвітанкавая цемра. Непрытульна і цяжка было на сэрцы. Праз які момант пачнецца атака, якой наканавана пачаць вызваленне роднай Кармяншчыны ад фашыстаў. У тыя гадзіны чакання Аляксей Шмыгалёў чамусьці прыгадаў бацьку. Стары Дзяніс, перанёсшы цяжкія катаванні, стаяў пад дулам аўтаматаў з горда ўзнятай галавой і зацятымі ад болю і нянавісці вуснамі. Не, ён не скарыўся фашыстам, не выдаў таварышаў па партызанскай барацьбе. Ён разумеў, што гэта яго апошнія імгненні жыцця, аднак на

Е.А. Арзуманян

твары мужнага чалавека ворагі бачылі толькі нянавісць і пагарду. “Сынкі мае любыя адпомсцяць за мяне!” — вось апошняе, што крыкнуў Дзяніс пад стук аўтаматных чэргаў. І цяпер сын каторы раз гаварыў у думках: “Адпомшчу, тат, абавязкова адпомшчу!”

Гром артылерыйскай кананады разарваў цішыню над Сажом. Ад узрываў снарадаў уздыбілася зямля на варожых пазіцыях. І вось громкагалосае “ўра!” кінула байцоў у атаку. Пераадолена драцяная агароджа, ззаду засталося памечанае сапёрамі міннае поле. Рукапашны бой у першай траншэі ворага. Узвод Конкіна, у якім служыў Аляксей Шмыгалёў, атрымаў заданне вызваліць паўночную частку вёскі Студзянец. Аддзяленне аўтаматчыкаў старшага сяржанта Катлярова выбіла фрыцаў з першых хат. Радавы Шмыгалёў па-пластунску паўзе да падвор'я, адкуль шалёна б'е чэргамі фашысцкі кулямёт. Яшчэ б крыху, і можна закідаць кулямёт гранатамі. Побач ужо знайшлі смерць зямляк Аляксея Цімафей Усцінавіч Таранаў, рускі Васіль Сцяпанавіч Смалякоў. Ды і сам Аляксей атрымаў кулю ў плячо. Чарга, яшчэ адна — нарэшце фашысцкі кулямётчык перастаў касіць нашы рады.

Вёску зацягнулі палосы дыму, агонь ірваўся ў лістападаўскае змрочнае неба. Фашысты кінуліся ў контратаку. Варожая куля збіла зорачку на шапцы Шмыгалёва. Асколкі міны, якія разарваліся непадалёку, пасеклі рукі байца. Рознакаляровымі кругамі паплыло навакольле ў вачах Аляксея. Апрытомнеў салдат, пачуўшы ласкавы покліч:

—Алёша, родненькі, адкрый вочы! — знаёмы дзявочы голас зваў з небыцця, прымушаў выйсці з непрытомнасці.

Адкрыў урэшце вочы і здзівіўся — побач санінструктар. Зямлячка з Пакроўска Дуся Смарчанка. Вось дык сустрэча на вайне!

У шпіталь на Браншчыне, дзе лячылі Аляксея Шмыгалёва, прыйшла да салдата навіна, што за бой у вёсцы Студзянец ён узнагароджаны медалём "За адвагу".

...Адгрымела Вялікая Айчынная. Адышлі ў нябыт падзеі тых дзён. Але ветэрану часта нагадваецца бой за Студзянец. Здаецца, працягні руку — і дакранешся да баявых таварышаў, разам зацішна прыгнешся ў акопчыку. Але не — параслі акопы калінай. Вунь яе чырвоныя гронкі так і ззяюць крывавымі кроплямі на сонцы. Сарваўшы некалькі з іх, Шмыгалёў падцягнуў папругу на кані і накіраваў яго на цэнтральную сядзібу саўгаса "Рудзянскі". Там жыве яго сям'я. Чацвёра дзяцей выгадаваў былы салдат. Валянціна стала эканамістам, Мікола — заатэхнікам. А вось Надзя і Кастусь пайшлі бацькавай дарогай, сталі інжынерамі лясной гаспадаркі. Ён увесь пасляваенны перыяд аддаў лесу, садзіў, расціў, лячыў яго. З павагай прывучыў адносіцца да лесу і дзяцей. Цяпер унучка Натка сустрэне на ганку дзеда, а ён ёй лясны пачастунак — гронкі каліны падорыць, і на твары дзяўчынкі, паўтараючы выраз дзеда Аляксея, выступіць шчаслівая ўсмешка. Яна таксама любіць лес. І каліна ж да таго прыгожая...

М. Кольчаў

Яны вызвалялі Кармяншчыну

АРЗУМАНЯН Ерванд Аванэсавіч, нарадзіўся ў 1909 г. у Арменіі. З сялян. У 1934 г. скончыў Цімiразеўскую акадэмію і працаваў у калгасе заатэхнікам. У 1938 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю.

М. Р. Грызлоў

М. І. Захараў

У 1941 г. пайшоў на фронт дабравольцам і да Дня Перамогі знаходзіўся ў дзеючай арміі. Сакратар партбюро, зампаліт палка 121-ай стралковай дывізіі. У лістападзе 1943 г. удзельнічаў у фарсіраванні р. Сож у раёне населеных пунктаў Студзянец–Касцюкоўка і вызваленні Кармянскага раёна ад гітлераўскіх захопнікаў. У 1952 г. абараніў доктарскую дысертацыю. Працаваў прафесарам кафедры жывёлагадоўлі Ціміразеўскай сельскагаспадарчай акадэміі, з 1958 па 1984 г. — рэктар гэтай навучальнай установы.

Е.А.Арзуманян трагічна загінуў у верасні 1990 г.

ГАЎРЫЛЕНКА Мікалай Паўлавіч, нарадзіўся 17 сакавіка 1915 г. у в. Старыя Расохі Кармянскага р-на Гомельскай вобл. Да Вялікай Айчыннай вайны працаваў у калгасе "Бальшавік" Кармянскага р-на. З першых дзён вайны на фронце. У лістападзе 1943 г. удзельнічаў у вызваленні Кармянскага раёна ад гітлераўскіх захопнікаў у саставе 121-ай гв. стралковай дывізіі ў якасці камандзіра аддзялення. У баі за сваю родную в. Старыя Расохі быў цяжка паранены. Пасля папраўкі звольнены з арміі і вярнуўся ў в. Старыя Расохі. Працаваў у калгасе "Бальшавік".

Памёр 1.5.1944 г.

ГРЫЗЛОЎ Міхаіл Рыгоравіч, нарадзіўся 28 лістапада 1918 г. у Арлоўскай вобл. У 1929 г. пераехаў у Маскву. У 1938 г. быў прызваны ў Чырвоную Армію. Вялікая Айчынная вайна застала ў г. Лунінец Брэсцкай вобласці ў званні старшыны. М. Р. Грызлоў становіцца камандзірам партызанскага атрада імя Калініна 10-ай Журавіцкай брыгады. Пасля злучэння партызан з Чырвонай Арміяй — на фронце. На Віслe цяжка паранены.

Цяпер на пенсіі. Жыве ў г. Масква.

ЗАХАРАЎ Міхаіл Іванавіч, нарадзіўся 11 лістапада 1925 г. у г. Казельску Калужскай вобл. у сям'і служачага. Закончыў Маскоўскае вышэйшае тэхнічнае вучылішча ім. Баўмана, а ў 1943 г. — Маршанскае стралкова-мінамётнае вучылішча. Камандзір узвода М. І. Захараў у лістападзе 1943 г. удзельнічаў у вызваленні Кармянскага раёна ад гітлераўскіх захопнікаў. Дэмабілізаваўся ў чэрвені 1946 г. Жыў у г. Баранавічы. У 1951—1952 гг. пераехаў у г. Ленінград. Зноў прызваны ў армію і прызначаны намеснікам камандзіра роты ў будаўнічых войсках.

СЯРГЕЕНКА Уладзімір Віктаравіч, н. у 1924.
УЛАСАЎ Васіль Гаўрылавіч, н. у 1902.
УЛАСАЎ Іван Емяльянавіч, н. у 1902.

УЛАСАЎ Міхаіл Іосіфавіч, н. у 1916.
УЛАСАЎ Міхаіл Сямёнавіч, н. у 1910.
УЛАСАЎ Піліп Ермалаевіч, н. у 1910.
ХІЛІНСКІ Лявон Апанасавіч, н. у 1903.
ЦЕРАХАЎ Піліп Паўлавіч, н. у 1900.
ЧЫСЦЯК Сяргей.
ШЫЛАЎ Рыгор Пятровіч, н. у 1913.

СТРУКАЧОЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БАРАВАЯ БУДА

ВАНЧУРА Павел Васілевіч.
ГУСАРАЎ Іосіф Андрэевіч.
ГУСАРАЎ Іосіф Рыгоравіч.
ДЗІНДЗІКАЎ Мітрафан Сяргеевіч.
ЕЎМЕНЕНКА Іван Андрэевіч.
ЕЎМЕНЕНКА Міхаіл Андрэевіч.
ЕЎМЕНЕНКА Пётр Андрэевіч.
ЖЛОБА Сяргей.
ІТКІН Хаім.
ІТКІНА Ітля.
КАВАЛЁЎ Сяргей Якаўлевіч.
КАРПОВІЧ Якаў Кузьміч.
ПАЛЯКОЎ Васіль Цімафеевіч.
ПАПКОЎ Анатоль Паўлавіч.
ПАПКОЎ Васіль Дзямідавіч.
ПАПКОЎ Іван Дзям'янавіч.
ПАПКОЎ Каліна Ігнатавіч.
ПАПКОЎ Мітрафан Карпавіч.
ПАПКОЎ Міхаіл Паўлавіч.
РАГОЖНІКАЎ Васіль Іванавіч.
РАГОЖНІКАЎ Васіль Сямёнавіч.
СІЛЬЧАНКА Анатоль Антонавіч.
ШАЛЫГА Ягор Васілевіч.
ЯНКОЎСКІ Дзяніс Піліпавіч.

ВЁСКА ГАРАДОК

АНДРЭЙЧАНКА Васіль Іванавіч.
АФАНАСЕНКА Іван Яфрэмавіч.
БАЛАБОЙКА Ісак Пятровіч.
БАРАНАЎ Іван Антонавіч.
БАЧАРОЎ Максім Яфімавіч.
БЕЛАВУСАЎ Павел.
БЕЛАВУСАЎ Піліп.
БЕЛАКАПЫТАЎ Аляксей Аляксандравіч.
КАВАЛЁЎ Якаў Якаўлевіч.
КАРНЕЕНКА Аляксандр Рыгоравіч.
КАРНЕЕНКА Ягор Нічыпаравіч.
МАРЧАНКА Васіль Андрэевіч.
МАРЧАНКА Уладзімір.
ПЕВЕНЬ Ісак Фёдаравіч.
ПЯТРОЎ Рыгор Лявонавіч.
СЕЛЯДЦОЎ Васіль Пятровіч.
СЕЛЯДЦОЎ Іван Пятровіч.

ВЁСКА ДУБАВІЦА

ВАЙЦЯНКОЎ Васіль Кірэевіч.
ГАРБАЧОЎ Піліп Васілевіч.
ГРЫЦОЎ Міхаіл Іларыёнавіч.
ГРЫЦОЎ Раман Патапавіч.
ГРЫЦОЎ Сямён Патапавіч.
КАРНАВУШЧАНКА Максім Ульянавіч.
ЛЕПУХАЎ Мікалай Сяргеевіч.
МАГІЛЁЎЦАЎ Павел Архіпавіч.
МАЛАШЭНКА Афанасій Кузьміч.
ПАЛТАРАЧАНКА Іван Андрэевіч.
ПЕТРАЧЭНКА Міхаіл Мікітавіч.
ПЕТРАЧЭНКА Пётр Цімафеевіч.
ПЕТРАЧЭНКА Рыгор Цімафеевіч.
ШЭМЕТАЎ Цімафей Іванавіч.

ВЁСКА ДУБРАЎКА

ЛЕПУХАЎ Сямён Пракопавіч, н. у 1913, загінуў у 1941.
ЛУК'ЯНЧАНКА Макар Дзянісавіч, н. у 1910, загінуў у 1944.
МІНОЖАНКА Апанас Кузьміч, н. у 1901, загінуў у 1944.
ПЕТРАЧЭНКА Рыгор Піменавіч, н. у 1911, загінуў у 1943.
СЯНЬКОЎ Даніііл Захаравіч, н. у 1913, загінуў у 1943.

ПАСЁЛАК ЖДАНАЎ

БАДЗЯНКОЎ Пётр Карпавіч, н. у 1913, загінуў у 1943.
БАДЗЯНКОЎ Цімафей Мікалаевіч, н. у 1915, загінуў у 1944.
ПАЎЛЮЧЭНКА Іван Піменавіч, н. у 1922, загінуў у 1942.
РАГАВЕНКА Пётр, н. у 1913, загінуў у 1943.
ФЕДАРЭНКА Васіль Мікалаевіч, н. у 1921, загінуў у 1943.

ВЁСКА КОЛАСАВА

БАЛАХОНАЎ Купрэй Андрэевіч, н. у 1907, загінуў у 1941.
БРЫЧЫКАЎ Іван Васілевіч.
ВАЙЦЯНКОЎ Павел, н. у 1912, загінуў у 1941.
ДАНІЛЕНКА Міхаіл Фёдаравіч, н. у 1912, загінуў у 1941.
КУПРЭЕНКА Лука Восіпавіч, н. у 1905, загінуў у 1941.
ШАРАМЕЦЕЎ Сяргей Рыгоравіч, н. у 1903, загінуў у 1941.
ШАРАМЕЦЕЎ Фрол Рыгоравіч, н. у 1903, загінуў у 1941.

ВЁСКА ЛЕСАВАЯ БУДА

БЕЛАКАПЫТАЎ Аляксей Аляксандравіч.
ГРЫБАНАЎ Яўмен Трафімавіч.
КАЗЛОЎ Васіль Міхайлавіч.
КАЗЛОЎ Іван Фаміч.
КУРБАТАЎ Іван Фролавіч.
РАГОЖНІКАЎ Павел Міхайлавіч.
ТУРЛАКОЎ Іван Кандратавіч.

ЯФРЭМЕНКА Сяргей Дзям'янавіч.

ПАСЁЛАК ЛОЗКІ

БАРАШЭНКА Аляксандр Андрэевіч, н. у 1910, загінуў у 1941.
ВАРАБ'ЁЎ Трафім Рыгоравіч, н. у 1915, загінуў у 1941.
ДАНІЛЕНКА Кандрат Кірылавіч, н. у 1920, загінуў у 1941.
КРАЎЦОЎ Андрэй Сафронавіч.
КРАЎЦОЎ Аркадзь Сафронавіч, н. у 1914, загінуў у 1944.
КРАЎЦОЎ Канстанцін Сафронавіч, н. у 1923, загінуў у 1943.
ПРЫМАКОЎ Іван Архіпавіч, н. у 1925, загінуў у 1943.

ВЁСКА МАТОРАЎКА

БЫЧКОЎ Леанід Аўрамавіч.
БЫЧКОЎ Фёдар Аўрамавіч.
ГРЫБАНАЎ Васіль Пятровіч.
ЕРАФЕЕНКА Аляксей Андрэевіч.
ЕРМАЛАЕЎ Міхаіл Васілевіч.
ЖУРАЎЛЁЎ Іван Іванавіч.
ЖУРАЎЛЁЎ Павел Іванавіч.
КАЗЯНКОЎ Якаў Яфрэмавіч.
КІРЭЕНКА Барыс Давыдавіч.
КІРЭЕНКА Фядос Зіноўевіч.
КУЗНЯЦОЎ Уладзімір Ісакавіч.
КУЗНЯЦОЎ Фама Ісакавіч.
РАГАВЕНКА Фёдар Іванавіч.
РАГАВЕНКА Фядос Яфімавіч.
РАГАВЕНКА Цімафей Іванавіч.
ТОНКІ Васіль Фаміч.
ТОНКІ Ягор Фаміч.
ШУРНІКАЎ Фёдар Ільіч.
ШЫТАЎ Ягор Пятровіч.

ВЁСКА МІХАЛЁЎКА

АКСЕНЦЬЕЎ Віктар Іванавіч.
АКСЕНЦЬЕЎ Цімафей Іванавіч.
БАБУЧЭНКА Пётр Іванавіч.
БАЛЕНКОЎ Леанід Афанасьевіч.
БАРАНАЎ Павел Сігнеевіч.
ГАРЭЛІКАЎ Піліп Фёдаравіч.
ГАРЭЛІКАЎ Фёдар Піліпавіч.
ЖУРАЎЛЁЎ Пётр Еўсцігнеевіч.
КРЫВАСТАНЕНКА Дзмітрый Сяргеевіч.
ЛЕЎЧАНКА Сяргей Пятровіч.
ЛЕЎЧАНКА Ягор Ягоравіч.
МЯЖЭННЫ Станіслаў Захаравіч.
ПУТАЎ Аляксей Сяргеевіч.
РАГАВЕНКА Іван Яфімавіч.
РАГАВЕНКА Сяргей Усцінавіч.
УТКІН Васіль Фёдаравіч.

ВЁСКА НОРКАЎШЧЫНА

АГУНЬКОЎ Іван Міхайлавіч.
ВІНАКУРАЎ Аляксандр Дзмітрыевіч.
ГАНЧАРОЎ Сцяпан Міхайлавіч.
ДАНІЛЕНКА Іван Трафімавіч.
ДЗЕНІСЕНКА Іван Трафімавіч.
ДЗЕРГАЧОЎ Аляксей Кірылавіч.
ЗІРКОЎ Кірыл Яфімавіч.
КАЗЯНКОЎ Максім Ягоравіч.
КАРНАВУШАНКА Рыгор Адамавіч.
НАВАЕНКА Ягор Пятровіч.
ПАНЧАНКА Майсей Цімафеевіч.
ПІСКУНОЎ Фёдар Дзянісавіч.
СТАРАВОЙТАЎ Фама Сямёнавіч.

ВЁСКА ПРАЎДА

ГАРЛАЧОЎ Васіль Іванавіч, н. у 1914, загінуў у 1942.
ГАРЛАЧОЎ Іван Іванавіч, н. у 1901, загінуў у 1942.
ГАРЛАЧОЎ Іван Кузьміч.
ДАВЫДЗЕНКА Мітрафан, н. у 1906, загінуў у 1945.
КАНДРАТКОЎ Арцём Лявонавіч, н. у 1907, загінуў у 1945.
КАНДРАТКОЎ Васіль Лявонавіч, н. у 1907, загінуў у 1945.
КАНДРАТКОЎ Сямён Лявонавіч, н. у 1912, загінуў у 1941.
САФРОНАВА Марыя Ермалаеўна.
САФРОНАЎ Ілья Давыдавіч, н. у 1901, загінуў у 1941.
СЕРАДЗЕНКА Уладзімір Фёдаравіч, н. у 1904, загінуў у 1941.

ПАСЁЛАК РОЗАВЫ

БАЛАХОНАЎ Васіль Фядотавіч, н. у 1913, загінуў у 1943.
БРЫЧЫКАЎ Фёдар Васілевіч.
ЕРМАКОЎ Цімафей Іванавіч, н. у 1907.
МІХАЛЕНКА Апанас Парфенавіч, н. у 1911.
МІХАЛЕНКА Дзямід Парфенавіч, н. у 1906.
МІХАЛЕНКА Ілья Парфенавіч, н. у 1913.
ЯФІМЕНКА Васіль Ягоравіч, н. у 1908.

ВЁСКА СТРУКАЧАЎ

ВАРАНКОЎ Ілья Еўдакімавіч.
ДАНІЛЕНКА Ілья Кандратавіч, н. у 1902.
ЗАХАРАНКА Цімафей Трафімавіч, н. у 1922, загінуў у 1943.
КАЛУЖНІКАЎ Павел Пятровіч, н. у 1911.
КАПАЧОЎ Іосіф Фёдаравіч.
КАПАЧОЎ Якаў Іванавіч.
КУПРЭЕНКА Міхаіл Трыфанавіч.
КУПРЭЕНКА Якаў Трыфанавіч.
ПРЫМАКОЎ Васіль Елісеевіч, н. у 1923, загінуў у 1942.
СВАСЦЕЕЎ Павел Мікалаевіч.
СІВУХА Якаў Сцяпанавіч, н. у 1922, загінуў у 1943.
ЦАРАНКОЎ Ілья Еўдакімавіч.

ЦАРАНКОЎ Сідар Еўдакімавіч, н. у 1905, загінуў у 1944.
ШЫТАЎ Сямён Радзівонавіч.
ЯЎМЕНЕНКА Рыгор Іванавіч, н. у 1925, загінуў у 1944.

ВЁСКА ШАЛАМЕІ

БАГДАНОВІЧ Ілья Іванавіч, н. у 1911, загінуў у 1941.
ГАРЛАЧОЎ Сяргей Цярэнцьевіч, н. у 1924, загінуў у 1941.
ДАВЫДЗЕНКА Аляксей Міронавіч, н. у 1912, загінуў у 1943.
ДАВЫДЗЕНКА Дзмітрый Міронавіч, н. у 1914.
КРАМШЧЫКАЎ Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1899, загінуў у 1941.
КУРБАТАЎ Леанід Іларыёнавіч, н. у 1912, загінуў у 1941.
МАЛАШЭНКА Раман Рыгоравіч, н. у 1901, загінуў у 1943.

ВЁСКА ШЭРАХАЎСКАЯ БУДА

БУТРЫМЕНКА Мацвей Мацвеевіч.
БУТРЫМЕНКА Сцяпан Мацвеевіч.
БУТРЫМЕНКА Ульян Сяргеевіч.
ДЗЕНІСЕНКА Іван Трафімавіч.
ДЗЕНІСЕНКА Канстанцін Ігнатавіч.
ІВАНОЎ Павел Ягоравіч.
МАЛАШЭНКА Якаў Васілевіч.
СУВОРАЎ Пётр Андрэевіч.

СТРУМЕНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ВАСІЛЬЕЎКА

ГАЖАЎ Мікалай Цімафеевіч, н. у 1900.
КАРАТКЕВІЧ Гаўрыіл Нупрэевіч, н. у 1899.
КАРАТКЕВІЧ Мікалай Нупрэевіч, н. у 1907.
КАРАТКЕВІЧ Уладзіслаў Якаўлевіч, н. у 1924.
КАРАТКЕВІЧ Цімафей Нупрэевіч, н. у 1904.
КРАЎЦОВА Аляксандра Аляксееўна, н. у 1900.
КРАЎЦОВА Хоўра Аляксееўна, н. у 1900.
РЭПІН Фёдар Іларыёнавіч, н. у 1909.
ХАДАНОВІЧ Леанід Сяменавіч, н. у 1910.
ХАДАНОВІЧ Міхаіл Іванавіч, н. у 1925.
ХАДАНОВІЧ Фёдар Сямёнавіч, н. у 1900.
ХАДАНОВІЧ Якаў Сямёнавіч, н. у 1909.
ШАМЕТАЎ Канстанцін Ільіч.

ВЁСКА ВОСАЎ

КАРАТКЕВІЧ Васіль Фёдаравіч, н. у 1904.
КАРАТКЕВІЧ Ганна Фёдараўна, н. у 1902.
КАРАТКЕВІЧ Іван Нічыпаравіч, н. у 1904.
КАРАТКЕВІЧ Нікадзім Андрэевіч, н. у 1923.
ПАЛІЦЫН Аляксей Якаўлевіч, н. у 1919.
ПАЛІЦЫН Пётр Мікалаевіч, н. у 1919.
СЕЛЯЗНЁЎ Васіль Сазонавіч, н. у 1904.
СЕМЯНЬКОЎ Міхаіл Андрэевіч, н. у 1920.
ХАДАНОВІЧ Вакум Канстанцінавіч, н. у 1915.
ХАДАНОВІЧ Пётр Іванавіч, н. у 1904.
ШЫПІНСКІ Пётр Іванавіч, н. у 1923.

ВЁСКА КУРГАНІЦА

ЛАВЯНЕЦКІ Іван Кандратавіч, н. у 1908.
ЛАВЯНЕЦКІ Міхаіл Кандратавіч, н. у 1916.
ЛАВЯНЕЦКІ Пётр Кандратавіч, н. у 1896.
ХАДАНОВІЧ Аляксандр Паўлавіч, н. у 1908.
ХАДАНОВІЧ Андрэй Нікадзімавіч, н. у 1914.
ХАДАНОВІЧ Іван Васілевіч, н. у 1892.
ХАДАНОВІЧ Іван Іосіфавіч, н. у 1920.
ХАДАНОВІЧ Ілья Максімавіч, н. у 1900.
ХАДАНОВІЧ Лаўрын Рыгоравіч, н. у 1900.
ХАДАНОВІЧ Пётр Уладзіміравіч, н. у 1920.
ХАДАНОВІЧ Піліп Пракопавіч, н. у 1923.
ХАДАНОВІЧ Сямён Міхеевіч, н. у 1900.
ХАДАНОВІЧ Сяргей Нікадзімавіч, н. у 1922.
ХАДАНОВІЧ Фёдар Нікадзімавіч, н. у 1918.
ХАДАНОВІЧ Яўген Пракопавіч, н. у 1923.
ЯЦКЕВІЧ Іван Мікалаевіч, н. у 1912.

ВЁСКА ЛАЗОВІЦА

АКІНЧЫЦ Міхаіл Сяргеевіч, н. у 1908.
ВАЛАНЦЭВІЧ Антон Кірэевіч, н. у 1902.
КУРБАТАЎ Сцяпан Паўлавіч, н. у 1920.
ЛАВЯНЕЦКІ Васіль Данілавіч, н. у 1919.
ЛАВЯНЕЦКІ Іван Данілавіч, н. у 1920.
ЛАВЯНЕЦКІ Іван Мікалаевіч, н. у 1920.
ЛАВЯНЕЦКІ Мікалай Паўлавіч, н. у 1916.
ПАЎЛОЎСКІ Сымон Рыгоравіч, н. у 1906.
ХАДАНОВІЧ Лук'ян Сяргеевіч, н. у 1914.
ХАДАНОВІЧ Мікалай Васілевіч, н. у 1916.
ХАДАНОВІЧ Міхаіл Якаўлевіч, н. у 1909.
ШЫПІНСКІ Вікенцій Нікадзімавіч, н. у 1903.
ШЫПІНСКІ Пётр Андрэевіч, н. у 1919.
ШЫПІНСКІ Фама Андрэевіч, н. у 1918.

ВЁСКА МАЛАШКІ

АКІНЧЫЦ Васіль Якаўлевіч, н. у 1920.
АКІНЧЫЦ Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1918.
АКІНЧЫЦ Уладзімір Фролавіч, н. у 1920.
КАРАТКЕВІЧ Аляксей Фёдаравіч, н. у 1914.
КАРАТКЕВІЧ Антон Баніфацыевіч, н. у 1904.
КАРАТКЕВІЧ Максім Рыгоравіч, н. у 1914.
КАРАТКЕВІЧ Міхаіл Іванавіч, н. у 1926.
КАРАТКЕВІЧ Ціхан Сямёнавіч, н. у 1890.
КАРАТКЕВІЧ Ягор Яўменавіч, н. у 1909.
МЫШКОЎСКІ Павел Міхайлавіч, н. у 1909.
ПЯТРОЎ Леанід Яфімавіч, н. у 1903.

ВЁСКА МАЛЯНІК

АГЕЕНКА Васіль Лявонавіч, н. у 1902.

АФАНАСЕНКА Сымон Сцяпанавіч, н. у 1912.
ВАСІЛЕНКА Мікіта Цімафеевіч, н. у 1902.
МЫШКОЎСКІ Яўген Тарасавіч, н. у 1924.
НОВІКАЎ Васіль Мікалаевіч, н. у 1898.
СЯРГЕЕНКА Андрэй Іванавіч, н. у 1914.
СЯРГЕЕНКА Васіль Іванавіч, н. у 1912.
СЯРГЕЕНКА Іван Ігнатавіч, н. у 1924.
СЯРГЕЕНКА Лаўрын Нічыпаравіч, н. у 1888.
ТУЖЫКАЎ Іосіф Пракопавіч, н. у 1913.
ЦІЦЯНКОЎ Аляксей Арцёмавіч, н. у 1902.
ЦІЦЯНКОЎ Васіль Якаўлевіч, н. у 1903.
ЦІЦЯНКОЎ Панцеляймон.
ШЭЛЕСТАЎ Аляксей Іванавіч, н. у 1908.
ШЭЛЕСТАЎ Марк Фадзеевіч, н. у 1911.
ШЭЛЕСТАЎ Павел Піменавіч, н. у 1910.

ВЁСКА СТРУМЕНЬ

АВЕРЧАНКА Аляксандр Іванавіч, н. у 1919.
БАБКОЎ Іван Якаўлевіч.
БАГДАНОВІЧ Аляксандр Васілевіч.
БАРСУКОЎ Аляксандр Нічыпаравіч, н. у 1921.
БАХАНЬКОЎ Фёдар І.
БУР'ЯНАЎ Карп Ісакавіч, н. у 1911.
ВОЛКАЎ А. В.
ДАМБРОЎСКІ Валянцін Браніслававіч, н. у 1912.
ДРАБЫШЭЎСКІ Піліп Ягоравіч, н. у 1891.
ДРАБЫШЭЎСКІ Якаў Антонавіч, н. у 1918.
КАРСАКОЎ Сцяпан Вікенцьевіч, н. у 1915.
МАЛЧАНАЎ Ігнат Самсонавіч, н. у 1912.
МАЛЧАНАЎ Іларыён Пятровіч, н. у 1913.
МАЛЧАНАЎ Лявон Фёдаравіч, н. у 1911.
МАЛЧАНАЎ Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1905.
РЭДУТА Ф. С.
СЕМЯНЬКОВА Марыя Іванаўна, н. у 1915.
СЕМЯНЬКОЎ Андрэй Рыгоравіч, н. у 1920.
СМЯТАННІКАЎ Ілья Пракопавіч, н. у 1917.
СЯЛІЦКІ Андрэй Фёдаравіч, н. у 1916.
СЯЛІЦКІ Данііл Фёдаравіч, н. у 1904.
ХАДАНОВІЧ Васіль Ягоравіч, н. у 1924.
ХАДАНОВІЧ Дзяніс Ціханавіч, н. у 1891.
ХАДАНОВІЧ Е. К.
ХАДАНОВІЧ І. Е., н. у 1911.
ХАДАНОВІЧ Іван Кірэевіч, н. у 1904.
ХАДАНОВІЧ Іван Якаўлевіч, н. у 1903.
ХАДАНОВІЧ Ісак Максімавіч, н. у 1905.
ХАДАНОВІЧ Леанід Мікалаевіч, н. у 1923.
ХАДАНОВІЧ П. Я., н. у 1879.
ХАДАНОВІЧ Сцяпан Аляксеевіч, н. у 1904.
ХАДАНОВІЧ Сцяпан Паўлавіч, н. у 1904.
ХАДАНОВІЧ Сяргей Іосіфавіч, н. у 1905.
ХАДАНОВІЧ Сяргей Ягоравіч, н. у 1911.
ХАДАНОВІЧ Уладзімір Данілавіч, н. у 1913.
ХАДАНОВІЧ Фёдар Андрэевіч, н. у 1895.
ХАДАНОВІЧ Фёдар Дзмітрыевіч, н. у 1904.
ХАДАНОВІЧ Якаў Аўрамавіч, н. у 1910.
ХАЗАЎ Андрэй Іванавіч, н. у 1899.
ШАКАЛАЎ Пётр.
ШАТЛІКАЎ Анісій Сямёнавіч, н. у 1901.
ШАТЛІКАЎ Максім Сцяпанавіч, н. у 1914.
ШАТЛІКАЎ Піліп Сцяпанавіч, н. у 1922.

ВЁСКА ТРУД

БАГДАНОВІЧ Рыгор Еўстратавіч.
БАЛБУКОЎ Іосіф Герасімавіч, н. у 1918.
БАЛБУКОЎ Сямён Герасімавіч, н. у 1916.
ВЕРАСАВОЙ Міхаіл Кірылавіч, н. у 1922.
ЛЯВОНЕНКА Ніна Сцяпанаўна, н. у 1925.
ЛЯВОНЕНКА Пётр Сцяпанавіч, н. у 1922.
ЛЯВОНЕНКА Сцяпан Васілевіч, н. у 1900.
ОСІПАЎ Іван Кузьміч, н. у 1926.
ХАДАНОВІЧ Іван Уладзіміравіч, н. у 1904.
ХАДАНОВІЧ Канстанцін Лаўрынавіч.
ХАДАНОВІЧ Мікалай Захаравіч, н. у 1924.
ХАДАНОВІЧ Пракоп Венядзіктавіч, н. у 1914.
ХАДАНОВІЧ Рыгор Лаўрынавіч.
ХАДАНОВІЧ Сяргей Рыгоравіч, н. у 1907.
ХАДАНОВІЧ Цярэнцій, н. у 1909.

КАРМЯНСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

ГАРАДСКІ ПАСЁЛАК КАРМА

АБАТУРАВА Ганна Міхайлаўна.
АБАТУРАВА Таццяна Іванаўна.
АЙДЗЕНДОРФ Міхаіл Хацкавіч.
АЙЗЕНДОРФ Хая Міхалеўна.
АКСЕЛЬРОД Меер Гількевіч.
АКСЕЛЬРОД Якаў.
АНТОШЫН Васіль Нічыпаравіч.
АРОНЧЫК Іосіф Абрамавіч.
АРЦЕМ'ЕВА Валянціна Аркадзьеўна.
АРЦЕМ'ЕВА Лідзія Аляксандраўна.
БАГДАНОВІЧ Рыгор Антонавіч.
БАКУЛЕВА Вера Адамаўна.
БАКУЛЕЎ Іван Паўлавіч.
БАРКОВІЧ Малка Хацкелеўна.
БАСІН Лазар Якаўлевіч.
БАСІН Якаў Іванавіч.
БЛЮМЕНТАЛЬ.
ВАВІЛАЎ Васіль Міхайлавіч.
ВАЙШТЭЙН Сямён Якаўлевіч.
ВАКСМАН Бася Мееpаўна.
ВАКСМАН Бася Самуілаўна.
ВАКСМАН Іосіф Шмойлавіч.
ВАКСМАН Лейба Шмойлавіч.
ВАКСМАН Леў Ізраілевіч.
ВАКСМАН Моня Міхелеўна.
ВАСІЛЕЎСКІ Ізраіль Ісакавіч.
ВІЛЕНСКАЯ Хая Ісакаўна.
ВІЛЕНСКІ Мендэль Хацкелевіч.
ВІШНЕЎСКІ Іван Уладзіміравіч.
ВЯРЭНІЧ Адам Дзям'янавіч.
ВЯРЭНІЧ Уладзімір Адамавіч.
ГАНЧАРОЎ Аляксандр Мікалаевіч.
ГАНЧАРОЎ Мікалай Аляксандравіч.
ГАРБАТОЎСКІ Іван Аляксандравіч.
ГАРБАТОЎСКІ Іван Іванавіч.
ГАРБАТОЎСКІ Пётр Іванавіч.

ГАРДОН Барыс Хацкелевіч.
ГАРДОН Іда Ісакаўна.
ГАРЭЛІК Броха Ісакаўна.
ГАРЭЛІК Гнэся Гількаўна.
ГАРЭЛІК Майсей Нохімавіч.
ГАРЭЛІК Мордух Нохімавіч.
ГЕНЬКІН Моталь Хаймавіч.
ГЕНЬКІН Хая Гдалевіч.
ГЕНЬКІНА Хая Хаімаўна.
ГІНЕРАВА Голда Беркаўна.
ГІНЕРАЎ Барыс Ізраілевіч.
ГІНЗБУРГ Гінда Беркаўна.
ГІНЗБУРГ Гірша Гіршавіч.
ГІНЗБУРГ Залман Гіршавіч.
ГІНЗБУРГ Зяма Барысавіч.
ГІНЗБУРГ Лейба Давыдавіч.
ГІНЗБУРГ Леў Давыдавіч.
ГІНЗБУРГ Рахмаіл Ізраілевіч.
ГІНЗБУРГ Яфім Давыдавіч.
ГІРШОН Гнеся Ількаўна.
ГОЛЬДЗІН Абель Янкелевіч.
ГОЛЬДЗІН Майсей Ісакавіч.
ГОЛЬДЗІН Меер Ісакавіч.
ГОЛЬДЗІН Самуіл Міхелевіч.
ГОЛЬДЗІН Янкель Міхелевіч.
ГОЛЬДЗІНА Броха Абелеўна.
ГОЛЬДЗІНА Броха Нохімавіч.
ГОЛЬДЗІНА Дзіна Сімонаўна.
ГОЛЬДЗІНА Іда Вульфаўна.
ГОЛЬДЗІНА Хая Шмайкаўна.
ГРОЗНАЯ Сіма Айзікаўна.
ГРОЗНЫ Айзік Іосіфавіч.
ГРОЗНЫ Арон Айзікавіч.
ГРОЗНЫ Барыс Айзікавіч.
ГРОЗНЫ Іосіф Айзікавіч.
ГРОЗНЫ Іосіф Айзікавіч.
ГРЫШОН Геня Міхайлаўна.
ГРЫШОН Гнеся Ількаўна.
ГРЫШОН Ізраіль Ізраілевіч.
ГРЫШЫН Веля Ізраілевіч.
ГРЫШЫНА Ева Абрамаўна.
ГУРЭВІЧ Аўраам Абрамавіч.
ГУРЭВІЧ Броха Міхелеўна.
ГУРЭВІЧ Гнеся Мендзелеўна.
ГУРЭВІЧ Груня Ізраілеўна.
ГУРЭВІЧ Давід Айзікавіч.
ГУРЭВІЧ Давід Аронавіч.
ГУРЭВІЧ Давід Беркавіч.
ГУРЭВІЧ Іосіф Рыгоравіч.
ГУРЭВІЧ Міхель Міхелевіч.
ГУРЭВІЧ Рая Шмаеўна.
ГУРЭВІЧ Хая Хацкелеўна.
ГУРЭВІЧ Шмая Беркавіч.
ГУРЭВІЧ Эма Шмаеўна.
ДАЛГАНЮК Андрэй Данілавіч.
ДЛІ Ісаак Ізраілевіч.
ДЛІ Рахіль Лейбаўна.
ДОБІН Шмуйла Ісакавіч.
ДОБІНА Хая Міхелеўна.
ЗАРЭЦКАЯ Хася Зусеўна.
ЗАРЭЦКІ Мендэль Хаімавіч.
ЗЕЛІЧОНАК Зелік Беркавіч.
ЗЕЛІЧЭНКА Груня Мeераўна.
ЗІЛЬБЕРТ Гінда Зелікаўна.
ЗІЛЬБЕРТ Хася Хацкелеўна.
ЗІЛЬБЕРТ Эля Гількаўна.
ЗУБАРОЎСКАЯ Рахіль Міхелеўна.
ЗУБАРОЎСКІ Зусь Гдалевіч.
КАВАЛЕНКА Уладзімір Мікалаевіч.
КАГАН Голда Юдкавіч.
КАГАН Лейба Лазаравіч.
КАГАН Леў Лазаравіч.
КАГАН Рыва Лазараўна.
КАГАН Уладзімір Паўлавіч.
КАГАН Фаня Лазараўна.
КАГАН Ханон Лазаравіч.
КАГАН Хоня Ісакавіч.
КАДЗІН Гірша Хацкелевіч.
КАДЗІН Іосіф Хацкелевіч.
КАДЗІН Хацка Міхелевіч.
КАДЗІНА Бася Юдкаўна.
КАЖАМЯКІН Віктар Лявонавіч.
КАЖАМЯКІН Мікалай Лявонавіч.
КАЖАМЯКІН Сямён Макаравіч.
КАЖАМЯКІН Фёдар Дзмітрыевіч.
КАЖАМЯКІН Якаў Макаравіч.
КАЛЯКІН Іван Мацвеевіч.
КАНТАРАЎ Раман.
КАПЛАН Айзік Аронавіч.
КАПЛАН Веньямін Рыгоравіч.
КАПЛАН Гірша Гіршавіч.
КАПЛАН Гнеся Навумаўна.
КАПЛАН Даша Ізраілеўна.
КАПЛАН Ліза Хаіманаўна.
КАПЛАН Навум Рыгоравіч.
КАРАТКЕВІЧ Васіль Сямёнавіч.
КАРАТКЕВІЧ Васіль Фёдаравіч.
КАРАТКЕВІЧ Ганна Дзянісаўна.
КАРАТКЕВІЧ Ілья Паўлавіч.
КАРАТКЕВІЧ Уладзімір Ільіч.
КАРАТКЕВІЧ Фёдар Сямёнавіч.
КАЦ Залман Мендзелевіч.
КАЦ Ізраэль Міхелевіч.
КАЦ Мотэль Ізраілевіч.
КАЦ Фёдар Панцялеевіч.
КАЦ Хася Гіршаўна.
КАЦ Хая Абрамаўна.
КАЧУБІНСКІ Фёдар Міхайлавіч.
КЛІМАЎ Аляксей Кузьміч.
КРОК Броха Хаімаўна.
КРОК Генадзь Рыгоравіч.
КРОК Геня Рыгораўна.
КРОК Гірша Львовіч.
КРОК Гнеся Мендзелеўна.
КРОК Маша Гіршаўна.
КРОК Мендзель Абрамавіч.
КРОК Яфім Хацкелевіч.
КРЭЙНІН Айзік Нохімавіч.
КРЭЙНІН Ілья Айзікавіч.
КРЭЙНІН Ілья Лазаравіч.
КРЭЙНІНА Хана Навумаўна.
КРЭЙНІНА Хася Лазараўна.
КУПРЭЕЎ Кузьма Акіндзіевіч.
ЛЕВІН Гершон Гіршавіч.

ЛЕВІН Лёва Шлёмавіч.
ЛЕВІН Рахмел Лейбавіч.
ЛЕВІН Янкель Ісакавіч.
ЛЕВІНА Блюма Зелікаўна.
ЛЕВІНА Дора Майсееўна.
ЛЕЗЯРОНАК Гнеся Рувімаўна.
ЛЕЗЯРОНАК Голда Залманаўна.
ЛЕЗЯРОНАК Зелік Міхелевіч.
ЛЕЙЗЯРОНАК Аба Алтаравіч.
ЛЕЙЗЯРОНАК Бася Ісакаўна.
ЛЕЙЗЯРОНАК Гінда Абелеўна.
ЛЕЙЗЯРОНАК Залман Зелікавіч.
ЛЕЙЗЯРОНАК Ісак Абрамавіч.
ЛЕЙЗЯРОНАК Ісак Рувімавіч.
ЛЕЙЗЯРОНАК Саламон Ісакавіч.
ЛЕЙЗЯРОНАК Фаня Абрамаўна.
ЛЕЙЗЯРОНАК Хана Майсееўна.
ЛЕЙЗЯРОНАК Хана Хацкелеўна.
ЛЕЙЗЯРОНАК Якаў Хацкелевіч.
ЛЕСАВА Блюма Міхелеўна.
ЛЕСАЎ Міхель Хаімавіч.
ЛІБМАН Аба Абелевіч.
ЛІБМАН Залман Абелевіч.
ЛІБМАН Залман Лейбавіч.
ЛІБМАН Залман Рыгоравіч.
ЛІБМАН Лейба Хацкелевіч.
ЛІБМАН Маша Залманаўна.
ЛІБМАН Міхаіл Лейбавіч.
ЛІБМАН Орлік Мееравіч.
ЛІБМАН Рува Гіршаўна.
ЛІБМАН Хася Ізраілеўна.
МАГІДСОН Броха Хацкелеўна.
МАГІДСОН Нохім Залманавіч.
МАДОРСКАЯ Рая Міхелеўна.
МАДОРСКІ Нохім Давыдавіч.
МАЙСЯНКОЎ Уладзімір Ігнатавіч.
МАЛКОВА Вольфа Аронаўна.
МАЛКОВА Іда Ізраілеўна.
МАЛКОЎ Якаў Ісакавіч.
МАНОСАВА Гінда Ізраілеўна.
МАНОСАВА Хася Лейбаўна.
МАНОСАВА Хая Ісакаўна.
МАНОСАЎ Абрам Абрамавіч.
МАНОСАЎ Нохім Абрамавіч.
МАНОСАЎ Шмуйла Абрамавіч.
МАРОЗАЎ Іван Майсеевіч.
МАЦВЕЕНКА Міхаіл Ісакавіч.
МЕЛЬНІКАВА Галіна Цімафееўна.
МЕЛЬНІКАЎ Аляксандр Дзям'янавіч.
МЕЛЬНІКАЎ Васіль Іванавіч.
МЕЛЬНІКАЎ Васіль Паўлавіч.
МЕЛЬНІКАЎ Іван Іванавіч.
МЕЛЬНІКАЎ Мікалай Паўлавіч.
МЕЛЬНІКАЎ Міхаіл Дзям'янавіч.
МЕЛЬНІКАЎ Цімафей Іванавіч.
МЕРМАН Гірша Хаімавіч.
МЕРМАН Пінька Хаімавіч.
МЕРМАН Рувім Хаімавіч.
МЕРМАН Рыва Іцкаўна.
МЕРМАН Хаім Ісакавіч.
МЕРМАН Хася Нохімаўна.
МЕРМАН Хася Рувімаўна.
МЕРХАСІН Абрам Фрыдманавіч.
МЕРХАСІН Ісак Майсеевіч.
МЕРХАСІН Ісак Майсеевіч.
МЕРХАСІН Ісак Фрыдманавіч.
МЕРХАСІНА Ліза Фрыдманаўна.
МЕРХАСІНА Рыва Аронаўна.
МЕРХАСІНА Рыва Майсееўна.
МЕРХАСІНА Сара Фрыдманаўна.
МЯТНІКАЎ Данііл Канстанцінавіч.
ПЕРЛІН Мендзель Ізраілевіч.
ПЕРЛІНА Доба Хацкелеўна.
ПЛОТКІНА Хая Хаімаўна.
РАГОЗІН Міхаіл Лявонцьевіч.
РАГОЗІН Уладзімір Лявонцьевіч.
РОЦІКАЎ Анатоль Васілевіч.
САМУСЕЎ Мікіта Пятровіч.
СІМКІН Гілька Моталевіч.
СІМКІН Гірша Гіршавіч.
СІМКІН Рыгор Ількавіч.
СІМКІНА Геня Рувімаўна.
СІМКІНА Хая Хаімаўна.
СІМКІНА Шыфра Абрамаўна.
СЛЯПЦОЎ Мацвей Мінавіч.
СОРКІН Ізраэль Лейбавіч.
СОРКІН Эля Ізраілеўна.
СОРКІНА Іда Абрамаўна.
СОРКІНА Малка Юдкаўна.
СУХАРАВА Маня Юдкаўна.
СУХАРАЎ Барыс Ісакавіч.
СУХАРАЎ Додзік Якаўлевіч.
СУХАРАЎ Макс Якаўлевіч.
СУХАРАЎ Мацвей Якаўлевіч.
СЫРАНКОЎ Дзмітрый Фёдаравіч.
СЫРАНКОЎ Уладзімір Фёдаравіч.
УЛАСАЎ Дзмітрый Антонавіч.
УЛАСЕНКА Фёдар Антонавіч.
УШАВА Наталля Сцяпанаўна.
ФАРБЕРАЎ Гілька Гецалевіч.
ФАРБЕРАЎ Іосіф Абрамавіч.
ФАРБЕРАЎ Сімон Абрамавіч.
ФАРБЕРАЎ Яфім Абрамавіч.
ФЕЙГІН Барыс Велькавіч.
ФЕЙГІН Веля Майсеевіч.
ФЕЙГІН Давыд Рувімавіч.
ФЕЙГІН Іосіф Ізраілевіч.
ФЕЙГІН Якаў Велькавіч.
ФЕЙГІНА Геня Хаімаўна.
ФЕЛЬДМАН Арон Абрамавіч.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Ізраэль.
ФОНКАЦ Рахміл Мацвеевіч.
ФРАДКІН Барыс Пінькавіч.
ХАЙКІН Ізраэль Мееравіч.
ХАЙКІН Моталь Ізраілевіч.
ХАЙКІН Эля Ізраілевіч.
ХАЙКІНА Хая Міхелеўна.
ХАНІН Ісак Якаўлевіч (Ісакавіч).
ХАРЫТОНЕНКА Яфрэм.
ХАЎКІНА Фаня Сямёнаўна.
ХЕЙФІЦ Лейба Лейбавіч.
ХЕЙФІЦ Нікун Ізраілевіч.
ХРАМЯНКОЎ Генадзь Іванавіч.
ХРАМЯНКОЎ Расціслаў Іванавіч.

ЦЕЙТЛІН Лейба Сымонавіч.
ЦІШКЕВІЧ Міхаіл Дзмітрыевіч.
ЦЫБІКАЎ Уладзімір Мікалаевіч.
ЦЫПОРКІН Гірша Мендзелевіч.
ЦЫПОРКІНА Хая Рувімаўна.
ЦЫРКІН Евель Аронавіч.
ЦЫРКІН Сямён Абрамавіч.
ЦЫРКІН Сямён Абрамавіч.
ЦЫРУЛЬНІКАВА Рыта Хацкаўна.
ЦЫРУЛЬНІКАВА Фаня Аронаўна.
ЦЫРУЛЬНІКАЎ Абель Шмуйлавіч.
ЦЫРУЛЬНІКАЎ Лейба Нохімавіч.
ШАГАЛАЎ Лейзер Ізраілевіч.
ШАГАЛАЎ Самуіл Ізраілевіч.
ШАПАШНІКАЎ Есуф Барысавіч.
ШВЕДАЎ Міхаіл Іванавіч.
ШКЛЯР Ігнат Мацвеевіч.
ШКЛЯР Іда Вульфаўна.
ШПІЦЭР Аркадзь Шлёмавіч.
ШПІЦЭР Веньямін Моталевіч.
ШПІЦЭР Гецель Моталевіч.
ШПІЦЭР Іда Веньямінаўна.
ШПІЦЭР Малка Гецэлеўна.
ШПІЦЭР Малка Рыгораўна.
ШПІЦЭР Мота Рыгораўна.
ШПІЦЭР Уладзімір Рыгоравіч.
ШПІЦЭР Хама Алтараўна.
ШПІЦЭР Яфім Рыгоравіч.
ШУРЫН Аркадзь Шлёмавіч.
ШУРЫН Гілька Шлёмавіч.
ШУРЫН Самуіл Шлёмавіч.
ШУРЫН Шлёма Абрамавіч.
ШУРЫН Шлёма Гецэлевіч.
ШУРЫНА Марыя Шлёмаўна.
ШУРЫНА Ніна Шлёмаўна.
ШУРЫНА Хая Майсееўна.
ШУТАЎ Васіль Міхайлаўна.
ЭЛЬКІН Юдка Зелікавіч.
ЭСКІН Барыс Ісакавіч.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 755. С. 157—304.

Падрыхтавала Р. А. Чарнаглазава

Імёны на абеліcках

Кармянцы свята шануюць памяць аб змагарах за народнае шчасце. Вялікая работа праводзіцца ў раёне па ўвекавечанні подзвігаў воінаў Чырвонай Арміі, партызан і падпольшчыкаў.

Памяць аб 290 воінах — ураджэнцах г.п. Карма, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, і 72 савецкіх воінах, аддаўшых сваё жыццё ў баях за вызваленне райцэнтра, увекавечвае помнік-скульптура воіна, устаноўленая ў 1967 г. у мемарыяльным парку на плошчы Свабоды.

У 1941 г. у рады Чырвонай Арміі ўліліся больш за дзве тысячы выхадцаў з Кармяншчыны, сотні ураджэнцаў раёна. Акрамя таго, значыліся ў 1-ай Гомельскай, 10-ай Журавіцкай і іншых партызанскіх брыгадах, атрадах і ў падполлі.

Невычэрпны смутак маці і жонак, родных і блізкіх тых, хто не вярнуўся да родных ачагоў з поля бітвы, навечна захаваны ў бронзе і мармуры помнікаў і абеліскаў, якія ўзвышаюцца ў больш як 30 населеных пунктах раёна. Адзін з іх устаноўлены ў скверы каля будынка Ліцвінавіцкай СШ імя П.М.Лепяшынскага на брацкай магіле, у якой пахавана звыш 150 салдат, сяржантаў і афіцэраў 121-ай гвардзейскай стралковай дывізіі, загінуўшых пры вызваленні тэрыторыі Ліцвінавіцкага сельскага Савета ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У брацкай магіле ў Ліцвінавічах спяць вечным сном воіны многіх нацыянальнасцей. Сярод іх рускія М. С. Капейкін, П. П. Зайцаў, Д. Д. Сілаеў, беларус Т. С. Дзюк, туркмен А. Ісакаў, башкір Г. М. Садыкаў, таджык С. Шарыпаў, азербайджанец Н. А. Юмаеў, татарын З. Г. Гацін і іншыя. Жыхары вёскі памятаюць сваіх вызваліцеляў. Над помнікам шэфствуюць вучні мясцовай школы. У дні святаў і знамянальных дат нясуць яны тут вахты памяці.

Каля паўтары тысячы мірных жыхароў Кармы і іншых населеных пунктаў Гомельскай вобласці, закатаваных нямецка-фашысцкімі захопнікамі, знайшлі свой апошні прытулак на яўрэйскіх могілках у райцэнтры. У 1975 г. на магіле ахвяр фашызму таксама ўстаноўлены абеліск.

Помнік-мемарыял узвышаецца з ліпеня 1977 г. і ў в. Труд, на тым месцы, дзе 14 жніўня 1941 г. прайшоў сход падпольнага райкома партыі і быў створаны парты-

занскі атрад. На будынку Кляпінскай васьмігадовай школы ўстаноўлена мемарыяльная дошка ў гонар слаўнага патрыёта, камандзіра атрада асобага прызначэння Паўла Паўлавіча Качуеўскага, які актыўна ўдзельнічаў у вызваленні Кармяншчыны ад гітлераўскіх захопнікаў і загінуў смерцю героя.

У памяць аб мужнасці і гераізме, нязгасным подзвігу савецкіх воінаў на месцы прарыву 22 лістапада 1943 г. варожай абароны на р. Сож у раёне вёсак Студзянец – Міхееўка ў 1968 г. насыпаны курган Славы і ўзведзены манумент. На адной з мемарыяльных пліт золатам выціснены назвы дывізій, якія вызвалялі Кармянскі раён ад гітлераўскіх захопнікаў, а на другой – гаворыцца аб подзвігу Героя Савецкага Саюза М. Г. Калінкіна. У цэнтры стэлы выбіты барэльеф воіна і словы: "Вечная слава героям, погибшим в боях за свободу и независимость нашей Родины!"

К. І. Пятроў

ВЁСКА АКЦЯБРОВА,
цэнтр сельсавета

Брацкая магіла савецкіх воінаў, помнік землякам. У цэнтры вёскі, каля клуба. Пахаваны 31 воін, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі раёна. У 1963 г. на магіле пастаўлены помнік – скульптура воіна. Побач устаноўлены дошкі з імёнамі 234 землякоў, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ВЁСКА БАРСУКІ, цэнтр сельсавета

Брацкая магіла савецкіх воінаў, помнік землякам. У цэнтры вёскі. Пахаваны 72 воіны, якія загінулі ў 1943 г. на тэрыторыі раёна ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У 1958 г. на магіле воінаў, якія загінулі ў гэтых баях, пастаўлены помнік – скульптура воіна з аўтаматам. Побач устаноўлены дошкі з імёнамі 155 землякоў, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ВЁСКА ВАЛЫНЦЫ,
цэнтр сельсавета

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан. На паўночнай ускраіне вёскі, каля школы. Пахаваны 168 воінаў і 1 партызан, якія загінулі ў 1943 – 1944 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі раёна. У 1959 г. на магіле пастаўлены помнік – скульптура воіна з аўтаматам.

ВЁСКА ВАШЧАНКІ, Ліцвінавіцкі сельсавет

Брацкая магіла савецкіх воінаў, помнік землякам. На паўднёвай ускраіне вёскі, у скверы. Пахаваны 3 воіны, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1968 г. на магіле пастаўлены абеліск. Абапал яго – дошкі з імёнамі 150 землякоў, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ВЁСКА ВОРНАЎКА,
цэнтр сельсавета

Брацкая магіла савецкіх воінаў, помнік землякам. У цэнтры вёскі, насупраць будынка клуба. Пахаваны 63 воіны, якія загінулі ў 1943 – 1944 гг. на тэрыторыі раёна ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1958 г. на магіле пастаўлены помнік – скульптура воіна з аўтаматам. Побач – мемарыяльныя дошкі з імёнамі 152 землякоў, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ВЁСКА ВЫСОКАЕ,
Ворнаўскі сельсавет

Помнік землякам. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 62 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1975 г. пастаўлены абеліск.

ВЁСКА ЗАДУБ'Е,
Стараградскі сельсавет

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На паўночнай ускраіне вёскі. Пахаваны 36 воінаў, якія загінулі ў 1941 і 1943 гг. на тэрыторыі раёна ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахава-

Абеліск на месцы гібелі камандзіра партызанскага атрада П. П. Качуеўскага

ных — воіны 121-ай гвардзейскай дывізіі 3-яй арміі Беларускага фронту. У 1966 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ВЁСКА ЗАЛАТАМІНО,
цэнтр сельсавета

Помнік землякам. У скверы. На ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

ВЁСКА КАМЕНКА,
цэнтр сельсавета

Брацкая магіла савецкіх воінаў. У цэнтры вёскі. Пахаваны 77 воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1944 г. У 1958 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна з аўтаматам.

Помнік землякам. У цэнтры вёскі, у скверы. На ўшанаванне памяці 255 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1976 г. пастаўлены мемарыяльны знак.

ВЁСКА КАРОЦЬКІ,
цэнтр сельсавета

Помнік землякам. У скверы, насупраць васьмігадовай школы. На ўшанаванне памяці 149 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1970 г. пастаўлены помнік — скульптурная кампазіцыя: 3 воіны.

ВЁСКА КАСЦЮКОЎКА,
Залатамінскі сельсавет

Курган Славы. За 0,5 км на поўнач ад вёскі, на беразе р. Сож.

У ходзе Гомельска-Рэчыцкай аперацыі 1943 г. пры вызваленні міжрэчча Сажа і Дняпра войскі 3-яй арміі прарвалі абарону праціўніка, з баямі прайшлі 16 км шырынёй па фронту да 20 км, перарэзалі шашу Слаўгарад—Доўск, што дало магчымасць пераправіцца на правы бераг Сажа другому эшалону арміі і працягваць наступленне.

У напружаных баях савецкія воіны праявілі мужнасць і масавы гераізм. Асабліва вызначыўся камандзір асобнай стралковай роты капітан М. Г. Калінкін, які закрыў сваім целам амбразуру варожага дзота.

У 1968 г. у памяць аб гераізме савецкіх воінаў на месцы прарыву насыпаны курган Славы, каля яго асновы ўстаноўлена пліта з апісаннем подзвігу Героя Савецкага Саюза М. Г. Калінкіна.

ВЁСКА КЛЯПІН,
Валынцаўскі сельсавет

Брацкая магіла пертызан. За 0,2 км на поўнач ад вёскі. Пахаваны партызаны М. М. Сляпцоў і К. І. Чабаткоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1942 г. У 1949 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Ускладанне вянкоў да абеліска П. П. Качуеўскаму

Магіла Качуеўскага Паўла Паўлавіча. На могілках. Камандзір партызанскага атрада "Другія" П. П. Качуеўскі загінуў 4.7.1942 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1949 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ВЁСКА КУРГАННЕ,
Акцяброўскі сельсавет

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На могілках. Пахаваны воіны, якія загінулі ў 1941 і 1943 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ВЁСКА ЛАЗОВІЦА,
Струменскі сельсавет

Помнік землякам. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1956 г. пастаўлены абеліск.

ВЁСКА ЛІЦВІНАВІЧЫ,
цэнтр сельсавета

Брацкая магіла савецкіх воінаў, помнік землякам. Каля сярэдняй школы. Пахаваны 105 воінаў, якія загінулі ў лістападзе 1943 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1958 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна. Побач устаноўлены дошкі з імёнамі 76 землякоў, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ВЁСКА ЛУБЯНКА,
Стараградскі сельсавет

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На паўночнай ускраіне вёскі. Пахаваны 12 воінаў 121-ай стралковай дывізіі 3-яй арміі Беларускага фронту, якія загінулі ў лістападзе 1943 г. у баях пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1957 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

ВЁСКА ЛУЖОК, цэнтр сельсавета

Брацкая магіла савецкіх воінаў, помнік землякам. Каля сярэдняй школы. Пахаваны 25 воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў пры вызваленні раёна. У 1958 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна. Побач устаноўлены дошкі з імёнамі 244 землякоў, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ВЁСКА МАЛЯНІК,
Струменскі сельсавет

Помнік землякам. На заходняй ускраіне вёскі. На ўшанаванне памяці 65 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

ВЁСКА РУДНЯ,
Ліцвінавіцкі сельсавет

Магіла савецкага воіна, помнік землякам. Каля клуба, у скверы. Пахаваны воін, што загінуў у 1941 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1952 г. на магіле пастаўлены абеліск, на якім дошка з надпісам-прысвячэннем 50 землякам, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ВЁСКА СТАРАГРАД,
цэнтр сельсавета

Брацкая магіла савецкіх воінаў. У цэнтры вёскі, каля будынка канторы саўгаса "Стараградскі". Пахаваны воіны, што загінулі тут у баях у 1941 г., а таксама 17 воінаў 121-ай стралковай дывізіі 3-яй арміі Беларускага фронту, якія загінулі ў лістападзе 1943 г. пры вызваленні вёскі.

Помнік землякам. На паўднёвай ускраіне вёскі, у скверы. На ўшанаванне памяці 269 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1976 г. пастаўлена стэла.

ВЁСКА СТРУКАЧОЎ,
цэнтр сельсавета

Брацкая магіла савецкіх воінаў. У цэнтры вёскі, у школьным скверы. Пахаваны 49 воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1943—1944 гг. пры вызваленні тэрыторыі раёна. У 1957 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

ВЁСКА СТРУМЕНЬ,
цэнтр сельсавета

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, помнік землякам. Каля будынка праўлення калгаса "Радзіма", у скверы. Пахаваны 47 воінаў і 1 партызан, якія загінулі ў баях за вызваленне раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1959 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна са схіленым у жалобе сцягам. Побач — дошкі з імёнамі 137 землякоў, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ВЁСКА СТУДЗЯНЕЦ,
Залатамінскі сельсавет

Магіла Калінкіна Міхаіла Герасімавіча. За 1,2 км на ўсход ад вёскі, у лесе.

М. Г. Калінкін нарадзіўся ў 1916 г. у Ленінградзе. Камандзір асобнай стралковай роты капітан М. Г. Калінкін вызначыўся 22.11.1943 г. у баі пры вызваленні в. Студзянец. У рашаючы момант бою М. Г. Калінкін закрыў сваім целам амбразуру дзота, што дало магчымасць байцам захапіць важны плацдарм і вызваліць в. Студзянец. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 15.1.1944 г. У 1979 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ВЁСКА ТРУД,
Струменскі сельсавет

Помнік партызанам. У скверы.

Кармянскі партызанскі атрад (камандзір А. І. Ушаў, камісары М. С. Бруёк, І. А. Асташонак) створаны 30.5.1942 г., дзейнічаў на поўначы Гомельскай вобл. Партызаны ў ліпені 1943 г. разграмілі варожы гарнізон у Карме, захапілі збожжа, якое гітлераўцы падрыхтавалі для адпраўкі ў Германію. Народныя мсціўцы актыўна ўдзельнічалі ў аперацыі "Рэйкавая вайна" і разам з часцямі Чырвонай Арміі ў лістападзе 1943 г. вялі баі за вызваленне Кармянскага р-на. 23.11.1943 г. атрад (476 партызан) злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі.

У 1976 г. у гонар баявой дзейнасці партызан пастаўлены помнік — абеліск і зямлянка.

ВЁСКА ХІЗАЎ,
Стараградскі сельсавет

Помнік землякам. На паўднёва-ўсходняй ускраіне вёскі, каля канторы

племсаўгаса "Багданавічы". На ўшанаванне памяці 144 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1952 г. пастаўлены абеліск.

ВЁСКА ХЛЯЎНО,
Залатамінскі сельсавет

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На могілках. Пахаваны воіны 283-яй стралковай дывізіі, якія загінулі ў 1943 г. у баях за вызваленне в. Хляўно ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1958 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан. Каля сярэдняй школы. Пахаваны 290 воінаў, якія памерлі ў 1943 г. ад ран у палявым шпіталі, і 5 партызан. У 1958 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

КАРМА,
гарадскі пасёлак, цэнтр раёна

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, помнік землякам. На плошчы, у скверы. Пахаваны 72 воіны і партызаны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1943 г.

У 1967 г. на брацкай магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна, абапал яе дошкі з імёнамі 290 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

Магіла ахвяр фашызму. Вул. Леніна, на могілках. Пахаваны каля 1,5 тыс. мірных жыхароў пасёлка і іншых населеных пунктаў Гомельскай вобл., закатаваных нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1941—1943 гг. У 1966 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Асноўныя скарачэнні, якія прыняты ў спісах

абр — артылерыйская брыгада
абс — асобны батальён сувязі
авд — авіяцыйная дывізія
авп — авіяцыйны полк
ад — артылерыйская дывізія
азсп — асобны запасны стралковы полк
аінжб — армейскі інжынерны батальён
амедсб — асобны медыка-санітарны батальён
амцб — асобны мотацыклетны батальён
амцп — асобны мотацыклетны полк
ап — артылерыйскі полк
асп — асобны полк сувязі
арад — асобная разведвальная дывізія
арб — асобны разведвальны батальён
арс — асобная рота сувязі
асп — асобны стралковы полк
асапб — асобны сапёрны батальён
асбр — асобная сапёрная брыгада
аўтбр — аўтамабільная брыгада
аўтп — аўтамабільны полк
баа — батальён аэрадромнага абслугоўвання
бад — бамбардзіровачная авіяцыйная дывізія
бап — бамбардзіровачны авіяцыйны полк
в. — вёска
ваяв. — ваяводства
вобл. — вобласць
воп. — вопіс
г. — год, горад
габр — гаўбічная артылерыйская брыгада
гап — гаўбічны артылерыйскі полк
гв. — гвардыі, гвардзейскі
гл. — глядзі
г.п. — гарадскі пасёлак
дбап — далёкабамбардзіровачны авіяцыйны полк
драп — далёкаразведвальны авіяцыйны полк
дыв. — дывізія
зенад — зенітная артылерыйская дывізія
зенадн — зенітны артылерыйскі дывізіён
зенап — зенітны артылерыйскі полк
зн. — знішчальны
зптабр — знішчальная процітанкавая артылерыйская брыгада
зптадн — знішчальны процітанкавы артылерыйскі дывізіён
зптап — знішчальны процітанкавы артылерыйскі полк
зсп — запасны стралковы полк
інш. — іншы
ісапб — інжынерна-сапёрны батальён
ісапбр — інжынерна-сапёрная брыгада
кам. аддз. — камандзір аддзялення
кап. — капітан
кап — карпусны артылерыйскі полк
кд — кавалерыйская дывізія
кк — кавалерыйскі корпус
л. — ліст
лейт. — лейтэнант
лкп — лёгкі кавалерыйскі полк
мал. — малодшы
мбр — механізаваная брыгада
медсб — медыка-санітарны батальён
мінп — мінамётны полк
мінбр — мінамётная брыгада
міндн — мінамётны дывізіён
мк — матарызаваны корпус
мп — матарызаваны полк

мсбр — мотастралковая брыгада
мсд — мотастралковая дывізія
мсп — мотастралковы полк
мтап — міна-тарпедны авіяцыйны полк
мтад — міна-тарпедная авіяцыйная дывізія
мцп — мотацыклетны полк
н. — нарадзіўся
падпалк. — падпалкоўнік
палк. — палкоўнік
памбр — пантонна-маставая брыгада
пас. — пасёлак
пдд — паветрана-дэсантная дывізія
пдсп — паветрана-дэсантны стралковы полк
п/п — палявая пошта
рад. — радавы
рап — разведвальны авіяцыйны полк
с. — старонка
с/с — сельсавет
сап — самаходны артылерыйскі полк
сбр — стралковая брыгада
сд — стралковая дывізія
ск — стралковы корпус
сп — стралковы полк
спр. — справа
старш. — старшына
ст. — старшы
сярж. — сяржант
т. — том
тб — танкавы батальён
тбр — танкавая брыгада
тд — танкавая дывізія
тк — танкавы корпус
тп — танкавы полк
тыс. — тысяча
ф. — фонд
цсап — цяжкі самаходны полк
цтп — цяжкі танкавы полк
шад — штурмавая авіяцыйная дывізія
шап — штурмавы авіяцыйны полк
яфр. — яфрэйтар

1945

ДА НАШЫХ ДЗЁН

Пасля вызвалення

Адгрымела Вялікая Айчынная вайна. Стала наладжвацца мірнае жыццё і ў Карме. 830 дзён і начэй (з 15.8.1941 да 25.11.1943 г.) раён знаходзіўся пад фашысцкай акупацыяй. За гэты час гітлераўскімі захопнікамі ён быў амаль цалкам разбураны і разрабаваны. Акупанты вывезлі ўсе матэрыяльныя і культурныя каштоўнасці. Былі знішчаны 1579 жылых дамоў, тры машынна-трактарныя станцыі, саўгас, 105 калгасаў, льнозавод, спіртзавод, малаказавод, спалены ўсе грамадскія пабудовы. Фашысцкія захопнікі вывезлі сельгастэхніку і інвентар, ліквідавалі ўсё грамадскае пагалоўе жывёлы: пагналі звыш 6 тысяч коней, 11 тысяч галоў буйной рагатай жывёлы, загубілі 10 400 свіней і 5300 авечак.

Былі разрабаваны 70 школ, усе бібліятэкі, раённая і тры ўчастковыя бальніцы, ФАПы. Шмат было спалена дамоў у вёсках Бервяны, Гарадок, Казімірава, Міхееўка, Паштовая Глінка. У Валынцах згарэла 187 дамоў, у Кляпіне — 138, у Струмені — 117. Поўнасцю былі знішчаны пабудовы ў в. Старая Халапаўка. Агульны ўрон, нанесены раёну захопнікамі, склаў звыш 1 мільярда 250 мільёнаў рублёў у цэнах таго часу.

Аднак самымі цяжкімі і беззваротнымі былі людскія страты. Акупанты расстралялі, павесілі і па-зверску замучылі 1173 мірныя жыхары раёна і 1493 пагналі ў нямецкую няволю. У баях за вызваленне Кармяншчыны аддалі свае жыцці 1119 салдат, сяржантаў і афіцэраў Чырвонай Арміі. Не менш трагічнымі з'яўляюцца звесткі і аб нашых земляках, якія не вярнуліся з франтоў Вялікай Айчыннай. Больш як шэсць тысяч воінаў і партызан раёна загінулі смерцю храбрых у барацьбе з ворагам. Амаль што кожная сям'я не дачакалася бацьку ці сына, дачку ці маці, брата ці сястру. Насельніцтва раёна зменшылася ў параўнанні з даваенным амаль на чвэрць.

Папялішчы і нястача, гора ў шматлікіх сем'ях, якія страцілі родных... Але перамога над фашызмам натхняла на стваральную працу. Адразу пасля вызвалення раёна пачалі дзейнічаць органы савецкай улады, першыя рашэнні якіх былі накіраваны на ўлік маёмасці, прадуктаў харчавання і жывёлы, арганізацыю дзяржзакупак збожжа і бульбы, мабілізацыю працаздольнага насельніцтва на аднаўленчую працу. Насельніцтву прадастаўляліся доўгатэрміновыя крэдыты на будаўніцтва, набыццё жывёлы і інвентару. Старшынёй выканкома райсавета быў абраны былы партызан атрада імя Варашылава 1-ай Гомельскай брыгады С. Р. Еўдачкоў. Райком партыі ўзначаліў былы сакратар падпольнага райкома КП(б)Б М. С. Бруёк. Адным з першых на раённым сходзе камуністаў было разгледжана пытанне "Аб аднаўленні калгасаў і выкананні плана лесанарыхтовак".

У пачатку 1944 г. у Карме пачаў працаваць радыёвузел. За кароткі тэрмін аднавіліся і пачалі хутка развівацца ўсе віды сувязі.

У краіне яшчэ не скончылася вайна з фашыстамі, а на вызваленай тэрыторыі Кармяншчыны (у в. Кляпін) пачала выходзіць раённая газета "Авангард". У рэдакцыю прыйшлі маладыя, але ўжо выпрабаваныя суровай школай вайны журналісты: рэдактар Г. П. Ус, адказны сакратар В. Паўлава, літсупрацоўнік В. Ф. Маеўскі. Г. П. Ус пазней узначаліла "Гомельскую праўду", а потым шмат гадоў рэдагавала часопіс "Работніца і сялянка". В. Ф. Маеўскі стаў відным "вожыкаўцам" і паэтам-байкапісцам.

Жыццё ўсё больш і больш набывала мірныя рысы. У 1945 г. раён атрымаў уласны бюджэт.

К. І. Пятроў

Станаўленне

З успамінаў М. З. Патапенкі, былога жыхара в. Старая Зенькавіна

Як інвалід дзяцінства па зроку я не быў прызваны ў армію і ўвесь перыяд акупацыі знаходзіўся ў в. Старая Зенькавіна, бачыў усе жахі, якія перажылі жыхары Кармы і вёсак раёна. Усяго было расстраляна ў Карме 830 чалавек, з іх яўрэяў — 183. З нашай вёскі, якая налічвала 110 двароў, з вайны не вярнуліся 88 чалавек. У мяне загінулі на фронце бацька і два браты. У час акупацыі памерла сястра.

Падчас адступлення немцаў частка насельніцтва раёна была эвакуіравана за р. Сож. Астатніх немцы пагналі далёка ў тыл і знішчылі шмат хат і прысядзібных пабудоў. Амаль не засталося жывёлы, былі вывезены ўся маёмасць, адзенне.

Калі немцы адступілі, людзі вярнуліся дамоў. Яны аказаліся голыя і галодныя, не засталося месца, дзе можна было б жыць.

Адразу пасля вызвалення быў арганізаваны калгас "Перамога". Старшынёй абралі Аляксандра Аляксеевіча Зайцава. Гэта адбылося ў канцы лістапада 1943 г. У 1944 г. людзі, у асноўным жанчыны, пачалі працаваць у калгасе. Мужчын, старых і інвалідаў засталося вельмі мала. На пачатку 1944 г. у калгасе было ўжо 19 коней і 18 кароў, якіх даглядала Цэнебрычэнка Матрона Пятроўна. У 1944 г. да маці адмірала Пятра Ціханавіча Бандарэнкі прывезлі карову і быка, якіх яна здала ў калгас, таму што не было чым карміць. Жанчыны цягалі на сабе плугі і бароны, шмат участкаў ускопвалі лапатамі.

З 1945 г. у калгасе пачало папаўняцца пагалоўе коней і кароў, але ўборку ўраджаю праводзілі ў асноўным уручную — косамі і сярпамі. У 1946 г. у калгасе ўжо мелася коней і кароў больш як па 50 галоў.

У магазінах немагчыма было купіць соль, цукар і іншыя прадукты, іх проста не было ў продажы. Крупы людзі рабілі самі (таўклі зерне ў ступах), а вясной збіралі марожаную бульбу і сушылі яе. Дзяржаве трэба было штогод здаваць воўну і скуры ад жывёл, 150 л малака, 42 кг мяса, завезці на поле па тры-чатыры вазы гною. А каб пракарміць уласную карову, людзі збіралі траву на балотах і ў кустах.

Але, нягледзячы на такое цяжкае становішча, у людзей была моцная вера ў лепшае будучае.

З успамінаў А. П. Саламонава, жыхара в. Валынцы

Когда я в декабре 1945 г. возвратился домой из армии, родители всей семьей жили в землянке. При отступлении немцы почти полностью сожгли деревню. Сразу после освобождения всем колхозникам дали по 0,5 га на приусадебные участки. Обрабатывали землю коровами и волами, но еще чаще вручную: лопатой, мотыгой, тяпкой. Урожаи были очень низкими, к тому же и в магазинах купить было нечего, да и денег у людей не было.

Учителям вместо зарплаты через магазин выдавали зерно по 20—30 кг в месяц. Чтобы прокормить себя, людям приходилось обрабатывать землю в лесу на полянах. Сеяли в основном просо.

З успамінаў Б. С. Пладунова, ветэрана вайны і працы

Вёска Хізаў пасля акупацыі ўцалела. Згарэў толькі адзін з трох будынкаў школы, таму вучням прыйшлося займацца ў дзве змены. У вёсцы ішло аднаўленне калгаса "Новы мір".

Дзяржава забяспечыла насеннем, але яго трэба было даставіць з Кармы. Жанчыны ў мяшках, на сваіх плячах, прынасілі яго ў Хізаў. Крыху пазней былі атрыманы некалькі кароў і коней. З іх пачалося развіццё малочнатаварнай фермы. Мяне абралі сакратаром партарганізацыі калгаса, і мы кожную суботу праводзілі партыйныя сходы, на якіх падводзілі вынікі працы за тыдзень.

Агульны настрой усяму насельніцтву надавалі пачуццё радасці жыцця, радасць працы. Словы "Нам песня строить и жить помогает" адпавядалі таму часу. На працу і з працы ішлі з песнямі. У суботнія і нядзельныя вечары танцавалі і спявалі пад гармонік.

Ішла першая пасляваенная пяцігодка. Былі выпушчаны аблігацыі Дзяржаўнай пазыкі, на якую штогод на пачатку мая праводзілася падпіска. І людзі падпісваліся. Кожны хацеў дапамагчы дзяржаве. План пяцігодкі выконваўся, краіна была на ўздыме.

Пачынаючы з 1949 г. пайшло штогадовае планавае зніжэнне цэн на прадукты харчавання і спажывецкія тавары. У калгасах ужо працавалі трактары. Гаспадаркі набывалі сілу. Жыццё з кожным годам паляпшалася.

У мірнай працы

Надышоў доўгачаканы дзень Перамогі. Вярнуліся дамоў франтавікі. Рабочыя прамысловых прадпрыемстваў рапартавалі аб аднаўленні вытворчасці і выкананні даведзеных планаў. Вельмі хуткімі тэмпамі ішло жыллёвае будаўніцтва, але тым не менш праблема жылля заставалася вострай. У пачатку 1946 г. вялікая колькасць сем'яў пражывалі яшчэ ў зямлянках.

За гады першай пасляваеннай пяцігодкі пачалі працаваць тры адноўленыя цагельныя заводы, спіртзавод, райпрамкамбінат, лесапільны і смалакурны заводы, торфапрадпрыемства ў в. Ворнаўка, млын у райцэнтры, ільнозавод, вапнавы завод у в. Студзянец.

Аднавіла сваю работу вышывальная арцель імя Клары Цэткін, якая ў 1960 г. была пераўтворана ў аднайменную фабрыку. Да канца 1955 г. выпуск прамысловай прадукцыі ў параўнанні з 1945-ым павялічыўся больш як у два разы, а з даваенным узроўнем — у 3,5.

Да канца 1952 г. было праведзена ўзбуйненне калгасаў з мэтай больш поўнага выкарыстання зямель, замацаваных за імі. Калі ў 1949 г. у раёне налічвалася 103 калгасы, то ў канцы 1952-га — усяго 28 буйных гаспадарак.

Першы пасляваенны пяцігадовы план прадугледжваў не толькі аднаўленне сельскай гаспадаркі, але і яе далейшае развіццё. У выніку ўжо вельмі хутка пасяўныя плошчы ў раёне дасягнулі даваеннага памеру, а па некаторых культурах нават перавысілі яго.

Асаблівая ўвага ўдзялялася жывёлагадоўлі. За пяць першых пасляваенных гадоў грамадскае пагалоўе было поўнасцю адноўлена. Палепшыўся пародны склад жывёлы, павысілася яе прадукцыйнасць.

У вёсцы была ажыццёўлена цэлая сістэма пераўтварэнняў, якая дазволіла ўмацаваць матэрыяльна-тэхнічную базу калгасаў і саўгасаў, стварыць моцныя аб'яднанні "Сельгастэхніка", увесці новы парадак планавання.

У пачатку 1960-ых гг. прайшло яшчэ адно ўзбуйненне калгасаў, пры гэтым частка іх была пераўтворана ў саўгасы, у выніку чаго ў раёне стала 8 калгасаў і 8 саўгасаў. У 1975 г. да іх далучылася птушкафабрыка "Сож", якая пачала даваць да 1,5 тыс. т мяса ў год.

У распараджэнні калгасаў і саўгасаў у сярэдзіне 60-ых гг. мелася 58 тыс. га сельгасугоддзяў, у тым ліку 38,8 тыс. га ворыва. Сярэднеўзважаны бал сельгасугоддзяў склаў 41, ворыва — 51.

Значна палепшылася тэхнічная аснашчанасць сельскай гаспадаркі. Толькі ў 1964 г. калгасы і саўгасы Кармяншчыны атрымалі 43 трактары, 42 камбайны, 24 аўтамашыны, 259 іншых сельскагаспадарчых машын і прычапных агрэгатаў. Па стану на 1 студзеня 1965 г. на калгасных і саўгасных палях працавала 304 трактары, 226 аўтамашын, шмат іншай тэхнікі.

Усе гэтыя захады, безумоўна, не маглі не адбіцца на станоўчым росце эканамічных паказчыкаў. Так, вытворчасць зерня ў 1965 г. склала больш за 20 тыс. т і ўзрасла ў параўнанні з 1964 г. на 35%. Ураджайнасць зерневых склала 10,1 і бульбы — 90 ц з гектара.

Павелічэнне вытворчасці зерня, бульбы, умацаванне кармавой базы адбіліся на павышэнні прадукцыйнасці грамадскай жывёлагадоўлі. Вырасла колькасць статка. На 100 га сельгасугоддзяў яна склала 29,9 галавы, з іх кароў прыходзілася 11,9, свіней — 32,1.

Паступова расла вытворчасць і рэалізацыя жывёльнай прадукцыі. Мяса за 1966 г. было выпрацавана 48,3 ц, малака — 194,3 ц на 100 га сельгасугоддзяў. Надой малака ад кожнай каровы ў сярэднім дасягнуў 1670 кг, атрымана па 88 цялят на 100 кароў і нецеляў. За гэтыя гады дзякуючы механізацыі найбольш працаёмкіх працэсаў у жывёлагадоўлі ўдалося паменшыць сабекошт прадукцыі галіны. У 1966 г. вытворчасць цэнтнера малака ў сярэднім па раёну раўнялася 16 рублям, мяса — 125.

Тады ж пачалася вялікая работа па будаўніцтву новых і рэканструкцыі старых жывёлагадоўчых памяшканняў з механічным выдаленнем гною, водапаеннем і даеннем кароў. На фермах з'явіліся цэхі па прыгатаванні кармоў, пачала ўкараняцца механізаваная раздача фуражу.

Вялікая работа праводзілася і па ўмацаванні кармавой базы за кошт пашырэння нарыхтовак сенажу, сіласу, травяной мукі. У саўгасе імя Чапаева былі пабудаваны міжгаспадарчы камбікормавы завод, ва ўсіх калгасах і саўгасах пашыраны плошчы пад кармавыя караняплоды і прыняты меры па павышэнні іх ураджайнасці.

Значна павысіўся ўзровень механізацыі сельскай гаспадаркі ў 70—80-ыя гг. Да канца 80-ых у калгасах і саўгасах раёна мелася ўжо каля 600 трактароў і 350 грузавых аўтамабіляў.

За дасягнутыя поспехі ў зімова-стойлавы перыяд 1982—1983 гг. раён узнагароджаны Ганаровым дыпломам ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ.

Урад краіны аказаў вялікую дапамогу працаўнікам вёсак па вапнаванні кіслых глебаў за лік бюджэта, у павелічэнні паставак мінеральных угнаенняў і сродкаў абароны ад шкоднікаў і хвароб сельгаскультур, што яшчэ больш садзейнічала павелічэнню з году ў год вытворчасці і продажу сельгаспрадукцыі. Пачаўся гэты пад'ём у канцы 60-ых гг. і працягваўся да 1990 г. За 1986—1990 гг. калгасы і саўгасы раёна вырошчвалі ў сярэднім за год па 46,7 тыс. т зерня пры сярэдняй ураджайнасці 27,1 ц/га, у 1987 г. — ажно 56,1 тыс. т, што склала ў сярэднім па раёну 30,7 ц/га.

Яшчэ больш шчодрым быў збожжавы гектар у калгасах імя Дзімітрава — па 38,7 ц, "Перамога" — 37,8, саўгасах "Кармянскі" і "Багданавічы", дзе адпаведна было атрымана па 34,6 і 34 цэнтнеры.

У 1990 г. у калгасах "Перамога" (старшыня М. М. Бондараў, галоўны аграном Н. В. Капачоў) атрымалі па 45 ц зерневых на круг, імя Дзімітрава (старшыня Я. М. Вараб'ёў, галоўны аграном Г. І. Пятроўская) — па 41, "Рассвет" (старшыня В. М. Максіменка, галоўны аграном В. Г. Міроненка) — па 39,3 цэнтнера.

Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне калгасаў і саўгасаў ажыццяўлялася арганізацыяй "Райаграпрамтэхніка". Яна мела майстэрні па рамонту сельскагаспадарчай тэхнікі і аўтамабіляў, неабходную колькасць тэхнікі для аказання калгасам і саўгасам дапамогі ў грузаперавозках.

Гэтая арганізацыя штогод рабіла гаспадаркам раёна розных паслуг на суму каля 2,5 млн. рублёў. У яе калектыве працавалі 459 чалавек. Яшчэ больш як 200 чалавек працавалі ў "Райсельгасхіміі" і аказвалі вяскоўцам значную дапамогу ў вапнаванні кіслых глебаў, унясенні арганічных і мінеральных угнаенняў, барацьбе з пустазеллем, шкоднікамі і хваробамі сельгаскультур.

Паралельна ўзрастала вытворчасць прадуктаў жывёлагадоўлі і продаж іх дзяржаве.

Так, калі ў 1966—1970 гг. калгасы і саўгасы раёна ў сярэднім прадавалі 13 тыс. т малака ў год, то за 1986—1990 гг. — 33,1 тыс. тон. У сярэднім па раёну ад кожнай каровы ў 1990 г. было надоена па 3249 кг малака, а ў калгасах "Перамога" і імя Лепяшынскага — адпаведна 3923 і 3789 кілаграмаў. Вытворчасць мяса ў той перыяд у раёне складала 8,2 тыс. т, або ў 2,6 раза больш як у 1966 г. Лепшых паказчыкаў дабіўся калектыў саўгаса "Кармянскі", дзе ў 1990 г. на 100 га сельгасугоддзяў было выпрацавана 342,1 ц ялавічыны і свініны, у калгасе "Перамога" — 223,6 цэнтнера.

Прыкладна на столькі за гэтыя гады павялічылася і рэалізацыя мяса дзяржаве. У 1990 г. кармянскія калгасы і саўгасы прадалі яго 8,5 тыс. тон.

Самы вялікі грамадскі статак буйной рагатай жывёлы ў раёне налічваўся ў 1986 г. — 43 257 галоў, у тым ліку 12 480 — кароў. Свіней у гаспадарках налічвалася 16 278 галоў, а вытворчасць свініны ў 1966—1990 гг. перавышала 1000 т мяса ў год.

Нарошчвалі свае магутнасці прадпрыемствы раёна, вялі работу па павышэнні эфектыўнасці і паляпшэнні якасці прадукцыі. Так, ткацкая фабрыка (філіял № 2 РВТА "Чырвоны Кастрычнік") у пачатку 80-ых гг. выпускала прадукцыі больш як на 5 млн. рублёў (у цэнах таго часу). Пры гэтым выпуск прадукцыі з індэксам "Н" (навінка) складаў 46% ад агульнага аб'ёму тавараў. На прадпрыемстве працавала 430 чалавек, у тым ліку 330 — жанчын. Фабрыка вырабляла пакрывалы, хусткі, накідкі, абрусы, ручнікі. Двум відам вырабаў быў прысвоены Дзяржаўны знак якасці.

Значна павялічыў выпуск прадукцыі і палепшыў яе якасць камбінат будматэрыялаў. Гадавы аб'ём вытворчасці складаў 1 млн. 300 тыс. рублёў. Толькі адной цэглы тут выраблялася 11 млн. штук у год.

Больш за 1000 т валакна выпрацоўваў ільнозавод, а вытворчасць прадукцыі ў грашовым выражэнні складала 1 млн. 200 тыс. рублёў. На малаказаводзе вытворчасць прадукцыі дасягнула 21 тыс. т у год.

На працягу 1970—1980 гг. у раёне ў вялікіх памерах вялося будаўніцтва важнейшых аб'ектаў гаспадарчага і культурна-бытавога прызначэння сіламі ПМК-50 "Гомсельбуда" і МПМК-52 "Аблміжкалгасбуда". Дастаткова сказаць, што толькі колькасць працуючых у гэтай галіне перавышала 500 чалавек. За год яны выконвалі будаўніча-мантажных работ на суму больш як 4 млн. рублёў, што дазволіла непазнавальна змяніць цэнтральныя сядзібы калгасаў і саўгасаў, многія вёскі. За гэты час пабудаваны дабротныя, у большасці з поўнай механізацыяй усіх працаёмкіх працэсаў, жывёлагадоўчыя памяшканні, мехмайстэрні, зернясховішчы, ва ўсіх калгасах і саўгасах раёна ўзведзены адміністрацыйныя пабудовы, клубы і дамы культуры, школы і дзіцячыя садкі, выраслі жылыя дамы, пракладзены дзесяткі кіламетраў водаправодаў. Усе цэнтральныя сядзібы гаспадарак звязаны з райцэнтрам дарогамі з асфальтавым пакрыццём.

Мяняўся і знешні выгляд раённага цэнтра: будаваліся новыя вытворчыя, адміністрацыйныя і культурна-бытавыя аб'екты, шматкватэрныя жылыя дамы, заасфальтоўваліся цэнтральныя вуліцы, быў праведзены газаправод. На прыродным газе працуюць цэнтральная кацельня, спіртзавод і кацельня "Райаграпрамтэхнікі", газіфікаваны 1327 кватэр і 51 прыватны дом.

За пасляваенныя гады далейшае развіццё атрымала ахова здароўя. У раёне дзейнічаюць раённая і 4 участковыя бальніцы, 18 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, амбулаторыя. Там працуюць 35 урачоў з вышэйшай адукацыяй і каля 160

чал. сярэдняга медыцынскага персаналу. Аддзел райвыканкома па ахове здароўя ўзначальвала Т. І. Храмянкова, а галоўным урачом райбальніцы працяглы час працаваў Я. І. Кірыенка. Яны шмат зрабілі для паляпшэння медыцынскага абслугоўвання насельніцтва.

У сферы бытавога абслугоўвання занята каля 200 чалавек. Да паслуг жыхароў Кармяншчыны 15 майстэрань па рамонту і пашыву адзення, 4 майстэрні па рамонту і пашыву абутку, 35 прадпрыемстваў грамадскага харчавання, 90 магазінаў.

У 1983 г. у раёне працавала 16 дашкольных устаноў, дзіцячая музычная і спартыўная школы, 6 дамоў культуры, 24 сельскія клубы і аўтаклуб, 24 сельскія, адна раённая і адна дашкольна-дзіцячая бібліятэкі з кніжным фондам 10 800 экземпляраў.

Непазнавальна змянілася аблічча вёсак. Людзі з упэўненасцю глядзелі ў заўтрашні дзень. Але іх надзеі перакрэсліла аварыя на Чарнобыльскай АЭС. У раёне практычна не засталося зямлі, не забруджанай радыеактыўнымі элементамі. Рэха Чарнобыля адмоўна адбілася як на развіцці эканомікі раёна, так і на стане здароўя многіх людзей (гл. "Пад знакам Чарнобыля").

У Кармянскім раёне пражывае больш за тысячу ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Гэтыя людзі былі на пярэднім краі не толькі ў ваенны, але і ў мірны час. Актыўная жыццёвая пазіцыя была заўсёды ўласціва Аляксандру Мінавічу Казакову, Кузьме Кандратавічу Нікіціну, Міхайлу Іванавічу Якушэнку, Мікалаю Канстанцінавічу Талкачову, Леаніду Фёдаравічу Якутовічу, Данілу Ягоравічу Прахарэнку і іншым былым воінам. Многія ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны і сёння ў страі. Ветэраны з гонарам выконваюць свой пачэсны грамадзянскі абавязак — шчыра перадаюць моладзі баявы і працоўны вопыт старэйшых пакаленняў. Вялікую дапамогу ў гэтай справе аказвае ім і Кармянскі раённы савет ветэранаў вайны і працы на чале з В. Р. Прытычанкам.

Сведчаннем нязгаснай памяці ўдзячных жыхароў Кармяншчыны па тых, хто, не шкадуючы жыцця, змагаўся з ворагам, з'яўляецца і тое, што рашэннем выканкома пасялковага Савета дэпутатаў 15 чалавекам прысвоена званне "Ганаровы грамадзянін гарадскога пасёлка Карма". Сярод іх — камандзір 121-ай стралковай дывізіі В. А. Канавалаў, начальнік штаба В. Куўшыннікаў і старшыня савета ветэранаў гэтай дывізіі М. І. Захараў, арганізатар партызанскага руху на Кармяншчыне Н. А. Міхайлашаў, камандзір партызанскага атрада імя Калініна М. Р. Грызлоў, сакратар падпольнага райкома камсамола А. В. Кузьмянкоў, Герой Савецкага Саюза А. А. Філімонаў і іншыя.

Так, з пакалення ў пакаленне перадаецца жывая нітка памяці. Ратны і працоўны подзвіг старэйшых пакаленняў працягваецца ў мірных, стваральных справах сённяшняга дня, у смелых марах і планах моладзі, у імкненні народа абараніць мір і шчасце.

К. І. Пятроў

Народная асвета

Усе пасляваенныя гады ў раёне вялася ўпартая работа па ўдасканаленні і паляпшэнні сістэмы адукацыі. Яна пачалася адразу пасля вызвалення Кармяншчыны ад фашысцкіх акупантаў.

Цяжкасці ў рашэнні гэтай задачы заключаліся ў слабай матэрыяльнай базе школ, адсутнасці памяшканняў для заняткаў, а яшчэ больш — у вострым недахопе добра падрыхтаваных настаўніцкіх кадраў.

Для таго каб вырашыць кадравую праблему, на настаўніцкія курсы, арганізаваныя Наркамасветы БССР пры педагагічных інстытутах у Магілёве, Віцебску, Гомелі, Мінску, ад раёна было накіравана 30 настаўнікаў з мэтай павышэння ведаў, падрыхтоўкі для работы ў 5—7-ых класах.

Адначасова былі арганізаваны шасцімесячныя курсы пры раённым аддзеле народнай адукацыі. Загадчыкам курсаў прызначылі выкладчыка геаграфіі Кармянскай сярэдняй школы Ф. А. Кажамякіна, выкладчыкамі — сту-

дэнтаў-практыкантаў Віцебскага педінстытута, настаўнікаў Кармянскай сярэдняй школы І. Я. Таранчанку, А. А. Яўнайса, загадчыка райана М. І. Якушэнку, інспектара К. Е. Дарожку. На курсах займалася каля 30 чалавек. Многія будучыя педагогі завочна набывалі веды ў Рагачоўскім педвучылішчы. Сярод апошніх была тады і А. Е. Чэчыкава, якая потым стала заслужанай настаўніцай БССР.

На пачатку 1966/1967 навучальнага года ў 9 сярэдніх, 17 васьмігадовых, з якіх адна была дапаможнай і адна школай-інтэрнатам, школах раёна навучаліся 8341 чалавек, з іх у сярэдніх школах — 3674, васьмігадовых — 3102.

Усяго ў школах Кармяншчыны на пачатку 1966/1967 навучальнага года працавала 532 настаўнікі-выкладчыкі, 151 з якіх меў вышэйшую адукацыю, 118 — незакончаную вышэйшую. Акрамя настаўнікаў-выкладчыкаў там працавала 24 старшыя піянерважатыя і 55 выхавацеляў у групах падоўжанага дня, школе-інтэрнаце і дапаможнай школе. У раёне завершана ўсеагульнае васьмігадовае навучанне, ажыццяўляецца пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі.

Сярод кармянскіх педагогаў заслужаным аўтарытэтам і павагай сярод калег карысталіся Міхаіл Іванавіч Якушэнка, які працаваў загадчыкам райана, дырэктарам Быканскай і Кароцькаўскай школ, а з 1935 г. на працягу 20 гадоў — дырэктарам Кармянскай СШ № 1, настаўнік матэматыкі Кармянскай СШ № 1 А. А. Яўнайс, настаўнікі А. А. Усава, М. Г. Думс-Савініч, П. А. Паліцын, П. П. Караткевіч, В. І. Цыбікаў, К. Т. Пісарэнка, Н. Д. Асюлева, Р. І. Сянько, І. Р. Якуш, К. К. Клімаў, Б. С. Пладуноў і іншыя.

Адной з лепшых школ раёна лічылася Кармянская. Да вайны яна зрабіла толькі 4 выпускі, пасля вайны — больш як 40. Пры школе працаваў кансультацыйны пункт Рагачоўскага педвучылішча, дзякуючы якому многія настаўнікі школы атрымалі сярэднюю педагагічную адукацыю, што было асабліва важна ў першыя пасляваенныя гады, калі настаўніцкіх кадраў вельмі не хапала.

Пэўна, патрэбна дадаць, што пры Кармянскай СШ № 1 яшчэ ў 1935 г. была арганізавана школа для людзей старэйшага ўзросту (у наступным — школа працоўнай моладзі). Арганізатарам і кіраўніком яе доўгі час быў М. І. Якушэнка. Потым школу ўзначальвалі С. Л. Ваксман, А. Л. Сазаноўская, Р. І. Сянько.

Гордасцю беларускага народа стаў выхаванец Кармянскай школы Пётр Ціханавіч Бандарэнка. Бязвусым юнаком ён добраахвотна пайшоў на Чырвоны флот, змагаўся супраць іншаземных акупантаў.

У мірныя гады Бандарэнка паспяхова закончыў Ваенна-палітычную акадэмію. Узначальваў да гэтага часу палітупраўленне Чарнаморскага Флоту, у 1939 г. прымаў удзел у рабоце XVIII з'езда ВКП(б). У гады Вялікай Айчыннай вайны контрадмірал П. Ц. Бандарэнка быў адным з арганізатараў абароны Адэсы і Севастопаля, абаронцам Сталінграда.

Добра ведаюць на Кармяншчыне і выхаванца Лужкоўскай няпоўнай сярэдняй школы Дзмітрыя Рыгоравіча Макаранку. Ён таксама прайшоў доўгі шлях дарогамі грамадзянскай, а затым Вялікай Айчыннай войнаў. Апошнія баявыя крокі ён зрабіў у званні генерал-маёра на Далёкім Усходзе ля Ліўдоенскага заліву, непадалёк ад Порт-Артура. Удзячныя землякі ўдастоілі Д. Р. Макаранку звання ганаровага грамадзяніна г.п. Карма.

Заўсёды жаданы госць у раёне і былы выхаванец Каменскай НСШ Аляксандр Андрэевіч Філімонаў, які пасля заканчэння танкавага вучылішча ваяваў з ворагам на Украіне, у Польшчы, Чэхаславакіі, Германіі і вярнуўся з вайны Героем Савецкага Саюза. Зараз Аляксандр Андрэевіч — доктар гістарычных навук, прафесар, працуе ў Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь.

Навучэнцамі школ раёна з'яўляліся Героі Савецкага Саюза Павел Уладзіміравіч Несцяровіч, ураджэнец в. Енцы, Павел Віктаравіч Мажэйка з в. Сапажкі.

Многія выпускнікі школ раёна сталі вучонымі ў розных галінах народнай гаспадаркі. Сярод іх І.І.Акінчыц, І.Ф.Аверчанка, В.В.Барашчанка, К.М.Бандарэнка, Э.У.Бандарэнка, Б.Ц.Бацанаў, І.Я.Гай-

коў, В.К.Гардзіенка, Л.М.Давыдзенка, У.А.Кулажанка, С.Х.Карпянкоў, В.Р.Караткевіч, Л.С.Корачкін, С.С.Казлоў, П.І.Корнеў, Я. Я. Лемянкоў, В.І.Лашкевіч, В.М.Мяжэнны, І.І.Мацвеенка, М.Дз.Несцяровіч, І.М.Панчанка, А.П.Пімашэнка, Л.А.Паплаўская, У.І.Рыжанкоў, І.Р.Сцепаненка, Р.Р.Сцепаненка, Л.І.Ткачоў, І.Р.Усевіч, А.А.Філімонаў, Р.Г.Цыганкоў, Т.М.Чыкалава і іншыя.

Педагогі раёна робяць усё для таго, каб вучань авалодаў глыбокімі і трывалымі ведамі, стаў сапраўдным патрыётам Радзімы. І як вынік самаадданай працы — лепшым з лепшых прысвоена званне заслужанага настаўніка Беларусі. Гэта — Н.Д.Асюлева, Р.Р.Ганжураў, М.А.Дзмітрыеў, К.К.Клімаў, М.Ц.Лялькова, Б.С.Пладуноў, Р.І.Сянько, П.М.Сяргеенка, А.І.Чэчыкава, З.Ц.Юдзянкоў, А.А. і В.А.Яўнайсы, М.І.Якушэнка.

Многія настаўнікі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі Савецкага Саюза, адзначаны ганаровым знакам "Выдатнік народнай адукацыі" Саюза і Рэспублікі Беларусь.

Педагагічныя калектывы раёна праводзяць вялікую работу па патрыятычным выхаванні падрастаючай змены на баявых і працоўных традыцыях старэйшых пакаленняў, подзвігах дзядоў і бацькоў, якія ў грозны час іншаземнай навалы баранілі сваю зямлю, а затым адбудоўвалі. І першае слова тут, як заўсёды, за настаўнікамі-франтавікамі М.І.Якушэнкам, П.Т.Асюлевым, М.Ф.Ігнаценкам, К. К. Клімавым, Д.К.Ляльковым, З.Г.Усевічам, А.П.Новікавым, В.І.Бандарэнкам, В.І.Багдановічам, Р.І.Сянько і іншымі ветэранамі.

К.І.Пятроў

Дакументы сведчаць

Выпіска з пастановы бюро Кармянскага райкома КП Беларусі

ад 26 лістапада 1982 г.

О работе партийных организаций колхоза имени Лепешинского и совхоза "Богдановичи" по поддержанию инициативы животноводов колхозов имени Железнякова Кореличского и имени Кирова Шкловского районов по успешному проведению зимовки скота, увеличению производства и продажи государству продукции животноводства в зимний период 1982—83 г.

Выполняя решения XXVI съезда партии, майского (1982 г.) Пленума ЦК КПСС, животноводы колхоза имени Лепешинского и совхоза "Богдановичи" разработали и осуществляют меры по успешному проведению зимнестойлового периода содержания скота, обеспечению высокой продуктивности, широко развернули социалистическое соревнование за увеличение производства и продажи государству молока и мяса в зимний период 1982—83 г.

Животноводы совхоза "Богдановичи" обязались за период нынешней зимовки в сравнении с прошлой повысить продуктивность коров на 95 килограммов, увеличить валовое производство молока на 12% и довести до 870 тонн.

Труженики колхоза имени Лепешинского обязались получить за зимовку 171 тонну валовых привесов скота, или на 10% больше, чем в стойловый период 1981—82 года, реализовать мяса на 100 га сельхозугодий по 38 центнеров, продать его государству 150 тонн, увеличить среднесуточные привесы крупного рогатого скота на откорме на 140 граммов и довести их до 650 граммов.

В целях достижения намеченных рубежей по производству и продаже государству продукции животноводства в хозяйствах создана хорошая кормовая база, организовано эффективное использование кормов, своевременно подготовлены к работе в зимних условиях животноводческие помещения, кормоцехи, машины и оборудование ферм. Главное внимание животноводов сосредоточено на рациональном использовании заготовленных кормов. На каждой ферме созданы звенья по доставке и приготовлению кормов. Разработаны условия социалистического соревнования, утверждены временные партийные формирования, депутатские посты, посты народного контроля. До каждого животновода доведены задания. Штабом

информации будут ежедневно подводиться итоги трудового соперничества и широко освещаться в оперативной наглядной агитации.

Бюро райкома КП Беларуси постановляет:

1. Одобрить работу партийных организаций, правления колхоза имени Лепешинского и дирекции совхоза "Богдановичи" по успешному проведению зимовки скота, увеличению производства и продажи государству продукции животноводства в зимний период 1982–83 года.

2. Сосредоточить главное внимание руководителей, специалистов, всех животноводов колхозов и совхозов на повышении эффективности отрасли животноводства, рациональном использовании кормов на каждой ферме. Создать звенья по подвозу и приготовлению кормов, организовать их четкую работу...

Повысить уровень организации и действенности социалистического соревнования...

Обеспечить выполнение каждым хозяйством планов и социалистических обязательств по производству и продаже государству животноводческой продукции.

Секретарь Кормянского райкома КП Беларуси *М.Игнатенко*

Пастанова XIII пленума Кармянскага райкома КП Беларусі

ад 18 сакавіка 1983 г.

Задачи партийных организаций районов по повышению роли трудовых коллективов в борьбе за эффективность и качество работы, дальнейшее укрепление трудовой и производственной дисциплины

Заслушав и обсудив доклад первого секретаря райкома партии тов. Игнатенко М. В., пленум райкома КПБ отмечает, что, выполняя решения XXVI съезда партии, последующих Пленумов ЦК КПСС, РК КПБ, первичные партийные организации усилили свое внимание к решению вопросов по повышению эффективности и качества работы, укреплению партийной, трудовой и производственной дисциплины. Повысился уровень руководства хозяйственным и культурным строительством. Совершенствуется внутрипартийная работа и работа с людьми. В районе приняты конкретные меры по усилению роли трудовых коллективов в борьбе за эффективность и качество работы, укреплению организованности, деловитости и дисциплины.

Промышленные предприятия, строительные организации успешно выполнили план двух лет пятилетки по основным технико-экономическим показателям. Обеспечен прирост объема производства и рост производительности труда. В 1982 году увеличен выпуск промышленной продукции со знаком качества на 47% против планового задания.

Возросли объемы строительно-монтажных работ. Дальнейшее развитие получили торговое и бытовое обслуживание, связь, транспорт и здравоохранение. Повысилась эффективность сельскохозяйственного производства. Среднегодовое производство валовой продукции в одиннадцатой пятилетке по сравнению с десятой возросло на 8,6%. Продажа зерна государству увеличилась в 1,9 раза, картофеля — на 20,4%, молока — на 5,7%.

Вместе с тем пленум райкома КПБ отмечает, что отделы райкома партии, многие первичные парторганизации слабо заботятся о повышении результативности и качестве организаторской и массово-политической работы в трудовых коллективах. Не всегда уделяют должное внимание созданию необходимых условий для плодотворного труда и активного отдыха рабочим, колхозникам и служащим. Медленно внедряются в производство прогрессивные технологии, передовые формы организации и оплаты труда.

В партийных организациях колхозов "Родина", "Коммунист", совхозов им. Володарского, им. Чапаева, "Райсельхозхимии", райпо ДЭУ-205 принижена роль трудовых коллективов в борьбе за укрепление трудовой и производственной дисциплины... В борьбе с этими негативными явлениями медленно повышается роль профсоюзных и комсомольских организаций, советов бригад, товарищеских судов, групп и постов народного контроля, недостаточно используются предусмотренные законом административные меры.

Отдельные парторганизации не добились, чтобы коммунисты занимали авангардную роль на производстве. В 1982 году многие производственные подразделения не обеспечили выполнение принятых обязательств. Коллектив комбината бытового обслуживания годовой план по реализации бытовых услуг населению выполнил только на 97,6%. Колхозами и совхозами не обеспечено выполнение плана двух лет пятилетки по продаже государству картофеля, льноволокна, мяса.

Пленум райкома КП Беларуси постановляет:

1. Бюро райкома КПБ, первичным партийным организациям направить усилия трудовых коллективов на успешную реализацию решений XXVI съезда КПСС, майского и ноябрьского (1982 г.) Пленумов ЦК КПСС, на дальнейшее повышение их роли в борьбе за эффективность и качество работы, укрепление трудовой и производственной дисциплины, воспитание коммунистического отношения к труду, мобилизации всех тружеников района на успешное выполнение государственных планов и социалистических обязательств 1983 года и пятилетки в целом.

2. Отделам райкома партии, первичным организациям, Совету районного агропромышленного объединения и исполкомам сельских Советов народных депутатов, руководителям колхозов и совхозов принять конкретные меры по обеспечению эффективного и рационального использования земли, капиталовложений, внутренних резервов, направить их на дальнейшее повышение урожайности всех сельскохозяйственных культур, укрепление кормовой базы, повышение продуктивности общественного животноводства. Разработать и осуществить дополнительные меры по быстрейшей ликвидации отставания нерентабельных и низкорентабельных хозяйств. Неотложной задачей считать организованное завершение зимовки скота, всего комплекса работ, связанных с проведением весеннего сева в оптимальные сроки при высоком качестве.

3. Отделам райкома КПБ, партийным, профсоюзным и комсомольским организациям в своей повседневной работе руководствоваться предложениями и выводами, содержащимися в речах и выступлениях Генерального секретаря ЦК КПСС тов. Андропова Ю. В., настойчиво совершенствовать организацию, содержание, формы и методы идеологической и политико-воспитательной работы в современных условиях.

4. Первичным партийным организациям систематически анализировать состояние идейно-воспитательной работы в трудовых коллективах. Повысить спрос и ответственность руководителей идеологических организаций за порученное дело. Уделять больше внимания соблюдению единства идейно-политического, трудового и нравственного воспитания...

5. Партийным, профсоюзным и комсомольским организациям, хозяйственным руководителям, исполкомам Советов народных депутатов всемерно улучшать воспитание рабочих и колхозников, инженерно-технических работников и служащих в духе строжайшего соблюдения государственной и трудовой дисциплины, порядка и организованности...

6. Обязать партийные, профсоюзные и комсомольские организации повысить воспитательную роль трудовых коллективов в формировании у каждого человека коммунистического отношения к труду, рационального использования материальных ресурсов.

Совершенствовать работу по повышению роли собраний, производственных совещаний, дней цехов, бригад, участков, механизаторов, животноводов, общественных отделов кадров, товарищеских судов, добровольных народных дружин в коммунистическом воспитании трудящихся.

7. Партийным организациям последовательно сочетать политическое просвещение и обучение тружеников с их активным вовлечением в общественно полезный, производительный труд.

Организовать глубокое изучение слушателями системы партийной и комсомольской учебы, экономического образования, решений партии и правительства по улучшению хозяйственного механизма и усилению его воздействия на эффективность и качество производства. Совершенствовать практику изучения, обобщения и распространения опыта передовиков и новаторов производства, трудовых коллективов.

8. Отделам РК КПБ, партийным организациям сосредоточить усилия всех общественных организаций на обеспечении комплексного подхода к решению воспитательных задач по созданию в трудовых коллективах атмосферы взаимовыручки, доброжелательности, сочетающихся с принципиальностью и нетерпимостью к антиобщественным явлениям...

9. Первичным парторганизациям, исполкомам Советов народных депутатов больше внимания уделять организации и содержательному использованию свободного времени рабочими, колхозниками, молодежью.

В воспитательной работе шире использовать возможности культутпросветучреждений. В клубах, библиотеках чаще организовывать литературные вечера, диспуты, устные журналы, встречи с ветеранами войны и труда, передовиками производства, активизировать работу художественной самодеятельности.

10. Партийным, профсоюзным и комсомольским организациям, советским и хозяйственным органам совершенствовать коммунистическое воспитание молодежи...

Шире использовать такие формы приобщения юношей и девушек к жизни коллективов, их традициям, как торжественные посвящения в рабочие, наставничество. Расширять сеть спортивных сооружений, активнее привлекать молодежь к занятиям физкультурой и спортом.

11. Редакции районной газеты "Заря над Сожем", районному радиовещанию широко освещать вопросы повышения роли трудовых коллективов в борьбе за эффективность и качество работы, воспитание коммунистического отношения к труду, передовой опыт укрепления трудовой и производственной дисциплины, пропагандировать социалистический образ жиз-

ни, показывать гражданственность и патриотизм советского человека, его труд на благо Родины, подвергать критике лиц, совершающих антиобщественные поступки.

Секретарь Кормянского райкома КП Белоруссии *М.Игнатенко*

Выпіска з рашэння выканаўчага камітэта Кармянскага раённага Савета народных дэпутатаў

ад 19 сакавіка 1986 г.
г.п. Карма

О работе отдела культуры по организации досуга населения, внедрению в быт новых гражданских обрядов и праздников

Заслушав и обсудив отчет заведующего отделом культуры т. Борисовца А. М., исполком районного Совета народных депутатов отмечает, что отдел культуры, руководствуясь постановлением ЦК КПСС "О мерах по улучшению использования клубных учреждений и спортивных сооружений", проводит определенную работу по организации досуга населения, внедрению в быт новых гражданских обрядов и праздников. Несколько укрепилась материальная база клубов и библиотек.

За одиннадцатую пятилетку капитально отремонтировано 10 учреждений культуры, в 5 произведен текущий ремонт. На ремонт и оснащение очагов культуры использовано 367 тыс. рублей. С целью укрепления культпросветучреждений кадрами в районе разработана и утверждена целевая программа "Кадры" до 1990 года. Улучшилось содержание массово-политической и культурно-просветительной работы. В районном Доме культуры работает литературно-музыкальная гостиная, клуб молодой семьи. Хорошо поставлена работа по организации досуга населения и внедрению в быт гражданских обрядов и праздников в Каменском, Барсуковском сельских Домах культуры, Хизовском и Лужковском клубах, Литвиновичской и Каменской библиотеках.

Вместе с тем исполком районного Совета народных депутатов отмечает, что в работе отдела культуры имеются существенные недостатки и упущения. Не принимаются эффективные меры по развитию и укреплению материальной базы учреждений культуры, укреплению их квалифицированными кадрами.

8 учреждений культуры нуждаются в капитальном ремонте, низок уровень идейно-художественного оформления многих очагов культуры. В ряде клубных учреждений ощущается недостаток мебели, оборудования, сценических костюмов. Из числа работников клубов и библиотек только 48, или 52%, являются специалистами, в т.ч. среди клубных работников — 45%.

Отдел культуры глубоко не вникает в содержание работы учреждений культуры, слабо привлекает к совершенствованию форм и методов их работы депутатский актив. В Борово-Будском, Зятковичском, Хлевнянском клубах, Кляпинской, Березовской, Дубовицкой библиотеках массовые мероприятия проводятся не регулярно. Не в полную силу работает культурно-спортивный комплекс... Не выработана четкая система организации культурного обслуживания жителей малонаселенных пунктов, не имеющих культпросветучреждений. Недостаточно используются возможности учреждений культуры для правового и нравственного воспитания трудящихся. В борьбе с пьянством и алкоголизмом недостаточно используются такие формы работы, как безалкогольные свадьбы, торжественные регистрации новорожденных, проводы в ряды Советской Армии, смотры коллективов художественной самодеятельности по жанрам, праздники улиц, деревень и т.д.

Исполком районного Совета народных депутатов решил:

1. Обратить внимание заведующего отделом культуры т. Борисовца А. М. на недостаточную работу учреждений культуры по организации досуга населения, внедрению в быт новых гражданских обрядов и праздников, их слабую материальную базу.

2. Контроль за выполнением данного решения возложить на заместителя председателя райисполкома т. Матвеенко В. Е.

3. Отделу культуры (т. Борисовец А. М.) проинформировать о выполнении настоящего решения к 1.1.87 г.

Председатель исполкома *Е.Т.Барабанов*
Секретарь исполкома *П.Д.Аношко*

Добры дзень, роднае поле!

...Трактар спыніўся. Механізатары выйшлі з кабіны, паглядзелі ўдалячынь. На тварах радасць. Перад іх вачыма шырокім палатном раскінулася калгаснае поле. Толькі ўзаратае, яно абдавала гэтых людзей асаблівай свежасцю і араматам.

Паразмаўляўшы аб калгасных справах, трактарысты прыселі на баразну, закурылі. Сонца хілілася да гарызонту. Дзесьці высока ў небе заліваўся вясёлым спевам жаваранак. Паветра напаўнялася вячэрняй прахалодай.

Людзі двух пакаленняў. Розныя ў іх жыццёвыя біяграфіі. Павел Цімафеевіч Ларчанка стаў першым трактарыстам у калгасе. Як кажуць, сам быў настаўнікам і вучнем. Але сталёвы конь працаваў амаль без прастояў. Вучыў і другіх майстэрству. Прыбягаў на поле і самы старэйшы сын — Васіль. Колькі радасці было ў хлопца, калі браў у рукі рычагі кіравання... Іншы раз яны суткамі былі на полі.

Аднойчы маці напала на абодвух:

— Сам пыл глытаеш без адпачынку і хлопцу не даеш спакою. Паспее яшчэ гэтага паспытаць.

Павел Цімафеевіч настойваў на сваім.

— Не, маці, згоды ў нас не будзе. Беларучкамі дзяцей сваіх выхоўваць не буду. Я хлебароб. Ім будзе і сын.

Планам Паўла Цімафеевіча Ларчанкі перашкодзіла вайна. Трактарыст стаў танкістам. На баявой машыне граміў ворага на розных участках фронту. Нянавісць да фашыстаў, жаданне вызваліць сваю родную зямлю і вярнуцца зноў да мірнай працы ўзбройвалі яго новай сілай і мужнасцю. Некалькі разоў прыйшлося пакідаць палаючы танк. Раненні, апёкі. Але зноў і зноў станавіўся ў строй. Перамогу сустрэў у Берліне. Праз год вярнуўся ў родныя мясціны. Тут ужо ішло аднаўленне гаспадаркі. Радасна сустрэлі яго вяскоўцы. Адразу зайшоў старшыня праўлення калгаса Кузьма Кандрацьевіч Нікіцін.

— Ну што, Павел Цімафеевіч, пачнём усё занава, — прамовіў ён. — Адпачні крыху — і за справу.

— Адпачынку не будзе, Кузьма Кандрацьевіч, — адказаў франтавік. — Не той зараз час...

— Тата, і я з табой, — умяшаўся ў размову Васіль. — Столькі цябе чакаў!

— Больш, Васіль, табе не прыйдзецца чакаць. Ворагі не ступяць на нашу зямлю, хлеб будзем расціць спакойна, — прамовіў бацька. — Заўтра пойдзем у поле, сынок.

Прайшло шмат часу. Павел Цімафеевіч з сынам па-ранейшаму працуюць разам. Ужо некалькі год займаюць першае месца сярод механізатараў калгаса “Камуніст”.

...Пачынаецца новы працоўны дзень. Павел Цімафеевіч з сынам крочаць у напрамку трактарнай базы. Адтуль ужо даносіцца ракатанне матораў. Іх рэха зліваецца са звычайнымі словамі бацькі і сына: “Добры дзень, людзі і поле!”

В. Міхайлаў

Працавітая сям’я

У сельскім клубе ўрачыста. Вядучая вечара хвалявалася. Яшчэ б! Столькі вачэй, столькі позіркаў на яе скіравана. Яна нясмела ўзяла ліст паперы і пачала гучна чытаць:

— Паважаныя працаўнікі калгаса імя Дзімітрава, шаноўныя члены праўлення і клубныя работнікі! У сваім пісьме вы прасілі расказаць аб тым, як служыць ваш зямляк Уладзімір Міхайлавіч Жлоба. Служыць добра, добра служыць! Усім вам, дарагія Валодзевы аднавяскоўцы, вялікае дзякуй за гэтага хлопца, салдата. Я, як камандзір вайсковай часці, асабліва хачу выказаць вялікую падзяку бацькам — Міхаілу Іванавічу і Вользе Дзмітрыеўне Жлобам.

Сляза ў маці скацілася, пабегла па шчацэ, а ў бацькі ўсмешка расплылася, засвяцілася вясёлкай.

Шасцёра дзяцей, шасцёра немаўлятак. Начэй недаспаных колькі! Выраслі, паднялі на ногі кожненькага, не на вузкую сцежку жыццёвую, а на дарогу шырокую, светлую мацярынскай і бацькоўскай спагадаю вывелі.

— Думаеце, што адзін толькі Валодзька, пра якога камандзір добра напісаў, такі? Усе дзеці, дзякуй Богу, добрыя ў нас удаліся, — гаворыць Міхаіл Іванавіч. — У нас ужо сямёра ўнукаў. Ці наведваюць? А як жа! Трэба бульбу пасадзіць — усёй грамадой збіраюцца. Ды не толькі прыязджаюць дапамагчы. Вось быў у мяне юбілей. Столькі падарункаў навезлі, столькі добрых слоў сказалі! Хіба гэта не радасць?! Мы з маці таксама іх праводзім у дарогу не з пустымі рукамі. Дзякуй Богу, у нас усё ёсць. Кароўку трымаем, парсючкі ёсць, птушка розная. Словам, дапамагаем.

...Старшыня праўлення калгаса Яўген Мікалаевіч Вараб'ёў можа шмат расказаць і пра Міхаіла Іванавіча, і пра яго жонку.

— У жывёлагадоўлі Міхаіл Іванавіч працуе з 1960 г. І ўвесь гэты час — пастухом, — зазначае кіраўнік гаспадаркі. — Пасвіў кароў, цялят, а калі абзавялася гаспадарка авечкамі, стаў чабаном. І жонка яму ва ўсім дапамагала. Магчыма, і па сённяшні дзень пасвіў бы калгасны статак Жлоба. Але здарылася так, што свінар Васіль Вайцянкоў быў прызначаны малаказборшчыкам. Задумаліся тады праўленцы, кім жа яго замяніць. На Жлобе спыніліся. Спыніліся — і не памыліліся. Яму не трэба напамінаць аб тым, калі неабходна перавозіць свіней у летнія лагеры. Пра зялёнку дбае. Яшчэ досвіткам у летнія дні ён шыбуе на канюшыннае поле, каб накасіць травы для жывёлы. А надыходзіць восень, паяўляецца яшчэ больш клопатаў. Трэба ж як след падрыхтаваць жывёлагадоўчыя памяшканні для работы ў зімовых умовах. Усё робіць сваімі рукамі, не спадзяецца, што хтосьці прыйдзе яму на дапамогу.

У Жлобаў шмат ганаровых грамат, падзяк. Штогод ім уручаюць прэміі. І яшчэ адна радасная падзея адбылася ў Міхаіла Іванавіча: на агульным сходзе яму прысвоена ганаровае званне "Заслужаны калгаснік". А гэта званне многае значыць. Тут дабаўка і да пенсіі, і бясплатнае выдзяленне раз у год аўтатранспарту для перавозкі паліва. Словам, чалавек у пашане.

С. Лопуць

Тваё сыны, Кармяншчына

Нарадзіўся М. Я. Ананенка, будучы важак бальшавікоў Кармяншчыны, у 1905 г., калі палыхала першая руская рэвалюцыя, у беднай, шматдзетнай сялянскай сям'і (разам з ім раслі 5 братоў і 2 сястры). З ранніх гадоў спазнаў хлопец усю горыч паднявольнай сялянскай працы. Даводзілася яму і пастушком грамадскага статка пабыць, і ў кулакоў спаўна пабатрачыць.

У свой час у лісце да мяне яго сучаснік і сябар (ён тады працаваў сакратаром райвыканкома), ды і сусед А. В. Кузьмянкоў (да вайны сем'і Ананенкаў і Кузьмянковых жылі ў адным доме) паведамляў:

— Характар у Макара Якаўлевіча быў няпросты, ён ніколі не ішоў на прымірэнне, калі быў упэўнены ў сваёй праваце. Душэўныя якасці гэтага чалавека заўсёды гарнулі да яго моладзь. Да яго ішлі за дапамогай і парадай. І калі ў 1929 г. пры сельскім Савеце ў в. Куракаўшчына была створана камсамольская ячэйка, сакратаром яе аднагалосна быў выбраны сапраўдны лідэр вясковай моладзі 24-гадовы Макар Ананенка.

Камсамольскі важак стаў галоўным запявалам арганізацыі па стварэнні ў кожнай вёсцы чырвоных куткоў, хат-чытальняў, забяспечваў іх абсталяваннем, плакатамі, літаратурай. Ён умела падбіраў з ліку маладзёжнага актыву агітатараў, чытальнікаў газет, кіраўнікоў гурткоў мастацкай самадзейнасці...

Ён першым у раёне справіў "чырвонае" камсамольскае вяселле без царквы, папоў і без ... гарэлкі. У той час гэта быў рызыкоўны крок, таму што кулацка-папоўскія падпявалы разгарнулі вакол гэтага вяселля раскілзаную прапаганду, усяляк ахайвалі сам працэс, нават пагражалі расправай. Але як бы там ні было, Макар Якаўлевіч атрымаў вялікую маральную і палітычную перамогу. Дарэчы, ні раней, ні пасля сам ён ніколі не ўжываў спіртных напояў і вельмі непрымірыма ставіўся, калі гэта дазвалялі сабе падначаленыя і саслужыўцы.

У далейшым Макар Якаўлевіч працаваў на адказных кіруючых гаспадарчых пасадах у раёне. Быў старшынёй камітэта

беднаты, кіраваў крэдытным таварыствам, узначальваў раённы спажывецкі саюз, працаваў упраўляючым раённай канторы па зерненарыхтоўках і ўпаўнаважаным камітэта нарыхтовак СССР па Кармянскаму раёну. А з пасады дырэктара Кармянскай машынна-трактарнай станцыі быў абраны, як ужо гаварылася, у 1939 г. першым сакратаром РК КП(б)Б.

Гэта быў кумір камуністаў, аўтарытэт яго быў найвялікшым і непахісным. Прыцягвалі сціпласць і даступнасць важака партыйцаў — дзверы яго кабінета былі адчынены для ўсіх і заўсёды.

Перспектыўнага кіраўніка заўважылі, і ў пачатку 1941 г. ён быў накіраваны ў Маскву, на курсы чырвонай прафесуры. Тут яго і застала вайна з Германіяй. Макар Якаўлевіч ідзе на фронт, становіцца палітработнікам.

“Калі пачалася фашысцкая агрэсія, мы яшчэ атрымалі пісьмо з фотаздымкам, — прыгадвае сын, жыхар в. Куракаўшчына В.М. Ананенка. — Там ён быў у званні капітана. Потым — два гады няведання. І толькі калі вызвалілі Карму восенню 1943-га, бацька прыслаў пісьмо і дзве фатаграфіі. З яго мы даведаліся, што маёр Ананенка ваяваў у якасці намесніка камандзіра танкавага палка. Разам са сваім злучэннем вызваляў Днепрапятроўск, Харкаў, Кіравагард...”

Васіль Макаравіч на гэтым слове сцішвае расказ, задумваецца. Яго можна зразумець: там, пры вызваленні Кіраваграда, 8 студзеня 1944 г., абарвалася жыццё палымянага камуніста і патрыёта сваёй Радзімы, адважнага афіцэра і выдатнага чалавека Макара Ананенкі.

Але сям'я, што заставалася ў Карме, даведалася аб гэтым горы і вялікай страце толькі ўлетку 1944-га, калі прыйшла жахлівая пахаванка, у якой значылася няпэўнае “прапаў без вестак...”.

А праз лічаныя месяцы надышла чарга ісці на фронт і сыну Васілю. Яго прызвалі пад Оршу ў снежні 1944-га. Адтуль пасля “вучэбкі” трапіў у пяхоту, а потым у пантанёрную часць. Перамогу сустрэў у якасці шафёра-пантанёра, але служыць давялося амаль 7 гадоў: толькі ў ліпені 1951-га вярнуўся дамоў.

Сваёй грамадзянскай цывільнай біяграфіяй Васіль Макаравіч можа ганарыцца: ён дастойна працягнуў справу бацькі. У яго толькі адзін запіс у графе “месца працы” — “Райаграпрамтэхніка” і незлічоная кольказсць — у раздзеле “Заахвочванні”. Яму ўручаны знак “Выдатнік Дзяржкамсельгастэхнікі СССР”, прысвоена званне “Выдатнік сельскай гаспадаркі Беларусі”, узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, цэлым шэрагам медалёў. А розных значкоў, падзяк, ганаровых грамат — проста не злічыць.

Многія з гэтых рэгалій — за выдатную працу на працягу 45 (!) сезонаў на хлебнай ніве, бо кожны год, як толькі надыходзіла жніўная пара, Васіль Макаравіч садзіўся на камбайн і вёў барацьбу за хлеб так, як змагаўся і загінуў на полі бою смерцю героя легендарны сын Кармяншчыны М. Я. Ананенка.

Р.Ганжураў

За газетным радком...*

Па старонках раённай газеты “Авангард” за 1946—1954 гг.

1946 г., 23 чэрвеня

Жанчыны косяць

Калі абвясцілі, што пачынаецца касавіца лугоў, сабраліся 5 калгасніц з калгаса імені Чапаева Куракаўскага сельсавета і пачалі гутарыць, як лепш да яе падрыхтавацца.

* Мова арыгінала захоўваецца.

Перш за ўсё яны прывялі ў парадак косы, малаткі, бабкі, падрыхтавалі граблі, а як пачаўся сенакос, першымі пайшлі на луг. Кожны дзень можна бачыць гэту жаночую брыгаду ў складзе: Лешчанка Ольгі, Лешчанка Ганны, Кручковай Ніны, Бісюковай Д., Бабковай Н. Праз некаторы час да іх далучылася і настаўніца Малаткова Ольга. Такім чынам, у сучасны момант брыгада складаецца з 6 чалавек.

Роўнымі радамі лажыцца трава, падрэзаная іх косамі. З кожным днём павялічваецца плошча скошанай нівы. Брыгада хоць і жаночая, але нормы выпрацоўкі перавыконваюцца. Замест 0,25 га яны скашваюць па 0,35 га кожная.

У час перапынку настаўніца Малаткова чытае сваім супрацоўніцам газету, праводзіць з імі гутаркі.

А пасля гутаркі калгасніцы, падбадзёраныя добрымі газетнымі весткамі, з яшчэ большай энергіяй прадаўжаюць касавіцу.

Е. Бандарэнка

1946 г., 14 ліпеня

Камуніст на чале калгаса

Камуніст Кузьма Нікіцін з 1941 года граміў варожыя полчышчы на розных напрамках, у баях за радзіму быў некалькі раз ранен і ў канцы 1945 года прыйшоў у сваю родную вёску Дубавіца.

Калгаснікі сельгасарцелі "Чырвоны добраволец" з радасцю сустрэлі свайго земляка. Не даўшы яму адпачнуць і тыдня, на агульным сходзе калгаснікі заявілі:

— Сам бачыш, Кузьма, дрэнныя справы ў калгасе. Давяраем табе кіраваць нашай гаспадаркай...

І былы франтавік Кузьма Нікіцін стаў на чале калгаснай гаспадаркі. Справы ў калгасе ён прыняў у заняпадзе... Перш за ўсё таварыш Нікіцін мабілізаваў калгаснікаў на нарыхтоўку дастатковай колькасці кармоў для жывёлы. Пасля ўпартых старанняў кармавая база ў калгасе была створана, што дазволіла калгасу зменшыць засыпку збожжа на фураж.

Сваю работу Нікіцін пачаў не адзінокім. Ён у кароткі час змог скалаціць калгасны актыў...

Палявыя работы калгас распачаў дружна і арганізавана. Ён адным з першых у раёне закончыў веснавую сяўбу, засеяўшы 194 гектары замест 170 па плану. На ворыве былі скарыстаны не толькі коні, але і буйная рагатая жывёла.

Адразу ж пасля заканчэння палявых работ старшыня калгаса стварыў спецыяльную брыгаду, якая штодзён працавала на ўздыме папараў. Зараз папары на плошчы ў 120 гектараў падняты поўнасцю і прайшлі належную культывацыю.

Старшыня калгаса — камуніст Нікіцін змог дабіцца ад калгаснікаў глыбокай зацікаўленасці ў развіцці арцельнай гаспадаркі, давёў да іхняй свядомасці, што яны самі з'яўляюцца гаспадарамі свайго шчасця...

Гэта яскрава паказала сенаўборка. За шэсць рабочых дзён калгаснікі скасілі і застагавалі 83 гектары сенажаці. Лепшыя касцы Ісанкоў Аўрам, Сенькоў Павел, Піскуноў Ефім, Нікіцін Еўгеній, Карнаушэнка Цімох, Паўтарычэнка Емельян, Кажура Сідар, Карнаушанка Ніканор штодзённа выкашвалі па 0,60—0,65 гектара. Ды наогул усе калгаснікі, працаваўшыя на сенажаці, перавыконвалі нормы выпрацоўкі, што дало магчымасць да 3 ліпеня поўнасцю закончыць сенаўборку і разлік з дзяржавай.

Зараз калгаснікі, закончыўшы бягучыя сельскагаспадарчыя работы, заклапочаны ў тым, каб па-гаспадарску сустрэць уборку хлябоў. У гэтых мэтах яны рамантуюць уборачны інвентар, амбары, гумно, падрыхтоўваюць ёўні і інш...

Г. Яўгеньеў

1947 г., 23 кастрычніка

Радасныя вынікі самаадданай працы

Усе сельскагаспадарчыя работы ў гэтым годзе праведзены арганізавана, у лепшыя тэрміны. У выніку дружнай працы ўсіх калгаснікаў і калгасніц з кожнага гектара атрымана на 2—2,5 цэнтнера збожжа больш, чым у мінулым годзе. Бульбы атрымана ў сярэднім па 136 цэнтнераў з гектара.

Калгас добрасумленна выканаў сваю першую запаведзь, здаўшы дзяржаве 2,175 пуда хлеба і 2,400 пуда бульбы. Закончыўшы абмалот ураджаю, мы поўнасцю засыпалі насенны і страхавы фонды з разліку асвaення ў 1948 годзе даваеннай пасеўнай плошчы.

На працадні калгаснікам авансам выдан хлеб, бульба, гародніна, сена і салома для жывёлы. За год на працадзень будзе размеркавана па 500 грамаў збожжа, 3 кілаграмы бульбы,

300 грамаў гародніны і інш. На працадні можна было размеркаваць больш хлеба і бульбы. Але калгаснікі на агульным сходзе рашылі прадаць частку бульбы і збожжа і на вырачаныя грошы набыць 10 цёлак для ўкамплектавання малочнатаварнай фермы.

Клапоцячыся аб ураджаі будучага года, мы пасеялі даваенную плошчу азімага жыта — 120 га, з іх 100 га радковым спосабам. Пад зябліва ўзарана 130 га.

Такім чынам, падводзячы коратка вынікі работы ў бягучым годзе, можна цвёрда сказаць, што пералом у справе пасляваеннага аднаўлення калгаса дасягнут, створаны ўсе прадпасылкі для таго, што калгас зараз хуткімі тэмпамі пойдзе ўгару. У 1948 годзе будзе пасеяна яравых культур каля 270 га, супроць 160 га ў гэтым годзе.

Гаворачы аб дасягненнях калгаса ў гэтым годзе, нельга не сказаць аб нашых лепшых людзях. Усеагульнай павагай карыстаюцца старыкі: калгаснікі Старавойтаў Павел і Самастроенка Мікалай. На палявых работах Старавойтаў выпрацаваў 357 працадзён, Самастроенка — 385 працадзён. Самааддана працуюць калгаснікі Зарубанаў Васіль, інвалід другой групы Кажамякін Жорж, Матвеенка Пётр, калгасніцы Чумакова Глаша, Чумакова Поля.

Вялікую дапамогу ў правядзенні важнейшых сельскагаспадарчых работ калгасу аказала Кармянская МТС, якая добрасумленна выканала свае дагаворныя абавязацельствы.

Ф. Ананенка,
старшыня калгаса "Чырвоны Акцябр" Куракаўскага сельсавета

1949 г., 3 сакавіка

Народная настаўніца

Варвара Іванаўна Цыбікава нарадзілася ў 1900 годзе ў беднай сялянскай сям'і. Каб зарабіць на кавалак хлеба, яна вымушана была яшчэ зусім маленькай дзяўчынкай пайсці працаваць нянькай да кавaля Шапавала, які жыў у вёсцы Навасёлкі. Ад цямна да цямна працавала яна два гады за кавалак хлеба. Не лепшым было яе жыццё і ў пана Цітовіча, а затым у пані Случаноўскай.

Беднасць, беспраўе не дае магчымасці Варвары Іванаўне ажыццявіць сваю мару аб вучобе. Яшчэ з дзіцячых год яна марыла вывучыцца настаўніцай, а затым вучыць дзяцей беднякоў, такіх, якой была сама.

Толькі Вялікая Кастрычніцкая рэвалюцыя адкрыла дзверы навучальных устаноў для дзяцей працоўных. Ажыццявілася заветная мара Варвары Іванаўны. У 1925 годзе закончыла яна педагагічны тэхнікум, і вось ужо на працягу 23 год безперарыўна працуе настаўніцай. Былыя вучні Варвары Іванаўны ўжо самі працуюць настаўнікамі, медыцынскімі работнікамі і інш. Вось, напрыклад, Усевіч Зінаіда Грыгораўна працуе настаўніцай Кармянскай сярэдняй школы, Бандарэнка Ліда — акушэркай Кармянскай бальніцы, Драздоў Генадзій і Ісачанка Мікалай — афіцэры Савецкай Арміі.

Савецкі Урад высока ацаніў заслугі Варвары Іванаўны Цыбікавай у справе навучання і выхавання дзяцей. У сувязі з трыццацігоддзем Беларускай ССР Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР узнагародзіў Цыбікаву Варвару Іванаўну — настаўніцу Зенькаўскай пачатковай школы ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцягу.

В. Ландышаў

1949 г., 1 снежня

Былое і сучаснае вёскі Струмень

У кастрычніцкія дні 1943 года Савецкая Армія выгнала нямецкіх захопнікаў з вёскі Струмень. Адступаючы пад ударамі Савецкай Арміі, нямецкія варвары поўнасцю знішчылі ўсе грамадскія пабудовы калгаса і вёскі. Знішчана звыш 40 дамоў калгаснікаў.

З першых жа дзён вызвалення савецкія людзі прыступілі да адраджэння родных гарадоў. За кароткі час у вёсцы Струмень былі адноўлены калгас, адбудаваны грамадскія пабудовы, дамы калгаснікаў.

Калгас імя Варашылава асвоіў поўнасцю даваенную пасеўную плошчу ў 320 гектараў, пабудован амбар, канюшня, кароўнік, цялятнік, кузня. Калгас мае 18 коней і 57 галоў буйной рагатай жывёлы. Кожны калгасны двор мае ў асабістым карыстанні кароў, свіней, авец і птушку.

Выраслі людзі калгаснай гаспадаркі. За гады Савецкай улады з вёскі Струмень выйшлі настаўнікі, урачы, спецыялісты сельскай гаспадаркі, афіцэры Савецкай Арміі і іншыя.

Вёска Струмень жыве паўнакроўным жыццём. Тут, каля сельскага Савета, ёсць ізба-чытальня, адноўлена і працуе сямігадовая школа, бальніца, аптэка, хлебапякарня, сельскі магазін, лясніцтва, паштовае аддзяленне. З раённым цэнтрам маецца тэлефонная сувязь. Амаль кожны калгасны двор выпісвае газеты.

Як і ўвесь беларускі народ, струменьцы дзейсна рыхтуюцца да 30-годдзя БССР. У ізбычытальні і калгасах праводзяцца гутаркі і даклады. Дзень беларускага народа калгасы сустрэлі датэрміновым выкананнем плана лесанарыхтовак і лесавывазак.

В. Ушаў

1954 г., 4 лютага

За круты ўздым усіх галін калгаснай вытворчасці (Са справаздачна-выбарчага сходу калгаса імя Кагановіча)

У мінулым годзе сельгасарцель імя Кагановіча атрымала зусім нізкі ўраджай усіх сельскагаспадарчых культур... З кожнага гектара яравой пшаніцы сабрана ўсяго па 3,6 цэнтнера зерня, ячменю і жыта — яшчэ менш. У чым прычына такой нізкай ураджайнасці?

З года ў год у глебу не ўносіцца неабходнай колькасці ўгнаення. У 1953 годзе пад збожжавыя і бульбу трэба было вывезці 5.550 тон гною і 3 тысячы тон торфу. Вывезлі ж толькі 1.950 тон гною і 1.273 тоны торфу. Сяўба была праведзена са спазненнем некандыцыйным насеннем. Сеялі ў большасці ўручную, не прымянялі перадавыя метады: перакрыжаванай сяўбы збожжавых і квадратна-гнездавой пасадкі бульбы. Севазварот уведзен фармальна. У яго палях не сеюць траў, лубіну...

Вельмі нізкая працоўная дысцыпліна. Многія калгаснікі не дастойны карыстацца высокім і ганаровым званнем калгасніка... Праўленне калгаса прымірылася з туняядцамі, не прымае да іх законных мер уздзеяння.

Амаль адсутнічае падрыхтоўка да веснавой сяўбы бягучага года. План вывазкі гною і торфу яўна сарван. Торфу вывезена 186 тон, а гною — 50. Не закончана засыпка і ачыстка насення.

На фінансавай дзейнасці сельгасарцелі адмоўна адбіваецца дэбіторская запазычанасць. А дэбітораў — каля 10 калгасаў і арганізацый...

Не выканан план развіцця жывёлагадоўлі. Вельмі нізкая яе прадукцыйнасць. Так, ад кожнай каровы надоена 533 літры малака, ад 46 кароў атрыман прыплод 30 цялят, захавана 26, ад адной свінаматкі атрыман "прыплод" 4 парасёнкі, кура-нясушка знесла 28 яек. Ужо гэтай зімой пала 4 галавы буйной рагатай жывёлы, 4 свінні, 3 авечкі.

Калгас абслугоўвае Кармянская МТС. Ці ведаюць аб становішчы спраў кіраўнікі МТС? Безумоўна, ведаюць! Але імі нічога не зроблена для паляпшэння спраў у арцелі. Дырэкцыя МТС, яе спецыялісты не перабудавалі сваёй работы ў адпаведнасці з запатрабаваннямі Пленума ЦК КПСС, не разабраліся ў прычынах адставання калгаса, не дапамаглі ліквідаваць іх.

Аб усім гэтым крытычна і самакрытычна гаварыў у справаздачным дакладзе старшыня калгаса тав. Семілетаў. Пасля такой вострай крытыкі галоўнаму аграному МТС тав. Шахнюку, які прысутнічаў на сходзе, не было аб чым гаварыць. Як і заўсёды да гэтага, прадстаўнік МТС прыняў крытыку і паабяцаў выправіць недахопы.

Дакладчыка дапоўнілі выступаючыя.

Многа чаго гаварыў на сходзе сакратар партарганізацыі тав. Лугоўскі. Аднак ён ні слова не сказаў аб тым, якую дапамогу праўленню аказала партыйная арганізацыя, як была пастаўлена масава-палітычная работа.

Справаздачна-выбарчы сход прайшоў пры высокай крытыцы недахопаў. Калгаснікі выбралі новае праўленне. Брыгадзірамі паляводчых брыгад, загадчыкамі жывёлагадоўчых ферм выбраны камуністы, свядомыя калгаснікі.

Ш. Дзямідаў, Ш. Якаўлеў

Вызначыліся працай

Героі Сацыялістычнай Працы

ДЗМІТРЫЕЎ Міхаіл Апанасавіч (гл. "Яны нарадзіліся на Кармяншчыне").

КАРАТКЕВІЧ Мікалай Аляксандравіч, нарадзіўся 10.9.1929 г. у в. Кароцькі. Герой Сацыялістычнай Працы (1978). Заслужаны механізатар БССР (1978). Працаваў камбайнерам у саўгасе "Кармянскі". Узнагароджаны ордэнамі Леніна (двума), Кастрычніцкай рэвалюцыі, "Знак Пашаны", медалямі. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР з 1980 г.

НІКІЦІН Кузьма Кандратавіч, нарадзіўся 27.11.1897 г. у в. Дубавіца. Герой

Сацыялістычнай Працы (1958). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1934–1939, 1945–1963 старшыня калгаса "Чырвоны добраахвотнік" (з 1963 г. калгас "Камуніст"). Узнагароджаны ордэнам Леніна, медалямі. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1947–1959 гг. Памёр у 1996 г.

ШАНЬКОЎ Іван Цімафеевіч, нарадзіўся ў 1931 г. у в. Каменка. Герой Сацыялістычнай Працы. Скончыў Клайпедскае мараходнае вучылішча. Капітан маразільнага трайлера Мурманскага тралавага флоту.

Узнагароджаныя ордэнам Леніна

ДЗМІТРЫЕЎ Міхаіл Апанасавіч (гл. "Яны нарадзіліся на Кармяншчыне").

ЕФІМЕНКА Агаф'я Адольфаўна, нарадзілася ў 1921 г. у в. Расохі. Працавала даяркай у калгасе "Бальшавік".

КАРАТКЕВІЧ Мікалай .Аляксандравіч (гл. "Героі Сацыялістычнай Працы").

КАРНАВУШКА Канстанцін Архіпавіч, нарадзіўся 6.5.1929 г. у в. Дубавіца. Працаваў трактарыстам у Багданавіцкай МТС, з 1958 г. у калгасе імя Леніна.

ЛАРЧАНКА Ганна Калінаўна, нарадзілася ў 1928 г. у в. Міхалёўка. Працавала даяркай у калгасе "Камуніст". Памерла ў 1992 г.

МАТАРЭНКА Таццяна Фёдараўна, нарадзілася ў 1938 г. у в. Бераставец. Працавала свінаркай у саўгасе "Багданавічы".

НІКІЦІН Кузьма Кандратавіч (гл. "Героі Сацыялістычнай Працы").

ПЛАДУНОЎ Барыс Сямёнавіч (гл. "Заслужаныя настаўнікі").

ШАНЬКОЎ Іван Цімафеевіч (гл. "Героі Сацыялістычнай Працы").

Заслужаныя работнікі Беларусі

Заслужаны заатэхнік

ЦІМАШЭНКА Валянціна Паўлаўна, галоўны заатэхнік саўгаса "Кармянскі". Званне "Заслужаны заатэхнік БССР" прысвоена ў 1979 г.

М.А.Караткевіч

К.К.Нікіцін

Заслужаны механізатар

КАРАТКЕВІЧ Мікалай Аляксандравіч (гл. "Героі Сацыялістычнай Працы").

Заслужаныя настаўнікі

АСЮЛЕВА Ніна Данілаўна, нарадзілася 2.3.1925 г. у в. Новая Зенькавіна. Заслужаная настаўніца БССР (1968). Скончыла Гомельскі педагагічны інстытут (1955). Працавала настаўніцай рускай мовы і літаратуры ў Кармянскай сярэдняй школе № 1.

ГАНЖУРАЎ Рыгор Рыгоравіч, нарадзіўся 4.5.1918 г. у в. Вынашаўка. Заслужаны настаўнік БССР (1967). Скончыў Гомельскі педагагічны інстытут (1953). Працаваў настаўнікам матэматыкі ў Ліцвінавіцкай сярэдняй школе. Памёр у 1996 г.

ДЗМІТРЫЕЎ Міхаіл Апанасавіч (гл. "Яны нарадзіліся на Кармяншчыне").

І.Ц.Шанькоў

В.П.Цімашэнка

Н.Д.Асюлева

КЛІМАЎ Кузьма Кірылавіч, нарадзіўся 22.6.1925 г. у в. Акцяброва. Заслужаны настаўнік БССР (1971). Скончыў Магілёўскі педагагічны інстытут (1955). Працаваў дырэктарам Акцяброўскай сярэдняй школы.

ЛЯЛЬКОВА Марыя Цімафееўна, нарадзілася 30.11.1919 г. у в. Рудня Чачэрскага раёна. Заслужаная настаўніца БССР (1970). Скончыла Гомельскі педагагічны інстытут (1937). Працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў Задубскай сярэдняй школе.

ПЛАДУНОЎ Барыс Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1918 г. у в. Асмаловічы Рагачоўскага раёна. Заслужаны настаўнік БССР (1968). Краязнавец. Скончыў Рагачоўскае педвучылішча (1937), Мічурынскі плодаагародніны інстытут (1952). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў настаўнікам біялогіі ў Хізаўскай сярэдняй школе. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1966). Памёр у 1999 г.

М.Ц.Лялькова



Б.С.Пладуноў

Хізаўскі Мічурын

Вучоба ў Мічурынску з багатай спадчынай І. У. Мічурына ўзбагаціла настаўніка Б. С. Пладунова тэарэтычна і практычна, што знайшло канкрэтнае ўвасабленне на доследных дзялянках прышкольнага ўчастка, які спачатку меў 1 га, а ў далейшым пашырыўся да 5-гектарнай плошчы. Тут былі дзялянкі: пашавы севазварот — 9 палёў; агароднінны — 4; васьміпольны пладовы гадавальнік; чатырохпольны ягаднік: садовыя суніцы, парэчкі, агрэст, маліна. Пладовы сад, доследныя дзялянкі, куток беларускага лесу, калекцыйны ўчастак і ўчастак чарнаплоднай рабіны, бэзавы сад, кветнікі, парніковы ўчастак на 32 рамы. У 1949 г. на базе Хізаўскай школы працавала першая на Кармяншчыне станцыя юных натуралістаў. Барыс Сямёнавіч са сваімі юнымі сябрамі праводзіў розныя навуковыя доследы па аграноміі. Ім укараняліся новыя гатункі збожжавых, агароднінных, пладова-ягадных і кветкавых культур. Да яго ў школу прыходзіла шмат пісьмаў з рознымі просьбамі. Барыс Сямёнавіч нікому не адмаўляў.

А ў пачатку 60-ых гг. тут праходзілі біялагічны практыкум студэнты Гомельскага пeдінстытута.

Школа пры яго асабістым удзеле стала флагманам у арганізацыі доследнай работы і працоўнай практыкі на прышкольных участках не толькі ў раёне, вобласці, а і ў рэспубліцы. Як вынік, у 1961 г. на рэспубліканскім аглядзе школ Кармянскаму раёну, які прадстаўляла там менавіта Хізаўская школа, быў прысуджаны пераходны Чырвоны сцяг, а Барыс Сямёнавіч узнагароджаны значком "Выдатнік народнай асветы". Пазней яму прысвоілі і званне "Заслужаны настаўнік школ БССР". Нястомная праца педагоганаватара ў 1966 г. была адзначана вышэйшай дзяржаўнай узнагародай — ордэнам Леніна.

Друкуецца са скарачэннем: Зара над Сожам, 15 снежня 1999 г.

Р.І.Сянько


З.Ц.Юдзянкоў

В.А.Яўнайс

І.І.Акінчыц

СЯНЬКО Рыгор Іванавіч, нарадзіўся 1.8.1925 г. у в. Новая Зенькавіна. Заслужаны настаўнік БССР (1975). Скончыў Гомельскі педагагічны інстытут (1956). Працаваў дырэктарам Кармянскага вучэбнага вытворчага камбіната.

СЯРГЕЕНКА Пётр Міхайлавіч, нарадзіўся 23.7.1911 г. у в. Старая Зенькавіна. Заслужаны настаўнік БССР (1968). Скончыў Гомельскі педагагічны інстытут (1938). Працаваў дырэктарам Ліцвінавіцкай сярэдняй школы.

ЮДЗЯНКОЎ Захар Цітавіч, нарадзіўся 5.2.1911 г. у в. Клясін Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці. Заслужаны настаўнік БССР (1967). Скончыў Рагачоўскае педвучылішча (1939). Працаваў настаўнікам пачатковых класаў у Буда-Кляпінскай сярэдняй школе. Памёр 6.10.1972 г.

ЯКУШЭНКА Міхаіл Іванавіч, нарадзіўся 21.11.1903 г. у в. Папароткі Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці. Заслужаны настаўнік БССР (1968). Скончыў Магілёўскі педагагічны інстытут (1932). Працаваў настаўнікам гісторыі ў Кармянскай вячэрняй школе. Памёр у 1998 г.

ЯЎНАЙС Аляксандр Андрэевіч, настаўнік Кармянская СШ №1. Званне "Заслужаны настаўнік БССР" прысвоена ў 1945 г.

ЯЎНАЙС Валянціна Аляксандраўна, настаўніца Кармянскай сярэдняй школы № 1. Званне "Заслужаная настаўніца БССР" прысвоена ў 1967 г.

Яны нарадзіліся на Кармяншчыне

АКІНЧЫЦ Іван Іванавіч, нарадзіўся ў 1941 г. у в. Багданавічы. Доктар філасофскіх навук (1988), прафесар, акадэмік Міжнароднай акадэміі навук вышэйшай школы (г. Масква). Скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт. Аўтар больш як 100 навуковых прац і артыкулаў.

АСТАПЕНКА Алесь (Аляксандр Кірылавіч), нарадзіўся 14.7.1920 г. у в. Сырская Буда. Беларускі пісьменнік. Вучыўся ў Мінскім педагагічным інстытуце імя М. Горкага. У час Вялікай Айчыннай вайны — рэдактар і дыктар беларускай рэдакцыі Усесаюзнага радыёкамітэта (Масква), удзельнічаў у баях на Заходнім і Бранскім франтах. Працаваў у рэдакцыях газет "Звязда" і "Чырвоная змена", у часопісе "Бярозка".


Л.М.Давыдзенка

Аўтар зборнікаў вершаў "Выпрабаванне" (1947, 1980), "Дзень маёй Радзімы" (1952), "Выбранае" (1957), "Сэрца спявае" (1960).

Пераклаў на беларускую мову творы рускіх, украінскіх, літоўскіх, латышскіх і нямецкіх паэтаў.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі. Памёр 20.7.1970 г.

ДАВЫДЗЕНКА Леанід Мікалаевіч, нарадзіўся 4.8.1941 г. у в. Залатаміно. Беларускі вучоны ў галіне эканамічнай тэорыі. Доктар эканамічных навук (1990), прафесар (1991). Скончыў Мінскі фінансавы тэхнікум (1959), Беларускі дзяржаўны універсітэт (1972). Працаваў на камсамольскай і партыйнай рабоце, у Мінскай вышэйшай партыйнай школе, Беларускім дзяржаўным універсітэце, галоўным саветнікам групы саветнікаў Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь (1997—2000). Цяпер загадчык кафедры эканамічнай тэорыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта. Аўтар больш як 145 навуковых прац, у тым ліку шэрага падручнікаў для ВНУ па асновах эканамічнай тэорыі.

ДЗЕРУЖЫНСКІ Авяр'ян Сафонавіч, нарадзіўся 10.6.1919 г. у в. Хляўно. Беларускі пісьменнік.

Скончыў Магілёўскі газетны тэхнікум (1937), Камуністычны інстытут журналістыкі ў Мінску (1941). Працаваў загадчыкам аддзела газеты "Чырвоная змена" (1945—1949), рэдактарам выдавецтва "Беларусь" (1949—1971), выдавецтва "Мастацкая літаратура" (1972—1980), выдавецтва "Юнацтва" (1981—1984).

Аўтар зборнікаў вершаў "Песні маладосці" (1959), "Калінавы цвет" (1961), "Бярозавы вецер" (1990), "Веснавей" (1994), зборнікаў вершаў для дзяцей "Цуды ёсць на свеце" (1960), "Дзе жыве зіма" (1962), "Карагод" (1963), "Ляцелі дзве птушкі" (1964), "Добры ветрык" (1968), "Ластаўка" (1971), "Добрае сэрца" (1980), "Залаты каласок" (1989) і інш.

Многія вершы пакладзены на музыку, сярод якіх "Мяцеліца", "Мінскі вальс", "Дзявочая лірычная", "Нездаровіцца", "Сабірайся ў госці, мой дзядок" і інш. Памёр 3.1.2002 г.

Незабыўнае

З аўтабіяграфіі Авяр'яна Дзеружынскага

На беразе блакітнага Сажа, якраз паміж Кармой і Слаўгарадам, сярод абшараў старажытных бароў і пералескаў раскінулася вёска Хляўно. На картах сівой Магілёўшчыны яна называлася больш пэўна — Хлебна. Хто ведае, можа, тут выказана толькі мара народная аб хлебе, а можа, і на самай справе хлебны быў наш кут для яе ўладароў — польскіх паноў. Ведаю толькі, што для сялян нашай вёскі жыццё было надзвычай цяжкім. Таму яны часцей казалі, што не хлебна, а хлеўна ў нас. І гэтае параўнанне жыцця з хлявом прыстала да вёскі і дайшло да нашых дзён.

Кожны чалавек улюбляецца ў свой родны куток. Гэта, калі можна так сказаць, яго маленькая дзяржава. Яшчэ хлапчуком, калі надаралася бываць у гасцях у якім-небудзь другім паселішчы і раніцай выйсці на вуліцу, мне здавалася, што нават і сонца там нейкае бляклае, не такое яркае, як у маёй вёсцы, і салаўі спяваюць горш, і зязюлькі неяк незвычайна хрыпла і картава куваюць.

Быў трывожны і суровы час — 1919 год. Нарадзіла тады мяне маці — па яе расказах — у сянніцы, пасля таго, як падаіла карову. А бабка-парадзіха, якая аказвала дапамогу, гаварыла маці, што гэта добрая прыкмета, — сын твой будзе расці як на дражджах і піць духмянае малако самога жыцця.

Добрым чалавекам была мая павівальная бабка. Толькі дабро зычыла людзям. Ды ў тыя цяжкія гады разрухі і грамадзянскай вайны не маглі спраўдзіцца яе пажаданні.

У нашай сям'і было восем дзяцей. Малака ніколі не хапала. Медыцынскае абслугоўванне толькі-толькі наладжвалася, а таму чацвёра маіх братоў і сясцёр так і не ўбачылі росквіту жыцця. Ад сухотаў памерла маці, і я застаўся сіратой.

Басаногае маленства маё — незабыўнае. Гэта і мая радасць, і мой смутак,

і маё захапленне прыгажосцю роднай прыроды. Яно блукала па сцяжынках-дарожках ранняй вясной, калі на вярбе ружавелі коцікі, а на балоцвінах адскоквала яшчэ зусім маленькая чырванаватая асака. На калыскім дрыгвяным балоце за вёскай любіў я разам са сваімі дружбакамі пакалыхацца-пагушкацца, як кажуць, трохі падурэць. А на горцы, дзе стаяла нашая хатка і дзе снег раставаў раней, калі прыгравала першае вясновае сонейка, сабіраліся хлопцы і дзяўчаты амаль са ўсёй вёскі і спявалі працяглыя, задушэўныя песні-вяснянкі. Гэтыя песні навекі запалі ў маё сэрца. У іх было столькі цеплыні, паэтычнай шчырасці, бадзёрасці і прагі жыцця, што яны няўмольна зачароўвалі. Я, падшыванец, заўсёды быў у гурце дзяўчат ці хлопцаў і спяваў. І лепшай радасці, як у гэтым спеве, не знаходзіў, лепшага задавальнення не адчуваў. Не адчуваў нават, што мае босыя ногі ад мокрай халоднай зямлі былі сіня-шызыя, узмакрэлыя патрэшчыны-цыпкі нылі і балелі.

Прыпамінаю чырвонаармейца-ветэрынара, які кватараваў у нашай хатцы з 1921 па 1922 год і часам даваў мне трохі цукру. Цукар той быў гасцінцам вышэйшага гатунку, маёй дзіцячай марай. Навіною былі каляровыя часопісы, кнігі і газеты, што чытаў і даваў мне патрымаць у руках чырвонаармеец. Думаў я тады — самы шчаслівы на зямлі той чалавек, які ўмее чытаць і пісаць.

Успамін узнікае адзін за другім. Нашае Хляўно — даволі вялікая вёска. У ёй сельсавет, хата-чытальня, магазін, тады яго называлі крамаю. Была таксама даволі вялізная каменная царква з высокімі купаламі і пазалочанымі крыжамі. Калі яе пабудавалі — не ведаю, але была яна вельмі прывабнай. Акаймаваная прысадамі і векавымі таполямі царква стаяла, бы ў садзе, а купал яе быў бачны здалёку. Вялізны звон клікаў у святы на служэнне ў царкву. Гул ад яго разносіўся на ўсе навакольныя вёскі.

Бабка мяне навучыла малітвам, і я да школы хадзіў з ёй у царкву і выстойваў нейкі час на каленях. Бабка за гэта мяне хваліла. А калі я стаў хадзіць у школу і перастаў наведваць царкву, звала мяне нячысцікам і грэшнікам. З бацькам я хадзіў на святочныя дэманстрацыі і спяваў песні. Бацька мой, Сафон Авяр'янавіч, быў вядомы сельскі актывіст і бязбожнік. Насіў нават значок бязбожніка.

Хоць адукацыю ён меў і малую — незакончаную пачатковую, але многа выпісваў газет, часопісаў, чытаў іх, расказваў сялянам навіны з унутранага жыцця краіны і пра міжнародныя падзеі. Часта выступаў і на сходах, трымаў цесную сувязь з міліцыяй, дапамагаў ёй змагацца з бандытызмам, з пакражамі.

Маці мая Агрыпіна і бабка Матруна былі зусім непісьменнымі забабоннымі людзьмі. Яны часта бурчалі на бацьку, абзывалі яго хрыстапрадаўцам, вялікім грэшнікам. Ён смяяўся, даказваў ім, што Бога няма, а кабеты злаваліся, сыпалі ў адказ злосныя праклёны, асабліва ў рэвалюцыйныя святы, калі бацька з чырвоным бантам выходзіў на дэманстрацыю...

Вучыўся я спачатку не вельмі добра. Мазюкаў на сшытках, ахайнасць давалася не вельмі, але потым набраў тэмпы і ў 3-ім—4-ым класах быў адным з лепшых вучняў па паспяховасці. Цяжка мне давалася арыфметыка. Вельмі любіў родную мову і літаратуру.

У пачатковай школе многа чытаў беларускай літаратуры. Ведаў на памяць і часта расказваў на вечарах у школе паэмы Янкі Купалы "Курган" і "Бандароўна". Пісаў сам вершы і змяшчаў іх у насценнай газеце. Быў старшынёй вучкома, падаваў асабісты прыклад у будаўніцтве брукаванай дарожкі да школы і абсадцы яе дрэвамі. Дрэвы захаваліся і дагэтуль, і калі ў апошні раз прыязджаў у сваю вёску, то бачыў сціплыя плады таксама і сваіх рук.

Пасля заканчэння сямігадовай школы я стаў селькорам раённай газеты, уступіў у члены ВЛКСМ. Як камсамолец быў прапагандыстам і агітатарам, дапамагаў бацьку, працаваў у калгасе. У той час мне даводзілася бываць з сельсавецкімі

работнікамі на сходах, агітаваць сялян уступаць у калгасы, расказваць ім аб перавагах калектыўнай механізаванай гаспадаркі над раздробленай прыватнаўласніцкай. І не толькі агітаваць словам, але і канкрэтным удзелам у калгаснай працы. Выязджаў на ворыва, на баранаванне, на сенажаць за Сож. Там у нас харошыя заліўныя лугі — трава у рост чалавека. Надараецца і меншая, затое густая-густая, ледзьве касою парэжаш. А ў гэтай траве вадзіліся сотнямі драчы. На рацэ, на азёрах, на старыку было безліч рыбы. Бясконцыя чароды яе хадзілі ў светлай вадзе Сожа. Пабываў я і на пасадзе піянерважатага.

Але прыйшоў час развітацца з роднай вёскай, з разложыстай грушай-дзічкай, якая мела чатыры ствалы. Я часта забіраўся між імі, пад птушыны шчэбет чытаў кнігі. А цяпер казаў ёй “бывай”. Я казаў “бывай” буслянцы на вяршыні высокай ліпы, на якую часта ў дзяцінстве паглядаў, і любаваўся клёкатам сваіх прыручэнцаў-буслоў. Казаў “бывай” сваёй рэчцы, дзе лавіў уюноў, ментузоў і шчупакоў; крынічцы, што сам выкапаў ля агарода; бацьку, які праводзіў мяне да Рагачова на цягнік. А цягнік адвёз у горад Магілёў, на Першамайскую вуліцу, у газетны тэхнікум.

Гарадское жыццё спачатку рабіла сумнае ўражанне, часта ўспаміналася вёска, хацелася трапіць хутчэй на канікулы дадому. Потым паступова стаў прывыкаць да горада. Каб бліжэй быць да жыцця, мы, студэнты, наведвалі некаторыя прадпрыемствы, у тым ліку шаўковую фабрыку, супрацоўнічалі ў яе шматтыражнай газеце. Заўсёды хацелася пісаць выдатна, быць прыстойным журналістам. Калі што-небудзь не ладзілася — перажываў.

Чамусьці часта думаў — чаму я не пайшоў вучыцца на настаўніка? Настаўнік, мне здавалася, — вяршыня ўсяго светлага. Ды так яно на самай справе было. Гэтую думку пацвярджалі і тыя выкладчыкі, якія вучылі мяне ў тэхнікуме, вельмі сціплыя, заўсёды ахайна апранутыя, разумныя, душэўныя і чалавечныя.

Як і заўсёды, усё мае пачатак і канец. Два гады вучобы ў газетным тэхнікуме праляцелі непрыкметна, і з 1937 г. я ўжо — студэнт Мінскага камуністычнага інстытута журналістыкі.

Заняткі ў нашым інстытуце цесна спалучаліся з практыкай. Мы часта наведвалі друкарні, фабрыкі, заводы, майстэрні, дзе бралі матэрыял для сваіх карэспандэнцый. У нас рэгулярна выдавалася свая шматтыражка, у якой мы змяшчалі допісы, спрабавалі сілы ў розных газетных жанрах. Наладжвалі таксама творчыя сустрэчы з пісьменнікамі, з дзеячамі мастацтва.

Запомнілася вытворчая практыка ў баранавіцкай абласной газеце “Чырвоная звязда”. Мяне, як маладога журналіста-практыканта, прыхільна сустрэў рэдакцыйны калектыў. Дзякуючы гэтаму за два месяцы напісаў рад нарысаў, фельетонаў, артыкулаў, карэспандэнцый, інфармацый, пабываў у многіх гарадах, раённых цэнтрах і вёсках вобласці.

Газетная праца вымагала вельмі сур’ёзных адносін, дакладнай праверкі фактаў. Начное ж дзяжурства ў газеце патрабавала ўважлівасці, добрасумленнасці.

...Але вось заняткі закончаны, і я на самастойнай працы — літсупрацоўнік Вілейскай абласной газеты. Любіў ездзіць у камандзіроўкі, арганізоўваць матэрыялы на розныя тэмы і пісаць фельетоны, замалёўкі, нарысы і крытычныя артыкулы. Старэйшыя рэдакцыйныя таварышы казалі, што ў мяне як з рога — усяго многа. Ды не кожны раз была ўдача. Едзеш напісаць дадатны матэрыял — аказваецца, трэба пісаць адмоўны. Бывае, што і ў тэрмін, вызначаны рэдакцыяй, ніяк не ўкладзешся і просіш дадатковага часу.

Нядоўга давялося мне папрацаваць на Вілейшчыне. Грымнула вайна. Нечакана, як гром з яснага неба. На другі дзень эвакуацыйны эшалон павёз мяне на ўсход. На сэрцы сумна і моташна — вялікае няшчасце абрушылася на нашу краіну,

на наш народ. Я ж ведаў, што вораг моцны і каварны, вельмі крыважэрны і ўжывае ўсе самыя неверагодныя, нечуваныя дагэтуль метады, каб дасягнуць сусветнага ўладання. Балюча было адчуваць, што мы адступаем, што і эшалон наш ужо каторыя суткі імчыцца на ўсход, і дзе наш канчатковы прыпынак — невядома. Але такі прыпынак быў — невялічкая станцыя ў Краснаярскім краі. Непадалёку ад яе, у мястэчку Назарава, мяне прызначылі адказным сакратаром раённай газеты "Ударник пятилетки". У мяне быў белы білет аб непрыгоднасці да вайсковай службы. Пачалася звычайная будзённая рэдакцыйная праца.

У Сібіры папрацаваў больш за год, адносна нядоўга — пацягнула бліжэй да сваёй Радзімы — Беларусі. У рэдакцыі якраз знайшоўся на маё месца чалавек з вопытам газетнай работы, і я дамогся паездкі ў прыфрантавую зону.

Даехаў так-сяк да станцыі Санкова Калінінскай вобласці, дзе мяне залічылі на пасаду адказнага сакратара раённай газеты "Дело Октября". Там я, дарэчы, апублікаваў і свой першы верш. Затым працаваў у газеце "Стахановец транспорта" Яраслаўскай чыгункі.

Журналіст-чыгуначнік, я быў ім каля трох год, адрозніваўся ад звычайнага газетнага работніка. Чыгунка, асабліва яе прыфрантавыя аддзяленні, дзе я працаваў, патрабавала суровай воінскай дысцыпліны, дакладнага выканання задання ў любы час сутак.

Дайшлі радасныя весткі, што быў вызвалены мой любімы Мінск, а затым і ўся Беларусь ад ненавісных акупантаў. Я думаў і сніў пра свой родны край, пра маю шматпакутную зямлю, пра гераічны народ.

1945 год. Адкліканы з Яраслаўля, еду на працу ў рэдакцыю газеты "Чырвоная змена" ў горад Мінск. Прыбываю на вакзал і днём на хударлявым каняку сва сваім няхітрым нажыткам дабіраюся па руінах да Усходняга завулка, дзе часова спыняюся ў аднаго дзядзькі на яго ўласнай кватэры. Мне адвялі невялічкі пакойчык, адгароджаны дошкамі, памерам у тры-чатыры квадратныя метры.

Увесь Мінск, асабліва цэнтр, уключаючы вуліцы Савецкую і Карла Маркса, — суцэльныя руіны. Варвары-фашысты настолькі метадычна і планамерна знішчалі нашу сталіцу, што ад яе засталіся толькі груды цэглы і шчэбеню. Але то тут, то там на ўцалелых сценах дамоў красаваліся словы: "З попелу і з руінаў мы ўзнімем цябе, наш родны Мінск!"

У рэдакцыі рэспубліканскай маладзёжнай газеты "Чырвоная змена" мне выпаў гонар быць загадчыкам аддзела рабочай моладзі. На старонках газеты з'яўляліся матэрыялы аб удзеле моладзі ў аднаўленні сталіцы, аб рабоце юнакоў і дзяўчат на фабрыках і заводах. Тады ўзводзіліся першыя ўдарныя камсамольскія новабудоўлі: аўтамабільны і трактарны заводы ў нашай сталіцы Мінску. Над гэтымі заводамі шэфства ўзяў камсамол рэспублікі. У газеце з'яўляліся тэматычныя палосы і развароты пра гэтыя новабудоўлі.

Давялося мне працаваць і ў другой нашай рэспубліканскай камсамольска-маладзёжнай газеце, а падчас працы пабываць амаль ва ўсіх гарадах, раённых цэнтрах і многіх вёсках Беларусі.

Затым займаўся рэдагаваннем літаратуры ў Дзяржаўным выдавецтве БССР.

Першая мая кніжка паэзіі "Песні маладосці", а ў яе ўвайшлі ў асноўным песні, выдадзена ў 1959 г. Праз год выдаў кнігу для дзяцей "Цуды ёсць на свеце". Рэдактарам абедзвюх кніжак быў Міхаіл Іванавіч Калачынскі. Гэты вельмі сціплы, чулы і добразычлівы чалавек сказаў мне:

— Песні і дзіцячыя вершаваныя творы — гэта два ручаі тваёй адной творчай ракі. Шчыра жадаю табе поспехаў.

Сказаныя словы таленавітага пісьменніка мяне акрылілі, і я натхнёна пачаў працаваць. Напісаў звыш двухсот песень. Выдаў кнігу паэзіі "Калінавы цвет" і кнігі для дзяцей "Дзе жыве зіма", "Ка-

рагод", "Ляцелі дзве птушкі", "Кую-кую ножку", "Смешкі і пацешкі", "Добры ветрык" (выбранае).

Дзе я ні бываю: ці за тысячы кіламетраў ад роднага кутка, ці зусім блізка ад яго, ён ніколі не выходзіць з маёй памяці. Хаджу па Каўказскіх гарах, а прыгадваю высокі вапнавы бераг любімай ракі Сажа.

Блукаю па лясах Мінршчыны, а ўяўляю сабе цяністы бор каля Сажа, дзе так многа летам і пад восень баравікоў. Ступаю па лугах Прыпяці ці Заходняй Дзвіны, а думаю пра свой ціхаплынны светлы Сож і прырэчныя шаўкавістыя заліўныя сенажаці. І кожны раз у песнях і марах птушкаю лячу туды, у сваю былую басаногую, але радасную і незабыўную краіну маленства:

Хоць ад цябе, родны кут, і далёка я
Помню лясы і лугі.
Рэчка — красуня мая светлавокая,
Сож, любы мой, дарагі.
1972 г.

Друкуецца са скарачэннем па кн.: Вытокі песні. Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. Мн., 1973.

ДЗМІТРЫЕЎ Міхаіл Апанасавіч, нарадзіўся 23.9.1921 г. у в. Барсукі. Беларускі вучоны ў галіне педагогікі. Доктар педагагічных навук (1993), прафесар (1994). Член-карэспандэнт Беларускай акадэміі адукацыі (1995). Герой Сацыялістычнай Працы (1971). Заслужаны настаўнік БССР (1964). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт (1950). Працаваў настаўнікам, дырэктарам Журавіцкай (Рагачоўскі раён) і Кармянскай сярэдніх школ. З 1961 г. дырэктар Кармянскай сярэдняй школы-інтэрната, з 1974 г. — рэктар Мазырскага педагагічнага інстытута. З 1988 г. у Гомельскім дзяржаўным універсітэце.

Аўтар навуковых прац па гісторыі педагогікі і асветы, тэарэтычна-метадычных праблемах адукацыі і навучання, у тым ліку кніг "Тэксты лекцый па дыдактыцы" (1981), "Тэорыя адукацыі і навучання" (1989) і інш.

Школа радасці

Вучні Міхаіла Апанасавіча Дзмітрыева і тады, калі вучыліся ў Кармянскай школе-інтэрнаце, былі ўдзячныя яму за ўдзел у іх лёсе. А цяпер, праз дзесяцігоддзі, гэта ўдзячнасць павялічылася шматразова. Невядома, што было б з намі — сіротамі і паўсіротамі, калі б ні школа-інтэрнат, якая ў нас заўсёды асацыіруецца з асобай дырэктара і якую я заўсёды смела называў "школай радасці". Яна навучыла нас цаніць жыццё, любіць працу і ўсякага чалавека, які прытрымліваецца гэтых каштоўнасцей.

Наш настаўнік ніколі не абыходзіў увагай пэўныя хібы: зробіць заўвагу, знойдзе неабходную форму для гэтага, і ніхто, да каго ён звяртаўся, не крыўдзіўся. Заўсёды знаходзіў патрэбныя словы — дарэчы і своечасова. Навучаў мудра, і парады былі слушныя, валодаў рэдкім дарам павагі да людзей. Абдзеленыя ўвагай дзеці, якія не бачылі ласкі, у школе знаходзілі яе, траплялі ў рукі клапатлівых педагогаў. Вось чаму — школа радасці. Гэтую школу Міхаіл Апанасавіч ствараў з любоўю, старанна падбіраў педагогаў у адпаведнасці са сваімі прынцыпамі. І яна стала справай яго жыцця. У верасні 1961 г. школа прыняла сваіх першых вучняў.

Усё — ад праекта, ад першага каменя ў падмурку да апошняга ўпрыгожання ў інтэр'еры, да карціннай галерэі і музейных залаў, ад першага настаўніка да прафесійнага педагагічнага калектыву — было справай Міхаіла Апанасавіча. Будаваў ён яе ў адпаведнасці са сваімі ўяўленнямі, якія склаліся на аснове жыццёвага вопыту. А вопыт у М. А. Дзмітрыева — яшчэ з даваенных часоў, калі ўслед за бацькам Апанасам Максімавічам прысвяціў сваё жыццё педагогіцы.

Дзе б ён ні працаваў — настаўнікам, інспектарам раёна, дырэктарам школы, рэктарам Мазырскага педінстытута, дацэнтам, прафесарам кафедры педагогікі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, —

у сваіх педагагічных пошуках наш настаўнік быў паслядоўны.

Яго бацька Апанас Максімавіч быў настаўнікам спачатку Навабелеўскай, а пазней Задубскай і Сырскай школ раёна. Ад бацькі Міхаіл Апанасавіч прыняў эстафету педагагічнай працы і перадаў яе сваім дзецям і нам, вучням.

Мы, выпускнікі Кармянскай школы-інтэрната — не самыя першыя вучні Міхаіла Апанасавіча, — заўсёды з душэўным хваляваннем едзем на традыцыйныя сустрэчы выпускнікоў, якія наш настаўнік таксама стараецца не прапускаць. Спяшаемся да яго за парадай, а часам і проста — сустрэцца з мудрым чалавекам.

Школа-інтэрнат у Карме, пединстытут у Мазыры — дзве вялікія справы ў жыцці нашага настаўніка.

Акрамя Залатой Зоркі ён мае шмат іншых узнагарод — і ваенных, і працоўных. Але галоўнай узнагародай ён лічыць павагу і ўдзячнасць сваіх вучняў.

Л. Новікаў

Друкуецца са скарачэннем: Настаўніцкая газета, 6 кастрычніка 2001 г.

КАРПЯНКОЎ Сцяпан Харламавіч, нарадзіўся ў 1947 г. у в. Вашчанкі. Скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхнічнае вучылішча імя Баўмана. Доктар тэхнічных навук, прафесар. Член-карэспандэнт Расійскай акадэміі прыродазнаўчых навук. Працаваў у Маскоўскім дзяржаўным універсітэце. Узначальваў лабараторыю магнітных і акустычных праблем. Цяпер у Маскоўскім каардынацыйным метадычным цэнтры перападрыхтоўкі кадраў. З'яўляецца саветнікам урада г. Масквы. Аўтар больш за 100 навуковых прац, у тым ліку падручніка для ВНУ "Канцэпцыя сучаснага прыродазнаўства", 10 вынаходніцтваў.

КЛІМЯНКОЎ Іван Пракопавіч, нарадзіўся 7.11.1946 г. у в. Хляўно. Беларускі пісьменнік. Скончыў Ліцвінавіцкую сярэднюю школу (1965), Беларускі дзяржаўны універсітэт (1970). Працаваў настаўнікам у

С.Х.Карпянкоў

У.А.Кулажанка

Любанскім раёне, сакратаром камсамольскай арганізацыі Смілавіцкага СПТВ-23 Чэрвеньскага раёна, выхавацелем у рабочым інтэрнаце Мінскага аўтамабільнага завода, будаўніком у Касцюковіцкім сельгасбудзе і калгасе "Перамога" Валожынскага раёна.

Аўтар кнігі апавяданняў "Сеанс гіпнозу" (1987).

КУЛАЖАНКА Уладзімір Андрэевіч, нарадзіўся 10.6.1926 г. у в. Косаль. Беларускі вучоны ў галіне эканомікі. Доктар эканамічных навук (1981), прафесар (1982). Скончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КПБ (1953), Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС (1959). З 1946 г. на журналісцкай і партыйнай рабоце. З 1964 г. у Беларускім дзяржаўным універсітэце (у 1983–1998 гг. загадчык кафедры паліт-эканоміі).

Аўтар звыш 200 навуковых прац і артыкулаў, у тым ліку адзін з аўтараў навучальнага дапаможніка "Асновы эканамічнай тэорыі" (1995).

КУРБАЦКІ Тодар (Фёдар Пракопавіч), нарадзіўся ў 1904 г. у г. п. Карма. Беларускі паэт. Вучыўся ў Магілёўскім педтэхнікуме. Скончыў Мінскі педагагічны інстытут. Настаўнічаў у Хойніцкай дзесяцігодцы, дзе вучыў будучага народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў на фронце.

Друкаваўся ў альманаху "Аднагодкі" (1934), часопісах "Беларусь калгасная", "Полымя рэвалюцыі", газетах "Літаратура і мас-

тацтва", "Звязда", "Чырвоная змена". Загінуў 15.1.1945 г.

З вершаў Тодара Курбацкага

* * *

Прайшоў я сцежкай ля ракі,
З травы сатканыя разлогі.
Тут ад сяла ва ўсе бакі
Бягуць бясконцыя дарогі.
Мае сябры, мы тут раслі,
Прайшло маленства полем, пашай;
Адсюль падлеткамі пайшлі
Ва ўсе канцы радзімы нашай.
Аб вас бярозкі мне шумяць,
Чаруюць сэрца цёплым сказам.
Душа чакае вас спаткаць,
Прайсці па родных нівах разам.
Іду па ранішняй зямлі,
І ўсё паўстала прад вачамі,
Як мы ў грыбы калісь ішлі,
Як коней пасвілі начамі.
Я тут, як вы, ўжо рэдкі госць.
Даўно не быў на гэтых травах…
За працай нашай маладосць,
Юнацтва наша на заставах.

1939 г.

ЛАТЫШАЎ Анатоль Фролавіч, нарадзіўся ў 1937 г. у в. Акцяброва. Літаратар. Скончыў Мінскую школу кінамеханікаў (1960). Працаваў загадчыкам клуба бібліятэкі ў родным раёне. У 1983 г. у выніку аварыі страціў рукі і ногі. Піша вершы.

З вершаў Анатоля Латышава

* * *

И что я в этой жизни значу?
А волосы, как сизый дым…
Я от обиды горько плачу,
И плачу по местам родным…

Там возле речки в деревушке
Когда-то бегал босиком.
Там мать меня из белой кружки
Поила теплым молоком.

Как все далече, все далече,
И время то, и дом родной…
А журавли который вечер
Летят на родину домой…

ПЕРВЫЙ СНЕГ

Снег на крышах, на заборах,
Снег пушистый на соборах,
Снег ложится, белый снег…
Вспомню я знакомых всех.
Лица, лица, как снежинки,
За окошком промелькнут…
Мне б на родину тропинку –
Только там меня не ждут,
Никого уж нет давно…
Я смотрю, смотрю в окно.
Мою душу, словно рану,
Снег бинтует заодно…

1992

ЛАШКЕВІЧ Рыгор Іосіфавіч, нарадзіўся 10.10.1904 г. у в. Востраў. Беларускі вучоны ў галіне раслінаводства. Доктар сельскагаспадарчых навук (1958), прафесар (1960), член-карэспандэнт АН Беларусі (1961). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1927). Працаваў у Беларускім навукова-даследчым інстытуце меліярацыі і воднай гаспадаркі. Асноўныя працы па аграбіялогіі, аграхіміі і фізіялогіі раслін. Распрацаваў эфектыўныя прыёмы вырошчвання сельскагаспадарчых культур, даследаваў уплыў воднага рэжыму і дажджавання на прадукцыйнасць сельскагаспадарчых раслін і інш.

МАЕЎСКІ Васіль Фаміч, нарадзіўся 1.1.1924 г. у в. Хізаў. Журналіст, літаратар. Заслужаны работнік культуры Беларусі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў у Кармянскай раённай газеце "Авангард", рэспубліканскай газеце "Знамя юности", часопісах "Блокнот агитатора", "Политинформатор и агитатор". У 1973–1983 гг. адказны сакратар часопіса "Вожык".

Аўтар зборнікаў сатыры і гумару "Палявыя маякі", "На чыстую ваду", "Розум у партфелі", "Багаты ўлоў", "Прамой наводкай" і інш.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны, медалямі "За баявыя заслугі", "Партызану Айчыннай вайны", "За доблесную працу".

МІРОНЕНКА Уладзімір Іванавіч, нарадзіўся 9.2.1942 г. у в. Акцяброва. Кандыдат фізіка-матэматычных навук (1970), прафесар (1992). Скончыў Магілёўскі педагагічны інстытут (1964). З 1975 г. у Гомельскім дзяржаўным універсітэце. Аўтар звыш 30 навуковых прац па якаснай тэорыі звы-

чайных дыферэнцыяльных упраўленняў. Увёў паняцці ўкладальных сістэм і адлюстроўваючай функцыі.

НЕСЦЯРОВІЧ Мікалай Дзмітрыевіч, нарадзіўся 25.7.1903 г. у в. Енцы. Беларускі вучоны ў галіне дэндралогіі. Доктар біялагічных навук (1955), прафесар (1956), акадэмік АН Беларусі (1956). Заслужаны дзеяч навукі БССР (1967). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1976). Скончыў Беларускі лесатэхнічны інстытут (1931). З 1937 г. вучоны сакратар, загадчык аддзела Цэнтральнага батанічнага сада. З 1940 г. у Інстытуце біялогіі АН БССР. З 1956 г. адказны сакратар Аддзялення біялагічных навук АН БССР. З 1969 г. віцэ-прэзідэнт АН БССР. З 1975 г. загадчык лабараторыі Інстытута эксперыментальнай батанікі АН БССР. Навуковыя працы па інтрадукцыі і акліматызацыі дрэвавых раслін. Памёр 27.12.1984 г.

ПІМАШЭНКА Аляксандр Пятровіч, нарадзіўся 25.6.1935 г. у в. Міхееўка. Доктар тэхнічных навук, прафесар. Заслужаны акадэмік навукі і тэхнікі Расіі. Працуе рэктарам Балтыйскай дзяржаўнай акадэміі рыбнай прамысловасці і флоту.

Аўтар больш за 80 навуковых прац, 14 вынаходніцтваў.

Узнагароджаны ордэнам "Дружбы народаў" (1996).

САВІН Георгій Сямёнавіч (епіскап Глеб), нарадзіўся 2.1.1945 г. у в. Хізаў. Кандыдат багаслоўскіх навук. Скончыў Маскоўскую духоўную семінарыю (1969), Маскоўскую духоўную акадэмію. З 1976 г. служыў у Данецкай епархіі, адначасова выкладчык Адэскай духоўнай семінарыі. З 1990 г. епіскап Сімферопальскі і Крымскі, затым епіскап Днепрапятроўскі і Запарожскі. З 1992 г. узначаліў Полацка-Глыбоцкую епархію. Узнагароджаны ордэнам Прападобнага Сергія III ступені. Памёр у 1998 г.

Духоўнае прызванне

...Прызванне хлопчыка стаць духоўнікам было вызначана ад самага на-

У.І.Міроненка

М.Дз.Несцяровіч

раджэння, наканавана яму лёсам. Яшчэ дашкольнікам Жора самастойна наведваў, прытым — сістэматычна, усе царкоўныя службы ў суседняй Крыўскай царкве Рагачоўскага раёна і здзіўляў усіх прысутных сваёй адданасцю рэлігіі. А ў школьныя гады самастойна вывучыў царкоўна-славянскую мову, і нярэдка яму давяралі чытаць псалмы ў царкве.

Невыпадкова таму пасля школы Георгій быў прыняты паслушнікам панамара і псаломшчыка.

Затым пачаліся гады вучобы ў духоўных установах. У 1965 г. ён паступае ў Маскоўскую духоўную семінарыю, пасля паспяховага заканчэння якой у 1969 г. працягвае вучобу ў самай прэстыжнай царкоўнай ВНУ — Маскоўскай духоўнай акадэміі. З яе сцен Георгій Савін выходзіць не проста дыпламаваным святаром, а са ступенню кандыдата багаслоўя.

Далейшая біяграфія і служба айца Глеба звязана з Украінай. З 1976 г. ён —

А.П.Пімашэнка

Л.А.Сасноўскі

клерык Данецкай епархіі і адначасова выкладчык Адэскай духоўнай семінарыі. Здольнасці і прафесіяналізм нашага земляка з часам заўважылі і па вартасці ацанілі ў кіраўніцтве Рускай праваслаўнай царквы ў Маскве. Улетку 1990 г. ён прызначаецца епіскапам Сімферопальскім і Крымскім, а ў лістападзе таго ж года — епіскапам Днепрапятроўскім і Запарожскім.

Вядома, што развал Саюза ССР адгукнуўся рознагалоссем у царкоўных справах, і асабліва — ва Украінскім экзархаце. Магчыма, адна з гэтых прычын і абумовіла Г. С. Савіна пакінуць высокі пост на Украіне і вярнуцца на радзіму, дзе яму з 1992 г. даверылі Полацка-Глыбоцкую епархію.

За вялікія заслугі перад Рускай праваслаўнай царквой епіскап Глеб узнагароджаны ордэнам Прападобнага Сергія III ступені і Патрыяршай граматай.

Б. Пладуноў, Р. Ганжураў

Друкуецца са скарачэннем: Зара над Сожам, 25 студзеня 1995 г.

САСНОЎСКІ *Леанід Адамавіч,* нарадзіўся ў 1935 г. у в. Кароцькі. Доктар тэхнічных навук, прафесар. Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Украіны (1997). Аўтар больш за 250 навуковых прац і 20 вынаходніцтваў.

СЕМІЛЕТАВА Ала Канстанцінаўна, нарадзілася ў 1943 г. у в. Вынашаўка. Беларуская і руская спявачка. Скончыла Кармянскую СШ № 1, Кемераўскае культасветвучылішча, Саратаўскую дзяржаўную кансерваторыю. Працавала ў Кемераўскім тэатры аперэты, Краснадарскай дзяржаўнай філармоніі. У рэпертуары арыі з аперэт "Сільва" І.Кальмана, "Вясёлая ўдава" Ф.Легара, "Вольны вецер" І.Дунаеўскага, "Трэмбіта" Г.Мілюціна і інш., рамансы П.Чайкоўскага, С.Рахманінава, Г.Свірыдава і інш., рускія і беларускія народныя песні.

З ліста А.К.Семілетавай земляку В.К.Ландышу:

"Паважаны Віктар Клімавіч!

Пасля таго як летам мінулага года я выехала з Вынашаўкі ў Краснадар, правёўшы ў вёсцы чарговы адпачынак, вельмі засумавала па земляках, па роднай беларускай старонцы, па мілых майму сэрцу мясцінах, дзе прайшло маё залатое дзяцінства. Не паверыце, здаецца, птушкай хуткакрылай паляцела б назусім у роднае гняздоўе, тым больш, што ўжо хутка і на пенсію. Ды, напэўна, маёй мары ўжо ніколі не збыцца, бо злавесны чарнобыльскі атам бязлітасна апаганіў усё, што для мяне было такім дарагім і любімым... І ўсё ж абяцаю, і аб гэтым скажыце маім землякам, што ў хуткім часе мы з мужам абавязкова наведаем Кармяншчыну, дзе выступім са сваім бясплатным канцэртным рэпертуарам, у якім фігуруюць не толькі рамансы Чайкоўскага, Рахманінава, Шастаковіча, Свірыдава, аперэты Кальмана "Сільва", "Вясёлая ўдава" Легара, "Вольны вецер" Дунаеўскага, "Шукальнікі шчасця" Заслаўскага, "Трэмбіта" Мілюціна, але і многія беларускія народныя песні, якія, дарэчы, мы з натхненнем і радасцю спяваем з мужам Станіславам Іванавічам Старасельцам і тут, на Краснадаршчыне.

Жадаю ўсім працоўным маёй роднай і знявечанай бацькаўшчыны вялікага шчасця, дабрабыту, трывалых поспехаў у барацьбе з чарнобыльскай навалай..."

Друкуецца са скарачэннем: Зара над Сожам, 4 красавіка 1991 г.

СМІРНОЎ Валерый Васілевіч, нарадзіўся ў 1947 г. у г.п. Карма. Беларускі артыст. Скончыў Кармянскую СШ № 2 (1963), Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Працаваў у Магілёўскім абласным драматычным тэатры. З 1970 г. у Гродзенскім абласным драматычным тэатры.

ЯЦКЕВІЧ *Алег Віктаравіч,* нарадзіўся 5.7.1946 г. у г.п. Карма. Генерал-маёр (1991). Скончыў Кармянскую СШ № 1 (1964), Казанскае вышэйшае каманднае танкавае вучылішча (1967), Ваенную акадэмію бронетанкавых войск (1978), Ваенную акадэмію Генеральнага штаба Узброеных Сіл СССР (1986). Служыў у Беларусі, Расіі, Чэхаславакіі, Германіі. З 1990 г. зноў у Беларусі: камандзір дывізіі, намеснік камандуючага арміі (1992–1994), намеснік міністра абароны Рэспублікі Беларусь (1994–2000).

А.В. Яцкевіч

Звязаны лёсам

АКУЛАЎ *Аляксандр Іосіфавіч,* нарадзіўся 4.12.1925 г. у в. Саланое Жлобінскага раёна. Скончыў Мінскую вышэйшую партыйную школу (1960). Працаваў другім і першым сакратаром Кармянскага РК КПБ (1960–1962), старшынёй Чачэрскага райвыканкома, першым сакратаром Кармянскага РК КПБ (1967–1977). Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР 7-га склікання. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (двойчы).

ІГНАЦЕНКА *Міхаіл Васілевіч,* нарадзіўся 7.1.1940 г. у в. Гарбавічы Калінкавіцкага раёна. Скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт (1963), Вышэйшую партыйную школу ЦК КПСС (1973). Працаваў у Рагачоўскім раёне настаўнікам, завучам, метадыстам райана, інструктарам райкома партыі, старшынёй калгаса, сакратаром райкома партыі, старшынёй райвыканкома. У сакавіку 1978 г. – кастрычніку 1983 г. працаваў першым сакратаром Кармянскага РК КПБ. Узнагароджаны ордэнам “Знак Пашаны” (двойчы).

МАРЧАНКА *Людміла Васілеўна,* нарадзілася 20.6.1940 г. у Маскве. Скончыла Усесаюзны дзяржаўны інстытут кінематаграфіі (1963). Працавала ў Тэатры-студыі кінаакцёра. Здымалася ў шматлікіх фільмах. Выконвала ролі Тані (“Бацькоўскі дом”, 1959), Насцечкі (“Белыя ночы”, 1960), Веры Мікалаеўны (“Да будучай вясны”, 1961), Галі Бадровай (“Мой малодшы брат”, 1962), Таісы (“Кухарка”, 1966), жонкі Будулая (“Цыган”, 1967) і інш. Здымалася таксама ў фільмах “Разведчыкі” (1969), “Службовы раман” (1977), “За беднага гусара закіньце слова” (1980) і інш.

Неаднаразова прыязджала ў г.п. Карму падчас школьных канікул да сваякоў (да дзеда з бабай па матчынай лініі, цётак і дзядзькоў). У 1965 г. у раённым Доме культуры адбылася сустрэча Л. Марчанкі з гледачамі.

ТКАЧОЎ *Васіль Юр'евіч,* нарадзіўся 1.1.1948 г. у в. Гута Рагачоўскага раёна. Бела-

М.В.Ігнаценка

рускі пісьменнік. Скончыў Львоўскае вышэйшае ваенна-палітычнае вучылішча (1973). Працаваў у раённым і абласным друку. З 1989 г. сакратар Гомельскага абласнога аддзялення Саюза беларускіх пісьменнікаў. Аўтар кніг "Партрэт салдата" (1984), "Дзень у горадзе" (1985), "Пахвалі пражыты дзень" (1988), "Тратнік" (2002), а таксама п'ес "Сівы бусел", "Вокны", "Кветкі-ягадкі" і інш.

У 1966 – 1967 гг. працаваў у Кармянскай раённай газеце "Зара над Сожам".

ШЧУКІН Аляксандр Уладзіміравіч, нарадзіўся 19.1.1946 г. у г. Вена (Аўстрыя). Лётчык-выпрабавальнік І класа. Касманаўт-выпрабавальнік. Маёр. Скончыў Качынскае вышэйшае ваеннае авіяцыйнае вучылішча (1970), Школу лётчыкаў-выпрабавальнікаў Міністэрства авіяцыйнай прамысловасці (1977), Маскоўскі авіяцыйны інстытут (1980). Працаваў лётчыкам-выпрабавальнікам, затым у Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў. Рыхтаваўся да палёту ў космас на касмічным караблі "Буран".

Неаднаразова прыязджаў да сваякоў у в. Хізаў, адкуль родам яго маці Т. Лапаценка. Загінуў 18.8.1988.

Касманаўт-выпрабавальнік

Пачатак касмічнай эры канчаткова пераканаў юнака А. Шчукіна ў правільнасці свайго жыццёвага выбару. І як толькі ў мінулым застаўся адзінаццаты клас, ён, гэты выбар, паў на Качынскае вышэйшае ваеннае авіяцыйнае вучылішча лётчыкаў.

Спасцігаць любімую справу было цікава, а таму неўпрыкмет надышоў год 1970-ы – год заканчэння. І вось ужо першае прызначэнне. Лейтэнанта Шчукіна як выпускніка з выдатнымі тэарэтычнымі ведамі і практычнымі навыкамі накіроўваюць у ВПС групы савецкіх войскаў у Германіі ў якасці лётчыка-выпрабавальніка.

Ён працаваў з 1975 г., а паралельна без адрыву ад вытворчасці ў 1977 г. закончыў школу лётчыкаў-выпрабавальнікаў Мінавіяпрама. Гэта школа дала права маёру Шчукіну асабіста ўдзельнічаць у лётных выпрабаваннях у якасці лётчыка-выпрабавальніка.

Менавіта ў час працы ў інстытуце цалкам раскрыўся неардынарны лётны талент А. У. Шчукіна, дадзены яму, магчыма, самой прыродай. Але лепш за ўсё аб гэтым гаворыць яго службовая характарыстыка:

"...За ўсе гады службы зарэкамендаваў сябе граматным, кваліфікаваным і дысцыплінаваным лётчыкам, здольным паспяхова працаваць у галіне лётных выпрабаванняў. Прымаў удзел у работах рознага профілю.

Лётаў пераважна на сучасных знішчальніках. Выдатная тэхніка пілатавання і самалётаваджэння дазваляла яму выконваць палёты і днём, і ўначы. Праводзіў работы высокай ступені складанасці, за што неаднаразова заахвочваўся кіраўніцтвам інстытута. За гады лётнай дзейнасці правёў у паветры 3134 гадзіны 37 мінут".

Неўзабаве пачынаецца касмічны этап яго службы, службы ў самім Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў. Тут пасля праходжання агульнакасмічных курсаў А. У. Шчукіну прысвойваецца кваліфікацыя "Касманаўт-выпрабавальнік СССР".

...З 1975 г. у Савецкім Саюзе ў абстаноўцы строгай сакрэтнасці пачаліся фарсіраваныя работы па стварэнні прынцыпова новага арбітальнага касмічнага апарата тыпу амерыканскага "Шатл", у чым у нас назіралася адставанне ад ЗША. А ўжо ў 1978 г., як пісала ў студзені 1989 г. газета "Труд", была створана група касманаўтаў для палёту на айчынным шматразовым чаўнаку пад назвай "Буран". У яе, поруч з кіраўніком І. Волкам, увайшоў лётчык-выпрабавальнік А. Шчукін.

Першая мадэль "Бурана" была запушчана 4 чэрвеня 1982 г. Яе пілатавалі І. Волк і Р. Станкявічус. На аналагах "Бурана" (усяго такіх палётаў было да 1988 г. 24) пашчасціла ўзнімацца ў неба і касманаўту-выпрабавальніку беларусу Аляксандру

Шчукіну. Ён, як адзін з самых вопытных і таленавітых лётчыкаў, рыхтаваўся да палёту на сапраўдным "Буране", самым вялікім з лятальных апаратаў у СССР.

Палёт гэты з дапамогай самай магутнай у свеце ракеты-носьбіта "Энергія" сапраўды адбыўся 15 лістапада 1988 г. Але, на жаль, А. У. Шчукін да таго трыумфальнага дня не дажыў. 18 жніўня 1988 г. ён загінуў у час чарговага выпрабавальнага палёту на самалёце СУ-26.

Б.Пладуноў, Р.Ганжураў

Друкуецца са скарачэннем: Зара над Сожам, 12 красавіка 1995 г.

ЯНЧАНКА Мікалай Ігнатавіч, нарадзіўся 22.6.1931 г. у в. Забалацце Магілёўскага раёна. Беларускі пісьменнік. Скончыў Магілёўскі педагагічны інстытут (1956). Працаваў настаўнікам у Бабруйскім і Рагачоўскім раёнах (1956–1966), у раённых газетах у Рагачове, Жлобіне, Калінкавічах, Карме (1966–1971). З 1972 г. жыў і працаваў у Рагачове.

Аўтар зборнікаў вершаў "Разнатраўе" (1971), "Кросны" (1980), кніжак апавяданняў для дзяцей "З людзьмі добра" (1973), "Зраблю сонейка" (1978), "Жменька жалудоў" (1989) і інш. Пераклаў на беларускую мову кнігу вершаў Дз. Кавалёва "Вечназялёная Ветка" (1990). Памёр у 2000 г.

Матэрыялы рубрык "Вызначыліся працай", "Яны нарадзіліся на Кармяншчыне", "Звязаны лёсам" падрыхтаваў М.З.Башлакоў

Загінулі ў Афганістане

КАШПАРАЎ Аляксандр Іванавіч, нарадзіўся 11.11.1963 г. у в. Васільеўка. У 1981 г. скончыў Кармянскую сярэднюю школу № 1. Працаваў слесарам у "Райсельгасхіміі". У 1981 г. прызваны ў Савецкую Армію Кармянскім РВК. Служыў у Афганістане механікам-вадзіцелем БМП. Пры выкананні баявога задання цяжка захварэў. Памёр 16.11.1983 г. Пахаваны ў г.п. Карма, на магіле ўстаноўлены помнік.

...А служба ў арміі амаль скончылася. Двойчы душманы падпальвалі машыны, якія ён вадзіў. Добрая ваенная падрыхтоўка дазваляла пазбегнуць кантузій, раненняў. На гэты раз Аляксандр з таварышамі ехаў у Кабул. У дарозе павінны былі знаходзіцца трое сутак. Увесь гэты час былі сутычкі з душманамі. На адной са стаянак стомленыя байцы напіліся вады з рачулкі, якая працякала побач. Адразу паднялася тэмпература, з'явіліся болі ў суставах. З апошніх сіл яны ўсё-такі давялі тэхніку ў Кабул. А хвароба прагрэсіравала. Аляксандр быў дастаўлены ў СССР, але было ўжо позна...



А.І.Кашпараў

Помнік на магіле А.І. Кашпарава

ПЕРАПЕЧКІН Мікалай Мікалаевіч, нарадзіўся 10.11.1967 г. у в. Баравая Глінка. У 1985 г. скончыў Залатамінскую сярэднюю школу. Працаваў у саўгасе памочнікам камбайнера. У 1985 г. прызваны ў Савецкую Армію Кармянскім РВК. У 1986 г. накіраваны ў Афганістан. Служыў механікам-вадзіцелем у танкавым падраздзяленні. Радавы М.М.Перапечкін загінуў 21.10.1986 г. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Пахаваны ў в. Баравая Глінка, на магіле ўстаноўлены помнік.

...У той дзень М.М.Перапечкін з таварышамі вярнуўся з баявога задання. З люка танка ён веў назіранні за наваколлем. Душманы з'явіліся нечакана... Мікалай паспеў папярэдзіць таварышаў.

Помнік на магіле М.М.Перапечкіна

В.М.Саломчанка

Помнік на магіле В.М.Саломчанкі

Мемарыяльныя дошкі ў гонар загінуўшых у Афганістане

САЛОМЧАНКА Віктар Міхайлавіч, нарадзіўся 27.4.1968 г. у в. Гарадок. У 1985 г. скончыў Кармянскую сярэднюю школу № 1, працаваў слесарам на льнозаводзе. У 1986 г. прызваны ў Савецкую Армію Кармянскім РВК. Служыў у Афганістане санітарам. Узнагароджаны медалём "70 гадоў Узброеных Сіл СССР". Радавы В.М.Саломчанка загінуў 12.5.1988 г. Пахаваны ў г.п. Карма, на магіле ўстаноўлены помнік.

...Віктар з таварышамі нёс баявое дзяжурства на адной з апорных кропак, якую душманы падверглі масіраванаму ракетнаму абстрэлу. Адна з ракет упала ля акопа Віктара...

Пад знакам Чарнобыля

Аварыя на Чарнобыльскай АЭС 26 красавіка 1986 г. страхотнай хмарай прасунулася і над Кармяншчынай, пакінуўшы на яе зямлі нябачную смерць на многія гады. 64 працэнты тэрыторыі раёна маюць шчыльнасць забруджання цэзіем-137 ад 10 да 15 кюры/км^2, 32 працэнты — ад 15 да 40 кюры/км^2. Нават у г.п. Карма колькасць цэзію-137 перавышае больш як 18 кюры/км^2. Лік "мёртвых" вёсак папоўнілі 27 населеных пунктаў раёна, у якіх пражывала 1224 сям'і і 4280 жыхароў. Яны перасялены ў другія рэгіёны рэспублікі, у тым ліку і ў сталіцу. Усяго ж з раёна пераселена 4030 сямей, ці каля 14 тыс. жыхароў. Поўнасцю ліквідаваны саўгас "Руднянскі" і калгас "Радзіма". Скасаваны 2 сельскія Саветы. У выніку колькасць насельніцтва скарацілася амаль напалавіну. У канцы 1995 г. у раёне пражывала ўсяго 18 143 чалавекі, у тым ліку ў г.п. Карма — 5000.

У цяжкім становішчы аказалася сельская гаспадарка. З землекарыстання выключана 15 739 га сельгасугоддзяў, у тым ліку 5695 — ворыўнай зямлі. Калі да катастрофы на ЧАЭС у раёне налічвалася звыш 40 тыс. галоў жывёлы, з іх больш як 12 тыс. кароў і каля 15 тыс. свіней, то на канец 1995 г. гэтыя паказчыкі адпаведна раўняліся 19 тысячам; 6000 і 3900 адпаведна.

У выніку скарачэння пагалоўя рэзка ўпаў аб'ём вытворчасці жывёлагадоўчай прадукцыі. У 1995 г. калгасы і саўгасы раёна прадалі дзяржаве малака 7220 т і мяса 1873 т супраць 30 тыс. і 7 тыс. т да аварыі.

Да 1986 г. Кармянскі раён займаў 3-яе месца ў рэспубліцы па вытворчасці льну. Мясцовы льнозавод перапрацоўваў

больш за 10 тыс. т ільнотрасты. На ім працавала 250 чалавек. Чарнобыль зрабіў свае папраўкі. Прадпрыемства аказалася на тэрыторыі са шчыльнасцю забруджання цэзіем звыш 30 кюры/км^2, і пра насевы льну ў былых маштабах давялося забыць. Зараз на заводзе працуе толькі 130 чалавек, аб'ём перапрацоўкі прадукцыі скараціўся амаль у 5 разоў.

Адной з самых балючых праблем для Кармяншчыны стала кадравая. Раён толькі на 50 працэнтаў забяспечаны ўрачамі, востра стаіць пытанне з педагогамі.

Вось такім суровым папярэджаннем для людзей стаў атам, які выйшаў з-пад кантролю чалавека.

К. І. Пятроў

Дакументы сведчаць

Рашэнне выканаўчага камітэта Кармянскага раённага Савета народных дэпутатаў

6 кастрычніка
г.п. Карма

Об информировании населения о радиационной обстановке на территории района

На основании докладной записки Совета Министров БССР от 01.9.89 г. № 1762 "О системе информирования населения о радиационной обстановке на территории Белорусской ССР" исполком районного Совета народных депутатов решил:

1. Создать информационную группу по информированию о радиационной обстановке в районе в следующем составе:
Матвеенко В.Е. — зам. председателя райисполкома, руководитель группы
Морозов В.П. — зам. председателя райисполкома, заместитель руководителя
Маевский В.П. — главврач района
Асташко Г.А. — главный санитарный врач района
Карпович В.Ф. — начальник штаба гражданской обороны
Седич П.Я. — зам. председателя РАПО
Буслов А.Е. — председатель райпо
Гарбузов — лесничий Струменского лесничества
Рыжков Н.И. — зав. ветлабораторией
Роскач Н.И. — председатель райобъединения "Сельхозхимия"
Солодкая Н.М. — редактор газеты "Заря над Сожем"
Косенкова Е.Е. — инспектор по охране природы
Гриневич А.И. — инспектор Белрыбвода района
Ярец М.Р. — председатель РК профсоюза работников АПК
Васильев Н.Д. — радиолог РАПО
Никитенко Н.И. — информатор по радиовещанию

2. Группа радиационного обследования и информации при райисполкоме раз в неделю представляет в районные средства массовой информации для опубликования и в межведомственные информационные группы при облисполкоме обобщенные данные о радиационной обстановке в районе.

3. Осуществляет с участием общественности по согласованному с райисполкомом графику комплексные обследования радиационной обстановки в населенных пунктах, а также сельскохозяйственной продукции, произведенной в личных подсобных хозяйствах граждан, промысловой продукции (грибы, ягоды, рыба и т.д.) с оповещением населения через средства массовой информации о результатах этих обследований и проверок.

4. На специально созданной в каждом населенном пункте доске информации приводятся сведения об уровнях радиации, состоянии загрязнения сельхозпродукции, рыбы, грибов, дикорастущих плодов и ягод, дозовых нагрузках на население, помещаются соответствующие информационные листки и пометки по режиму проживания и поведения людей на загрязненных территориях, а в населенных пунктах, где выполняются работы по дезактивации, — сведения о ее результатах. Приемка выполненных работ по дезактивации осуществляется с

участием общественности, и на каждое подворье составляется и выдается дозиметрический паспорт.

Контроль возложить на штаб гражданской обороны района (т. Карпович В.Ф.).

Председатель исполкома *Е.Т.Барабанов*

Секретарь исполкома *П.Д. Аношко*

Графік правядзення першачарговых мерапрыемстваў раённай інфармацыйнай групай у сувязі з радыяцыйным становішчам на кастрычнік—снежань 1989 г.

1. Провести паспортизацию подворий граждан, проживающих в зоне строгого контроля; октябрь, т. Матвеенко В.Е., т. Морозов В.П.

2. Провести подворный обход граждан, проживающих в населенных пунктах, подлежащих эвакуации;
октябрь, т. Матвеенко В.Е., т. Ротозеева Е.И.

3. Вывесить в исполкомах поселкового и сельских Советов щиты с указанием уровней РЗ (Ки/км^2) по населенным пунктам;
октябрь, председатели исполкомов.

4. Опубликовать на страницах районной газеты населенные пункты с указанием уровней РЗ почвы;
октябрь, ноябрь, редакция газеты: т. Солодкая Н.М., т. Матвеенко В.Е.

5. Опубликовать в районной газете "Заря над Сожем" результаты измерений по уровню РЗ продуктов из подворий граждан;
октябрь, ноябрь, декабрь, т. Асташко Г.А.

6. Выступить по местному радиовещанию о соблюдении правил личной гигиены;
ноябрь, декабрь, т. Асташко Г.А., т. Маевский В.П.

7. Выступить по местному радиовещанию и на страницах районной газеты о чистоте мясных продуктов и молока, закупаемого у населения;
сентябрь, декабрь, т. Рыжков Н.И.

8. Изготовить и вывесить на центральных усадьбах хозяйств карты территории района с указанием уровней РЗ почвы;
т. Матвеенко В.Е.

9. Провести "прямую линию" по местному радиовещанию с разъяснением порядка отселения жителей из загрязненных территорий;
т. Матвеенко В.Е.

Председатель группы *В.Е.Матвеенко*

Пастанова Савета Міністраў БССР

ст. 497

О бронировании жилой площади за гражданами, выехавшими на работу в населенные пункты, подвергшиеся радиоактивному загрязнению в результате аварии на Чернобыльской АЭС

СМ БССР постановляет:

Облисполкому и Минскому горисполкому обеспечить бронирование жилой площади по месту постоянного жительства, независимо от ее ведомственной принадлежности, за гражданами, выехавшими на работу в населенные пункты, подвергшиеся радиоактивному загрязнению в результате аварии на Чернобыльской АЭС, на все время работы в этих населенных пунктах.

Зам. председателя СМ БССР *Н.Костиков*

Зам. управделами СМ *А.Соколовский*

Зварот Пастаянных камісій па пытаннях ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС Гомельскага і Магілёўскага абласных Саветаў народных дэпутатаў

ад 24 снежня 1993 г.
г.п. Карма

Депутаты Гомельского и Могилевского областных Советов народных депутатов на совместном заседании Постоянных комиссий по вопросам ликвидации последствий аварии на ЧАЭС, проведенном в г.п. Корма, — административном центре одного из сильно пострадавших от аварии районов республики, обсудили сложившуюся социально-экономическую ситуацию и ход реализации мер по преодолению последствий катастрофы.

Наметив для последующей совместной работы ряд наиболее серьезных проблем социального обустройства пострадавшего населения, депутаты двух наиболее пострадавших областей обращаются в Верховный Совет и Правительство Беларуси с нижеследующим.

Нашей республикой в сложнейших экономических условиях приходится решать проблемы выживания после глобальной катастрофы. Весь послеаварийный период, несмотря на наличие издержек в стратегии и тактике защитных мероприятий, однозначно можно оценить как реальную заботу государства о своих согражданах, оказавшихся безвинными заложниками радиационной трагедии.

Однако областные депутаты отмечают, что в последнее время на фоне затихания Чернобыльского набата в нашем парламенте и Верховный Совет, и Совмин начали запаздывать в оценке складывающейся на пострадавших территориях социально-экономической ситуации.

Последняя характеризуется тем, что субъективное отношение населения к последствиям аварии стабилизировалось. На опаленной радиоактивным пеплом земле живут те люди, которые осознанно решили не искушать судьбу в поисках "лучшего" вдали от родных мест. Плановое переселение практически заканчивается. Именно поэтому заботу государства о себе население сейчас видит исключительно в реальном повышении уровня жизни на пострадавших территориях. Люди говорят: уделите нам хоть немного внимания по наиболее насущным проблемам и не мешайте нам жить.

Что их сейчас волнует?

Основное — это газификация, благоустройство и регулярное медицинское наблюдение, особенно за детьми. Как раз по этим вопросам глубинка пострадавших территорий и остается крайне запущенной. Мы, депутаты, задаем вопрос: неужели наше государство, как бы тяжело сейчас ни было, не сможет найти силы для полного выполнения своего долга хотя бы по этим жизненно важным мерам?

В целом считаем, что недопустимо затянуть переход на проведение реабилитационных мероприятий как основы тактики ликвидации последствий аварии, однако в республике до сих пор не разработана концепция такой реабилитации. Более того, в проекте новой республиканской Госпрограммы отпускается еще два года, и то только на разработку математической модели реабилитации!

Мы отмечаем, что местные органы власти уже научились жить и работать в условиях ликвидации последствий аварии, прекрасно ориентируясь в первоочередности проблем жизнеобеспечения своих районов. Однако они по-прежнему не имеют настоящего механизма экономического управления своими территориями, фактически не являясь держателями финансов, выделяемых на проведение защитных мероприятий. Это усугубляется аморфностью централизованного финансирования чернобыльских мероприятий, резким снижением дисциплины ведомств и персональной ответственности их руководителей за выполнение заданий в пострадавших районах. Необходимо срочно установить жесточайший государственный механизм ответственности за исполнение защитных мероприятий, начиная от министра и кончая рядовым рабочим.

Серьезной переориентации требует позиция Верховного Совета и Совмина в отношениях ситуации, складывающейся в сельхозпроизводстве на пострадавших территориях, — здесь, как нигде в другой отрасли, ощущается застой в решении накопившихся проблем.

Обращаемся к Постоянной комиссии Верховного Совета по вопросам ликвидации последствий аварии на ЧАЭС. В текущем году по вашей инициативе в Минске и Гомеле был проведен серьезный разбор роли республиканских министерств и ведомств в проведении конкретной работы на пострадавших территориях — у нас есть опасения, что намеченные меры могут остаться на бумаге. В этом убеждает и разработанный проект Государственной программы по преодолению в Республике Беларусь последствий катастрофы на ЧАЭС, который вобрал в себя укоренившуюся практику "размазывания" чернобыльских средств и вновь не принял во внимание законные требования пострадавших территорий по концентрации финансов в первую очередь на решение их проблем.

Депутаты Гомельщины и Могилевщины считают, что в принципе недопустимо какое бы то ни было упрощение послеаварийной ситуации и сокращение финансирования пострадавших территорий.

Давайте не забудем о своем долге перед людьми, живущими под чернобыльским гнетом!

Постоянная комиссия по вопросам ликвидации последствий аварии на Чернобыльской АЭС Гомельского облисполкома

Постоянная комиссия по вопросам ликвидации последствий аварии на Чернобыльской АЭС Могилевского облисполкома

Даведка аб адсяленні сем'яў з зоны радыеактыўнага забруджання ў Кармянскім раёне

Зона последующего отселения

Больше 15 Ки/км^2

	(населены пункт)	(колькасць сем'яў)
1.	Лозовица	25
2.	Васильевка	4
3.	Лабыревка	50
4.	Салобута	21
5.	К. Прудок	13
6.	Заболоцкое	13
7.	Курганье	10
8.	Сапожки	25
9.	Студенец	24
10.	Н.Зеньковина	55
11.	Ст. Зеньковина	17
12.	Колюды	54
13.	Рудня	79
14.	Ясень	26
15.	Добричь	7
16.	Жауница	41
17.	Бервены	11
18.	Косель	40
19.	Высокое	42
20.	Кавказ	2
21.	г.п. Корма	1087
		1640 семей

По Государственной программе ликвидации последствий аварии на ЧАЭС

	(населены пункт)	(колькасць сем'яў)
1.	Бурный	9
2.	Кр. Бор	12
3.	Рассвет	11
4.	Курганица	14

5.	Осов	3
6.	Малашки	20
7.	Труд	10
8.	Маленик	24
9.	Казимирово	26
10.	П. Глинка	21
11.	Б. Глинка	26
12.	Никольск	2
13.	Луначарск	9
		187 семей

	Больше 40 Ки/км^2 (населены пункт)	(колькасць сем'яў)
1.	Золотомино	170
2.	Хлевно	81
3.	Костюковка	36
4.	Струмень	170
		457 семей

Всего: 2284 семьи

Зам. председателя исполкома *Е. Бондарева*

На 1.1.94 г. осталось проживать: 1664 семьи, в т.ч. 756 с детьми;
за 1993 г. переселено 327 семей, в т.ч. 104 с детьми.

Распараджэнне

ад 24 красавіка 1990 г.
г.п. Карма

Для проведения работ по отселению жителей населенных пунктов зоны жесткого контроля, учету семей с детьми и беременных женщин направить для повторного обхода следующих работников райисполкома:

Населенный пункт:	Ф.И.О.
д. Курганье	Чернякова В.А.
	Вышнякова В.Е.
	Жданова Н.Н.
д. Хлевно	Матвеенко В.Е.
	Силков М.М.
д. Косельский Прудок	Потапенко Л.В.
	Маркова Т.Н.
д. Салобута	Похоменко И.А.
	Жиленко С.Я.
	Ходонович В.С.
д. Луначарск	Мурашко Е.В.
	Моисеенко В.А.
	Шершнева В.П.
д. Жауница	Ходонович В.С.
	Кожемякина Е.А.

	Подоляцкий Н.А.
д. Лозовица	Мироненко В.Л.
	Давыденко Л.П.

Сведения повторного обхода предоставить в райисполком по состоянию на 1 мая 1990 года, 20 июля 1990 года и 1 октября 1990 года.

Председатель исполкома *Е.Т.Барабанов*

Выпіска з рашэння Кармянскага райсавета

По вопросу выполнения Закона Республики Беларусь "О социальной защите граждан, пострадавших от аварии на ЧАЭС"

В этих целях с 1987 года в районе построено 723 квартиры общей площадью 45 710 м^2. Введено в эксплуатацию 6 школ, 4 детсада, поликлиника, 3 клуба, 6 магазинов и 2 столовые, 2 бани, 5 ФАПов.

Построено дорог с твердым покрытием 225 км, проложено 72 км водопровода. Начиная с 1992 года проложено 49,2 км газопровода.

Только за 1997 год в районе расходовано со средств бюджета на различные выплаты в соответствии с Законом Республики Беларусь "О социальной защите граждан, пострадавших от катастрофы на Чернобыльской АЭС" около 51 млрд. рублей. Отселены жители из зоны с уровнем радиоактивного загрязнения свыше 40 Ки/км^2. Переселено из населенных пунктов, расположенных на территории, загрязненной радиоактивными веществами свыше 15 Ки/км^2, 1382 семьи.

Для переселения граждан выделено больше 1000 квартир, построенных за счет средств, выделенных на ликвидацию последствий аварии.

Под постоянным контролем находятся продукты питания для населения, питьевая вода. Осуществляется кольцевой завоз продуктов в школьные столовые.

Население регулярно обследуется в соответствии с требованиями, медицинскими работниками районных, областных и республиканских учреждений.

Для проведения оздоровления трудящихся и их детей в 1996 году было выделено 3746 путевок. Несколько оживилась работа по благоустройству и улучшению санитарного состояния г.п. Корма и сельских населенных пунктов.

Вместе с тем в работе, проводимой в районе по ликвидации последствий аварии на Чернобыльской АЭС, обеспечению социальной защиты населения, проживающего на загрязненной территории, имеется ряд серьезных недостатков и упущений.

Не обеспечивается комплексный и сбалансированный подход к вопросам обеспечения социальной защиты граждан из-за отсутствия Программы по преодолению катастрофы на ближайшие несколько лет и дальнейшую перспективу.

Остро ощущается нехватка средств на нужды сельскохозяйственного производства, защитных мероприятий, газификации, социального обустройства и обеспечения населенных пунктов района. Необходимо проложить 400 км газовых, 100 км водопроводных сетей, благоустроить 8 км в г.п. Корма и 153 км улиц в сельских населенных пунктах.

Важнейшей остается кадровая проблема, и в первую очередь в здравоохранении, в образовании, в сельском хозяйстве.

В районе не хватает 12 врачей, 40 учителей, 30 главных специалистов сельского хозяйства.

Проявляется беспечность по отношению к здоровью людей, созданию соответствующих условий труда, безопасности в работе. Со стороны райпотребсоюза в магазинах не соблюдается обязательный ассортиментный перечень продуктов и товаров повседневного спроса. Имеются недостатки в обеспечении продуктами питания школьных и дошкольных учреждений.

Зона і "насельнікі"

Вёску Струмень да красавіка 1986-га, калі выбухнуў рэактар на Чарнобыльскай АЭС, і нават пасля, ажно да вясны 1989-га, калі былі абвешчаны сапраўдныя вынікі катастрофы, да разраду неперспектыўных не адносілі. Тым не менш гэтага, некалі квітнеючага населенага пункта параўнальна маладога (з гісторыяй крыху больш за стагоддзе) сёння на карце няма. 42 злавесныя кюры па

цэзію-137 і, адпаведна, небяспека для здароўя і жыцця прымусілі людзей шукаць прытулку ў іншых мясцінах.

Праўда, хоць шлагбаум кантрольна-прапускного пункта тут з'явіўся больш як паўтара года назад і ўезд у вёску быў забаронены, жыццё цеплілася аж да глыбокай восені мінулага года. А што сёння ў вёсцы і вакол яе?

І вось мы на прыстані. Ужо сам выгляд КПП, "зебра"-шлагбаум міжволі прыгадваюць абстаноўку ваеннага часу, выклікаюць трывогу. У вагончыку, размешчаным за некалькі крокаў ад берага Сажа, нясуць дзяжурства хлопцы са "спецназа". Старшы з паста міліцыянер дакладвае, што ніякіх здарэнняў за час нясення службы не адбылося.

Дарэчы, у атрадзе зусім маладыя хлопцы — па 20—25 гадоў. Усе яны прыйшлі на гэты адказны і ў пэўнай ступені небяспечны ўчастак па ўласным жаданні, або, як раней казалі, па закліку сэрца. Заступаюць на пост праз двое сутак на трэція і змяняюцца праз 24 гадзіны. Нясуць службу і жывуць у прыстасаваным, як у будаўнікоў, вагончыку са спартанскай абстаноўкай: адзін пакой у вагончыку, калі можна так сказаць, — афіцыйны (тут дзелавыя паперы і неабходная дакументацыя па службе), другі — бытавы (з газавай плітой і тапчаном).

Зона за ракой хоць і лічыцца адселенай, але жыццё ў ёй, як мы ўпэўніліся, працягваецца. У журнале КПП ужо з раніцы было зафіксавана перамяшчэнне, на падставе адпаведных пропускаў, каля дзесятка транспартных адзінак.

А жыць трэба

Зялёнага колеру юркі "ўазік" падмінае пад колы адзін за адным кіламетры гравійкі. Мы, карыстаючыся выпадкам, едзем у Валынцы ў камандзіроўку, каб затым расказаць аб буднях і святах людзей, якім лёсам, відаць, наканавана працаваць і жыць у даволі цяжкіх і складаных умовах. Але, нягледзячы на ўсе выпрабаванні, яны застаюцца вернымі сялянскай запаведзі.

На тэрыторыі Валынцаўскага сельскага Савета размешчаны адзіны саўгас. Да ракавой красавіцкай раніцы 1986 г. зямельная плошча гаспадаркі складала 4174 га, у тым ліку: сельгасугоддзяў — 3222, ворыва — 1668, сенажацяў — 906 і 650 гектараў пашы. Пасля аварыі на ЧАЭС карысная зямельная плошча складае ўсяго 1340 гектараў.

Саўгас апынуўся і ў цяжкім фінансавым становішчы. Калі б маглі прадаць зімой вялікую колькасць жывёлагадоўчай прадукцыі, мелі б вялікія грошы. А так атрымліваецца цяпер, што працуюць, як кажуць, з колаў — што прывезлі, тут жа даводзіцца выкарыстоўваць.

З 18 спецыялістаў, якія працавалі ў гаспадарцы, цяпер з вышэйшай сельскагаспадарчай адукацыяй усяго адзін. Гэта дырэктар саўгаса В.М.Каляда. Ён тут, паводле яго слоў, і эканаміст, і галоўны аграном, і заатэхнік. У бухгалтэрыі працуе таксама ўсяго тры жанчыны. Ёсць яшчэ ў саўгасе загадчык майстэрань, інжынер па сельгасмашынам, брыгадзір. Вось і ўсе кадры.

Неймаверна цяжка працаваць і жыць ва ўмовах, калі не ведаеш, што з саўгасам будзе заўтра. Але бяда людзей гартуе. Узяць, да прыкладу, сям'ю Ніны Канстанцінаўны Палаўковай, начальніка мясцовага аддзялення сувязі. Нядаўна вярнуліся пад дах бацькоўскай хаты два яе сыны-халасцякі: Алег і Віктар. Хлопцы не пайшлі шукаць лёгкага хлеба, не кінуліся ў вір камерцыі. Ім, маладым і здаровым, справа знайшлася і ў гаспадарцы. Пайшлі працаваць трактарыстамі. В.М.Каляда задаволены працай братоў Палаўковых.

Не адзін дзесятак год шчыруе ў кузні М.А.Саламонаў. З раніцы па ўсяму наваколлю разносіцца адтуль малінавы звон — гімн працы і вясны. Мікалай Антонавіч на пенсіі. Але як у такі гарачы час абысціся механізатарам без яго спрытных і ўмелых рук. Цяпер, калі востра адчуваецца недахоп запчастак, нават самых звычайных шурупаў, ён патрэбен вяскоўцам, як касцу свежы вецер у спякотны поўдзень. Без выхадных шчыруе

на палетках пенсіянер Фёдар Сямёнавіч Разгонаў, ён жа і старшыня савета працоўнага калектыву.

Не, з такімі людзьмі жыццё не спыніцца.

Гадоў з дзесяць назад у Савеце налічвалася дзве васьмігадовыя і адна пачатковая школы, дзе займалася 246 вучняў, працавала 19 настаўнікаў, палавіна з якіх была з вышэйшай адукацыяй. Цяпер адна школа ў в. Кляпін, дзе займаюцца 68 вучняў. Настаўнікі ўзялі пад свой кантроль арганізацыю гарачага харчавання ў школьнай сталоўцы. Рэгулярна дастаўляюць дзяцей на медыцынскае абследаванне. Наладзілі сувязі з кіраўніцтвам нямецкага г. Анцынг. Адтуль ужо два разы наведваліся ў школу прадстаўнікі Анцынгскай ініцыятывы дапамогі дзецям Чарнобыля, пастаўлялі медыкаменты, харчаванне, вопратку.

Сярод лясоў і хмызнякоў на стыку Гомельскай і Магілёўскай абласцей, на ўсходнім Прысожжы раскінулася в. Калюды — былы цэнтр другой паляводчай брыгады саўгаса "Валынцы". Многае тут давялося пабачыць і перажыць калюдаўцам у гады Вялікай Айчыннай вайны. Пакінулі фашысцкія карнікі свае сляды жорсткасці. З шасцідзесяці хат уцалела не больш за дваццаць. Не павярнула ад гэтай вёскі і чарнобыльская хмара, густа ўсеяўшы зялёную рунь, лясы радыенуклідамі. Да гэтай страшэннай трагедыі ў Калюдах налічвалася 67 двароў, дзе пражывала 240 чалавек. Цяпер там засталося ўсяго 15 нямоглых пенсіянераў, далейшы лёс якіх на раздарожжы.

У в. Жавуніца да нядаўняга часу было 26 моцных двароў. Жылі тут працавітыя людзі. А цяпер гэтая вёска ў ліку "мёртвых". Такая доля напаткала яе сяброўку в. Ясень, дзе да радыяцыі пражывала 107 чалавек, налічвалася 34 двары. Але гэтыя блізкія сэрцу куткі нельга лічыць пахаванымі. Там засталіся дрэвы, пасаджаныя ў маладосці іх гаспадарамі, там засталіся магілы продкаў...

Г.Карнач

З матэрыяльнай і духоўнай спадчыны

Народныя абрады і звычаі

На тэрыторыі Кармянскага раёна даволі поўна прадстаўлены амаль усе фальклорныя жанры. Трывала захоўвае народная памяць традыцыйны абрадавы фальклор, хоць многія абрады і звычаі ў значнай ступені трансфарміраваліся, страцілі ранейшыя магічныя функцыі, захаваўшы толькі пацешлівы, святочна-карнавальны характар.

Калядна-навагодні комплекс Кармянскага раёна супадае з агульнабеларускім у такіх асноўных абрадавых момантах, як абходныя шэсці калядоўшчыкаў на Каляды і шчадроўнікаў на Новы год, агульная трапеза (тры куцці), зімовыя гульні тэатралізаванага характару, калядныя варожбы аграрна-магічнай і шлюбнай накіраванасці, рытуальныя дыялогі. Традыцыйны абрад калядавання, як і ў іншых мясцовасцях Гомельскай вобласці, быў звязаны з ваджэннем казы. Паводле ўспамінаў М. Бруевіч з в. Вmatch наўка, "на другую куццю вадзілі казу, для гэтага пераапраналі хлопца ў вывернуты кажух, галаву рабілі з бурака, устаўлялі казліныя рогі". У цэнтры песні, якой суправаджалася каляднае прадстаўленне, — міфічная істота "каза", з ёй звязвалі надзеі на добры ўраджай. Праўда, у нашым прыкладзе гучыць матыў відавочнай пагібелі казы ад "стральцоў-барцоў Нікалаеўцаў". Ахвярапрынашэнне жывёлы спалучана з ідэяй паміранне прыроды зімой і яе ўваскрэсеннем вясной — вызначальнай ідэяй каляндарна-абрадавага фальклору.

Адметнасцю мясцовай фальклорнай каляднай традыцыі з'яўляецца гульнявое тэатралізаванае прадстаўленне, якое разыгрывалі "пава з павуком". Для гэтага дзяўчыну нараджалі ў дліннае плацце, на галаве — вянок з лентамі з бумагі. Гэта была "пава". Хлопец быў "павуком"

(в. Струкачоў). Калі калязнікаў з казой чакалі з нецярплівасцю, то "паву з павуком не любілі пускаць у хату, бо яны заўсёды што-небудзь украдалі". Песня, якая выконваецца ўдзельнікамі гэтай гульнявой часткі абраду, вызначаецца шлюбнай сімволікай (вянок — сімвал дзявочай годнасці; згуба вянка — сімвал страты цнатлівасці да шлюбу):

Пава, пава па двару лятала,
Перайка ўпала, у рукавок клала,
З рукаўка брала, вяночак віла.
Вяночак звіла, пайшла ў таночак,
З таночка ішла, вяночак згубіла.

Прыведзены факт прысутнасці абрадавага дзеяння шлюбнага характару ў калядным комплексе сведчыць аб тым, што ідэя шлюбу, прадаўжэння роду была не менш важнай у земляробчым календары, чым культы прыроды і продкаў.

Спецыфічнай асаблівасцю калядавання на Карманшчыне з'яўляецца пераапрананне ўдзельнікаў у "цыган". Хутчэй за ўсё гэта звязана з унясеннем новых элементаў у традыцыйны абрад калядавання, што істотна паўплывала і на песенны рэпертуар (уключэнне песень цыганскай тэматыкі). Па ўспамінах Н. Аляксеенкі з в. Хізаў, "сабяром трапак, здзелаем ляльку, з лялькай хадзілі па дамам, дзіцёнка носім, калі ў цыганку пераапранаемся. Адна ідзе з лялькай, абкрытая, а етыя бегаюць, пяюць, скачуць, карты з сабой носяць: "Давай пагадаю! Маладая, красівая, замуж пойдзеш!"

Каляды з'яўляліся падрыхтоўчым этапам для атрымання добрага ўраджаю. Невыпадкова абрады, якія выконваліся, насілі заклінальны аграрна-магічны характар. Напрыклад, абрад засявання ў вёсках Кармянскага раёна адбываўся на другі дзень пасля шчадравання: "Калі шчадроўшчыкі засеюць збожжам у хаце, то ў гэтым годзе ў хазяіна будзе багаты ўраджай" (в. Багданавічы). У шчадроўна-калядных песнях, адрасаваных гаспадару, гаспадыні, дачцэ, сыну, гучаць матывы зычання дабра, здароўя, шлюбнага шчасця. Асабліва відавочнымі з'яўляюцца элементы вясельнай стылістыкі ў калядках, адрасаваных моладзі.

Адметнасцю мясцовай каляднай традыцыі з'яўлялася "спайка", калі дзяўчаты і хлопцы збіраліся ў якой-небудзь хаце, наймалі музыку, рыхтавалі "кашу", а "старэйшыя дзеўкі "білі" кашу (в. Высокае) ці хто-небудзь з хлопцаў, "той, хто больш грошай пакладзе на кашу" (в. Задуб'е). Прыведзены прыклад сведчыць аб узаемасувязі каляднай і радзіннахрэсьбіннай абраднасці. Радзінны абрад разбівання гаршка з бабінай кашай, можна меркаваць, быў запазычаны каляднай традыцыяй, напэўна, таму, што на Каляды адзначалі нараджэнне Хрыста.

Захоўваецца яшчэ і сёння ў памяці жыхароў Карманшчыны звычай заклікання марозу на куццю: "Ставілі куццю на стол, і бацька гукаў: "Мароз, мароз, хадзі куццю есці. А еслі не пойдзеш, жалезнай пугай паб'ем" (в. Задуб'е). У міфалагічных прыкметах і павер'ях, звязаных з Калядамі, надзвычай ярка адлюстраваўся светапогляд нашых продкаў, іх паэтычнае асэнсаванне складаных з'яў жыцця, пошукі мудрых тлумачэнняў незразумелых ім прыродных фактаў, імкненне спасцігнуць таямніцы рацыянальнага гаспадарання на зямлі, знайсці найлепшыя сродкі, каб дасягнуць у будучым добрага ўраджаю на палетках і прыплоду дамашняй жывёлы. І хоць калядны цыкл не быў непасрэдна звязаны з правядзеннем земляробчых работ, але ўжо ўзімку ўсе думы і жаданні селяніна былі звязаны з чаканнем новага ўраджаю. Таму такімі важнымі, напоўненымі магічнай сілай здзяйснення з'яўляюцца ўсе тыя сімвалічныя абрадавыя дзеянні, да якіх звярталіся нашы продкі на працягу ўсяго каляднага перыяду. Найбольш распаўсюджанымі павер'ямі, якія і сёння, як і было заведзена раней, вызначаюць гаспадарчы і сямейны жыццёвы парадак, з'яўляюцца наступныя: "верх куцці зразалі і давалі скату патрохі"; "на Каляды семкі елі, на пол плявалі, штоб ураджай быў харошы" (в. Хізаў); "зерне кідалі ў печ, каб была добрай жніўка"; "яшчэ ў першы дзень Каляд, калі ў хаце ёсць дзеці, бацькі кідалі зерне на паліцу, прыгаворваючы: "Радзі, Божа". А дзеці павінны былі

грабсці да сябе гэтае зерне болей" (в. Зяцькавічы).

Разнастайнасцю адрозніваецца дзявочая навагодняя варажба, сімволіка якой звязана з зернем, дамашнімі жывёламі і птушкамі, прадметамі побыту. Варожбы пра шлюб, запісаныя на Кармяншчыне, маюць традыцыйны характар адвольных магічных дзеянняў і заклінанняў. Уражвае і захапляе той паэтычны струмень народнай фантазіі, якім прасякнута імкненне прадбачыць свой лёс, убачыць суджанага ці суджаную, уявіць сваю будучыню, усцешыць свае рамантычныя летуценні. У гэтым можна пераканацца, калі звярнуцца да некаторых з варожбаў, напрыклад: "Бралі мужскія штаны ў зубы і цягалі вакол сваёй хаты тры разы, пры гэтым задумаўшы хлопца" (в. Багданавічы); "па кучкам насыпаюць зерне і выпускаюць курэй. Чыю кучку ўперад ухопіць курыца, тая ўперад пойдзе замуж" (в. Высокае).

Абрад гукання вясны ў мясцовай фальклорнай традыцыі вядомы пад назвай "Луца". Паводле ўспамінаў Т. Сітнікавай з в. Акцяброва, "калі гукалі вясну, вадзілі карагод, пасярэдзіне была дзяўчына (Луца яе называлі) і хлопец, вакол іх жанчыны спявалі песню. Палілі вогнішча, былі ў царкве, потым як мага хутчэй беглі да рэчкі, каб першымі запець: "А ты, Луца, ня Луца, // Па зялёненькай траўцы // Дваранін каня пасе, // Дзеўка ваду нясе".

Своеасаблівасцю абраду гукання вясны на Кармяншчыне з'яўляецца такая цікавая дэталь, што "па вадзе пускалі плыць дошчачку, на якой клалі хлеб і запальвалі свечку", адначасова спявалі:

Пусці, маменька, на ручэй гуляць.
Ой, лі, ой, люлі, на ручэй гуляць.
На ручэй гуляць, селязнёў вітаць.
То не селязень, то не селязень,
То ж не сізенькі, то ж мой міленькі.

Святкуюць на Кармяншчыне і *Юраўскае свята*. Па ўспамінах Н. Андрыянавай з в. Асінаўка, "на Юр'я моляцца, абыходзяць сваю ўсадзьбу з пірагом, на мяжу тыкаюць костачкі, зберажоныя ад Вялікадня, і гавораць: "Юрай, рана адамкай землю, выпускай расу на цёплае лета, на буйное жыта, на ядраністае, на каласістае, гаспадару на здароўе". Рытуал выгану жывёлы на пашу абавязкова суправаджаўся замоўнымі формуламі, напрыклад, "як выганяюць жывёлу ў поле, бяруць хлеба і абносяць яго кругом трубы і гавораць: "Як печ стаіць на месцы, каб і мая жывёла пільнавала сваё месца і хазяіна" (в. Асінаўка); "як я без хвартука не магу абысціся, так каб і ты, мая цясютка, з двара нікуды не выходзіла" (в. Задуб'е). Перад тым, як выгнаць жывёлу на пашу, выконвалі не толькі простыя абрадавыя дзеянні, але і здзяйснялі складаны па сваёй сутнасці рытуал: "У сераду пякуць з цеста хрэст, бяруць тры невялікія каменчакі, нож, замок, бязмен, сякеру, курыныя яйкі, грамнічную пасвяцоную свечку, бяруць з калодзіжа вады, выцягаюць са страхі салому, патом чэраз увесь скот перакідаюць камень і абліваюць вадой. І так тройчы. Патом чэраз ўсё пераганяюць скот" (в. Асінаўка).

Шмат міфалагічных прыкмет і павер'яў захоўваюцца яшчэ і сёння ў памяці жыхароў Кармяншчыны. Напрыклад, панядзелак і пятніца лічацца найбольш спрыяльнымі і шчаслівымі днямі для выгану жывёлы ў поле. Каб засцерагчы кароў ад шкоднага ўздзеяння ведзьмаў, абмывалі іх расой, сабранай на Юр'я (в. Асінаўка), выганялі ў поле і сцёбалі галінкамі пасвенчанай вярбы.

З асабліва радаснымі і светлымі пачуццямі надзеі і чакання сустракалі вяскоўцы *Вялікдзень*, свята, у якім спалучыліся язычніцкія і хрысціянскія элементы. Святочны настрой, хвалюючы ўнутраны стан дарослых перадаваўся ў гэтыя велікодныя дні дзецям, якія "беглі па яйкі, гулялі ў біткі" (в. Ліцвінавічы). Цэласны велікодны абрад мы сёння не можам узнавіць, аднак асобныя рытуалы і абрадавыя дзеянні даволі ўстойліва захоўваюцца мясцовай фальклорнай традыцыяй. Гэта традыцыйнае фарбаванне яек ў чырвоны колер ("красілі столькі, колькі хрэснікаў, унукаў" — в. Высокае), выпяканне велікоднага хлеба "паскі" ("пасадзіла булкі ў печ — не пераступай парога, не топай з хаты ў двор,

пасядзі, каб булкі не патрэскаліся" — в. Высокае), святочная трапеза, гульня ў "біткі", качанне яек у латках, гушканне на арэлях, магічна-спеўны абход двароў моладдзю (валачобнікамі), выкананне імі велічальнай песні "Хрыстос уваскрэс".

На *Тройцу*, паводле ўспамінаў інфарматараў Кармяншчыны, прыносілі ў хату галінкі клёна, рабіны (май), клалі іх таксама на сенавале, прыгаворваючы: "Лажу гэты май, каб сена было на рай". Верылі, калі "май" хутка засохне, то і сена будзе хутка сохнуць (в. Акцяброва). Магічнай лячэбнай сілай, лічылі, валодае траецкая зяляніна, якую выкарыстоўвалі пры захворваннях жывёлы і чалавека. Паводле народных павер'яў, "як граза, ды ў вокнах "май" стаіць, тады Пярун не ўдарыць у хату (в. Хізаў). Не толькі з культам расліннасці была звязана Тройца. Аб тым, што гэта язычніцкае свята, у якім адлюстраваўся культ продкаў, сведчаць наступныя звесткі: "Хадзілі на Троіцу на могілкі, гулялі, пелі песні" (в. Ворнаўка); "у суботу хадзілі на могілкі, паміналі памёршых" (траецкія дзяды — в. Акцяброва). Абрад кумлення, які адбываўся на Тройцу, і адлюстраваў рэшткі старажытных уяўленняў, звязаных з прыняццем дзяўчат у асяроддзе жанчын, з ідэяй прадаўжэння роду, суправаджаўся адпаведнымі песеннымі радкамі:

Ох, кумушкі-галубушкі,
Сястрыцы, вы, мае кумушкі,
Сястрыцы, вы, мае кумушкі,
Як будзіце вы куміцца,
Гукніце вы мяне,
Як будзіце ды куміцца вы,
Гукніце і мяне.
(в. Кляпінская Буда)

У параўнанні з іншымі рэгіёнамі Гомельскай вобласці *купальская традыцыя* на Кармяншчыне адрозніваецца больш устойлівай захаванасцю. Па сведчаннях інфарматараў, раніцай на *Купалле* (23 чэрвеня па ст.ст.) жанчыны і дзяўчаты ішлі ў поле збіраць кветкі, якімі потым, папярэдне пасвенчанымі ў царкве, лячылі розныя хваробы. Паводле ўспамінаў Г. Шведавай з в. Лебядзёўка, "ідом к лесу, к вадзе, палілі кастры, на кастры спальвалі "май", які стаяў на Тройцу ў хатах, ля хат. Гэтым попелам угнойвалі палі, абсыпалі скот, каб яны не хварэлі, не мёрлі". На купальскім кастры спальвалі розныя непатрэбныя рэчы, напрыклад, "зносілі ў адно месца калёсы і распальвалі вогнішча" (в. Бераставец), "цэлы дзень збіралі голле" (в. Задуб'е); "стары каток возьмуць, надзенуць на жэрдку, а пад катком цяпло кладуць, песні пяюць" (в. Высокае).

Народныя павер'і звязваюць купальскую ноч з незвычайным разгулам звышнатуральных сіл, асабліва ведзьмаў, ад якіх можна было ўсяго чакаць. Людзі імкнуліся засцерагчы сябе і дамашнюю жывёлу ад іх шкоднага ўздзеяння. Паводле ўспамінаў А. Савянковай з в. Задуб'е, "у Іванаў дзень ведзьмы (жэншчыны, каторыя з нячыстай сілай знаюцца) малако ў кароў выдоівалі. Каб ад іх засцерагчыся, тапор лажылі ў хляве, дзе скаціна". На якія толькі перасцярогі не адважваліся нашы продкі, каб пазбавіць ведзьмаў іх магічнай шкоднай сілы: прывязвалі "храшчэнскую свечку" да дзвярэй хлява, "торкалі ў дзверы серп ці касу, рабіны ветачку, крапівы, асіны" (в. Асінаўка). У в. Кляпінская Буда "пад Івана Купалу "ганялі ведзьму": трэба было ўкрасць барану і цягнуць яе; хлопцы цягнуць, а дзеўкі следам співаюць. Цягнулі на пагон, куды кароў ганяюць, а потым раскладалі касцёр, палілі барану". Як паведаміла Н. Андрыянава з в. Асінаўка, калі ўжо так здарыцца, што ведзьма ў купальскую ноч адбярэ малако ў каровы, "тады надо чалавеку тому йціць у лес, набраць у мяшок мураўя і етым мураўём увесь выган перасыпаць, штоб усе каровы перайшлі. Тады ўжо ведзьма не будзе есць етага малака, ужо яго назад яна аддасць".

У купальскую ноч розныя бясчынствы здзяйсняюцца самімі ж людзьмі, народная мараль не асуджала такія дзеянні: "На Купалу вароты знімалі, броўны раскачвалі, дажэ цялегу маглі ўвалакчы з дравамі на другі двор" (в. Задуб'е); "ноччу на Купала ўсе скамейкі вакол двара павырываюць і ўсе дровы параскатваюць на дарогу ці куды яшчэ, заборы ламаюць" (в. Дубавіца); "каму прыдуць

прасла паламаюць, а каму — баню па бярвеннях разбяруць" (в. Высокае). Бадай, самым паэтычным момантам у мастацкай сістэме купальскай абраднасці з'яўляліся варожбы аб шлюбе. Цікава, што ў гэтай гульні-прадказанні прымалі ўдзел і хлопцы. Меркавалі, калі кінутыя на ваду вянкі хлопца і дзяўчыны сыдуцца, значыць, яны пажэняцца. Па ўспамінах Г. Шведавай з в. Лебядзёўка, "пускаюць яшчэ вяночкі з запаленымі свечкамі. Куды той вяночак паплывець, там яе суджаны. Калі свечка тухне, дзяўчына памрэ, у які бок паплыве, туды дзеўка замуж пойдзе" (в. Лебядзёўка).

Жніўныя абрады і песні добра захаваліся ў беларусаў, і маюць яны ў розных рэгіёнах мясцовыя адметнасці. Своеасаблівымі дэталямі адрозніваюцца зажынкі ў вёсках Кармяншчыны. Паводле народных уяўленняў, зажынаць павінна была здаровая жанчына, у адваротным выпадку, меркавалі, "калі пойдзе зажынаць бальная жэншчына, з бальной рукой, то ўсе людзі будуць балець: то парэжуць пальцы, то нарываць будуць" (в. Высокае). Нажаўшы першы сноп, на зямлю клалі хлеб-соль і прамаўлялі, звяртаючыся да Споркі (Маці Божай): "Спорка-спешка, кругом постаці аббяжы, нам жаць памажы, хадзі к нам абедаць хлеб, соль, вадзічку" (в. Высокае). Першы нажаты сноп абавязкова забіралі з поля з сабой і ставілі на покуці, затым "яго аббівалі ў царкве, свяцілі зерне" (в. Ворнаўка). У жніўных песнях гучаць матывы цяжкай долі жанчыны, якая сумуе па сваіх бацьках, нешчаслівага сямейнага жыцця, сіроцкія матывы. Дажынкі суправаджаліся выкананнем пэўных абрадавых дзеянняў. Калі дажыналі жыта, напрыклад, у в. Акцяброва, то "сабіралі некалькі каласкоў, звязвалі іх у вузел, пад іх клалі хлеб і соль". Абавязкова выконвалі рытуал праполкі "барады". Апошні нажаты сноп неслі да хаты гаспадара і вешалі яму на шыю вянок з каласоў" (в. Акцяброва). Цікавае міфалагічнае павер'е, звязанае з барадой, давялося запісаць ад Г. Бабковай з в. Вашчанкі: "Хто бараду сарве, таму Бог шчасце прынясе. Таму па начам, каб ніхто не бачыў, маладыя хадзілі і зрывалі бараду".

Вясельная абраднасць Кармянскага раёна складаецца з такіх этапаў, як сватанне, заручыны, зборная субота ("завіванне ёлкі"), пасад, першы дзень вяселля, вянчанне ў царкве, дзяльба каравая, ад'езд нявесты ў дом жаніха, другі дзень вяселля ("браць банкеты"), трэці дзень вяселля ("разгуліны"). Абавязковым першапачатковым абрадавым момантам з'яўлялася сватанне, якое суправаджалася іншасказальнымі дыялогамі і адпаведнымі песнямі, markup рознымі па тэматычнай накіраванасці, эмацыянальнай афарбоўцы, маральна-этычнай праблематыцы. У адной з такіх вясельных песень, якія гучалі на сватанні, адлюстравалася такая рыса беларусаў, як працавітасць і дбайнасць. На просьбу дзяўчыны да маці падрыхтаваць ёй пасаг апошняя адказвае:

Едзь, мая дачушка, без кубла,
Чаму кудзелькі не скубла.
(в. Акцяброва)

У сваты звычайна прыходзілі ўвечары ў суботу бацька маладога, хросны бацька, дзядзька, брат і прыносілі з сабой сала, хлеб, гарэлку. Калі бацькі дзяўчыны згодны былі аддаць яе замуж, то запрашалі сватоў за стол і "першую чарку налівалі з гарэлкі жаніха" (в. Багданавічы). На заручынах бацькі маладых дамаўляліся аб вяселлі. Спачатку пілі гарэлку з боку жаніха, а потым гарэлку маладой. "У гэты час дзяўчына павінна была назваць свякроўку мамай" (в. Акцяброва). На гэтым вясельным этапе нявеста адорвала сватоў і бацькоў жаніха падарункамі. Заручыны ў в. Ворнаўка называлі "суглядамі".

Існуе тэрміналагічная блытаніна паняццяў "запоіны" і "заручыны". У в. Ліцвінавічы заручалі маладых людзей на запоінах. Як адзначыла К. Ігнаценка, "пасля запоін нельга было адмовіцца ад свадзьбы".

На Кармяншчыне вечар, калі збіраліся сяброўкі ў маладой, называлі "зборная субота", "ёлка", "дзявічнік", "завіванне ёлачкі". Паводле ўспамінаў С. Караедавай, "вечарам перад самай

свадзьбай прыходзілі дружкі жаніха і нявесты, ёлку маленькую прыносілі з лесу, ставілі ў булку хлеба, упрыгожвалі цвятамі" (в. Ліцвінавічы). Добра памятаюць жанчыны і вясельныя песні, якімі суправаджалася "завіванне ёлачкі":

Зборніца субота, зборніца,
Збарней усяго Ганначка,
Сабрала сабор у таткаў двор,
Пасадзіла дружачак усіх за стол,
А сама села вышэ ўсех.
(в. Акцяброва)

У адрозненне ад іншых раёнаў Гомельскай вобласці, вясельная традыцыя Кармянскага раёна не вылучалася багаццем і разгорнутасцю каравайнага абраду. Цікавасць уяўляе такі абрадавы момант, як дзяльба каравая. Гэта так званая "сярэбшчына", калі "жаніх ехаў па нявесту з гасцямі, выкуплівалі нявесту, і садзяцца за стол дзяліць каравай. Пры гэтым дараць падаркі і выказваюць пажаданні" (в. Акцяброва).

Каравайныя пажаданні — сведчанне глыбокай народнай мудрасці нашых продкаў, філасофскага характару іх этнапедагагічнай накіраванасці. У лаканічных, іншы раз рыфмаваных радках, гучаць спаконвечныя народныя ўстаноўкі, якія датычаць шчаслівага сямейнага жыцця. Невыпадкова заклікалі ў пажаданнях шанаваць бацькоў, паважаць адзін аднаго, клапаціцца аб прадаўжэнні роду.

"Дару пучок цыбулі, каб не давала свякрусе дулю";

"Дарую табе ніткі, каб не заглядваў на чужыя лыткі";

"Дарую міску капусты, каб у хаце не было пуста, каб у каждым куточку сідзела па сыночку, а пасярод хаткі бегалі дзяўчаткі" (в. Лебядзёўка).

Адметнасцю вяселля на Кармяншчыне з'яўляецца паслявясельная частка, якая вядома пад назвамі "пярэзвы" — першы тыдзень вяселля, калі радня маладых хадзілі адзін да другога ў госці, "банкет", "разгуліны". На другі дзень веселле "спраўлялі ў хаце хроснай маткі нявесты і хроснага бацькі жаніха. Гэта называлася "браць банкеты", на якіх гучалі песні, напрыклад:

Дай каціласа ды зорачка з неба,
Дай упала за дол.
Журылася красная дзяўчонка,
Хто й завядзе дамоў.
— Ой, не журыся, красная дзяўчына.
Я завяду дадому.
(в. Багданавічы)

Трэці дзень вяселля ў в. Багданавічы называўся "разгуліны" і вызначаўся тым, што "госці маладой прыходзілі да яе дому, а госці маладога да яго".

Міфалагічныя ўяўленні і павер'і, звязаныя з вясельнай абраднасцю, яскрава адлюстравалі асаблівасці творчага мыслення нашых продкаў, якія імкнуліся прадказаць, прадбачыць шчасце і заможнасць сямейнага жыцця, прадухіліць няшчасці, засцерагчы маладых ад розных уяўных шкодных сіл. Маладых хвалявала пытанне, хто будзе верхаводзіць у сям'і — муж ці жонка. У сувязі з гэтым народная фантазія нарадзіла павер'е, згодна з якім трэба маладой, калі яе ўпершыню маці жаніха заводзіць у хату, зірнуць у гэты час на 4 куты і сказаць: "Цішы, мышы, я ваш кот". Гэта абазначала, што маладая ў такім выпадку будзе гаспадыняй у доме" (в. Акцяброва). Падчас сустрэчы маладых свякруха павінна быць у пары (з мужам ці з хросным бацькам), што сімвалізавала, што маладыя ў пары пражывуць шмат гадоў (в. Ворнаўка).

Каб шлюб маладых быў моцны, каб яны жылі дружна, не дазвалялася "станавіцца на той палавік, па якому павінна іціць маладая" (в. Задуб'е). У час вясельных гульняў "садзілі маладых на лаўку, і калі жаніх спіхне нявесту, то ён будзе галоўны ў доме" (в. Ліцвінавічы). Жанчыны, у якіх былі маленькія дзеці, імкнуліся сарваць кветкі, якімі ўпрыгожвалі дугу перад тым, як ехаць па маладую" (в. Сямёнаўка).

Шырока распаўсюджаны на тэрыторыі Кармянскага раёна *павер'і, звязаныя з выкліканнем дажджу.* Нашы продкі, каб засцерагчы пасевы ад засухі, здзяйснялі пэўныя магічныя дзеянні, напрыклад, "выходзілі на крыжавую дарогу, бралі плуг і пераворвалі крыж-накрыж, каб дождж пайшоў" (в. Сямёнаўка); "мак ірвалі, у калодзеж кідалі" (в. Задуб'е); "удовы ткалі абудзённік і насілі на крыжавыя дарогі" (в. Высокае); "за-

бівалі і клалі ў лапаць жабу, якую харанілі, як нябожчыка" (в. Задуб'е).

Прыведзены матэрыял дазваляе ўявіць рэгіянальныя і лакальныя характарыстыкі абрадавых з'яў, убачыць, наколькі спецыфічна адметнай з'яўляецца карціна бытавання асобных абрадаў нават у межах аднаго раёна.

В. С. Новак

Друкуецца са скарачэннем па кн.: Крыніц кармянскіх пераэвоны (абрады і песні ў сучасных запісах). Гомель, 2000.

Замовы

У сістэме фальклорных жанраў замовам належыць своеасаблівае месца, што абумоўлена іх архаічнасцю, прыродай, утылітарнай функцыянальнасцю, значэннем і прызначанасцю слова ў гэтых творах. Па свайму глыбіннаму сэнсу замовы ўяўляюць з'яву двухпрыродную, адзіную, цэласную і самагодную канструкцыю, асноўнымі аспектамі якой з'яўляюцца фальклорны і рытуальны. Цесная сувязь слова і дзеяння, узаемадапаўняльнасць і ўзаемазамяняльнасць названых кампанентаў дазваляюць гаварыць пра замовы як з'явы абрадавага характару ў самым шырокім значэнні гэтага паняцця.

Замовы ў народнай традыцыі маюць мноства назваў: "шэпты", "шаптанні", "словы", "малітвы", "чары", "замаўлянні", "нагаворы", да пэўных груп — "прысушкі", "адсушкі". Усе гэтыя назвы нясуць у сабе звесткі пра сэнс, галоўную вызначальную адзнаку твораў, а яе сутнасць — слова, мова, гаварэнне, шаптанне. І не проста слова, а слова таямнічае, слова вешчае, прарочае, якое мае незвычайную сілу.

Апошнім часам назіраецца ўсплеск цікавасці да гэтага віду бытавой культуры, што звязана з многімі фактарамі духоўнага і эканамічнага жыцця. Не апошнюю ролю адыгрываюць прыродазнаўчыя і фізічныя навукі, якія скіравалі ўвагу на магчымасці чалавека, узаемасувязі розных элементаў жывой і нежывой прыроды, што пашырае ўяўленні пра здольнасць узаемадзеянняў на розных узроўнях і прыпадымае завесу над з'явамі, якія раней трактаваліся як забабонныя вымыслы.

Самымі распаўсюджанымі, агульнавядомымі і шматлікімі з'яўляюцца замовы ад хвароб, або лекавыя, якія прымяняліся для дапамогі людзям і хатняй жывёле. Ужо сам пералік хвароб, ад якіх ужываліся замовы, сведчыць пра даволі шырокія веды нашых продкаў у анатоміі і народнай медыцыне, а тэксты замоў з пералічэннем органаў і касцей пацвярджаюць гэта. Менавіта замовы як адна з састаўных частак народнай медыцыны могуць лічыцца папярэднікам медыцыны навуковай. Да таго ж істотным элементам лячэбнай магіі было прымяненне лекавых траў, выкананне пэўных фізічных дзеянняў, якія лічыліся магічнымі, але фактычна аказвалі дабратворнае ўздзеянне, напрыклад масажы, націранне тлушчам і рознымі настоямі траў, змыванне вадою і г.д. Зараз не адмаўляецца роля саміх замоў як гіпнатычнага сродку, што сапраўды мог даваць станоўчы вынік, калі ўлічваць такі немалаважны фактар, якім была шчырая вера і заклінальніка, і самога хворага ў дзейснасць замоўнага рытуалу.

Г.А.Барташэвіч

Пры першым выгане скаціны на пашу

На сінім моры, на лукаморы стаіць дуб какаты, на тых какатах ляжыць белы камень. Як таму камню ніхто не йме, так нашае скацінкі ніхто не йме і не займе: ні гад паўзучы, ні звер бягучы. Я прашу цябе, упрашаю, святое Юр'е, выхадзі са сваімі замкамі, залатымі ключамі. Замкамі затварай сваім слугам няверным зубы, губы першым, сярэднім, пасследнім. Штоб наша скацінка здавалася ў полі мятай, камнем, на даліне купінай, а ў лесе калодай, кустам на дарозе, сокалам. І прашу цябе, святое Юр'е, Міхаіл, умёршага, спасіце, зберажыце нашу скацінку. Благапалучна, спакойна, пака з поля прыйдзе.

Запісана ў в. Барсукі ад Ю.С.Анішчанка, 1914 г.н.

Ад хвароб жывёлы

Памяні, Госпадзі, цара Давыда і ўсю кротасць яго і вялікую памяць яго. Судзяржаў цар Давыд ваду, зямлю і нашы грэшныя душы, судзяржаў жа

чэмерную балезь у скаціны, рыжай шарсьціны, пользу давай і вопух палягай.

На сінім моры на востраві стаіць дуб без макушкі, без вярхушкі, без сучкоў, без ражкоў. На том дубі сядзіць воран — сам чорны, а нос у яго доўгі, ногі красныя, глазы ясныя. Выскрабай жа ты, чорны воран, чэмерную балезь з скаціны, рыжай шарсьціны, із жыл, з пажылак, з касьцей, з машчэй, з буйныя галавы, з ясных воч, выскрабай і пользу давай, і вопух палягай. А ня будзеш выскрабаць, будзець на цябе Гасподзь Бог гразу насылаць, каменнем пабіваць і градам засякаць.

Запісана ў в. Навасёлкі ад Г.І.Кручковай, 1915 г.н.

Ад гадзюкі

На сінім моры-велікаморы стаіць дуб, на тым дубе змяінае гняздо, у тым гняздзе тры змяі-гадзюкі. Первая — Салоха, другая — Лізуха, трэцяя — змяя Курапея, чацвёрты брат, унімі сваіх сясцёр. Ты ўнімі, сакрушы, з тых зубоў вопух не сашлі. Сашлю іх на крутую гару. Прыедзе святы Юры на белым коніку з вострай кап'ёй, з вострай мечай, з колкай шупшынаю, стрыкучай крапіваю. На свентым Здзвіжэнні будзе вам там крушэнне. Будзе сеч і стракаць стрыкучаю крапіваю, норы-пячоры будзе зарываць, наказанні даваць — і падпечныя, і падмежныя, вадзяныя, земляныя.

Запісана ў в. Барсукі ад Ю.С. Анішчанка, 1914 г.н.

Ад вужа

На балоце, на калодзе стаіць вярбовы куст, пад тым кустом сядзяць гады, яды, гадзюкі, вужы, вужаняты. Вужа, вужа, гукай свайго мужа, сваіх вужанят, сваю вужыху і ідзі з раба божага (імя) яд выбірай. Ня будзеш яду выбіраць — будзя архірэй на сівым кані выязджаць і гострым мечам ссякаць, у Ягіпет адпраўляць і на колікі саджаць.

Запісана ў в. Навасёлкі ад А.Нямцовай, 1905 г.н.

Ад шалу

На моры, на лукамор'і ляжыць белы камень, на тым камні сядзіць дзедзька-белабарэдзька. Прашу ж я цябе, дзедзька-белабарэдзька, штоб ты вынімаў шал ад гэтага сабакі-кусакі, забраў дух нячысты. Штоб ад гэтага сабакі-кусакі галава не балела, у вушах не шумела, мазгоў не круціла.

Ад крывацёку

Ехаў Даніла на сівой кабылі і вёз жбан вады. Жбан атарваўся, вада разлілася. Стаіць хатка на курынай ножцы, а ў тэй хатцы старая бабка хлеб запякала і рабу божаму Грышку кроў замаўляла, маладзіка, ветаха і пад поўна.

Ад звіху

Ішоў Ісус Хрыстос цераз калінавы мост, залатою трасцінкаю папіраўся. З етага раба божага (імя) штоб удар улягаўся, і пступ, і звіх, і мах калючы і балючы, і гаручы, і падзіўны, пагаворны, пацешны і смешны, жаласны і радасны. Косць за косць не захадзі, крыві не палі, цела не сушы, цела не сушы, жыл не тамі. Костачка аб костачку чырканісь, на сваё месцечка станавісь.

Запісана ў в. Кляпін ад Г.В.Чураўцавай, 1911 г.н.

Ад зубішча, цемянніка

На моры, на лукамор'і стаіць дуб. Дуб, дуб, вазьмі маладзенца цеменны зуб, а вы, сучышчы, вазьміця зубішчы — це́менныя, е́менныя, бакавыя, гарлавыя, урошныя, смяротныя, вадзяныя, ветраныя, агняныя, палыняныя. А ня возьмеш — з'есць ён цябе з галлём і з карэннем. Выгаварую з буйныя галавы [з русага воласа, з румянага ліца, з ярых глаз, з чорных броў, з дванаццаці жыл, з сараку сустаў і з сараку палусустаўцаў].

Запісана ў в. Барсукі ад Ю.С.Анішчанка, 1914 г.н.

Ад зубнога болю

Калі маладзік, выйсці і сказаць:

—Маладзік маладой, у цябе рог залатой, ці быў ты на свеце?

— Быў.

—Ці баляць у мёртвых зубы?

— Не.

—Ну і няхай у раба Божага (імя) тожэ не баляць. Як гэтаму маладзіку жонкі не мець, так у (імя) зубам не балець.

Запісана ў в. Стараград ад З.П.Тарасенка, 1935 г.н.

Ад ячменю

Ячмень, ячмень, на табе кукіш, ты яго не любіш, бяры тапарок і рубі папярок. Амінь.

Запісана ў в. Асінаўка ад Н.Д.Андрыянавай, 1928 г.н.

Ад скулы

Вячэрнія зоры-зараніцы, божыя памашніцы, памажыце скулу выгаварываць із касці, із машчы, із буйнай галавы, з гаручай крыві, з сіняй жылы, з салодкага мозгу. Думана, пагадана, пацешна, пасмешна, умоўна, прыгаворна. Скула-скулавіца, божая муравіца, сіняя сінявіца, жоўта жаўтавіца, колкая калкавіца, рожа-ражавіца, тут табе не хадзіць, сэрца не знабіць, жывата не пушыць. Ідзі ж на мха, на балата, дзе пташкі не шчабечуць, сабакі не брэшуць, там табе піць-гуляць, ніцыя лозы ламаць, не стаяць ні сходам, ні маладзіком, ні пад поўна.

Выхадзі, скула, выхадзі, скула, выхадзі, скула!

Ад рожы

Станьты, Божа маці, стань ты ў помачы рабы божай раджонай (імя) балячку шаптаці. Дзевяці балячок шаптаці, дзевяці прышчэвок шаптаці, дзевяці безвершніц шаптаці і тры балячкі шаптаці: і залезніца, і вэдова, і разава́. Ты ж, балячко-залезніца, чаго ты садзілася, чаго ты сшумелася: ці ты ад вады, ці ты ад яды, ці ты ад работы, ці ты ад ахоты? Ці ты наспана́, ці ты наслана́, ці ты ветрана́, ці ты нагаворана, ці ты падумана, ці ты пагадана, ці ты жэньска, ці ты мужчыньска? Я цябе цяпер угавараю, я цябе цяпер умаўляю. Годзі ты хадзіла, кось ламала, пад сэрцэ падлягала, пііцесці не давала. Я цябе цяпер угавараю, я цябе цяпер умаўляю. Ты ж, балячко, ты, гарачко, розавая разавуха, васковая васкаўніца, ты сіняя ты сініца, ты вялікая паненко. Сіні на сіні цвет, рожа на рожы, красны на красны, белы на белы цвет. Я лозу капаю, рожу сею, а рожа не ўзышла, а з нагі (ці рукі) балячка пайшла.

Запісана ў в. Зяцькавічы ад З.П. Навуменка, 1896 г.н.

Ад залатніка

На сінім моры-велікаморы стаіць яблыня залатая. Пад той яблыняй карваць цісовая, на той карваці ляжыць маці Прачыстая. Прыйшоў к ёй Ісус Хрыстос: "Маці мая, маці, памажы рабе божай (імя) залатніка падымаці".

У прасветлым полі стаіць дрэва, пад тым дрэвам Адам і Ева. Як Адаму з Евай з раю не выхадзіць, так етаму залатніку па жывату не хадзіць, не бушаваць і крэпка на сваім месцечку стаяць. І вот табе, залатнік, месцечка, залатое крэслечка і на ім прыгаворнаму, пагаданаму, прыглядназму.

Запісана ў в. Барсукі ад Ю. Анішчанка, 1914 г.н.

Ад уроку

Царыца-вадзіца, красная дзявіца, самацветніца і ўгодніца, і хадзіла і гуляла, рыдысь-брыдысь абмывала, круты берагі абрывала, жоўты пяскі прынасіла, бела камення, сыро карэння. Абмывала царэй, каралей і ўвесь народ хрысціяньскі, — абмый раба божага (імя). Угавару я яго ўроцы, стрэшныя і папярэшныя, падзіўныя і пасмешныя, жэньскі і мужскей і дзявоцкіі ліхеі. І ссылаю, і здымаю ўсю печ яго — не сам сабою, Госпадам Богам.

Запісана ў в. Навасёлкі ад Г.І .Кручковай, 1915 г.н.

Ад уроку

Першым разам, Госпаднім часам. Зара-зараніца, Госпадняя памашніца, як ты загараеш, так ты сунімаеш свае ўрокі: бацькіны, маткіны, бабіны, дзедавы, цёткіны, дзядзькіны, мужчынскія, жаноцкія, дзявоцкія, хлапоцкія, сера вока, сіне вока, чорна вока. Выхадзіце, урокі, з касцей, з машчэй, з русых кос, з ярых воч, і з печаней, і з костачак, і з пальчыкаў, і з усіх сустаўчыкаў, і з буйнай галавы, і красныя крыві, з гарачых мазгоў. Ідзіце вы, урокі, на махі, на балоты, на гнілыя калоды. Там вам гулянне, там вам красаванне, а рабу божаму маладзенцу (імя) на паляпшанне. Па еты час, на ету гадзіну, па касці не хадзі, касці не ламі, сэрца не тамі, буйную галаву не крышы, прылюбі, Госпадзі, мой дух.

Ад спугу

Як на сінім моры, на лукаморы, стаіць дуб на двінаццаць какатоў, на двінаццаць каранёў. На тым дубу тры дзявіцы гулялі, не ўмелі яны ткаць, ні прасць, толькі з етага маладзенца пужанне выганяць бацькіна, маткіна, кацінае, гусінае, курынае, сабачае, авечае, чалавечае.

Святая Маць Прачыстая, вывадзі з етага младзенца ету балезнь, вывадзі ўрошную і прыгаворную, пужаную і зліканую. Амінь.

Запісаны ў в. Асінаўка ад Н.Д.Андрыянавай, 1928 г.н.

Ад спугу

Госпаду Богу памолімся і святому вакрасенню паклонімся.

Угаварую, упрашую спуг, спуг бацькоўскі, спуг авечы, спуг чалавечы, спуг сабачы, спуг парасячы ,спуг ветраны, спуг вадзяны. Па касці не хадзі, касці не ламі, жывата не тамі, сэрца не сушы. Дай жа, Госпадзі, гэтай (імя) на помач, з буйнай галавы, з русых валасоў, з чорных брывей, з шырокіх вачэй, з румянага ліца і з шчырага сэрца, і з краснай крыві, з жоўтых касцей, і з ножак, ручак, і з жылля, пажылля. Патуль ты таміла, патуль ты ламіла, пакуль я цябе ні ўгаварыла. Угавараю спуг, спуг бацькоўскі, спуг мацькоўскі, спуг авечы, спуг чалавечы, спуг сабачы, спуг казіны, спуг кацiны, спуг парасячы, спуг ветраны, спуг вадзяны. Угавараю, умаляю, на быстрыя воды пасылаю, на жоўтыя пяскі, на зялёныя травы.

Запісана ў в. Пятравічы ад Т.П.Медзвядзёвай

Ад крыксаў

Госпада Бога ўпрашаю, Прачыстую мамачку на помач жалаю. Крыксы-плаксы ўгавараю, упрашаю з ёлкі зваліцца, на сук прабіцца, на іголкі пакалоцца, на шчэпкі нашчапіцца, а з (імя) адкасніцеся, раннія, вячэрнія, начныя, палуночныя, дзянныя, палудзённыя. Прашу вас, упрашаю выхадзіць вам з буйнай галавы, з русых кос, з ясных воч.

Ад крыксаў

Госпада Бога ўпрашаю, Прачыстую мамачку на помач жалаю.

Зорачка-зарыца, красная дзявіца, мы с табой пасватаемся, пабратаемся. Вазьмі ў мяне дачышчу свайму сынішчу (у залежнасці, каго лечаць, або: вазьмі ў мяне сынішчу сваёй дачышчы), мае крыксы-плаксы, раннія, вячэрнія, начныя, палуночныя, дзянныя, палудзённыя, пужаныя, здрыганыя, уляканыя, крыкслівыя, дрыслівыя, прыглядныя, прыпадныя, пацешныя, пасмешныя, ад старых старух, старыкоў, ад старых старыц, ад маладых маладзіц, ад красных дзявіц, і ўстань, Госпадзі, на помач.

Запісаны ў в. Барсукі ад Ю.С.Анішчанка, 1914 г.н.

Ад крыксаў

Зоры-зарыцы, красныя дзявіцы, вазьміце вы ад етага раба божага (імя) крыксы-плаксы, нашніцы дзянныя, палудзенныя, нашныя, палунушныя, часавыя, мінутныя, урошныя і прыгаворныя, вадзяныя, ветраныя, пужаныя і зліканыя, бацькіны і маткіны, бабіны і дзедавы, цёткіны і дзядзькіны, дзявоцкія і хлапоцкія, жаноцкія, мужчынскія і парабоскія, жалосныя і карысныя, уцешныя і прысмешныя, светавыя і заравыя. Рэчкі пасвяціцца, а рабу божаму (імя) спаць, спаць, спаць.

Бог мой, прылюбі ты дух мой.

Ад ліха-сухотніка

Госпаду Богу памалюся, Маткі Прачыстай пакланюся. Вадзіца-царыца, Гасподняя памашніца, прыбаўляеш ты рэкі і моры, прыбаў, Госпадзі, етаму младзенцу ўсё благапалушнае. Стаяла бабка проціў Госпада Бога, ручкі склаўшы, Госпада Бога ўмаляўшы. Стаяў тын проціў неба на зямлі, ля тога тына ляжаў камень-лацень. На тым камені-лацені ляжала англійская кніга, як тыя кнігі нікому не прачытаць, так у раба Божага младзенца (імя) патайніка, дзянніка, сухотніка, адбытніка, чэмера не бываць, ні ўрошнаму, ні прыгаворнаму, ні пужанаму, ні зліканаму, ні схадоваму, ні маладзіковаму, ні пад поўна, ні перамяжковаму. Амінь.

Запісаны ў в. Асінаўка ад Н.Д.Андрыянавай, 1928 г.н.

Ад падучай хваробы

Першым разам, гасподнім часам Госпаду Богу памалюся, Прачыстай мамачцы пакланюся.

Мужык верабей, жонка вераб'іха, дзеці вераб'яняты, і сам выхадзі, дзяцей вывадзі, падумны, пагадны, і паглядны, і падзіўны, і пасмешны. Штоб па касцях не хадзіў, касці не ламіў, жыл не таміў, крыві не сушыў, цела не пушыў. І сам выхадзі, і дзяцей вывадзі. І па еты час, па еты раз, па ету пару, па раннюю зару. Зара сухая, Бог помачы давае, мой дух пралюбляе. Стань, Божачка, на помач і пралюбі мой дух. Не я ж угаварую, угаварае маць Прачыстая. Маць Прачыстая ішла і (імя) помачы прынясла.

Запісана ў в. Зяцькавічы ад З.П.Навуменка, 1896 г.н.

Ад патайніка

Госпада Бога ўпрашаю, Прачыстую матку на помач жалаю, ад етага раба божага (імя) патайніка атымаю, угавараю, упрашаю, адсылаю за цёмныя лясы, на жоўтыя пяскі, дзе людзі не ходзяць, пташкі не лятаюць, дзе малыя дзеці не гуляюць. Там я яго пакідаю, зялезным тынам загараджую, вострай мечай засякаю, урошнага, прарошнага, падумнага, прыгаворнага, нашнога, палуношнага, дзяннога, палудзённага, пужанага, зраджанага, крыклівага, дрымлівага, вадзянога, землянога, ветранога, агнявога. Прашу яго, упрашаю выходзіць з буйнай галавы, з русых кос, з жывата, з белай касці, з жоўтых мазгоў, з краснай крыві. Па касці табе не хадзіць, касці не ламіць, сэрца не знабіць, сон не знаравіць, крыві не таміць.

Запісана ў в. Барсукі ад Ю.С. Анішчанка, 1914 г.н.

Уступны артыкул і тэксты замоў падрыхтаваны паводле кніг: Замовы. Мн., 1992; Крыніц кармянскіх перазвоны. Гомель, 2000.

Моўныя залацінкі Кармяншчыны

Кармяншчына — гэта край з багатымі народна-песеннымі традыцыямі, мілы сэрцу ўсіх жыхароў любы куточак з непаўторнай прыродай: рэчкамі, маляўнічымі лугамі, балацянкамі, лясамі і палямі. Мясцовыя жыхары захавалі ў сваёй памяці шмат песень, казак, легенд і паданняў пра сваю малую радзіму, сваю Бацькаўшчыну. Яны перадаюць іх з любоўю і пашанай з пакалення ў пакаленне. Вяскоўцы да гэтага часу беражліва ставяцца да сваёй роднай гаворкі. Вядома, што гаворкі тутэйшага рэгіёна адносяцца да вялікай групоўкі сярэднебеларускіх гаворак, якія вызначаюцца адметнымі рысамі. Да іх належаць такія спецыфічныя асаблівасці, як ужыванне дзеяслоўных форм *робя, чытаець* замест робіць, чытае, слоў *етый* (гэты), *сцярагацца* (сцерагчыся) і інш.

Мова жыхароў Кармяншчыны мілагучная і чысцюткая. Яна знаходзілася і знаходзіцца ў полі зроку вучоных Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Ф.Ска-

рыны. Супрацоўнікі кафедр філалагічнага факультэта абследавалі і запісалі тут назвы водных аб'ектаў, якія ў мовазнаўстве называюцца гідронімамі, і склалі своеасаблівы слоўнічак гідронімаў. А вось слоўнікавы запас раёна адлюстраваны ў "Матэрыялах да дыялектнага слоўнічка Гомельшчыны", змешчаных у навуковым зборніку "Беларуская мова", які выдае Гомельскі дзяржуніверсітэт.

Цікавасць выклікаюць шматлікія найменні прадметаў быту і культу. Напрыклад, чаранок — гэта маленькі чыгунок, а чурнік — гаршчочак: "Учора Нюта купіла такі ладны чурнік у лаўцы". Тут можна пачуць і такую назву для гаршчочка, як *чыбрык*: "У чыбрыку трэба сцярагацца варыць, а то шчэ разаб'ем". На каструлю могуць сказаць чынка і рандаль. Рукавіцы з футра атрымалі ў кармянцаў найменне *шубнікі*: "Не забудзь узяць шубнікі, а то рукі ў лясу пакалеюць". А гузік тут называюць шпонкай: "З нітак дзелалі красівыя шпонкі". Паглядзіце, як прыгожа гучыць слова *цюцік* у наступным выслоўі: "Цы то ў шутку, цы не, толькі ў нас плотнікі цюцікам завуць кароткія бярвенні". Ці возьмем вядомае слова *вяроўка*, а на Кармяншчыне — гэта цяг: "Вось цяг ляжыць".

Своеасаблівыя назвы характэрны і для іншых прадметаў і з'яў з жыцця кармянцаў, якія прыжыліся і актыўна выкарыстоўваліся ў мове жыхароў: цапок — палка, кіёк; шкумат — шматок; швая — мера вымярэння; шанок — мера вагі; рызіны — галёшы; рэз — месца (распілоўкі); разніца — бойня; цыбульнік — вецер (пераменны); лясоўка — лясная мыш; лугоўка — вада (шчалачная) і інш. Шмат чаго могуць расказаць нам наступныя найменні: раздво — каляды; растукацца — разабрацца; расходаць — знішчыць; расчарэпаць — размасціць; рум — месца вязання плытоў; роскідзь — разора; падарожнік — грыбапенька; падол — нізіна на лузе; палетнік — сезоннік.

Пэўную цікавасць мае слова *паланкі*, якім называюць адыходы (пры апаленні круп): "Етыя паланкі пойдуць свінням", а таксама начоўкі для апалення круп: "Возьмі паланкі і папалай проса".

Цешыць і традыцыйная песенная творчасць Кармяншчыны, якая глыбокімі каранямі ўвайшла ў быт і культуру раёна. Тут можна пачуць разнастайныя песні: жартоўныя, веснавыя, восеньскія, летнія, зімовыя, сіроцкія. Багата сустракаецца і вясельных песень, у якіх маладую могуць назваць царыцай, любачкай, лябёдачкай, бярозкай, рэдзькай, канапелькай; маладога — белы лебедзь, лябядзёк, князь малады; сватоў — татарамі, каралямі:

Царыца Анечка, царыца.
Серадзі двара крыніца,
Да й за дварочкам пшаніца,
Да й пад вакенцам сад-вінаград.
Як наехалі ж татары,
Пшаніцу-ярыцу стапталі,
А й сад-вінаград выламілі,
Крыніцу-вадзіцу палілі,
З сабой Анечку павялі.

(в. Зяцькавічы)

Толькі ў вуснай народнай творчасці можна так трапна перадаць багацце слова. Толькі ў песнях могуць жаніх і нявеста мець белыя плечыкі і румяна лічка, ехаць чыстым полем пад ясным месячыкам праз лозы густыя, горы крутыя, шырокім мастом да высокіх церамаў з сценамі камянымі, конікам вараненькім, карэтай сіняй. Такія маляўнічыя словы называюцца эпітэтамі. Яны з'яўляюцца ёмістай характарыстыкай шматлікіх фальклорных персанажаў. Эпітэты адыгрываюць важную ролю ў перадачы мясцовага каларыту вясельных песень. Напрыклад: мужыкі пышныя, цёшчанька грозненька, зялёна-зеляненька канапелька, залаты нож, сад-вінаград, пшаніца-ярыца, сталяны (стольны) горад, кароткая ножка, сырая зямелька, бяленькі сахар, ручай мядовы і інш.

Нельга не заўважыць у песнях паралельнага апісання прыроды і жыцця чалавека. Малюнкі прыроды, у аснове якіх ляжаць вобразы ветру, стыхіі, ручая, каліны, канапелькі, удала спалучаюцца з

важнымі этапамі вяселля: агледзінамі, заручынамі, сватаннем:

А ў полі канапелька ды зялёна-зеляненька,
А не даў ветрычак болі пастаяць,
Болі пастаяць, пер'ем пашугаць:
Рассыпаў канапельку на сырую зямельку,
Раздуў пер'ейкі а па чыстым полю.
Ой, наша Полечка ды малада-маладзенька,
А не даў Іванька болі пагуляць,
Болі пагуляць ды косы паплятаць:
Расплёў косухны ды па белых плечыках,
Разліў слёзухны па румяным лічку.

(в. Слабада)

Л.П.Кузьміч

Друкуецца са скарачэннем па кн.: Крыніц кармянскіх пераззвоны. Гомель, 2000.

Народны фальклорны калектыў "Спадчына"

Лепшыя калектывы мастацкай самадзейнасці Кармянскага раёна

Народны фальклорны калектыў "Спадчына". Створаны ў 1989 г. пры Кармянскім раённым Доме культуры. З 1992 г. мае званне народнага. Лаўрэат міжнародных, рэспубліканскіх і абласных фестываляў. Першы кіраўнік калектыву А.Л.Храмянкова. З 1992 г. кіраўніком Л.Р.Хутарцова, хормайстрам Т.В.Антошына. У рэпертуары беларускія народныя песні і танцы.

Аўтэнтычны фальклорны калектыў "Вытокі". Створаны ў 1964 г. пры Барсукоўскім клубе-музеі. Дыпламант абласнога фестывалю "Беларусь — мая песня". Першы кіраўнік калектыву А. Ф. Давыдзенка. Цяпер кіраўніком Л. С. Дудалева. У рэпертуары аўтэнтычныя беларускія народныя і рэгіянальныя песні, танцы і жарты.

Вакальная група "Славянская душа". Створана ў 1997 г. пры Кармянскім раённым цэнтры культуры і вольнага часу. Лаўрэат абласнога фестывалю "Беларусь — мая песня". Кіраўнік групы Л.Р.Хутарцова, музычны кіраўнік А.М.Хашава. У рэпертуары беларускія, рускія і ўкраінскія народныя песні.

Джазавы аркестр "Грант". Створаны ў 2000 г. пры Кармянскім раённым цэн-

тры культуры і вольнага часу. Кіраўнік аркестра А.У.Гаўрыленка. У рэпертуары песні беларускіх і рускіх кампазітараў.

Дзіцячы духавы аркестр. Створаны ў 1987 г. пры Кармянскай раённай музычнай школе. Лаўрэат абласнога конкурсу калектываў духавых інструментаў. Кіраўнік А.І.Цылаў. У рэпертуары песні ваенных гадоў, беларускія народныя, жартоўныя песні, а таксама песні беларускіх кампазітараў.

Фальклорны гурт "Луца". Створаны ў 1964 г. пры Акцяброўскім цэнтры фальклору. Кіраўнік Г.П.Бурдоленка. У рэпертуары беларускія абрадавыя і народныя песні.

Фальклорны калектыў "Весялуха". Створаны ў 1997 г. пры Вынашаўскім сельскім клубе. Кіраўнік Н.М.Пятрова. У рэпертуары абрадавыя, сямейна-бытавыя, народныя песні.

Фальклорны калектыў "Світанак". Створаны ў 1992 г. пры Кароцькаўскім сельскім Доме культуры. Першы кіраўнік калектыву Н.У.Клюкевіч. Цяпер кіраўніком С.С.Дзяменцева. У рэпертуары беларускія народныя і жартоўныя песні.

Фальклорны калектыў "Хізаўчанка". Створаны ў 1975 г. пры Хізаўскім сельскім Доме культуры. Лаўрэат абласных і раённых фестываляў і конкурсаў. Першы кіраўнік калектыву Г.М.Кружаева. Цяпер кіраўніком Н.І.Лапаценка. У рэпертуары беларускія абрадавыя і народныя песні.

З гісторыі раённай бібліятэчнай сістэмы

13 чэрвеня 1918 г. Кармянскі валасны выканком узняў пытанне аб арганізацыі бібліятэкі ў м. Карма. Першая бібліятэка была створана ў былым доме лесапрамыслоўца Гілера. Са Смаленска туды прывезлі больш за 100 экземпляраў кніг.

Восенню 1918 г. П.М.Лепяшынскі стварыў у в. Ліцвінавічы працоўную школу-камуну. З Масквы выхаваўцелі школы-камуны прывезлі з сабой бібліятэку. У 1919 г. школа з часткай вучняў пераехала ў Маскву, а кнігі былі перададзены ў Ліцвінавіцкую хату-чытальню.

У 20-ыя гг. сярод культурна-асветных устаноў вядучае месца належала хатам-чытальням. Тут сяляне знаёміліся з дэкрэтамі і пастановамі савецкай улады. Пры хатах-чытальнях былі адкрыты школы ліквідацыі непісьменнасці, дзе праводзіліся сходы, гутаркі і лекцыі на розныя тэмы, выстаўкі, канцэрты, ставіліся спектаклі.

Адной са старэйшых бібліятэк у раёне лічыцца Хізаўская, якую адкрылі ў 1923 г. у былым панскім доме. Кніжны фонд яе складаў усяго 40 экземпляраў кніг. Першым загадчыкам бібліятэкі быў вопытны прапагандыст і арганізатар з в. Хляўно Гаварушкін. У 1929 г. кніжны фонд Хізаўскай бібліятэкі ўжо складаў 2000 экземпляраў.

У 1935 г. у Карме ў новым Доме культуры, што быў пабудаваны па вуліцы Абатурава, адкрылася раённая бібліятэка. Загадчыцай яе працавала Леўшунова — адукаваны і вопытны бібліятэкар.

У 1939 г. у раёне налічвалася 20 клубаў, 16 хат-чытальняў, 18 бібліятэк з кніжным фондам 9719 экземпляраў.

Пасля вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у канцы 1944 г. Кармянскі райвыканком прыняў рашэнне аб адкрыцці раённай бібліятэкі. Пачаўся збор кніг у насельніцтва. Было сабрана 300 кніг. А 2 студзеня 1945 г. бібліятэка пачала сваю працу. З Мардовіі з Саранскай рэспубліканскай бібліятэкі ў Кармянскую раённую бібліятэку пачалі паступаць кнігі.

У 1947 г. у раёне ўжо мелася 16 хат-чытальняў, якія да 1960 г. былі пераўтвораны ў бібліятэкі пры сельскіх клубах.

У 1953 г. была адкрыта дзіцячая раённая бібліятэка з кніжным фондам 1500 экземпляраў.

У 1960 г. у раёне працавалі раённая бібліятэка, дзіцячая раённая бібліятэка,

12 самастойных, 19 клубных, 3 калгасныя, 3 прафсаюзныя бібліятэкі з агульным кніжным фондам 126 158 экземпляраў. Насельніцтва абслугоўвалі 39 бібліятэкараў.

У 1968 г. усе клубныя бібліятэкі былі рэарганізаваны ў самастойныя. У раёне мелася 28 сельскіх бібліятэк з агульным кніжным фондам 1295 экземпляраў.

У 1945 – 1969 гг. раённай бібліятэкай загадвала Н.П.Антоненка. Пасля яе нядоўгі час загадчыцай з'яўлялася Г.В.Гладзінава (1969 – 1970).

У 1978 г. была створана цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма. Раённую бібліятэку рэарганізавалі ў цэнтральную раённую бібліятэку, а 31 сельскую бібліятэку – у філіялы. Агульны кніжны фонд цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы склаў 300,1 тыс. экзеплябраў. Агульная колькасць чытачоў дасягнула 18 136.

У маі 1984 г. цэнтральная бібліятэка пераехала ў новы будынак на вуліцу Кастрычніцкую. Яе плошча склала 300 квадратных метраў.

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС і адсяленнем вёсак былі ліквідаваны Воеўская, Гарадоцкая, Кляпінская, Косальская, Ліцвінавіцкая дзіцячая, Рэвуцкая, Руднянская, Струменская і Хляўнянская сельскія бібліятэкі (філіялы).

У цяперашні час у Кармянскую цэнтралізаваную бібліятэчную сістэму ўваходзіць 20 бібліятэк: 1 цэнтральная, 1 дзіцячая, 18 сельскіх. Кніжны фонд складае 200 800 экземпляраў. У штаце бібліятэчных супрацоўнікаў значыцца 32 чалавекі, сярод якіх 4 з вышэйшай, 19 з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.

У 1970 – 2001 гг. загадчыцай раённай бібліятэкі, а потым дырэктарам цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы працавала С.М.Палевіч, з верасня 2001 г. дырэктар ЦБС Т.Л.Егерава.

Больш за 30 гадоў жыцця аддалі бібліятэчнай справе яе ветэраны: Н.П.Антоненка, А.Ф.Давыдзенка, Н.М.Касцючэнка, У.С.Куц, П.І.Лазарэнка, М.А.Марачкоўская, С.М.Палевіч, Н.І.Сіманкова, Г.С.Супічэнка, Л.Я.Сяргеенка, С.У.Цімашэнка, В.П.Якутовіч.

Распрацавана і рэалізуецца ў жыццё праграма "Жывая памяць Кармяншчыны". Асноўнымі накірункамі дзейнасці бібліятэк у гэтай сувязі стала вывучэнне гісторыі роднага краю, адраджэнне і запіс нацыянальна-культурных традыцый сваёй мясцовасці, напісанне летапісаў вёсак і бібліятэк. Збор матэрыялаў вядзецца пад рубрыкамі: "Краязнаўства Кармяншчыны", "З сівой мінуўшчыны", "Імі ганарыцца наш раён", "Ішоў салдат дарогамі вайны", "Народныя абрады, звычаі, святы нашых продкаў" і інш.

Нямала гадоў пры цэнтральнай раённай бібліятэцы дзейнічае літаратурная гасцёўня "Спадчына", дзе адбыліся сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі Міхасём Башлаковым, Алай Канапелька, Іванам Клімянковым, Валянцінай Куляшовай, Пятром Прыходзькам, Васілём Ткачовым, рускім пісьменнікам Юрыем Фатневым і інш.

П.І.Лазарэнка

З гісторыі раённай газеты

Раённая газета на Кармяншчыне пачала выдавацца з 1 студзеня 1932 г. Называлася яна "Калгаснік Кармяншчыны" і выходзіла з рознай перыядычнасцю на беларускай мове. З № 59 1938 г. да чэрвеня 1941 г. і ў кастрычніку 1943 г. – красавіку 1962 г. мела назву "Авангард".

Адным з першых рэдактараў газеты з'яўляўся М.К.Ждановіч, які ўзначальваў рэдакцыю ў перадваенныя гады. Сярод супрацоўнікаў райгазеты таго часу быў В.П.Калацілкін, які пайшоў на фронт і геройскі загінуў у баях з фашыстамі.

У кастрычніку 1943 г., у ходзе вызвалення раёна ад фашысцкіх захопнікаў, выпуск газеты быў адноўлены. Друкаваўся "Авангард" у мясцовай друкарні ў Карме на двух палосах фарматам аркуша 205 х 290. Рэдактарам яе да 20 студзеня 1944 г. працавала Г.П.Ус.

З 20 студзеня па 1 мая 1944 г. газета выходзіла з грыфам у канцы нумара "Рэдакцыйная калегія". З 1 па 25 мая таго ж года раёнку падпісваў у свет часова выконваючы абавязкі рэдактара В.Ф.Маеўскі. З 25 мая 1944 г. па 1946 г. в.а. рэдактара быў І.М.Майсейкаў. Некаторы час у 1946 г. газету рэдагаваў Р.Атрашкоў.

У 1947 г. "Авангард" падпісваў да друку М.Ф.Капельчык, адказнымі сакратарамі былі Х.Н.Мерхасіна, а затым — В.К.Ушаў. У 1954 г. калектыў рэдакцыі ўзначальваў В.Дз.Шыбінскі. З 5 лютага 1955 г. да 23 чэрвеня 1961 г. рэдактарам працаваў В.К.Ушаў. Газета ў гэты перыяд стала чатырохпалоснай з трохразовым выхадам на тыдзень.

З 1961 г. да моманту скасавання раёна (красавік 1962 г.) на чале "Авангарда" быў У.В.Штапенка. Пасля ўзнаўлення Кармянскага раёна, са студзеня 1967 г., газета выходзіць на чатырох палосах фарматам 600 х 400 пад сваёй цяперашняй назвай "Зара над Сожам". Асвятляе пытанні грамадска-палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця.

У 1967—2000 гг. рэдактарамі газеты працавалі А.П.Нікіценка, В.М.Філіянаў, Н.М.Салодкая, Р.Ф.Ганжураў, Т.А.Волкава, з 2001 г. рэдактарам А.А.Ушаў.

Газета мае свае багатыя традыцыі. У розныя гады сярод яе штатных супрацоўнікаў, а таксама рабселькораў былі знакамітыя людзі, пачыналі свой шлях здольныя і таленавітыя журналісты, вядомыя пісьменнікі, такія як сатырык В.Ф.Маеўскі, празаік і драматург В.Ткачоў, паэт М.Янчанка.

Р.Ф.Ганжураў

Мемарыяльны музей П.М.Лепяшынскага

Адкрыты ў в. Ліцвінавічы 12.3.1968. Філіял Гомельскага абласнога краязнаўчага музея. Створаны на базе экспанатаў з маскоўскай кватэры Лепяшынскага і дакументаў з Музея Рэвалюцыі СССР у Маскве. Мае 5 экспазіцыйных залаў (пл. экспазіцыі 600 м^2), 1,4 тыс. экспанатаў (1985). Дакументы і матэрыялы расказваюць пра жыццёвы шлях прафесійнага рэвалюцыянера, партыйную, дзяржаўную і педагагічную дзейнасць Лепяшынскага, пра стварэнне ім Ліцвінавіцкай доследна-паказальнай працоўнай школы-камуны ў 1918 г., пра яго сустрэчы з У.І.Леніным. У экспазіцыі поўны збор твораў Леніна, пратаколы II з'езда РСДРП пад рэдакцыяй Лепяшынскага, падборка копій газеты "Искра", творы М. Салтыкова-Шчадрына з прадмовамі Лепяшынскага, асабістыя яго рэчы, літаратурныя творы і нацюрморты, кнігі, урадавыя ўзнагароды, захоўваецца дакументальны фільм аб ім "Барацьба і творчасць".

І.Г.Якуш

Друкуецца па кн.: Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. Т. 3. Мн., 1986. С. 236.

З гісторыі стварэння музея

У 1954 г. настаўнік мясцовай сярэдняй школы І.Г.Якуш і былы старшыня калгаса імя Лепяшынскага П.А.Нядбайлаў наведаліся да жонкі Панцеляймона Мікалаевіча, Вольгі Барысаўны, у Маскву. Яны падзяліліся з ёй думкамі аб стварэнні ў Ліцвінавіцкай школе мемарыяльнага музея П.М.Лепяшынскага.

Вольга Барысаўна аднеслася да прапановы з вялікай увагай. Яна перадала для будучага музея асабістыя рэчы Панцеляймона Мікалаевіча і многа дакументаў. Гэтыя экспанаты і паклалі пачатак стварэнню музея.

Для музея быў адведзены пакой. Пачаўся карпатлівы пошук матэрыялаў. Быў створаны савет музея. У састаў яго ўвайшлі настаўнікі і вучні школы, прадстаўнікі партыйнай арганізацыі. Савет музея узначаліў І.Г.Якуш, гісторык, краязнаўца. Члены савета напісалі пісьмы ў Музей Рэвалюцыі ў Маскву, у музей "Петрапаўлаўская крэпасць", дзе П.М.Ле-

пяшынскі быў вязнем, у музей сяла Шушанскае, дзе Панцеляймон Мікалаевіч разам з У.І.Леніным знаходзіўся ў ссылцы, у абласны краязнаўчы музей г. Магілёва, дзе ён вучыўся ў гімназіі, у музей г. Пскова, дзе ў свой час Лепяшынскі быў агентам газеты "Искра", у Оршу, дзе ён працаваў незадоўга да пачатку Кастрычніцкай рэвалюцыі, а таксама ў іншыя месцы, звязаныя з жыццём і дзейнасцю палымянага рэвалюцыянера.

За некалькі год накапілася мноства матэрыялаў. З Масквы з дома Лепяшынскіх была дастаўлена абстаноўка кватэры — шафа, камода, сталы, крэслы, радыёпрыёмнік, грамафон, канторка, за якой працаваў Панцеляймон Мікалаевіч, мноства іншых аб'ёмістых рэчаў. У 1969 г. для музея быў выдзелены другі паверх аднаго з будынкаў школы.

Зараз музей складаецца з двух пакояў, якія нагадваюць маскоўскую кватэру Панцеляймона Мікалаевіча, трох экспазіцыйных залаў, дэманстрацыйна-лекцыйнай залы, дзе ёсць стацыянарная кінаўстаноўка для дэманстрацыі дакументальна-хранікальных кінафільмаў. Тут часта дэманструецца дакументальная лента "Барацьба і творчасць", у якой расказваецца аб рэвалюцыйнай дзейнасці У.І. Леніна, П.М. Лепяшынскага, Г.М. Кржыжаноўскага, слайды, атрыманыя з ГДР з музея г. Ляйпцыга, дзе выдавалася газета "Искра", — фотакопія яе першага нумара і іншыя каштоўныя матэрыялы.

Музей — цэнтр палітыка-выхаваўчай работы ў раёне. На аснове яго матэрыялаў студэнты пішуць рэфераты, курсавыя работы і дыпломныя.

Музей наведала ўжо звыш 10 тыс. чалавек. Тут пабывалі дэлегацыі з розных абласцей нашай краіны і іншых рэспублік. Яго наведалі актывісты-кааператары з Аргенціны, экскурсанты з афрыканскіх краін — Намібіі, С'ера-Леона, Уганды, прадстаўнікі Манголіі.

Музею прысвоена званне народнага. Кожны дзень гасцінна расчынены яго дзверы для наведвальнікаў.

С.Жукаў

Матэрыялы раздзела "З матэрыяльнай і духоўнай спадчыны" падрыхтаваў М.З.Башлакоў.

З гісторыі населеных пунктаў

АКЦЯБРОВА, вёска, цэнтр сельсавета і камунальнага сельгаспрадпрыемства "Акцяброва". У 1765 г. вядома як цэнтр каралеўскага маёнтка Быча ў Вялікім княстве Літоўскім. У другой палове XIX ст. у Быхаўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1871 г. пабудавана драўляная праваслаўная Георгіеўская царква. У 1880 г. — сяло Старая Быч: 77 двароў, 495 жыхароў, цэнтр воласці Быхаўскага павета Магілёўскай губерні. Размяшчаліся валаснае праўленне, ветраны млын, праваслаўная царква, хлебазапасны магазін. Распаўсюджаны адыходны промысел, ім займаліся 32 двары, даход — 17—22 рублі, бандарным — 10 двароў, даход — 15—20 рублёў, колавым — даход — 15—20 рублёў. Бычанскі праваслаўны прыход аб'ядноўваў 2805 прыхаджан, царкве належала 35 дзес. зямлі. На пачатку XX ст. — сяло, цэнтр воласці Быхаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — 136 двароў, 1379 жыхароў, 1374 дзес. зямлі, якая належала Старабычанскай сельскай грамадзе. У 1918 г. сялянскія дзеці наведвалі працоўную школу I ступені за 0,5 км у вёсцы Новая Быч. З 20.8.1924 г. — цэнтр Бычанскага сельсавета Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 177 двароў, 948 жыхароў (445 муж., 503 жан.). Размяшчаліся 2 ветраныя млыны, арцель бондараў "Красны кустар", крупадзёрка, колавая і кравецкая майстэрні, працавала кузня. Створаны калгас "2-ая пяцігодка". У Вялікую Айчынную вайну ў вёсцы знаходзіўся Штаб 1-га Беларускага фронту. 30 ліпеня 1964 г. вёска Старая Быч і вёска Новая Быч атрымалі новую назву — "Акцяброва". З 25.3.1965 г. — цэнтр Акцяброўскага сельсавета і калгаса "Зара ка-

мунізму". У 1969 г. 353 двары, 1189 жыхароў. Сярэдняя школа, 2 клубы, бібліятэка, бальніца, аддзяленне сувязі.

На 1.1.2002 г. — 253 двары, 616 жыхароў. Сярэдняя школа, дзіцячы сад, аддзяленне сувязі, урачэбная амбулаторыя, Дом культуры, бібліятэка, 2 магазіны.

АРЭШНІК, пасёлак у Стараградскім сельсавеце. Узнік у пачатку XX ст. З 20.8.1924 г. — у Задубскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 17 двароў, 80 жыхароў (41 муж., 39 жан.). З 16.7.1954 г. — у Стараградскім сельсавеце. Не існуе.

АСІНАЎКА, пасёлак у Лужкоўскім сельсавеце. У 20-ых гг. XX ст. вядома пад назвай "Асіннік". З 20.8.1924 г. — у Расохскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Згодна з перапісам насельніцтва 1926 г. — 25 двароў, 147 жыхароў (72 муж., 75 жан.). З 30.6.1966 г. у Лужкоўскім сельсавеце Чачэрскага раёна, з 30.7.1966 г. у Кармянскім раёне. Не існуе.

БАГДАНАВІЧЫ, вёска ў Кароцькаўскім сельсавеце. У канцы XVII ст. адносілася да Чачэрскага замка і была вядома як баярскае паселішча ў Чачэрскім старостве Вялікага княства Літоўскага. У 1726 г. налічвалася 5 дымоў. Баяры плацілі падатак пад назвай "гіберна" Чачэрскаму замку, апрача гэтага неслі розныя павіннасці: будавалі і рамантавалі масты, у якасці паліцэйскіх з'яўляліся на кірмашы і павінны былі мець добрую зброю і каня. У XIX ст. вядома як ваколіца ў складзе фальварка Багданавічы, маёмасць памешчыкаў Хілінскіх. У 1816 г. налічвалася 36 рэвізскіх сялянскіх душ. У 1858 г. — фальварак Багданавічы (23 рэвізскія сялянскія душы), маёмасць памешчыцы Маргарыты Хілінскай (удавы палкоўніка Хілінскага); ваколіца (35 рэвізскіх сялянскіх душ) належала памешчыку адстаўному штабс-капітану і кавалеру Антону Хілінскаму. У 1884 г. — ваколіца, 151 двор, 606 жыхароў, у Расохскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Меліся хлебазапасны магазін і праваслаўная царква. Асноўным заняткам вяскоўцаў было земляробства, якое яны спалучалі з промысламі: кравецкім, даход — 10 рублёў, ганчарным — 18 рублёў, возніцкім — 10 рублёў. На пачатку XX ст. пад назвай "Багданавічы" было 2 населеныя пункты — ваколіца і вёска. У 1909 г. была адчынена земская школа. У 1909 г. — вёска, 31 двор, 182 жыхары, 125 дзес. зямлі, належала вясковай сельскай грамадзе; ваколіца, 178 двароў, 876 жыхароў, 1082 дзес. зямлі належалі мяшчанскаму праўленню. З 20.8.1924 г. — у Кароцькаўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. На базе дарэвалюцыйнай школы была створана працоўная школа I ступені, якая размяшчалася ва ўласным будынку і ў наёмным. Навучанне вялося на беларускай мове. У 1924 г. было 126 вучняў. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 259 двароў, 1150 жыхароў (557 муж., 409 жан.). Існавалі сталярная майстэрня, ветраны млын, воўначасальня. Створаны калгас "Звязда", мелася кузня. Зараз у складзе КСУП "Саўгас "Багданавічы".

На 1.1.2002 г. 72 двары, 195 жыхароў. Клуб, бібліятэка, магазін.

БАРАВАЯ БУДА, вёска ў Струкачоўскім сельсавеце, цэнтр камунальнага сельгаспрадпрыемства "Саўгас імя Чапаева". З пачатку XVIII ст. у складзе маёнтка Меркулавічы ў Меркулавіцкім старостве Рэчыцкага павета ў Вялікім княстве Літоўскім. У 1720 г. — 17 дымоў, 7 валок, прыватная ўласнасць паноў Марціна і Міхайлы Міхалкоўскіх. З 1793 г. вяскоўцы адносіліся да Меркулавіцкага прыхода і наведвалі Узнясенскую царкву. У 1884 г. — 67 двароў, 448 жыхароў, у Меркулавіцкай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Меліся хлебазапасны магазін, ветраны млын. У вёсцы былі распаўсюджаны промыслы: ганчарны, даход — 45 рублёў, рамізніцкі — 20 рублёў, кравецкі — 15 рублёў, кавальскі — 25 рублёў. На пачатку XX ст. у Меркулавіцкай воласці Магілёўскай губерні. У 1907 г. адчынена земская школа. У 1909 г. — вёска, 111 двароў, 794 жыхары, належала мясцовай сельскай грамадзе, якая валодала 1129 дзес. зямлі. У 1918 г. на базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа I ступені. У 1923 г. яна

размяшчалася ў фальварку Лесавая Буда: двухпавярховы крыты гонтай будынак нацыяналізаваны ў гэтым жа годзе. З 20.8.1924 г. — цэнтр Баравабудскага сельсавета Кармянскага раёна Магілёўскай губерні, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу 1926 г. — 83 двары, 432 жыхары (214 муж., 218 жан.). Побач размяшчаліся Баравабудскія хутары, 12 двароў, 70 жыхароў (31 муж., 39 жан.). Меліся кравецкая майстэрня, ветраны млын, 2 кузні, створаны калгас "Землеўпарадкавальнік". З 16.7.1954 г. сельсавет ліквідаваны, яго тэрыторыя далучылася да Струкачоўскага сельсавета. У 1970 г. 167 двароў, 586 жыхароў.

На 1.1.2002 г. 189 двароў, 501 жыхар. Сярэдняя школа, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, Дом культуры, бібліятэка, сталовая, аддзяленне сувязі, магазін.

БАРАВАЯ ГЛІНКА, вёска ў Залатамінскім сельсавеце. У другой палове XIX ст. у Бычанскай воласці Быхаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1884 г. — 31 двор, 127 жыхароў. 7 двароў займаліся адыходным промыслам, даход — 17—22 рублі, бандарным, даход — 10—15 рублёў. Вёска адносілася да праваслаўнага Хляўнянскага прыхода Праабражэнскай царквы. На пачатку XX ст. вёска ў Бычанскай воласці Быхаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — 38 двароў, 349 жыхароў, 397 дзес. зямлі, належалі вясковай грамадзе. З 20.8.1924 г. у Хляўнянскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Вясковыя дзеці наведвалі працоўную школу I ступені за 4 км у вёсцы Хляўно. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 50 двароў, 296 жыхароў. Размяшчалася шавецкая майстэрня. З 2.9.1975 г. у Залатамінскім сельсавеце, у складзе саўгаса "Руднянскі" (цэнтр в. Залатаміно).

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС вёска адселена.

БАРСУКІ, вёска, цэнтр сельсавета і камунальнага сельгаспрадпрыемства "Саўгас імя Валадарскага". У XIX ст. вядома як прыватная ўласнасць памешчыкаў Случаноўскіх. У 1858 г. — вёска, 175 рэвізскіх сялянскіх душ (86 муж., 89 жан.), маёмасць памешчыка Захарыя Случаноўскага ў Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1880 г. — 63 двары, 459 жыхароў. Размяшчаўся хлебазапасны магазін. Частка жыхароў апрача земляробства займалася промысламі: ганчарным — 39 двароў, даход — 18 рублёў, кравецкім — 10 рублёў. На пачатку XX ст. вёска ў Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні — 100 двароў, 727 жыхароў, належала сельскай грамадзе, якая валодала 830 дзес. зямлі. У 1924 г. вясковыя дзеці наведвалі працоўную школу I ступені ў вёсцы Сырская Буда. З 20.8.1924 г. — цэнтр сельсавета Кармянскага раёна Магілёўскай вобласці, з 20.2.1938 г. — гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — вёска Барсукі Вялікія, 71 двор, 374 жыхары (191 муж., 183 жан.). Побач вёска Барсукі Малыя, 25 двароў, 124 жыхары (56 муж., 86 жан.). Створаны калгас імя Калініна, працавалі кузня, ветраны млын, воўначасальня, конная малацілка, шавецкая майстэрня. У час Вялікай Айчыннай вайны са жніўня 1941 па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

На 1.1.2002 г. 179 двароў, 540 жыхароў. Сярэдняя школа, дзіцячы сад, урачэбная амбулаторыя, комплексны прыёмны пункт, аддзяленне сувязі, Дом культуры, бібліятэка, кафэ, сталовая, магазін.

БЕЛЬ, пасёлак у Струменскім сельсавеце. У 20-ых гг. XX ст. хутар у Струменскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — хутар, 7 двароў, 44 жыхары (22 муж., 22 жан.). Пазней — пасёлак у складзе калгаса "Радзіма" (цэнтр в. Струмень). Не існуе.

БЕРАСТАВЕЦ, вёска ў Стараградскім сельсавеце. У другой палове XIX ст. у Доўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1858 г. — вёска фальварка Цераспаль, прыватная ўласнасць памешчыцы Ванды Манкевіч (207 сялянскіх душ). У 1884 г. — 54 двары, 357 жыхароў. Ганчарным промыслам займаліся 8 двароў, даход —

17 рублёў. Размяшчаўся хлебазапасны магазін. На пачатку XX ст. вёска ў Доўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — 91 двор, 660 жыхароў, належала вясковай сельскай грамадзе, якая валодала 783 дзес. зямлі. У 1909 г. адчынена земская школа, якая дзейнічала да 1914 г. З 20.8.1924 г. — вёска ў Хізаўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. На базе дарэвалюцыйнай школы была створана працоўная школа I ступені, якая размяшчалася ва ўласным будынку. Навучалася 55 дзяцей з вёскі і 8 — з урочышча Тараcполе. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 100 двароў, 596 жыхароў (292 муж., 304 жан.), меліся малацільная машына з конным прыводам, воўначасальня, 2 ветраныя млыны, санная, шавецкая, 2 кравецкія, белашвейная майстэрні. Створаны калгас “Зара Беларусі”. У 1935 г. працавалі конная крупарушка, 2 ветраныя млыны, кузня. З 16.7.1954 г. — у Стараградскім сельсавеце. Зараз у складзе КСУП “Саўгас “Багданавічы” (цэнтр в. Хізаў).

На 1.1.2002 г. 109 двароў, 196 жыхароў. Магазін.

БЕРВЯНЫ, вёска ў Кароцькаўскім сельсавеце. На пачатку XX ст. у Кармянскай воласці Магілёўскай губерні. З 20.8.1924 г. пасёлак у Кароцькаўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Пасялковыя дзеці наведвалі працоўную школу I ступені за 2 км у вёсцы Сапажкі. У 1924—1925 гг. навучалася 16 пасялковых дзяцей. Згодна перапісу насельніцтва 1926 г. — 33 двары, 146 жыхароў (72 муж., 74 жан.). З 25.12.1962 г. — вёска ў Рагачоўскім раёне, з 6.1.1965 г. у Чачэрскім раёне, з 30.7.1966 г. у Кармянскім раёне ў складзе саўгаса “Кароцькі” (цэнтр в. Кароцькі).

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС адселена.

БУРНЫ, пасёлак у Кароцькаўскім сельсавеце. З 20.8.1924 г. — пасёлак у Куракаўшчынскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 15 двароў, 76 жыхароў (36 муж., 40 жан.). З 25.12.1962 г. — у Рагачоўскім раёне, з 19.9.1963 г. — у Кармянскім раёне ў складзе калгаса “Перамога”. 22 снежня 1966 г. пасёлак злучыўся з вёскай Старая Зенькавіна.

БЯЛЁЎ, вёска ў Барсукоўскім сельсавеце. На пачатку XX ст. у Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — фальварак Бялёў Малы, 2 двары, 21 жыхар, 246 дзес. зямлі, належаў памешчыку Быкоўскаму. Побач размяшчаўся другі фальварак пад назвай “Бялёў”, 1 двор, 9 жыхароў, належаў нашчадкам Г. Случаноўскага. З 20.8.1924 г. — у Барсукоўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — Бялёў Стары, хутар, 8 двароў, 32 жыхары (21 муж., 11 жан.). Побач знаходзіўся пасёлак Бялёў Новы, 13 двароў, 72 жыхары. Пасялковыя і хутарскія дзеці наведвалі школу за 3 км у вёсцы Навасёлкі. Створаны калгас імя Валадарскага, мелася кузня. Зараз вёска ў складзе КСУП «Саўгас імя Валадарскага» (цэнтр в. Барсукі).

На 1.1.2002 г. 8 двароў, 20 жыхароў.

БЯРОЗАЎКА, вёска ў Каменскім сельсавеце. У канцы XVII — першай палове XVIII ст. належала Чачэрскаму замку ў Чачэрскім старостве Вялікага княства Літоўскага. Паводле інвентару 1704 г. у вёсцы налічваўся адзін дым і 22—24 валокі, у 1726 г. 3 дымы. Сяляне плацілі чынш 15 грошаў. У 1765 г. — 16 гаспадарак, гадавы даход — 190 злотых. На пачатку XX ст. у Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні; 68 двароў, 466 жыхароў, 687 дзес. зямлі, якая належала вясковай сельскай грамадзе. У 1905 г. пабудаваны з дрэва ветраны млын — помнік традыцыйнага прамысловага дойлідства Беларусі. У 1909 г. адчынена земская школа, якая размяшчалася ў наёмным будынку. З 20.8.1924 г. — вёска ў Каменскім, з 5.8.1929 г. у Курганскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 83 двары, 463 жыхары, побач размяшчаўся Бярозаўскі кардон, 2 двары, 5 жыхароў, ветраны млын, воўначасальня. Зараз у складзе калгаса “Кастрычнік” (цэнтр в. Кучын).

На 1.1.2002 г. 33 двары, 62 жыхары. Магазін.

ВАЗНЯСЕНСК, пасёлак у Ліцвінавіцкім сельсавеце. Узнік у пачатку XX ст. З 20.8.1924 г. у Ліцвінавіцкім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Пасялковыя дзеці вучыліся ў чатырохгадовай школе імя П. М. Лепяшынскага, што знаходзілася за 3 км. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 17 двароў, 84 жыхары (38 муж., 46 жан.). Побач размяшчаліся Вазнясенскія хутары, 4 двары, 26 жыхароў. Зараз у складзе калгаса імя Лепяшынскага (цэнтр в. Ліцвінавічы).

На 1.1.2002 г. 13 двароў, 25 жыхароў.

ВАЛЫНЦЫ, вёска, цэнтр сельсавета. У XVIII ст. у складзе Чачэрскага староства Вялікага княства Літоўскага, у 1765 г. — маёмасць земскага суддзі Рэчыцкага павета пана Маліноўскага. У другой палове XIX ст. у Нова-Ельнянскай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1884 г. налічвалася 42 двары, 264 жыхары, частка вяскоўцаў займалася адыходным промыслам (сплаў лесу, гнанне дзёгцю), кавальскім, даход — 40 рублёў. Вяскоўцы з'яўляліся прыхаджанамі праваслаўнага Кляпінскага прыхода, наведвалі Пакроўскую царкву. На пачатку XX ст. вёска Нова-Ельнянскай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні: 66 двароў, 519 жыхароў, 473 дзес. зямлі, якая належала вясковай сельскай грамадзе. З 20.8.1924 г. — цэнтр Валынцаўскага сельсавета Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Згодна з перапісам насельніцтва 1926 г. — 93 двары, 539 жыхароў (260 муж., 279 жан.). Створаны калгас "Хваля рэвалюцыі", меліся кузня, воўначасальня. З 15.7.1935 г. да 27.9.1938 г. — мястэчка. У 1970 г. 168 двароў, 535 жыхароў. Цэнтр саўгаса "Валынцы". Васьмігадовая школа, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, магазін.

На 1.1.2002 г. 79 двароў, 186 жыхароў.

ВАСІЛЬЕЎКА, вёска ў Струменскім сельсавеце. На пачатку XX ст. вядома як фальварак у Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — хутар, 11 двароў, 51 жыхар, 106 дзес. зямлі; фальварак належаў двараніну Сушкевічу, які валодаў 110 дзес. зямлі. З 20.8.1924 г. хутар у Струменскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 23 двары, 114 жыхароў (49 муж., 65 жан.). Вёска ўваходзіла ў склад калгаса "Радзіма" (цэнтр в. Струмень).

У выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС адселена.

ВАШЧАНКІ, вёска ў Ліцвінавіцкім сельсавеце. У канцы XVII — пачатку XVIII ст. у Чачэрскім старостве Вялікага княства Літоўскага. У 1704 г. згодна з інвентаром Чачэрскага староства — вёска, 3 дымы, 1 $^1/_2$ службы належала Чачэрскаму замку. З 1726 г. вёска Вашчанкі, пры ёй Васільеўская слабада (2 дымы) у Ліцвінавіцкім войтаўстве належала Чачэрскаму замку. Сяляне плацілі 16 грошаў і дастаўлялі ў замак мёд, хмель і г.д. У 1765 г. — 21 гаспадарка (гадавы даход — 56 $^1/_2$ злотага), маёмасць земскага суддзі пана Маліноўскага ў Рэчыцкім павеце Мінскага ваяводства. У другой палове XIX ст. — у Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1907 г. адчынена земская школа. У 1909 г. — 79 двароў, 579 жыхароў, 530 дзес. зямлі, належала мясцовай сельскай грамадзе. У 1918 г. на базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа I ступені імя Вароўскага. Навучанне вялося на беларускай мове. З 20.8.1924 г. — вёска ў Ліцвінавіцкім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 100 двароў, 530 жыхароў (251 муж., 279 жан.). Зараз вёска ў складзе калгаса імя Лепяшынскага (цэнтр в. Ліцвінавічы).

На 1.1.2002 г. 78 двароў, 173 жыхары. Клуб, аддзяленне сувязі, проціпажарны пункт, магазін.

ВОРНАЎКА, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса імя Дзімітрава. У канцы XVII — першай палове XVIII ст. вядома пад назвай Вараноўшчына як баярскае сяленне ў Чачэрскім старостве Вялікага княства Літоўскага. У 1726 г. — 9 дымоў, 2 службы. Баяры плацілі падатак 200 злотых у год Ча-

чэрскаму замку. Апрача гэтага неслі розныя павіннасці і абавязаны былі мець добрую зброю і каня. У 1842 г. пабудавана праваслаўная драўляная Раства-Багародзіцкая царква. У 1848 г. — Вараноўшчына, фальварак памешчыцы Вольгі Маліноўскай. Памешчыцы належала 37 рэвізскіх сялянскіх душ (20 муж., 17 жан.) і крыху больш за 193 дзес. зямлі. Земляробства сяляне спалучалі з рознымі промысламі: ганчарным і рамізніцкім. У 1886 г. — 19 двароў, 60 жыхароў у Расохскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Меліся праваслаўная царква, ветраны млын. У 1898 г. у прыход увавходзіла 3588 жыхароў сяла і навакольных вёсак. Царкве належала 96 дзес. зямлі. У 1909 г. — 157 двароў, 98 жыхароў, 157 дзес. зямлі, якая належала мясцовай сельскай грамадзе; ваколіца — 96 двароў, 421 жыхар, належала ваколіцкай сельскай грамадзе, якая мела 661 дзес. зямлі. З 20.8.1924 г. цэнтр сельсавета Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Створаны калгас "Рэвалюцыя", мелася кузня. У 1970 г. — 229 двароў, 673 жыхары. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Дзімітрава. Млын, лесапільня, сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, магазін.

На 1.1.2002 г. 176 двароў, 465 жыхароў. Сярэдняя школа, дзіцячы сад, аддзяленне сувязі, Дом культуры, бібліятэка, сталовая, проціпажарны пункт, комплексны прыёмны пункт.

ВОСАЎ, вёска ў Струменскім сельсавеце. У канцы XVIII — пачатку XVIII ст. вядома ў Чачэрскім старостве Вялікага княства Літоўскага і адносілася да Чачэрскага замка. Згодна з інвентаром 1704 г. у вёсцы налічвалася 4 дымы. У 1726 г. — 7 дымоў, 1 служба ў Вотарскім войтаўстве Чачэрскага староства. Сяляне плацілі 22 грошы і давалі мёд, добры хмель і г.д. Чачэрскаму замку. У 1765 г. — 23 гаспадаркі ў Засожскай воласці Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства. Гадавы даход — 15 грошаў, вёска належала панам Збарамірскім. Меліся млын, сукнавальня, карчма. На пачатку XX ст. — вёска ў Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні, 146 дзес. зямлі, належала вясковай сельскай грамадзе. У 1909 г. — 7 двароў, 27 жыхароў. З 20.8.1924 г. — вёска ў Струменскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Створаны калгас "Чырвоны Кастрычнік", працавалі кузня, воўначасальня. Пасля Вялікай Айчыннай вайны ў складзе калгаса "Радзіма" (цэнтр в. Струмень).

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС ліквідавана.

ВОСТРАЎ, вёска ў Кароцькаўскім сельсавеце. У 1858 г. вядома як сяльцо, 15 рэвізскіх мужчынскіх душ, прыватная ўласнасць памешчыцы А. Хілінскай. У 1868 г. тут заснавана сукнавальня, валавы даход — 4500 рублёў. У 1884 г. — ваколіца Востраў, 20 двароў, 140 жыхароў у Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Асноўным заняткам сялян было земляробства, якое яны спалучалі з промысламі: ганчарным, даход — 15 рублёў і кравецкім, даход — 5 рублёў. На пачатку XX ст. вёска ў Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні, 349 дзес. зямлі належала вясковай сельскай грамадзе. У 1909 г. налічвалася 29 двароў, 101 жыхар. З 20.8.1924 г. у Кароцькаўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Вясковыя дзеці наведвалі школу I ступені за 1 км у вёсцы Кароцькі, у 1924—1925 гг. — 30 вучняў. Згодна з перапісам насельніцтва 1926 г. — 32 двары, 124 жыхары. Створаны калгас "Чырвоны Востраў", меліся вадзяны млын, кузня. З 25.12.1962 г. — вёска ў Рагачоўскім раёне, з 6.1.1965 г. у Чачэрскім, з 30.7.1966 г. у Кармянскім раёне. Зараз ў складзе КСУП «Саўгас "Кармянскі"» (цэнтр в. Кароцькі).

На 1.1.2002 г. 1 двор, 2 жыхары..

ВОСТРАЯ КАРМА, вёска ў Ворнаўскім сельсавеце. З 20.8.1924 г. — пасёлак у Ворнаўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.8.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 25 двароў, 135 жыхароў (68 муж., 67 жан.). У 1935 г. працавалі торфазавод, ветраны млын. Зараз у складзе калгаса імя Дзімітрава (цэнтр в. Ворнаўка).

На 1.1.2002 г. 10 двароў, 18 жыхароў.

ВЫНАШАЎКА, вёска ў Кароцькаўскім сельсавеце. У 1765 г. прыватная ўласнасць пана Быкоўскага ў Чачэрскім старостве Вялікага княства Літоўскага. У 1816 г. налічвалася 160 рэвізскіх сялянскіх душ мужчынскага полу. У 1884 г. — 78 двароў, 290 жыхароў у Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Асноўным заняткам жыхароў было земляробства. Частка жыхароў спалучала земляробства з ганчарным промыслам, даход з якога складаў 21 рубель. Размяшчаліся хлебазапасны магазін, ветраны млын. У 1907 г. адчынена земская школа. У 1909 г. — 121 двор, 933 жыхары, 906 дзес. зямлі належала вясковай сельскай грамадзе. У 1918 г. на базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа I ступені, якая размяшчалася ў наёмным памяшканні, кошт якога складаў 6 рублёў у месяц. Школу наведвалі дзеці з суседняй вёскі Гарадзец. Навучанне вялося на беларускай мове, школе належала 2 дзес. зямлі. З 20.8.1924 г. вёска ў Куракаўшчынскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 194 двары, 970 жыхароў (452 муж., 518 жан.). Размяшчаліся ветраны млын, воўначасальня, гарбарная майстэрня. У 1929 г. створаны калгас імя Енукідзе, працавалі кузня, ветраны млын. З 25.12.1962 г. вёска ў Рагачоўскім раёне, з 19.9.1963 г. у Кармянскім пасялковым Савеце.

На 1.1.2002 г. 107 двароў, 194 жыхары. Клуб, магазін.

ГАРАДОК, вёска ў Кароцькаўскім сельсавеце. У канцы XIX ст. вядома як фальварак у Кармянскай воласці Рэчыцкага павета Магілёўскай губерні. Апошнім уладальнікам фальварка быў дваранін А. Дарыа-Дзерналовіч. З 20.8.1924 г. арцель у Куракаўшчынскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — арцель Гарадок, 14 двароў, 79 жыхароў (43 муж., 36 жан.). Дзеці наведвалі школу за 1,5 км у вёсцы Вынашаўка. На базе фальварка створаны калгас імя Сталіна, працавала кузня. З 25.12.1962 г. вёска ў Рагачоўскім раёне, з 19.9.1963 г. у Кармянскім пасялковым Савеце. Потым у Кароцькаўскім сельсавеце ў калгасе "Перамога".

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС адселена.

ГАРАДОК, вёска ў Струкачоўскім сельсавеце. У другой палове XIX ст. у Меркулавіцкай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1884 г. — 54 двары, 349 жыхароў. У вёсцы былі распаўсюджаны промыслы: адыходны, даход з якога складаў 45 рублёў, кравецкі — 5 рублёў, рамізніцкі (займаліся 12 двароў) — 10 рублёў, колавы (займаліся 3 двары) — 5 рублёў, бандарны — 25 рублёў, па вырабу драўлянага посуду — 25 рублёў. У 1882 г. адчынена царкоўнапрыходская школа ў пабудаванай сялянамі драўлянай хаце (13,5 м х 6,5 м), крытай саломай. Вяскоўцы адносіліся да праваслаўнага Меркулавіцкага прыхода і наведвалі Ушэсцеўскую царкву. На пачатку XX ст. вёска ў Меркулавіцкай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — 85 двароў, 612 жыхароў, належала вясковай сельскай грамадзе, якая валодала 1013 $^1/_4$ дзес. зямлі. У 1909 г. працавала царкоўнапрыходская школа, пераўтвораная ў 1918 г. у працоўную школу I ступені. У 1924 г. навучаліся 125 дзяцей, з вёскі Гарадок — 83 вучні, з Шэрахаўскай Буды — 42 чалавекі. Навучанне вялося на беларускай і рускай мовах. З 20.8.1924 г. — пасёлак у Барабудскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 42 двары, 207 жыхароў (80 муж., 127 жан.). Створаны калгас "Чырвоны Гарадок". Працавалі кузня, ветраны млын. З 16.7.1954 г. у Струкачоўскім сельсавеце. 22 снежня 1966 г. з вёскай злучыўся пасёлак Новы Прамень. Зараз у складзе КСУП «Саўгас імя Чапаева» (цэнтр в. Баравая Буда).

На 1.1.2002 г. 45 двароў, 77 жыхароў.

ДАНІЗАЎКА, вёска ў Струменскім сельсавеце. На пачатку XX ст. вёска ў Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — 18 двароў, 50 жыхароў (27 муж., 23 жан.), 357 дзес. зямлі, якая належала вясковай сельскай грамадзе. З 20.8.1924 г. у Струменскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з

20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу 1926 г. — ваколіца, 6 двароў, 32 жыхары (17 муж., 15 жан.). Сялянскія дзеці наведвалі школу за 2 км у вёсцы Струмень. Вёска знаходзілася ў складзе калгаса "Радзіма" (цэнтр в. Струмень).

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС адселена.

ДУБАВІЦА, вёска ў Струкачоўскім сельсавеце, цэнтр калгаса "Камуніст". У другой палове XIX ст. у Расохскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1884 г. — 47 двароў, 220 жыхароў. Распаўсюджаны промыслы: кавальскі, даход — 30 рублёў, ганчарны, даход — 18 рублёў, колавы, даход — 40 рублёў. Размяшчаўся хлебазапасны магазін. Вяскоўцы адносіліся да праваслаўнага Расохскага прыхода і наведвалі Мікалаеўскую царкву. У 1909 г. вёска, 65 двароў, 477 жыхароў, 772 дзес. зямлі належала вясковай сельскай грамадзе. З 20.8.1924 г. у Струкачоўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Вясковыя дзеці (15 вучняў) наведвалі працоўную школу I ступені імя Вароўскага за 0,5 км у вёсцы Міхалёўка. Створаны калгас "Чырвоны дабраволец", працавалі ветраны млын, кузня. У 1971 г. 165 двароў, 565 жыхароў. Камбінат бытавога абслугоўвання, лесапільня, млын. Васьмігадовая школа, Дом культуры, бібліятэка, аддзяленне сувязі, магазін.

На 1.1.2002 г. 150 двароў, 429 жыхароў. Базавая школа, Дом культуры, бібліятэка, дзяцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, сталовая, магазін.

ДУБРАВІНА (да 30.7.1964 г. Кабылічы), вёска ў Ліцвінавіцкім сельсавеце. У другой палове XIX ст. у Бычанскай воласці Быхаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1882 г. — 45 двароў, 18 жыхароў, частка якіх займалася бандарным, адыходным, кавальскім, кравецкім промысламі. Адносілася да праваслаўнага Бычанскага прыхода Георгіеўскай царквы. У 1909 г. — 60 двароў, 499 жыхароў, 528 $^{1}/_{2}$ дзес. зямлі належала мясцовай сельскай грамадзе. У 1923 г. адчынена школа імя Петрачэнкі, у 1924 г. там навучалася 90 дзяцей. Школа размяшчалася ў наёмным памяшканні, кошт якога ў месяц складаў 6 рублёў. З 20.8.1924 г. у Ліцвінавіцкім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 81 двор, 434 жыхары (199 муж., 235 жан.), сярод якіх 2 шаўцы, кравец, бондар. У вёсцы было 2 ветраныя млыны. Зараз у складзе калгаса імя Ляпяшынскага (цэнтр в. Ліцвінавічы).

На 1.1.2002 г. 31 двор, 75 жыхароў. Магазін.

ДУБРОЛЕЖ, пасёлак у Ліцвінавіцкім сельсавеце. На пачатку XX ст. вядомы як лясная старожка ў Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні: 1 двор, 4 жыхары, маёмасць графа Чарнышова-Круглікава. З 20.8.1924 г. у Ліцвінавіцкім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Вясковыя дзеці наведвалі школу за 1,7 км у вёсцы Вашчанкі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — пасёлак, 5 двароў, 27 жыхароў (10 муж., 17 жан.). У 1930 г. створаны калгас "Адраджэнне", працавала кузня. Зараз у складзе калгаса імя Лепяшынскага (цэнтр в. Ліцвінавічы).

На 1.1.2002 г. 1 двор, 2 жыхары.

ЕНЦЫ, вёска ў Ворнаўскім сельсавеце. У канцы XVII — пачатку XVIII ст. вядома як баярскае пасяленне ў Чачэрскім старостве Вялікага княства Літоўскага. У 1726 г. — 6 дымоў, 2 службы. Баяры адносіліся да Чачэрскага замка. Павінны былі мець добрага каня і зброю. Плацілі 200 злотых падатку. Апрача гэтага, будавалі і рамантавалі масты, у якасці паліцэйскіх павінны былі з'яўляцца на кірмашах. У 1816 г. — ваколіца, 11 рэвізскіх сялянскіх душ, прыватная ўласнасць памешчыцы Брандтавай і яе сыноў. У 1884 г. — 55 двароў, 198 жыхароў, у Расохскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Размяшчаўся хлебазапасны магазін. Былі распаўсюджаны промыслы: кравецкі, даход — 10 рублёў, бандарны — 15 рублёў, ганчарны — 6 рублёў, рамізніцкі — 10 рублёў. Вяскоўцы з'яўляліся прыхаджанамі праваслаўнага Ворнаўскага прыхода і наведвалі Раства-Багародзіцкую царкву. Меўся вадзяны млын. На пачатку XX ст. вёска ў Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні.

У 1909 г. — 27 двароў, 170 жыхароў, якія мелі 201 дзес. зямлі; вакаліца, 73 двары, 442 жыхары; маёнтак, 1 двор, 9 жыхароў, належала нашчадкам памешчыка Борхава, якія валодалі 220 дзес. зямлі. У 1909 г. адчынена земская школа. З 20.8.1924 г. вёска ў Ворнаўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Земская школа была ператворана ў працоўную школу I ступені, у 1924 г. тут навучалася 48 дзяцей, 5 — з вёскі Жабін. Навучанне вялося на рускай і беларускай мовах. Школе належала 2 дзес. зямлі. Створаны калгас "Іскра", працавала кузня. Зараз у складзе калгаса імя Дзімітрава (цэнтр в. Ворнаўка). Радзіма Героя Савецкага Саюза П.У.Несцяровіча.

На 1.1.2002 г. 21 двор, 40 жыхароў.

ЖАБІН, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. У пачатку XVIII ст. вядома як баярскае сяленне ў Чачэрскім старостве Вялікага княства Літоўскага. У 1726 г. — 10 дымоў, 2 службы. Баяры плацілі падатак 280 злотых Чачэрскаму замку. Апрача гэтага, неслі розныя павіннасці і павінны былі мець добрую зброю і каня. У 1837 г. маёмасць губернскага сакратара памешчыка Якава Мілеўскага, які тут меў 100 дзес. зямлі. У 1848 г. — цэнтр аднайменнага фальварка, 6 двароў, 56 рэвізскіх сялянскіх душ, прыватная ўласнасць памешчыцы Караліны Бутулінскай, якая валодала 215 дзес. зямлі. Сялянам належала 64 дзес. зямлі. У 1884 г. — вакаліца, 94 двары, 523 жыхары ў Расохскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Сяляне апрача земляробства займаліся промысламі: рамізніцкім — даход з якога складаў 20 рублёў, ганчарным — 16 рублёў. Жыхары з'яўляліся прыхаджанамі Ворнаўскага праваслаўнага прыхода. Наведвалі Раства-Багародзіцкую царкву. На пачатку XX ст. вёска, 9 двароў, 63 жыхары, якія валодалі 64 дзес. зямлі; вакаліца, 102 двары, 562 жыхары, 954 дзес. зямлі. Вясковыя дзеці наведвалі працоўную школу I ступені за 1 км у вёсцы Лужок. У 1924 г. — 74 вучні. 5 вучняў наведвалі школу за 1,5 км у вёсцы Енцы. З 20.8.1924 г. — вёска ў Расохскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 83 двары, 381 жыхар (180 муж., 201 жан.). Створаны калгас "1 Мая", працавалі ветраны млын, кузня. З 30.6.1966 г. у Лужкоўскім сельсавеце. Зараз вёска ў складзе калгаса "Бальшавік" (цэнтр в. Лужок).

На 1.1.2002 г.6 двароў, 7 жыхароў.

ЖАВУНІЦА, вёска ў Валынцаўскім сельсавеце. У канцы XIX — пачатку XX ст. у Нова-Ельнянскай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. Вяскоўцы былі прыхаджанамі Кляпінскага прыхода, наведвалі Пакроўскую царкву. У 1909 г. — 30 двароў, 251 жыхар, 587 дзес. зямлі, належала сельскай грамадзе. З 20.8.1924 г. у Валынцаўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 60 двароў, 345 жыхароў (164 муж., 181 жан.). Меўся ветраны млын. Вёска знаходзілася ў складзе саўгаса "Валынцы" (цэнтр в. Валынцы).

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС адселена.

ЖДАНАЎ, пасёлак у Струкачоўскім сельсавеце. Узнік у 20-ыя гг. XX ст. у час калгаснага будаўніцтва. З 20.8.1924 г. у Струкачоўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 14 двароў, 77 жыхароў (38 муж., 39 жан.). Створаны калгас імя К. Маркса, працаваў ветраны млын. 29 лістапада 1962 г. пасёлкі Крывы Рог і Круглы злучыліся з пасёлкам Жданаў. Не існуе.

ЗАБАЛОЦКАЕ, пасёлак у Акцяброўскім сельсавеце. Узнік у 20-ыя гг. XX ст. З 20.8.1924 г. у Руднянскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 9 двароў, 62 жыхары (27 муж., 35 жан.). З 25.3.1965 г. пасёлак у Акцяброўскім сельсавеце, у калгасе "Зара камунізму" (цэнтр в. Акцяброва). У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС адселены. Не існуе.

ЗАДУБ'Е, вёска ў Стараградскім сельсавеце. У XIX ст. вядома як цэнтр аднайменнага маёнтка. У 1858 г. налічвалася 220

рэвізскіх душ (113 муж., 107 жан.). Належаў калежскаму рэгістратару Іосіфу Янушкевічу, з 1868 г. — калежскаму асэсару Грамыку. Ён меў тут 276 дзес. зямлі, ветраны млын. У 1884 г. — вёска, 81 двор, 553 жыхары у Доўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Распаўсюджаны ганчарны промысел, якім займаліся 50 жыхароў. Размяшчаўся хлебазапасны магазін. Вяскоўцы з'яўляліся прыхаджанамі праваслаўнага Хізаўскага прыхода і наведвалі Георгіеўскую царкву. На пачатку XX ст. у Доўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — вёска, 138 двароў, 806 жыхароў, 1032 дзес. зямлі належала вясковай сельскай грамадзе; фальварак, 4 двары, 13 жыхароў, належаў двараніну Грамыку, які валодаў 285 дзес. зямлі. Побач знаходзіўся другі фальварак: 2 двары, 11 жыхароў, 101 дзес. зямлі, належаў А. Патапаву. У 1909 г. адчынена земская школа, якая ў 1918 г. была пераўтворана ў працоўную школу І ступені і размяшчалася ў нацыяналізаваным будынку. Яе наведвалі дзеці з 5 навакольных вёсак. Навучанне вялося на беларускай мове. З 20.8.1924 г. — вёска, цэнтр Задубскага сельсавета Кармянскага раёна, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 150 двароў, 802 жыхары (371 муж., 431 жан.). Меліся ветраны млын, воўначасальня, шавецкая, кравецкая і аўчынная майстэрні. Створаны калгас "Ударнік", меліся 2 кузні. З 16.7.1954 г. Задубскі сельсавет ліквідаваны, вёска ўключана ў Стараградскі сельсавет. Зараз у складзе КСУП «Саўгас "Стараградскі"» (цэнтр в. Старагеад).

На 1.1.2002 г. 112 двароў, 277 жыхароў. Сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, магазін.

ЗАЛАТАМІНО, вёска, цэнтр сельсавета. У другой палове XIX ст. вядома ў Бычанскай воласці Быхаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1884 г. налічваліся 25 двароў, 131 жыхар. Асноўным заняткам вяскоўцаў было земляробства і промыслы: адыходны, якім займаліся 9 двароў і даход ад якога складаў ад 17 да 22 рублёў, бандарны, даход — 10—15 рублёў. Вяскоўцы адносіліся да Хляўнянскага праваслаўнага прыхода, наведвалі Праабражэнскую царкву. На пачатку XX ст. вёска ў Бычанскай воласці Быхаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — 56 двароў, 442 жыхары, 623 дзес. зямлі, якая належала вясковай сельскай грамадзе. З 20.8.1924 г. у Хляўнянскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Вясковыя дзеці наведвалі працоўную школу І ступені за 3 км у вёсцы Хляўно. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 65 двароў, 366 жыхароў (174 муж., 192 жан.). 29 лістапада 1962 г. з вёскай злучыўся пасёлак Вояўка, а 29 жніўня 1974 г. — пасёлак Леніна. З 2.9.1975 г. цэнтр Залатамінскага сельсавета (былы Хляўнянскі сельсавет). У 1971 г. цэнтр Хляўнянскага сельсавета і саўгаса "Руднянскі". 143 двары, 496 жыхароў. Млын, лесапільня, камбінат бытавога абслугоўвання. Пачатковая школа, клуб, бібліятэка, дзіцячыя яслі, бальніца, аддзяленне сувязі, магазін.

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС адселена.

ЗЯЦЬКАВІЧЫ, вёска ў Ліцвінавіцкім сельсавеце. З пісьмовых крыніц вядома з 1629 г. Па хадайніцтву сялян, якія не мелі магчымасці наведваць кірмашы вясной з-за разводдзя, кароль Сігізмунд III надзяліў Зяцькавічы правам на правядзенне трохдзённага кірмашу. У 1704 г. вядома ў Ліцвінавіцкім войтаўстве Чачэрскага староства Вялікага княства Літоўскага. Вёска (2 дымы, 2 службы), належала Чачэрскаму замку. Жыхары плацілі чынш і дастаўлялі ў замак натуральную даніну. У 1765 г. — вёска, 12 гаспадарак, маёмасць земскага суддзі пана Маліноўскага ў Рэчыцкім павеце Мінскага ваяводства. У 1884 г. — 47 двароў, 290 жыхароў у Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Частка жыхароў займаліся ганчарным, кавальскім, шавецкім промысламі. Адносілася да праваслаўнага Ліцвінавіцкага прыхода. Размяшчаліся хлебазапасны магазін, ветраны млын. На пачатку XX ст. вёска ў Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — 73 двары, 579 жыхароў, 502 дзес. зямлі, якая належала мясцовай сельскай грамадзе. З 20.8.1924 г. вёска ў Ліцвінавіцкім сельсавеце

Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Вясковыя дзеці наведвалі працоўную школу I ступені імя Вароўскага за 1,5 км у вёсцы Вашчанкі. Арганізаваны калгас “Чырвоны пахар”, меліся кузня, 2 ветраныя млыны. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 122 двары, 639 жыхароў (300 муж., 339 жан.). Зараз у складзе калгаса імя Лепяшынскага (цэнтр в. Ліцвінавічы).

На 1.1.2002 г. 83 двары, 172 жыхары. Клуб, магазін.

ІВАНАЎКА, вёска ў Ворнаўскім сельсавеце. З 20.8.1924 г. пасёлак у Ворнаўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу 1926 г. — 16 двароў, 94 жыхары (46 муж., 48 жан.). Створаны калгас “Сталінград”, меўся ветраны млын. Зараз у складзе калгаса імя Дзімітрава (цэнтр в. Ворнаўка).

На 1.1.2002 г. 6 двароў, 11 жыхароў.

КАЗІМІРАВА, вёска ў Ліцвінавіцкім сельсавеце. На пачатку XX ст. вядома як хутар у Бычанскай воласці Магілёўскай губерні. У 1909 г. — 20 двароў, 171 жыхар. Хутар адносіўся да праваслаўнага Хляўнянскага прыхода. Хутаране наведвалі Праабражэнскую царкву. З 20.8.1924 г. у Хляўнянскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Хутаранскія дзеці наведвалі працоўную школу I ступені за 3 км у вёсцы Хляўно. Згодна з перапісам насельніцтва 1926 г. — 42 двары, 228 жыхароў. Створаны калгас “Чырвоны Казіміраў”, працавала кузня. З 2.9.1975 г. — вёска ў Заламінскім сельсавеце.

На 1.1.2002 г.12 двароў, 17 жыхароў.

КАЛЮДЫ, вёска ў Валынцаўскім сельсавеце. Упершыню ўпамінаецца ў 1599 г. пры акрэсліванні граніц Вялікага княства Літоўскага. У 1704 г. згодна з інвентаром Чачэрскага староства — 7 дымоў, 1 $^{1}/_{2}$ службы. Вёска адносілася да Чачэрскага замка, якому жыхары плацілі чынш 38 грошаў. У 1726 г. — 9 дымоў у Палескім войтаўстве, чынш складаў 15 грошаў. Апрача чыншу, у Чачэрскі замак жыхары дастаўлялі натуральную даніну. У 1765 г. — 26 гаспадарак, прыватная ўласнасць земскага суддзі Рэчыцкага павета пана Маліноўскага ў Засожскай воласці Чачэрскага староства. У 1886 г. вёска, былое прыватнае ўладанне, 157 двароў, 928 жыхароў у Палескай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Існавалі 3 ветраныя млыны, хлебазапасны магазін. Распаўсюджаны промыслы: бандарны, даход — 10 рублёў, кавальскі — 30 рублёў, шавецкі — 10 рублёў, кравецкі — 10 рублёў. Вяскоўцы з’яўляліся прыхаджанамі Пакроўскай царквы праваслаўнага Кляпінскага прыхода. На пачатку XX ст. вёска ў Палескай воласці Гомельскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — 258 двароў, 2002 жыхары, належала мясцовай сельскай грамадзе. Побач размяшчаўся фальварак, маёмасць графа Чарнышова-Круглікава, які валодаў 806 дзес. зямлі. З 20.8.1924 г. у Валынцаўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Створаны калгас “Ударны Кастрычнік”. Меліся ветраны млын, крупарушка, воўначасальня. Вёска ўваходзіла ў склад саўгаса “Валынцы” (цэнтр в. Валынцы).

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС адселена.

КАМЕНКА, вёска, цэнтр сельсавета. У 1765 г. вядома як прыватная ўласнасць Мінскага кашталяна пана Юдзіцкага ў Рэчыцкім павеце Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага. У XIX ст. цэнтр аднайменнага маёнтка. У 1884 г. — 39 двароў, 233 жыхары ў Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Меўся хлебазапасны магазін. Распаўсюджаны промыслы: ганчарны, ім займаліся 8 двароў, даход — 18 рублёў, кавальскі — 10 рулёў. Вяскоўцы з’яўляліся прыхаджанамі Балатнянскага праваслаўнага прыхода, наведвалі Пакроўскую царкву. На пачатку XX ст. вёска ў Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — 60 двароў, 434 жыхары, 460 дзес. зямлі, якая належала вясковай сельскай грамадзе. Побач быў аднайменны маёнтак (1 двор, 14 жыхароў), які належаў двараніну Богушу, ён валодаў 542 дзес. зямлі. У 1913 г. адчынена земская школа. З 20.8.1924 г. — цэнтр Каменскага сельсавета Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. На базе дарэвалюцыйнай школы створана школа

I ступені, з 1918 г. размешчана ў нацыяналізаваным будынку. Школе належала 2 дзес. зямлі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 79 двароў, 473 жыхары (226 муж., 247 жан.). Меліся ветраны млын, кравецкая і шавецкая майстэрні, саломарэзка. Створаны калгас "Луч Першага Мая". З 30.6.1966 г. — цэнтр сельсавета Чачэрскага раёна, з 30.7.1966 г. Кармянскага раёна ў складзе калгаса "Кастрычнік" (цэнтр в. Кучын). У 1971 г. 116 двароў, 411 жыхароў. Васьмігадовая школа, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, магазін.

На 1.1.2002 г. 83 двары, 190 жыхароў. Лазня, сталовая.

КАРОЦЬКІ, вёска, цэнтр сельсавета і камунальнага сельгаспрадпрыемства "Саўгас "Кармянскі". У 1855 г. згодна з купчай належала памешчыку І. А. Рымкевічу. У 1884 г. — ваколіца, 129 двароў, 1020 жыхароў у Кармянскай воласці Магілёўскай губерні. Асноўным заняткам сялян было земляробства, якое яны спалучалі з промысламі: кавальскім — даход з якога складаў 25 рублёў, ганчарным — 18 рублёў, колавым — 15 рублёў, кравецкім — 5 рублёў, рамізніцкім — 20 рублёў. На пачатку XX ст. у Кармянскай воласці Магілёўскай губерні. У 1906 г. адчынена царкоўнапрыходская школа. У 1909 г. — вёска, 70 двароў, 882 жыхары, 2623 дзес. зямлі належала вясковай сялянскай грамадзе. У 1918 г. на базе дарэвалюцыйнай школы была створана працоўная школа I ступені, навучанне вялося на беларускай мове. Школа размяшчалася ў наёмным памяшканні, за якое ў месяц плацілі 6 рублёў. Школу наведвалі вучні з навакольных вёсак Рудня, Кулакоўка, Востраў. З 20.8.1924 г. цэнтр Кароцькаўскага сельсавета Кармянскага раёна Магілёўскай губерні. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 175 двароў, 782 жыхары (373 муж., 409 жан.). Створаны калгас "Парыжская камуна", меліся ветраны млын, кузня, конная крупарушка і прасарушка. З 25.12.1962 г. вёска ў Рагачоўскім раёне, з 6.1.1965 г. у Чачэрскім раёне, з 30.7.1966 г. у Кармянскім раёне. У 1971 г. 160 двароў, 411 жыхароў. Васьмігадовая школа, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, сталовая, магазін.

На 1.1.2002 г. 189 двароў, 543 жыхары. Сярэдняя школа, Дом культуры, дзіцячы сад, магазін, сталовая, гасцініца, лазня, фельчарска-акушэрскі пункт, бібліятэка, аддзяленне сувязі, комплексны прыёмны пункт.

КАСАЛЯЦКІ, пасёлак у Ліцвінавіцкім сельсавеце. На пачатку XX ст. вядомы як хутар у Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — 1 двор, 3 жыхары, належаў графу Чарнышову-Круглікаву. З 20.8.1924 г. у Ліцвінавіцкім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 11 двароў, 63 жыхары (30 муж., 33 жан.). Хутарскія дзеці наведвалі чатырохгадовую школу імя Лепяшынскага. Зараз пасёлак у складзе калгаса імя Лепяшынскага (цэнтр в. Ліцвінавічы).

На 1.1.2002 г. 2 двары, 3 жыхары.

КАСЦЮКОЎКА, вёска ў Залатамінскім сельсавеце. У другой палове XIX ст. выселак у Бычанскай воласці Быхаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — выселак Касцюкоўка (ён жа Міхееўка), 28 двароў, 255 жыхароў, 354 дзес. зямлі, належала мясцовай сельскай грамадзе. Адносіўся да Хляўнянскага праваслаўнага прыхода Праабражэнскай царквы. З 20.8.1924 г. — вёска ў Хляўнянскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай губерні. Вясковыя дзеці наведвалі працоўную школу I ступені за 5 км у вёсцы Хляўно. Згодна з перапісам насельніцтва 1926 г. — 47 двароў, 275 жыхароў (141 муж., 134 жан.). Створаны калгас "Чырвоны Бераг", меліся кузня, ветраны млын. Вёска знаходзілася ў складзе саўгаса "Руднянскі" (цэнтр в. Залатаміно).

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС адселена.

КАЎКАЗ, пасёлак у Ворнаўскім сельсавеце. З 20.8.1924 г. у Кароцькавіцкім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 17 двароў, 91 жыхар (50 муж., 41 жан.). З лістапада 1962 г. у Ворнаўскім сельсавеце. За-

раз у складзе калгаса “Рассвет” (цэнтр в. Высокае).

На 1.1.2002 г. 4 двары, 4 жыхары.

КЛЯПІН, вёска ў Валынцаўскім сельсавеце. У 1765 г. вядома як слабада і маёнтак Кляпін — прыватная ўласнасць пана Маліноўскага ў Чачэрскім старостве Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства ў Вялікім княстве Літоўскім. У 1839 г. пабудавана драўляная праваслаўная Пакроўская царква. У 1882 г. — сяло, 59 двароў, 356 жыхароў у Нова-Ельнянскай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. Вяскоўцы апрача земляробства займаліся рознымі промысламі: абутковым, кравецкім, кавальскім. Значнае месца займаў адыходны промысел (сплаў лесу). У 1890 г. адчынена царкоўнапрыходская школа, для якой у 1895 г. пабудаваны ўласны драўляны будынак памерам 12,1 х 11,3 м, крыты гонтай. У 1899 г. праваслаўны Кляпінскі прыход аб'ядноўваў 2574 жыхароў сяла і навакольных вёсак. Царкве належала 38 дзес. зямлі. На пачатку XX ст. у Нова-Ельнянскай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — сяло на р. Кляпінка, 93 двары, 682 жыхары, 545 дзес. зямлі, якая належала мясцовай сельскай грамадзе. Маёнтак: 1 двор, 943 дзес. зямлі, 9 жыхароў, уласнасць двараніна Кміта А. На базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа I ступені. З 20.8.1924 г. у Валынцаўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. У 1926 г. — 116 двароў, 809 жыхароў (293 муж., 416 жан.), сярод якіх 2 краўцы, 2 бондары, каваль і аўчыннік. Створаны калгас “Колас”, працавала кузня.

На 1.1.2002 г. 33 двары, 84 жыхары. Сярэдняя школа, магазін, фельчарска-акушэрскі пункт.

КЛЯПІНСКАЯ БУДА, вёска ў Валынцаўскім сельсавеце. На пачатку XX ст. у Нова-Ельнянскай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — вёска, 37 двароў, 303 жыхары, 1062 дзес. зямлі, якая належала вясковай сельскай грамадзе. У 1910 г. адчынена царкоўнапрыходская школа, будынак для якой пабудавалі сяляне. У 1918 г. школа была пераабсталявана ў працоўную школу I ступені. У 1921 г. сяляне выдзелілі для школы зямельны надзел плошчай 21 840 кв.м. З 20.8.1924 г. у Валынцаўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Паводле перапісу 1926 г. — 97 двароў, 487 жыхароў (234 муж., 253 жан.). Працавалі кузня, кравецкая майстэрня (1 кравец). Створаны калгас імя К. Маркса.

На 1.1.2002 г. — 28 двароў, 65 жыхароў.

КОЛАСАВА, вёска ў Струкачоўскім сельсавеце. З 20.8.1924 г. у Струкачоўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 18 двароў, 96 жыхароў (40 муж., 56 жан.). Зараз у складзе КСУП «Саўгас імя Чапаева» (цэнтр в. Баравая Буда).

На 1.1.2002 г. 39 двароў, 59 жыхароў.

КОРСУНЬ, вёска ў Валынцаўскім сельсавеце. З 20.8.1924 г. — у Валынцаўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Паводле перапісу 1926 г. — 9 двароў, 50 жыхароў (27 муж., 23 жан.).

На 1.1.2002 г. 9 двароў, 13 жыхароў.

КОСАЛЬ, вёска ў Акцяброўскім сельсавеце. У другой палове XIX ст. у Бычанскай воласці Быхаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1884 г. — 43 двары, 216 жыхароў. Частка вяскоўцаў займалася промысламі: кравецкім, даход — 5—10 рублёў, кавальскім — 10—15 рулёў. Вяскоўцы з'яўляліся прыхаджанамі Бычанскага праваслаўнага прыхода і наведвалі Георгіеўскую царкву. На пачатку XX ст. вёска (на ручаі Касалянка) у Бычанскай воласці Быхаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1908 г. адчынена земская школа. У 1909 г. — 58 двароў, 461 жыхар, 543 дзес. зямлі, належала вясковай сельскай грамадзе. Побач быў аднайменны выселак: 9 двароў, 98 жыхароў. У 1910 г. пабудаваны ўласны будынак для школы. З 20.8.1924 г. — вёска ў Руднянскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Сярод вяскоўцаў было 3 кавалі, 3 бондары, 1 аўчыннік, кравец. На базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа I ступені, якую наведвалі дзеці з суседніх населеных пунктаў: в. Рудня, хутароў Курганне, Косельскі Прудок. Навучанне вялося на белару-

скай мове. Школе належала 1 дзес. зямлі. З 25.3.1965 г. — вёска ў Акцяброўскім сельсавеце ў калгасе "Зара камунізму". Зараз у складзе КСУП "Акцяброва".

На 1.1.2002 г. 20 двароў, 46 жыхароў.

КОСАЛЬСКІ ПРУДОК, вёска ў Акцяброўскім сельсавеце. На пачатку XX ст. вядома як выселак у Бычанскай воласці Быхаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — 9 двароў, 100 жыхароў (52 муж., 48 жан.). З 20.8.1924 г. хутар у Руднянскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Хутарскія дзеці наведвалі працоўную школу I ступені за 2 км у вёсцы Косаль. Згодна з перапісам насельніцтва 1926 г. — 22 двары, 138 жыхароў (61 муж., 77 жан.). Меліся вадзяны млын, сукнавальня. З 25.3.1965 г. у Акцяброўскім сельсавеце, у складзе калгаса "Зара камунізму" (цэнтр в. Акцяброва).

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС адселена.

КРАСНЫ БОР, пасёлак (да 22 снежня 1966 г.) у Кароцькаўскім сельсавеце. З 20.8.1924 г. у Куракаўшчынскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Згодна з перапісам насельніцтва 1926 г. — 10 двароў, 53 жыхары (30 муж., 23 жан.). З 25.12.1962 г. у Рагачоўскім раёне, з 19.9.1963 г. у Кармянскім раёне, у складзе калгаса "Перамога". У 1966 г. часткова ўвайшоў у склад вёскі Новая Зенькавіна.

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС адселены.

КРУГЛЫ, пасёлак (да 29 лістапада 1962 г.) у Струкачоўскім сельсавеце. З 20.8.1924 г. у Струкачоўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 17 двароў, 76 жыхароў. З 29 лістапада 1962 г. знаходзіўся ў складзе пасёлка Жданаў. Не існуе.

КРЫВЫ РОГ, пасёлак (да 29 лістапада 1962 г.) у Струкачоўскім сельсавеце. Вядомы з 20-ых гг. XX ст. З 20.8.1924 г. у Струкачоўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 13 двароў, 71 жыхар. З 29 лістапада 1962 г. знаходзіўся ў складзе пасёлка Жданаў. Не існуе.

КУРАКАЎШЧЫНА, вёска ў Кароцькаўскім сельсавеце. У 1877 г. заснаваны цагельны завод. У 1884 г. — вёска, 30 двароў, 210 жыхароў у Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Размяшчаліся хлебазапасны магазін, крупадзерня, даход з якой складаў 125 рублёў. Частка вяскоўцаў займалася промысламі: ганчарным, даход — 18 рублёў, кравецкім — 15 рублёў. На пачатку XX ст. у Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — 52 двары, 362 жыхары, 426 дзес. зямлі, належала вясковай сельскай грамадзе. З 20.8.1924 г. — цэнтр Куракаўшчынскага сельсавета Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 102 двары, 458 жыхароў (218 муж., 240 жан.). У вёсцы размяшчалася шавецкая майстэрня, дзе працавалі 3 шаўцы, 3 жыхары займаліся вырабам аўчын. Створаны калгас "Чырвоны Кастрычнік", мелася кузня. З 25.12.1962 г. — вёска ў Рагачоўскім раёне, 19.9.1963 г. тэрыторыя ўключана ў Кармянскі пасялковы Савет. Зараз у Кароцькаўскім сельсавеце, у складзе КСУП «Саўгас "Кармянскі"» (цэнтр в. Кароцькі).

На 1.1.2002 г. 130 двароў, 291 жыхар. Магазін.

КУРГАННЕ, вёска ў Акцяброўскім сельсавеце. На пачатку XX ст. хутар у Бычанскай воласці Быхаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — 8 двароў, 66 жыхароў, 80 $^1/_2$ дзес. зямлі належала Косальскай сельскай грамадзе. З 20.8.1924 г. хутар у Руднянскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай губерні. Дзеці наведвалі працоўную школу I ступені за 1,5 км у в. Косаль. Згодна з перапісам насельніцтва 1926 г. – 17 двароў, 99 жыхароў (50 муж., 49 жан.). З 25.3.1965 г. вёска ў Акцяброўскім сельсавеце, у калгасе "Зара камунізму" (цэнтр в. Акцяброва).

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС адселена.

КУРГАНІЦА, вёска ў Струменскім сельсавеце. На пачатку XX ст. вядома як хутар, З

двары, 21 жыхар, які належаў мяшчанам Хадаковічам, якія валодалі 86 дзес. зямлі. З 20.8.1924 г. у Струменскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Згодна з перапісам насельніцтва 1926 г. — 25 двароў, 440 жыхароў. Да аварыі на Чарнобыльскай АЭС уваходзіла ў склад калгаса "Радзіма".

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС адселена.

КУЧЫН, вёска ў Каменскім сельсавеце, цэнтр калгаса "Кастрычнік". У 1884 г. — 37 двароў, 22 жыхары ў Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Размяшчаліся хлебазапасны магазін, ветраны млын. Быў распаўсюджаны ганчарны промысел, якім займаліся 7 двароў, даход з яго складаў 18 рублёў. Вяскоўцы з'яўляліся прыхаджанамі праваслаўнага Балатнянскага прыхода, наведвалі Пакроўскую царкву. На пачатку XX ст. у Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — вёска, 57 двароў, 477 жыхароў, 498 дзес. зямлі, належала вясковай сельскай грамадзе. З 20.8.1924 г. у Каменскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 75 двароў, 439 жыхароў (202 муж., 237 жан.). Побач размяшчаліся Кучынскія хутары: 12 двароў, 61 жыхар (32 муж., 29 жан.). Меліся кравецкая майстэрня, кузня, малацілка. З 5.8.1929 г. — вёска ў Курганіцкім сельсавеце. Створаны калгас "Іскра". У 1935 г. працавалі 2 ветраныя млыны, кузня. З 30.7.1966 г. у Каменскім сельсавеце Чачэрскага раёна, з 30.7.1966 г. Кармянскага раёна, у складзе калгаса "Кастрычнік".

На 1.1.2002 г. 109 двароў, 342 жыхары. Сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, дзіцячы сад, магазін, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі.

ЛАБЫРОЎКА, вёска ў Залатамінскім сельсавеце. У другой палове XIX ст. у Бычанскай воласці Быхаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1889 г. — 28 двароў, 1907 жыхароў. Распаўсюджаны адыходны промысел, даход — 17—22 рублі. Вяскоўцы з'яўляліся прыхаджанамі праваслаўнага Хляўнянскага прыхода і наведвалі Праабражэнскую царкву. У 1909 г. — выселак, 52 двары, 350 жыхароў, 354 дзес. зямлі належалі мясцовай сельскай грамадзе. У 1924 г. вясковыя дзеці наведвалі працоўную школу I ступені за 2 км у вёсцы Студзянец. З 20.8.1924 г. вёска ў Руднянскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 78 двароў, 433 жыхары (203 муж., 230 жан.). Дзейнічалі сукнавальня, ветраны і паравы млыны. З 2.9.1975 г. вёска ў Залатамінскім сельсавеце.

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС адселена.

ЛАЗОВІЦА, вёска ў Струменскім сельсавеце. У 1858 г. — 36 рэвізскіх сялянскіх душ (20 муж., 16 жан.), прыватная ўласнасць памешчыцы Марцэлы Кузміцкай (ур. Леваніцкай). У 1884 г. — 15 двароў, 140 жыхароў, у Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Вяскоўцы апрача земляробства займаліся ганчарным промыслам, даход — 18 рублёў. На пачатку XX ст. — 37 двароў, 147 жыхароў, 976 дзес. зямлі, належала вясковай сельскай грамадзе. Побач размяшчалася ваколіца, 1 двор, 2 жыхары. З 20.8.1924 г. — вёска ў Струменскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Вясковыя дзеці наведвалі працоўную школу I ступені за 3 км у вёсцы Струмень. У 1924—1925 гг. там навучаліся 40 вучняў. Створаны калгас "Камунар", працаваў вадзяны млын. У складзе калгаса "Радзіма" (цэнтр в. Струмень).

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС адселена.

ЛАНІЦА, вёска ў Струменскім сельсавеце. У канцы XIX ст. вядома пад назвай Перавоз у Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. Перавоз Ланіца (1 двор, 4 жыхары) належаў дваранцы Хмызаўскай. Побач размяшчаўся хутар: 6 двароў, 25 жыхароў, 101 дзес. зямлі, належаў мясцовай сельскай грамадзе. З 20.8.1924 г. у Струменскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — хутар, 20 двароў, 126 жыхароў (67 муж., 59 жан.). Існавалі ветраны млын, кузня, быў створаны калгас імя Літвінава. Не існуе.

ЛЕБЯДЗЁЎКА, вёска ў Каменскім сельсавеце. У 1816 г. — 105 рэвізскіх мужчынскіх душ, прыватная ўласнасць у Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1884 г. — 45 двароў, 291 жыхар, у Кармянскай воласці Рагачоўскага павета. Размяшчаўся хлебазапасны магазін. Распаўсюджаны промыслы: ганчарны, якім займаліся 16 двароў, даход — 18 рублёў, кравецкі, даход — 5 рублёў. На пачатку XX ст. вёска ў Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — 69 двароў, 483 жыхары, 554 дзес. зямлі, належала вясковай сельскай грамадзе. Побач размяшчаўся маёнтак (1 двор, 5 жыхароў) двараніна Богуша. З 20.8.1924 г. у Каменскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Згодна з перапісам насельніцтва 1926 г. — 77 двароў, 413 жыхароў (193 муж., 220 жан.); Лебядзёўскія хутары — 16 двароў, 100 жыхароў (59 муж., 41 жан.). Меліся цагельны завод, воўначасальня. З 5.8.1929 г. у Курганскім сельсавеце. З 30.6.1966 г. — вёска ў Каменскім сельсавеце Чачэрскага раёна, з 20.7.1966 г. Кармянскага раёна, у складзе калгаса "Кастрычнік".

На 1.1.2002 г. 40 двароў, 108 жыхароў. Магазін.

ЛЕНІНСКІ, пасёлак (да 29 жніўня 1974 г.) у Залатамінскім сельсавеце. Узнік у 20-ыя гг. XX ст. у час калгаснага будаўніцтва. З 20.8.1924 г. у Хляўнянскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Згодна з перапісам насельніцтва 1926 г. — 21 двор, 120 жыхароў.

29 жніўня 1974 г. злучыўся з вёскай Залатаміно.

ЛЕСАВАЯ БУДА, вёска ў Струкачоўскім сельсавеце. Вядома з канца XIX ст. як фальварак, пабудаваны ў 1892 г. памешчыкам Жукоўскім. На пачатку XX ст. 2 аднайменныя фальваркі ў Меркулавіцкай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — паштовая станцыя Лесавая Буда, 1 двор, 6 жыхароў; фальварак (1 двор, 8 жыхароў, 162 дзес. зямлі), належаў двараніну Жукоўскаму. Побач размяшчаўся другі фальварак: 1 двор, 11 жыхароў, 1039 дзес. зямлі, таксама належаў двараніну Жукоўскаму. У 1923 г. фальваркі былі нацыяналізаваны, у адным з іх размясцілася Баравабудская працоўная школа I ступені. З 20.8.1924 г. — вёска ў Баравабудскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Створаны калгас "12-ы Кастрычнік", працавала кузня. З 16.7.1954 г. — вёска ў Струкачоўскім сельсавеце. Зараз вёска ў складзе КСУП "Саўгас імя Чапаева" (цэнтр в. Баравая Буда).

На 1.1.2002 г. — 63 двары, 123 жыхары. Клуб, магазін.

ЛІЦВІНАВІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета. У XVIII ст. вядома ў Чачэрскай воласці Чачэрскага староства Вялікага княства Літоўскага. Згодна з інвентаром Чачэрскага староства 1704 г. — вёска, 8 дымоў, 4 $^{3}/_{4}$ службы належала Чачэрскаму замку. Сяляне плацілі чынш 44 грошы, карысталіся рыбнымі ловамі. Меўся млын.

У 1726 г. — цэнтр Ліцвінавіцкага войтаўства Чачэрскага староства. У 1765 г. — 42 сялянскія гаспадаркі, маёмасць земскага суддзі Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства пана Маліноўскага. Меліся карчма, тры млыны. У 1880 г. дзейнічаў праваслаўны Ліцвінавіцкі прыход, праваслаўная драўляная Казьма-Дзям'янаўская царква, царкоўнапрыходская школа, вадзяны млын, хлебазапасны магазін, сукнавальня, якая належала графу Іпаліту Чарнышову-Круглікаву, даход — 120 рублёў. У 1886 г. — сяло, 93 двары, 462 жыхары ў Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Распаўсюджаны ганчарны, кравецкі промыслы. Ліцвінавіцкі прыход аб'ядноўваў 3069 жыхароў сяла і навакольных вёсак, царкве належала 36 дзес. зямлі. На пачатку XX ст. у Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — сяло, 147 двароў, 1068 жыхароў, 1281 дзес. зямлі належалі сельскай грамадзе. Побач знаходзіўся фальварак: 1 двор, 9 жыхароў, 8531 дзес. зямлі, належала Чарнышову-Круглікаву. У 1913 г. у фальварку размяшчаўся вінакурны завод № 154, які належаў памешчыцы, дачцэ Іпаліта Чарнышова-Круглікава Яўгеніі Чарнышовай-Безабразавай.

У 1918 г. у сяло прыехаў дзеяч рэвалюцыйнага руху публіцыст П. М. Лепяшынскі. На базе дарэвалюцыйнай школы ён заснаваў працоўную. У канцы 1919 г. яна была пераведзена

ў Маскву. З 20.8.1924 г. — вёска, цэнтр сельсавета Кармянскага раёна Магілёўскай акругі.

Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 170 двароў, 811 жыхароў (377 муж., 434 жан.). Створаны калгас імя Лепяшынскага, меліся кузня, ветраны млын, воўначасальня, малацілка. У 1959 г. на будынку сярэдняй школы ўстаноўлена мемарыяльная дошка П. М. Лепяшынскаму, у 1973 г. каля школы яму пастаўлены помнік. 29 лістапада 1962 г. у вёску сселены жыхары пасёлка Рагозны. У 1968 г. адкрыты музей П.М.Лепяшынскага. У 1972 г. 418 двароў, 1257 жыхароў. Млын, швейная і шавецкая майстэрні. Сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, сталовая, 3 магазіны.

На 1.1.2002 г. 436 двароў, 1182 жыхары. Птушкафабрыка "Сож", лясніцтва. Сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, музей П.М.Лепяшынскага, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, комплексны прыёмны пункт, аддзяленне сувязі, кафэ, магазіны.

ЛУБЯНКА, вёска ў Стараградскім сельсавеце. У 1848 г. вядома як Хізаўская Буда, у складзе фальварка Стараград, прыватная ўласнасць памешчыка Людвіга Случаноўскага, налічваліся 282 рэвізскія сялянскія душы (133 жан., 149 муж.). У другой палове XIX ст. — у Доўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1884 г. налічвалася 49 двароў, 345 жыхароў. Распаўсюджаны ганчарны промысел, якім займаліся 17 двароў, даход — 18 рублёў, знаходзіўся хлебазапасны магазін. Вяскоўцы з'яўляліся прыхаджанамі праваслаўнага Хізаўскага прыхода Георгіеўскай царквы. На пачатку XX ст. вёска Лубянка (яна ж Хізаўская Буда) у Доўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — 91 двор, 643 жыхары, 756 дзес. зямлі, належала мясцовай сельскай грамадзе. З 20.8.1924 г. у Задубскім сельсавеце Кармянскага раёна, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Згодна з перапісам насельніцтва 1926 г. — 45 двароў, 196 жыхароў. Побач размяшчаліся 2 аднайменныя хутары: Лубянка-1 — 2 двары, 163 жыхары і Лубянка-2 — 3 двары, 15 жыхароў. У вёсцы дзейнічалі 2 майстэрні: кравецкая і шавецкая, працавала кузня. Створаны калгас імя Молатава. Зараз вёска ў складзе КСУП "Саўгас Стараград" (цэнтр в. Стараград).

На 1.1.2002 г. 25 двароў, 51 жыхар, магазін.

ЛУЖОК, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса "Бальшавік". У 1884 г. — 55 двароў, 261 жыхар, у Расохскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Размяшчаўся хлебазапасны магазін. Вяскоўцы займаліся земляробствам, спалучаючы яго з промысламі (кравецкім, даход — 10 рублёў, ганчарным, ім займаліся 11 двароў, даход — 18 рублёў, рамізніцкім — 13 двароў, даход — 10 рублёў), якія прыносілі дадатковы прыбытак у гаспадарку. Вяскоўцы з'яўляліся прыхаджанамі праваслаўнага Расохскага прыхода і наведвалі Мікалаеўскую царкву. На пачатку XX ст. у Расохскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — 84 двары, 459 жыхароў, 992 дзес. зямлі, належала сельскай грамадзе. У 1909 г. у вёсцы адчынена земская школа, у 1918 г. пераўтворана ў працоўную школу I ступені, для якой у 1919 г. пабудавалі ўласны будынак. З 20.8.1924 г. — вёска ў Расохскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Згодна з перапісам насельніцтва 1926 г. — 124 двары, 687 жыхароў (338 муж., 349 жан.). Мелася маслабойня. Створаны калгас "Бальшавік". Размяшчаліся 2 ветраныя млыны, конная прасарушка, крупарушка, кузня, воўначасальня. З 30.6.1966 г. — цэнтр Лужкоўскага сельсавета Чачэрскага раёна, з 30.7.1966 г. — Кармянскага раёна. У 1972 г. 105 двароў, 291 жыхар. Млын, камбінат бытавога абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, аддзяленне сувязі, магазін.

На 1.1.2002 г. 134 двары, 383 жыхары. Сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, дзіцячы сад, магазін, сталовая, аддзяленне сувязі, урачэбная амбулаторыя.

ЛУНАЧАРСКІ, пасёлак у Залатамінскім сельсавеце. Узнік у 20-ыя гг. XX ст. у час калгаснага будаўніцтва. З 20.8.1924 г. у Хляўнянскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Згодна з перапісам насельніцтва 1926 г. — 15 двароў, 79 жыхароў (44 муж., 35 жан.). З 2.9.1975 г. пасёлак у Залатамінскім сельсавеце.

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС адселены.

МАЛАШКІ, вёска ў Струменскім сельсавеце. У канцы XIX ст. у Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. меліся 20 двароў, 151 жыхар. З 20.8.1924 г. вёска ў Струменскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці.

Згодна з перапісам 1926 г. — 49 двароў, 242 жыхары (128 муж., 114 жан.). Існавалі ветраны млын, воўначасальня. Створаны калгас "Перамога".

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС адселена.

МАЛЯНІК, вёска ў Струменскім сельсавеце. У XIX ст. вядома як цэнтр аднайменнага фальварка. У 1848 г. там налічваліся 104 рэвізскія сялянскія душы (39 муж., 65 жан.). Фальварак належаў памешчыцы Агаф'і Віткоўскай, якая валодала 644 дзес. зямлі. У 1884 г. — 17 двароў, 107 жыхароў. Вяскоўцы ў асноўным займаліся земляробствам. Севазварот быў трохпольны. Земляробства спалучалася з промысламі: ганчарным, якім займаліся 2 двары, даход складаў 18 рублёў, рамізніцкім — 12 двароў, даход — 15 рублёў. Размяшчаўся хлебазапасны магазін. На пачатку XX ст. у Кармянскай воласці Магілёўскай губерні. У 1909 г. 35 двароў, 183 жыхары, 222 дзес. зямлі, належала вясковай сельскай грамадзе. З 20.8.1924 г. у Струменскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Арганізаваны калгас "Усход", працавала кузня.

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС адселена.

МАСЦЕРАВАЯ СЛАБАДА, вёска ў Кароцькаўскім сельсавеце. На пачатку XX ст. у Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. 57 двароў, 378 жыхароў, 363 дзес. зямлі, належала вясковай сельскай грамадзе. З 20.8.1924 г. у Куракаўшчынскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Вясковыя дзеці наведвалі працоўную школу I ступені ў вёсцы Сырск. У 1924—1925 гг. там навучаліся 43 чалавекі вясковых дзяцей. У вёсцы дзейнічалі ветраны млын, кузня, майстэрня па вырабу аўчын. Створаны калгас імя Молатава. З 25.12.1962 г. — вёска ў Рагачоўскім раёне, з 19.9.1963 г. у Кармянскім пасялковым Савеце, у складзе калгаса "Перамога". 22 снежня 1966 г. злучылася з вёскай Сырск.

МІКАЛАЕЎКА, вёска ў Валынцаўскім сельсавеце. На пачатку XX ст. вядома як хутар у Нова-Ельнянскай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні, адносіўся да Кляпінскага праваслаўнага прыхода Пакроўскай царквы. У 1909 г. — 12 двароў, 136 жыхароў, 240 дзес. зямлі, належала мясцовай сельскай грамадзе. З 20.8.1924 г. вёска ў Валынцаўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — хутар, 21 двор, 145 жыхароў. Меліся 2 ветраныя млыны, 2 кузні, малацільня. Створаны калгас "Дружны", працавала кузня. У цяперашні час злучылася з вёскай Валынцы.

МІКОЛЬСК, пасёлак у Ліцвінавіцкім сельсавеце. У канцы XIX — пачатку XX ст. вядомы як фальварак. З 20.8.1924 г. у Хляўнянскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 31 двор, 168 жыхароў (83 муж., 83 жан.), мелася воўначасальня. З 20.9.1975 г. пасёлак у Заламінскім сельсавеце, у складзе саўгаса "Руднянскі".

На 1.1.2002 г. 1 двор, 2 жыхары.

МІХАЛЁЎКА, вёска ў Струкачоўскім сельсавеце. У 1884 г. — 37 двароў, 120 жыхароў, у Расохскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Меўся хлебазапасны магазін. Распаўсюджаны промыслы: ганчарны, даход — 18 рублёў, бандарны — 10 рублёў. Вяскоўцы з'яўляліся прыхаджанамі Расохскага праваслаўнага прыхода і наведвалі Мікалаеўскую царкву. На пачатку XX ст. у Расохскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — 62 двары, 417 жыхароў. Належала вёска мясцовай сельскай грамадзе, якая валодала 703 дзес. зямлі. У 1911 г. пабудавана школа, якая у 1918 г. пераўтворана ў працоўную школу I ступені. У 1924 г. яна насіла імя Вароўскага, навучаліся 35 вучняў з в. Міхалёўка і 153 з в. Дубавіца.

Школе належала 2 дзес. зямлі. Навучанне вялося на беларускай мове. З 20.8.1924 г. вёска ў Струкачоўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 60 двароў, 331 жыхар (156 муж., 175 жан.). Зараз у складзе калгаса "Камуніст" (цэнтр в. Дубавіца).

На 1.1.2002 г. 42 двары, 71 жыхар.

МАШАНАЎКА, пасёлак у Старагарадскім сельсавеце. З 20.8.1924 г. у Задубскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Згодна з перапісам насельніцтва 1926 г. — 8 двароў, 35 жыхароў (21 муж., 14 жан.), меліся конная малацілка і сталярная майстэрня. З 16.7.1954 г. у Старагарадскім сельсавеце. Не існуе.

НАВАСЁЛКІ, вёска ў Барсукоўскім сельсавеце. У XIX ст. вядома як цэнтр маёнтка, прыватная ўласнасць памешчыкаў Случаноўскіх. У 1832 г. была пабудавана Свята-Троіцкая праваслаўная драўляная царква. У 1858 г. — сяло, 182 рэвізскія сялянскія душы (85 муж., 97 жан.), маёмасць памешчыка Захара Случаноўскага. У 1875 г. пасля смерці маёмасць яго сына Івана Случаноўскага, якому належала 1160 дзес. зямлі, сад, даход з якога складаў 200 рублёў, валавы млын. У 1886 г. — прыватнае ўладанне, 50 двароў, 480 жыхароў у Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Размяшчалася праваслаўная царква, хлебазапасны магазін, валавы млын. Штогод у дзень Святой Тройцы адбываўся кірмаш. Былі распаўсюджаны промыслы: ганчарны — даход — 18 рублёў, кравецкі — 10 рублёў. У 1898 г. была адчынена царкоўнапрыходская школа. У 1898 г. праваслаўны прыход аб'ядноўваў 3729 жыхароў сяла і навакольных вёсак, яму належала 37 дзес. зямлі. На пачатку XX ст. сяло ў Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — 92 двары, 665 жыхароў, належала мясцовай сельскай грамадзе, якая мела 809 дзес. зямлі, фальварак (2 двары, 30 жыхароў), належала нашчадкам памешчыка Случаноўскага, якія валодалі 1268 дзес. зямлі. У 1910 г. дзейнічала земская школа, для якой у 1912 г. пабудаваны ўласны будынак. З 20.8.1924 г. вёска ў Барсукоўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 91 двор, 449 жыхароў (221 муж., 228 жан.). Побач размяшчаліся Навасёлкаўскія хутары (17 двароў, 85 жыхароў). На базе дарэвалюцыйнай школы была створана працоўная школа I ступені, якую наведвалі дзеці з навакольных вёсак: Рэвут, Новы Бялец і Бяляеўскія хутары. Створаны калгас "Памяць Леніна", працавала кузня. Зараз у складзе КСУП "Саўгас імя Валадарскага" (цэнтр в. Барсукі).

На 1.1.2002 г. 31 двор, 45 жыхароў.

НОВАЯ БЫЧ (да 30 ліпеня 1964 г.), вёска ў Акцяброўскім сельсавеце. У другой палове XIX ст. у Бычанскай воласці Быхаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1886 г. — прыватнае ўладанне, 86 двароў, 664 жыхары, царкоўнапрыходская школа ў 7 вёрстах, паштовая станцыя Свенсіполь. Адносілася да Бычанскага праваслаўнага прыхода Рыгораўскай царквы. Частка жыхароў поруч з земляробствам займалася рознымі промысламі: адыходным — 40 двароў, даход з яго складаў 17—22 рублі, бандарным — 6 двароў, даход — 15—20 рублёў, колавым — 30 рублёў, кравецкім — 6 двароў, даход — 5—10 рублёў. У 1893 г. пабудавана школа — аднапавярховы драўляны будынак, крыты саломай. На пачатку XX ст. вёска ў Бычанскай воласці Быхаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — 155 двароў, 1057 жыхароў, 1445 дзес. зямлі, якая належала вясковай сельскай грамадзе. У 1916 г. на базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа I ступені, якую наведвалі дзеці з сяла Старая Быч і хутара Сутокі. З 20.8.1924 г. вёска ў Бычанскім (Старабычанскім) сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 170 двароў, 983 жыхары. Створаны калгас "Спартак", мелася кузня. З ліпеня 1964 г. вёскі Новая Быч і Старая Быч атрымалі назву "Акцяброва".

НОВАЕ ЖЫЦЦЁ, пасёлак у Кароцькаўскім сельсавеце. Узнік у 20-ыя гг. XX ст. у час калгаснага будаўніцтва. З 20.8.1924 г. у Куракаўшчынскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Згодна з перапісам насельніцтва 1926 г. — 14 двароў, 70 жыхароў, працавала кравецкая майстэрня па пашыву кажухоў. З 25.12.1962 г. у Рагачоўскім раёне, з

19.9.1963 г. у Кармянскім раёне, у складзе калгаса "Перамога". Не існуе.

НОВАЯ ЗЕНЬКАВІНА, вёска ў Кароцькаўскім сельсавеце. У другой палове XIX ст. у Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1884 г. налічвалася 25 двароў, 188 жыхароў. Асноўным заняткам вяскоўцаў было земляробства, якое спалучалася з промысламі: ганчарным, якім займаліся 9 двароў, даход — 18 рублёў, рамізніцкім — 7 двароў, даход — 15 рублёў, кавальскім — даход 10 рублёў. Размяшчаўся хлебазапасны магазін. На пачатку XX ст. вёска ў Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — 43 двары, 349 жыхароў, належала вясковай сельскай грамадзе, якая валодала 461 дзес. зямлі. З 20.8.1924 г. у Куракаўшчынскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Вясковыя дзеці наведвалі працоўную школу I ступені за 2 км у в. Старая Зенькавіна, дзе ў 1924—1925 гг. навучаліся 10 дзяцей. Створаны калгас імя Якаўлева, меліся конная прасарушка і грэчкарушка, кузня. З 25.12.1962 г. вёска ў Рагачоўскім раёне, з 19.9.1963 г. у Кармянскім раёне.

На 1.1.2002 г. 129 двароў, 359 жыхароў. Клуб, магазін.

НОВАЯ ХАЛАПАЎКА, вёска ў Кароцькаўскім сельсавеце. З 20.8.1924 г. пасёлак у Кароцькаўскім сельсавеце Кармянскага раёна. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 22 двары, 111 жыхароў (54 муж., 57 жан.). З лістапада 1962 г. у Ворнаўскім сельсавеце. Не існуе.

НОВЫ МЛЫН (ДОБРЫЧ), вёска ў Ворнаўскім сельсавеце. У 1816 г. — 12 рэвізскіх сялянскіх душ мужчынскага полу, прыватная ўласнасць. У другой палове XIX ст. вёска ў Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1878 г. належала памешчыцы Пелагеі Дорыа-Дзерналовіч. Заснавана сукнавальня, даход з якой складаў 150 рублёў. У 1884 г. налічваліся 8 двароў, 55 жыхароў. Частка жыхароў (2 двары) займаліся адыходным промыслам, даход — 18 рублёў. У 1909 г. — 13 двароў, 97 жыхароў, 84 дзес. зямлі, якая належала сельскай грамадзе.

На рацэ Добрыч размяшчаліся гаспадарскі двор, вадзяны млын, сукнавальня — уласнасць двараніна А. Дорыа-Дзерналовіча. З 20.8.1924 г. вёска ў Кароцькавіцкім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. У 1926 г. пад назвай Добрыч вядомы 3 населеныя пункты: вёска Добрыч-Млынок (15 двароў, 91 жыхар); 2 пасёлкі — Добрыч-Калодзішкі (4 двары, 22 жыхары) і Добрыч-Падбярэззе (10 двароў, 48 жыхароў). Вясковыя дзеці наведвалі школу за 2 км у вёсцы Сапажкі, у 1924 г. у ёй навучаліся 12 чалавек. Створаны калгас "Чырвоны сцяг", меліся кузня, ветраны млын, сукнавальня. З 9 лістапада 1962 г. у Ворнаўскім сельсавеце, 27 красавіка 1963 г. вёска Добрыч стала называцца Новы Млын. Зараз у складзе калгаса "Рассвет" (цэнтр в. Высокае).

НОВЫ СВЕТ, пасёлак (да 22 снежня 1966 г.) у Струкачоўскім сельсавеце. Узнік у час калгаснага будаўніцтва. З 20.8.1924 г. у Баравабудскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 15 двароў, 86 жыхароў (38 муж., 48 жан.). Пасялковыя дзеці наведвалі Гарадоцкую працоўную школу I ступені, працавала пякарня кандытарскіх вырабаў. 22 снежня 1966 г. пасёлак злучыўся з вёскай Гарадок.

НОВЫЯ РАСОХІ (цяпер Расохі), вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. На пачатку XX ст. вядома як пасёлак у Расохскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. было 28 двароў. З 20.8.1924 г. у Расохскім (Старарасохскім) сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 31 двор, 181 жыхар (85 муж., 96 жан.). З 30.6.1966 г. у Лужкоўскім сельсавеце Чачэрскага раёна, з 30.7.1966 г. у Кармянскім раёне.

На 1.1.2002 г. 59 двароў, 126 жыхароў. Магазін.

НОРКАЎШЧЫНА, вёска ў Струкачоўскім сельсавеце. У 1884 г. — 52 двары, 230 жыхароў, у Расохскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Размяшчаўся хлебазапасны магазін, ветраны млын. Вяскоўцы апрача земляробства займаліся промысламі: ганчарным, даход з якога складаў 18 рублёў, кавальскім, 5 двароў, даход — 10 рублёў,

рамізніцкім, 12 двароў, даход — 10 рублёў. Вяскоўцы з'яўляліся прыхаджанамі Расохскага праваслаўнага прыхода і наведвалі Свята-Троіцкую царкву. На пачатку XX ст. вёска ў Расохскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1902 г. адчынена царкоўнапрыходская школа. У 1909 г. — 78 двароў, 284 жыхары, належала вясковай сельскай грамадзе, якая валодала 100 дзес. зямлі. У 1918 г. на базе дарэвалюцыйнай школы была створана працоўная школа I ступені, у 1921 г. для яе пабудавалі ўласны будынак, драўляную хату памерам 10 х 7 м, крытую саломай. З 20.8.1924 г. — вёска ў Струкачоўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 93 двары, 564 жыхары (273 муж., 291 жан.). Створаны калгас "Новы прасвет", працавалі ветраны млын, кузня. Зараз у складзе калгаса "Камуніст" (цэнтр в. Дубавіца).

На 1.1.2002 г. 60 двароў, 123 жыхары. Магазін.

ПАКРОЎСКІ, пасёлак у Каменскім сельсавеце. З 20.8.1924 г. у Каменскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Згодна з перапісам насельніцтва 1926 г. — 12 двароў, 63 жыхары (30 муж., 33 жан.). З 20.8.1929 г. у Курганскім сельсавеце, з 30.6.1966 г. у Каменскім сельсавеце Чачэрскага раёна, з 30.7.1966 г. Кармянскага раёна, у складзе калгаса "Кастрычнік" (цэнтр в. Кучын).

На 1.1.2002 г. 8 двароў, 9 жыхароў.

ПАСЕКА-СЛАБОДКА, вёска ў Старградскім сельсавеце. У 1848 г. вядома ў складзе фальварка Стараград, прыватная ўласнасць памешчыка Людвіга Случаноўскага, налічвалася 133 рэвізскія сялянскія душы (64 муж., 69 жан.). У другой палове XIX ст. у Доўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1884 г. — 36 двароў, 169 жыхароў. Быў распаўсюджаны ганчарны промысел, даход з якога складаў 17 рублёў. Вяскоўцы адносіліся да Хізаўскага праваслаўнага прыхода, наведвалі Георгіеўскую царкву. На пачатку XX ст. вёска ў Доўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. З 20.8.1924 г. у Задубскім сельсавеце Кармянскага раёна, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 19 двароў, 108 жыхароў (44 муж., 64 жан.). Побач знаходзіўся аднайменны хутар — 16 двароў, 104 жыхары (65 муж., 39 жан.). Існавала сталярная майстэрня, у якой працавалі 2 сталяры. Створаны калгас "Шлях Леніна", працавала кузня. З 16.7.1954 г. вёска ў складзе Стараградскага сельсавета, зараз у складзе КСУП "Саўгас Стараград" (цэнтр в. Стараград).

На 1.1.2002 г. 21 двор, 37 жыхароў.

ПАШТОВАЯ ГЛІНКА, вёска ў Ліцвінавіцкім сельсавеце. У другой палове XIX ст. у Бычанскай воласці Быхаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1884 г. — 26 двароў, 121 жыхар. Частка жыхароў земляробства спалучалі з рознымі промысламі: адыходным займаліся 9 двароў, і даход складаў 17—22 рублі, кавальскім — 10—15 рублёў. Вяскоўцы з'яўляліся прыхаджанамі праваслаўнага Хляўнянскага прыхода і наведвалі Праабражэнскую царкву. На пачатку XX ст. вёска ў Бычанскай воласці Быхаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — 35 двароў, 224 жыхары, 382 дзес. зямлі, якая належала вясковай сельскай грамадзе. З 20.8.1924 г. вёска ў Хляўнянскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Дзеці наведвалі працоўную школу I ступені. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 47 двароў, 270 жыхароў (129 муж., 141 жан.), мелася кузня. З 2.9.1975 г. у Залатамінскім сельсавеце.

На 1.1.2002 г. 15 двароў, 27 жыхароў.

ПЕРШАЯ СТУПЕНЬ, пасёлак (да 1951 г. назва Кажаны) у Ліцвінавіцкім сельсавеце. Вядомы з пачатку XX ст. З 20.8.1924 г. у Ліцвінавіцкім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 14 двароў, 83 жыхары (38 муж., 45 жан.). Зараз у складзе калгаса імя Ляпяшынскага (цэнтр в. Ліцвінавічы).

Адселены ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

ПРАЎДА, вёска ў Струкачоўскім сельсавеце. Узнікла ў час калгаснага будаўніцтва на месцы сельскагаспадарчай арцелі "Праўда". З 20.8.1924 г. у Струкачоўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 8 двароў, 41 жы-

хар (21 муж., 20 жан.). Дзеці наведвалі працоўную школу І ступені за 1,5 км у вёсцы Струкачоўка. Зараз у складзе КСУП "Саўгас імя Чапаева" (цэнтр в. Баравая Буда).

На 1.1.2002 г. 5 двароў, 16 жыхароў.

ПЯТРАВІЧЫ, вёска ў Стараградскім сельсавеце. У XIX ст. вядома як цэнтр аднайменнага фальварка. У 1858 г. — 177 рэвізскіх сялянскіх душ (91 муж., 86 жан.), прыватная ўласнасць памешчыка штабс-капітана І. Сідарэнкі. У 1884 г. налічваліся 67 двароў, 414 жыхароў, меліся два млыны, карчма. Частка жыхароў займалася промысламі: ганчарным — 18 двароў, даход — 18 рублёў. На пачатку XX ст. вёска ў Доўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. адчынена земская школа. У 1909 г. — 111 двароў, 722 жыхары, 958 дзес. зямлі, належала вясковай сельскай грамадзе. Побач размяшчаўся фальварак, які належаў памешчыцы Белаш (327 дзес. зямлі). У 1918 г. створана працоўная школа І ступені ў нацыяналізаваным памешчыцкім будынку. У 1924 г. там навучаліся 80 чалавек. З 20.8.1924 г. у Задубскім сельсавеце Кармянскага раёна, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 116 двароў, 630 жыхароў (300 муж., 330 жан.). Размяшчаліся кравецкая майстэрня, ручная маслабойня і шавецкая майстэрня. Побач былі Пятравіцкія хутары: 10 двароў, 45 жыхароў.

У вёсцы створаны калгас "Чырвоны маяк", працавалі два ветраныя млыны, кузня. З 16.7.1954 г. у Стараградскім сельсавеце. Зараз у складзе КСУП "Саўгас "Стараградскі" (цэнтр в. Стараград).

На 1.1.2002 г. 82 двары, 186 жыхароў. Магазін.

РАССВЕТ, вёска ў Кароцькаўскім сельсавеце. Узнікла ў 20-ыя гг. у час калгаснага будаўніцтва. З 20.8.1924 г. у Куракаўшчынскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Згодна з перапісам 1926 г. — 10 двароў, 64 жыхары (29 муж., 35 жан.). З 25.12.1962 г. у Рагачоўскім раёне, з 19.9.1963 г. у Кармянскім раёне, у складзе калгаса "Перамога". Не існуе.

РАТНІК ХАЛАПАЎСКІ, пасёлак у Ворнаўскім сельсавеце. У 20-ыя гг. XX ст. вядомы пад назвай Ратнік. З 20.8.1924 г. у Кароцькаўскім сельсавеце Кармянскага раёна. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 9 двароў, 51 жыхар (24 муж., 27 жан.). З лістапада 1962 г. у Ворнаўскім сельсавеце, у складзе калгаса "Рассвет" (цэнтр в. Высокае). Не існуе.

РУДНЯ, пасёлак у Ворнаўскім сельсавеце. У 1840 г. памешчыца Разалія Караткевіч валодала 129 дзес. зямлі. У 1868 г. прыватная ўласнасць памешчыка Вітольда Лашкевіча, мелася сукнавальня, даход — 120 рублёў, у 1884 г. — сукнавальня і вадзяны млын з даходам 195 рублёў. На пачатку XX ст. вядома як Рудня-Добрыцкая ў Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. Рудня-Добрыцкая на р. Добрыч, 2 двары, 11 жыхароў, належалі двараніну Казлоўскаму. З 20.8.1924 г. у Кароцькаўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 22 двары, 92 жыхары (44 муж., 48 жан.). Вясковыя дзеці наведвалі за 2 км школу ў вёсцы Кароцькавічы. Існавалі сукнавальня, турбінны млын. Створаны калгас "Ленінскі шлях", меліся вадзяны млын, кузня. З 9 лістапада 1962 г. вёска ў Ворнаўскім сельсавеце, у складзе калгаса "Рассвет" (цэнтр в. Высокае).

На 1.1.2002 г. 6 двароў, 8 жыхароў.

РУДНЯ, вёска ў Ліцвінавіцкім сельсавеце. Узнікла на месцы рудні, дзе ў плавільных печах выраблялася жалеза, з якога атрымлівалі сельскагаспадарчыя прылады (сярпы, сякеры і г.д.) для ўнутраных патрэб. У другой палове XIX ст. вёска ў Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1884 г. — 11 двароў, 73 жыхары. Распаўсюджаны ганчарны промысел, якім займаліся 3 двары, і даход складаў 18 рублёў. На пачатку XX ст. у Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — 27 двароў, 150 жыхароў належалі вясковай сельскай грамадзе, якая валодала 201 дзес. зямлі. З 20.8.1924 г. вёска, цэнтр Руднянскага сельсавета Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 94 двары, 481 жыхар (240 муж., 241 жан.). З 16.7.1954 г. тэрыторыя сельсавета ліквідавана, уключана ў

Ліцвінавіцкі сельсавет. 19 красавіка 1978 г. пасёлак Барысаўка злучыўся з вёскай Рудня. Зараз ў складзе калгаса імя Лепяшынскага (цэнтр в. Ліцвінавічы).

На 1.1.2002 г. 3 двары, 4 жыхары.

РЭВУТ, вёска ў Барсукоўскім сельсавеце. У 1867 г. маёмасць памешчыка падпалкоўніка А. С. Мелеха, які заснаваў тут крупадзёрны завод. У 1884 г. — 44 двары, 289 жыхароў, у Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Размяшчаліся хлебазапасны магазін, вадзяны млын. Распаўсюджаны ганчарны промысел, ім займаліся 8 двароў, даход складаў 18 рублёў. На пачатку XX ст. вёска ў Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — 48 двароў, 443 жыхары, належала вясковай сельскай грамадзе, якая валодала 797 дзес. зямлі. З 1918 г. вясковыя дзеці наведвалі працоўную школу I ступені, за 1,5 км у вёсцы Навасёлкі. З 20.8.1924 г. вёска ў Барсукоўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу 1926 г. — 93 двары, 445 жыхароў (223 муж., 232 жан.), меліся кравецкая і шавецкая майстэрні. Створаны калгас "Чырвоны сормавец", працавалі кузня, воўначасальня. У час Вялікай Айчыннай вайны вёска са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе КСУП "Саўгас імя Валадарскага" (цэнтр в. Барсукі).

На 1.1.2002 г. 31 двор, 34 жыхары.

САЛАБУТА, вёска ў Залатамінскім сельсавеце. У другой палове XIX ст. вядома ў Бычанскай воласці Быхаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1884 г. — 27 двароў, 118 жыхароў. Распаўсюджаны адыходны промысел, даход — 17—22 рублі. Адносілася да праваслаўнага Хляўнянскага прыхода, вяскоўцы наведвалі Праабражэнскую царкву. У 1909 г. — вёска, 33 двары, 269 жыхароў, 381 дзес. зямлі, належала вясковай сельскай грамадзе. З 20.8.1924 г. у Хляўнянскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Вясковыя дзеці наведвалі працоўную школу I ступені за 2 км у вёсцы Студзянец. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 54 двары, 283 жыхары (131 муж., 152 жан.). Створаны калгас "Чырвоны партызан", меліся 2 ветраныя млыны, кузня. З 2.9.1975 г. вёска ў Залатамінскім сельсавеце, у складзе саўгаса "Руднянскі" (цэнтр в. Залатаміно).

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС адселена.

САПАЖКІ, вёска ў Кароцькавіцкім сельсавеце. У канцы XVII — пачатку XVIII ст. вядома ў Чачэрскім старостве Вялікага княства Літоўскага як баярскае паселішча пад назвай Сапагі. Паводле інвентару 1726 г. — вёска, 4 дымы, 1 служба, належала Чачэрскаму замку, якому баяры плацілі гіберну, павінны былі мець добрую зброю і каня. Апрача гэтага, неслі розныя павіннасці: будавалі і рамантавалі масты, развозілі пошту, з'яўляліся на кірмашах у якасці паліцэйскіх. У 1884 г. — ваколіца Сапажкі (яна ж Сапагі), 54 двары, 284 жыхары ў Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Размяшчаўся хлебазапасны магазін. Частка жыхароў займалася рознымі промысламі: ганчарным, 13 двароў, даход — 18 рублёў, кравецкім — 50 рублёў, бандарным — 15 рублёў. На пачатку XX ст. ваколіца ў Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1906 г. адчынена царкоўнапрыходская школа. У 1909 г. — ваколіца, 78 двароў, 154 жыхары, 671 дзес. зямлі, якая належала мясцовай сельскай грамадзе. На базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа I ступені, якая размяшчалася ў наёмным памяшканні, за якое ў месяц плацілі па 6 рублёў. Навучанне вялося на беларускай мове. З 20.8.1924 г. вёска ў Кароцькаўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 102 двары, 458 жыхароў (58 муж., 66 жан.). Размяшчалася швейная майстэрня. Створаны калгас "Чырвоны сцяг", меліся ветраны і вадзяны млыны, кузня. З 25.12.1962 г. у Рагачоўскім раёне, з 6.1.1965 г. у Чачэрскім, з 30.7.1966 г. у Кармянскім раёне. Зараз у складзе КСУП "Саўгас "Кармянскі" (в. Кароцькі).

На 1.1.2002 г. 12 двароў, 18 жыхароў.

СКАРТЫНЬ, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. У 1884 г. — 34 двары, 150 жыхароў, у Расохскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Часткова вяскоўцы апрача

земляробства займаліся рознымі промысламі: кавальскім (даход — 15 рублёў), ганчарным (даход — 5 рублёў). Адносілася да Расохскага праваслаўнага прыхода, вяскоўцы наведвалі Мікалаеўскую царкву. На пачатку XX ст. належала сельскай грамадзе, якая валодала 549 дзес. зямлі. У 1909 г. налічвалася 47 двароў, 353 жыхары. З 20.8.1924 г. вёска ў Расохскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 60 двароў, 327 жыхароў (152 муж., 175 жан.). Размяшчаўся ветраны млын. Вясковыя дзеці наведвалі працоўную школу I ступені, за 4 км у сяле Расохі. Створаны калгас "Лужкоўскі", працавала кузня. З 30.6.1966 г. у Лужкоўскім сельсавеце Чачэрскага раёна, з 30.7.1966 г. у Кармянскім раёне. Зараз у складзе калгаса "Бальшавік" (цэнтр в. Лужок).

На 1.1.2002 г. 22 двары, 31 жыхар.

СТАРАГРАД, цэнтр сельсавета і камунальнага сельгаспрадпрыемства "Саўгас "Стараградскі" на рацэ Добрыч, за 16 км на захад ад Кармы, 94 км ад Гомеля, 44 км ад чыгуначнай станцыі Рагачоў, 20 км ад прыстані Карма (на р. Сож). На аўтамабільнай дарозе Карма—Доўск. У пачатку XIX ст. вядома як цэнтр аднайменнага фальварка, прыватная ўласнасць памешчыкаў Случаноўскіх. У 1848 г. маёмасць памешчыка Людвіга Случаноўскага. У склад фальварка ўваходзілі 2 вёскі: Хізаўская Буда, Пасека-Слабодка, у якіх налічваліся 426 рэвізскіх сялянскіх душ. Памешчыку належала 1758 дзес. зямлі, сялянам — 910. У 1874 г. — прыватная ўласнасць памешчыцы Марыі Случаноўскай, якая валодала 1004 дзес. зямлі. Меўся валавы млын, даход з якога складаў 40 рублёў, вадзяны млын і сукнавальня (120 рублёў). На пачатку XX ст. у Доўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — фальварак (7 двароў, 22 жыхары), належаў памешчыцы Случаноўскай, якая мела 862 дзес. зямлі. З 2.8.1924 г. у Задубскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, у 1930-ыя гг. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 2 двары, 25 жыхароў (17 муж., 18 жан.). Створаны калгас імя Леніна, працавалі кузня, ветраны млын, вадзяны турбінны млын. У 1974 г. цэнтр сельсавета і саўгаса "Стараградскі". Камбінат бытавога абслугоўвання. Бібліятэка, аддзяленне сувязі, сталовая, магазін.

На 1.1.2002 г. 127 двароў, 359 жыхароў. Клуб, бібліятэка, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, магазін.

СТАРАЯ ЗЕНЬКАВІНА, вёска ў Кароцькаўскім сельсавеце. У 1816 г. — цэнтр маёнтка, 714 рэвізскіх сялянскіх душ (371 жан., 343 муж.). У 1884 г. — 47 двароў, 307 жыхароў. Размяшчаўся хлебазапасны магазін. Распаўсюджаны промыслы: ганчарны, ім займаліся 40 двароў, і даход складаў 18 рублёў, рамізніцкі — 10 двароў, даход — 15 рублёў. На пачатку XX ст. вёска ў Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1906 г. адчынена земская школа. У 1909 г. налічвалася 64 двары, 476 жыхароў, належала мясцовай сельскай грамадзе, якая валодала 683 дзес. зямлі. На базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа I ступені, якая размяшчалася ў наёмным памяшканні. Навучанне вялося на беларускай мове. У 1924—1925 гг. вучыліся 50 дзяцей са Старой Зенькавіны і 10 — з вёскі Новая Зенькавіна. З 20.8.1924 г. вёска ў Куракаўшчынскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Створаны калгас "Чырвоны Кастрычнік". Меліся конны і паравы млыны, конная крупарушка. З 25.12.1962 г. у Рагачоўскім раёне, з 19.9.1963 г. у Кармянскім пасялковым Савеце.

На 1.1.2002 г. 75 двароў, 142 жыхары.

СТАРАЯ ХАЛАПАЎКА, вёска ў Ворнаўскім сельсавеце. У другой палове XIX ст. вядома пад назвай Хулапаўка ў Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1884 г. налічвалася 33 двары. Апрача земляробства сяляне займаліся ганчарным промыслам (3 двары, даход — 18 рублёў). Размяшчаўся хлебазапасны магазін. На пачатку XX ст. ваколіца Хулапаўка ў Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — ваколіца, 57 двароў, 74 жыхары, належала мясцовай сельскай грамадзе, якая мела 342 дзес. зямлі. З 20.8.1924 г. у Кароцькаўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 19 двароў, 87 жыхароў (41 муж., 46 жан.). З лістапада 1962 г. у Ворнаўскім сельсавеце, у складзе

калгаса "Рассвет" (цэнтр в. Высокае). Не існуе.

СТАРЫЯ РАСОХІ (цяпер Расохі), вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. У XVIII ст. вядома пад назвай Расохі як каралеўскае ўладанне ў Вялікім княстве Літоўскім. У 1765 г. — маёмасць суддзі пана Скарыны ў Рэчыцкім павеце Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага. У 1787 г. пабудавана драўляная Мікалаеўская праваслаўная царква. У 1858 г. — сяло, 189 рэвізскіх сялянскіх душ (93 муж., 105 жан.). Уладальніку належала 3 карчмы, валавы і вадзяны млыны, 2 фруктовыя сады, 2737 дзес. зямлі. У 1863 г. адчынена народнае вучылішча. У 1886 г. — цэнтр Расохскай воласці ў Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні, 62 двары, 379 жыхароў. Меліся вадзяны і ветраны млыны, штогод у красавіку і кастрычніку адбываліся кірмашы. У 1898 г. у праваслаўны Расохскі прыход уваходзіла 3838 прыхаджан сяла і навакольных вёсак, царкве належала 34 дзес. зямлі. У 1914 г. працавала земская школа, якая ў 1918 г. пераўтворана ў працоўную школу І ступені, размяшчалася ва ўласным будынку. Навучаліся дзеці з суседніх вёсак: Хлусы, Скартынь і навакольных пасёлкаў і хутароў. Навучанне вялося на беларускай мове. З 20.8.1924 г. вёска, цэнтр Расохскага сельсавета Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 83 двары, 414 жыхароў (205 муж., 209 жан.). Расохскія хутары: 16 двароў, 82 жыхары. У вёсцы меліся малацілка, вадзяны млын. На хутарах працавала маслабойня. Створаны калгас "Саюз", працаваў вадзяны млын. З 30.6.1966 г. у Лужкоўскім сельсавеце Чачэрскага раёна, з 30.7.1966 г. у Кармянскім сельсавеце. Зараз у складзе калгаса "Бальшавік" (цэнтр в. Лужок).

На 1.1.2002 г. 59 двароў, 126 жыхароў. Магазін.

СТРУКАЧОЎ, вёска, цэнтр сельсавета. У 1886 г. — былое ўладанне на р. Горка, 95 двароў, 541 жыхар у Расохскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Размяшчаліся 2 ветраныя млыны, хлебазапасны магазін. Асноўным заняткам вяскоўцаў было земляробства, якое яны спалучалі з рознымі промысламі: ганчарным — даход — 18 рублёў, кравецкім — 10 рублёў. Вёска адносілася да праваслаўнага Расохскага прыхода, вяскоўцы наведвалі Мікалаеўскую царкву. У 1885 г. была пабудавана школа. На пачатку XX ст. вёска ў Расохскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1907 г. дзейнічала земская школа. У 1909 г. — 153 двары, 995 жыхароў, належала вясковай сельскай грамадзе, якая мела 2126 дзес. зямлі. На базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа І ступені, якая размяшчалася ва ўласным будынку. Навучанне вялося на беларускай мове. З 20.8.1924 г. цэнтр Струкачоўскага сельсавета Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — пасёлак, 25 двароў, 133 жыхары (53 муж., 80 жан.). Побач Струкачоўскія хутары: 11 двароў, 71 жыхар (39 муж., 32 жан.). Створаны калгас імя Розы Люксембург, працавалі ветраны млын, кузня. 29 жніўня 1974 г. вёска Лозкі злучылася са Струкачовам. Зараз у складзе саўгаса імя Чапаева (цэнтр в. Баравая Буда).

На 1.1.2002 г. 120 двароў, 389 жыхароў. Сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, дзіцячы сад, сталовая, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, магазіны.

СТРУМЕНЬ, вёска, цэнтр сельсавета. Знаходзіцца за 9 км на паўночны ўсход ад Кармы, 119 км ад Гомеля, 69 км ад чыгуначнай станцыі Рагачоў, за 5 км ад прыстані Карма (на р. Сож). У канцы XVII ст. вядома як баярскае паселішча ў Чачэрскім старостве Вялікага княства Літоўскага. Належала Чачэрскаму замку. Паводле інвентару 1704 г. — вёска, 8 дымоў, 1 служба (меліся рыбныя ловы, штогод баяры плацілі гіберну 120 злотых). У 1726 г. налічвалася 7 дымоў, 1 служба, гіберна складала 60 кап. Баяры неслі розныя павіннасці, будавалі і рамантавалі масты, развозілі пошту, з'яўляліся на кірмашах у якасці паліцэйскіх і павінны былі мець добрую зброю і каня. У 1765 г. — баярская вёска, 17 гаспадарак, шляхецкая ўласнасць пана Маліноўскага ў Рэчыцкім павеце Мінскага ваяводства. Мелася карчма. У 1884 г. — ваколіца, 76 двароў, 399 жыхароў у Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Дзейнічалі хлебазапасны магазін, праваслаўная царква. Рас-

паўсюджаны рамізніцкі промысел, ім займаліся 60 двароў, даход — 15 рублёў, ганчарны — 18 рублёў, кавальскі — 25 рублёў, сталярны — 15 рублёў. На пачатку XX ст. у Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1907 г. адчынена земская школа. У 1909 г. пад назвай "Струмень" існавалі 2 населеныя пункты: вёска — 31 двор, 236 жыхароў; ваколіца — 126 двароў, 340 жыхароў. З 20.8.1924 г. цэнтр сельсавета Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Працавала школа, якую наведвалі дзеці з ваколіцы Струмень, вёсак Лазовіца і Данізаўка. У школе мелася маленькая бібліятэчка. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. пад назвай Струмень было тры населеныя пункты: ваколіца — 119 двароў, 536 жыхароў; вёска — 55 двароў, 326 жыхароў; кардон — 1 двор, 5 жыхароў. Меліся кузня, крупарушка, ветраны млын, швейная майстэрня.

У 1974 г. цэнтр калгаса "Радзіма". Хлебапякарня, малочны завод, швейная майстэрня, лясніцтва. Сярэдняя школа, клуб, 2 бібліятэкі, бальніца, аптэка, ветэрынарны ўчастак, аддзяленне сувязі, сталовая, 3 магазіны.

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС адселена.

СТУДЗЯНЕЦ, вёска ў Ліцвінавіцкім сельсавеце. У другой палове XIX ст. у Бычанскай воласці Быхаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1884 г. налічвалася 28 двароў, 91 жыхар. Частка жыхароў займалася промысламі: кавальскім, даход — 10—15 рублёў, адыходным — 17—22 рублі. Вяскоўцы з'яўляліся прыхаджанамі праваслаўнага Хляўнянскага прыхода і наведвалі Праабражэнскую царкву. У 1909 г. — вёска, 38 двароў, 348 жыхароў, 202 дзес. зямлі, якая належала вясковай сельскай грамадзе; выселак, 4 двары, 35 жыхароў, 35 дзес. зямлі, належала мясцовай сельскай грамадзе. У 1913 г. адчынена земская школа. З 1918 г. пераўтворана ў працоўную школу I ступені, якую наведвалі дзеці з вёсак Лабыроўка і Салабута. У 1924 г. навучаліся 40 дзяцей. З 20.8.1924 г. вёска ў Руднянскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Згодна перапісу насельніцтва 1926 г. — 42 двары, 230 жыхароў (118 муж., 112 жан.). Побач знаходзіўся аднайменны хутар: 5 двароў, 31 жыхар (14 муж., 17 жан.). З 2.9.1975 г. у Залатамінскім сельсавеце, у складзе саўгаса "Руднянскі" (цэнтр в. Залатаміно).

На 1.1.2002 г. 18 двароў, 31 жыхар.

СЫРСК, вёска ў Кароцькаўскім сельсавеце. У 1765 г. — прыватная ўласнасць мінскага харунжага пана Быкоўскага ў Рэчыцкім павеце Мінскага ваяводства. У 1816 г. — цэнтр аднайменнага маёнтка, у якім налічвалася 171 рэвізская сялянская душа мужчынскага полу. У 1884 г. — вёска, 55 двароў, 529 жыхароў, у Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. Распаўсюджаны ганчарны промысел, якім займалася 14 двароў, даход — 18 рублёў, размяшчаўся хлебазапасны магазін. У 1884 г. Епархіяльным ведамствам адчынена школа граматы. На пачатку XX ст. вёска ў Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. налічваліся 81 двор, 592 жыхары, належала вясковай сельскай грамадзе, якая валодала 606 дзес. зямлі. На базе дарэвалюцыйнай школы была створана двухкамплектная чатырохгадовая школа. У 1924—1925 гг. навучаліся 119 вучняў з Сырска і навакольных населеных пунктаў: Масцеравой Слабады і двух пасёлкаў. Школа размяшчалася ў нацыяналізаваным будынку. З 20.8.1924 г. у Куракаўшчынскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 99 двароў, 498 жыхароў (243 муж., 255 жан.). Меліся кравецкая майстэрня, працавалі 2 краўцы, малацілка, кузня. У вёсцы была створана сенна-колавая майстэрня, арцель імя Будзённага. З 25.12.1962 г. вёска ў Рагачоўскім раёне, з 19.9.1963 г. у Кармянскім пасялковым Савеце, 22 снежня 1966 г. з ёй злучылася вёска Масцеравая Слабада.

На 1.1.2002 г. 221 двор, 482 жыхары. Аўтапарк № 5, база ПМК-102. Магазіны.

СЫРСКАЯ БУДА, вёска ў Барсукоўскім сельсавеце. У другой палове XIX ст. вядома пад назвай Буда ў Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1884 г. налічваліся 34 двары, 255 жыхароў. Асноўным заняткам вяскоўцаў было земляробства, якое яны спалучалі з промысламі: ганчарным, якім займаліся 16 двароў, даход — 18 рублёў, кавальскім — 3 двары, даход — 10 рублёў, выра-

бам драўлянага посуду — 15 рублёў. На пачатку XX ст. вёска ў Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. З 20.8.1924 г. у Барсукоўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Згодна перапісу насельніцтва 1926 г. — 68 двароў, 349 жыхароў. На базе дарэвалюцыйнай школы ў 1923 г. створана працоўная школа I ступені, якая размяшчалася ў нацыяналізаваным будынку (драўляным аднапавярховым доме, крытым гонтай). Школу наведвалі дзеці з суседняй вёскі Барсукова. Навучанне вялося на беларускай мове. Створаны калгас "Непераможны". Працавалі кузня, воўначасальня, ветраны млын, швейная майстэрня. У час Айчыннай вайны вёска са жніўня 1941 г. па лістапад 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе КСУП "Саўгас імя Валадарскага" (цэнтр в. Барсукі).

На 1.1.2002 г. 24 двары, 58 жыхароў.

СЯМЁНАЎКА, вёска ў Кароцькаўскім сельсавеце. У 20-ыя гг. XX ст. вядома як пасёлак. З 20.8.1924 г. у Куракаўшчынскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 8 двароў, 53 жыхары (29 муж., 24 жан.). З 25.12.1962 г. вёска ў Рагачоўскім раёне, з 19.9.1963 г. у Кармянскім раёне.

На 1.1.2002 г. 59 двароў, 166 жыхароў.

ТАРАХАЎКА, вёска ў Барсукоўскім сельсавеце. У XIX ст. Тарахаўка (яна ж Млынок) вядома як цэнтр аднайменнага маёнтка, прыватная ўласнасць памешчыкаў Случаноўскіх у Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1858 г. — 214 рэвізскіх сялянскіх душ, маёмасць памешчыкаў Ігнація, Аляксандра і Міхаіла Случаноўскіх. У 1875 г. належала памешчыку Аляксандру Случаноўскаму, які валодаў 541 дзес. зямлі і меў ветраны, 2 вадзяныя млыны, сукнавальню, карчму. У 1884 г. — 44 двары, 313 жыхароў. Распаўсюджаны промыслы: ганчарны, даход — 18 рублёў, кавальскі — 10 рублёў, абутковы — 10 рублёў. У 1893 г. вяскоўцы на свае сродкі пабудавалі школу, з 1895 г. яна перайшла на ўтрыманне духавенства і стала называцца царкоўнапрыходскай. На пачатку XX ст. у Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — 87 двароў, 519 жыхароў, належала вясковай сельскай грамадзе, якая мела 408 дзес. зямлі; фальварак, 1 двор, 12 жыхароў, належала двараніну А. М. Случаноўскаму, які валодаў 345 дзес. зямлі. У 1910 г. царкоўнапрыходская школа пераўтворана ў земскую. У 1918 г. на базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа I ступені, тады ж ёй быў перададзены пакой былога маёнтка памешчыка А. Случаноўскага. У 1924 г. навучаліся 40 дзяцей, ёй належала 2 дзес. зямлі. З 20.8.1924 г. у Хізаўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — вёска: 78 двароў, 498 жыхароў; хутар: 1 двор, 8 жыхароў. Створаны калгас "Камінтэрн", працавала кузня. Зараз у складзе КСУП "Саўгас імя Валадарскага" (цэнтр в. Барсукі).

На 1.1.2002 г. 17 двароў, 37 жыхароў.

ТРУД, вёска (да 1963 г. Асецкая) у Струменскім сельсавеце. З 20.8.1924 г. у Струменскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Створаны калгас "Труд", працавала кузня. У 1963 г. вёска атрымала назву Труд, якую насіў калгас, уваходзіла ў склад калгаса "Радзіма" (цэнтр в. Струмень).

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС адселена.

ХІЗАЎ, вёска ў Стараградскім сельсавеце, цэнтр камунальнага сельгаспрадпрыемства "Саўгас "Багданавічы". У 1765 г. — маёмасць пані Парчэўскай у Рэчыцкім павеце Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага. У пачатку XIX ст. маёмасць памешчыкаў Случаноўскіх, потым прыватная ўласнасць нашчадкаў памешчыка Людвіга Случаноўскага. У 1863 г. пабудавана праваслаўная драўляная Георгіеўская царква. У 1877 г. заснавана сукнавальня, якая сумесна з млыном здавалася ў арэнду за 140 рублёў. У 1886 г. — сяло, былое ўладанне на р. Добрыч, 65 двароў, 507 жыхароў. Меліся вадзяны млын, хлебазапасны магазін, праваслаўная царква, царкоўнапрыходская школа. Хізаўскі прыход у 1898 г. аб'ядноўваў 3640 прыхаджан сяла і навакольных вёсак. Царкве належала 55 дзес. зямлі. На пачатку XX ст. сяло ў Доўскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — 132 два-

ры, 877 жыхароў, 1126 дзес. зямлі, належала мясцовай сельскай грамадзе. У 1918 г. школа пераўтворана ў працоўную школу I ступені, яна размяшчалася ў нацыяналізаваным панскім будынку. У 1924 г. там навучаліся 140 дзяцей. З 20.8.1924 г. цэнтр Хізаўскага сельсавета Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 147 двароў, 730 жыхароў (351 муж., 137 жан.). Побач размяшчаліся Хізаўскія хутары: 44 двары, 267 жыхароў (230 муж., 137 жан.). Існавалі слясарная, кравецкая, 2 шавецкія майстэрні, у якіх працавалі па 2 чалавекі, малацілка. На хутарах меліся кавальская, кравецкая майстэрні, вадзяны млын. Створаны калгас "Новы свет". З 16.7.1954 г. у Стараградскім сельсавеце.

На 1.1.2002 г. 151 двор, 487 жыхароў. Сярэдняя школа, дзіцячы сад, аддзяленне сувязі, фельчарска-акушэрскі пункт, сталовая, магазін.

ХЛЯЎНО, вёска ў Залатамінскім сельсавеце. У другой палове XIX ст. у Бычанскай воласці Быхаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1885 г. пабудавана каменная праваслаўная Праабражэнская царква. У 1886 г. — былое ўладанне, 87 двароў, 641 жыхар, піцейны двор, таржок. Распаўсюджаны адыходны промысел, якім займаліся 38 двароў, даход складаў 17—22 рублі, бондарскі, даход — 10—15 рублёў, кавальскі — 80—120 рублёў, кравецкі — 5—10 рублёў. У 1898 г. адчынена царкоўнапрыходская школа. У 1898 г. Хляўнянскі прыход аб'ядноўваў 3456 прыхаджан сяла і навакольных вёсак. Царкве належала 52 дзес. зямлі. На пачатку XX ст. сяло ў Бычанскай воласці Быхаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1900 г. пабудаваны для школы ўласны будынак. У 1909 г. — сяло на р. Хлявянка: 141 двор, 1073 жыхары, 1276 дзес. зямлі, якая належала мясцовай сельскай грамадзе. У 1918 г. на базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа I ступені, якую наведвалі дзеці з 6 навакольных вёсак. Навучанне вялося на рускай і беларускай мовах. З 20.8.1924 г. цэнтр Хляўнянскага сельсавета Кармянскага раёна Магілёўскай губерні. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 221 двор, 1190 жыхароў (597 муж., 593 жан.). Апрача сялян тут жылі 4 краўцы, слесар-інструментальшчык, 2 аўчыннікі, 2 шаўцы. Меліся 3 ветраныя млыны, сталярная майстэрня. Створаны калгас імя Максіма Горкага, працавалі 2 ветраныя млыны, кузня.

З 2.9.1975 г. у складзе саўгаса "Руднянскі" (цэнтр в. Залатаміно).

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС адселена.

ЧАМУШАЛЬ, пасёлак у Лужкоўскім сельсавеце. Вядомы з 20-ых гг. XX ст. З 20.8.1924 г. у Расохскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 28 двароў, 159 жыхароў (87 муж., 72 жан.). З 30.6.1966 г. у Лужкоўскім сельсавеце Чачэрскага раёна, з 30.7.1966 г. у Кармянскім раёне, у калгасе "Бальшавік" (цэнтр в. Лужок).

На 1.1.2002 г. 1 двор, 4 жыхары.

ШАЛАМЕІ, вёска ў Струкачоўскім сельсавеце. У першай палове XIX ст. уласнасць памешчыка Коўзаня, затым яго дачкі Соф'і Сімпліцынавай. У 1858 г. налічвалася 249 рэвізскіх сялянскіх душ (128 муж., 121 жан.). У другой палове XIX ст. вядома як цэнтр аднайменнага маёнтка ў Расохскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1884 г. налічваліся 44 двары, 326 жыхароў. Распаўсюджаны промыслы: кавальскі, даход — 20 рублёў, кравецкі — 15 рублёў, якія прыносілі значны даход у гаспадарку. Вяскоўцы з'яўляліся прыхаджанамі праваслаўнага Навасёлкаўскага прыхода і наведвалі Свята-Троіцкую царкву. На пачатку XX ст. вёска і маёнтак у Расохскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — вёска, 70 двароў, 442 жыхары, належала мясцовай сельскай грамадзе, якая валодала 518 дзес. зямлі; маёнтак, 1 двор, 6 жыхароў, належала нашчадкам памешчыка I. Коўзаня. З 20.8.1924 г. вёска ў Струкачоўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Вясковыя дзеці наведвалі працоўную школу I ступені за 1,5 км у в. Струкачоўка. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 93 двары, 444 жыхары (200 муж., 244 жан.). Створаны калгас "Праўда", працавалі нафтавы і ветраны млыны, конная крупарушка. Зараз у складзе саўгаса імя Чапаева (цэнтр в. Баравая Буда).

На 1.1.2002 г. 6 двароў, 9 жыхароў.

ШЭРАХАЎСКАЯ БУДА, вёска ў Струкачоўскім сельсавеце. У другой палове XIX ст. у Меркулавіцкай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1872 г. заснаваны вінакурны завод. У 1884 г. налічвалася 50 двароў, 312 жыхароў. Размяшчаўся хлебазапасны магазін. Асноўным заняткам вяскоўцаў было земляробства, якое яны спалучалі з рознымі промысламі: кавальскім, даход — 11 рублёў, адыходным — 45 рублёў, ганчарным — 45 рублёў. З 20.8.1924 г. вёска ў Баравабудскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі, з 20.2.1938 г. гэтага ж раёна Гомельскай вобласці. Вясковыя дзеці наведвалі працоўную школу I ступені за 5 км у вёсцы Гарадок, дзе ў 1924 г. навучаліся 42 чалавекі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 52 двары, 263 жыхары (121 муж., 142 жан.). Побач размяшчаліся Баравабудскія хутары: 22 двары, 125 жыхароў (54 муж., 70 жан.). Створаны калгас “13-ы Кастрычнік”, працавалі кузня, ветраны млын. З 16.7.1954 г. вёска ў Струкачоўскім сельсавеце. Зараз у складзе КСУП “Саўгас імя Чапаева” (цэнтр в. Баравая Буда).

На 1.1.2002 г. 9 двароў, 18 жыхароў.

ЯНАЎКА, вёска ў Каменскім сельсавеце. У XVIII ст. вядома як цэнтр аднайменнага маёнтка ў Рэчыцкім павеце Мінскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага. У 1842 г. — фальварак, прыватная ўласнасць двараніна М. Башмачэнкі, які валодаў 2800 дзес. зямлі, меў валавы млын і сукнавальню, якія здаваліся ў арэнду. У 1867 г. — маёмасць губернскага сакратара Башмачэнкі. На пачатку XX ст. у Кармянскай воласці Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. — фальварак, 2 двары, 21 жыхар, належаў двараніну Богушу, які валодаў 506 дзес. зямлі. З 20.8.1924 г. пасёлак у Каменскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 г. — 16 двароў, 86 жыхароў (41 муж., 45 жан.). Побач знаходзіліся Янаўскія хутары: 21 двор, 100 жыхароў (46 муж., 54 жан.). З 5.8.1929 г. вёска ў Кургáніцкім сельсавеце. Створаны калгас “Чырвоны муравей”, мелася кузня. З 30.6.1966 г. у Каменскім сельсавеце Чачэрскага раёна, з 30.7.1966 г. Кармянскага раёна. Зараз у складзе саўгаса “Кастрычнік” (цэнтр в. Кучын).

На 1.1.2002 г. 21 двор, 42 жыхары.

ЯСЕНЬ, вёска ў Валынцаўскім сельсавеце. У канцы XIX — пачатку XX ст. вядома як фальварак у Нова-Ельнянскай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. фальварак, 1 двор, 10 жыхароў, прыватная ўласнасць двараніна Стоша, які валодаў 200 дзес. зямлі. З 20.8.1924 г. хутар у Валынцаўскім сельсавеце Кармянскага раёна Магілёўскай акругі. Паводле перапісу 1926 г. — 33 двары, 185 жыхароў (93 муж., 92 жан.). Вёска знаходзілася ў складзе саўгаса “Валынцы” (цэнтр в. Валынцы).

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС адселена.

В.В. Віталева

ЗМЕСТ

Да чытача 17

Зямля нашых продкаў 21
З глыбіні тысячагоддзяў (21). Асноўныя археалагічныя помнікі раёна (29). На зямлі радзімічаў (33). У складзе Чарнігаўскага княства (34).

У складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай 35
Станаўленне дзяржавы (35). Дакументы сведчаць (38). Сацыяльна-эканамічнае становішча сялянства ў XIV–XVI стагоддзях (41). Дакументы сведчаць (42). Аб вёсках Кармяншчыны XVII– XVIII стагоддзяў (45). Кляпін (46). Карма (46). Колькі гадоў Карме? (47). Адкуль пайшло імя тваё, бацькаўшчына? (48).

У складзе Расійскай імперыі 48
Шляхам двух стагоддзяў (48). Дакументы сведчаць (51). З успамінаў М.М.Макаранкі (54). З гісторыі народнай адукацыі ў XIX стагоддзі (55). З успамінаў А.А.Яўнайса (56). Кармянскія вёскі ў канцы XIX стагоддзя (57). Напярэдадні рэвалюцыі 1905 года (58). Дакументы сведчаць (59). Аб гэтым не забыць (60). Гарэлі маёнткі (61). Забурліў і Кляпін (61). Стараста-бунтаўшчык (61).

На крутым павароце гісторыі 63
За ўладу Саветаў (63). Дакументы сведчаць (68). Рэвалюцыянер і педагог (69). Барацьбіты за савецкую ўладу з в. Кляпін (72). Час выбраў нас (успаміны ўдзельнікаў і сведак падзей 1917–1920 гг.) (74). «Хізаўская рэспубліка» (74). Без памылак не абыходзілася (74). “Дубы-волаты” (75). Як мы змагаліся... (75). Актыўныя ўдзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны (80). Да новага жыцця (81). Гаспадарчае будаўніцтва (81). Народная асвета (83). Мара аб зямлі (84). За новае жыццё (85). Вучыліся і вучылі (85). За газетным радком... (86). Вынікі “суцэльнай калектывізацыі” (91). Дакументы сведчаць (92). Аб тым, што памятаецца (92). З успамінаў А.І.Акінчыца (96). З успамінаў М.С.Супічэнка (96). З успамінаў П.А.Жлоба (96). Вернутыя імёны (96). Ахвяры палітычных рэпрэсій (97).

Ішла вайна народная 106
На рубяжы жыцця і смерці (106). Дакументы сведчаць (108). Той гарачы ліпень (111). Акупацыйны рэжым (112). Дакументы сведчаць (114). Жыццё пад акупацыяй (122). Падполле дзейнічала (124). Танцы на плошчы (131). Нам удалося ўцячы (131). Кастрычніцкая дэманстрацыя (132). Слухалі Маскву (132). Сям’я патрыётаў (133). Кармяншчына партызанская (133). Партызанскія фарміраванні, якія дзейнічалі на тэрыторыі Кармянскага раёна (137). Дакументы сведчаць (142). У той грозны час (148). У чачэрскіх лясах (151). Так змагаліся патрыёты (153). За памылкі плацілі жыццямі (156). Асобае заданне (157). Слова клікала ў бой (158). На Кармянскай прыстані (159). Партызан Іван Юрчанка (160). У імя свабоды (161). Апаленае вайной юнацтва (162). Юныя мсціўцы (163). Вёз хлапчук малако... (163). Юныя патрыёты (164). З успамінаў Аляксандра Ігнатавіча Міхаленкі (165). Вызваленне (165). Дакументы сведчаць (168). Гомельска-Рэчыцкая аперацыя (168). Батальён ішоў у атаку (172). Героі Савецкага Саюза – ураджэнцы Кармяншчыны (174). Подзвіг на Дняпры (175). Поўны кавалер ордэна Славы (176). З узнагародных лістоў на Льва Хадановіча (176). Адзнака маршала (177). Кавалер ордэна Аляксандра Неўскага (177). Героямі сталі на Кармяншчыне (178). Паўтарыў подзвіг Матросава (178). “Ганаруся, што ёсць такія смельчакі” (180). Сяржант з Пензеншчыны (182). Знакамітыя землякі (183). Лёс адмірала П.Ц.Бандарэнкі (183). Дакументы сведчаць (184). Камандзір дывізіі (185). Генерал з Хізава (186). Баявымі шляхамі (186). Прыйшоў той дзень (186). Ваяваў на Украіне (187). Гронкі каліны (188). Яны вызвалялі Кармяншчыну (189). Яны прайшлі дарогамі вайны (191). Воіны Чырвонай Арміі, якія загінулі пры абароне і вызваленні раёна і пахаваны на яго

Кормянская центральная районная библиотека

тэрыторыі (215). Воіны-землякі, якія загінулі ці прапалі без вестак на франтах Вялікай Айчыннай вайны (246). Воіны-землякі, якія загінулі ці прапалі без вестак у гады Вялікай Айчыннай вайны і месца нараджэння якіх дакладна не вызначана (347). Партызаны, падпольшчыкі і мірныя жыхары — ахвяры фашысцкага тэрору (349). Імёны на абелісках (369).

1945 — да нашых дзён 376
Пасля вызвалення (376). Станаўленне (377). З успамінаў М.З.Патапенкі (377). З успамінаў А.П.Саламонава (377). З успамінаў Б.С.Пладунова (378). У мірнай працы (378). Народная асвета (381). Дакументы сведчаць (383). Добры дзень, роднае поле! (387). Працавітая сям'я (387). Твае сыны, Кармяншчына (388). За газетным радком... (389). Па старонках раённай газеты "Авангард" за 1946—1954 гг. (389). Вызначыліся працай (392). Героі Сацыялістычнай Працы (392). Узнагароджаныя ордэнам Леніна (393). Заслужаныя работнікі Беларусі (393). Яны нарадзіліся на Кармяншчыне (395). Звязаны лёсам (405). Загінулі ў Афганістане (407). Пад знакам Чарнобыля (409). Дакументы сведчаць (410). Зона і "насельнікі" (415). А жыць трэба (416). З матэрыяльнай і духоўнай спадчыны (417). Народныя абрады і звычаі (417). Замовы (423). Моўныя залацінкі Кармяншчыны (426). Лепшыя калектывы мастацкай самадзейнасці Кармянскага раёна (428). З гісторыі раённай бібліятэчнай сістэмы (429). З гісторыі раённай газеты (430). Мемарыяльны музей П.М.Лепяшынскага (431). З гісторыі стварэння музея (431). З гісторыі населеных пунктаў (432).